## ТАІСА БОНДАР



# ЧАС, КАЛІ НАС ЛЮБІЛІ

# ТАІСА БОНДАР



# ЧАС, КАЛІ НАС ЛЮБІЛІ

аповесці

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1988

ББК 84 Бел7
Б 81

Рэцэнзент
ЯЎГЕН КУРТО

Работа, карьера, семья, любовь — что станет главной опорой на жизненном пути? В чем наивысший смысл жизни, ее ценность? Об этом думают и над этим размышляют героини повестей Тансы Бондарь.

Именно поиск ответа на эти сложные вопросы во многом определяет жизнь женщины и ее судьбу.

Б $\frac{4702120200-136}{М\ 302(03)\text{-}88}$ 2—88

ISBN 5—340—00002—8

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1988.

# ЖЫВЫЯ ЖЫВУЦЬ



аповесць

«Не шукайце біяграфій у біяграфіях. Гэта... толькі рамы, шыўкі, заўсёды гатовыя разысціся, рубцы, якія ныюць у навальніцу, болі, збуджаныя якім-небудзь чортавым дожджыкам, з хмарамі на небе... Ад таго, што адчуваеш, нікуды не ўцячэш».

*Луі Арагон*

## 1

— Я забуду сваё імя... І тваё імя... І назаву цябе Любым, каб успомніць... успомніць, што гэта — шчасце... Зрабі так, каб я цябе палюбіла. Зрабі так! Больш нічога не трэба. Каб я магла цябе палюбіць.

Павэлак прахапіўся. Жонка гукае? Ніна? Не, ціха. Цёмна. Ён разумее, што прачнуўся. Прачынаецца. А вейкі разляпіць не можа. Зараз! Трэба зрабіць адно, зусім невялікае, намаганне. Ён ужо адарваў галаву ад падушкі. Ужо ўскінуўся. Камечыць коўдру, каб выслабаніцца, перакінуць на край ложка ногі...

— Я змаглася без любові... Усохла... Сэрца ўсохла! Ніводнай кветачкі ў ім... І птушкі даўно не прылятаюць... Няўжо гэта я забіла іх тым, што гукаю, гукаю ў былое? Птушкі не могуць жыць ва ўспамінах, як я. Яны там паміраюць... А я... Родны, зрабі так, каб я палюбіла! Разбудзі мяне...

Якія кветкі? Якія птушкі? Насланнё нейкае! Світае. За вокнамі зашарэла. І Ніна спіць. Нават не зварухнулася, калі крануў яе за плячо. Ды і не памятае ён, каб усчыналася паміж імі гаворка пра кветкі, пра птушак. Птушкі... Бач ты!

Павэлак сцяўся ад холаду, што раптоўна працяў яго, і пачаў узірацца ў жончын твар. Яе гэта быў голас. Нінін! Хоць ніколі не скардзілася яна на нейкіх там птушак. На боль у сэрцы — скардзілася. Ды і то не яму. Суседцы, Ганьцы Пахомавай. Павэлак якраз кадушку ладзіў. У хлеўчуку. А акенца незашклёнае (трэба не забыцца і зашкліць!) у бок Ганьчынага гарода глядзіць. Вось і ўчуў сёе-тое з іх гамонкі. На боль у сэрцы Ніна скардзілася. Па начах, казала, баліць. Невядома

з чаго баліць... А то — птушкі! Няхай лётаюць... Бяды ж яны нікому не чыняць.

— Ты столькі абяцаў мне... Але што можна даць таму, хто ўзяць не можа? Сэрца ўсохла. Ніводнай кветачкі ў ім... І аддарыць не было б чым... Каб я цябе палюбіла, каб я змагла цябе палюбіць, — птушкі вярнуліся б... І мы ўзляцелі б разам з імі... Разбудзі мяне! Зрабі так, каб я цябе палюбіла...

Павэлак, недаўменна-спалоханы, так нізка схіліўся над жончыным тварам, што чуў, як спляталася іх дыханне. Ніна спала. І губы не варухнуліся... А голас гучаў. Толькі што гучаў. Ён, Павэлак, мог бы паклясціся сваім розумам, што гэта гаварыла Ніна. Звярталася да некага. Можа, нават да яго, да Павэлка. Не. Яна згадвала птушак...

Ат, насланнё! Мала што яму збрыдзіцца. Гэта тая пляшка гарэлкі, што яны з Пахомам учора агаралі, паднялa да пеўняў. Знайшоў чым бавіцца! Блытаюцца нейкія словы ў памяці... Лепш спусціцца ў склеп, зачэрпнуць расолу. Любоў, нелюбоў... Сорак летаў Ніна ўжо размяняла. Не дагнала яго па гадах, ды не ўсё ж пра сэрца дбаць. Не ўсім. І птушкі не ўсе лятаюць.

Павэлак як быў, у споднім, выйшаў у сенцы. Адшчапіў кручок. Прахінуў дзверы, высунуўся. Зябка. Сарваў з цвіка, убітага ў вушак, паддзёўку і акрыўся. Галасілі пеўні. Рыпнула пад нагой расхістаная, сцёртая пасярэдзіне прыступка. З шумам вырваўся з грудзей глыбокі, нечакана цяжкі ўздых.

Світала. Дрэвы яшчэ не сцякалі ў траву дрыготкімі ценямі — святло калыхалася, як вада ў аграмадным слоіку. Здавалася: міг — і хлыне шэра-блакітны лівень зыкаў, змываючы начную маркоту, размываючы цішыню. Але мінуў міг, другі, а густое святло па-ранейшаму ціха калыхалася побач — вакол яго. Нячутна, амаль непрыкметна світала. А ўздоўж сцежкі, як нехаця адзначыў Павэлак, зацвіла трава. Расой зацвіла. Халоднай расой. Крануўшы колькі травінак ступнёй, ён апёкся гэтым холадам. І заспяшаўся. Хоць спяшацца не было куды. Дзень толькі-толькі пачаў займацца.

Так, цэлы доўгі дзень быў наперадзе. І хопіць яшчэ яму, Павэлку, за дзень featureзнага клопату. І розных думак. Бо колькі ні адварочвайся ад думак, колькі ні хавайся ад іх за клопатамі ды за працай, яны, выраслыя

за жыццё, не адступяцца, не адпусцяць. Будуць цягацца ўслед за ім. Будуць чапляцца за кожную хвіліну адпачынку. Будуць спрачацца між сабой і з ім, Павэлкам, і даводзіць сваё.

Сваё... Што — сваё? І чаму гэта не ягонае, не Павэлкава, калі думкі — ягоныя? У ягонай жа галаве яны рояцца, у ягонай душы варочаюцца! І колькі ні адварочвайся ад іх, колькі ні хавайся за клопатамі ды за працай, не дапамагае.

Вось і зараз. Толькі вочы прадраў, толькі зірнуў на свет божы ды на падворак уласны, а думкі тым часам тут як тут. І зноў за сваё. Жывеш ты, маўляў, Павэлак, і сам не ведаеш, для чаго: дні ідуць, заплятаючыся за службу, за нейкія абавязкі перад гэтым тваім жыццём, няўдалым і бязрадасным, а ў чым твая радасць, дзе? Пэўна ж, не ведаеш...

Ат! — паспрабаваў адмахнуцца ад невясёлай думкі Павэлак. Не спадобіў бог, як той казаў, быць іншым, дык і не будзеш. І чаго б ён раптам аб гэтым шкадаваў!

Глынуўшы расолу, адставіў бляшаную конаўку і пашукаў вачыма, на што сесці. Згледзеў калоду, на якой звычайна калоў бярозавыя чурбакі, падышоў, пасунуў яе бліжэй да сцяны. Каб больш зручна сядзець было. Змахнуў колькі невялікіх трэсачак і сеў, папраўляючы на плячах паддзёўку...

«— ЛЕПШ БЫ МНЕ РУЧАНЬКІ ЗГАРНУЦЬ, чым у свет белы выпраўляцца, дзіцятка сваё пакідаючы... Лепш бы мне...

Гэта мама шэпча. Ціха шэпча: мне нічога больш не чуваць, ні слоўка больш не чуваць. Я хачу закрычаць, пагукаць маму — і не магу. Не магу — нават дзвюма рукамі — адарваць ад свайго твару, ад свайго рота чыюсьці нягнуткую, шурпатую далонь. Я ўкусіў бы гэту далонь, пракусіў бы! — але яна так моцна, так балюча сціскае вусны, што мне не здолець. Ніяк не здолець. Не тое што вуснамі шавяльнуць, галавой хітнуць не магу: прама перад вачыма — аграмаднае драўлянае кола, запырсканае граззю, і яшчэ — калі вочы паставіць крыху коса — чыесьці ногі ў аграмадных, густа намазаных дзёгцем ботах. Пазіраць на боты (яны зрэдку, калі ногі пераступаюць на адным месцы, абзываюцца, выціскаюць нейкі незнаёма-густы гук) чамусьці страшна. Таму,

раз-пораз касячы вокам у іх бок, я ўсё ж пазіраю на кола: кола падобна на тое, якое ад калёсаў, толькі вельмі вялізнае — верху не відаць...

Раптам — глухі, кароткі ўскрык. Вокліч. Быццам хто мяне пагукаў. Я ўслухваюся, выцягваю шыю, вырываючыся з-пад цяжкой далоні, і нічога не чую. Ніводнага гуку. Толькі там, дзе смокча, пячэ штосьці ў грудзях, б'ецца, калыхаецца гарачае паветра: тах! тах! тах!..

Раптам — зварухнуўся, на момант павіс у паветры, насоўваючыся на мой позірк, на кола, якое я бачу, адзін, той, што бліжэй, бот. Чаўкнула гразь — быццам балюча абзыўнулася прыцiснутая ботам зямля. І вось ужо другі бот, тлуста намазаны чорным дзёгцем (рэзкі яго пах казыча ў носе), насоўваецца... Я спрабую сцяцца ў камячок. Жах працінае мяне: ну, як і мяне ўцісне ў гразь, у зямлю гэты аграмадны бот! Але ён апускаецца побач, за паўкроку — не на мяне.

Каўтаю свой страх у роце, ціскаю яго языком, а ён усё роўна не глытаецца. І нягнуткая, шурпатая далонь па-ранейшаму заціскае мне рот. Яшчэ раз чаўкнула гразь, яшчэ раз балюча абзыўнулася зямля — і крык! Той жа глухі, кароткі ўскрык. Вокліч. Быццам мяне хто пагукаў... Выцягваю шыю, звіваюся, каб вызваліцца, выслізгнуць з чыіхсьці дужых учэпістых рук, і бачу, як павольна, цяжка здрыганулася, зрушылася кола — і месцамі блішчасты абруч, вобад, пацёк пад яго, у цёмную гразь...

— Павал! Павал! — дзярэ вушы, будзіць мяне звычна-пявучы голас, цётчын голас. — Прыйдзі да розуму, дзіця: паехалі яны, паехалі ўжо...

Праз сілу расплюшчваю вочы: яны як засланы туманам — трэба пацерці іх кулачкамі... Але я гэта толькі так думаю, бо тут жа зноў заплюшчваю вочы.

— Цяпер усё добра будзе, цяпер на добрае павернецца... — не адступаецца голас. — Бач, белы як папера! Спужаўся нябось. Мардатага таго спужаўся, што з вінтоўкай... Цяпер-то ўжо баяцца няма чаго. Цябе, малога, не кранулі, пашкадавалі, вось і дзякаваць богу трэба. Цяпер на добрае павернецца.

Нехаця зіркаю перад сабой. Туман ужо разышоўся, і на дарозе, там, дзе толькі што павольна, цяжка паварочвалася аграмаднае драўлянае кола, пуста. Нікога. Не... Штосьці там, над калдобінай, варушыцца. Выцягваю шыю, узіраюся — варона! Не брудна-шэрая, як

тая, што прылятала на падворак увечары, а чорная-чорная. Як дзёгаць на тых аграмадных ботах...

— Што ты там згледзеў? Бач, утаропіўся... Няйначай, страх яшчэ не адпусціў. Уставай! Пойдзем. Ніхто хлеба не дасць, як сам не заробіш.

Нягнуткія шурпатыя пальцы ўпіваюцца мне ў руку — я ўздрыгваю, скараючыся іх сіле, іх волі, а позірк ніяк не адарваць ад дарогі, ад калдобіны, над якой, на больш сухім грудку, штосьці раздзёўбвае вялікая чорная птушка. Што? У нейкі момант мне пачынае здавацца, што яна дзяўбе той глухі кароткі ўскрык, вокліч, згублены з калёсаў...»

Ужо добра развіднела. Скрозь, уздоўж усёй вуліцы, у дварах галасілі пеўні — вось-вось павінна было ўзысці сонца. Павэлак сачыў, як цяплела на ўсходзе неба, і перакідаў у думках усё, што меркаваў перарабіць за дзень.

Згадка не закранула яго, яго спакойнай задумлівасці, і нічога з таго, што мільганула ў душы, ён не помніў. Нічога. Ні маці сваёй. Ні крыку яе. Ні падводы, на якой павезлі гэты крык у нейкі іншы край. Ні сябе, малога, меншага за калёснае кола. Калі спрабаваў звычайна аднавіць у памяці свае першыя свядомыя крокі, згадвалася вечна сагнутая спіна, не па-дзіцячы цяжкая праца ды цётчын зычны, зычна-пявучы голас: «Ніхто, Павал, хлеба не дасць, як сам не заробіш. Працуй-ведай!»

А працы ўсёй павек не пераробіш. І адно трэба зрабіць, і другое. А трэцяе — чаргі сваёй чакае... Усяго не пераробіш, як бы ні шчыраваў цёнгле. А сам не зробіш, ніхто за цябе не зробіць. Гэтак яно скрозь. Вось і сёння. Ніхто Павэлкавай работы не зробіць. Пасядзіць ды пойдзе ўпраўляцца. Памыецца. Паснедае... Адно што ў хату ісці не хацелася...

## 2

У хаце ніхто болей не спаў. Лена цёрся аб ножку стала, выгінаючыся, расцягваючыся, як чорна-рыжы гармонік, кот. Цікалі ходзікі. Разбуджаныя рукой гаспадыні, яны паказвалі неверагодны зараз час: гадзіну апоўначы. Ці апаўдня. Ніна, гаспадыня, не задумваючыся,

падцягнула ланцужок і хіснула маятнік. Вось яны і ішлі. Цікалі. А яна нерухома сядзела на адсунутым ад стала крэсле. Нават вочы прыкрыла далонню. Навошта ёй было ведаць, якая цяпер гадзіна? У бальніцу ісці было рана. Сонца яшчэ не ўстала. Ды і Макавей на сваім драндулеце яшчэ не разагнаў ранішнюю дрымоту вулічкі, зарослай паўз платы пырнікам. Кожную раніцу ўшкрабецца на свой драндулет і ляціць. І ўсе жанкі яму ўслед чорта памінаюць. Чорт і ёсць. Гэта ж неяк да яе майстраваўся. «Нінка, кажа, ты б толькі са мной здаволіла сваю ночку. Я ж агонь і ў шапцы магу прынесці. Згаджайся!» З ім згадзіся... Чорт і чорт. Ганька ўчора прарочыла, што Кацярына Раманішышына хлопца ад Макавея панесла, і Раманішыха, няйначай, заб'е дачку — гэтулькі з ёй няньчылася! Няньчыцца яна няньчылася. Замуж — не аддала. Ці мо не ўзялі. А Макавею што! Абы сілы дурной пазбыцца. Хрысця ж ягоная ўсё за хваробы хаваецца.

Ляціць, чорт кучаравы... Ажно шыбіны зазвінелі. Знайшоў жа недзе гэткага ж звера, як і сам!

Ніна крутанулася на крэсле. Паднялася. Падышла да люстэрка, што займала цэлы прамежак між акон. Змахнула з яго нябачныя пылінкі. На яе пазірала маладая кабета ў шэрай у белы гарох кофце, не зашпіленай на грудзях. Пазірала з такім непрыхаваным смуткам, што ў Ніны сцялася сэрца. Штосьці здарылася? Што? Вочы прыпухлі. У гладка зачасаных назад валасах — сівізна. Зморшчынка на пераноссі рубцом... Грудзі... Ніна — міжволі неяк — захінулася рукой і дрыготкімі пальцамі пачала зашпільваць кофтачку на грудзях.

Зноў немаведама чаго балела ўначы сэрца. І праз сон — у сне — балела. Неяк Дзмітрыеўне паскардзілася — тая супакойвала. Казала, што ўсё добра, што сэрца спраўнае. Ёй можна верыць. Яна ўжо аднойчы ўратавала яе.

«НЕ МАЯ ТАДЫ ЗЯЗЮЛЯ КУКАВАЛА... У вайну было. Не. Раней крыху. Перад самай вайной. Калі нашы часці прайшлі і ў суседняй — якіх адзінаццаць кіламетраў ад Запярыння — Дубраўцы з'явіліся немцы, мы ўжо са Сцяпанам кахаліся. Так кахаліся, што і думаць не думалі, як яно будзе далей. Як павернецца. Павярнулася ж на кроў вялікую...

Ды гэта потым. Да гора яшчэ дажыць трэба было. А тады? Тады лета толькі ў красу ўбіралася. Дзень стаяў высокі-высокі. Балюча было і зірнуць угору — адразу галава кружылася. Ад вышыні. Ці ад святла. Ці яшчэ ад чаго...

І нашто задзіраць галаву! Неба ляжыць на вадзе. Зусім побач, ля кладкі. Ручнікі я палашчу. Палашчу ў гэткай густой сінечы, што і за работай дзіўлюся: як гэта яны застаюцца белымі-бялюткімі. Без адзінай сіняй плямінкі... Падымаю, атрэпваю ручнік і слухаю, як цененька звіняць кроплі вады. А палатно, скручваючыся ў жгут, святлее пад пальцамі, робіцца пругкім. Адзін ручнік, другі...

Ужо ўвесь бераг, парослы лотаццю, стракаціць ад вышываных і невышываных дарожак.

— Памагаты не патрэбны?

Як ціха, як нерашуча ён гэта спытаў. Ён, Сцяпан мой. На той час і ведаць яго не ведала. Звычайна, як толькі наладзіць моладзь вячоркі і Пятрок Зміраў ірване зухаватым рухам гармонік з пляча, выгукнуўшы сваё, звыклае: «Э-эх, душа, разгарніся!», ён уваходзіў у хату, ківаў усім і нікому і прысланяўся да шула. І стаяў. І моўчкі назіраў за намі. І ніхто ў яго ні пра што не пытаўся. Вёска ведала, што ён стрыечны брат Марылі Юрчыкавай: Юрчык узяў Марылю ці не з Заполля...

— Тое і раблю, што ад памагатых адбіваюся, — падымаю на хлопца вочы. — Добра, што паласкаць скончыла!

Падняла свой кошык, ступаю насустрач яму. Загарэлы, у картовых штанах, закасаўшы да каленяў, ён як не пахіснуўся, прапускаючы мяне. Даверліва ўсміхнуўся:

— Выкупаемся?

— Яшчэ чаго! Ты ж і так ледзьве на нагах утрымаўся, зіркнуўшы на падол мой падаткнуты.

— Як хочаш...

І кідаецца ў ваду. Так, як стаяў. Я чую нягучныя роўныя ўсплёскі і не азіраюся. Адыходжуся па сцежцы ўбок (сонца — высока, ручнікі павінны хутка павысыхаць!) і апускаюся на траву, не падбіраючы спадніцы. Распраўляю падол. Зіркаю на раку. Хлопец плавае крыху воддаль. І я раптам лаўлю сябе на тым, што з задавальненнем цікую за ім, і злуюся. Яшчэ чаго! Плавае і плавае! Не забароніш!

За мной Павэлак — сельсавецкі! — трэці месяц ходзіць. Выйсці за яго ўгаворвае. Можна б і выйсці: пры пасадзе, гаспадарлівы, хата, як лялька, у пасёлку, на пагорку... Толькі гэта бацькавы думкі, не мае. Мне самой іншае карціць, а што іншае, я і сама пакуль што не ведаю...

— Мяне Сцяпанам завуць. А ты — Ніна, сястра казала. Прыгожае імя: Ні-на... Не славянскае нейкае.

— Як гэта не славянскае? Маю бабку так звалі, — уступаю, зусім нечакана, у гаворку.

— А ў бабкі гэтае імя ад каго? У прабабкі?

Сцяпан пытаецца мякка, усмешліва, хоць пазірае не на мяне, а на неба, усё гэтак жа, з шырока раскінутымі рукамі лежачы на спіне. І галава ў яго не закружыцца!

— Што маўчыш? Не ведаеш? І я, на жаль, не ведаю. Проста прыгожа. І крыху таямніча. Быццам у самім гэтым слове, у імені даўніна чутная, і блізкая, і невядомая адначасова. Блізкая і невядомая... Зусім як неба над намі.

Ён пераварочваецца на жывот. Падпёршы рукамі падбародак, углядаецца кудысьці ў далячынь, зарослую лотаццю і вербалозам. Колькі часу маўчыць, потым пачынае расказваць. Нібыта і не мне расказвае:

— У людзей, як і ў птушак, ёсць не толькі зямля. Ёсць і неба. Гэткае ж высокае і неабдымнае. Зямлю мы звыкла на босых ступнях носім — баімся адарвацца ад яе. За сябе баімся і за зямлю баімся. Таму і неба здаецца далёкім, чужым. А яно не чужое. Яно гэтаксама нам належыць. Адно што для неба крылы патрэбны! Чаму, запытацца, скажам, самалёты з'явіліся? Крылатым захацеў адчуць сябе чалавек. Такім, якім быў пры нараджэнні. Быў — і забыўся на тое. І змайстраваў крылы. Бачныя. Шырокія. Магутныя. А тыя, нябачныя, якія ёсць у кожнага з нас — спрадвек былі! — адпалі.

— Дзіўна ты гаворыш, — перапыняю я хлопца, адчуваючы незразумелае хваляванне. — Бачныя, нябачныя... Людзі ж не птушкі. У птушак свае клопаты, у нас — свае. Вось і цябе ўзяць... Іншы б на тваім месцы пра хараство дзявочае — маё! — гаварыў, пра захапленне сваё далдоніў: «Ах, Ніначка, якія ў цябе вочы! Ах, Ніначка, якія ў цябе...» А ты — пра крылы. Дзіўна.

— Пра крылы? Ну, што ж тут дзіўнага? — пава-

рочваецца ён да мяне, быццам і не заўважаючы, што я хацела, хай сабе і нязлосна, пакпіць з яго. — Кажам жа мы: душа, любоў, лятункі... А што такое душа? Ці любоў? Што такое лятункі? Чаму мы лёгка пераносімся ў думках туды, куды імкнецца душа? Чаму так высока крыляюць песні? А лятункі... Само ж слова крылатае! Нам проста смеласці не хапае, рашучасці. Нам адарвацца ад зямлі страшна: на зямлі хлеб расце. І магіл занадта многа...

Ён нерашуча змаўкае. Уткнуўся тварам у траву. І я раптам пужаюся: дамаглася свайго! Што, як Сцяпан не схоча працягваць гаворку? Што, як ён чакаў ад мяне нейкіх іншых слоў? Я нават ліхаманкава пачынаю шукаць у сабе гэтыя іншыя словы. А на языку круціцца толькі пустое, нікчэмнае зараз: «Дзівак!»

— Дзівак! — не вытрымліваю і разрываю напружаную паўзу. — На зямлі мы нараджаемся, на зямлі і паміраем. Спрадвек гэта.

— Птушкі гэтаксама на зямлі паміраюць... — абзываецца Сцяпан. Быццам нехаця абзываецца. Але, падняўшы галаў, зіркае на мяне амаль весела. — Вось ты! Ты ж уся звонкая-звонкая. Як жаўранак. Падстаў табе далоні, прыўздымі — і паляціш!

— Так і палячу? Замахаю рукамі і палячу? — смяюся я, адчуўшы палёгку, а па целе ўжо разліваецца незразумелая лёгкасць, нібыта і ўзапраўду вось-вось устану, адштурхнуся ад зямлі і ўздымуся высока-высока...

— І рукамі махаць не трэба! Рукі ж — не крылы. Крылы — у табе. У веры тваёй. У веры, што паляціш. Што не выжывеш без гэтай вышыні, без ветру насустрач. Здольнасць узляцець — ляцець! — знікае, калі перастаеш у яе верыць і пачынаеш шукаць крылы.

Сцяпан гаворыць узрушана, пераканана. Смех мой павінен крыўдзіць яго. І не крыўдзіць. Ён садзіцца на траву, падкурчыўшы ногі, і ўсміхаецца. І — смяецца разам са мной. І нас гэты агульны смех нечакана збліжае.

— А ты не з палахлівых жаўранкаў, — мякка перапыняе ён імгненне.

І мы доўга маўчым. Мне здаецца, што доўга. Я паспяваю прасачыць за аблачынкай, якая сплывае ўніз па Пцічы. Падзівіцца яе разной бязважкасці. Падумаць пра тое, што з такой цішы і светлыні абавязкова пра-



расце дождж. Адчуць незнаёмае ўзрушэнне ад навакольнага хараства... Колькі разоў бывала тут і адна, і з дзяўчатамі (ці ж першае лета мыю на кладцы бялізну!), а нібыта і не бачыла гэтай ракі, гэтай высокай лотаці, гэтых вербаў, у якіх кожны лісток падшыты мяккім срэбным ззяннем.

— З такой цішы і светлыні абавязкова прарасце дождж. Бачыш: аблачынкі пабеглі?

Я ўздрыгваю, палохаючыся Сцяпанавых слоў: ён нібыта падслухвае мае думкі... Гэта ж я толькі што падумала! Слова ў слова — маё!

Падхопліваюся. Таропка кідаюся збіраць ручнікі. Скручваць іх у пругкія белыя жгуты. Сцяпан дапамагае, раз-пораз зіркаючы ў мой бок. Правяраючы, ці гэтак усё робіць, як я. Я не перапыняю. Не пазіраю на яго. І бачу кожны яго рух. Кожны яго позірк. Бачу, што адлегласць паміж намі вельмі ж хутка скарачаецца. За апошнім ручніком схіляемся разам. І... забываемся пра ручнік і пра свой рух. Павольна разгінаемся. Плячо ў плячо. Твар да твару. Не чую ні свайго, ні яго дыхання. Чую: недзе зусім блізка кувае зязюля.

— Гэта яна шчасце нам кувае. Гады нашы шчаслівыя лічыць, — ціха абзываецца Сцяпан.

— Нам? На-шы? — з голасам, са словамі да мяне вяртаецца ранейшая ўпэўненасць. — Задужа шчодры ты ля чужога скарбу... Я і слухала, бо ўсё роўна трэба было чакаць, пакуль ручнікі павысыхаюць.

Складваю ручнікі ў кошык, чакаю, пакуль ён перадасць астатнія, і рашуча адмаўляюся ад дапамогі. Я ўжо забрытала сябе. Сустрэліся і сустрэліся. Не хапае яшчэ, каб на чые вочы разам трапілі! Ад языкоў не абярэшся...

— Каму зязюля кувала, тое лета ведае, — кідаю наўмысна абыякава. — А нашы сцежкі разыходзяцца.

— Я буду чакаць цябе тут, як звечарэе.

— Чакаць нікому не забаронена!

Смяюся. Ступаю на сцежку і іду, не азіраючыся. Іду таропка, быццам ён вось-вось кінецца мяне даганяць. Азіраюся на яго маўчанне. На цішыню за сабой. Сцяпан стаіць, дзе стаяў. Апусціўшы рукі. Не адводзячы пагляду.

— Я да раніцы чакаць буду!

Чую ўжо спіной. Спачатку гэтыя яго словы. Потым куванне зязюлі. Дзесьці вельмі блізка. За ракою...»

Пра што гэта яна? А! Пра Дзмітрыеўну. Дзмітрыеўна прасіла раней сёння прыйсці. Камісія нейкая прыязджае. Трэба паспець прыбрацца... І ездзяць, і ездзяць! А што правярацы? Захварэе чалавек — яго ў бальніцу. А ў бальніцы вядома, якія законы. Хворыя хварэюць, урачы лечаць. А яна, Ніна, і адным і другім павінна ўнаравіць, і адных і другіх улагодзіць. Нянечка, адным словам! А хоць бы і ўрач... Што тут правярацы? Паправіцца хворы — яго і выпішуць. Сам не ўлежыць, каб і не выпісалі: жыццё ж ля парога чакае. Якое ні якое, а жыццё. Як часта ні падцірае Ніна падлогу ў палатах, колькі перадач ні прыносіць знізу, а хворым грудзям надакучыць дыхаць бальнічным паветрам. Нікому згубіць сілу і зусім знямогламу ляжаць на ложку не хочацца. Ляжаць, бо хвароба навалілася. Болем навалілася ці так, змогай... Бальніца, адным словам!

Ніна зачасала і так гладкія валасы, не зірнуўшы ў люстэрка. Зняла са спінкі крэсла сінюю шарсцяную кофту і, падумаўшы нейкі момант, кінула яе назад.

Азірнулася ад дзвярэй, агледзела пакой. Непрысутным позіркам, з абыякавасцю агледзела. Бо так і не вярнулася да непрыбранага ложка. Так і не згадала, што не паснедала. Хоць жбанок з малаком і хлеб, прыкрытыя ручніком, былі на стале звечара.

На ганку памарудзіла, успамінаючы штосьці нязробленае. Ці забытае. І не ўспомніла. Сцепанула плячыма — зябка! — і, прыціскаючы да грудзей пруткія, сашчэпленыя звыклым рухам рукі, пайшла да веснiц.

— Ты пайшла ўжо?

Перахопленая пытаннем Павэлка ля самых веснiц, яшчэ раз сцепанула плячыма. Спынілася. Павярнула галаву.

— Малако і хлеб на стале. Ты ж і сам... Мне трэба раней сёння.

І прычыніла веснiцы.

## 3

Тое, што Ніна не гукнула яго снедаць, не збянтэжыла Павэлка. Не першы раз. Ён звыкся. Раніцой жонку было лепш не чапаць. Як сама не свая. Колькі пражылі, а ўсё прачыналася чужою. І яму, Павэлку, чужою,

і свету беламу. Лепш было не чапаць. Расходзіцца. Распагодзіцца...

Ён доўга плёскаўся пад рукамыйнікам. Аж пакуль не забразгаў пустым дном. Уцёрся. І пайшоў у хату, абмінаючы старую разгалістую вішню. Падумаў, што трэба б ссячы вішню: даўно ўсяго прыбытку ад яе, што цень у спёку. Нават шпакі ў шпакоўні не жылі...

Затрыманы гэтай думкай, пастаяў хвіліну-другую ля дрэва. Можа, гэта пра шпакоў згадвала Ніна? Яны і праўда ўжо шмат гадоў не прыляталі ў двор. Не сяліліся тут у шпакоўні.

— Цьфу, дурань! — вылаяў Павэлак сам сябе ўголас. — І прычэпіцца ж нешта! Птушкі... Шпакі... Задурыў сабе галаву!

Яшчэ раз зірнуў угору, на пустую шпакоўню, і заспяшаўся. Пакуль раса, трэба зрабіць колькі пракосаў на ўзлеску! Гэта ж кіламетры тры ісці полем...

Абвёўшы позіркам хату, яшчэ з парога, ён адразу заўважыў і непрыбраны ложак, і кінутую на спінку крэсла сінюю шарсцяную Ніну кофту, і некрануты ручнік, што прыкрываў малако і хлеб. Зглынуў уздых. Закашляўся. Быццам горычы глынуў. Уцёрся рукавом і яшчэ раз уздыхнуў. На гэты раз — з палёгкай. Ледзь не штораніцы адно і тое ж. Пабіць бабу неяк аднойчы, ці як?

Думка бліснула і згінула. А Павэлак ужо таптаўся па хаце, ужо звыкла нацягваў пасцілку паверх разгладжанай коўдры, ужо складваў кофту і нёс яе ў шкап. Агледзеўшыся і задаволена хмыкнуўшы, сеў да стала. Эх, Ніна, Ніна!

«ВЯСНА ВОЧЫ КРАДЗЕ... Ці ж я гэтага не ведаў? Дык не!

Прыязджаю, заходжу ў двор, а яна — з двору:

— Здраствуйце, Павел Пятровіч. Тата дома. Збрую ладзіць.

— А ты куды, Ніна? — пытаюся, а сам вочы баюся адвесці: успырхне і паляціць дзеўка, а мне зноў з Цімохам старым, з бацькам яе, вечар бавіць.

— Сяброўкі чакаюць. Цеатр мы хочам свой наладзіць...

— Тэатр правільна. Але які ж тэатр у...

— У богам забытым Запярынні?

— У вас жа і клуба няма!

— Будзе ў нас клуб. І тэ-а-тр будзе! Мы ўрывак з «Пінскай шляхты» ўжо развучваем.

— Якої шляхты?

— А вось прыходзьце і пабачыце! — смяецца Ніна, і за ёю доўга ляскаюць веснічкі.

— Што ж не праходзіш, Пятровіч? Не зважай на дзеўку, яй-богу! Наравістая, бо маладая. І не гэткіх аб'язджаюць.

— Ды я да вас, Цімох Васільевіч.

— Да мяне дык да мяне. І то... Куды дзеўка дзенецца?

Цімох ладкуецца на перавернутым чурбаку, папярэдне змахнуўшы рукавом лаўку. Для мяне. Павагу выказвае. І, выцягнуўшы капшук з тытунём і яшчэ раз выцершы пальцы аб штаны, засяроджана пачынае скручваць цыгарку. На мяне вачэй не падымае.

— Як з сенам сёлета? Будзе? — пытаюся, каб штосьці спытацца. — Трава месцамі ў пояс, бачыў.

— Сенакос добры. Абы ўправіцца.

— Чаго ж не ўправіцца? І надвор'е стаіць — працуй-ведай!

Кажу, а сам думаю, як гаворку да свайго жаніхоўства павярнуць: з тым жа ехаў, усю рашучасць сваю сабраўшы, каб абгаварыць усё папярэдне з Цімохам, а там і сватоў засылаць. Не першы раз прыязджаю, а ўсё да галоўнага не дойдзе. Трэба было, відаць, адразу пачынаць, а то зноў неўпрыкмет на жыццё-быццё вясковае ў гаворцы саб'ёмся.

— На надвор'е няма чаго наракаць, праўда твая, яй-богу. Тут іншае, Пятровіч, — на момант як забыўся на сваю цыгарку Цімох, і я адчуў незразумелую трывогу (ці мо яго, Цімохава, якаясь трывога перадалася мне). — Мужыкі кажуць, як бы германец не пайшоў на нас, як бы вайной гэты спакой не абярнуўся.

— Вайной? — сілюся ўсміхнуцца як мага спакайней. — У нас жа дамоўленасць з германцам. Дагавор!

— Дагавор-то яно дагавор, ды надта ж ашчэрвасцца на нас германец, яй-богу. Мужыкі кажуць...

— Ну, што яны могуць казаць, мужыкі? Што яны могуць ведаць? — абураюся. — Ёсць каму думаць. Ёсць каму разважаць. Наша справа малая.

— Малая, кажаш? — прыжмурыўся той на мяне, выпрамляючыся. — Мо і малая. Ды спаконвечная. Адвеку

сялянская — на зямлі і з зямлёй. А як на гэтую зямлю, на нашую, германец прыйдзе?

— Не прыйдзе.

— Хай бог дае, як той казаў, — буркае Цімох і доўга, як мне, незадаволенаму кірункам гаворкі, здаецца, маўчыць, раз-пораз зацягваючыся дымам. — Толькі я, Пятровіч, так разважаю сам сабе: на лепшае спадзявайся, а на бяду вочы не закрывай. Мы не помнім, а зямля помніць, яй-богу. І германца помніць.

Вось жа ўпарты стары: яму — пра сваё, а ён — пра сваё. Быццам аднаго яго трывога точыць! Як бы гэта мякчэй гаворку перавесці?

— Што будзе, таго не мінеш, Цімох Васільевіч, — нецярпліва пастукваю па халяве бота. — Толькі я думаю, што да вайны не дойдзе. Не павінна. Германец не дурны, на сілу не папрэ.

— На сілу?

— На сілу. Як інакш! Я спакойны за заўтрашні дзень, кажу з усёй перакананасцю. Жаніцца вось надумаўся, — выпальваю пра свой намер нечакана нават для самога сябе, без усякага пераходу, і сцінаюся, чакаючы, як стары зрэагуе.

А той ніяк не рэагуе. Нават галавы не падымае. І я спяшаюся ўдакладніць сказанае, падкрэсліць:

— Жаніцца я надумаўся. Гады ўжо. Ды і за гаспадаркай трэба некаму глядзець. Сам — на службе важнай. Дзяржаўнай... За ўсім вока ды вока трэба!

— Вока за ўсім трэба, як жа! — зацягваючыся дымам, падтрымлівае Цімох.

— Дык вось я і наважыўся ажаніцца. І дзеўку нагледзеў, — кажу, а сам цікую за старым: пэўна ж, ведае, пра што я...

— Ці не маю часам? — прыжмурыўся той.

— Вашу, Цімох Васільевіч. Ніну.

Цімох не абзываецца. Курыць. Апякаючы пальцы, усё смокча, дасмоктвае цыгарку.

— Адна яна ў нас з Ганнай, Ніна...

— Не на гора ж бяру, не на галечу! — перапыняю старога. — Нават крыўдна, Цімох Васільевіч. Хата ў мяне добрая. На пагорку. Усё ў гаспадарцы маецца. І потым — служба...

— Ды жаніх ты першы, Пятровіч. Я ўжо і з Ганнай сваёй гаварыў. З якога боку ні глянь: першы. Мы з усёй павагай да цябе. Не памыслі, яй-богу, — Цімох сплю-

нуў крышынкі тытуню, абапёрся рукамі на калені — гэтакім гарбылём! — накуколіўся. — Але цяперака сватоў разам са згодай дзеўкі прысылаюць. Вучоныя, бачыш, усе. Я, канечне, прыцыкну на Ніну. Як жа! Дачка ўсё ж. Павінна бацьку паслухаць. Ды і ты, яй-богу...

Я раптам адчуваю, як прыхлынула, завалакла пагляд злосць. На гэтага недарэку старога. І на сябе, ёлупня: ганяю кабылу ледзь не штодня ў гэтае богам забытае... Ат! Канца-краю гэтаму жаніхоўству не відаць. Дзевак, урэшце, мала ў свеце, ці што?

Змахваю пылінкі з ботаў, здзьмухваю іх з далоні. Павольна падымаюся. Зіркаю на скурчанага старога.

— Я што, Цімох Васільевіч? Я і ў другі двор магу завярнуць. Гэтакага, як я, усюды прымуць. Як той казаў, з радаснай душой прымуць. Вы не пашкадуеце.

І кіруюся да веснічак. А сам, зашчаміўшы губу між зубамі, слухаю: пагукае Цімох, дзе дзенецца! Налог жа хутка здаваць... А Цімох тым часам не абзываецца. Чую: ногі мае пацяжэлі, крокі запаволіліся — сіла, цяжкая, як зямля, да зямлі гняце. Надта ж ладная дзеўка, Ніна. Што тварам, што целам узяла...

— Бывайце, Цімох Васільевіч. Налог хутка здаваць: ужо ж вы не спазніцеся.

— Цьфу ты, яй-богу, — забурчаў стары, зазлаваў. Ці з таго, што бяссілле сваё мне паказаў. Ці з таго, што я з крыўдай у сэрцы адыходжу...»

Павэлак неяк непрыкметна для самога сябе паснедаў, прыбраўся, вынес малако ў склеп. Прымкнуў дзверы, узяў касу і наважыўся ісці. Яшчэ раз гаспадарскім вокам агледзеў двор.

— Здароў будзь, сусед! Брыгадзе ўздумаў дапамагчы, што касу зрання адкляпаў? — гукнуў яго з-за плота Пахом.

— Здароў. Па ўзлеску пахаджу, пракос-другі выйду... — буркнуў Павэлак незадаволена ў адказ, зачыняючы веснічы і яшчэ раз аглядаючы двор.

— А-а-а... Я думаў: у брыгаду. Сенакос добры сёлета. Рук не хапае. Вось я і думаў...

Пахом, таксама з касой, усчаў гэтую гаворку, пэўна, нездарма. Брыгадзір папрасіў. Няйначай! Цёнгле вочы ўсім муляе, што ён, Павэлак, па двое сутак у гародзе сваім таўчэцца. Дык па закону. Невялікая пасада: начальнік пажарнай аховы, а суткі заняты — двое дома.

І якое там заняты! Хоць гэта ўжо справа дзяржаўная... Усё — як належыць. Ён, Павэлак, сваё месца ведае. А каму вочы муляе, хай не глядзіць. Хай адвернецца.

Ён зірнуў услед Пахому, які дробненька перасыпаў нагамі, жвавымі крокамі спускаючыся з пагорка. Мармытнуў нешта сабе пад нос. І пашыбаваў у супрацьлеглы бок. Да лесу. Нават і ў думках больш не згадваючы пра Пахома. Што галава, то розум. У яго — сваё, у Пахома — сваё. Нічога яны не дзеляць. Нічым адзін аднаму не абавязаны. Суседзі. Суседзяў не выбіраюць. А мірыцца — як-небудзь зміracца. Хай у душу яму, Павэлку, не лезе. Ён і сам туды не зазірае і нікому не дасць зазірнуць. Жыццё ва ўсіх аднолькавае, а хто ў тым жыцці больш мае, хто менш, не ім разбірацца.

З-за лесу выкацілася сонца. Вялізнае, як калёснае кола («Толькі спіцы не ў сярэдзіну, наадварот павыгінаны», — варухнулася ў Павэлку колішняя няўцямная згадка маленства), яно павісла над лесам — і да яго пацяклі, паплылі няроўныя струмені туману. Быццам сонца высмоктвала іх з цьмянай, прыкрытай голлем цішыні, а яны рваліся, распадаліся на шматкі, раствараліся ў паветры. І ніводны не дабягаў да расчырванелага сонца, не мог наталіць яго смагу.

У алешніку, што цягнуўся паўз зарослую пырнікам і курынай слепатой дарогу — дакладней, старую неглыбокую каляіну, — шчыравалі салаўі. Ці то радаваліся сонцу, ранку, ці то проста выказвалі сваю птушыную сутнасць. Салавей — дык і спявай. Заходзься. На тое воля прыроды.

Павэлак не слухаў салаўёў. Ішоў шпарка. Папікнуў сябе нязлосна за тое, што не падкасаў калашыны, — панамакалі ледзь не да каленяў і цяжкімі фалдамі білі па нагах. І больш не зважаў на гэта. Нечакана зноў прыгадаўся Нінін голас. Там, уначы. І ён адганяў гэтую згадку ўзмахамі свабоднай рукі, нібыта адсякаючы гэтымі шырокімі ўзмахамі метры-кіламетры — ад дому. Ад пасёлка...

## 4

Пасёлак жыў звычайнымі, будзённымі справамі. Рыкалі, брыдучы паўз платы, абчапляныя пыльным голлем вішань, каровы. Рыпелі дзверы. Бразгалі вёдры і рука-

мыйнікі. Абганялі рэха чыесьці таропкія крокі. Яшчэ крокі...

Хто спяшаўся на станцыю, каб паспець да цягніка, што памчыць у горад, — шмат хто з руднянцаў працаваў там. Хто, скінуўшы на плячо касу ці граблі, спяшаўся ў бок брыгаднага двара, дзе фыркаў грузавік і раз-пораз ускіпаў вясёлы дзявочы смех.

Прачнулася і бальніца. Невялікі аднапавярховы будынак лыпаў вокнамі, што адчыняліся па чарзе, ад першай палаты да чацвёртай, апошняй. Ніна закончыла прыборку, павыганяўшы ўсіх, хто хадзіў, у калідор. Ці ў садзік, як ахвота. Хадзілі ўсе. Апроч цёткі Варвары. З Запярыння прывезлі на тым тыдні. З цяжкім сардэчным прыступам. І Ніна ледзь што не ўвесь час таўклася недзе паблізу. Калі не ў самой палаце, дык у калідоры. Рэдка бачылася з кім з аднавяскоўцаў, а тут... І нагаварыцца нельга. Дзмітрыеўна ўчора Косціку, унуку Варварынаму, казала, што небяспека не мінае.

— Добрага ранку, цётачка. Як сёння? Мо палепшала? — звыкла, мяккімі, нячутнымі рухамі падсоўваючы пасудзіну, гаварыла-прыгаворвала Ніна. — Вы маўчыце, маўчыце! Вам размаўляць доктарка забараняе. Я і так бачу, што палепшала.

Старая згодна кіўнула галавой. А вочы ціхія. Глыбокія і ціхія. Як дзве мёртвыя студні, у якія раптам зазірнула сонца.

— Выпішуць вас хутка. Сама чула, як Дзмітрыеўна Косціку вашаму казала.

— Ды ўжо ж дома паміраць буду, — ледзь расшчапіўшы вусны, выдыхнула цётка Варвара. — Дома, любка мая...

— Нашто ж паміраць? — паспрабавала ўсміхнуцца Ніна. Вам яшчэ ўнукаў перажаніць трэба. Ведама ж, сэрца! Каму з ім спакойна сёння? І даўняе, і новае на нас замкнулася. Ад той бяды аддыхаліся, новая вайна можа грымнуць... Нябось не грымне... А сэрца што? Ведама ж, пабаліць, пабаліць дый адпусціць.

Яна ўсё церла, церла вільготнай анучкай спінку ложка старой. Усё ўзіралася ў яе ціхія вочы. Усё спрабавала знайсці нейкія гаючыя словы. І разумела: словы не закранаюць цётчыну душу. Не могуць прабіцца праз гэты яе спакой. І не адступалася. Зноў нешта прамаўляла, спрабуючы ўстаць паміж цёткай і смерцю. Пакуль яшчэ магчыма. Пакуль яшчэ ёсць час.

— Ты ідзі. Ідзі, любка мая. Я збірацца буду... — паківала набок галавой, перапыняючы яе, старая.

Ніна разгубілася: куды — збірацца? Цётцы ж і рухацца нельга, не тое што ўставаць. Мо яна сваімі размовамі...

— Не, не! Вы, цётка Варвара, ляжыце. Не ўставайце! Я Дзмітрыеўну пагляджу! — памкнулася яна да дзвярэй і спынілася. І сцялася, прыціснула мокрую анучку да грудзей, пачуўшы:

— Не ўстану я... Збірацца буду...

«НЕ З НАС ПАЙШЛО... «Не з нас пайшло, любка мая!» — гэта ж цётчыны словы! Толькі даўно, вой як даўно казала яна мне іх. Гэтыя словы. Не па словы я да яе прыходзіла. Граблі пазычыць. Усе ўтраіх збіраліся назаўтра сена варушыць, а грабляў двое. Вось маці і паслала да Варвары. Адвячоркам ужо. Зашарэла.

— Пагуляй, любка. Недзе я ўткнула іх, а дзе, і сама не помню. Вось сцаджу малако — і ты сырадою пап'еш. А потым і граблі пашукаем.

— Дзякуй, цётачка.

Я няўцямна сачу за яе рукамі, за яе рухамі, мяккімі і ўпэўненымі. Думкі — недзе далёка. Быццам адасобіліся і ад мяне, і ад вечара гэтага. Чацвёрты дзень абмінаю я сцежку да ракі...

— Вёска гудзе, што замуж цябе аддаюць. Гэта ці не за бусланогага пісара з раёна? Нешта ён усё ля хаты вашай круціцца, — спрытна падстаўляючы жбанкі пад белы пеністы струмень з падойніка, запыталася цётка. Запыталася, пэўна, з простай цікавасці, а мяне як варам аблілі — успыхнула, счырванела, узрушана замахала рукамі.

— А-ёй! Ці мала што да языкоў наліпне? Круціцца і круціцца! Не забароніш жа. Я, цётачка, замуж не збіраюся.

Варвара не падымае галавы, не адказвае. Закончвае сцэджваць малако. Апаласквае падойнік. Чапляе яго на штыкеціну.

— Не хочаш казаць, не трэба. Памажы мне жбанкі да ганка знесці, — абзываецца нарэшце. — Толькі бабы марна гусці не будуць, любка мая. А тым часам пісар той з бацькам тваім, з Цімохам, гаварыў. І непаразумення нібыта не ўзнікла: сватоў засылаць збіраецца.

— Сва-тоў? — няўпэўнена спрабую я запярэчыць (значыцца, не гульня ўсё! Значыцца, за маёй спіной змова). — Як — сватоў?

— А і то сказаць: жаніх ён хоць куды! Па нашых часах...

— Пайду я! — паварочваю я назад ад сенцаў.

— Граблі вазьмі. Зараз я, любка, — мітусіцца цётка Варвара, учуўшы маю раптоўную роспач, горкую роспач. — А ты сырадою папі, пакуль я спраўлюся, выпі сырадою!

Яна таропка ідзе да хлеўчука, бярэ граблі (яны і стаялі там, ля сцяны!), вяртаецца, узіраючыся ў мяне.

— Пыхкія вы пайшлі сёння. Хто яго акуратна даведаецца, як і што, а туды ж. Крыўдуеце на старых за словы іхнія, за парады. Спакон вякоў гэтак, любка мая: дзеці бацькоў слухаюць. Павінны. Не з нас пайшло. Вось і ты.

— Я пайду. Дзякуй за пазыку, цётка Варвара. Заўтра ўвечары прынясу, — перапыняю я гаворку. Можа, і занадта рэзка перапыняю, бо, азірнуўшыся ад веснічак, бачу, што янаківае галавой, сашчапіўшы на грудзях рукі.

«Бабы гудуць... Вёска ўсё ведае... Сватоў будзе засылаць...» — словы рассыпаюцца, ледзь пачынаю іх збіраць, каб неяк акрэсліць раптоўную разгубленасць. Нешта тут не так. Усё паварочваецца не як хацела, а як думала. Як баялася думаць. Не, не! Тата спытаўся б у мяне, перш чым слова даць. Мала што бабы на платы панавешваюць!

— Мама, я да Фросі схаджу! — гукаю ў адчыненыя сенцы, уткнуўшы граблі ў капу сена ля стопкі. І, не чакаючы адказу, — подбегам з двара.

Ужо добра звечарэла. Зрэдку пракідваюцца зоркі. Хвіліна, другая — і вынырне з-за старых вербаў ля рэчкі месяц. Вада ўжо свеціцца там, пад тым берагам. Здалёк відаць. У прагалінах...

Ногі самі нясуць па знаёмай сцежцы, абганяючы думкі. Абганяючы нават позірк, які не-не і зачэпіцца за ліст падарожніка, ці за вербалозіну непадалёку ад сцежкі, ці за бліск вады ў прагале паміж голля. Я ўжо супакойваю сябе. Пасяджу на тым месцы, дзе ручнікі

сушыла, думаю. На вечар падзіўлюся. Светлавалосага памагатага ўспомню. З'ехаў, пэўна... Не відаць...

— Як доўга ты не йшла, Ніна.

Сцяпан (гэта ён, ён, канечне!) падымаецца насустрач — быццам вырастае з травы, з ліловага змроку. Я ад нечаканасці, ад нечаканай, незразумелай радасці ўскрыкваю, не паспеўшы зацінуць рот далонню. Хоць чакала ж, чакала: а раптам?..

— Ці не ваўкалак ты часам, га? — баранюся немаведама ад чаго. — Перапужаў. Хоць вады з рота прасі!

— Як доўга ты не йшла!

— Хіба я абяцала? Не да цябе, да рэчкі ішла.

Сцяпан не адгукаецца. Бязгучна набліжаецца. Ужо зусім побач. Я чую, як гулка калоціцца яго сэрца. Ці маё... Усё паблыталася. Наўколле звузілася да майго позірку, зараз проста такі прыкаванага да Сцяпана, да яго твару.

— Хіба я абяцала? — паўтараю я менш упэўнена. І гляджу, як уздрыгваюць, напружваюцца яго вусны, лашчачы нейкія словы. Слоў не чую. А вусны набліжаюцца і набліжаюцца да маіх.

— Хіба я абяцала? — спрабую я адасобіцца ад таго, што ўжо прыйшло, — радаснае і трывожнае адначасова. — Хіба я...

Усё знікае. Гарачая хваля пяшчоты ахінае нас дваіх. Вуснамі адчуваю, як уздрыгваюць Сцяпанавы вусны, мякка, пяшчотна зрываючы ці то ўскрык мой, ці то ўздых. І зноў — няма ні мяне, ні Сцяпана. Толькі высокая гарачая хваля вечара. І неба над ёй. Светлае-светлае, як толькі што прытушаны маімі вейкамі хлапечы позірк.

Я ніяк не магу апамятацца, адарвацца ад хлопца. Ды і не хачу — марна гэта ўтойваць! Ды і не атрымалася б... Рухі Сцяпана нячутныя, пяшчотныя. То пальцы яго ціха кранаюцца маіх валасоў, і цяпло іх сцякае па касе — на плечы... То ў далонях яго, у абдымках, сама гарнуся шчыльней: шчака знаходзіць шчаку, дыханне — дыханне, вусны — вусны...

Усё знікае. Ёсць толькі гэта шчаслівая блізкасць. Цнатлівая. Нясмелая.

— Жаўранак ты мой, — шэпча Сцяпан. — Пташынка нясмелая...

І я не ўсведамляю: мінуты ці гадзіны цякуць паўз нас над лёгкай плынню Пцічы. Шэпт гэты, узрушанае

маўчанне маё прывабілі ўсіх салаўёў з аселіцы: пошчак заглушае сэрцабіццё. Ды і ці б'ецца яно, сэрца?

— Сцяпан, — раблю намаганне, спрабую вымавіць, вусны ў вусны прамовіць я. — Пагодзь, Сцяпан...

І сама гарнуся да яго. Сама п'ю яго гарачае дыханне, хмялеючы, не чуючы зямлі пад сабой. А Сцяпан раптам бярэ мяне на рукі і падымае. Высока падымае. І я ўся лёгкая-лёгкая: адпусці ён — і паляцела б! Але ён не адпускае. Горне мяне да грудзей і не адпускае. Ступае крок, другі. Кудысьці ўгору ступае. Я расплюшчваю вейкі і бачу толькі неба. Толькі зоркі — многа-многа зорак, што на тонкіх нітачках звісаюць над намі. Укруг нас. Можна дацягнуцца і крануць якую рукой. Вось бы звон пайшоў! Я падаюся да іх, кранаю і...

— Ні-на-а! — гукае хтосьці са сцежкі. — Ні-на!

І чары рассейваюцца. Выслізгваю са Сцяпанавых рук. Падношу далоні да шчок, што палаюць, як макаў цвет, няйначай. Добра, што не відаць. Адгароджваюся далонямі ад Сцяпана, калі ён імкнецца наблізіцца, як раней.

— Гэта Фрося гукае, — тлумачу. — Сяброўка.

— Табе здалося. Гэта я крычаў, каб цэлы свет пачуў тваё імя. Гэта — імя майго шчасця... — ён мяккім рухам бярэ мае далоні, складвае іх разам і падносіць да губ. Цалуе іх. Яшчэ і яшчэ.

— Ні-на! — аддаляецца Фросін голас.

— Чуеш? — чамусьці шэптам пытаюся я.

— Я чую, як б'ецца тваё сэрца ў маім. Так цяпер будзе заўсёды. Усюды, дзе б я ні быў. Дзе б ты ні была...

Ён кажа гэта не мне. Далоням маім. Я чую — адчуваю! — кожны рух яго ных вуснаў. Стала раптам балюча — дотыкі вуснаў апякаюць.

— Сцяпан, мяне замуж аддаюць. Уся вёска гудзе...

Сцяпан дурасліва ківае галавой, ашчапіўшы яе маімі і сваімі далонямі.

— А што, не казаў я табе, не казаў: птушкі самі выбіраюць, з кім ім ляцець да зорак. А ты — птушка. Пташынка мая! І ты — мяне выбрала. Праўда? Таму і прыйшла.

Я маўчу. Апусціла галаў яму на грудзі і маўчу, і ўслухваюся, слухаю, як якаясьці няўцямная трывога вярэдзіць, разварочвае сціхлую, абмяклую душу.

— Ты ж прыйшла. Я аднаго баяўся, што ты не

прыйдзеш. Але ж ты прыйшла! І ты са мной. І так будзе вечна. Чуеш? Так будзе вечна...»

Што ж ёй сказаць старой Варвары? Што зрабіць для яе? Паткніся яна, Ніна, разбіць гэты спакой, гэту абыякасць да таго, што адбываецца з ёй, яшчэ засярдуе цётка. Ды мо і не абыякасць гэта, а глыбокая засяроджанасць — мо абрад нейкі душа яе праўляе... Усяго і вечнага ў жыцці, што — само жыццё. Аднаго смерць падсцеражэ — нехта іншы жыццё далей панясе. А куды — далей, ніхто, пэўна, не ведае. Кожнаму шлях прадвызначаны. Вось і ўсё, што вядома. І нічога ў тым не зменіш. Нічога не адменіш.

Ніна ўсё ўзіралася ў ціхі, адзначаны цяжарам пражытага, твар старой, якая больш не зважала на Ніну: уся — у сваім, у сваіх думках. Ніна ўсё спрабавала зразумець гэты цётчын спакой — адсутнасць боязі перад блізкім, немінучым расстаннем з усім, што было жыццём, што было ёй самой.

Вось жылі калісьці ў адной вёсцы. А што яна, Ніна, ведала пра старую Варвару? Адно ўсплыве, другое... Шчаслівай цётку не назавеш: якое ў яе тое шчасце? Ад цямна да цямна спіны не разгінала. З Хвядосам як ні жыла, а не нажылася: надарваўся неяк у кузні, месяцы са тры паляжаў і памёр. Чатырох сыноў ажаніць марыла... Як жа іх звалі, сыноў яе? Іван. Мікола. Пеця... І Саша. Аляксандр. Гэта яна яго гэтак звала, Аляксандрам. А для вёскі Сашкам быў... Івана толькі і ажаніла Варвара. Вайна пачалася. Вайна ўсіх чатырох забрала. І Івана... Нявестка ў Дубраўку маці наведаць пайшла. І не вярнулася. Казалі, у Нямеччыну пагналі — усіх, хто трапіў у аблаву, пагналі... Як Варвара з двума ўнукамі на руках выжыла тады, мала хто ведаў. Яна, Ніна, не ведала. Яна і пра сябе не ўсё ведала.

Ніна адмахнулася ад калючых думак, яшчэ раз уздыхнула ў бок старой і прычыніла за сабой дзверы. Цыкнула на хворых, што, як здалося ёй, занадта гучна гаманілі паблізу, і пасунулася шукаць Дзмітрыеўну.

## 5

Сонца гарэла над зямлёй роўна, яркім — да залатога — агнём, непрыкметна падцягваючы да сябе вышыню. Туман ужо не дыміўся. Растаў у цёплай, разрэджа-

най ветрам сінечы. Толькі цені алешын усё яшчэ былі доўгімі, няўклюднымі і наскрозь вільготнымі. Яны пагойдваліся на мятліку і, падрэзаныя Павэлкавай касой, лажыліся збоку з ціхім, ледзь чутным звонам. Ці, можа, гэта каса вызвоньвала так тонка.

Сюды, на паляну, зарослую мятлікам, зязюльчыным лёнам і званцамі, сонца яшчэ не прабілася. Сцяной з усходу стаяў лес, і расу яно вып'е тут няхутка. Павэлак задаволена пакрэктваў на кожны ўзмах касой. Каса ішла лёгка. Пракос, шырокі і роўны, радаваў вока... «Можа, варта было пайсці ў брыгаду? — мільганула думка. Ат! Яму, Павэлку, ад саўгаса нічога не трэба, і яны без яго абыдуцца!

Ён акуратна абкасіў паляну. Да самага кустоўя. Прасоўваўся далей. Узлескам у бок чыгункі. Спыняўся. Паплёўваў на рукі. Адбіваў касу. І зноў мераў ранак дужымі, дакладнымі ўзмахамі. Хацелася курыць. Нарэшце ўцёр рукавом сарочкі лоб, утыркнуў кассё ў зямлю, палез у кішэню па капшук. Доўга скручваў цыгарку, услухваючыся ў наўколле.

— Гэта ты, Пятровіч, да маёй гаспадаркі падбіраешся? Здароў! — пад'ехаў на кані Гнась Засека, сябрук Павэлкаў — яшчэ па партызанах. Ігнат, калі правільна. Але як пайшло яшчэ змоладу: Гнась ды Гнась, дык так і ідзе. Лесніком зараз у лясгасе! Зрэдку бачацца...

— Здароў, Гнась!

Павэлак абрадаваўся сустрэчы. Нешта смылела яму сёння душа. І чапаць ён яе не чапаў ніколі, дык не! Зрэдчас усё ж выказвала сябе. Вось і сёння. З ночы пачалося. З голасу Нінінага. З птушак... Цьфу!

— Здароў, браце! — паўтарыў ён вітанне, моцна паціскаючы руку сябрука, які ўжо саскочыў з каня, закінуўшы повад на сядло, адпусціў яго і стаяў цяпер побач з Павэлкам, стаяў і жмурыўся на сонца, што зазірнула ўжо і сюды, за алешнік. — Ты ўсё са стрэльбай і ў сядле?

— З гэткай стрэльбай можна: калі і пальну колькі раз на год... Больш для спалоху. А калі і не спатрэбіцца зусім. З гэткай — можна.

Яны закурылі. Памаўчалі, глыбока зацягваючыся. Кожны думаў пра сваё. Абодва думалі пра адно і тое ж. Пра гады, якія абмінаюць толькі мёртвых, а на іх, упа-

лелых у вайну, навальваюцца ўсё цяжэй. Пра стрэлы, якія гучаць цяпер так далёка, што не дасягаюць слыху: адно душа і чуе зрэдку. Пра лес, які ратаваў, каго мог, — таго, хто сам ратаваўся...

— А я пакасіць выйшаў. Рукам дам работу, думаю, — і на душы палегчае. Ды і капейчына ў хаце не лішняй будзе, — першы азваўся Павэлак.

— Усё для Ніны сваёй шчыруеш?

— Для яе. Толькі ёй гэта ўсё непатрэбна! — вырвалася ў Павэлка. І ён адразу пашкадаваў, што вырвалася, закалацілася ўсё ў грудзях ад гэтых слоў. Паспрабаваў перавесці гаворку: — Ты не думай. Мы добра жывём. У згодзе.

І, зразумеўшы ўсю неперakанаўчасць сказанага, адно махнуў рукой. Зацягнуўся дымам. Раз. Другі.

— Пасварыліся б калі пад назіркам ночы! — нявесела пажартаваў Гнась. — Усё б нешта змянілася. Га? Я ад сваёй Тэклі часам толькі ў лесе ратуюся. Як распаліцца — словамі можна ўсе елкі паабчапляць. А Ніна...

— Халодная яна. Быццам выпалена ўсё ўнутры. Ні зямлі, ні неба не бачыць, здаецца. Піць пачала. Крадком ад мяне спрабуе піць. Даўно ўжо.

— Я ведаю, — адвярнуўся Гнась, папраўляючы на плячы стрэльбу.

— Ве-даеш? — злякнуўся, зніякавеў неяк Павэлак.

— А хіба што ад людзей утоіцца? — камячыў у пальцах згаслую цыгарэту Гнась. — Ты маўчыш, дык думаеш, людзі не бачаць? Пагаварыў бы ты з ёй, ці што?..

— Гаварыў.

— І што яна?

— Што? Не чуе. Пазірае мне ў вочы, ківае — і нічога не чуе. Я ўжо неяк, не паверыш, замахнуўся быў на яе.

Павэлак пачаў скручваць другую цыгарку. І ўсё ніяк не мог скруціць. Тытунь рассыпаўся... Нарэшце скруціў. Падаўся да запалкі, якую запаліў Гнась, прыкрываючы агеньчык ад руху далонню.

— Не, не ўдарыў, — адказваючы на нямое запытанне сябра, працягваў ён. — Чорт яго ведае, гэта ж як дзіця неразумнае стукнуць. Ці сабаку, ледзьве жывую... А Ніна і не заўважыла рукі маёй адведзенай.

— Трэба было стукнуць. Закрычаць — але стукнуць!

З бабамі па-добраму нельга. — Гнась, відаць, згадаўшы сваю Тэклю, адно махнуў рукой.

— Не магу, Гнась. Не здолею. Здэцца, і душу з мяне даўно вынула, а — не магу. Чужая яна.

— Во-о, дурань, — мацюкнуў Павэлка той. — Чужая... Дваццаць гадоў пад бок табе кладзецца — і чужая?! Ты што, не мужык? Га? Не муж ейны?

Гнась шумна абураўся. Мо якраз таму шумна, што адчуваў нейкую Нініну праўду, а якую — не ведаў. Ды і Павэлка было шкада. Сябра ўсё-ткі. Не адзін год рукаліся. Каліcь ваявалі разам.

А Павэлак ужо не слухаў яго. У думках нават папракаў сябе за шчырасць. Знайшоў у чым спавядацца! Гнась разумее, канечне. Ды яму, Павэлку, разуменне гэта не дапаможа. Праўда, унутры нібыта сцішылася трохі. На нейкі час. І ўсё ж дарэмна ён словы распусціў...

— Будзе як будзе. Дзякуй, браце. Пайду памахаю яшчэ з паўгадзіны касой, — падаў ён руку Гнасю. — Заходзь калі! Пагамонім.

І павярнуўся да касы. І, ужо ўзмахнуўшы касой, раптам згадаў, што хацеў папрасіць у Гнася колькі жардзін — агароджу ад Пахома паправіць. Але не спыніўся. Ды і Гнась ужо ўскочыў у сядло і крануў каня, кіруючыся ў пасёлак.

«Іншым разам неяк, — супакойваў сябе Павэлак. — Іншым разам...» А ад чаго супакойваў? Што — іншым разам? Жардзіны папрасіць? Дык пры чым тут жардзіны!

Чырк! чырк! чырк! — адмервала крокі каса, зрэдку ледзь паспяваючы абмінуць купіну. Пачыналася забалочаная раней лагчынка — можна было тут і спыніцца. Але Павэлак усё адводзіў плячо, усё ўзмахваў касой і... Купіна ўсё-ткі трапілася пад самую руку! — ён рассек яе цяжкім узмахам. І цяпер здзіўлена пазіраў на парушанае гняздо нейкай пташыны. Мяккае, усланае пёркамі. А на дне — яечкі. Драбнюткія яечкі ў блакітную крапінку. Два... Тры!

— Цьфу! — зазлаваў Павэлак. — Насланнё нейкае.

Над ім з крыкам насілася птушка. Невялічкая. Мітуслівая. Д'ябал яго ведаў што за птушка, а крычала — ад крыку ажно вушы закладвала.

Павэлак адмахнуўся ад яе, потым яшчэ раз сплю-

нуў і, выцершы травой касу, ускінуў яе на пляхо. Хопіць! Здаволіўся.

«ХТО НЕ НАРАДЗІЎСЯ, ТОЙ УМІРАЦЬ НЕ БУДЗЕ! Гэтак, здаецца, казала Ніна маці. Неаднойчы паўтарала. Хоць хто ведае, каму паўтарала — Ніне? мне? свету беламу?

Не любіла мяне. Не прыняла. Адразу не прыняла. Я, дурань, не адразу зразумеў. Аж да таго вечара, які парушыў усё, што я будаваў цэлыя тры месяцы, не зразумеў. А ў той вечар...

Спыніў кабылу непадалёку ад Цімохавага двара. Не так, каб ля варот. Прывязаў. Пайшоў да знаёмых весніц, адказваючы на знарок сур'ёзныя прывітанні, быццам і не чуў спіной, як пасміхаліся ўслед маладзейшыя.

— Ах, якія ў вас боты, глядзецца можна...

— Можа, ад маёй чупрыны што возьмеце, Пятровіч? Надта ж дзеўкі ў нас маладыя!

— А ён не да дзевак, ён да іхніх куфэркаў прыглядаецца!

Фрося Гуцькава... Гэтую я адразу пазнаў: вечна трапляецца на шляху, калі б ні прыехаў. Мала што трапляецца — абавязкова зачэпіць, язык свой павострыць. Смалы б пякучай на гэткі язычок! Нездарма ж кажуць: дзе чорт не можа, там бабу пашле... Яна, гэтая Фрося, няйначай, і разносіць па вёсцы ўсю бязглуздзіцу пра мяне. Ну, старэйшы я за Ніну! Дык хіба ж стары? Дзесяць гадоў і тры месяцы між намі — няшмат. Асабліва калі ўлічыць дом у пасёлку, гаспадарку і службу маю. Ну, задужа высокі — за вярсту відаць! Дык гэта ж і добра. Ніхто з драбнейшых не палезе ў супернікі. Не пасмее. Ну, гавару па-гарадскому — з прыдурам, як яна кажа! Дык жа сямігодку скончыў. Вучыўся. У людзі затое выбіўся.

Хоць чаго я апраўдваюся? Перад кім? У гэтым богам забытым...

— А-а, Пятровіч! Маё шанаванне, ей-богу. Што не відаць колькі дзён ужо?

— Добры вечар, Цімох Васільевіч. Ніна дома?

— А ты заходзь, заходзь у двор! Што з-за брамы пытацца? — замітусіўся той, адчыняючы весніцы. — А кабылку дзе навязаў? Каб не звялі! Жартаўнікі знойдуцца, ей-богу...

Заходжу ў двор. Вітаюся з цёткай Ганнай, якая

перабірае ля ганка леташнюю бульбу. І прыпыняюся.

— Дык ці дома Ніна?

— І што ты, добры чалавек, вочы ўсім у вёсцы мазоліш? І ходзіш, і ходзіш... Няма Ніны. З моладдзю нейдзе, — абзываецца цётка.

Учуўшы прыхаваныя злосныя ноткі ў яе голасе, не знаходжу, што адказаць. Зіркаю на Цімоха. Ён — на мяне. Паткніся пярэчыць гаспадыні — каб яшчэ горш не выйшла! Яшчэ аблае...

— Чаго ты, Ганна, яй-богу? — нарэшце мовіць Цімох, не паварочваючы ў жончын бок галавы. — Хутка сваты ў хату...

— Сва-ты! — усплёсквае яна рукамі. — Здурэў ты, Цімох, ці што? Дзеўка нос вароціць, а ты пра сватоў... З чым прыйдуць, з тым і пойдуць сваты. Пятровічу твайму за Нінай трэба было хадзіць, а не за табой, старым!

Крыўджуся не гэтулькі на словы цётчыны, колькі на тое, што пра мяне яна кажа, нібыта ў маю адсутнасць, нібыта не стаю я побач, за які крок ад яе. Не да двору — не трэба!

— Не да двору, значыцца? Бывайце тады, — абцягваю кашулю, каб нечым заняць доўгія рукі, і павяртаю да весніц. — Я з павагай усёй да вас... Я як лепей хацеў. А вы радасць у мяне адабралі. Вы...

— Ды ты не памыслі, яй-богу! Адна яна ў нас.

Цімох мармыча яшчэ штосьці, подбегам праводзячы мяне ажно за весніцы. Што — не чую. Кіпіць усё ўва мне. Чую адно: як шалёна б'ецца ў жылах кроў. Не да двору! Гэта я! Ды я цяпер і не зірну на іх красуню! Ды я дзесятым шляхам абміну гэта богам забытае Запяранне! Ды я...

Усведамляю, што іду ў адваротны ад навязанай кабылы бок, не адразу. А ўсвядоміўшы, не паварочваю назад. Трэба перш супакоіцца. А то чаго добрага... Колькі той вёсачкі: чорт яго набярэцца на ўсіх тлумачэнняў. А палезуць жа. Перапыняць. Як жа! Не! Праз колькі двароў павярну да рэчкі. Яшчэ не вечар. І твар можна астудзіць вадой. І камароў з дзесятак шлэпнуць. Усё, годзе! Нагі маёй тут больш не будзе!

Іду. А крокі ўсё запавольваюцца. І думкі, што абселі галаву, аціхаюць пакрысе. У такт крокам. А сцежка ўсё звужаецца. Падымаю вочы і... Каб не ўскрыкнуць, ба-

люча прыкусваю, зашчэмліваю між зубамі губу! Мігаю, вачам сваім не верачы: зусім блізка — ледзь што не пабач — Яна! Яны. Ніна і нейкі хлюст. У абдымку.

Нашто вам што, калі вунь яно, тлумачэнне ўсяму. Кальнула ў сэрцы. Адступаю крыху назад. У бок ад сцежкі. У цень вербалозіны. А сам вачэй не зводжу. Гадаю: хто? Ладна збіты, у сіняй кашулі з зухавата адкладзеным шырокім каўняром. Светлавалосы... Не, не магу згадаць. А Ні-на! Ніна як прыклеілася да яго! Вунь яно што...

Адчуваю ўсю сваю бездапаможнасць, бяссільна скрыгачу зубамі. Сплёўваю адно брыдкае слова, другое... Пуста ўнутры. Глыбока-глыбока — пуста.

Заціскаю рот далонню. Адступаю яшчэ далей. Назад. А ў позірку ўсё пагойдваюцца дзве постаці, злітыя ў адну. У адно. У абдымак. «Ненавіджу! — крычыць ува мне боль. — Ненавіджу!» А я заціскаю рот і адступаю. Спатыкаюся. Чапляюся за голле. Выцягваю, адцягваю ад рэчкі — ад іх дваіх — позірк. Вунь яно што... Вунь яно што!

Натыкаюся спіной на чыйсьці ціхі ўскрык. І дзеравянею. І адрываю, нарэшце, позірк ад убачанага, спрабую павярнуцца і...

— Ты нагу мне разгнёў, Павел.

Фрося! Я ажно застагнаў, сцінаючыся ў балючы камяк. І тут усачыла! І тут пад руку трапіла! Разгінаюся, рэзка паварочваюся, ледзь не збіўшы галавой сукаватую галіну. Вось дзе я магу ўсё ёй выказаць, усю нянавісць сваю. Вось дзе ёй...

Фрося плача. Стаіць на адной назе і па-дзіцячы, кулакамі, размазвае па шчоках бабіны слёз. Даходзіць раптам да свядомасці: гэта ж пра нагу нешта казала — наступіў, ці што?

— Чаго ты?

— Нага...

— Дзе? Пакажы, — апускаюся я на кукішкі, потым на калена: як забываюся на момант пра тых, дваіх. — Гэта нага? Тут?

Націскаю, відаць, не надта асцярожна, бо дзеўка ўскрыквае, учапіўшыся за маё плячо. І праглынае наступны камяк слёз. І ціха, быццам апраўдваецца, шэпча:

— Дужа баліць, Павел.

Павел? Бач ты! Адкуль толькі ціхасць і пакора ўзя-

лiся? Высмейваць на ўсё вёску — яна першая! Мянушкi выдумляць — лепш за яе нiхто не выдумае! Мо i Нiне нагаворвала... Раптоўна накочваецца злосць. На сябе. На Фросю гэту. На лёс няўдалы. I, здавалася ж, усё складвалася добра, дык не! Хлюст нейкi дарогу перайшоў i вось, зусiм побач, Нiну да сэрца прыцiскае... А я? А мне — злосцю душыся? Што я, нежывы? Што ў мяне — хвост авечы замест сэрца?

Занадта балюча, вiдаць, абмацваю Фросiну ступню, бо яна ўчапiлася рукамi ў маё плячо (на адной жа назе стаiць) i сцiскае яго ўсё мацней. Але маўчыць. Зацятая. Адно слёзы, як бабiны, пэўна, коцяцца... Па-вел! Цяпер — Павел!

Рука, паслухмяная думцы, слiзгае вышэй... Да круглага дзявочага калена. Чаму б i не? Сама нагу падставiла! Усе ж яны з аднаго цеста... Злосць варочаецца ў грудзях, лена распаўзаючыся, зноў падагравае кроў. Чаму б i не? Проста вось тут. Побач з тымi!

Забыўся i на Фросiну ступню, i на яе слёзы. Пагладжваю, цiскаю ногi. Вышэй i вышэй. Перашкаджае спаднiца...

— Павел! — пачала адштурхваць мяне дзяўчына.

Але позна ўжо. Я нiчога не ўсведамляю. Апроч прывабнай мяккасцi дзявочага цела. Апроч шалёных штуршкоў сваёй крывi.

Яна вырываецца. Ускрыквае. Штосьцi крычыць мне. Цi гэта мне здаецца? Я не сачу болей нi за сваiмi рухамi, нi за сваiмi думкамi. I калi Фрося ўсё-ткi вырываецца, выслабаняецца з маiх рук, кiпцюрамi разадраўшы мне шыю, са стогнам валюся ў траву. I плачу, нечакана пачынаю плакаць. Цiха. Узахлёб. Ад злосцi, што ўсё слабее, — змаглася, пэўна, душа. Ад таго, што люблю Нiну, а яна абдымаецца над рэчкай з нейкiм светлавалосым. Ад таго, што мог бы вось зараз здаволiць сваю кроў i выпусцiў, не ўтрымаў дзеўку...

— Бедненькi! — калыхаецца нада мной Фросiн шэпт. — Як цябе...

Што яна, яшчэ тут? Не кiнулася ўцякаць? А! Нага ж у яе... Спрабую засяродзiцца на гэтай думцы, а чую: круцiць нешта мяне — ажно ў зямлю ўцiскае. Не тое што падняцца, галаву адарваць ад зямлi не магу. А дзяўчына, як знарок, наблiжаецца, садзiцца на траву. Побач. Зусiм побач дрыжыць яе ўсхваляванае дыханне. Больш таго! Рукой, пальцамi Фрося кранаецца маiх

плячэй. Валасоў. І пачынае гладзіць валасы, мякка, амаль нячутна іх перабіраючы.

— Бедненькі!

— Не смей мяне шкадаваць! — сіплю, ад болю кусаючы далонь. — Смейся! Момант дужа зручны.

Чамусьці хочацца зноў распаліць злосць, якая штурхнула мяне да дзеўкі. Але злосць кудысьці адышла і не вяртаецца. А ад супакойлівых, мяккіх рухаў дзявочай рукі адмякае, вызваляецца ад напружання, ад здранцвення цела.

Мінута, другая — я ўжо сяджу побач з Фросяй, недаўменна ўзіраючыся ў яе журботны зараз твар. Язык свой востры праглынула яна, ці што? А можа... Не! — адмахваюся ад няўцямнай думкі. Бусланогім празвала. Ніводнага разу не прамінула, каб асцюк у сэрца не ўсадзіць. Шыю вунь разадрала...

— Ты што, ісці не можаш? — пытаюся знарок груба, пагладжваючы драпіны на шыі.

Яна ківае.

— Чакаеш, што я давяду?

Зноў ківае. У адказ на маю сярдзіта-чужую ўхмылку:

— Яшчэ чаго! — хачу я падняцца.

— Павел! — у яе голасе яскрава чуецца роспач — быццам зноў вось-вось пасыплюцца слёзы. — Зараз сцёмніцца... Мы агародамі... Тут жа як вокам кінуць!

І, адвярнуўшыся, шэптам:

— Хіба я вінаватая?

І яшчэ цішэй:

— Прабач...

Гэта — за драпіны на шыі. Абазваўшы сябе ў думках ёлупнем, застаюся сядзець, чакаць, пакуль добра сцёмніцца. Зрэдчас адмахваюся ад камароў. Думаю пра Ніну. Гадаю, ці пайшлі яны ўжо ад рэчкі! Адчуваю, як недзе глыбака, на самым дне думкі, зноў пачынае варушыцца злосць.

— Ты чаго? — уздрыгваю ад нечаканасці, пачуўшы на шчацэ дотык дзявочай далоні.

— Камар... — абзываецца Фрося.

А далонь яе ўжо прыкрывае маю руку на траве, цёпла пашавольваецца там. Можа, і праўда... Хто каго любіць... Адкінутая здагадка ўсё ж нейкім чынам непакоіць: чаго ж тады гэтак адбівалася толькі што, колькі хвілін назад?

— Дагуляешся! — рэзка папярэджваю дзяўчыну, адсоўваючы руку.

— Мо пойдзем?

— Зараз. Зірну, ці няма каго.

Падымаюся. Зіркаю не ў бок сцежкі — у бок ракі. Там ужо нікога няма. Ціха паўзе туман над вадой. Шэпчуцца вербы. І — нікога наўкруг.

Адвёў ад твару голле. Падаў Фросі руку. Яна ўстае, цяжка абапіраецца на маю руку. Уся абмяклая і гарачая — праз кашулю рука ўспыхвае... «Чаму — не? Чаму? — пытаю зноў і зноў. — Цяпер жа ўсё адно...» І спрабую прыхінуць да сябе дзяўчыну. Яна не вырываецца. Толькі наструньваецца ўся. Цела — як дрогка напятая струна.

«Хоць бы яна маўчала! Хоць бы маўчала!» — заклінаю немаведама каго. У думках. Хоць якія там думкі, калі ўсё знікае, знікла ў густой чырвонай смузе: і рака, і вербы, і сцежка, і Фрося... Ёсць толькі яе мяккае гарачае цела, якое рукі мае ліхаманкава вызваляюць з апраткі, з нейкіх бясконцых жаночых зашпілек. Ёсць толькі гэта цяпло, якое я п'ю, ірву губамі, схіляючыся ўсё ніжэй і ніжэй.

Фрося не вырываецца. Ці я не чую. Я хачу ўціснуць яе ў сябе, глыбока ў сябе — туды, дзе смыліць, дзе будзе вечна смылець душа. Ці ведаю я ў гэты момант, чаго хачу? Чорт яго ведае... Ёсць толькі гэтае цела! Ды яшчэ цяпло... Ды яшчэ горкая, з прысмакам палыну на губах прага...»

Павэлак ледзьве шкандыбаў, пятляючы за зарослай каляінай. І каса змуляла плячо... Што ён смакуе гэтыя ўспаміны? Адышло ўсё. Гады сцяной выстраіліся — не пераскочыш. І ён, бусланогі, не пераскочыць. Адскакаў сваё. Па лясах ды балотах, вайной акружаных. І потым...

Гэта тады, у юнацтве, яшчэ да вайны, здавалася, што ўсё яшчэ будзе, што ўсё — наперадзе. А што — усё? Цяпер, азіраючыся на пражытыя гады, ён і бачыць не бачыў нічога вартага той маладой упэўненасці. Штосьці пахавана ў яго душы, штосьці мучыць часам, а да сутнасці не дабрацца. Не дакапацца...

Хацелася курыць. Але прыпыняцца ён не стаў. Дома, на ганку, пакурыць.

## 6

Колькі хворых людзей! Іхняя бальнічка невялікая — часта перапоўнена, а як усіх сабраць... Нядобра нешта ў свеце, калі людзі не галадаюць, не мерзнуць — а хварэюць, не могуць з болем якімсьці справіцца. Ідуць і ідуць да ўрачоў. А што ўрачы? Больку загояць. Косткі складуць правільна, каб зрасліся. Мікстуру выпішуць. У душу чалавеку зазірнуць і ўрачы не могуць. І рэнтген не дапамагае. Яна, Ніна, неаднойчы назірала ў цёмным кабінеце. Шкілет паказвае іхні апарат. Плямінкі ўсякія. А што — плямінкі? А калі на душы гэтыя плямінкі? Душы ж мы не ведаем. Таму і не прызнаём, бо не ведаем.

— Ніна? Што ў цябе? Мо спірт прыйшла зноў прасіць? Не дам, — не падымаючы галавы ад папер, пазнала Ніну па кроках урач, шчупленькая, ваструплечая жанчына ў акулярах.

— Старая Варвара паміраць збіраецца. Ты б зірнула, Дзмітрыеўна! З адной вёскі мы. З Запярыння. Ты ж ведаеш.

Дзмітрыеўна падняла позірк.

— Што? Новы прыступ?

— Ды не. Спакойная надта. Нібыта ўжо нежывая. Збірацца, кажа, буду. Смерць чуе.

— Мы ўсё зрабілі, — зноў апусціла тая галаў у паперы і стомлена дадала: — Ёй — шэсцьдзесят чатыры гады, галубок. Сэрца зношанае.

Ніна маўчала. Стаяла і нечага чакала.

— Ды сядзь ты! Не стой за спіной, — сказала, як загадала тая. — Зараз скончу, і пойдзем да старой. Я паслала ўжо газік райкомаўскі па яе ўнукаў. Ты — як? Даўно не скардзілася...

— Я? — апусцілася Ніна на краёк крэсла. — Жыву. Што мне зробіцца? Жывыя жывуць.

«ЖЫВЫЯ ЖЫВУЦЬ... І доўга верацць, што ўсё будзе вечна. Жыццё будзе вечна. І маладосць. І каханы побач... Хто ж чакаў вайну, нават калі гаворка пра яе не-не і ўсчыналася то ў адной хаце, то ў другой? А я дык нічога і не чула. Не слухала. Я пакахала — кахала! З кім ні гавару — Сцяпана бачу. Што ні раблю — вечара чакаю. Чакаю, калі можна будзе выслізнуць за

весніцы і непрыкметна звярнуць на сцежку. Да рэчкі. Да Сцяпана...

— Куды гэта ты, дачушка, бегаеш штовечар? Ні бацьку, ні мне не пахвалішся. Фрося ўчора заходзіла: не помніць, казала, калі і гаманіла з табой.

Ох, ужо гэта Фрося! — усміхаюся міжволі сама сабе: не вытрымала ўсё ж, сказала маме...

Ужо ад парога вяртаюся, падыходжу да маці, якая сядзіць ля чыста прыбранага стала, рукамі цярэбячы хвартух на каленях. Уся такая маленькая. Такая родная!

Штосьці раптам змушае ўкленчыць перад ёй, уткнуцца тварам у яе шурпатыя, пахкія далоні — тварам, вуснамі прыпасці да іх. Як у маленстве. Даўно-даўно. Ці то ад згадкі, ці то яшчэ ад чаго ўсхліпваю. Шчасцем, замілаванасцю поўніцца сэрца, а слёзы... Слёзы ад віны нейкай неўсвядомленай перад маці. Ад таго, што ступіла ўжо на яе сцежку і нічога-нічога не бачу наперадзе, апроч Сцяпана.

— Кахаю я яго, мама. Так кахаю, што за шчасце сваё баюся.

— Не шчасця трэба баяцца, вачэй нядобрых.

— Я пабягу, добра? Ён чакае, — падхопліваюся, быццам лагуканая любым.

— Хто — чакае? Хто — ён? — усміхаецца на мае таропкія рухі мама, сумна, як здаецца мне, усміхаецца. — Нияк Юрчык перастрэў мяне...

— Ён, Сцяпан. Сцяпан чакае!

Гэта я ўжо ад дзвярэй тлумачу, не даслухаўшы пра Юрчыка. Вядома, што ён не мог сказаць. Ды і мама, напэўна ж, даўно ведала, з кім я да першых пеўняў расстацца не магу. Колькі той вёскі! Не адны дык другія вушы ўчуюць. Не адны дык другія вочы ўгледзяць...

На вуліцы ўсё спрабую суцішыць крокі, каб каго вітаннем не абмінуць, каб раней часу не кінуцца бегма — праз зараснікі вербалозу — да рэчкі. А ногі не слухаюцца, абганяюць думкі.

— Во дзе я цябе перастрэла!

Фрося! Дарогу заступіла. Знячэўку. Быццам знарок чакала мяне тут, ля самай павароткі.

— Ой, Фрося, спяшаюся дужа!

— А чаго? Сцяпан толькі што прабег. Няхай пачакае, аддыхаецца. І ты ўся ў мыле...

— Скажаш! — раблю я выгляд, што пакрыўдзілася.

— Ды жартую я, Нін. Засумавала без цябе, словам няма з кім перамовіцца.

Угледзеўшыся, заўважаю ў Фросі штосьці незнаёмае — не ейнае. Мяккасць, ці што? Засяродзіцца ж, зразумець — перашкаджае думка: Сцяпан ужо на беразе і чакае! А Фрося перабірае гузікі на маёй кофце, і ўтрымлівае мяне, і ціха, журботна неяк кажа:

— Словам няма з кім перамовіцца. Мачыха як чуе што нядобрае, адно сіпіць услед. У спектаклі тваю ролю іграць няма каму. Павел не прыязджае...

— Які — Павел? Адкуль не прыязджае?

Утаропліваюся ў сяброўку, у яе спалоханы раптам твар і ліхаманкава перабіраю ў памяці ўсіх знаёмых хлопцаў. Няма сярод іх Паўла. Не ведаю я. А Фрося ўжо смяецца, сагнаўшы з твару хмурынку, цень яе журботны.

— Ды твой! Пятровіч. Прычапіцца няма да каго са сваімі жартамі. А яго за вярсту відаць — сам позірк чапляецца.

— А-а... Я была падумала...

— І дарэмна падумала, — пацалункам перапыніла мяне Фрося. — Шчаслівіцам думаць неабавязкова. Нават шкодна. Вочы перастануць свяціцца, і вусны прагоркнуць.

— Ды ну цябе! — са смехам адмахваюся я ад яе слоў і ад яе пацалункаў. — Зайздросціш, так і скажы.

— Зайздрошчу. Няхай у вас добра ўсё будзе!

Фрося нечакана рэзка адварочваецца і ідзе назад. Вуліцай. Не развітаўшыся. Мне здалося, што ў яе ўздрыгваюць плечы. Не! Проста здалося...

— Фрось! — гукаю ёй услед. — Мы заўтра дагаворым, добра?

І тут жа забываюся на свае словы. І на сустрэчу з Фросяй. І на колішнюю матчыну перасцярогу. Праз колькі таропкіх крокаў мяне страчае любы. Цёпла-цёпла робіцца мне ў яго абдымках. Утульна-ўтульна. Нібы і няма ў свеце нічога і нікога, апроч нас дваіх. Апроч гэтага гняздоўя мякка сплеценых рук. Апроч усхваляванай радасці спаткання.

Колькі хвілін мінае, не ведаю. Не ўсведамляю. Непадалёку, у кустоўі, ускрыквае раптам птушка. І, ахопленая незразумелай трывогай, я гарнуся бліжэй да

Сцяпана. «Гэта ж драч! Гэта ж драч вечна палохае ўсіх сваім траскучым крыкам», — супакойваю сябе ў думках. Супакойваю, а трывога не праходзіць. Адчуваю: яна перадалася і Сцяпану.

— Пойдзем? Пастаім на нашай кладцы, — схіляецца ён паглядам да самага майго твару. — Раку паслухаем.

І мы ступаем на нашу кладку. І маўчым. Сцяпан задумаўся. Я, з трывогай, не адводжу позірку ад яго, нязвыкла сцішанага, быццам незнаёмага ў гэтай сваёй задуменасці. Штосьці суровае, нават жорсткае, чытаецца зараз на ягоным твары — і ад гэтага мне балюча. І яму балюча, я ведаю. Адчуваю. І нічым не магу дапамагчы. Толькі пазіраю, не адводзячы вачэй. Толькі ўслухоўваюся ў яго маўчанне, у яго маўклівую трывогу. Сэрца адгукаецца на кожны дотык яго пляча, яго рукі — недзе глыбока ў позірку, недзе на самым дне яго, ускіпаюць слязінкі. Баюся заплакаць. Адкуль — раптам — трывога? Адкуль гэтае горкае прадчуванне слёз?

— Сцяпан!

— Што, родная? Што? Чым я напалохаў цябе?

— Я памру без цябе... без твайго кахання...

Вусны не слухаюцца. Крывяцца ў балючую ўсмешку.

— Але ж маё каханне з табой. І гэта — назаўсёды. Пакуль жывы...»

Голас, які вяртаў Ніну ў яе мінулае, раптам знік, згас. Толькі недзе глыбока ў душы яе ўздрыгвалі, трымцелі словы: «Пакуль жывы... Пакуль жывы...»

Яна напружана сачыла за Дзмітрыеўнай, за яе нетаропкімі рухамі, чакаючы, калі яна нарэшце скончыць, вызваліцца. І вызваліць яе, Ніну. Вызваліць ад неабходнасці зноў і зноў перажываць даўно перажытае. Адсюль, здалёк — амаль ужо і чужое. Хіба можна пазнаць у той, то няўрымсліва смелай, то нясмела-пяшчотнай дзяўчыне яе, сённяшнюю? Зніякавелую. Пакорную. Нават не лёсу пакорную, а гэтай размеранай хадзе жыцця. Хадзе гадзін, дзён, месяцаў... Для яе даўно ўжо не мела значэння іх паслядоўнасць. Жывуць жывыя. А яна нібыта і нежывая...

— Як Павэлак? Па-ранейшаму завіхаецца вакол цябе? — скасіла позірк у яе бок Дзмітрыеўна.

Ніна разгубілася. «Павэлак? Чый Павэлак?» — ледзь не запыталася яна ўголас. І схамянулася: гэта ж яе Павэлкам Дзмітрыеўна пацікавілася, мужам! І адказу чакала, хоць і схілілася зноў над сваімі паперамі. Трэба было нешта адказаць, а што? Не знайшла, што сказаць на той момант. І змоўчала. Хвіліну, другую маўчала, прыгадваючы адзін з дзён — хоць бы ўчарашні! — і Павэлка ў ім. Нічога пэўнага не прыгадвалася: паснедалі моўчкі, за вячэрай ён нешта пра сена казаў, што каса неадкляпаная... А навошта тое сена?

— Што маўчыш?

— Не ведаю... — зляцела з моцна сцятых губ, ледзь што не супраць Ніцінага жадання.

— Э-э, галубок, нельга так, — рашуча, кароткім узмахам рукі адсунула паперы Дзмітрыеўна. — Ну, што ты ўвесь час узіраешся ў сябе? Што ты бачыш там, у былым? Дваццаць гадоў мінула, галубок. Дваццаць! Нас з табой само жыццё хутка спіша, а ты...

Ніна маўчала.

— Маўчыш? — не вытрымала паўзы Дзмітрыеўна. І ў голасе, у пытанні больш не было абурэння. Толькі стома. Цяжкая стома. — Маўчаць яно лягчэй. Ад мяне адмаўчышся, ад сябе... Толькі былога не вярнуць. Ні былога шчасця, ні былога гора не вярнуць, галубок. Жыць трэба. Лёгка, цяжка — трэба жыць. Работай. Клопатам пра жывых, пра тых, хто побач. Вот ты і мяне часцей абыходзіць стала, а ці ж я табе дабра не хацела? Ці ж не жадала шчасця табе, Ніна? Не першы ж год разам. Побач. Часу век не хапала пасядзець каля цябе, распытаць, думкі твае ўлагодзіць, дык жа сама ведаеш — бачыш: хворыя! хворыя! Зараз я прыкуру...

— Мо я пайду? — пераступіла Ніна з нагі на нагу, адводзячы позірк. — Ты прабач, Дзмітрыеўна, калі што не так.

— Сядзь! — загадала тая, прыкурваючы цыгарэту. — Гаворка толькі пачынаецца. Некалі ж трэба пагаварыць. Ну, давай па парадку!

— Што — па парадку? — спрабавала бараніцца Ніна. — Сама кажаш: хутка само жыццё нас спіша.

— Жыццё — нас, а не мы яго... Розніцу чуеш?

Розніцу Ніна чула. Толькі чула як бы збоку. Абыякава. Шмат чаго магла б расказаць! І маўчала. Душылася гэтым даўкім, гарачым маўчаннем, а маўчала. Выпіць бы зараз! — зглынуць скамечаныя ў адзін балючы

камяк словы, запіўшы іх горыччу, і — вызваліцца ад іх. Хоць ненадоўга.

«Жыццё — нас, а не мы яго...» Розніцу Ніна чула. Ды лепш бы гэтай розніцы не было! Кожны б сам сабой, жыццём сваім, распараджаўся — так, як выходзіла яму, як выпадала. Кожны б сам за сябе вырашаў. А Дзмітрыеўна ўжо за яе вырашала. І ўпэўнена, можа, нават ганарыцца тым, што вырашыла. І дарэмна...

— Ніна, галубок, няўжо ты думаеш, што ў мяне няма чаго аплакваць? Што я не згадваю гады свае маладыя? Івана свайго? Адзін ён у мяне быў. Адзіны. Не адпусціла сэрца: так удавой і старэю. Ды чаго там! — састарэла. Не перад табой жа мне пер'е распускаць... Састарэла, галубок. Нібыта і непрыкметна.

Ніна разгубілася. Спалохалася — сама не ведала чаго. Сцялася ў крэсле, пільна ўглядаючыся ў свае складзеныя на каленях рукі. І напружана чакала. Слоў Дзмітрыеўны. Слёз... Скаланулася ўся, пачуўшы спачатку ціхі, а потым гучны, раскацісты смех. Дзмітрыеўна смяялася. Рагатала. Зняўшы акуляры, выцірала хусцінкай вочы і рагатала.

— Ты помніш? Помніш, як Іван дзеда Гаўру лячыў? Сонцам... Паскідай з сябе ўсё, дзед, да апошняга лахмана, вучыў, стань на сонцы апаўдня, калі сонца якраз у лысую макаўку глядзіцца, і рукі ўгору падымі. Сонца па руках і пацячэ ў састарэлае цела. Толькі апаўдня і ў чым маці нарадзіла... Так у газеце пісалі... І каб ні-ні! — не зважаць на тое, што робіцца вакол, — Дзмітрыеўна ледзь прамаўляла словы: перашкаджаў смех. — Помніш той дзень? Не дзед, а жывот з банцікам... Прышкробся да мяне ў зямлянку ўвечары. «Доктарка, — пытаецца, — збрахаў старому Іван ці не? Ці лечыць сонца?» Лечыць, кажу. Спецыяльныя курорты будуюцца там, дзе сонца болей. А ён: «А чаго тады хлопцы рагочуць-залягаюцца на ўвесь лес? Гнася перастрэў, спытаўся, дык той прама параіў: схадзі да доктаркі. Утойвае, маўляў, Іван галоўнае: трэба, каб перад гэтым нехта банцік развязаў. Яно, канечне, што галава, то розум. Але які банцік, Дзмітрыеўна? Дзе тут, у лесе, банцікі?» Ну, што было яму адказаць? Адно што вуха Івану свайму накруціла, як з'явіўся. Трэба ж даўмецца! Сонца... Па руках...

Ніна не магла не ўсміхнуцца. Усміхнулася. А потым і засмяялася ўслед за Дзмітрыеўнай. Надта ж жыва

ўяўляўся куртаты, шчупленькі дзед Гаўра. З заплюшчанымі вачыма і паднятымі ўгору худымі жылістымі рукамі. Жывот з банцікам...

— А я не прыгадала ніводнага разу гэтай гісторыі, — падумала яна. Не, сказала. Бо Дзмітрыеўна адразу ж адгукнулася:

— І дзіўнага нічога няма. Для мяне Іван мой дасюль жывы. Чуеш? Жы-вы! — голас яе быў зноў цвёрды, спакойна-вытрыманы, калі не суровы, быццам і не яна гэта толькі што смяялася да слёз. — А ты, галубок... ты дасюль верыш, што сябе разам са Сцяпанам пахавала. Як сабе хочаш, так і прымай мае словы, толькі гэта здрадай называецца. Здрадай жыццю. І Сцяпану. Так, так! І Сцяпану! Бо ён за цябе загінуў. Ты за яго павінна была б жыць!

— Не магу. Не ўмею, — ледзьве выціснула з сябе Ніна, зноў утаропіўшы позірк у складзеныя на каленях рукі. «І не хачу!» — хацела яна дадаць, крыкнуць. Адгарадзіцца гэтым крыкам ад папроку Дзмітрыеўны, ад позірку яе, ад руху, якім тая зноў паправіла акуляры. Хацела... І толькі сцялася, толькі ўтаропілася ў складзеныя на каленях рукі. Хоць штосьці ўжо ў душы яе скранулася, штосьці жыло, прабіваючыся да святла. Да слоў...

Словы так і не загучалі. Іх апярэдзілі слёзы. Перастаялыя. Пякучыя. Горкія-горкія. Ніна плакала. Упершыню за столькі год. Плакала і не чула, як Дзмітрыеўна доўга пагладжвала яе плечы, валасы, шэпчучы: «Паплач, паплач, галубок!», а потым ціха адышлася і шчыльна зачыніла за сабой дзверы.

## 7

Адышло ўсё. Шмат чаго папросту не прыгадвалася. Ды і не хацелася Павэлку што-небудзь прыгадваць: усё роўна не разбярэшся, адно душу развярэдзіш. Адышло. І часам, нібы каменнай сцяной, адгароджана. І на які д'ябал гэту сцяну разбіраць па каменьчыку? Некалі сама ўпадзе і пахавае яго пад сабой. Колькі таго жыцця!

Павэлак адпачываў на ганку, на сонейку, са смакам уцягваючы дым. Перабіраў у думках непераробленыя справы. Ужо зусім намерыўся ўстаць і пайсці ў градах



пакалупацца трохі, але згледзеў — у апошні момант, — што да весніц ішла Марфа. Паштарка. «Пацікаўлюся прагнозам у газеце (трэба ж, каб сена пасохла!), — мільганула думка, — а потым і ў агарод...»

— Добрага здароўечка, Пятровіч! — гукнула ад весніц Марфа.

— Дзень добры.

— Пісьмо табе прыйшло, таму і ў двор кіруюся. Пісьмо — не газета, між штыкецін не засунеш. Каб не прапала часам. Раптам што важнае?

— Пісьмо? — Павэлак недаўменна зіркаў то на Марфу, то на бязважкі канверт, што яна тыцкала яму ў руку. — Ад каго мне атрымліваць тыя пісьмы?

— Почырк нібыта жаночы, — пакручвалася перад ім Марфа.

— Дык мо ты і напісала, га? — не ўстрымаўся і крануў Павэлак занадта спакусліва раскалыханую на грудзях кофту. — Прыгадала, як хавалася ад дажджу ў мяне пад пахай, і пісьмо напісала — у госці клічаш?

Ён жартаваў, каб неяк схаваць трывогу. І ўсё камячыў у руцэ канверт, не спяшаючыся ці не адважваючыся зірнуць на зваротны адрас. Адкуль ён мог атрымаць сёння пісьмо? Ні ў яго, ні ў Ніны радні не засталося. Нешта тут было не так. Нешта дужа сэрца закалацілася... Канверт апякаў руку, а Марфа, відаць, не збіралася адразу ісці з двара.

— Дык што, прыйсці ў госці апоўначы?

— Во-ой, Пятровіч, ты скажаш! А куды ж я свайго дзену? Хіба што да кумы сну пазычыць! — залілася чырванню Марфа.

А сама падступалася да яго бліжэй і бліжэй: нічога ўжо і не відаць, апроч гарачага пакалыхвання тонкай паркалёвай кофты.

— Супынься, Марфа! — Павэлак адчуваў, што жарт зайшоў надта далёка, і заварушыўся, засоп разбуджаны ўдарамі крыві стары, ненасытны звер. — Супынься. Дзень — не ноч, а мой падворак — не лугавіна з копамі сена.

— Бог з табой, Пятровіч! У мяне і ў думках такога нічога не было. Бог з табой! — адступалася тая. — Я ж па рабоце. Па справе я, Пятровіч.

— І пажартаваць з табой нельга, — падняўся Павэлак. — Мужык жа яшчэ спраўны. Ні ў вачэй, ні ў рук

волі не адбяру, як цябе згледжу: круглая, мяккая ўся.

— Ды ўжо ж не твая Нінка! Адны вочы тырчаць...

Наткнуўшыся на яго пацямнелы пагляд, Марфа змоўкла. Як язык праглынула. Стаяла і бязгучна адкрывала і закрывала рот. Адкрывала і закрывала. Не могучы вымавіць ніводнага слова. Ці хоць бы проста адвярнуцца ад гэтага пагляду, каб льга было пайсці з двара. Павэлак жа і руху не зрабіў, каб неяк дапамагчы ёй. Здавалася... А ён нечакана наблізіўся ўшчыльную, і дрогкая рука яго патанула ў гарачых складках кофты.

— Ідзі, Марфа. Далей ад граху... Цёплая, мяккая ты ўся!

Марфа пайшла, раз-пораз азіраючыся на яго. Нязвыкла сцішанага. Разгубленага.

Разгубіўся Павэлак. Думкі не мог у адно сабраць. Адчуваў: нешта з ім не тое. На старыя сцежкі азіраецца. Да жаночай цеплыні пацягнула: работа не сагравае... Марфа... Вось адно яе Павэлку зараз і не хапала! Будзе, што пасля таго дажджу баба як сказілася была: усё паўз двор ягоны хадзіла. Па пяць разоў на дзень. Мікалай яе касавурыцца пачаў, бабы чаплялі... Адно Ніна нічога не заўважала. Ды яна, пэўна, не заўважыла б, прывядзі ён Марфу ў хату!

Павэлак зноў сеў на ганку, прыжмурыўся на сонца, што ўжо добра прысмальвала лысіну. Паднёс бліжэй да вачэй канверт: трэба было паглядзець, што за пісьмо аддала яму Марфа. Не сама ж яна яго напісала!

Зваротнага адраса не было. Не значыўся. Няроўным размашыстым почыркам (адкуль Марфа ўзяла, што пісала жанчына?), там, дзе стаяла «каму», было напісана: Буршу Паўлу Пятровічу. Яму, Павэлку. Ён акуратна разарваў канверт, узяў удвая складзены лісток. Разгарнуў. Пачаў чытаць: «Павел Пятровіч, ваш сын...» Зразумеў: памылка. Памылкова пісьмо трапіла да яго. Не было ў яго сына. Ніколі не было. Бог, як кажуць, не даў. Але, пачаўшы чытаць, можна было і дачытаць. Усё роўна канверт не склееш. Памылка, ды не ягоная.

А позірк ужо бег па лістку: «Павел Пятровіч, ваш сын загінуў. Адно гэта прымусіла мяне напісаць вам і тым парушыць слова, дадзенае сястры маёй. Фрося забараніла...»

Словы заскакалі ў вачах. Павэлак адчуў, як штосьці

цёмнае зварухнулася глыбока ў душы і пачало расці, надымацца. Усё вышэй і вышэй. Сын... Фрося... «Фрося забараніла, аднойчы і назаўсёды забараніла звяртацца да вас, што б ні здарылася. З тым і з жыцця пайшла. І я ніколі не парушыла б слова — я так любіла сваю сястру! — калі б не гэтае новае гора, не гэта смерць Паўла — такая гераічная, такая недарэчная смерць!

Павел на фізіка вучыўся, на трэцім курсе ўжо быў бы, калі б... Ён у лагеры з дзецьмі працаваў — канікулы ж! З экскурсіі вярталіся, з паездкі, а аўтобус вазьмі і загарыся. Ужо непадалёку ад Оршы. Старэнькі фанерны аўтобус быў — успыхнуў як запалка, а ў ім жа дзеці былі, Павел і дзеці. Вось і ратаваў Павел дзяцей. Дзверы заклініла, дык ён праз кабіну вадзіцельскую яму дзяцей перадаваў. Аднаго не ўратаваў, не паспеў: бак узарваўся...

Мне цяжка пісаць. Два тыдні мінула, а слёзы не высыхаюць. Здаецца, і не Паўліка пахавала (не пазнаць жа яго было), але магілка яго — побач з матчынай, з Фросінай, і няма ў мяне цяпер нікога ў цэлым свеце. Фрося на вайне засталася, сын яе — хлопчык мой! — за ёй пайшоў, да яе... Па двaіх цяпер плачу.

А вы? Няўжо сэрца не скаланецца, не ўспомніць?»

Павэлак зноў і зноў пачынаў чытаць пісьмо, мо таму, што ўздрыгвалі, дрыжалі рукі, словы ніяк не складваліся ў штосьці цэлае, зразумелае. Хоць ён даўно — адразу! — усё зразумеў. Фрося... Сын... Павел... Яго сын. І імя ў сына — яго, Павэлкава...

«У ДЗВЕ СОЛІ МАЧАЎ. Любоў нянавісцю выпальваў... Сын! У мяне рос сын, а я, сукін кот, і ў думках не насіў, што гэтак магло абярнуцца. А была ж яшчэ і ноч, калі Фрося прыходзіла ў атрад з паведамленнем ад сувязнога з Дубраўкі. Ноч, якую ўсю, дарэшты, да першых сонечных промняў я правёў з ёй. Назло сабе, абыдзенаму каханнем — абыдзенаму лёсам. Назло смерці, што ўсюды хадзіла за мной, дражнячы, пужаючы чырвонымі, налітымі крывёй вачыма і галоднай, ненасытнай, вечна ашчэранай зяпай. Назло ўсяму свету, ахопленаму полымем, які, здавалася, аблягала воўчае выццё, як аблягала яно лагер, і тую ноч, і зямлянку.

Як Фрося была апранута? Не помню. Цяпер ужо не помню. Помню яе без надзеўкі, асляпляльна белую нават у паўзмроку зямлянкі. Яна пачала распранацца,

ледзь толькі ўвайшла. Нервовымі, ліхаманкавымі рухамі. Быццам ведала, што ў яе была толькі ноч. Толькі адна ноч.

— Фрося, тут холадна!

Я яшчэ спрабаваў жартаваць.

А яна пераступіла кінутае на падлогу адзенне. Лёгка. Прыгожа. І прыпала да маіх грудзей. Да ватніка, замызганага, халоднага. Адхіснуўся. Пачаў шаптаць: «Пачакай, Фрося! Пачакай, ягадка. Я зараз. Зараз!» А Фрося... Фрося лавіла вуснамі мае рукі, мае таропкія рухі...

Ці казала яна мне што-небудзь? Потым? Не помню. І калі — потым? Калі было гаманіць? Ноч вельмі хутка згарэла. Хоць я і газнічку задзьмухнуў адразу, а ўсё, што запомнілася: асляпляльна белае полымя, у якім згарэў... Апаліла мяне і згасла. Калі было гаманіць? Фрося і на развітанне ніводнага слова не сказала. Павярнулася ад дзвярэй, колькі імгненняў узіралася ў мяне, нібыта спрабуючы разгледзець у паўзмроку твар, і выйшла.

І я не пайшоў следам. Не гукнуў услед. Прыйшла і пайшла! Прыйдзе ў наступны раз — свайго не ўпусцім. Відаць жа было: прыклеілася дзеўка. А мне — што? Сама... Мне трэба было паспаць хоць трохі: група выходзіла на заданне, на некалькі сутак...

Ды і ўпэўнены я быў, што Фрося прыйдзе. Яшчэ неаднойчы прыйдзе: праз яе партызаны трымалі сувязь з трыма бліжэйшымі вёскамі. Але Фрося чамусьці не прыходзіла. Не прыйшла...»

Павэлак смактаў ужо чацвёртую цыгарку. Ці то ад моцнай махоркі, ці то ад моцных штуршкоў крыві (часам яму здавалася, што вось-вось палопаюцца жылы) гуло ў галаве. Фрося... Сын... Фрося... Сын... Што ён ведаў калі пра Фросю? Што сяброўка Ніціна? Што языкастая? Што з усіх хлопцаў выбрала яго? Што гарачая? Ён і тое, як выглядала дзеўка, не прыгадваў.

Скамячыў пальцамі цыгарку, не адчуўшы апёку. Падняўся. Спрабаваў і, як ні сціскаў зубы, не здолеў стрымаць глухі, балючы стогн. Сплюнуў. Быццам стогн сплюнуў сабе пад ногі. Недаўменна азірнуўся вакол, не пазнаючы свой двор. Вакол — і над ім — рос, шырыўся, засланяючы сонца, цёмны, чорны гул. Шумеў лес.

Гудзеў, падскокваючы, як на выбоінах, на хвалях выбухаў, самалёт з павучыным знакам. Ламала вершаліны соснаў патрушчанае гэтым гулам неба...

## 8

— Ніна, там Косцік Варварын прыехаў. Ты ж развітацца з цёткай хацела! — гукнула ў прачыненыя дзверы Дзмітрыеўна. Гукнула і знікла. Ці то спяшаючыся па справах. Ці то пазбягаючы ў гэты момант яе пагляду або тлумачэння.

Ды і ці змагла б Ніна зараз штосьці растлумачыць? Нават Дзмітрыеўне... Слёзы прынеслі палёгку. Дыхаць стала лягчэй. Думкі паслухмяна аціхлі, быццам пагадзіліся нарэшце з тым, што не здолелі, не здолеюць апраўдаць яе. Быццам адступіліся. Яны вернуцца (Ніна гэта разумела!), але вернуцца, каб дапамагчы ёй разабрацца, што яна з сабой зрабіла. Што яна зрабіла са сваім сэрцам.

«Цётку Варвару ўнук забірае. Трэба бегчы!» — заспяшалася яна праз міг, шукаючы вачыма люстэрка.

— Ат! Не на спатканне іду, — апярэдзілі яе нечакана сказаныя ёй уголас словы, і Ніна ім не здзівілася.

З акон, паўз якія ішла па калідоры, бачыла бальнічны двор, купкі хворых непадалёку ад райкомаўскай машыны (пазнала Толіка, шафёра іхняга — ён быў пасялковы!), незнаёмую жанчыну ў дарагім, няйначай, бастонавым касцюме. Падумала: ці не нявеста гэта Косцікава? І ўсміхнулася: надта ж гарадская! — не Косціку ля яе скакаць.

За дзвярамі палаты было ціха. Ніна нават спалохалася. Рванула за ручку, ступіла ў пакой і, зніякавеўшы, памкнулася была назад: Варвара, падаткнутая падушкамі, сядзела на ложку, і, укленчыўшы перад ёй, перад ложкам, плакаў Косцік. Бязгучна плакаў. Не выціраючы — хутчэй папросту не заўважаючы — слёз.

— Падыдзі, Ніна, — спыніла яе старая. — Без тваёй дапамогі не падымуся, бадай.

— Ды нельга вам падымацца, бабуля! — ускінуўся Косцік. — І лекарка не раіць.

— Дома... паміраць буду.

Голас гучаў ціха. Але цвёрда. І, скараючыся яго ўладнай сіле, Ніна падышла, адвяла Косцікаву руку, якой ён па-ранейшаму слепа чапляўся за край ложка,

і моўчкі пачала абуваць апранутую, сабраную ў дарогу старую. Міжволі, падсвядома адчувала яна журботную ўрачыстасць гэтых мінут. І не спяшалася. І не асмельвалася парушыць гэтую ўрачыстасць словамі — сваім разуменнем, сваім спачуваннем. Ці пралітыя толькі што над сабой слёзы, якія ачысцілі душу ад перастаялай горычы і вярнулі спакой, не той мёртвы, абыякавы спакой, што адгароджваў Ніну ад жыцця, а той, незнаёмы, гаючы, ці сама мінута расстання з цёткай Варварай, мінута, у якой было столькі спакойнай велічы, столькі журботнай урачыстасці, была прычынай, — упершыню жыццё ўявілася Ніне і велічным, і вартым усіх пражытых страт, колькі б іх ні выпала на долю, вартым усіх перанесеных мук. Мо і праўда ачышчаюць мукі душу, што гэткі спакой сыходзіць на душу перад смерцю, што няма ў ёй страху і раскаяння.

Хоць у чым цётцы раскайвацца? Гэта ад бога, як ёсць за што, адкупіцца можна, схавацца, ад людзей не схаваешся. Усё на іх вачах: і нараджаешся, і жывеш, і паміраеш... А Варвара і дзвярэй ні ад каго не замкнула, і сэрца ні ад каго не адвярнула. На словах магла і не пашкадаваць — вохкаць не любіла, а дапамагала ўсім. І тым, хто прасіў, і тым, хто не прасіў.

Смерць сваю чуе. Ужо ў дарозе... Нельга парушаць зараз цішыню вакол. Ні словамі, ні слязьмі. Косцік гэтага яшчэ не разумее. Занадта далёка ён. Занадта малады. А Ніна зразумела. Як, адкуль зразумела, яна не ведала. Але зразумела. І таму моўчкі, немітусліва завіхалася ля старой. Дапамагла падняцца. Ямчэй падставіла плячо, абняўшы цётку. Кіўнула Косціку, каб забраў няхітры яе скарб, спакаваны ў клуначку. І, адчуўшы плячом, як напружылася, перамагаючы змогу, лёгкае, высахлае Варварына цела, рушыла да дзвярэй.

«І ЗЯМЛЯ КАЖА... Калі ўслухацца, адгукнецца зямля не толькі на кожны крок, але і на кожны зрух душэўны. Калі ўслухвацца, шмат чаго пачуеш.

Ды гэта ўмець трэба — не ў сябе, а ў прастору ўслухвацца. Сцяпан — умее. А я... Я толькі побач з ім усведамляю, адчуваю сваю знітаванасць з зямлёй. Сваю адзінакроўнасць з ёй.

Гэта дзіўна! Незвычайна радасна. Гэта пачалося адразу, з першай сустрэчы. Прачынаюся ад шолаху крыл. Шырэй прачыняю акно і ўзіраюся ў шэра-блакіт-

нае мроіва золку, усхваляваная, шчаслівая, поўная чакання новага цуду — новага дня. Дзень займаецца не толькі там, за акном, а і ўва мне. Я чую, як пераліваецца, плюхаецца ўва мне яшчэ цьмянае святло. Як яно званчэе, пачынае іскрыцца — шырыцца і расце, пакуль не выступае, не ўзыходзіць на твары разгубленай, шчаслівай усмешкай.

Усё нібыта і ранейшае, і ўсё — іншае. Іншае неба. Іншае святло. Іншыя раніцы. Іншая я. Баюся ў люстэрка іншы раз зазірнуць, каб не спудзіць позірк свой, шчасце ў ім прыхаванае. Спудзіш — не вернецца.

І чакала ж, усе гады чакала шчасця, а прыйшло зусім нечакана. Не было часу апамятацца — штосьці вельмі аграмаднае ўва мне штоміг нараджаецца, спрабуе вызваліцца, мяняючыся, набываючы і тут жа губляючы новыя рысы. Што гэта? Не ведаю. Усведамляю адно: гэтага магло і не быць. Не было. Раней — не было. Не балела ж мне раней!

А тут — баліць. І боль таксама незнаёмы. Салодкі. Часам да млосці салодкі — тады, калі нейкі голас ува мне нашэптвае, што нікому нічога не даецца дарам і назаўжды. Што ўсё на свеце некалі адыходзіць. Праўда, я хутка навучылася адгароджвацца ад голасу. Марай. Марай пра штосьці зусім неакрэсленае, далёкае. Пра будучае...

Пра будучае — таму што адно на яго і спадзяюся з таго дня, як чорнай хмарай насунулася з захаду вайна. Вай-на... Слова якое страшнае, толькі шэптам і прамаўляецца. І чужая ж, чужая яна мне! — я не ведаю яе, я яшчэ не сутыкалася з ёй, а ўжо баюся. Так баюся, што сэрца халадзее, як у думках згадваю, што ў свеце ідзе вайна. У свеце... І зусім побач! За лесам. У суседнюю Дубраўку, кажуць, немцы часцяком наязджаюць, а гэта ж які дзесятак вёрст...

Перш, напачатку, як схлынулі хмары крыжастых самалётаў і аціх страшны гул з боку чыгункі, з боку пасёлка, думалася, што, абмінуўшы маё акружанае лясамі Запярынне, вайна абмінула — абміне! — і маё шчасце. Ды гэта напачатку так думалася. Нядоўга. Бо якое ж шчасце, калі і тыдня не мінула, як яна, праклятая, мяне са Сцяпанам разлучыла? Адразу і пайшоў з вёскі. Не адзін пайшоў, не, а да яго аднаго душа рвецца, дзе ён, што? Прыйдзе — нічога не расказвае пра сваё жыццё, пра чужую — і яму чужую, я знаю! — вай-

ну. А я дужа і не распытваю. То баюся папытаць: мо яму казаць нельга? То часам і збяруся распытаць, ды не пытаюся, забываючыся на свае думкі, ледзь толькі набліжаецца дзень, міг сустрэчы.

«Сцяпан! — адстуквае, спявае сэрца, нават не спрабуючы суцішыць, астудзіць гарачыя штуршкі крыві. — Сцяпан!» А сцежка расцягваецца і расцягваецца, ніяк не набліжаючыся да той Грады, што, па паданнях, цягнецца ледзь не да Налібоцкай пушчы, да той старой вольхі, пад якой ён чакае мяне. Заўсёды чакаў. Хоць паміж намі быў лес, яго то ціхі, то трывожны шум. Хоць паміж намі была вайна... О, як я ненавіджу яе, гэту вайну, яшчэ не ведаючы. Ненавіджу, бо з дня на дзень сустрэчы нашы ўсё карацейшыя: паўгадзіны... чвэрць... дзесяць мінут...

Бягу, каб ніводная мінута не прапала, каб ніводнае слоўка з тых, што яму скажу, не згубілася. Сцяпан жа здалёк прыходзіць. Прыходзіць і чакае гэтых мінут, чакае маіх слоў. Шмат у мяне для яго слоў, шмат хачу сказаць, а пакуль дабягу — усё разгублю вечна. «Калі мы ў наступны раз убачымся?», «Ты прыйдзеш?», «Ты зможаш?», «Цябе адпусцяць?» — вось і ўсе мае словы. Паўтараю іх, паўтараю па шмат разоў, не згадваючы іншых, тых, якія насіла ў сэрцы. Усё перамагае страх, падсвядомы страх за яго. І за сябе. За нас!

А ён, Сцяпан мой, суцяшае мяне. Супакойвае. Не выпускае з абдымкаў усе гэтыя кароткія, украдзеныя ў вайны, мінуты. І паступова расступаюцца змрочныя прадчуванні, адкрываючы дзень і яго зіхоткае, гарачае неба. Зноў гайдаюцца на голлях дрэў птушкі. Зноў лашчацца да босых ног колкія травінкі. Зноў смяецца, свецячыся ў траве, крыніца. Вось і зараз...

— Жаўранак ты мой светлакосы, — шэпча Сцяпан. — Не бойся за мяне, не трывожся. Я — там, дзе павінен быць. Дзе павінен быць кожны мужчына сёння. А ты — у маім сэрцы. Значыцца, усё добра будзе. Усё добра будзе, вось убачыш!

— Калі мы ў наступны раз убачымся?

— Заўтра. Я пастараюся... Я абавязкова прыйду.

— Мне страшна. Я баюся...

— Баішся лесам адна хадзіць? — усміхаецца ён аднымі вачыма, перапыняючы мае трывожныя думкі, а можа, і свае: вочы ўсміхаюцца, а позірк балючы і не святлее. — Ай-яй-яй, на што гэта падобна, Ніна? Ёсць

кніжкі, у якіх напісана, што чалавек не памірае. Наогул не памірае. Працягвае жыць. Толькі ў іншым абліччы. Дрэвам. Ці аблачынай. Ці жаўранкам.

І зноў усміхаецца, горнучы мяне да сябе.

— Я не хачу... жаўранкам! — баранюся я ад таго трывожнага, жахлівага і ўсё-ткі магчымага, што стаіць за яго словамі.

— Немцы... нелюдзі забіваюць нават малых дзяцей! — вырываецца ў Сцяпана — упершыню, міжволі вырываецца! — і твар яго пахмурнее, робіцца незнаёма-колкім, скуластым. Усё сцінаецца ўва мне ад рэзкага болю, быццам рэзка, адным гарачым бліскам сарвала, апаліла ўсё, чым я захіналася ад яе, небяспека. І свет — сама гэта мінута — стаў крохкім, так, нібы вайна наблізілася ўшчыльную — балючымі словамі гэтымі, стомай, незнаёмай, жорсткай рашучасцю на Сцяпанавым твары. Так, бы я зазірнула ў якуюсьці вогненную бездань зусім побач, менш чым за крок ад нас, — і не хачу, не хачу бачыць таго, што ўбачыла, што прадчувае гэты рэзкі боль у грудзях.

Сцяпану перадаецца мой боль. Ён яшчэ саграває, спрабуе адагнаць маю трывогу абдымкамі, вуснамі. І адступаецца. І цвёрда вымаўляе — нягучна, але цвёрда:

— Мне трэба ісці... Мне трэба ісці, любая.

— Ты прыйдзеш заўтра? Цябе адпусцяць?

— Ты чакай. Чакай, нават калі я не прыйду...»

— Дачушка, што я табе хацела сказаць... Штосьці я табе...

Варвара, не дайшоўшы колькі крокаў да машыны, спынілася. Марудзіла, шукала якіясьці словы. А Ніна і не прыспешвала яе. Чакала. Халодным, адсутным позіркам сачыла за рухамі кабеты ў светлым бастонавым касцюме (дужа далікатна тая падносіла да вачэй насоўку), за няўклюдным, цяжкім таптаннем Косціка, за вокнамі, з якіх павытыркаліся хворыя... Чакала.

І вось, перамагаючы слабасць, старая павярнулася да яе. Грузна. Усім целам. Не адводзячы вачэй. Халодзячы глыбокім, бяздонным позіркам і без таго выстуджанае Ніціна сэрца. Памаўчала колькі хвілін і, перапыняючы наступнае імгненне, глуха, з прыхаванай горыччу сказала:

— Што ў вёску вачэй не кажаш? Не магілы, дачуш-

ка, травой зарастаюць, а памяць. А без памяці і чалавека няма... І род яго на ім канчаецца.

— Я прыеду, — устрапянулася, апускаючы вочы, Ніна. — Я не забыла... Я нічога не забыла, цётачка!

Не забыла... І чакала новых папрокаў. Прагнула пачуць іх зараз ад старой Варвары, адчуць іх балючыя дотыкі да сэрца — каб прачнулася сэрца, каб нарэшце прачнулася! Але Варвара нічога больш не сказала. Яна нават не падзякавала Ніне за дапамогу, прымаючы гэту дапамогу да самага ад'езду машыны. Толькі падняла голаў і зіркнула на нявестку, калі тая мітуслівымі, нервовымі рухамі выцягвала з сумачкі грошы, — і кабета сумелася, зніякавела, ціха мармытнуўшы:

— Я хацела аддзячыць... Заплаціць...

Гэта ёй, Ніне, заплаціць! — абурылася ўсё ў Ніне. За што? За дапамогу? За слёзы ў вачах? За ўсё, што яна зразумела, адчула сёння, развітваючыся з цёткай? За збуджаны боль? За згадку аб мінулым? За белы халат яе? Крыўда захліснула, нябачнымі вострымі кіпцюрамі раздзіраючы грудзі, і, адкінутая звыклым, загадным: «Гэтага яшчэ не хапала!», аціхла, стаілася. Хапіла сілы ўсміхнуцца.

Так з усмешкай і стаяла Ніна нейкі час пасярод бальнічнага двара, сілячыся ўчуць з-за пошуму таполяў далёкае глухое фырканне райкомаўскага газіка.

## 9

Вайна згадвалася рэдка. Яна была не проста далёка — Павэлак пахаваў яе ў тым далёкім, аджытым і адпрэчаным. Пахаваў са спакойнай упэўненасцю, што гэта і ёсць яго апошні доўг былому. Былому часу. І быломy сабе.

Калі зрэдку накочваўся, засланяючы сонца, цёмны, чорны гул, ён ведаў, што рабіць. Ён стаўляў на стол заўсёды прыхаваную на такі выпадак пляшку гарэлкі і два кілішкі (абавязкова два, хоць бы і быў у хаце ён адзін). І доўга сядзеў, прыкрыўшы вочы далонню. Не, ён нічога не прыгадваў. Маўчанне, як павучынне, павольна аплятала, скоўвала думкі — і гул адступаў, аддаляўся, набываючы звыклае, роўнае гучанне. Мільгане чыйсьці, здавалася б, забыты твар. Хрусне зламаная аўтаматнай чаргой галіна. Хіснецца рудой, іржавай аблачынай дым

над папялішчам. І ўсё... І гул знікне. Боль адпусціць.

Вось і зараз. Трэба толькі падняцца, ступіць якіх дзесяць крокаў, нахіліцца і намацаць пад прыпечкам, за дровамі... І тут Павэлак успомніў, што ў сховішчы бутэлькі няма. Тыдні тры як няма: брыгадзір, Цярэнцевіч, заходзіў. Рэдкі госць, як не пачаставаць! Збіраўся зайсці потым у краму, купіць «беленькую»... І не сабраўся.

Стала яшчэ больш млосна. Вось як выйшла! А і злавацца марна. Калі і выпадала злавацца на сябе самога, то з іншай прычыны. З больш важкай. Ды і то карысці ніякай. Злуйся не злуйся, шкадуй не шкадуй — нічога ў пражытым ён не змяніў бы, нічога са страчанага не вярнуў. Было тое, што было. І вайна...

Ён, Павэлак, часам дзівіўся з Гнася, з сябрука. Адно пытанне смаркача якога-небудзь, падшыванца, які пацікавіцца мінулым, — і пайшло-паехала! І пра зверствы фашыстаў, і пра гераізм партызанскіх сувязных, і пра засады, і пра баі пры выхадзе з блакаднага акружэння, і пра сябе, партызанскага падрыўніка, раскажа Гнась. Ды яшчэ і з імпэтам, узрушана. Адкуль і словы браліся.

А яго неяк настаўнік, былы вайсковец, зацягнуў у школу на сустрэчу з дзецьмі, дык ён, як ні сіліўся, так і не змог нічога складнага сказаць. Што сказаць? Ваявалі. Жылі, хто жывы быў. Хацелі выжыць. Каб выжыць, і немца білі — ён жа знішчыць усіх хацеў, немец. Хацеў, ды не выйшла.

Што казаць? Што згадваць? Нікому чужое жыццё не патрэбна, ніхто ні на чыіх памылках не навучыўся абмінаць свае. Прыпячэ — здагадаешся, што трэба ратунак шукаць. І ўвесь тут сказ.

Тады, у школе, настаўнік пачаў замест яго расказваць. Шмат нагаварыў. І пра яго, Павэлка, складна выходзіла. Пра медаль яго «За адвагу», пра шлях яго геройскі... Цяпер усё і не прыгадаеш. Складна! Дык на тое ён і настаўнік. А Павэлак так разумеў: вайна ўсё заблытвае. І ў свеце, і ў чалавеку кожным. Так заблытвае, што часам і разблытаць нельга. Да самай смерці не разбярэшся, дзе ты вайну абхітрыў, дзе яна цябе аглушыла, адабраўшы штосьці самае тваё. Нябачнае, незразумелае, але для нечага самага галоўнага ў табе — адзіна неабходнае. Што ж цяпер — у ладкі пляскаць?

Злосць усё-ткі пачынала варушыцца ў ім. Урокі гісторыі... Так, здаецца, настаўнік, Іван Панцеляймонавіч, казаў тады. Прыгожа. Як жа! Калі з аднаго боку зірнуць, то і правільна. А калі з другога? З таго, дзе кроў сочыцца? Любое слова на той крыві паслізнецца... Не, Павэлак не разумеў жадання згадваць, расказваць пра тыя часы, пра страшныя карціны гора людскога, пра цяжкае змаганне з добра ўкормленымі, добра ўзброенымі, добра вывучанымі нелюдзямі. Нелюдзямі іх называлі, а і яны ж людзьмі нараджаліся...

Гул у галаве не сціхаў. Паратунку на яго не было: накочваўся, мацней раз ад разу, з кожнай новай хваляй, — і, сплюнуўшы, Павэлак пачаў збірацца ў краму. Пайшоў у хату па грошы. Доўга корпаўся ў шуфлядзе, хоць грошы ляжалі зверху, акуратна загорнутыя ў хусточку. Доўга не мог уцяміць, чаму ходзікі паказвалі сем гадзін раніцы, калі быў ясны дзень і касцы на лузе, пэўна, даўно адпалуднавалі. Доўга пераводзіў стрэлкі, зверыўшы час па сваім старым кішэнным гадзінніку. Без чвэрці дванаццаць...

Трэба было хоць кашулю пераапрануць: вісела ж колькі новых у шкапе! Але Павэлак толькі пакасіўся на шкап, насунуў туфлі, прытупнуў па звычцы і выйшаў. У самы поўдзень выйшаў. У духмень, якой чамусьці дасюль не заўважаў.

Гул у галаве стаў яшчэ цяжэйшым. Свінцовым. Павэлак не мог зварухнуць галавы: адразу пачынала хіліцца, завальвацца чорнае ад бляску сонечных промняў неба.

«НЕ МАЛАДОСЦЮ ЖЫВЁМ, НЕ СТАРАСЦЮ ЎМІРАЕМ... Якая праўда ў гэтых словах, чорт яго разважыць! Сёння ўжо і не падзеліш жыццё на маладосць і... Ну, да старасці мне яшчэ доўга прымервацца. Гадоў дзесяць, не менш. Ды і ў маладосць не скокну — адскакаў сваё! — хоць сцежку туды дасюль помню. Помню.. Усё помню — і што хачу помніць, і чаго не хачу. Забыў бы, ды не забываецца...

Восень на зіму паварочвае. Але. Холадам патыхае. І ад неба, і ад зямлі. Паляжыш ля чыгункі гадзін колькі, назіраючы за немцам, — здаецца, ватнік набракне холадам. Спіны не павярнуць, пакуль ля кастра не ады-

дзеш, не адагрэешся. А той-сёй яшчэ і жартуе: Хведар Верамееў, той ніколі не прапусціць.

— Пятровіч, цябе што, напалам складваюць, каб з-за куста не вытыркнуўся? Нешта ты доўга косткі распрамляеш?

— Яго і ўдвая скласці, ён сваё ўсочыць, — агрызаецца, як звычайна, замест мяне Гнась. — А вось ты, Хведар, ці то баішся ад лесу адысціся, каб раптам на немца не напароцца, ці то чакаеш, пакуль вайна сама па сабе скончыцца. Зброяй і той дасюль не разжыўся.

— Ты, ты...

Хведар падскоквае, спрабуе знайсці колькі важкіх слоў, каб адказаць, каб апраўдацца, і пад агульны смех бяжыць да камандзірскай зямлянкі ў які ўжо раз прасіцца на заданне: не яго віна, што яго не пасылаюць. І ўсе гэта ведаюць. І Гнась ведае. І не хацеў ён пакрыўдзіць Хведара — так, падчапіць... І хлопцы смяюцца без злосці. Спачувальна нават. Немцы старога бацьку Хведаравага застрэлілі. За тое, што парася не хацеў аддаваць...

— Бурша да камандзіра!

— Цябе, Павэлак...

Я падымаюся. Ямчэй запраўляю пад рэмень ватнік.

Яго бачу адразу. Не пазнаю, а сэрца страпянулася — прызнала! Ладна збіты, светлавалосы... Недзе мы сустракаліся. Дзе? дзе? — пытаюся ў сябе, дакладваючы камандзіру, што з'явіўся па выкліку. З'явіўся, хоць толькі што з задання і маю права на адпачынак.

— Павел Пятровіч, просьба да цябе.

— Просьба? — не хаваю здзіўлення.

— Так, просьба. Ты толькі што з задання, маеш права на адпачынак, але тут... Знаёмцеся: Сцяпан Ручай, з суседняга атрада, ад Юркевіча. Жаніцца надумаўся.

— Жаніцца? — здзіўленне саступае цікавасці, і я ва ўпор разглядваю гэтага Сцяпана. — Зараз? А я тут пры чым? Ці не сватам хочаце паслаць, Васіль Лук'янавіч?

— Сватам не сватам, а ажаніць яго табе давядзецца, Павел Пятровіч. Ты ж у нас сакратар сельсавета.

— Ну, які зараз сельсавет? — вырываецца ў мяне неяк няўзнак.

Васіль Лук'янавіч спахмурнеў.

— Гэта як разумець? Прадстаўнік Савецкай улады ў раёне, ты зняў з сябе паўнамоцтвы на час акупацыі? Аддаў іх ворагу? Не чакаў, Павел Пятровіч, не чакаў! Людзі да цябе ідуць з патрэбамі сваімі. Можа, ты іх у камендатуру нямецкую будзеш адсылаць? «Які зараз сельсавет...»

— Ды я... Я... Надта ж нечаканае заданне! Ваяваць трэба... — намагаюся я звязаць словы ў нейкі больш-менш выразны адказ. — Вайна ж...

— Вайна! — сekануў далонню паветра Васіль Лук'янавіч. — Трэба ваяваць! Мы і ваюем. І ён — ваюе. Добра ваюе. Таму і адпусціў камандзір на тыдзень, што заслужыў. Таму да нас ён, да цябе... Не папа шукаў, а сакратара сельсавета. Каб усё па-нашаму.

— Прабачце, Васіль Лук'янавіч. Надта ж нечакана гэта. Я гатоў, — злосна зіркаю я на жаніха, хоць злавацца трэба на сябе, дурня: сакратару райкома, камандзіру гэткае ляпнуць! Чаго добрага, і з даверу магу выйсці.

Што ж, заданне атрымана, можна ісці. Пайшлі. Прыхапіўшы паперы, кіруюся ўслед за прышлым жаніхом. Цяжкое пачуццё не знікае. Не знікла. «Таму і адпусціў камандзір...», «Жыццё працягваецца, нягледзячы на смерці і кроў...», «Не папа шукаў, а сакратара сельсавета...», «Добра ваюе...», «Жыццё працягваецца...» Словы не адпускаюць, вярэдзяць штосьці балючае. Памяць не памяць...

Ат, якога чорта лысага было сябе зараз папікаць? Авось абыдзецца. Не бязвер'е адазвалася на словы камандзіра, а неразуменне: гэта ў лес, у лясныя раёны немцы пакуль што не сунуліся, а скрозь жа, ліха на іх, гаспадарылі. Вось і вырвалася...

А тут яшчэ гэты... жаніх! Знайшоў час, нічыю маці не памінаючы. З першага моманту, з першага позірку адчуваю ў ім — чужое, варожае мне. Душа чуе. Надта зашкрабалася яна, душа, — гэты вечна насцярожаны, ненасытны звярок ува мне, што, выспаўшыся, вычакаўшы дзень, тыдзень ці колькі там яшчэ, пачынае мяне грызці. Грызе і грызе. Пакуль не саступаю ў нечым. Пакуль не змірыся.

З чым я павінен змірыцца гэты раз? Што — аддаць? Д'ябал прынёс гэтага Сцяпана! І надвор'е псуец-

ца. Не дождж, а ледзяная крупа сыплецца — шоргат, шолах ідзе па лесе...

— Можа, ты, нарэшце, скажаш, куды мы кіруемся? — не хаваючы злосці, звяртаюся да спадарожніка. — На які ражон лезем?

— Хіба я не казаў? У Запярынне.

Калі б гром раптам грымнуў, абярнуўшы колкую ледзяную крупу ў ледзяную зліву, у раку, што хлынула з неба, ён не ўразіў бы мяне больш, чым адказ Сцяпана. Запярынне! — як жа я адразу не прызнаў гэтага хлюста? Запярынне... Ніна! Вось у чым была справа. Вось што ўчуў мой звярок у першы ж момант сустрэчы. Запярынне... І я — сваімі рукамі! — павінен аформіць іх шлюб?! Не! Камандзір зразумее, што я не мог. Не магу...

Вось жа, трасцу тваю з лёсам гэткім! — і не памысліш, як усё абярнуцца можа. Я ж дзеўку гаспадыняй бачыў у сваёй хаце, у сваім двары. Я ж харастве яе маліцца гатовы быў... Перайшоў дарогу, сука, і ўсміхаецца: «Хіба я не казаў?» Ды скажы ён гэта ў зямлянцы...

Бач, як усё абярнулася! Ні ў бога, ні ў чорта не верачы, падумаеш тут, што сцежка была заказана. Дурань. Разява і дурань, якіх зямля не бачыла. Сваё аддам. Над сабой пасмяюся. Сваёй рукой прысуд свайму каханню падпішу...

Лаю сябе ў думках і гэтымі, і іншымі — мацнейшымі — словамі лаю. Пэўна ж, душы сваёй не засаромеюся: на які ляд мне яе пакуты? Назад павярнуць... Трэба ісці назад! Загадваю сабе, а ногі як прыраслі да зямлі, як ураслі ў яе. Адно што вылаяцца магу.

— Вось жа, трасцу тваю з жыццём гэткім!

Сцяпан ужо добра такі адышоўся. Спяшаецца. Да Ніны маёй спяшаецца. Перакрэсліў усе спадзяванні мае, сука, і ўсміхаецца: «Хіба я не казаў?..»

Звярок ува мне ўвачавідкі ператвараецца ў цёмнага, страшнага звера. Звер той штосьці грызе, крамсае: я, здаецца, чую храбусценне — і, пакрамсаўшы, выплёўвае. Зазірні хто ў той момант у маю душу — няйначай, убачыў бы, што ўсё ў ёй запляванa цёмнымі крывавымі згусткамі.

— Ты чаго стаў? — гукае Сцяпан, нарэшце азірнуўшыся. — Што-небудзь здарылася?

— Ідзі, ідзі! Я даганю, — нечакана спакойна адзываюся я і дзіўлюся гэтаму свайму спакою. Быццам голас ягоны зняў маё ўтрапенне — вызваліў з кіпцюроў страшнага звера: магу зварухнуцца, магу гаварыць.

Пераступаю з нагі на нагу, вырашаючы: павярнуць назад (ад жартаў пасля не ацярэбішся!) ці ісці за Сцяпанам у Запярынне (Ніну ж убачу, шчаслівую, з гэтым...). Дагнаць бы і прыстукнуць прышлага шчасліўца! Хто б яго зараз дашукваўся? Мільганула і спалохала сваёй балючай вастрынёй: няўжо здатны на такое? Няўжо змог бы?

— Дурань! — вылаяў сябе ўголас і рушыў за Сцяпанам...»

— Куды? Куды? Табе што, вочы засляпіла? — закудахтала старая Грыпіна, чапляючыся за Павэлка. — Ці мо ад спёкі адурэў, што не бачыш, куды прэшся? Куранят ледзь не перадушыў, даўганогі. Людзі на сенакосе...

— Чаго ты захадзілася, баба Грыпіна? Нічога з тваімі куранятамі не здарылася. Не перадушыў жа я іх! — абярнуўся да яе Павэлак. — Задумаўся вось...

— Тое я і гляджу, што твару на табе няма.

— Твару няма? А куды ж ён дзеўся, твар? Няўжо згубіў па дарозе ў краму? — паспрабаваў аджартавацца ён, адчуваючы прыкрасць і незразумелую стому.

— Можа, і згубіў. Ці ж дзіва ў гэткую спёку...

Старая пазірала насцярожана, быццам баючыся памыліцца ў сваіх адчуваннях, і Павэлку зрабілася не па сабе: дрэнь яго справа, калі ад людзей сваіх горкіх думак утаіць нездатны. Унюхала ж нешта Грыпіна, калі гэтак натапырылася!

Ён прыўзняў капялюш, развітваючыся са старой, і пашыбаваў у краму. Здалёк было відаць: крама адчынена і ці не Гнасеў Гняды пасвіўся непадалёку...

## 10

Хворыя не разыходзіліся па палатах, хоць ужо наступіў час працэдур, а ў кабінеце Дзмітрыеўны сядзела абяцаная камісія — сухенькі дзядок у акулярах, напалову прыкрытых непаслухмянымі пасмамі сівых валасоў, і зацягнуты ў занадта вузкі пінжак прадстаўнік

раўздрава. Дзядок, няйначай, прафесар, як вызначыла, зазірнуўшы ў дзверы, Ніна, — быў галоўны. А прадстаўнік так... Як прадстаўнік. Нічога больш пэўнага не вызначыш.

Ніна ўжо хацела прычыніць дзверы — ціха, каб цікаўнасць яе засталася незаўважанай, — і быццам зачапілася за пачутае:

— Шмат што ў чалавеку высвеціцца, убачыцца з космасу, і найперш — повязь яго, непарыўная повязь не адно з зямлёй, а і з небам, з сусветам, рух якога, законы развіцця якога льга прасачыць і на прыкладзе чалавечага жыцця, аднаго чалавечага веку. Вось хоць бы наш выпадак узяць, Верачка. Можна вытлумачыць вяласць, абыякавасць, поўнае адчужэнне і захворваннем, зменамі ў псіхіцы, а можна і інакш. Ёсць у астраномаў тэрмін: гарызонт падзей. Гарызонт, альбо прасцей — паверхня, што быццам агароджвае прастору вакол чорнай дзіркі, у межах якой сіла гравітацыі такая магутная, што ніводзін сігнал не можа выйсці, прарвацца адтуль, з-за нябачнай «агароджы», і дасягнуць зямлі. Ніводзін. Хоць гэта зусім не азначае, што сігналаў няма...

Ён звяртаўся да Дзмітрыеўны, відаць, працягваючы распачатую раней гаворку. А Ніну як заклініла ў дзвярах: ні туды ні сюды. Здавалася: яна нічога не зразумела. Не разумела. Пераводзіла позірк з дзядка на Дзмітрыеўну, зноў на дзядка... А ён гаварыў, гаварыў!

Словы ў большасці былі ніколі ёй, Нінай, раней не чутыя: «экстрэмальныя фактары» ці, таго мудрэй — якіясьці «кампенсаторныя рэакцыі», да прыкладу. Але вымаўляў прафесар іх так упэўнена, з такім імпэтам (а яшчэ ж і рашучымі жэстамі рукі падтрымліваў), што ўсумніцца ў іх важнасці было нельга. Ніна і не ўсумнілася. Яна наогул услухвалася не ў словы, а ў голас прафесара — у яго непрыхаваную радасць, якая, здавалася, перадавалася ўсім. І ёй...

— Вось вы, — нечакана звярнуўся той да Ніны, якая не паспела схавацца за дзвярамі, — вы хацелі б здзейсніць касмічны палёт, свой — касмічны палёт?

— Не... не ведаю, — разгубілася Ніна. — Я не змагла б... Напэўна, не змагла б.

— Вось таму што не ведаеце, таму што не захацелі — і не змаглі б, толькі таму!

«Ты ж уся звонкая-звонкая. Як жаўранак. Падстаў табе далоні, прыўздымі — і паляціш...

Крылы — у табе. У веры тваёй. У веры, што паляціш. Што не зможаш без гэтай вышыні, без ветру — насустрач...»

Сцяпанаў голас гучаў так выразна, што Ніна падумала на момант: ці не прафесар яе разыграў. Ледзь падумала, а крыўда ўжо прачнулася ў душы: што, як не крыўда, проста такі цягнула яе за язык?

— Усё б вам смяяцца з простых людзей, адукаванасць сваю паказваць!

— Ніна, галубок! — здзіўленая нечаканымі папрокамі ў адрас прафесара, перапыніла яе Дзмітрыеўна. — Я ж прасіла...

— Не, не, не! Заходзьце, Ніна-галубок, у пакой, — падскочыў да дзвярэй прафесар. — Смялей заходзьце, стары прафесар не кусаецца, хоць і не саромеецца сваёй якой-ніякой адукаванасці. А вось вам, вам павінна быць сорамна за знявагу самой сябе і ўсіх іншых заадно. Што гэта за «простыя» людзі? Дзе вы іх сустракалі? За якой «прастасцю» хочаце схавацца ад часу, ад прагрэсу?

Уцягнутая гэтым націскам, гэтым напорам старога ў пакой, Ніна не ведала, што адказваць, на каго глядзець, куды сунуць рукі, якія сталі раптам вялізнымі і няўклюднымі.

«Рукі — не крылы. Крылы — у табе. У веры тваёй...»

Яна паверыла тады Сцяпану. Але паміж ёй і Сцяпанам устала вайна. Смерць... Яна, Ніна, выжыла. І не верыла гэтаму прафесару: прафесар і ягоны прагрэс былі чужымі Ніне. Чужым не верыць.

— Што ж вы маўчыце, Ніна...

— Цімафееўна, — падказала Дзмітрыеўна.

— Што ж вы маўчыце, Ніна Цімафееўна? — прафесар спрабаваў зазірнуць ёй у твар. — Чужым не верыць, гэтак вы зараз думаеце. А вось скажыце вы мне зараз самае неверагоднае, я б вам паверыў. Як веру таму, што людзі не могуць быць чужымі адзін аднаму, калі яны — людзі. Людзі не па абліччы, не па апратцы — па сутнасці сваёй духоўнай.

Ніна падняла вочы на Дзмітрыеўну, просячы дапа-

могі — дазволу пайсці. Тая зрабіла выгляд, што не разумее, не зразумела просьбы.

— Космас, касмічныя палёты... Вось куды сягнула мара чалавека, — працягваў, крануўшыся Нінінага пляча, прафесар. — Усе мы працавалі, каб гэта мара здзейснілася. І я, і вы, Ніна Цімафееўна, таксама.

— Ну, я... — памкнулася была сказаць Ніна і не сказала, згадаўшы словы прафесара.

— Я чалавек просты, маленькі... Гэтым вы хацелі адгарадзіцца ад маіх слоў? Так? — закончыў ён яе думку. — Не, калега, ніхто вам не дасць дазволу на маленькую ролю, на маленькую адказнасць.

— Я нянечка! — перапалоханая зваротам «калега» (ён, відаць, прымаў яе за кагосьці іншага), паспяшалася ўдакладніць Ніна.

— Ведаю, — спакойна адазваўся той. — Я ўсё пра вас ведаю. Мы яшчэ пагаворым, добра?

«Я ўсё пра вас ведаю... Мы яшчэ пагаворым...» — перадражнівала Ніна таропкую (увесь час здавалася, што ён захлынаецца словамі) гаворку прафесара. Што мог ведаць пра яе нейкі прафесар? Нябось, са сталіцы. У раёне гэткіх спрадвек не вадзілася.

«Трэба ж было нос у дзверы ўшчаміць!» — дакарала яна сябе, зноў і зноў прыгадваючы ўсё, што пачула. Не словы яе палохалі, не! Ці мала слоў Ніна чула штодзень — яшчэ і больш мудрагелістых часам! Справа не ў словах, не ў тым, што было колькі хвілін таму сказана. Гэта былі з н а ё м ы я словы. Не чужыя. Калісьці іх казаў ёй Сцяпан. Чаму, адкуль іх ведаў незнаёмы прафесар, было незразумела. Было нават непрыемна Ніне. Быццам ён адбіраў у яе права на мінулае. На тое мінулае, якое належала толькі ёй, Ніне. І нікому больш. Ніводнаму чалавеку...

«ЛЯЖАЧАГА ХЛЕБА НІДЗЕ НЯМА... Старая прымаўка. Татава. Тата прыгадвае яе ўсякі раз, калі трэба брацца за цяжкую работу — выходзіць у поле з плугам, складаць на драбіны трохпудовыя мяхі бульбы, паспець у час абмалаціць збажыну...

— Ляжачага хлеба няма нідзе, яй-богу, — пакрэктвае ён, ледзь паспяваючы за старэнькай калгаснай малатарняй (была наша чарга малаціць, і мы ўсе ўтраіх — тата, мама і я — завіхаемся ў свірне, загадзя звёзшы

да яго важкія, добра падсохлыя жытнёвыя снапы, увесь свой ураджай). — Не выглядай надвор'я, дачушка: восень на зіму павярнула — з дня на дзень снег ляжа. Шчыруй, завіхайся! — цяжкая зіма ўсіх нас чакае.

— Чаму цяжкая? Чаму ты ведаеш, тата? — падаючы яму наступны сноп, спрабую я перакрычаць шум малатарні.

— Немцы далёка зайшлі. Не спынілі адразу — цяпер павярнуць, пагнаць іх назад цяжка будзе, яй-богу. Быў бы я маладзейшы...

Ён змоўк і колькі часу працуе моўчкі, зрэдку пакрэктваючы. Бачу, як напружваецца, чырванее ў яго карак, калі ён згінаецца. І хачу, і ніяк не магу ўявіць немцаў, якіх павярнуць, пагнаць назад будзе цяжка. Што яны — дужэйшыя за нашых салдат? Дужэйшыя за майго Сцяпана?

— Да лютых маразоў трэба рыхтавацца, — зноў загаварыў, перамагаючы шум малатарні, бацька, на гэты раз да маці. — Збожжа звязём, папрашу ў кума каня па дровы з'ездзіць.

— Ужо ж, ужо ж, — заківала мама.

Я хутчэй здагадваюся, пра што яны гамоняць, чым чую. Шум, няроўны — цяжкімі натужнымі ўсхліпамі, — паглынае ўсе гукі, дыктуючы свой рытм, вымагаючы ўсё новых і новых намаганняў. Паднесці сноп, падчапіць новы мех, разам з мамай адцягнуць напоўнены зернем... І зноў — па сноп, па другі, па трэці...

Калі тата выключае старэнькі рухавічок, ад якога працавала малатарня, ува мне доўга не можа ўсталявацца цішыня. У вушах па-ранейшаму гудзе, рукі зрэдку ўздрыгваюць, крануўшыся пыльнай спадніцы і зноў бязвольна павісаючы ўздоўж цела.

— Управіліся, дзякуй богу! — уздыхае мама. — Паабмятай, Ніна, кругом, а мы з бацькам мяхі пазавязваем.

— Мо з сябе пачынаць — атрапацца трохі? — смяюся я. — Пылам наскрозь прапахла.

— Мы ўжо дома патрусімся, дачушка. Галоўнае: управіліся і машына не сапсавалася. Які з бацькі механік!

— Вось заўсёды ты, Ганна, яй-богу! — весела абзываецца той. — Як-ніяк, а справа зроблена. Цапамі калі б управіліся?

Здаецца, так чыста і сонечна на душы як зараз, потым ужо ніколі не будзе...

Шэра і холадна на вуліцы. Нават у хаце, зіркаючы ў акно, пацепваю плячыма. Нізам, ледзь пахістваючы цёмнае, вільготнае голле вішань, дзьме халодны вецер. Праз халодны, ледзь чутны шоргат сыплецца снежная крупа. Калі крупінкі стукаюцца ў аконнае шкло, яны пачынаюць плавіцца — і праз міг празрыстыя кроплі коцяцца, сплываюць уніз, пакідаючы дрыготкі мокры след. Таму ўсё за акном бачыцца размытым, невыразным, амаль нерэальным.

Зглядзеўшы дзве згорбленыя постаці, крыху воддаль адна ад адной, я спрабую ўгадаць, хто б гэта мог быць. Але ўсё расплываецца, расцякаецца, і ўгадаць мужчын нельга. А першы паварочвае ўжо да нашага двара, і сэрца сцялася, і сэрца гучна затахкала.

— Мама, да нас госць! — усхвалявана гукаю я, адвярнуўшыся ад акна.

— Хто?

— З акна не відаць. Не ведаю...

А сама ўжо ведаю — адчула: Сцяпан! Недарэмна ж усхадзілася сэрца. Недарэмна ж так чыста і сонечна было ўвесь дзень на душы. Хлеб хлебам...

Хтосьці топчацца на ганку. Я зноў прыліпаю да акна: весніцы адчыняе другі мужчына. Высокі. На ўсё акно. Яшчэ адзін госць?

У дзверы пастукалі. Радасна адгукаецца сэрца.

— Заходзьце! — спакойна, не павышаючы голасу, адказвае на стук мама. — Адчынена.

Я кідаюся да дзвярэй.

— Ніна! — імкнецца яна мяне спыніць.

Але я ўжо ў абдымках Сцяпана і загароджваю шлях другому госцю, не зважаючы на яго. Не заўважаючы.

— Добры дзень вам у хату! — гукае ён з-за Сцяпанавага пляча. — Не чакалі гасцей?

І я пазнаю голас: Пятровіч! І, засаромеўшыся сваёй нястрыманасці, адрываюся, адхіляюся ад Сцяпана.

— Добры дзень, Павел Пятровіч.

І, узяўшы Сцяпана за руку, вяду да маці, да ўсмешкі яе.

— Мама, гэта мой Сцяпан.

— Добры дзень, Ганна Захараўна, — схіляецца ён да матчынай рукі. Каб пацалаваць. Але яна хуценька

адбірае руку, спалохана зіркнуўшы ў мой бок. І я не магу стрымаць смеху. Смяюся. Смех быццам разрывае няёмкасць, вяртаючы імгненням іх звыклую афарбоўку. І мне, і ўсім астатнім адразу стала лягчэй: нічога не здарылася — у хаце — госць — знаёмства адбылося! Зноў заўсміхалася мама. Павярнуўся да Павэлка Сцяпан:

— Бачу, што вас не трэба знаёміць.

Я зусім забылася на свайго былога кавалера: гэта ж ён — другі госць!

— Праходзьце, праходзьце, Пятровіч! Чаго ў парозе стаяць? — запрашае яго мама. — Вы разам, ці як?

— Ваюем разам, — доўга каўтае той словы, перш чым адказаць ёй.

— А-а...

— Сватацца ён да вас... да Ніны... Вось і я — былы сакратар сельсавецкі — спатрэбіўся, — дадае, кашлянуўшы.

Я здзіўлена зіркаю на яго, гарнуся да Сцяпана: штосьці ў голасе, у позірку Пятровіча насцярожвае. Злосна ён гаворыць. Як праз зубы. І ў вачах як ноч пераначавала. Заляцанні свае да бацькі прыгадаў?

— Нешта я не разумею цябе, Пятровіч, — хмурнее маці, не хаваючы свайго незадавальнення. — Былы, кажаш? Скінулі цябе з пасады, ці як?

— Чаму скінулі? Немцы ў пасёлку...

— Дык гэта немцы тваю пасаду адмянілі? А я перапужалася была, што ты ўладзе, людзям сваім не дагадзіў.

Павэлак тузануўся на лаве, скоса зірнуўшы на Сцяпана. «Ён ненавідзіць яго, і мяне, і ўсіх нас», — мільгае ў мяне жахлівая сваёй яснасцю думка. Але я адганяю яе: за што ненавідзець? Яны ж ваююць разам, абодва па сваёй волі. Яны ж і не ведалі, пэўна, адзін аднаго да апошняга часу. І прыйсці сюды, да нас, са Сцяпанам, Пятровіч дагадзіўся...

— Ніна, збегай да хроснага, бацьку скажы, што госці ў нас, — падымаючыся з зэдліка, загадвае мама. — Ды плюшаўку маю накінь: бачыш, што на вуліцы робіцца? А я на стол збяру тым часам...»

Колькі гадоў мінула, а помніцца ўсё як учора было. Хоць згадваеш або не згадваеш маладосць, думаеш або не думаеш аб тым, што магло б быць, — жыццё ідзе як

ідзе. Па звыклым крузе. Звыклымі прамежкамі. Дзень — ноч... Ноч — дзень... Часам ад згадкі да згадкі столькі дзён і начэй міне, што з ліку саб'ешся. Ат! Навошта і лічыць дні або гады, калі яны як каменне ў сцяне, што расце і расце паміж мной і Сцяпанам? Хутка ўжо неба не ўгледзіш!

«...Бацьку я ледзьве не за рукаў цягну: хутчэй, хутчэй! Дома ж Сцяпан чакае. Сцяпан сватацца прыйшоў, і я — згодна. Згодна выйсці за яго! І выйду. Я і бацьку, і маму ўпрашу. Усё ім пра свайго Сцяпана раскажу, і яны зразумеюць мяне. Яны павераць, што Сцяпан — лёсам мне вызначаны, што я не магу жыць без яго. Яно, канечне, вайна зараз, і Сцяпана я каля сябе не ўтрымаю. Не будзе ён ля маёй спадніцы сядзець. Не будзе і не павінен. Але ж мужам ён мне стане, мужу да жонкі зазвычай лягчэй вырвацца. Вось жа адпусцілі яго зараз...

— Навошта было так спяшацца, яй-богу? — бурчыць тата, атрасаючыся на ганку. — Аддыхацца не магу.

Але я, апярэдзіўшы яго папрокі, ужо ўваходжу ў хату, ужо чую Сцяпанаў голас:

— Адсядзецца ў схроне, перачакаць ліхую часіну, Ганна Захараўна, можа, сёй-той і здолее. Але пры ўмове, што іншыя — народ наш увесь — на барацьбу падымуцца.

— Пра якую барацьбу гаворка? — пытаюся, азіраючыся на дзверы, на тату, які замарудзіўся ў сенцах.

— Ты б лепш пайшла са склепа капусты квашанай прынесла! У мяне яечня сквірчыць, — мама перапыняе, апярэджвае Сцяпана, які ўжо намерваўся адказаць. — Ідзі, ідзі! Мы тут з бацькам самі разбяромся.

Пазіраю на Сцяпана — той усміхаецца. Шырока — на ўвесь твар — усміхаецца. Значыцца, верыць, што ўсё будзе добра. Верыць, як і я, што ўсё будзе добра...»

— Ніна Цімафееўна! Ніна Цімафееўна, вы кепска сябе адчуваеце? — цягнула яе за руку, за рукаў халата Таня, медсястра. — Вам кепска?

Ніна схамянулася. Адарвалася ад сцяны, да якой незаўважна прыхінулася колькі мінут таму.

— Не-не, Таня! Я зараз... Я задумалася.

— Вы штосьці казалі. Пра касмічны палёт.

— Магчыма, — Ніна ўважліва зірнула на дзяўчыну; нібыта ўпершыню заўважаючы і яе высокую прычоску (цэлая капа на галаве!) пад касынкай, і прыпухлы маленькі роцік, падфарбаваны яркай памадай, і акуляры ў вельмі бліскучай, дарагой, напэўна, акаймоўцы. — Я даўно хацела пацікавіцца, Таня, навошта ты носіш акуляры? Зрок жа ў цябе нармальны.

— Адкуль вам гэта вядома? — успыхнула тая, падцяўшы вусны, ад чаго рот стаў нагадваць маленькую чырвоную кропку.

— Сама ж неяк казала, — усмешліва папікнула Ніна. — Забылася? Бачу, забылася: надзьмулася як мыш на крупы. Маладыя вочы, а ты іх за шкельцамі хаваеш.

Таня адмякла. Зняла акуляры і, круцячы іх у пальцах, вінавата ўсміхалася.

— Ды занадта маладыя! Хворыя нашы ні вачам маім, ні рукам не давяраюць. Вось і зараз Яўдохін з трэцяй палаты вас, Ніна Цімафееўна, патрабуе. Мне, кажа, толькі яна ўкол робіць так, як належыць. Здаецца, кажа, і баліць меней.

— Дык я ж нянечка, а не сястра, — больш па звычцы запратэставала Ніна. — Мне не паложана.

— А мне што рабіць з Яўдохіным гэтым? Ідзі, кажа, дзіцятка, гукні балесную. Вас, значыцца. А якое ж я «дзіцятка»? У мяне — дыплом.

— Ды ўжо ж! Ты ў нас вучоная. Хадзем, я паўшчуваю Ігналя. Бач, мянушку даў: ба-лес-ная... І слова ж недзе гэтакае адшукаў, чорт лысы! Хадзем.

## 11

Павэлак няспешна набліжаўся да крамы. Куды было спяшацца? Спёка. Прама нетутэйшая нейкая спёка: дыханнем нутро апякала. Мо перад навальніцай моцнай, мо перад бядой якой... Смылела ж усё ў ім з раніцы. Ён і ў краму ішоў больш каб заспакоіцца. Не піць жа на самай справе гарэлку ў такую гарачыню! Глынеш — і згарыш, богу душу аддаўшы. І на які ляд таму ягоная, Павэлкава, душа, не спытаеш... Жывеш, пакуль жывеш, а пра далейшае і думаць не варта.

Ды і тое сказаць, чаго толькі людзі не навыдумлялі за гэтулькі часу, каб прадоўжыць свой век, прадоўжыць

і ў нябыт, — ды яшчэ і там, на тым свеце, месца якое лепшае адхапіць! У богу засумняваліся — прыступкі ў вечную памяць збудавалі, ні раю, ні пекла не знайшлі, зямлю і неба прадзіравіўшы, — у космас нажытыя рублі пачалі выкідаць: авось там нешта знойдзецца! Можа, і знойдзецца. Не яму, Павэлку, думаць над гэтым. Але ён так разумеў: гнацца трэба за жыццём, а не за прагрэсам. Адно яно, жыццё, хоць так, хоць гэтак круці. У кожнага — адно. Ды і на прагрэс часам льга з другога боку зірнуць. Не вялікі мастак быў Павэлак у навуках розных, а газеты чытаў. Дапамагае, дапамагае прагрэс чалавеку, а потым супраць таго ж і абернецца — і дзяцей малых не шкадуе.

Павэлак звыкла разважаў сам з сабой. Думкі былі не надта каб спакойныя, ды ўжо ж менш вярэдзілі душу, чым прыпаміны...

Дзверы ў краму былі адчынены і завешаны доўгай марлевай фіранкай. Ад мух. З-за фіранкі чуўся злёгку хрыпаты голас Гнася:

— Дык як, Кацярына? Прыйдзеш, як установу сваю зачыніш? Га? Усе ж бабы ў ягады бегаюць!

— Якія ягады там, дзе ты сваім канём патопчашся? — засмяялася Кацярына, дражнячы яго сваім смехам. — Ды і не ў ягады ты мяне запрашаеш. Вой, не ў ягады...

— Траву прыкамечым, дык і ягады знойдуцца!

Павэлак пераступаў з нагі на нагу, не асмельваючыся адкінуць фіранку і ўвайсці — перапыніць вясёлую змову Гнася і маладайкі. «Бач ты, гэткага бугая, як Макавей, ёй мала!» — думаў ён. Без асуджэння думаў. Не ягоная ж баба. Ды і пра Макавея Ганька, магчыма, збрахала...

— А Тэклю сваю што, пад замок пасадзіш на гэты час? Учуе — жыцця табе не будзе. Свайго не аддасць.

— Хопіць і Тэклі, Каця. Абы цябе задаволіць і сябе каля цябе. Га? Прыйдзеш?

— Кхе, кхе... — не вытрымаў Павэлак.

— Заходзьце, Пятровіч! — гукнула з-за пляча Гнася Кацярына. — Не чакаць жа ўвесь дзень, пакуль сяброўку вашаму заляцанні надакучаць!

І зноў звонка, весела засмяялася, напоўніўшы смехам увесь невялікі пакой. Калі Павэлак адкінуў фіран-

ку і ўвайшоў, яму здалося: смех гэты калыхаўся ў паветры гарачай хмельнай хваляй.

— Мо перашкодзіў? — пакасіўся ён на спіну Гнася.

Гнась, нібы адчуўшы яго позірк, павярнуўся.

— Каму? Кацярыне? Дык яе ж хлебам не кармі, дай язык аб каго-небудзь пачасаць. Я трапіўся — аб мяне язык вастрыла. Зараз цябе не выпусціць, пакуль не ўесць.

— Гэткіх, як ты, уясі! Рабрыны з-пад кашулі вытыркаюцца.

— Лягчэй, Каця, лягчэй, — наваліўся бокам на стол Гнась, хочучы дастаць дзеўку. — Перастрэну ў лесе — марна прасіцца будзеш.

Тая адступіла далей. Далей ад Гнасевай рукі і спакусы. І ўжо без смяшынкі ў голасе, неяк стомлена, як адзначыў у думках Павэлак, спытала:

— Вам што, Пятровіч? «Беленькую»? Ці мо іншая якая патрэба?

— Ды якая ў мяне іншая патрэба, Кацярына? «Беленькую»? Моташна нешта.

— Чаго так?

— Спёка.

Павэлак заўважыў, што Гнась уважліва прыглядаўся да яго. Углядаўся. Быццам бачыў штосьці раней прыхаванае, нечакана раптам аголенае і не да канца зразумелае.

— Ты куды зараз, Гнась?

— Магу да цябе зайсці. Калі запросіш. Піць — спёка не дасць, а пагаманіць, пакурыць можна. А то ўсё спехам, усё на хаду.

— Пайшлі.

Яны выйшлі, кіўнуўшы ў адказ на цікаўны, здзіўлены позірк гаспадыні крамы. Ішлі моўчкі. Гнась вёў за повад каня, зрэдку абарочваўся на яго фырканне. Павэлак ступаў побач, крок у крок, несучы ў руцэ загорнутую ў газету бутэльку. Моўчкі мінулі бабу Грыпіну, што па-ранейшаму тупала, намацваючы шлях сваім кійком. паўз вішняк, — наглядавала за квактухай з вывадкам куранят. Моўчкі размінуліся з паштаркай, з Марфай, якая, скончыўшы, відаць, работу, ішла дадому. Моўчкі скіраваліся ў Павэлкаў двор і, як толькі Гнась павязаў каня, у хату.

У хаце спёка амаль не адчувалася. Звінела недзе муха, абжываючы цішыню. Цікалі ходзікі.

— Пісьмо я атрымаў, Гнась, — сказаў, калі яны селі каля стала, Павэлак. — Страшнае пісьмо.

— Адкуль?

— З мінулага. Я зараз...

Ён разгарнуў бутэльку, паставіў яе на стол, схадзіў і прынёс, дастаўшы з шуфляды, ліст.

— Вось, чытай. Я збяру што паесці.

— Ды не трэба, — адмахнуўся Гнась, дастаючы цыгарэты. — Прачыні трохі дзверы ў сенцы: курыць... хочацца...

Гнась ужо апусціў вочы — чытаў, раз-пораз вяртаючыся назад — разбіраючы чужы почырк. Бровы сышліся ў яго на пераноссі, раптоўна змяніўшы твар. Зрабіўшы яго нібы вытачаным з каменя, суровым, жорсткім нават.

— Налівай, ці што? Шкварку ж да нечага нёс!

Павэлак адкаркаваў бутэльку, напоўніў да палавіны прынесеныя шклянкі і выпіў сваю. Моўчкі. Як на памінках. Уцёрся рукавом. Апусціўся на лаўку, не ставячы на стол посуд. Шкло як не хруснула ў яго моцна сцятых, пабялелых пальцах, а ён не зважаў — усё сціскаў і сціскаў іх.

— Ты... нічога не ведаў?

Павэлак цяжка падняў галаў.

— Ты што — не ведаў?!

— Не, — выціснуў з сябе Павэлак і ўздыхнуў: трохі адпусціла. — Ды і цяпер... што я ведаю... Нават меней, чым тады.

— Ты і — Фрося? Не-е... А я, дурань, мазгі высушыў гадаючы...

Гнась круціў у руцэ лустачку хлеба, зрэдчас зіркаючы на Павэлка, на яго прыгорбленыя плечы і звялы твар, на яго ўспацелую ад духмені (ды і ад выпітай гарэлкі!) ладную ўжо лысіну праз усю галаву, спрабаваў прыгадаць яго ранейшым, маладым і ганарлівым. Спрабаваў і не мог. Не прыгадвалася. Ці пражытыя разам — непадалёк — гады перашкаджалі.

— Такая дзеўка цябе кахала!

— Пры чым тут: кахала — не кахала? Ты па сутнасці скажы. Па сутнасці пісьма гэтага.

— Дык у тым і сутнасць уся: кахала цябе Фрося. Цябе, а не Хведара Верамея.

— Пра Хведара ў пісьме няма.

— Ну, пэўна ж. Сын у Фросі ад ця... бе, — запнуўся Гнась на слове і ўсё ж працягваў, не хаваючы жорсткіх нотак у голасе. — Ад цябе, таго, хто яе ніколі не кахаў. А кахаў яе Хведар! — праз тое і загінуў. І Фросю не ўратаваў, і сам загінуў. Ты і гэтага не ведаў?

— Не, Гнась. Не!

Так горача выдыхнуў сваё «не!» Павэлак, такі разгублены (каб не сказаць: пабіты) твар у яго быў, што сумнявацца было нельга. Не ведаў. «Добра, хоць так, — мільганула ў памякчэлым паглядзе Гнася, які, нарэшце, узяў шклянку і цяпер піў — цадзіў — гарэлку праз сціснутыя зубы. — Добра, хоць так!»

— Вось ты цяпер, мабыць, думаеш пра мяне: сукін кот ты, сябра, змануў дзеўку і нават лёсам яе не цікавіўся — пра сына свайго, пра тое, што быў у цябе сын, быў! — праз столькі год дазнаўся. Не бачыў яго і не ўбачыш ужо! — і так табе, лысай падле, і трэба... Жыў, як і ўсе, ваяваў, як і шмат хто, а са шкарлупіны сваёй не вылез... Не вылез, брат. Мо толькі сёння зразумеў, што не вылез. Не спрабаваў нават. Баяўся.

Павэлак дрогкай рукой наліў сабе гарэлкі, пасунуў бутэльку ў бок Гнася, так і не зірнуўшы на яго, выпіў.

— Баяўся! Усяго баяўся. Мін, якія падкладваў пад рэйкі. Немцаў, якіх забіваў. Слоў, што трэба было казаць, памінаючы сваіх хлопцаў. Думак сваіх, што часам штурхалі ў траву, у кусты, далей ад куль, ад болю. Усяго баяўся, Гнась. І ў вайну, і потым, калі яна скончылася. І зараз... Быццам увесь свет супраць мяне!

— Глупства! — рашуча перапыніў яго Гнась. — Свет не можа быць супраць чалавека, калі чалавек не ідзе супраць яго і супраць людзей.

— Я ж пра сябе кажу.

— І я пра сябе. Але і пра цябе, і пра ўсіх! Сам жа вызначыў: жыў, як усе, ваяваў, як усе. А шкарлупіна — яна ў кожнага ёсць. Толькі ў аднаго тонкая — душа свіціцца, а ў другога — мохам, як бранёй, пакрытая. Ты што думаў: я — не баяўся? я — пад кулі лез без страху? Проста нельга было інакш. Інакш — у макрыцу абярнуўся б.

— Я пра сябе кажу.

— Што ты заладзіў: пра сябе, пра сябе? — зазла-

ваў Гнась. — Ці ж я цябе не ведаю? Разам за смерцю палявалі.

— Ды не за смерцю мы палявалі! Смерць як сядзела ў нас, так і сядзіць, часу свайго чакае... За страхам мы палявалі. Каб страх не перамог, не задушыў.

— Ну, не перамог жа! Не задушыў!

— Не задушыў...

Павэлак зноў падаўся да бутэлькі і быццам забыўся на свой рух, на тое, што хацеў наліць сабе яшчэ трохі. Пот цяжкімі, пад колер асмужанай на сонцы скуры, кроплямі каціўся па скронях, абмінаючы натапыраныя, выцвілыя кусцікі аднаго і другога брыва. Але ён не ўціраўся. Мо проста не заўважаў. Як не заўважаў напружаных, колкіх позіркаў сябрука, якімі той адгароджваўся — спрабаваў адгарадзіцца — ад яго, Павэлкавай, пакуты, ад гэтых цёмных кропель поту ў яго на скронях, ад цішыні, што раптам усталявалася ў хаце. Надакучліва звінела недзе муха. Цікалі ходзікі, падганяючы млявы, размораны гарачынёй час.

«КРЫВІ НА КРЫВІ НЕ ВІДАЦЬ... Усё на вайну спішацца. Як ні праспешвай: хуткага канца ў яе не будзе. Па ўсім адчуваецца: не будзе. Шмат народу яна перамеле. Мо і мяне...

Не! Выжыву я. Як бы ні павярнулася — выжыву. Хто-хто, а я не дам сябе абхітрыць. Быць такога не можа. Для нечага ж я нарадзіўся, не проста для смерці. На пасадзе мала чаго пабыў, ажаніцца хацеў — не атрымалася. А гэны... І вайна яму не вайна.

Ненавіджу! На маё пазарыўся, з-пад носа... Не вернецца ў атрад, хто будзе дакопвацца чаму? Ці мала хто ў лесе сёння хаваецца? Чаго лягчэй: перастрэць за вёскай... Калі назад пойдзе... Крыві на крыві...

Услухваюся ў цемру, быццам думкі мае могуць падслухаць. Спяць жа ўсе. Пазасыналі. І ён заснуў. У сне, няйнакш, бачыць сябе ў Нініным ложку... Ды што бачыць! Заўтра ляжа. Я — сваёй рукой! — дакумент складу адпаведны, дазвол дам, замест таго каб сваёй рукой прыдушыць... Ра-зум-нік, паскуда! Пра жыццё расказваў, якое будзе, за якое людзі змагаюцца. Ды не за «якое» — за сваё змагаюцца. І ён — за сваё. Не чакаў жа канца вайны, зараз у мяккім ложку хоча пакачацца. Пакачаецца! Перад смерцю сваёй...

А што? Нянавісць — гэтаксама сіла. Яна і руку пад-

штурхне, калі сумненне спыніць. Не мая дзеўка, хай і ён ёй не нацешыцца! Гэта толькі справядліва будзе. А што свайго... Навошта дарогу перайшоў? Навошта дзеўку зманіў словамі салодкімі? Я не ўмеў гэтак, не ўмею, — а сэрца ж і ў мяне ёсць. Мала кабылу папаганяў у гэтае богам забытае Запярынне?

Не, гэта толькі справядліва будзе. І бог бы гэтак рассудзіў, калі б быў. А Ніна... Паплача, паплача — і забудзе. Уся вайна яшчэ наперадзе.

Ужо ж лепей было б прыкончыць яго раней, па дарозе сюды. Дзеўку б не папсаваў... Ды па дарозе сюды я не мог. Ніяк не мог. Камандзір жа выпраўляў. Усе бачылі: разам мы выходзілі з лагера. Адно: і сябе разам з ім трэба было канчаць... Чым бы растлумачыў? Свае б да сценкі паставілі. І так і гэтак нявыкрутка.

Не, па дарозе сюды я не мог. А вось як вяртацца будзе, шчасця напіўшыся, у самы раз і...

Сена запахла. Угрэлася і запахла. Канечне, на ложку яно б і ямчэй было, як на падлозе, — не лета ж! Ды неяк пры чужаку гэным няёмка стала Цімоха ўважыць — ложак ягоны заняць. На сене не горш. Толькі што шабуршыць на кожны рух. Не тое што рух, думка раптам палохае... Ды і гэны, чужак гэны — побач. Паўлокцяя якога падзяляе. Добра, што хоць пасцілкі лішнія ў хаце знайшліся: побач — а паасобку мы з ім.

Вось і ў жыцці мы — паасобку. Вайну ў разлік узяўшы, нібыта і свае, а — чужыя. Ніна паміж намі. За дзеўку душу не пашкадую, на забойства пайду. Як вяртацца будзе, шчасця напіўшыся, у самы раз і... Гэта толькі справядліва будзе!

Хто калі пра мяне думаў? Хто мяне любіў за ўсё жыццё маё сірочае? Цётка дом пакінула — дык жывой ёй, пакуль не памерла, вярней, чым сабака служыў. Ледзь што рукі не лізаў за чэрствага хлеба акраец і дах над галавой. У ногі бухнуўся, калі ў школу паслала, касцюмчык картовы справіўшы. Яшчэ больш спіну гнуў, завіхаючыся па гаспадарцы. Яшчэ больш дагаджаў.

«Няпростага сялянскага роду мы, гэта помні! Адзін з двух атожылкаў — па матчынай лініі — да старога шляхецкага роду вядзе... Ужо ж гэткімі гарапашнікамі, як і іншыя, і Ляховічы з цягам часу сталі, а вось жа прыгадалі ім іхні род, калі шукалі, каго раскулачыць. Папомнілі. Гэткія ж гарапашнікі, як і іншыя былі, што

праўда, то праўда, а вось жа папомнілі, што няпростага сялянскага роду...» — прыгаворвала цётка штовечар.

Простага, няпростага роду — якое гэта мела значэнне? Ужо і тады ніхто родам не цікавіўся: чым прасцей — тым лепей. Спакайней. Навошта мне было помніць тое, ад чаго карысці ніякай? Я і яе, нябожчыцу, прыгадаў адно таму, што сябе зноў пашкадаваў. Што сябе зноў шкада стала. Б'юся, б'юся колькі ўжо гадоў, вось-вось ужо, здавалася, бога за крысо ўхаплю — аж не! З немцам трэба ваяваць. І дом пакінуў на суседзяў, і дзеўку з-пад носа хлюст гэны звядзе.

Не, Паўэлкам я не буду, калі ўсё на свае месцы не пастаўлю. Доля доляй, але ж і я на нешта здольны. Не так, дык гэтак, а сваё вазьму! — не я гэта прыдумаў. Крыві на крыві не відаць...»

— Пайду я, Павэлак. Чым тут дапаможаш? — падняўся Гнась.

А мо ён і даўно таптаўся каля Павэлка, не рашаючыся крануць таго за плячо. Павэлак з-пад ілба глядзеў на старога сябрука. Гадаў: што ён заўважыў на ягоным твары. Муку? Сумненне ў правільнасці пражытага? Шматгадовую стому? Хоць што было гадаць, калі ў самога Павэлка не было адказу на ўсе пытанні, якія раптам як пасыпаліся з ягонай душы. Ці з мінулага...

— Пасядзеў бы. Гарэлку ж не дапілі.

Сказаў і апусціў вочы. Піць не хацелася. Недзе глыбока ў ім варочалася млосць.

— Пайду. Ды і гарэлку ўсю не перап'еш... — Гнась таптаўся каля Павэлка, быццам хацеў яшчэ штосьці сказаць.

— Тэклі сваёй не ўводзь у вушы: увесь пасёлак адразу загудзе, — ціха папрасіў Павэлак. — Трэба самому перш разабрацца.

— Ды што цяпер разбірацца? — не ўцярпеў, ускіпеў Гнась. — Тады трэба было. Раней. Не Ніну ў памяці адваёўваць, а да Фросі прыглядзецца. Такая дзеўка цябе кахала! Ды я б за яе... няйначай як Верамей, жыццё б за яе не пашкадаваў. І не я адзін. Агонь-дзеўка! К чорту на ражон лезла. Такія звесткі прыносіла, што ўсёй нашай разведцы не здабыць. А дзіця ж насіла. Тваё, выходзіць...

— Маё, выходзіць.

Павэлак апусціў галаў на рукі і аціх, увесь згорбле-

ны, натапыраны, востры, і столькі было ў гэтай яго натапыранай, згорбленай постаці млявай, нейкай нібыта і не мужчынскай зусім бездапаможнасці, што Гнась не стаў працягваць, хоць усё ў ім кіпела, хоць яму ніколі не траплялася больш зручнага моманту, каб выказацца — выказаць Павэлку сваё, гэтаксама дасюль не перабалелае...

## 12

Калі Ніна з сястрой уваходзілі ў палату, насустрач ім ужо радасна гудзеў Ігналь:

— Вось цяпер я згодны. Вось цяпер я ўсе як ёсць вены падстаўлю пад вашыя іголкі. Вось цяпер іншая справа!

— Да пажылых гадоў дажыў, а ўсё ў хлопчыка гуляеш, — спыніла яго гудзенне Ніна. — Чым табе Таня не дагадзіла? Яна ў нас вучоная, спецыяльна, каб гэткіх, як ты, лячыць, вучылі ў горадзе.

— Дык я што? Я нічога. І я кажу: вучоная. Навошта на мяне сваю навуку марнаваць? Мне ля тваіх рук спакайней, Ніна. Дальбог, спакайней.

— Я нянечка. Мне не паложана.

— Паложана не паложана... З хворымі ж таксама лічыцца трэба. А то ледзь што: да пажылых гадоў дажыў... Якія ж гэта пажылыя гады? Падрамантуеце крыху сэрца — хоць куды буду!

Вочы ў Ігналя паблісквалі, і хоць ляжаў ён смірна, з гатоўнасцю прасцёршы руку на край ложка, па ўсім адчувалася, што гэта толькі момант такі, што ляжаць ён даўно не ляжыць, — абрыдла, што набліжаўся дзень, калі ён, развітваючыся з усімі, скажа тое ж, што і кожны, хто выпісваўся паздаравелым, акрыялым: «Усё ж лепш да вас не трапляць!»

— Сэрца-то табе падлечаць, — усміхнулася Ніна, рыхтуючы шпрыц, — а вось з языком, ад слоў распухлым, пэўна, ніхто не ўправіцца. Чалавек гэткі яшчэ не нарадзіўся. Урача гэткага яшчэ няма. Ты, Ігналь, баб пасялковых часам не кансультуеш?

— Кансультуе, калі якая ў прыцемку пад руку трапіцца, — буркнуў стары Пятрок, хаваючы ў вусы ўсмешку.

Усе ў палаце засмяяліся.

— Я пратэстую, Цімафееўна, — рагатнуўшы разам з усімі, спрабаваў надаць твару сур'ёзнасць Ігналь. — Супраць нагавору пратэстую. Нашы жанкі самі каго хочаш пракансультуюць — да-обра языкі падвешаны. А каго б і хацеў перастрэць калі ў прыцемку, не трапляецца... Ці во, хіба што Пятрок стары пераймае! Параілі б што, а то: «га-га-га» ды «гы-гы-гы». Ведама ж, з хворага можна!

— Памаўчы трошкі, хворы, а то ўкол не разыдзецца.

— Тваёй рукой зроблены?

Ніна азірнулася ўжо ад століка.

— Ніна Цімафееўна, я пайду ў наступную палату. Дзякуй вам за дапамогу.

— Што? Якую дапамогу? — адвярнулася да яе — ад балючай згадкі і ад Ігналевых вачэй — Ніна. — Якая ж тут дапамога? Спатрэблюся, то я ў садку буду. Ці мо калі Дзмітрыеўна запытае раптам... У садку пасяджу. Натапталася зранку, трэба нагам роздых даць. У садку і спёка не так адчуваецца: вальней дыхнуць льга...

«АДНА БЯДА — НЕ БЯДА... Хто гэта сказаў? Каму? Куды мяне нясуць і навошта? Штосьці здарылася. Трэба абавязкова ўспомніць. Я ж помніла! Я зараз успомню...

Усю ноч снег ішоў. Першы — рэдкі яшчэ — снег. Белы-белы. Нават ранак заняўся раней ад светлыні яго. Тата па дровы з кумам ехаць збіраўся. І паехаў. Гадзіны не мінула — мама толькі жывёлу накарміла і адышлася, да суседкі, пэўна, — як ён вярнуўся. Я ў акно ўбачыла. Ступаў цяжка, незнаёма згорбіўшыся, — быццам хаваючы твар.

— Што-небудзь здарылася, тата? — кідаюся яму насустрач і застываю, камянею на паўдарозе.

Штосьці здарылася. Сэрца раптам зайшлося...

Мама? Сцяпан? Не... Ён жа толькі ўчора развітаўся з намі, у атрад вярнуўся.

— Што здарылася, тата?

— Пачакай, дачушка. Зараз я... Ах ты, яй-богу!

— Мама? Што з ёй? Што... з ёй?

Адчуваю, што падкошваюцца ногі. Што, калі не ўхаплюся рукой за стол ці за вугал печы, — упаду.

— Сцяпан... там. Сцяпана...

Маўчу я? Ці крычу? Ці нямею ад набраклага кры-



вёй крыку? Адпіхваю печ. І рукі татавы. І цяжкія дзверы. І ранак, які перахапіў мяне на парозе — асляпіў... Снег. Кругом — занадта белы снег. Нічога не бачу. Я — нічога — не бачу!

— Сця-па-ан!!!

Бягу. Падаю. Бягу праз двор. Па вуліцы. Ні зямлі, ні неба не відаць. Нічога не бачу. Ведаю, што бягу да хроснага. Да яго двара. Не! Я — да Сцяпана бягу. Натыкаюся на чыесьці рукі і вырываюся: хто асмельваецца мяне ўтрымліваць?

— Ніна! Ніначка!

Гэта мама загаласіла. У яе руках я б'юся, ад яе вырываюся.

— Ма-ма!

Хіба гэта мамін твар? Ён жа чорны. Чарнейшы за снег вакол. На момант я ўсё бачу: маму, клін вуліцы, голую ліпу, прыцярушаную чорным снегам, ля варот натоўп, што сабраўся вакол падводы, край падводы, боты, што тырчаць адтуль...

— А-а!!!

Крык разарваў мне грудзі? Я не дабегла...

— Пусціце мяне! Куды вы мяне нясеце?

Нясуць. Не чуюць, пэўна. Крык разарваў мне грудзі... Гэта я памерла. Я, а не Сцяпан. Гэта мяне забілі, мяне!

— Мама, гэта мой Сцяпан. Пра якую барацьбу гаворка?.. Гэта Фрося гукае. Сяброўка. Бабы гудуць... Вёска ўсё ведае. Сватоў будзе засылаць... Тата спытаўся б у мяне, перш чым слова даць! Мама, гэта мой Сцяпан. Спакон вякоў дзеці бацькоў слухаюць, спакон вякоў... Мама, гэта мой Сцяпан! Дзівак... На зямлі мы нараджаемся, на зямлі і паміраем. Бабы гудуць... Цяпер так заўсёды будзе: ты і я? Цяпер так заўсёды... Мама, гэта мой Сцяпан...

— Ніна! Дачушка мая, хоць слоўка скажы! Адкрый вочы, дзіцятка, зірні на нас... Божа ж мой, божа, за што ты караеш яе?

— Мама, гэта мой Сцяпан. На душы чыста і сонечна... Што-небудзь здарылася, тата? Гэта Фрося гукае. Сяброўка. Мяне Сцяпан чакае... Я памру без цябе, без тваёй любові... Мама, гэта мой Сцяпан!

— Ніна! Ніна!

На момант я ўсё бачу: бэльку праз усю столь, чорны

прагал акна, бліскучую спінку свайго ложка, маміны рукі ў мяккіх зморшчынках. Маміны рукі...

— Ніна! Дачушка!

Як пастарэла за гэты дзень мама! І вочы спалоханыя... Баіцца, што я распытваць пачну. Але я ўжо ведаю. Я ўсё ведаю. Я толькі яшчэ раз зірну на яго, на свайго Сцяпана. Мама дазволіць. Мама мне ўсё дазваляла заўсёды. Часам і супіла бровы, а дазваляла.

— Дачушка! Ты ачуняла? Ты чуеш мяне? Чуеш?..

Я чую. Я хачу сказаць ёй, што чую. А вусны чамусьці не варушацца. Як зляпіліся. Спрабую прыўзняць галаў.

— Ляжы, ляжы! Чуеш... Дзякуй богу, дзякуй богу, ачуняла! І бацька парадуецца, — мама схіляецца нада мной, цалуе, асцярожна цалуе, як хворую. — Цяпер я цябе, дачушка мая, падыму, цяпер, дзякуй богу, на лепшае павернецца.

Я хачу сказаць ёй — папрасіць, каб дазволіла мне пайсці туды, на вуліцу, каб дазволіла зірнуць... Але яна перапыняе мае думкі:

— Я табе зараз булёнчыку наллю, пакармлю. Ён цёплы, ён у печы. І акно прачыню... Паслухай, як птушкі пяюць. І дзень спякотны, а яны хоць бы што — пяюць...

Птушкі? Спякотны дзень? А куды снег дзеўся? Белы-белы. Снег, што за ноч нападаў. Ад якога я аслепла...

Мама адчыняе акно. Тое, што ў сад. Я па кроках вызначыла. У акно забытымі пахамі хлынула цяпло. Пела малінаўка... З цяжкасцю, праз натугу, павярнуўшы на падушцы галаў, бачу цёмна-зялёнае лісце, голле яблыні, густа пакрытае цёмна-зялёным лісцем, праз якое прасвечвае бляклае, гарачае неба...»

Цёмна-зялёнае лісце... Голле яблыні, густа пакрытае цёмна-зялёным лісцем, праз якое прасвечвае бляклае, гарачае неба... Зусім як сёння, падумалася раптам Ніне. Яна ўсё яшчэ была дома, выразна бачыла і бэльку праз усю столь, і адчыненае ў сад акно, і голле яблыні... Згадка не адпускала, забраўшы і гэту апошнюю думку. І ўсё ж думка паступова адольвала, перамагала смугу былога. Згадка ўсё больш нагадвала малюнак, у які Ніна працягвала ўглядвацца, не могучы адвесці позірку. Дзень быў зусім як сёння.

Яна прыкрыла твар рукой, нібыта засланяючыся ад

прыгаданага. Калі б не гэта дрогкая, неспакойная рука, можна было б падумаць, што Ніна адпачывала. Драмала пад каржакаватай, галінастай яблыняй, прыхінуўшыся спіной да яе камля і выпраставшы на траве стомленыя ногі.

Балесная... Пэўна ж, гэта не мянушка! — прачнулася ў ёй іншая, не колішняя туга. Зашмат болю і спачування ў слове. А тады атрымлівалася: шкадаваў яе Ігналь. Пашкадаваў. Чаму? Навошта? Не было яе за што шкадаваць. Жывая. Не хворая...

Ніне здавалася: яшчэ крышку — і яна зразумее, у чым справа. Жывая. Не хворая. А можа — хворая? Можа, ёсць гэткая хвароба, пра якую і Дзмітрыеўна не ведае? Не помніць жа Ніна тыя паўгода, што праляжала ў ложку пасля смерці Сцяпанавай, пластом праляжала... Маці казала, што як мёртвая ляжала. Значыцца, і была мёртвай. Адпусціла яе смерць, ды не да канца, відаць. Не зусім адпусціла. Ценем за ёй ходзіць. І не забірае, і жыццю не аддае.

А цяпер вось згадкі ажылі. Знак не знак, а, пэўна ж, мяжа нейкая перад ёй. Пераступіць Ніна — жыць будзе, не пераступіць...

Ніне здавалася: яшчэ крышку — і яна зразумее самае галоўнае, самае важнае, без чаго абыходзілася яна дагэтуль і далей абыходзіцца не зможа. Не зможа і не павінна. Для нечага ж смерць адпусціла яе тады, хай сабе і не да канца. Для чаго? Тады, у вайну, яна, здавалася, ведала...

## 13

— Раскажы, Гнась, пра яе. Пра Фросю.

Гнась, які ўжо скіраваўся да парога, здзіўлена азірнуўся на Павэлка. Цераз плячо. З адным жаданнем: паслаць сябрука туды, куды д'ябал не даскочыць... І, уражаны тым, як за лічаныя хвіліны змяніўся ў таго твар — пачарнеў, зменшыўся, нібыта прыліплы да скул, — стрымаўся. Моўчкі вярнуўся да стала. Моўчкі заткнуў пробкай недапітую бутэльку. Адсунуў талерку з амаль некранутай закуссю і шклянкі. Сеў. Утаропіўся на Павэлка.

— Вунь як цябе... Перакруціла ўсяго. Га?

— Нечакана ўсё. Не думаў я...

— Думаць, брат, заўсёды не шкодзіць. Ды не ў думках справа. Здараецца, і зашмат думаеш, а пад носам у сябе нічога не бачыш, — углядаючыся ў сябрука, як ніколі раней, пільна, падшукваў словы Гнась. — Лёгка сказаць: раскажы! Што расказваць?

— Усё. Усё, што ведаеш.

Кепска было Павэлку. Не мог ён гэтага схаваць. Ды і не хацеў зараз. Гнася спыніў, расказ ягоны пачуць хацеў. Ці то горш, ці то лепш, лягчэй стане, ды ўжо ж лепш, чым застацца зноў аднаму, сам-насам са збуджаным у душы болем.

— Усё раскажы. Якая яна была?

— Га? Якая? — палез па цыгарэту Гнась. — Прыгожая. Прыгажэйшай, чым яна, і не сустракаў я болей ніколі. І не сустрэну.

З гэтакай сілай вымавіў ён гэта, гэтак моцна ўздрыгнулі яго пальцы, выцягваючы цыгарэту, што Павэлак падняў галаву і запытальна зірнуў на Гнася. На момант варухнулася ў ім здагадка, ды такая кволая, што яму і адмахвацца не давялося. Так, варухнулася штосьці і ацiхла.

Учуўшы пах дыму, адчуў, што даўно хацеў закурыць... А Гнась, глыбока зацягваючыся дымам, працягваў. Цяпер ужо цішэй. Спакайней.

— Вайна ўсё парушыла. Фросі б жыць ды жыць — жыццю, песням сваім радавацца... Ат! Мы, мужыкі, ваявалі — і то ўсяк даводзілася. А колькі яна адпакутавала, пра тое яна адна, мусіць, ведала. Мачыха як чула што нядобрае, зверам на яе глядзела. Ледзь угледзела, што дзіцем ходзіць Фрося, што зацяжарала, — з хаты, на зіму гледзячы, выгнала. Га? Фрося яшчэ ў атрад прыбягала, перш чым у пасёлак пайсці. Бабіха — ты ж яе ведаў! — ёй цёткай нейкай далёкай даводзілася... Угаворвалі мы Фросю застацца ў атрадзе. Не, і ўсё! У пасёлку, маўляў, ад яе карысці больш будзе. Раней толькі наязджала туды, а цяпер жыць будзе... Нават я не здагадваўся пра сапраўдную прычыну. Угаворваў, як і Хведар, бо немцы стаялі ў пасёлку. Ці мала што!

Ён скамячыў пагаслую цыгарэту. Пачаў прыпальваць новую. Трымаў запалку, апякаючы пальцы, пакуль прыкурыў Павэлак.

— Я і сам не ўсё ведаю. Больш ад іншых... Сувязь з намі дванаццацігадовы браценік яе, Жэнька, трымаў. На станцыі ўладкавалася Фрося. Прыбірала. Ваду кі-

пяціла. Каму што пасобіць трэба — пасобіць. А усёй платы, што з кухні салдацкай і ёй часам што-якое перападала... Га? Тауклася цэлы дзень на станцыі, глядзела, слухала — у школе ж першай была па мове іхняй нямецкай, спатрэбілася! Што пачуе — праз Жэньку нам перадае. Усе нашы з табой подзвігі на чыгунцы яе, Фросінай, мужнасцю аплачаны спярша... Гэта ўжо потым, пасля вайны, стала вядома. Вось яно як!

Гнась замоўк. Быццам услухваўся ў мінулае. Або ў сябе, у тое, што гучала ў ім зараз. А Павэлак і не заўважаў гэтага маўчання: маўчалі ж яны з Гнасем побач падоўгу неаднойчы і заўсёды разумелі адзін аднаго. Менавіта маўчанне часцей і збліжала.

Павэлак паспрабаваў прыгадаць старую Бабаіху, што памерла недзе адразу пасля вайны. Прыгадвалася толькі невялічкая, сухенькая яе постаць, як прывязаная да кавенькі. Да занадта высокай для старой кавенькі, гэткай жа сухенькай, згорбленай, як і гаспадыня. Ды хата яе на ўскрайку пасёлка: усёй хаты — назва адна...

Хоць калі зірнуць з іншага боку, то чаму ён, Павэлак, павінен быў тады цікавіцца нейкай Бабаіхай? Жыла і жыла. І ён жыў. Праўда, далей — вышэй, на самым пагорку. Траплялася часам яна на вочы — кранаўся капелюша ў адказ на вітанне старой. Як вядзецца. І ўсё. І навошта было ў яе ўзірацца? Ці мала хто трапляўся на шляху? Ці мала людзей жыло ў пасёлку?

Бабаіха... Ён нават Фросю цяпер, больш як праз дваццаць гадоў, прыгадаць не мог. Гнась сказаў: прыгожая, прыгажэйшай, чым яна, не сустракаў. А ён, Павэлак, побач з Нінай яе ніколі папросту не заўважаў. Не бачыў. Гнась сказаў: прыбягала яна ў атрад, перш чым у пасёлак пайсці. Пэўна ж. Прыходзіла. Ноч з ім, з Павэлкам, цішком правяла. А ўсё, што запомнілася: асляпляльна белае полымя, у якім згараў, — успыхнула ноч, апаліла яго і згасла.

« З Нінай у мяне ніколі гэтак не было!» — балюча заныла ў ім штосьці забытае, даўняе-даўняе.

— А дзіця... — Павэлак папярхнуўся словам, закашляўся. — З дзіцем яна — як?

— Га?

— З дзіцем, кажу, як? Як упраўлялася?

Павэлак няўпэўнена намацаў рукой ручнік, што вісеў на спінцы крэсла, пачаў выціраць спатнелы твар, шыю. Бы толькі зараз адчуў, што яму горача. Бы ўпер-

шыню заўважыў, што не ўздрыгваюць — дрыжаць рукі, а ён усё не знойдзе ім месца ні на стале, ні на каленях.

— Вера, сястра яе меншая, услед за ёй пераехала. Любіла, мусібыць, Фросю больш як бацькоў. Як нітка за іголкай, за ёй цягнулася. Га? Любіла, кажу, мусібыць... Маці сваёй, што Фросі мачыхай была, нават калі памірала тая — не даравала. Зімы той першай, лютай, не даравала. Сама яшчэ дзіця, з Фросіным сынам на руках засталася, а дамоў не вярнулася.

Ён зноў памаўчаў. Колькі раз зацягнуўся.

— Як пагналі немцаў, гады два-тры прымала маю помач — чым я тады асабліва мог дапамагчы, га? — а потым адмовілася. Рашуча. Падзякавала за ўсё і адмовілася.

— Што ж мне, мне не сказаў ніколі нічога?

— Табе? — Гнась неяк крыва, балюча ўсміхнуўся. — Хто ж яго ведаў... Ты ж і сам не ведаў, кажаш... Га?

Некуды адхлынула сэрца. Ад гэтай крывой, балючай Гнасевай усмешкі — хоць і згасла яна ўжо, і патанула ў тытунёвым дыме! — Павэлку не было куды дзецца. Твар у твар сядзелі.

«Мо спыніць гаворку? Мо лепш было б аднаму ва ўсім разабрацца?» — памкнуўся быў сказаць ён гэта Гнасю, але толькі скамячыў, сціснуў ручнік да болю ў пальцах і, адступіўшыся, кінуўшы яго на стол, пацягнуўся да недапітай бутэлькі.

— Будзя, Пятровіч, — на міг перапыніў яго рух Гнась. — У гэтакую спёку і да бяды недалёка. Га? Я ж бы мог і не казаць табе...

— Кажы.

Павэлак прыўстаў, падчапіў дрогкай рукой бутэльку, пасунуў бліжэй. Асцярожна ўзяў шклянкі. Паставіў адну перад Гнасем, другую, не ставячы, напоўніў да палавіны.

— Усё роўна ўжо. Табе наліць?

— Ды не, — хацеў, памкнуўся ўжо прыкрыць далоняю сваю шклянку Гнась і, спахмурнеўшы, толькі адмахнуўся. — Ат! Налі. Гэта ж нібыта памінкі ў нас. Неяк абыдзецца.

Выпілі. Прыкусілі. Разам пацягнуліся да курыва.

— Ды не круці сваю... Вазьмі з пачка. Адзін смак!

— Звычка. З вайны яшчэ, — вяла адказаў Павэлак,

скручваючы цыгарку і рассыпаючы тытунь. — Калі... яе? У сорак трэцім?

— У сорак трэцім. Данёс нехта. На станцыі і забралі. Мучылі...

Гнась кінуў цыгарэту. Сам разліў рэшту гарэлкі па шклянках.

— Не магу! Дасюль прыгадваць гэткае не магу. Хай ужо мы, га? Хай мне спіну асколкамі пакрамсала, га? Хай Хведара Верамея, які вызваляць яе кінуўся і цяжка паранены трапіў ім у рукі, зрэзалі ўсяго і сабакам аддалі, га? А яе — нашто? А ўсіх жанок і дзяцей — нашто? Мы ж іхнім бабам не помсцілі! Мы ж іхніх дзяцей не чапалі! Га?

— Дык то ж мы.

— Тое і яно.

Памаўчалі. Моўчкі дапілі гарэлку, памінаючы кожны сваё. Памінаючы Фросю. І сына яе. Фросінага і яго, Павэлкавага, сына. Гэта і было самае балючае. Самае што ні на ёсць балючае. І сына...

— Бач, як абярнулася! — нарэшце азваўся Гнась. — Фросю пасмяротна ўзнагародзілі, і сын яе героем памёр... У мірны час загінуў. А мы жывём...

Ён падняўся. Ледзь было не пахіснуўся, але, лёгка адштурхнуўшыся ад стала, ступаў цвёрда, цвяроза. Павярнуўся ад парога:

— Ты, відаць, спачування чакаў? Прабач, Пятровіч, язык не павярнуўся табе паспачуваць: мо і з-за цябе яна... Га?

Бразнулі дзверы. Павэлак застаўся сядзець ля стала. Адзін у сваёй хаце. Сам-насам з гарачай, ліпкай цішынёй. Ён усё ўслухваўся ў цяжкія, размераныя Гнасевы крокі. Бух-бух. Бух-бух... І раптам, спалохаўшыся нечага, зразумеў: ніякія гэта не крокі — Гнась ужо на сваім Гнядым, пэўна, двор старой Грыпіны мінуў! — гэта так цяжка сэрца яго кроў разганяла па жылах. Як выштурхвала: бух-бух!

Не хапала яшчэ богу душу аддаць зараз! — зазлаваў ён на свой страх. «Мо і з-за цябе яна...» Як жа, з-за яго! Бач, вывеў! Хто гэта калі баб разумеў? Ён, Павэлак, пра сябе гэткага ніколі б не сказаў. Ён — не разумеў. Клалася якая з іх калі пад бок, ён і ў думках не шукаў чаму. Вядомая справа, адна на ўсіх прычына.

Усе з аднаго цеста. А мужык ён, дзякуй богу, спраўны...

— Цьфу, пра што думаю, — сплюнуў Павэлак сабе пад ногі. — А ўсё паперка гэтая, трасца на яе...

Хмель ударыў яму ў галаву: сліну распусціў! мінулае капае! Спаліць ліст — і канец усяму! «Мо і з-за цябе яна...» Мо і з-за яго. Дык ён, Павэлак, пры чым? Ён. Павэлак, чым вінаваты?

Пахістваючыся, устаў. Абышоў стол. Схапіў, скамячыў пісьмо і пацягнуўся да запалак. Што было — мінула. Мінула — і ўся тут праўда. Вайна была. Каб не вайна, яшчэ невядома, як усё павярнулася б. Ліст з мінулага... Глупства!

Разважанні падштурхвалі не вельмі каб паслухмяную руку. Чыркнула запалка. Агонь лёгка перакінуўся на скамечаны шматок паперы — шматок загарэўся. Запякло пальцы. Павэлак адчуваў боль і не расціснуў пальцаў. Чакаў, пакуль дагарыць. Пакуль попелам асыплецца з апечаных, пачырванелых пальцаў...

«— ТАГДЫ МАЮ, КАЛІ Ў РУКАХ ТРЫМАЮ! Цётчыны словы. Прыслоўе гэткае ёсцека. Чуў? Вось я змалку чуў, а зразумеў да канца толькі зараз.

— Залатыя словы, вось што я скажу. Правільныя. Планамі ды абяцаннямі не пажывішся. А рукой памацаеш ці да рота паднясеш — во! Тваё! Тваё-ё, брат. Ніхто не вырве.

— Ты пра што? — зіркаю на Ахрэма, адвёўшы позірк ад агню, ад кастра, што ўрэшце разгарэўся.

— А ты — пра што?

Ахрэм жмурыцца, хітравата ўсміхаючыся. Здагадваецца, відаць, пра ўсё. Ды што здагадваецца! Проста такі ведае. Ну, і няхай! Чаму мяне гэта павінна бянтэжыць? Цяпер што? Сам, сваёй рукой дакумент адпаведны склаў: Ніна Ру-чай, нічыю маці не памінаючы... Цяпер што? Усе ведаюць — і Ахрэм ведае. Нічога дзіўнага. Яшчэ і жарты пасыплюцца! аддаў! другога прапусціў наперад!

— Аддаў дзеўку і што рабіць не ведаеш?

— Ведаць ведаю, ды не зраблю.

Сказаў я ці толькі падумаў?

— Кішка тонкая.

Пра што гэта ён? Нешта я не разумею... Ці мо занадта добра разумею? Узіраюся ў слаба асветлены твар

Ахрэма — спакойны, абыякавы нават твар. Пачулася мне, ці як? Ён жа не спытаўся, ён сказаў. І я... Вырвалася-такі! Як чорт за язык дзергануў. Яшчэ падумае што-кольвечы Ахрэм...

— Хліпкі мужык цяпер пайшоў: сваё аддае. За жыццё, канечне, сёння ніхто і капейкі не дасць, а шчасце... Шчасце — дарага цэніцца. Міну пад камендатуру трэба падкласці, абмінуўшы сваю смерць, няйначай, перш чым дазвол атрымаеш тыдзень у цёплым ложку пакачацца з дзеўкай. Э-хе-хе!

— Ты адкуль пра міну ведаеш? Ён жа ад Юркевіча.

— Сарока на хвасце прынесла, Павел Пятровіч.

Кальнула ў грудзях. Раз і другі. Пытаюся пра міну, а думкамі — у гэтым богам забытым... І гэны — туды ж! У цёплым ложку! Я ўжо гэты ложак, нават вачэй не звёўшы, бачу. Проста стаіць перад вачыма. Высокі. З блішчастымі катахамі на спінцы. З гарой падушак мяккіх, вязанай накідкай прыкрытых...

Куды ён хіліць, Ахрэм? «Павел Пятровіч!» Сам жа старэйшы на колькі год, а павагу выказвае. Як тады, калі ў лаўцы за прылаўкам стаяў. Павел Пятровіч! Толькі што голаў не згінае. Колькі помню, лісінае штосьці ў ім, яшчырае... Чаго гэта я з ім разгаварыўся?

— Ты не памыслі, Павел Пятровіч. Не пасмяяцца я ўздумаў. Не! Крый божа, грэх на сябе не вазьму. Крыўдна за цябе стала. Дом у пасёлку, гаспадарка дагледжаная, на пасадзе лічышся... А дзеўка нос верне, — кашлянуў Ахрэм. — Вайна ж некалі скончыцца. Ці так, ці так... А Ніна якраз па табе! Ты не памыслі, Павел Пятровіч. Я каб дапамагчы як... Дапамагчы хачу.

— Чым тут дапаможаш? Сам, сваёй рукой... — не ўтрымаў я крыўды, зноў не ўтрымаў.

— Сваёй рукой і туды і сюды можна. Вайна шмат што спіша... А для свайго шчасця і пастарацца можна. Іншыя душу за яго не шкадуюць, не тое што...

Я палохаюся. Палохаюся не слоў Ахрэмавых, а таго, што ён слова ў слова мае думкі паўтарыў — тое, што я там, у Цімохавай хаце, думаў. Дык думаў і думаў! Перадумаў даўно. Пакуль вяртаўся — і перадумаў. Адступіўся. Чорт іх бяры разам з тым ложкам высокім! Хопіць, што ў адзін бок страляю...

— Хто і варты такога жыцця, якога душа жадае,

калі не ты, Павел Пятровіч? Ты ж не нейкага там простага сялянскага роду.

— Яшчэ цара Мікалая прыгадай! — бурчу, а ў самога, чую, злосць закіпае. І на сябе. І на Ахрэма, што прычапіўся, няйначай як ліст у лазні. Гне і гне сваё!

— Цар на дурняў заўсёды знойдзецца. Не пра цара гаворка, Павел Пятровіч, а пра цябе. Пра шчасце тваё.

— Ну, чаго ты пад'ялдыкваеш? Чаго ты пад'ялдыкваеш? — ускіпаю, гатовы выхапіць з кастра галавешку і пульнуць ёй у гэтага дабрадзея; у паскуду гэту, што дабрадзеем прыкідваецца. Бач! — жмурыцца, усмешку хаваючы.

— Не памыслі, Павел Пятровіч. Дапамагчы хачу. Як перад богам: адно дапамагчы.

— Вось бы і дапамог, як умееш! А то душу муціш... Без цябе млосна, нічыю маці не памінаючы...»

«Павел Пятровіч! Павел Пятровіч!..» Павэлак ачумела глядзеў на пустую бутэльку перад сабой: чаго гэта раптам ён Ахрэма крывога прыгадаў? Таго ж расстралялі ў сорак трэцім... Увосень... Адкрылася: немцам ён служыў, паскуда...

«Дык гэта ж ён, ён — Ахрэм — забіў тады Сцяпана! — апякла нечаканая здагадка. — Дапамог!»

Хмель як рукой зняло. Адчуў холад у спіне. Халодным потам увесь пакрыўся. Пачаў ліхаманкава перабіраць у памяці ўсе сустрэчы з Ахрэмам, усе кароткія гаворкі з ім. Калі выпадала... Пра даўжок той Павэлку двойчы нагадваў. Даўжок! Тады думалася, што пра самагонку ён. Глынуў жа з яго біклажкі Павэлак, каб сагрэцца, каб заспакоіцца, — мала-многа, а глынуў. Вось і думаў...

Ён, Павэлак, і пра Сцяпана — што забілі яго каля Запярыння — не адразу ўведаў: не з іхняга атрада Сцяпан. Васілю Лук'янавічу, камандзіру, мабыць, і дакладвалі: ад іх жа ён пайшоў у Запярынне! Пайшоў і не вярнуўся. І значыцца: сярод партызан ён, Павэлак, апошні, хто бачыў Сцяпана жывым... Можа, і падазрэнне на яго ўпала? Можа, і казаў хто, што гэта ён, Павэлак, з-за рэўнасці мог... Не, не! Папыталіся б у яго. Яшчэ як бы папыталіся!

Ён цяжка падняўся з-за стала. Згроб посуд і аднёс, паставіў на прыпечак. Вярнуўся, як забыўшыся што,

змахнуў са стала і, перакінуўшы крэсла, доўга падымаў яго. Падняў і ручнік і, пачапіўшы яго на плячо, пасунуўся ў сенцы, у двор — да рукамыйніка. «Гэта ён, ён — Ахрэм — забіў тады Сцяпана!» — здагадка абярнулася ўпэўненасцю і ўсім цяжарам яе навалілася на Павэлка, той ледзьве ногі пераставуляў, згорблены, нібыта раптоўна пастарэлы. Нібыта ўсё ў ім раптам згасла: і згадкі, і думкі, і сіла.

Ужо не думаў ён ні пра былое, якое толькі што гаманіла з ім, ні пра сённяшнія справы па гаспадарцы, так і не перарobленыя, ні пра тое, што будзе рабіць далей, як жыць далей. Раней смерці не памрэ, а будзе як будзе, — мільганула ў ім і згасла. А мо і не мільганула. Проста цяжка, як ніколі, стала Павэлку ў хаце, сам-насам з сабой, — і выйшаў ён у двор, машынальна захапіўшы ручнік: смылелі ж ад поту і рукі, і твар, і шыя. І гэта, апошняе, адчуваў ён хутчэй падсвядома.

Гэтак бывае. Зняможацца душа, дух у чалавеку — як памрэ ў ім, не могучы падняць непасільную для яго ношку! — і тады волю бярэ невядома што... Жыццё! Інстынктам гэта яшчэ называюць. А дакладней, усёткі, — проста жыццё. Раней смерці не памрэш.

Сонца стаяла высока-высока. Яго і не відаць было над дваром — з-за ззяння, што лілося зверху. А гарачыня быццам спадаць пачала. Ці гэта Павэлку так уяўлялася. Яму было нават зябка: пацепваў плячыма, да якіх прыліпла кашуля.

Вады ў рукамыйніку не было, і ён не стаў вяртацца ў сенцы. Абмінуў старую вішню. Ссунуў нагой, не згінаючыся, сена, што сушылася ля хлява (два дні, як накасіў па мяжніку!). Кінуў у голаў скамечаны льняны ручнік і паваліўся на траву. Адчуў, як затрымцела ўсё ў ім церпкага, салодкага паху, і праваліўся ў сон. Цяжкі, неспакойны сон...

## 14

Тады, у вайну, яна, здавалася, ведала, што павінна рабіць, для чаго жыць. Каб помсціць. Каб адпомсціць за Сцяпана. Гэта было не важна, што яна не ўсведамляла — каму. Вайне! Вайна забрала Сцяпана, гэта Ніне кожны казаў. Ніхто не мог сказаць, чыімі рукамі, зна-

чыцца: трэба было ўсёй поскудзі помсціць — усім, хто хацеў на іхняй зямлі іншыя парадкі завесці, хто людзей забіваў. Хто і яе Сцяпана...

Так, тады ўсё было ясна. Акрыяла і ў атрад пайшла. Нічыіх угавораў не паслухала. Нічога не збаялася: чаго было баяцца, калі ішла сама смерці сваёй шукаць. Адпомсціць за Сцяпана — і загінуць. Таму і кулямёт вывучыла, кулямётчыцай стала. Таму і ад куль не хавалася ні ў адным баі...

Ніна чула крокі, што — праз сад — набліжаліся да яе. Чула і не магла расплюшчыць вочы. Ці не хацела. Дзмітрыеўна б пагукала! А калі з хворых хто — адпачывае яна. Спіць!

Крокі аціхлі зусім побач. Прайшла хвіліна, другая. Ніхто не абзываўся. «Не праваліўся ж ён скрозь зямлю!» — падумала яна і расплюшчыла вочы. І — за крок які ад сябе — убачыла прафесара. Той узіраўся ў яе. Разглядваў.

Памкнулася была ўстаць: няёмка ж! — прафесар... Але ён раптам так рашуча замахаў рукамі («Сядзіце! Сядзіце!»), што згубіў раўнавагу і смешна, нязграбным кулём, зваліўся ў траву. І першым засмяяўся, падымаючыся і зручней уладкоўваючыся побач з ёй. Засмяялася і Ніна: прафесар, а паводзіць сябе, няйначай, як хлапчук. Прысеўшы на кукішкі, разглядваў яе. Рукамі замахаў, быццам крылы гэта, і зваліўся. Сеў на траву, выпраставў ногі, як яна, і смяецца...

— Не напужаў вас, Ніна Цімафееўна?

— Ды не, — крыху сумелася тая. — Вы мне Ніна кажыце. Мяне ўсе проста Нінай завуць.

— Усе? Ну, а мне, старому, вы дазволіце звяртацца да вас так, як мне зручней? Звычка, ведаеце. Можа, пасля — як пазнаёмімся мы з вамі...

— А вы ж казалі, што ўсё пра мяне ведаеце. Помніце? — асмялела Ніна. — У Дзмітрыеўны казалі.

— Казаў.

Прафесар усмешліва пазіраў на яе, і ўсмешка яго была добрая, цёплая. І нібыта знаёмая ёй, Ніне. І скаванасць яе знікла. Неяк адразу, у першыя ж імгненні — знікла. Гэта нават непакоіла яе.

— А навошта вам пра мяне ўсё ведаць?

— О-го, які раптам паварот! — пасур'ёзнеў прафесар. — Чакаў, што запытаеце, адкуль я ўсё ведаю. І адказ ужо загадзя падрыхтаваў. А вы: навошта? Першае

пытанне ў тупік заганяе... Не ўмееце свецкую размову з прафесарам весці. Не хочаце. «Навошта»...

Ён выцягнуў з кішэні халата акуратна складзеную насоўку, зняў акуляры і пачаў выціраць шкельцы. Доўга, як здалося Ніне, выціраў. Яна разглядвала спадцішка старога, гатовая ўмомант адвесці позірк, калі прафесар зноў паверне ў яе бок голаў. Цяпер яе чарга была разглядваць яго.

Без акуляраў, як усе, хто дрэнна бачыць, прафесар выглядаў разгубленым, у нечым нават бездапаможным. Проста старэнькі, дабрадушны, як відаць, дзядок у белым... Насілі ж некалі белыя кашулі палатняныя і белыя нагавіцы мужыкі па вёсках! Праўда, да такіх белых валасоў, як у прафесара, рэдка хто дажываў...

Ніна сачыла за яго рухамі і чакала. Чакала: што ж ён адкажа ёй? Што скажа?

— Ручай — маё прозвішча. Віктар Юр'евіч Ручай, — проста, не націскаючы на прозвішча, сказаў той, і начапіў акуляры, і зірнуў на Ніну, і не адвёў вачэй ад яе — спалоханага раптам — позірку. — Дзядзькам я Сцяпану даводзіўся. Гэткім чынам і вам, Ніна Цімафееўна, не чужы.

«Дык вось адкуль незразумелае адчуванне нечага знаёмага, вельмі знаёмага! Голас, усмешка... Ці ж магла б я падумаць? Дзядзькам? Але ж Сцяпан ніколі нічога не казаў...»

— Дзядзь-кам? Але ж Сцяпан ніколі нічога не казаў... — неяк міжволі паўтарыла ўголас яна сваю думку, сваё сумненне.

— Ён шмат чаго вам не казаў. Шмат чаго не сказаў. Не паспеў.

Прафесар памаўчаў, углядаючыся ў яе твар. Спалатнелы, мабыць, твар, бо Ніна адчувала, як яе быццам холадам абдало.

— Я шукаў вас. Многа раней. Сказалі, што знішчылі карнікі ўсю вашу сям'ю за сувязь з партызанамі. А вы на той час, відаць, прозвішча памянялі... Вось і адступіўся. Калі б выпадкова зусім не разгаварыўся з Верай Дзмітрыеўнай на кафедры ў мединстытуце, то і не знайшоў бы...

Ніна сцялася ўся. Ён гаварыў, а яна сціскалася, сціскалася ў камячок: ногі падкурчыла, рукамі іх абхапіла, ледзь што тварам у іх не ўткнуўшыся, да камля прывалілася, прыціснулася шчыльней. І не чула ўжо, што ка-

заў прафесар. Адна фраза са сказаных ім востра ўпілася ў сэрца і засланіла ўсё астатняе. Нават не фраза, абрывак фразы: «...на той час, відаць, прозвішча памянялі... відаць, прозвішча памянялі...»

Гэта і было тое, чаго Ніна ніяк не магла ўразумець, — здрада. Яе, Ніна, здрада. Прозвішча памяняла. Сцяпанава прозвішча аддала, каб было дзе галаву прыхінуць. Каб не адной самой жыццё сваё далей несці. І не прозвішча яна аддала, а Сцяпана. Памяць пра яго.

Дзмітрыеўна яшчэ казала, што са Сцяпанам яна, Ніна, і сябе пахавала... Не пахавала. Выжыла ж. Жыла. З чужым прозвішчам жыла. Не раўняючы да яе, Дзмітрыеўны: масквічка, разам з Іванам сваім, радыстам, радыёінжынерам, да іх, партызан, прыляцела і потым, як загінуў Іван, адсюль, ад магілы ягонай, не паехала. У Маскву — дамоў — не паехала! Тут урачаваць засталася. І замуж не выйшла. Сваталіся, а не выйшла.

Ніна не адчувала, што плакала. Слёзы цяклі ў яе па шчоках ціха, бязгучна — ніводзін рух не перапыняў іх. Ніводзін гук...

«— І СОНЕЙКА ЎСІХ НЕ САГРЭЕ! А ўжо доля каму якая выпадзе, дачушка. Што ж цяпер рабіць? Жыць трэба, — зноў выцірае куточкі вачэй мама. — На бацьку зірні! Пастарэў, сагнуўся ўвесь. І мне... Мне б адно на цябе надыхацца. Свіцішся ўся...

Не магу заплакаць. Хоць і маму шкада. І сябе таксама. Не! Сябе я не шкадую. Не пашкадавала б, каб не ведала, што бацькі не перажывуць мяне, маёй смерці... Дык так яно і лепш: не на вачах. Не на вачах у іх памерці. У лесе. Ад кулі ліхой. Ёсць жа і на мяне недзе куля!

— Я замяніць яго павінна. Разумееце? Яны Сцяпана забілі.

— Хто — яны?

— Не ведаю, мама. Усё роўна...

Мне цяжка гаварыць.

— А мо гэта са сваіх... здрадца, зайздроснік шчасцю твайму? Табе ж дзевятнаццаці гадкоў яшчэ няма... Які з цябе партызан?

Мама ўсхліпвае. Мне шкада яе. А слёз — няма. Як выкіпелі. Толькі пячэ агнём, баліць там, дзе вочы. Апускаюся на калені — як раней, даўно-даўно раней, тыц-

каюся тварам у маміну спадніцу, спрабуючы суцішыць боль у вачах. Уздрыгваю на мяккі, пяшчотны рух яе далоні. Падымаю голаў.

— Вы ж усё разумееце, мама! Вы ўсё ў мяне разумееце.

— Разумею, — адгукаецца яна, ледзь расшчапляючы вусны. — Ты вунь і заплакаць не можаш...

— Не магу. Выкіпелі слёзы. Не ведаю калі, а выкіпелі. І гадоў мне не васемнаццаць, а многа-многа... Здаецца, больш, як вам з татам, мама.

— А божа ж мой, — пачынае яна галасіць. — А каб таму, хто сцежку тваю перайшоў, ногі павыкручвала! А каб гэтых злыдняў, што на зямлю нашу нанесла, попелам па ёй развеялі! А каб той крывёй, што ліецца, усім ліхадзеям навекі захлынуцца! Што ж гэта на свеце робіцца? Што ж гэта такое? І вочы глядзець не хочуць, і ручанькі апускаюцца-а... А божа ж мой! А людзечкі!

— Не трэба, мама, — прашу. — Не трэба людзей збіраць. І не аплаквайце вы мяне раней часу.

— Ды хіба ж я цябе аплакваю, Ніначка? Што ты, што ты! — палохаецца яна. — Па сабе галашу, па старасці сваёй адзінокай...

І замаўкае. І ўсё гладзіць, гладзіць мае косы. Адна хвіліна мінае, другая.

— Цімох хацеў, каб сын у нас нарадзіўся. Нічога мне не казаў, але я ведала, што ён сына хацеў. А як занядужала перад родамі, немаведама адкуль фельчара прывёз. Парася таму аддаў за тое, што прыязджаў. І разрадзілася, дзякуй богу, і дзіцёнак жывенькі быў, і я не памерла. Мусібыць, і бог быў ні пры чым — што яму ў нашу хатку заглядваць? — І фельчар дарам парася ўзяў. Дужа хацела я сына Цімоху нарадзіць! А нарадзілася ты, дачушка...

Калі і ёсць за што нас з Цімохам караць, дык адно за тое, што сыночка хацелі, сыночка чакалі. Бо ці ж не шкадавалі мы цябе? Ці ж пакрыўдзілі аднаго разу? Выгадавалі. Прыгожая ты ў нас расла. Красуня чыста вырасла.

Я гарнуся да маміных слоў, да мамінай далоні, што гладзіць і гладзіць мае косы. Як маленькай.

— Думалі з Цімохам: замуж ты выйдзеш, многа дзетак народзіш — сабе і нам, старым, на ўцеху. Ды вайна гэта праклятая нелюдзяў на нашу зямлю прывяла...

І Сцяпана я шкадую, дачушка: малады, ласкавы і з табой, і з намі быў. Ні піла, ні сякера з рук не падалі. І водпуск у свайго камандзіра заслужыў... Шкадую, а як жа? Ды больш цябе шкадую, адзіную сваю дачушку. Паўгода ж як мёртвая ты была. Як усё з сярэдзіны крывёй не выцекла? Грэшная: думала, што і цябе побач са Сцяпанам пахаваем. Грэшная... Выжыла ты. Аджыла. Мы і радуемся! Неяк жа было б. Неяк жа павярнулася б... А ты зноў па-свойму разважыла: ні мяне, ні бацьку не хочаш паслухаць. Пашкадаваць не хочаш.

— Не магу, — шапчу, не падымаючы галавы. — Не магу я, мама.

— Ну і няхай. Ну, няхай будзе, як ты хочаш. І ў лесе ж свае людзі!

І гладзіць, гладзіць мае косы. Як маленькай...»

Матчын твар адплывае. Кудысьці ў яркае сонечнае ззянне адплывае. Ніна яшчэ колькі імгненняў бачыць яго — ужо размыты, без балючых зморшчынак, памаладзелы, быццам гэта ў далёкі час, у маладосць матчыну, ён адплывае, а не ў нябыт. Закрычаць бы, пабегчы ўслед! — ды занадта добра яна ведае, што не пачуе маці, што не вернеш яе. Нават і слязьмі, якія нарэшце прарвалі шматгадовую смугу, што ахінала, што душыла яе, Ніну, і ўжо другі раз на дзень вымывалі з душы застаялую горыч, не вернеш...

А рука гладзіць і гладзіць яе косы. Ціха, пяшчотна, як маленькай. І Ніна раптам усведамляе: гэта прафесар... Гэта стары прафесар... Гэта стары прафесар гладзіў яе па галаве. Ён жа яшчэ нешта сказаў, расказваў!

Услухалася, баючыся зварухнуцца. Але толькі ветрык ледзь чутна, лена варушыўся на голлі яблыні, агучваючы цішыню, фарбуючы цішыню ў цёмна-зялёнае лісце лета. Ды зусім нячутны рух рукі спрабаваў заспакоіць яе балючыя думкі. І яе слёзы.

Не, Ніна не саромелася слёз. Занадта доўга яна чакала іх — цэлае жыццё! — каб зараз не адчуць палёгкі, каб не адчуць, што гэта якраз слёзы вярталі ёй жыццё, забытую жыццёвую сілу. Чаго ж іх саромецца?

І ўсё-ткі пэўны час яна яшчэ не падымала галавы, не падымала заплаканых вачэй — не магла, не хацела ў гэты момант сустрэцца паглядам з прафесарам і штосьці тлумачыць. Ды і няёмка ёй было: ён, такі паважаны чалавек і Сцяпанаў дзядзька, зразумеў яе і не

асудзіў, а спрабаваў заспакоіць, суцешыць, а ў яе не было слоў нават падзякаваць. Не скажаш жа: дзякуй, што па галоўцы пагладзілі! Ён жа — прафесар, не раўняючы. Яму неяк культурней трэба.

— Як вы? Палегчала, бачу, — заўважыў той напружанне, з якім прымала зараз Ніна яго ласку. — А я ўжо непакоіцца пачаў, пакрыўдзіў, думаю...

— Што вы, што вы! Бог з вамі, прафесар...

— Віктар Юр'евіч, — мякка паправіў ён яе.

— Віктар... Юр'евіч, — запінаючыся, паўтарыла за ім Ніна і змоўкла: як захрасла ў горле — вусны рухаліся, варушыліся, а голасу не было, знік голас.

Яна сцягнула з шыі касынку і круціла яе ў руках. Хацела ўцерці вочы ды, прыгадаўшы акуратна складзеную насоўку прафесара, не асмелілася. А той нібыта і не заўважаў нічога: ні заплаканых вачэй яе, ні скамечанай касынкі ў руцэ, ні няёмкасці ў рухах.

— Ведаеце, куды мы з вамі пойдзем зараз? У рэстаран. Так, так, у рэстаран! І не ўздумайце пярэчыць — не прыму ніякіх пярэчанняў.

— Але ж...

— Ніякіх пярэчанняў, Ніна Цімафееўна! Пакінем халаты ў Веры Дзмітрыеўны і пойдзем. Яна не можа з намі пайсці — я запрашаў! — а нам самы час. Самы час!

Ён падняўся, занадта лёгка для свайго ўзросту падняўся і падаваў ёй руку.

— Але ж я... Я зусім не апранута!

— Хіба? Нешта я праз свае акуляры не заўважыў, каб вы былі не апрануты...

Прафесар усміхаўся. Усмешліва пазіраў на яе, і ўсмешка яго была добрая, цёплая. Знаёмая ёй, Ніне, — Сцяпанава! — усмешка.

Як яны ішлі праз сад, паўз вокны бальніцы, як зайшлі разам да Дзмітрыеўны і пра што там гаманілі, як, забегшы ў бакоўку і перакапаўшы ўсё ў ёй, каб знайсці асколак старога люстэрка, яна спрабавала лаўчэй зачасаць свае гладкія, не вельмі сягоння і чыстыя валасы, як, не заўважаючы, што з усіх бальнічных вокнаў сочаць за ёю хворыя, спрабавала прынаравіцца яна да няспешных крокаў свайго спадарожніка, Ніна не помніла. Не ўсведамляла. Калі і ўсведамляла што, дык толькі радасць. Дзіўную нейкую радасць. Са слязьмі па-

палам, больш на віну падобную, і ўсё-ткі — радасць.

Ніводнай жа роднай душы на свеце не было ў яе да сюль. Ні з кім жа ў цэлым белым свеце не магла яна пагаварыць пра жыццё сваё і Сцяпана ўспомніць, нават з Дзмітрыеўнай: тая і сама ўсё ведала, мо нават лепш, чым яна, Ніна. Ды і занятая была вечна Дзмітрыеўна. Уся бальніца на яе плячах.

А мо проста трэба было Ніне дачакацца гэтага дня, каб зрушылася ў ёй, недзе глыбока ў душы, здавалася, мёртвае ўжо адчуванне жыцця, адчуванне сваёй прыналежнасці, далучанасці да яго і да ўсяго на свеце. Нават да мінулага, даўно і моцна агароджанага бясфарбнымі, падобнымі адзін на адзін гадамі. Зрушылася і скранула слёзы. І падштурхвае думкі яе, і яе рухі...

У рэстаране было пуста. Толькі за кутнім столікам, не павярнуўшыся на іх крокі, шапталіся аб нечым дзве дзябёлыя, аднолькава апранутыя ў цёмныя сукенкі, перашчыкнутыя хвартушкамі, афіцыянткі. Ці то час абеду не надышоў, ці то адабедалі ўсе. Ніна неяк ніводнага разу за дзень не зірнула на бальнічны гадзіннік.

А што пуста — гэта добра. Ніхто прыглядацца не будзе да яе, да яе просценькай, шэрай у белы гарох кофты. Ніхто не будзе вушы натапырваць: пра што гэта ёй, Ніне, з прыезджым, нават з выгляду вучоным чалавекам гаманіць.

Яны селі ля акна. Прафесар і крэсла Нініна прытрымаў, пакуль яна садзілася. Ён больш не разглядваў Ніну, — пэўна, здаволіўся. І яна звыклася паціху з думкай, што нічога асаблівага — тым больш благога! — у тым, што прыйшла сюды з прафесарам, няма. І рэстаран у іх пасёлку аказаўся не вельмі каб... Зала ад кухні адгароджана дашчатай перагародкай, на якую пачапілі колькі прыгожых свяцільнікаў, а насупраць — прыгожая фіранка, цюль — адным кавалкам — на ўсе вокны адразу. Прыгледзеўшыся, Ніна ўбачыла, што і цюль не новы, там-сям ужо добра пажаўцелы. Ведама ж, не раён! — нават абрус на стол не паслалі. Праўда, блішчаў стол, не раўняючы са звычайным...

— Агледзеліся? Не надта, каб аглядаць было што. Праўда? Ды пакорміць нас пакормяць, як думаеце?

— Я гукну зараз...

— Навошта? — крануўся яе рукі прафесар. — Ці вы пасядзець, пагаманіць са мной не хочаце?

— Не, не! Я вельмі рада, — заспяшалася адвесці яго папрок Ніна. — Я рада...

Чаму яна была рада, тлумачыць не стала. Але ўпершыню адкрыта паглядзела на прафесара.

— Вось і добра. Я, Ніна Цімафееўна, у радню не набіваюся. Вы самі разумееце!

— Я разумею, — не здолела стрымацца Ніна, і голас яе загучаў адчужана. — Вы — прафесар.

— Значыцца, не разумееце, — спакойна ўдакладніў той. — Прафесура мая тут ні пры чым. Ды і тыя няпоўныя пяцьдзесят гадоў, што былі сведкамі маёй работы, напачатку фельчарскай, ніколі не далі б мне права хавацца за прафесарскай пасадай. Вам павінна быць сорамна, Ніна Цімафееўна: мала вы сябе паважаеце, сябе і сваю працу. А Верачка... — Вера Дзмітрыеўна расказвала, што і сэрца ў вас залатое, і рукі ніякай работы не баяцца. Што, каб не ваша руплівасць, ёй бы цяжка было — ёй бы немагчыма было! — тут застаяцца.

— Дзмітрыеўна... Дзмітрыеўна вам так казала?

Ніна расхвалявалася, неяк і не заўважыла, што сціскае руку прафесара. А заўважыўшы, яшчэ больш сумелася. Схавала рукі пад стол, паўтарыла, цяпер ужо ледзь чутна:

— Вось так і сказала?

— Так і сказала, Ніна Цімафееўна. Вы хіба не згодны з ёй?

— Дзмітрыеўна не таму... — рашылася Ніна. — Яе Іван тут пахаваны. Не змагла ад магілы яго паехаць. Тут урачаваць засталася, у нашых мясцінах. Таму і замуж не выйшла, што Івана... Не раўняючы са мной. Як зацьменне якое на душы было...

— Чакайце, чакайце! Давайце па парадку. Пра Івана я ведаю. І што ваяваў тут. І што загінуў, як з блакады выходзілі. І што пахаваны ў вашых мясцінах. І што помніць яго Верачка. Толькі ведаю я і іншае. Палюбіла край наш і людзей нашых Вера Дзмітрыеўна. Уратаваўшы шмат каму жыццё ў час вайны, ды і потым, не магла яна, кінуўшы сваю невялічкую бальніцу, свой пост, паехаць у Маскву, дзе і ўрачоў больш, і бальніцы большыя. Бясспрэчна: знайшлося б і ёй месца ў сталіцы — з яе высокай кваліфікацыяй, з яе вопытам, з яе заслугамі, нарэшце, ёй бы адразу аддзяленне даверылі. Ды сваё месца Вера Дзмітрыеўна сама вызначыла. Аба-

вязкам сваім лічыла і лічыць быць там, дзе большая патрэба ў ведах яе, у руках яе. Вы і цяпер са мной не згодны? — усміхнуўся ён да Ніны.

— Я згодна, — адгукнулася яна. — Да Дзмітрыеўны... да Веры Дзмітрыеўны ўсе ідуць. Нават здалёк. Усе яе ў нас любяць! Толькі...

— Што — толькі?

— Толькі не абавязак гэта для яе — бальніца, а жыццё.

Сказала і спалохалася сваёй смеласці: не пра сябе ж казала, пра Дзмітрыеўну! А прафесар нібыта абрадаваўся.

— Вось бачыце, як вы ўсё правільна разумееце! І яе жыццё ў працы, і ваша, Ніна Цімафееўна.

— Я што... Я за чысцінёй сачу, — церабіла Ніна рукі, складзеныя на каленях.

— А што такое чысціня ў бальніцы? Га-лоў-нае! Ды і, чуў я, не адно за чысцінёй вы сочыце, а? — усміхаючыся, ківаў прафесар пальцам. — Калі трэба, то лёгка замест сястры ўпраўляецеся. Праўду кажуць? Ці мо зманілі мне, старому?

— Не зманілі, — апусціла галаў Ніна і, як падштурхнутая раптоўнай думкай, загаварыла горача, узрушана. — Толькі Дзмітрыеўна тут не вінаватая. Гэта хворыя ўсё! Таня, сястра, маладзенькая дужа. І да яе была другая, таксама з вучылішча. А мне не паложана. І я казала заўсёды: не паложана. А яны просяць. Ведаюць, што з вайны навучаная, і просяць. Дзмітрыеўна тут не вінаватая! Хворыя, здараецца, капрызнічаюць...

Яна ўзіралася ў прафесара: ці так усё сказала? Ці ўсё як ёсць растлумачыла?

— Як жа гэта вы на зацьменне ў душы хвіліну назад скардзіліся? З зацьменнем у душы — не лечаць.

— Ды тое пра іншае я...

— Грыбнога супу няма. Катлет па-палтаўску няма. З халодных закусак — толькі тварог, — кінула на стол меню афіцыянтка. — Заказваць што будзеце?

Яны не заўважылі за гамонкай, калі яна падышла, і здзіўлена азірнуліся на глухі, занадта рэзкі, быццам і не жаночы зусім голас.

— Прынясіце, калі ласка, што ёсць. На ваш густ. І можаце не спяшацца, — падкрэслена ветліва звярнуўся

да афіцыянткі прафесар, і тая, спадцішка змерыўшы яго вопытным паглядам, адышлася.

Прафесар мякка крануўся Нінінага пляча.

— Ну, навошта ж так? Няма на вас віны за Сцяпана, нічым вы, Ніна Цімафееўна, не вінаваты перад памяццю яго. На магілу ездзіў — магіла дагледжаная. А што сям'я... Як жа без сям'і?

Прафесар задумаўся. Задумліва пазіраў у акно, насупраць якога сядзеў. А Ніна адчувала, як зардзеліся ў яе шчокі, вушы, шыя — як расцякаецца па ёй чырвань хваляй сораму. І віны. І шкадавання. І яшчэ немаведама чаго, жывога, балючага. Хутка год міне, як ездзіла яна ў Запярынне. Цётка Варвара, ад'язджаючы з бальніцы, папракнула. Раптам вярнуліся, мацней, балючэй ударылі яе цётчыны словы: «Што ў вёску вачэй не кажаш? Не магілы, дачушка, травой зарастаюць, а памяць. А без памяці і чалавека няма...»

Дзмітрыеўна яе, Ніну, хваліла. Прафесар гэты, Віктар Юр'евіч, спачувае — усё разумее, раней, чым яна скажа, разумее. І на магілу Сцяпанаву з'ездзіў...

Ніне муляла ўстаць, падзякаваць прафесару і бегчы, бегчы ад яго — з рэстарана гэтага, ад думак сваіх, такіх зноў балючых, такіх шчымлівых. Куды заўгодна. У бальніцу, да спраў звыклых. У поле ці ў лес, што за полем. Ці — лесам — у Запярынне, дамоў...

Афіцыянтка ўжо несла на падносе абед, і, робячы амаль непасільнае зараз намаганне, каб заспакоіцца, — каб адхлынула ад твару чырвань, Ніна сціснула апушчаны галаў дзвюма рукамі і паўтарала ў думках адно і тое ж слова «Будзя! Будзя! Будзя...».

Але праз заклён гэты ўсё роўна прабіваліся далёкія галасы: то голас цёткі Варвары — і тады балюча аціхала, абмірала ў Ніны сэрца, то голас Віктара Юр'евіча — і тады сэрца выбухала, быццам вырываючыся з грудзей, і яна не магла ўлагодзіць, суцішыць яго балючы, няроўны гул.

— Што ж вы не пачынаеце есці, Ніна? Астывае.

Есці Ніна не магла. Яна нават вачэй ад стала адарваць не магла. Каб магла, устала б і пайшла адсюль — пабегла! Прафесар сказаў: Ніна... Яна чула. Яна не здолела б яму падзякаваць. Ды і не дзякуюць, пэўна, за такое. І выходзіць: перад усімі Ніна вінавата. Можа, перад гэтым старым прафесарам, дзядзькам Сцяпанавым, найболей. Ён жа шукаў яе! Шукаў і знайшоў,

урэшце. А Ніна ніколі не пацікавілася, ці была ў Сцяпана радня, апроч той, запярынскай, якую разам з яе бацькамі забілі. За сувязь з партызанамі...

## 15

Гарачыня пачынала спадаць. Ветрык, які ледзь чутна, лена варушыўся на голлі, агучваючы цішыню, фарбуючы яе ў цёмна-зялёнае лісце лета, цяпер плыў з голля ўгору, цягнучы яго за сабой, — дрэвы быццам падымаліся на дыбачкі, каб памерацца адно з адным ростам. Гэта былі нясмелыя спробы — ні ў іх, ні ў ветру не хапала сілы абрушыць, разбіць цішыню. Адно няясны, няўлоўны пошум пагойдваўся над зямлёй, над шырокім пагоркам, на якім і абапал якога — між балотцам, зарослым багуном і буячнікам, і цёмнай, няроўнай сцяной лесу — тоўпіліся двары, хаты, садкі, калодзезі, дрэвы... Рудня. Пасёлак, які больш нагадваў вёску. Ды і быў бы вёскай, каб не жалезная стужка чыгункі, што з поўдня на поўнач пераразала яго на дзве амаль роўныя часткі, ды прыземісты, самавіты станцыйны будынак — вакзал — якраз пасярэдзіне.

Станцыя была тым вузлом, што сцягваў вуліцы, вулічкі і завулкі ў адно — у адзін малюнак небагатага рабочага паселішча. Калі і прыбудоўваліся да пасёлка новыя хаты, то яны нічым не адрозніваліся ад тых, што ўжо стаялі. Месяц, другі — і яны набывалі тое рудое адценне, якое было тут нават у паветра, асабліва калі захмарвала звычайна бляклае неба.

Ды і цішыня ў пасёлку была асаблівая. Цішынёй яе можна было назваць больш па звычцы. Бо ледзь не кожныя паўгадзіны пачынала раптам пастукваць, пашчоўкваць штосьці ў паветры — спачатку далёка, ледзь-ледзь чутна, а потым усё бліжэй, усё выразней, і вось ужо дробна дрыжалі шыбкі ў вокнах, напаўняючы двары тонкім, звыклым звонам, і з жалезным бразгатам, пафыркваючы, калі спыняўся на станцыі, пралятаў чарговы цягнік. З поўдня на поўнач. Ці, наадварот — з поўначы на поўдзень. І бразгат гэты, цяжкое пафыркванне гэта былі чуваць адусюль. З няроўнай сілай, але адусюль, дзе б яны каго ні заспелі ў гэты момант.

Улетку, калі сонца, як сёння, прыпякала з самага ранку, не мінала і паўдня, як над пасёлкам калыхалася

гарачая брудна-белая смуга. Але сёння, мо таму што так і не заснуў, самлеўшы на сонцы, ветрык, неба было высокае і чыстае. Сонца пераваліла ўжо за поўдзень і, хоць вісела крыху пахіліўшыся, усё яшчэ высока, амаль у зеніце, адчувалася, што наспявае той міг, той рух, які саштурхне яго з гэтай кропкі і пакоціць уніз, у балотца.

Гарачыня паціху спадала, гусцейшымі сталі пыльныя цені дрэў — яны пачыналі ўжо распаўзацца, шырэць, набываючы больш выразныя абрысы, збіраючы прахалоду. Двор быццам пакрыўся цёмнымі плямінамі, і адна з такіх плямінак, разбухшы, укрыла, нарэшце, упрэлага ад спёкі Павэлка, які спаў на абярэмку сена, уткнуўшыся ў яго, у скамечаны ручнік тварам, шырока раскінуўшы рукі. Спаў, а двор жыў сваім жыццём. Шаптаўся з вішнямі ветрык. Драмалі пад сцяной хлява, закапаўшыся ў цёплы пыл, куры. Зрэдчас, адгукаючыся далёкаму цягніку, дрыжалі ў вокнах хаты шыбкі, і, калі іх тонкі звон асыпаўся доле, уздрыгвала, як уздыхала, зямля. І зноў было ціха. І зноў у гэтую цішыню, у лёгкі пошум лісця, уплятаўся сумотны жаночы голас:

— Змаглася я без любові... Усохла... Сэрца ўсохла! Ніводнай кветачкі ў ім... І птушкі даўно не прылятаюць... Няўжо гэта я забіла іх тым, што гукаю, гукаю ў былое? Птушкі не могуць жыць ва ўспамінах, як я. Яны там паміраюць. А я... Ненавіджу... І прашу, немаведама каго прашу: вазьмі гэты боль... Родны, зрабі так, каб я палюбіла. Разбудзі мяне...

Павэлак спаў. Цяжкі, неспакойны сон, наваліўшыся ўсім цяжарам, прыціскаў яго да зямлі, не адпускаючы, не даючы падняць галаў і разгледзець, хто гукаў з цьмянай далечыні, хто скардзіўся немаведама каму на птушак. Ці на сэрца. Ці на яго, Павэлка...

Голас быў падобны на Нінін. А вось ужо і Ніну пазнаваў ён! Не падымаючы ад ручніка галаў, бачыў, як ішла яна — зямлі, здаецца, не кранулася, уся лёгкая-лёгкая. І сукенка на ёй яшчэ даўнейшая. Даваенная. У шэра-блакітныя кветачкі. У якой яна, Ніна, замуж выходзіла некалі.

Павэлак пакутна ўспамінаў і не мог успомніць таго, за каго яна выходзіла замуж. Гэта не ён быў, не Павэлак. Хтосьці іншы. Хто?

— Сцяпан! Га-га-га... Маскалямі сюды яшчэ задоўга да вайны засланы, — рагатаў, схіляючыся над ім, Па-

вэлкам, усё ніжэй і ніжэй Ахрэм — халодныя, прыжмураныя вочы на ўвесь твар. — Няўжо не помніш? Сцяпан! Ты ж забіў яго, Павел Пятровіч. Ты ж забіў яго, калі ён вяртаўся ў атрад! Няўжо не помніш?

— Гэта ты, ты! — спрабаваў прыкрыцца, захінуцца ад яго рукамі Павэлак. — Я не забіваў. Не забіваў!

— Э-э, не! Я — сваё атрымаў. Тры кулі ў грудзях — як тры кропкі ў канцы жыцця. Вось толькі працягу не было пасля тых трох кропак... Як сабаку ў зямлю кінулі. Твае та-ва-ры-шы кінулі! А цяпер я — чуеш? я! — буду па тваю душу прыходзіць. Невялікі набытак — а ўсё ж на адну душу больш, яшчэ адна душа на рахунку. Няхай і гэта залічыцца! А Сцяпанава смерць на табе, Павел Пятровіч. Га-га-га...

Павэлак адпіхваў рукой перакошаны рогатам Ахрэмаў твар, а рука праваньвалася ў пустату. І зноў Ахрэм схіляўся над ім, жмурачы халодныя, мёртвыя вочы.

— Памятаеш, як папрасіў: «Дапамажы, як умееш»? Не табе я дапамагаў, а сабе. А ты след у след за мной, Павел Пятровіч, ішоў. След у след! Дарогу мне ў думках паказваў. Баяўся, каб не ўпусціў я Сцяпана, каб хаця перастрэў паблізу ад вёскі.

— Брэшаш! — бараніўся, крычаў у перакошаны Ахрэмаў твар Павэлак. — Мы ў іншым раёне былі. Уся група на заданне выходзіла. Мала што ты брыдзіць пачнеш! Брэшаш! Брэшаш!

— Сабакі брэшуць, Павел Пятровіч. А мне — адсюль — чаму б і не сказаць праўду? Не хочаш ты гэтай праўды. Не хо-очаш! Не мяне, мёртвага, а таго, што кажу, баішся.

Павэлак заплюшчыўся, закрыў твар рукамі і ўсё адно бачыў Ахрэма, яго злосную ўхмылку. Ён нейкім сёмым пачуццём помніў, што заснуў пад вішняй, што спіць, што сніцца яму Ахрэм, а страх раскалыхваў сэрца ўсё грамчэй і грамчэй. З-за гулу, з-за грому гэтага выплывалі, біліся аб прыціснутыя рукі калючыя словы:

— Ты след у след за мной, Павел Пятровіч, ішоў. Дарогу мне ў думках паказваў — каб хоць не ўпусціў Сцяпана, каб перастрэў паблізу ад вёскі! Ты пісталет мне ў руку сунуў і стрэлу майго з нецярпеннем чакаў...

— Які пісталет? Адкуль у мяне пісталет? — зноў пачынаў бараніцца Павэлак. — Мы зусім у іншым раёне былі!

— Былі. І я гэта ведаў. Га-га-га! І ўсё ж ты, Павел Пятровіч, руку маю падштурхнуў, пісталет мой разрадзіў у суперніка ненавіснага. Нездарма ж кожны раз позірк адводзіў, са мной сустракаючыся. Я і пра даўжок табе нагадваў, помніш? Даўжок я сам у цябе сарваў. Ха-арошая дзеўка была!

— Якая... дзеўка? Якая дзеўка, Ахрэм? — спрабаваў адарвацца ад зямлі, спрабаваў падняцца Павэлак.

Спрабаваў і не мог. І Ахрэм раптам некуды знік.

— І птушкі даўно не прылятаюць... Няўжо гэта я забіла іх тым, што гукаю, гукаю ў мінулае? Птушкі не могуць жыць ва ўспамінах, як я. Птушкі не могуць...

Зноў гэты голас! І дзіця недзе паблізу плача. У яго ж, у Павэлка, няма, не было дзяцей. Ён і пісьмо, што прыйшло без зваротнага адраса, спаліў. А дзіця — плача. Зусім побач ужо.

Павэлак робіць намаганне, садзіцца, хоча ўстаць — і, перапыняючы яго рух, абрываецца са старой вішні і падае доле, да ног яго, шпакоўня. Падае і разлятаецца на дробныя трэсачкі. І трэсачкі не рассыпаюцца па зямлі, па двары, а ўзлятаюць угору, над ім, Павэлкам, і над дваром яго ным. І гэта ўжо не трэсачкі, а птушкі. Незнаёмыя, ярка-блакітныя птушкі. Яны з шумам носяцца над ім, заглушаючы нават дзіцячы плач. Ярка-блакітныя на белым небе.

— Кыш! Кыш! — махае ім Павэлак.

І птушкі знікаюць. Як раствараюцца ў небе, перафарбаваўшы яго ў ярка-блакітны колер.

Павэлак падымаецца, расцірае ацёклыя ногі, падымае галаў і... за які крок ад яго распранаецца Фрося. Скідае нейкую лёгкую, амаль бясфарбную апратку. Нервовымі, ліхаманкавымі рухамі.

Ён хоча сказаць ёй, што зараз не ноч, а дзень. Што хто з суседзяў можа зазірнуць зараз у двор. Што ў двары нідзе не схаваешся. Што яна наогул яму толькі сніцца. А Фрося пераступіла кінутае ў пыл адзенне. Лёгка, прыгожа пераступіла і прыпала да яго грудзей.

— Гэта наш сын плача, Павел. Мой і твой сын.

— Пачакай, Фрося! Пачакай, ягадка. Я хутка. Зараз, — пачаў шаптаць Павэлак, адчуваючы, як яго захліствае, апякае асляпляльна белае полымя.

— Мне нельга чакаць: у мяне толькі адна гэта ноч, — бязгучна, вуснамі, адказвае дзяўчына.

— Але ж зараз дзень!

— У мяне адна гэта ноч... Гэта наш сын плача, Павел. Чуеш?

Павэлак нічога ўжо не чуе. Нічога! І ў абдымках у яго — не Фрося, а крывы Ахрэм. Павэлак хоча адштурхнуць яго, але той учапіўся за плечы, павіс на плячах і, ухмыляючыся, дыхаючы ў твар перагарам, гучна шэпча:

— Ха-арошая дзеўка! Як бачыш, даўжок я сам з цябе сарваў. Га-га-га... А ты думаў!

Не хапае сілы адштурхнуць яго, а Павэлак ужо захлынаецца гэтым рогатам, гэтым п'яным перагарам, — і ўсё-ткі, праз рогат, праз страшныя ў сваёй аголенай сутнасці словы чуе, як абрываецца, спыняецца ў яго сэрца і вырываецца з грудзей у яго балючы стогн. Ці няўцямны крык...

Гэта ён сам крычаў? Гэта ён ад свайго ўласнага крыку прачнуўся? Прахапіўшыся, Павэлак ніяк не можа ўцяміць, што адбылося. Што наогул з ім адбываецца. Галасы, адны і тыя ж словы — словы нейкай віны яго незразумелай перад даўнім, мінулым, птушкі праклятыя! А тут яшчэ Ахрэма не ў час прыгадаў...

Услухваючыся ў гулкія, няроўныя штуршкі сэрца, ён пачынае суцяшаць сябе тым, што ўсё, безумоўна, ад таго, што вось ужо колькі год не паказваўся дактарам. Што збуджаныя згадкі збудзілі і боль, здавалася, пакінуты на вайне, здавалася, пахаваны яшчэ тады, у вайну, і пахаваны назаўсёды. Што, урэшце, магло б ніколі і не знайсці яго тое пісьмо, якое ён спаліў, думаючы, што спаліць з ім і страшную, страшна запозненую вестку...

Гэта было слабое суцяшэнне, ён разумеў. І ўсё ж, раскідаючы па траве прыкамечанае сена, зноў і зноў даводзіў сэрцу: чалавек не вольны мяняць штосьці ў сваім лёсе — ён не можа ні ссунуць, ні рассунуць межы часу і штосьці змяніць. Што было — тое было. Як будзе — так і будзе. Ніхто не папытаецца, чаго хацеў ці чаго хоча ён, Павэлак. Было — і было. Як будзе — так і будзе.

## 16

— Сцяпан мне двойчы пісаў на працягу года. Першы раз з Запярыння. Перад самай вайной. Атрымаць ліст я яшчэ ў Мінску паспеў — праз тры дні горад ужо бамбілі...

Прафесар задумаўся, прыгадаўшы той дзень, — быццам цень пагасіў раптам яго твар. І невядома, чаму — яна не змагла б гэта растлумачыць! — Ніне стала шкада яго. Так пашкадавала б яна бацьку, стомленага, пастарэлага ад гадоў і ад пацяжэлых за жыццё думак.

— А другое — праз Маскву — зімой... Выходзіць, праз месяц пасля таго як загінуў. Недарэчна загінуў. Напэўна ж, у спіну стралялі, высачыўшы, — павярнуўся ён да Ніны.

Яны сядзелі ў скверыку на лаўцы, крыху ў баку ад дарожкі, што, здавалася, дымілася ад сонца, ужо даволі доўга, пакінуўшы пусты рэстаран і свой амаль некрануты абед здзіўленым афіцыянткам. А гаворка ўсё ніяк не магла распачацца: словы паміралі, перш чым былі вымаўлены. Быццам не патрэбны былі словы — і любое з іх гучала фальшыва, нічога не дадаючы да разумення, узніклага паміж імі.

І Віктар Юр'евіч, і Ніна — не адварочваючыся ад яго сумнага зараз позірку — думалі пра адно і тое ж. Не пра вайну. Не пра смерць Сцяпанаву. Не пра тое, што кожны з іх перажыў пасля гэтай смерці. Яны думалі пра час, які перацёк у мінулае так хутка і так незаўважна, — але і цэлай сцяной гадоў не змог засланіць, не засланіў і ніколі не заслоніць таго, што помніць сэрца. Адбіраючы ўсё: маладосць, хараство, здароўе, сілу! — час не можа адабраць у чалавека любоў...

— Я даражу гэтымі пісьмамі, Ніна Цімафееўна... Ніна, — мякка папраўіўся прафесар. — Даражу, бо люблю Сцяпана, як сына: ён і быў мне сынам! І ўсё ж пасля расказу Верачкі, пасля сустрэчы з вамі... Вазьміце іх, Ніна. Два апошнія лісты і яшчэ армейскі яго здымак. Яны будуць дапамагаць вам жыць, як дапамагалі мне. Пакуль буду жывы, пішыце мне — тут і адрас мой мінскі запісаны. Буду рады, калі заедзеце з Верачкай у госці.

Трэба было падзякаваць прафесару. Трэба было хоць штосьці сказаць. А Ніна не магла гаварыць ад хвалявання: Сцяпанавы пісьмы! У яе будуць пісьмы, напіса-

ныя яго рукой, і фотаздымак! Яна і марыць пра такое не пасмела б, не тое што папрасіць аб гэтым Віктара Юр'евіча...

Прафесар падняўся. Ніна, якая ўскочыла на міг раней, не зводзіла вачэй з яго рук: у руках, выцягнутыя з кішэні пінжака, з цёмнай запісной кніжкі, былі пажаўцелыя ўжо ад часу паперкі — пісьмы.

— Вазьміце, — падаў ён іх Ніне.

Дрогкімі рукамі пацягнулася яна да паперак, і раптам, падштурхнутая бязмерным пачуццём удзячнасці і глыбокай сваёй узрушанасцю, схілілася і пацалавала рукі Віктара Юр'евіча. Перш чым узяць пажаўцелыя ад часу пісьмы, пацалавала рукі, якія ёй іх аддавалі.

— Што вы, што вы, Ніна! — сумеўся на момант Віктар Юр'евіч, і, зразумеўшы, разумеючы, якім пачуццём выкліканы гэты рух, абняў яе за плечы, і пацалаваў пасівелую над ілбом пасмачку валасоў.

Трэба было падзякаваць яму. Трэба было хоць штосьці сказаць! А словы памiралі, перш чым Ніна спрабавала іх вымавіць. Быццам не патрэбныя яны былі зараз — любое з іх прагучала б фальшыва, нічога не дадаючы да разумення, даўно — адразу! — узніклага паміж імі.

Яна пазірала ўслед старому прафесару, яшчэ не ведаючы, што ўжо ніколі больш не ўбачыць яго. Не ведаючы, што ехаў ён сюды не па справе, а дзеля іхняй сустрэчы. Што не варта было яму ехаць неўзабаве пасля перанесенага інфаркту, але ехаў ён дзеля яе, каб паспрабаваць вылечыць яе, вярнуць яе, Ніну, да жыцця, зразумеўшы ўсё яшчэ з дыягназу, пастаўленага яе захворванню ў гаворцы з ім Дзмітрыеўнай.

Удзячнасць перапаўняла Нініна сэрца. Усёй істотай сваёй помніла яна, адчувала, што трымае ў дрогкай руцэ пісьмы і фотаздымак Сцяпана, а позірк быў як прыкаваны да высокай, крыху ссутуленай постаці Віктара Юр'евіча, які аддаляўся, мінаючы сквер, які ніводнага разу не абярнуўся і — яна была ўпэўнена ў гэтым! — думаў пра яе. Пра яе і пра час, што перацёк у мінулае так хутка і так незаўважна...

Толькі правёўшы яго позіркам, толькі калі схавалася яго постаць за павароткай, апусцілася Ніна на лаўку, апусціла позірк на пажаўцелыя лісткі. Недзе быў укладзены ў іх фотаздымак. Сцяпанаў фотаздымак! Тароп-

ка, асцярожна разгарнула паперкі, не зважаючы на тое, што ўздрыгвалі, дрыжалі пальцы, — і заплюшчылася. Як ад рэзкага святла. Як ад рэзкага святла, што балюча разанула па вачах. Пальцы слепа, дрогка абмацвалі невялічкую картку, а ў вачах, моцна заплюшчаных, проста перад ёй стаяў Сцяпан. Загарэлы. У картовых штанах, закасаных па калені.

— Памагаты не патрэбны?

Голас прагучаў так выразна, што ад гуку яго абарвалася сэрца. Адкрыла вочы, недаверліва азірнулася, абвяла позіркам залітую сонцам і рухомымі ценямі дрэў дарожку — сквер быў пусты. Нікога.

Уздыхнуўшы, паднесла да вачэй картку. Сцяпан. У марацкай форме, незнаёма строгі і засяроджаны, але Сцяпан. Яе, Нінін, Сцяпан. Светлы, колеру неба пагляд. Ледзь прыкметна надламаныя бліжэй да скроняў дужкі броў. Злёгку прыпухлыя, гарачыя вусны. Тое, што гарачыя, дадала памяць. Бо не адно гэтага не знаходзіла Ніна на здымку. Сцяпан быў высокі. Дужы. Мог падняць яе да самых зорак. Мог разам з усім наўколлем яе падняць — бліжэй да святла, да таямнічага ззяння. І сам быў светлы, сонечны — асабліва калі ўсміхаўся.

Ніна ўзіралася ў пацямнелы фотаздымак. Узіралася так доўга і так пільна, што кругі паплылі перад вачыма. Быццам сціраючы іх, павяла рукой — калыхнуўся, адступіў прасцяг. Стала чуваць, як уздыхае, шэпчацца, ловячы кожны павеў ветру, лісце таполі.

«— НЕ ВАЛІЦЦА ШЫШКА ПАД ЯБЛЫНЮ, А ПАД ЕЛКУ... Рабі як ведаеш, дочка. Добрымі ці благімі мы з Ганнай былі для цябе, няхай людзі скажуць, яй-богу. А што любім цябе, дык дачка ж ты наша. Што баімося за цябе, дык у кім нам апору шукаць на старасці? Рабі як ведаеш, яй-богу.

Тата праводзіць мяне. Далёка правёў. Да самай Сіняй Грады. Мала чаго не дайшлі да таго месца, дзе Сцяпан мяне заўсёды чакаў. Дзе зараз бы чакаў, калі б...

— Тут непадалёку Сцяпан мяне заўсёды чакаў, — кажу.

Ён палохаецца маіх слоў. Узяў мяне за руку і, сумеўшыся, адпусціў. Кашлянуў і палез у кішэню па табаку.



— Ты гэта... Ты не думай, Ніна...

— Я не думаю, тата. Вучыцца страляць буду. Я хутка навучуся!

— Не твая гэта справа, дочка. Мне трэба было ісці, яй-богу. Мне, а не табе. Паперадзе бацькі хочаш...

— Я павінна. Я ж казала табе.

Хачу абняць тату, прабачэння ў яго папрасіць невядома за што — за ўсё! За ўсё разам. На момант усведамляю — адчуваю! — што і з ім, як гадзіну назад з мамай, развітваюся назаўсёды. Што гэта апошняя наша гаворка... Хачу абняць яго — і не магу варухнуцца. Зноў гэта звыклая ўжо скамянеласць! — я нават палохацца яе перастала, толькі прыкрасць кожны раз застаецца ў сэрцы: не я яе — яна мяне перамагае. Як і зараз. Прыкра. А ні слёз, ні руху, якім растлумачыла б сваю адчужанасць...

— Ты гэта... Я ўсё разумею, яй-богу. Не валіцца шышка пад яблыню, а пад елку.

— Ну, пры чым тут шышкі, тата?

— Ні пры чым. Шышкі ні пры чым, яй-богу! — прагна зацягваецца ён дымам, згорбіўшыся яшчэ болей, яшчэ больш балюча. — Няпросты чалавек быў Сцяпан. Душэўна няпросты. І вучоны. Я адразу прыкмеціў, яй-богу. Я адразу за цябе баяўся.

— Баяўся? За мяне? — перапыняю незнаёма тарапкія яго словы.

— Але. Быццам яшчэ тады ведаў што. Нетутэйшы ён, Сцяпан, не такі, як мы. А цябе з усіх выбраў, яй-богу! І на цябе вочы зайздросныя знайшліся б, а ўжо як вас дваіх доля звяла... Нічога добрага не магло з гэтага быць, яй-богу! Я адразу за цябе баяўся. А як сказаць, калі ты гарэла ўся? Як сказаць? Гарэла... І быццам згарэла.

Ніколі гэтак многа не гаварыў тата. Не падумала б нават, што ён можа столькі раптам гаварыць. Маўчаў больш. Часам слова нельга было выцягнуць. Мама злавалася, здаралася, а часцей адмахвалася: без слоў яны адзін аднаго разумелі.

Сэнс таго, што ён казаў зараз, быў занадта балючы: паколвала штосьці ў сэрцы. «Не такі, як мы...», «...а ўжо як вас дваіх доля звяла...», «...не магло з гэтага быць...» Словы застывалі ў свядомасці, не могучы збудзіць яе. Быццам згарэла... Ды не быццам, а — згарэла я! І слёзы як выкіпелі, і думкі як знямелі. Адно і

магу, што слухаць і пазіраць здалёк — з мінулага, са шкадавання свайго аб ім.

— Не ўберaглі мы цябе з маткай. Не навучылі ў свой час агню асцерагацца. А потым — позна было. Не дазволь мы табе замуж пайсці — без замуства пайшла б за ім, яй-богу. Я і Ганне гэтак сказаў.

Няпросты чалавек быў Сцяпан. Душэўна, кажу, няпросты. І ты, дочка, яму пад пару. Каб не вайна, мо і інакш як павярнулася б, яй-богу. Мо б і звілі вы сваё гняздо. А так... Нічога добрага не магло з гэтага быць. Я і Ганне гэтак казаў.

Ён яшчэ раз прагна зацягнуўся дымам і, кінуўшы цыгарку, утаптаў яе ў пясок. Пацягнуўся да мяне, пацалаваў у лоб. Раз. І другі. І закашляўся (я спалохалася, што ён раптам заплача!), адмахнуўся ад кашлю.

— Ат, яй-богу! Глядзі сябе, дочка. Ідзі. Федзька Верамееў зачакаўся, пэўна.

Сказаў і, неяк нязграбна павярнуўшыся, пайшоў назад. У Запярынне. А я і зварухнуцца не магу. Стаю, як кім у пясок укапаная, і пазіраю яму ўслед. Быццам жыццю свайму ўслед пазіраю. Азірніся тата, ён бы вярнуўся — ён бы адчуў...

— Ні-на!

Не ўздрыгнула, здрыганулася ўся: гэта Хведар гукае. Час ісці. Зрабіць намаганне, адарвацца ад сцежкі і ступіць насустрач нечаму невядомаму — насустрач смерці сваёй. Час ісці! — загадваю сабе і працягваю стаяць, дзе стаяла. Паміж тым, што было і адыходзіць: вось ужо і постаці татавай не відаць з-за кустоўя! — і тым, што чакае: вось зноў нягучна гукае Хведар:

— Ні-на!..»

Азірнулася. Недаверліва абвяла позіркам залітую сонцам і рухомымі ценямі таполяў дарожку — сквер быў пусты. Нікога. Ды і хто б з былога мог з'явіцца сюды, у сквер, ці пагукаць яе — адтуль?

Апусціла позірк на Сцяпанаву картку, доўга ўзіралася ў яе, спрабуючы неяк спалучыць усё, што помніла, з занатаваным камерай воблікам: Сцяпан ніколі пры ёй не надзеў форму. Больш таго: не загаворваў ніводнага разу пра сваю службу на флоце... Ды чаго там! Калі ім было гаварыць? Вось і пра дзядзьку свайго, пра Віктара Юр'евіча, не згадаў. Не паспеў...

Ніна ўзіралася ў родны твар, нечакана супакоеная:

думкі не ранілі яе — яны быццам раз'ясніліся і набылі ўстойлівасць, устойлівую вагу. Спачатку яна нават не паверыла гэтаму спакою, гэтай спакойнай яснасці і, прыціснуўшы картку да грудзей, нейкі час услухвалася ў сябе, у аціхлы боль. І чула толькі роўныя, глыбокія штуршкі сэрца ды лёгкі пошум лісця над галавой.

Не выпускаючы карткі, разгарнула першы пажоўклы ад часу лісток, спісаны толькі з аднаго боку, знутры, дробным, незнаёмым ёй Сцяпанавым почыркам. Пачала чытаць, часам падоўгу разбірала асобныя неразборлівыя словы: «Дзядзя Віця! Усе перасцярогі аказаліся залішнімі. Радня прыняла. Разумеюць. Ні аб чым асабліва не распытваюць. Прыглядаюся да людзей, яны — да мяне. Чужака б яны не прынялі, але і штучным сваяцтвам шмат не прыдбаеш. Трэба шукаць сцежку да кожнага, а часам не знаходжу, і падоўгу. Адчуваю: не хапае ведаў, ведаў пра зямлю і чалавека на ёй. Адно на ўсіх жыццё, а кожны сваё ад яго ўзяць хоча, кожны пасвойму перакруціць спрабуе. Нібыта ўсе разам, усе — адна грамада, а ўсё ж, кожны — яшчэ і асобна, у баку ад усіх. І вось тое, што асобна, тое, што ўбаку, часцей за ўсё і перамагае ў чалавеку. Уласніцтвам гэта называй, раскулачвай за потам здабытую лішнюю мерку збожжа ці бульбы, глядзі на яго, як на ворага веры сваёй, — пакуль не ўразумее кожны, што не сваім, не абасобленым ён дужы, а агульным, агульначалавечым, на свой бок яго не павернеш. У ворагі ж цэлы народ запісаць ніяк не выпадае...

І пэўна ж, каб здзейснілі мы вялікія, велічныя планы перабудовы цэлага грамадства, мала — скласці іх, мала заклікаць усіх да напружанай, самаахвярнай працы ў імя будучыні. Трэба — не ведаю, ці магчыма гэта? — каб усе і кожны з гэтых усіх *сваю* веліч адчулі, *сябе*, а не толькі планы гэтыя, вялікімі ўявілі.

Часта думаю над гэтым. Прыглядаюся да людзей. Нашмат кіламетраў вакол выхадзіў лес. Глухія мясціны. Спадручныя. Адно непакоіць — я сам.

Мушу павініцца, дзядзя Віця. Сэрца зусім не адчуваю. Каханне сваё сустрэў — дзяўчыну, усю звонкую, як жаўранак. Разумею, што не час зараз, а нічога з сабой зрабіць не магу. Вось і атрымліваецца, што і я — яшчэ і асобна, у баку ад усіх. А ведаю ж, перакананы: адно на ўсіх жыццё! — усім разам за яго змагацца.

І ўсё ж не хвалюйцеся за мяне. Я спраўлюся. Ваш Сцяпан».

Ніна некалькі разоў перачытала ліст. Не таму, што нечага не зразумела. Усё зразумела. І шкадаванне раптам захліснула: не ведала яна Сцяпана — т а к о г а не ведала. Магчыма, т а к о г а Сцяпана яна і не варта была... Тады. А цяпер? — пыталася яна ў сябе. Пыталася і не знаходзіла адказу. Ці, знаходзячы, хавалася ад яго...

Другое пісьмо было кароткае. На добрых дзве трэці карацейшае за першае і больш пацёртае.

«Дзядзя Віця, з'явілася магчымасць перадаць вестачку. Усё добра. Змагаемся. Падымаем на барацьбу людзей. Вучу таму, што ўмею, хлопцаў, вучуся сам.

Хачу папрасіць вас аб адной паслузе. Наперад. Калі што са мной здарыцца — а здарыцца можа ўсё, вы ж разумееце! — знайдзіце пасля вайны ў Запярынні Ніну Мікуліч — дапамажыце ёй выжыць. Яна ўся — сэрца. Здаецца часам, што дыхае мной. І ўпершыню ў жыцці мне страшна. За яе. Калі бацькі дадуць згоду, мы пажэнімся.

Знайдзіце Ніну, дзядзя Віця. Толькі вас я любіў гэтак, як люблю яе. Беражыце сябе. Сцяпан».

Літары расплываліся. Яна рабіла намаганне — і яны зноў складваліся ў словы: «Упершыню ў жыцці мне страшна. За яе...» Ён — усё адчуваў. Ведаў! Быццам зазірнуў наперад.

Ніне здавалася, што ўсё ў ёй палае: гэтак цяжка было дыхаць, выкаўтнуць аграмадны, балючы камяк паветра, які захрас у горле і пёк знутры, душачы яе. Але думкі былі ясныя. І яна зноў не магла не здзівіцца таму, як добра памятала ўсё, што тычылася Сцяпана. Сцяпана і яе, Ніны. Але памятала дагэтуль, да сённяшняга дня, адным толькі пачуццём — пачуццём болю і пакінутасці, і, напэўна, гэта пачуццё, скаваўшы яе тады, у лістападзе сорак першага года, зрабіла яе абыякавай да ўсяго, што было з ёй потым, на працягу больш як дваццаці год.

Як гэта сказала ёй, пасуровеўшы раптам, Дзмітрыеўна? «...Ты верыш, што сябе разам са Сцяпанам пахавала. А гэта здрадай называецца. Здрадай жыццю. І Сцяпану, калі хочаш... Бо ён за цябе загінуў. Ты за яго павінна была б жыць!» За яго павінна была б жыць, за Сцяпана... А яна, Ніна, і пра сябе не часта згадвала.

Каб не Дзмітрыеўна, каб не бальніца, куды несла яна сваё адзіноцтва, мо б і рукі на сябе даўно наклала...

Яшчэ і яшчэ раз перачытваючы лісты, бачыла Ніна перад сабой Сцяпана, высокага, дужага, незнаёма строгага і засяроджанага. Ён шчымліва-прыгожым рухам адкідваў з ілба валасы і ўзіраўся кудысьці ў далячынь — паўз яе, Ніну, паўз гэты сквер, да гаркаты прапахлы сонцам, паўз гэты дзень.

— Толькі вас я любіў гэтак, як любіў яе... Перакананы: адно на ўсіх жыццё! Адно — на ўсіх...

Ніне здавалася, што ўсё ў ёй палае, — а гэта палала, палымнела над ёй, над скверам, да гаркаты прапахлым сонцам, над днём — высокае гарачае неба.

## 17

Калодзезь быў у гародчыку. Які дзесятак крокаў. Але мінула колькі хвілін, пакуль Павэлак, узяўшы ў сенцах вядро і лінуўшы з яго рэшту сцяплелай вады пад вішню, мінуў двор. Перш падзівіўся, як хутка паглынала ваду, адно цямнеючы няроўным кругам, зямля. Потым, задраўшы галаў, узіраўся нейкі час у пустую шпакоўню, вырашыўшы зняць яе пры выпадку ці хоць бы высветліць, у чым справа, чаму не сяліліся ў ёй шпакі. Ужо амаль дадыбаўшы да калодзезя (ногі былі як ватныя), звярнуў увагу на ката: расцягваючыся, як чорнарыжы гармонік, той лёгка чапляўся за вастрыё дошак, за самы верх агароджы, цішком падкрадваючыся да нейкай пташыны... Да малінаўкі, што, пэўна, не заўважала яго і ўвішна чысціла свае каляровыя пёркі.

«Вось зараз пачысціць табе вусаты пёркі!» — усміхнуўся Павэлак і, нібыта злякнуўшыся гэтай сваёй усмешкі, нязграбна ўзмахнуў вядром — рукой, што трымала вядро.

— Брысь! Лазіш тут...

Малінаўка ўспырхнула, затрымалася на момант у паветры над ім і шмыгнула некуды ў сад. Знікла. А кот застыў на плоце, павярнуўшы галаў да гаспадара, здавалася: міг — і загаворыць, скажа Павэлку штосьці злоснае, непрыемнае.

— Брысь! — зазлаваў Павэлак і, сплюнуўшы сабе пад ногі, ступіў да калодзезя.

Набраў вады. Вярнуўся і, з шумам расплёскваючы

яе, да краёў напоўніў рукамыйнік. Скінуў кашулю, агаліўшы незагарэлыя, белыя ніжэй цёмнай шыі плечы. Доўга — двойчы даліваў вады — мыўся, фыркаючы, стогнучы ад задавальнення. Доўга ўціраўся, не спяшаючыся сціраць з плячэй дробныя, прыемна халодныя кроплі. Узяў кашулю і, не апранаючыся, паплёўся ў хату: хацелася есці.

Пасля таго як памыўся, асвяжыўся халоднай вадой, Павэлку палегчала. Быццам змыўшы пот і млявасць, змыў ён і шчымлівую няўпэўненасць і невядома адкуль і чаго ўзніклы страх перад мінулым. Чаго яму, Павэлку, было палохацца? Не ведаў ён, што Фрося нарадзіла ад яго сына. Не ведаў, і ўсё тут. І ўся віна яго ў тым, што не ведаў. Бо ці ж мала бабы нараджаюць дзяцей, каб потым нікому не прызнацца ад каго? Ці ж Фрося першая? Не першая і не апошняя. Па сённяшнім часе — лічы не пералічыш гэткіх! Вунь і Кацярына Раманішышына таксама...

А скажы Павэлку Фрося, што ж ён не дапамог бы? Скажы яна... Хоць калі б яна магла яму сказаць, як забілі яе? У сорак трэцім...

Павэлак раптам уцяміў, што папросту бароніцца ад таго, што точыць і точыць душу. Усё яшчэ спрабуе бараніцца. Хоць цяпер ужо вяла. Амаль абыякава. Быццам не сабе даводзіць, а некаму збоку і гэты нехта збоку пазірае на яго з асуджэннем і не вельмі ўслухваецца. А ніхто ж не мог асудзіць яго, Павэлка, і за што? Што ён — смерці Фросінай хацеў?

Сцяпанавай смерці — у тую ноч у Запярынні — хацеў! Ды хацець — не забіць. Думкамі не забіваюць. І Ахрэм у сне марна ашчэрваўся: не ішоў Павэлак за ім след у след, не падштурхваў руку — не страляў. Далёка іх група была, у іншым раёне. Тол здабываць хадзілі... Не адразу і пра смерць Сцяпанаву ён дазнаўся. Ужо снег лёг, і маразы ўдарылі... Нехта ж яму тады сказаў... Ахрэм крывы і сказаў! Не... Ахрэм адно выскаляўся пры сустрэчы ды пра даўжок двойчы нагадваў: Павэлак яшчэ думаў, што пра самагонку той, а адкуль яна ў яго, тая самагонка? На тым і разыходзіліся...

Не адчуваючы смаку, Павэлак жаваў, прыкусваючы хлеб, падталай, мяккай шкваркай і кіслым гурком. Схадзіць у склеп, прынесці малако паленаваўся, а есці ж нешта трэба. У печы было не палена, распальваць жа ў сенцах керагаз, які перш чым разгарыцца, доўга пых-

кае дымам і чадзіць, было і зусім недарэчы. А есці ж нешта трэба. Вось і еў. Тое, што ставіў на стол сабе і Гнасю колькі гадзін таму.

І Гнась асудзіў яго. Павэлак бачыў: асудзіў. А за што? Што ён — смерці Фросінай хацеў? І пра сына Павэлак не ведаў. І ўся віна яго ў тым, што не ведаў.

Пра Сцяпана, пра смерць яго таксама не адразу дазнаўся. Федзька, Хведар Верамееў, сказаў. Хведар — запярынскі, часцяком наведваўся туды, да бацькоў. Вось ён і прынёс навіну... Снег ужо лёг, маразы ўдарылі...

«— З МАРОЗУ МАРОЗУ ПРЫНЁС, не прагоніце? — уваліўся ў зямлянку Федзька.

Невысокі, у тоўстым кажуху і аблавухай шапцы, ён выглядае хлапчуком, на якога надзелі ўсё з чужога пляча, — абы не змёрз. Ды ён і ёсць маладзёнак, хоць бы і са мной побач. Смаркач, як часам я яго называю: камандзір ніводнага разу на заданне не выпусціў. Так... Снуе між Запярыннем і лесам. І цяпер во, пэўна, адтуль: хлеб свежаспечаны з торбачкі вынуў.

— Частуйцеся, — запрашае. — Самагонкі не расстараўся, а хлеб маці спякла. Разнёс увесь, а гэта вам. Два бохана.

— А што, самагонку гнаць перасталі? Ці як? — уедліва абзываюся на яго «частуйцеся».

— Ды мо і не перасталі, — з гатоўнасцю тлумачыць Федзька, скідаючы цёплую апратку. — Не хадзіў па хатах. Трывожна ў Запярынні, усе як баяцца чаго.

— Няўжо немцы, сукіны дзеці, дабраліся і туды? — бурчыць Гнась са свайго кута. — Калі мы толькі гэту погань усю пераб'ём?

— Не, не немцы, — перапыняе яго Федзька, пасур'ёзнеўшы, як пасталеўшы раптам, і змаўкае.

На момант у зямлянцы ўсталёўваецца цішыня. Чуваць, як у пячурцы патрэсквае паленне, як неспакойна заварочаўся на палку Гнась. Гнась і не вытрымлівае першы. Устае, угінаючыся, падыходзіць і апускаецца на чурбак ля пячуркі, побач з хлопцам.

— Чуеш, Пятровіч? Не немцы, кажа.

Я маўчу. Я амаль упэўнены, што здарылася штосьці менавіта з Нінай, і зацята маўчу.

— Ды ўжо ж, не немцы, — упарта паўтарае Федзька.

— Чаго ты дзяўбеш адно і тое ж: не немцы, не нем-

цы! Што там здарылася ў Запярынні? Чаго людзі баяцца? Каго? — ускіпае Гнась.

— Каб жа хто ведаў каго! Трасца яго ведае. Са сваіх нехта на забойства пайшоў. З думкай, што вайна ўсё спіша... Трапіўся б ён мне, гэты герой!

Федзька гаворыць задзірыста, хмура, не падымаючы на нас вачэй. І я адчуваю, што за гэтай яго хмурай задзірыстасцю — зусім не хлапечая, не дзіцячая нянавісць. І гэтая яго нянавісць нейкім чынам закранае і мяне. Закранае, мо таму, што я ведаю, пра чыё забойства ён кажа, каго забілі непадалёк ад Запярыння. Ды што там ведаю! — рады. Шалёная радасць захіснула мяне ўсяго і гарачай цяжкою чырванню калыхаецца дзесьці глыбока ў душы. «Чужой бядзе, чужой смерці рады...» — апякае на момант думка. Але думка хутка патанае ў гэтай чырвані, у яе гарачым цяжары, і я пачынаю прагна ўслухоўвацца ў тое, пра што ўсё яшчэ маўчыць Федзька.

А той раптам паварочваецца да мяне.

— Сцяпана Ручая забілі. Непадалёк ад Запярыння. Больш як месяц таму. У спіну стралялі. Вы ж ведалі яго, Пятровіч!

— Гэтак, як і ты, ведаў, — буркаю ў адказ, баючыся аднаго, каб чырвань не выступіла на твары. — Ён жа ад Юркевіча прыходзіў...

І Федзька, і Гнась маўчаць. І гэта маўчанне раззлавала мяне. Шалёная радасць абярнулася шалёнай злосцю: сядзіш тут, як крот, у зямлі, бо гаспадары, нічыю маці не памінаючы, на твой дом і на тваё жыццё знайшліся — нанесла нячысцікаў! А і тут спакою няма. Кожны смаркач у душу хоча залезці. А што ў той душы пераломана ўсё ды перамелена, нікога не цікавіць. Сцяпана забілі? Дык і мяне маглі забіць — не сёння-заўтра заб'юць, калі лоб ці спіну падстаўлю. Ведама ж, навіна!

— Ніну я ведаў, — спрабуючы ўзяць сябе ў рукі і не паказаць абуджанай злосці, кажу я. — Заляцаўся да яе ў свой час, ні для каго з гэтага сакрэту не рабіў: усе ў Запярынні ведалі. А Сцяпан — прышлы. Сватам ад яго быў — камандзір паслаў. Паперы сельсавецкай пячаткай змацаваў. На другі дзень і развітаўся. А ён — ад Юркевіча прыходзіў, з яго атрада...

Кажу, а ў самога рукі свярбяць: падысці б і ўмазаць гэтаму смаркачу па вуху за позірк ягоны ды за

маўчанне раптоўнае. Бач, вылупіўся, бельмы вылупіў!

— Знайшоў каму спавядацца — Федзьку ды мне! — умешваецца ў гаворку, перапыненую маўчаннем, Гнась. — Не твайго расказу, Пятровіч, чакаю.

— А што расказваць? — адвярнуўся да яго Федзька. — Забілі, як у атрад вяртаўся. Кіламетры два ад вёскі. У спіну стралялі. Цесць Сцяпанаў, Цімох, з кумам і знайшлі яго на сцежцы, па дровы прыехаўшы. Ужо снегам прысыпанага...

— А людзі што кажуць? Цімох што? — пытаецца Гнась.

— А што людзі? Хто кажа, што з-за дзеўкі, з-за Ніны, яго забілі. Хто даводзіць, што няпросты чалавек быў Сцяпан, што ўсачылі яго паслугачы нямецкія. Хіба разбярэшся? А дзядзьку Цімоху, бацьку Нінінаму, не да гаворак, самі разумееце. Злягла дзеўка. Памрэ, няйнакш. Да памяці ніяк не дойдзе. Як мёртвая, адным словам.

«Ды змоўкні ты!» — хачу крыкнуць яму — і як скамянеў. Пра Ніну я не думаў, мне і ў галаў не магло прыйсці... А тут імя прагучала, і як варам абдало. Злягла дзеўка. Памрэ, няйнакш... Да памяці ніяк не дойдзе... Значыцца, гэтага я жадаў? Гэтаму радаваўся? Ды хай бы жыла з гэтым хлюстам светлавалосым! Што — на ёй свет клінам сышоўся? Я ж зміраўся быў. Я і згадваць яе радзей пачаў. Хай бы жыла...

«Змоўкні ты!» — хачу крыкнуць Федзьку і нечакана заўважаю, што ён маўчыць. Што ён даўно маўчыць. Нагнуўся, варушыць сукаватай палкай галавешкі ў пячурцы і маўчыць.

Не абзываецца і Гнась. Толькі ўва мне няўцямна мітусяцца думкі, збіваючы адна адну. Я ж зміраўся быў. Я і згадваць Ніну радзей стаў з таго дня...

Раптам змоўкла незразумелая, даўкая злосць. Згінула. Як адвалілася. І чырвань, што калыхалася цяжкой гарачай хваляй, сшэрхла. Шэра стала ўва мне, пуста. Упору заплакаць. Гэтага якраз і не хапала!

Адваліўся на палок, падкамячыўшы пад галаў ватоўку, сцяў зубы. Мацюкнуўся, сплюнуўшы, Гнась. І зноў чуваць толькі, як патрэсквае падкінутае ў пячурку Хведарам бярозавае паленне.

Хутка я ўжо нічога не чую. Мільгануў перад вачыма і знік Нінін шчаслівы твар — тады, калі яна прыпала да Сцяпанавага пляча. І ўжо сцелецца пад ногі белая

дарога, бачная зараз у лесе толькі мне. Плывуць насустрач мякка ўхутаныя ў снег яліны. І ад далёкага, не пачутага, а хутчэй угаданага стрэлу чмякаецца з сасны, зверху, снежны камяк, ледзь не зачапіўшы выкінутую ўзмахам наперад руку за паўкроку. Войкнуць не паспяваю. І, памянуўшы адразу і бога і чорта, рашуча адмахваюся ад спалоху. І ад перажытага. Чорт яго з той дзеўкай! Пляваць мне на белабрысага яе. Не паляваць жа за ім на самай справе! Хопіць, што за немцам палюем...

Разумею, што папросту прыгадваю сваё вяртанне ў атрад. Бо вось жа патрэсквае ў пячурцы бярозавае паленне. І Гнась ціха мацюкаецца, не знаходзячы слоў на Федзькава маўчанне. І я ляжу, уткнуўшыся тварам у старую ватоўку, прапахлую...

У зямлянцы пахне хлебам. Свежаспечаным іржаным хлебам. Федзька ж з вёскі ад маці прынёс. Разам з балючай навіною... Я ўдыхаю гэты пах балючымі глыткамі. Шэра неяк ува мне, пуста. Упору, як бабе, заплакаць...»

Не адчуваючы смаку, Павэлак жаваў, варочаў скіўіцамі, заядаючы хлеб падталай ад спёкі, мяккай шкваркай і кіслым леташнім гурком. Прыйшла згадка і растала. Ён нават не паспрабаваў, як раней, адмахнуцца, адпіхнуць яе. Быццам пагадзіўся нарэшце з тым, што ўсе спробы яго адгарадзіцца ад мінулага, ад перажытага былі марнымі: з-за надзейнай, здавалася, агароджы гадоў, якая вырасла ўкруг яго і ў ім, раптам вырвалася, хлынула лавіна прыпамінаў, слоў, пачуццяў, і ўсё, што ён, Павэлак, можа, — гэта аддацца яе волі. Змагаючыся, кідаючыся з боку ў бок, лавіну гэтую не адолець. Зняможацца душа, і яшчэ невядома, чым тады ўсё абернецца для яго, Павэлка. Не стрываў адразу, даў волю душы — цяпер доўга ўсё не ўляжацца.

Сабраў са стала. Прыкрыў ручніком хлеб. Падышоў да шкапа, адчыніў яго і вынуў касцюм. Паклаўшы яго на ложак, вярнуўся і выцягнуў белую святочную кашулю і чыстую споднюю. Пачаў апранацца. Ужо надзеўшы сарочку, абярнуўся да люстэрка, якое займала ўвесь прасценак паміж вокнамі, — яно прыдалося калісьці Ніне, вось і купілі...

Павэлак не любіў гэтае люстэрка. Не таму, што пла-

ціў за яго дорага — залішне дорага: парсючка за гэткія грошы можна было б прыдбаць. Халера іх бяры, тыя грошы! Не шкадаваў ён для Ніны нічога. Прыдалося ёй — і купілі, сам з магазіна нёс, не зважаючы на цікаўныя позіркі суседзяў. Не, грошы — халера з імі! І позіркі нічые яго не спынілі б: людзі чаму хочаш пазайздросцяць!

Неўзлюбіў Павэлак прыдбанае люстра пасля таго, як неаднойчы, не могучы дагукацца жонкі, уваходзіў у хату і знаходзіў яе перад ім, нерухомую, зніякавелую. І каб жа ў сябе ўзіралася! Глядзіць паўз сябе, у пустату — праз шкап і рамку з пацямнелымі фотаздымкамі, якія адбіваюцца ў шкле, і вочы сумныя, што ў пабітага сабакі. Што яна там бачыла, у той пустаце? Ён запытаўся неяк — не адказала. Здзіўлена павяла на яго вачыма і змоўчала.

Колькі ні ўзіраўся Павэлак у люстэрка, нічога ён там не бачыў, апроч рамкі з пацямнелымі фотаздымкамі. Адсюль, праз усю хату, было не відаць, хто калі быў зняты на іх, але ён, і не разглядваючы, ведаў, што на крайнім справа ён зняты з Нінай, у той дзень, калі прывёў яе сюды, у сваю хату, дзякуй богу, ацалелую ў ваеннае ліхалецце: немцы жылі, спаліць, мусібыць, не паспелі... Дах падправіў, шыбы ў вокны паўстаўляў — і жыві!

А той здымак, што побач, — Нінін. Сярод бальнічных яна. З Верай Дзмітрыеўнай, з доктаркай, побач: з вайны як папляліся, так і побач увесь час, няглед зячы што і няроўня нібыта... А ўнізе — тая картка, што яму, Павэлку дзеці-школьнікі прынеслі. Пасля сустрэчы, на якую яго настаўнік угаварыў. Угаварыць угаварыў, а расказваць самому давялося: які з Павэлка расказчык?

Колькі ні ўзіраўся ў люстэрка Павэлак, нічога ён там не бачыў, апроч самога сябе, пастарэлага, з шырокай лысінай праз усю галаву. Яшчэ трохі — зусім як качан галава будзе, хоць дамалёўвай былыя кудзеркі! Ды што дамалёўваць, як не дамалюеш, не вернеш ні чуба, ні гадоў маладых. Быццам і не было тых маладых гадоў — за працай ды клопатам не ўбачыў. За дзеўкай пахадзіць не ўмеў. Адно што даўганогі быў ды нос — ладным гарбылём. Дражніць дражнілі, а вось жа — Фрося накруцілася...

Зноў згадаўшы Фросю, Павэлак спахмурнеў. Пра-

вёў далонню па твары, як сціраючы з яго згадку, але ад люстэрка не адвярнуўся. Нечым яно вабіла яго зараз, нешта ён усё-ткі хацеў выглядзець у ім. Што?

Прыгажуном Павэлак зроду не быў. Але ж і вачэй ад яго твару ніхто з прыкрасцю не адводзіў. Твар як твар. Высокі лоб. Шэрыя, крыху выцвілыя ўжо вочы, заўсёды злёгку прыжмураныя. Нос — гарбылём, падпёрты з абодвух бакоў скуламі. Здаровыя і цяпер, не ў прыклад катораму іншаму, зубы. Чаго хацець?

Ён узіраўся ў свой твар — і бачыў сябе ранейшага. І не мог уразумець, чаму ўсё-ткі так і не прыгарнулася да яго Ніна. Жонкай стала, у ложак ягоны лягла, а не прыгарнулася. Ні тады, калі прывёў яе сюды, у сваю хату, ні потым. Чужой прыйшла, чужой і засталася. Ці мала ён патаптаўся вакол яе? Ці мала трываў, навучыўшыся цярплівасці? Не прыняла. Не прыгарнулася. Мо таму і дзяцей у іх не было...

Прыкрасць не вярнулася, і ўсё ж нешта горкае, калючае запяршыла ў перасохлым раптам горле. Павэлак закашляўся і больш ужо не падымаў вачэй на люстэрка. Адышоўся. Закурыў. Удыхаючы горкі дым, курыў. Не адводзіў позірку ад свайго цёмна-сіняга шарсцянога касцюма на ложку — быццам прыпамінаў, для чаго, для якой патрэбы выцягнуў яго са шкапа. Успомніў. Прытушыў цыгарку, паклаў недагарак збоку на прыпечак і зноў палез у шкап. Цяпер — у шуфляду знізу. Пакалупаўшыся, дастаў невялікі карабок — скрыначку, у якой трымаў узнагароды, медалі за вайну. Скрыначка адазвалася ледзь чутным звонам, і ён доўга трымаў яе ў руцэ, не адчыняючы. Ужо зусім быў вырашыў і не адчыняць, сунуць назад: не чапляць жа напраўду ў будні дзень медалі на пінжак! Не свята — абыдзецца і так. Неаднойчы і ў свята згадваў пра іх толькі, калі Ніна нагадвала. А яна не вельмі каб і нагадвала...

Хацеў ужо сунуць скрыначку назад, у шуфляду, але нешта рупіла яму — адчыніў, крануўся пальцамі халаднаватага металу: «За адвагу»... Багата яе, адвагі, спатрэбілася кожнаму, каб пераламаць немца, адолець. Кожнаму і ўсім — усяму народу, адным словам. А медаль не ўсім далі. Яму, Павэлку, далі.

Думалася пра гэта спакойна. Без асаблівага гонару. Усяго нагледзеўся за тры гады. Не на ўсё і яму, Павэлку, адвагі хапала.

Ён уздыхнуў. І зноў закашляўся. І, адкашляўшыся,

рашуча сунуў скрыначку ў шуфляду. Трэба было апранацца: на ложку ляжаў, чакаў Павэлка яго выхадны, цёмна-сіні шарсцяны касцюм.

## 18

Над скверам, да гаркаты прапахлым сонцам, над вулічкай, у якую пераходзіў сквер, над днём — палала высокае гарачае неба. Падымеш голаў — і позірк тоне ў агністай глыбіні, і ад гарачага бляску сплюшчваюцца, склейваюцца вейкі.

Сонца даўно перавалііла за поўдзень. Яно яшчэ спрабавала ўтрымацца на самай вышыні, шырока раскідала незлічоныя свае падпоркі-промні, але тыя саслізгвалі з вершалін таполяў, з дахаў, то на чыйсьці плот, паабчапляны пузатымі жбанамі, і з яго ў прыдарожны пыл, то на голле вішань, якія падступалі да самых платоў, і з яго ў цень. Здавалася: хвіліна, другая — і яны не ўтрымаюць сонца, ломячыся, пасыплюцца долу, цягнучы яго за сабой.

Але мінала хвіліна, другая, трэцяя, а ўсё заставалася па-ранейшаму. Калі і пасоўвалася сонца ўніз, то так павольна, што гэта ніяк не заўважалася. Ды і ці льга было разгледзець яго рух з-за гарачага бляску? Падымеш голаў — і самі сабой сплюшчваюцца, склейваюцца вейкі, каб неяк прыкрыць вочы, каб не асляпіла іх агністае неба.

Ніна раз-пораз спрабавала знайсці ў гэтым бляску, у гэтым нясцерпным ззянні — сонца і кожны раз мусіла зноў апускаць голаў, не знаходзячы. Не паспявала. Слепла. Потым доўга церла рогам касынкі вочы, куточкі, прыкідваючы ў думках, якая пайшла ўжо гадзіна з таго часу, як пакінула яна бальніцу. Не тое што Дзмітрыеўна нешта сказала, самой муляла: упершыню адышлася, ці мала што каму спатрэбіцца...

Разгладзіла на каленях касынку, асцярожна паклала, згінаючы па ранейшых складках, Сцяпанавы пісьмы і картку — паміж імі і загарнула іх, не завязваючы, баючыся пакамячыць. Не ёй пісаў Сцяпан, ды ўсё ў гэтых пісьмах яе, Ніны, тычылася. Усё ў іх было адрасавана і ёй. Яна не змагла б растлумачыць ні сабе, ні нікому, што — усё. Усё! У душы Ніінай, якая, здавалася, не жыла і не памірала, смуткуючы па нязбытым, аплакваю-

чы шчасце яе кароткае, збудзілася невядомая сіла. Яшчэ вельмі кволая, ціхуткая, ледзь адчувальная, і ўсё ж — сіла. Быццам не чытала яна толькі што словы Сцяпанавы на пажаўцелых ад часу лістках, а слухала, узіраючыся ў яго незнаёма строгі, засяроджаны твар. Быццам сустрэлася яна са Сцяпанам сваім і са слоў яго зразумела, што кахаў ён яе, як нікога, што каханне яго — мацнейшае за смерць, што жыць трэба хаця б таму, што гэтага хацеў ён. Для яе, Ніны, хацеў. Пэўна ж, хацеў і для сябе...

Ішла Ніна не спяшаючыся, але хутка. Больш па звычцы. А яшчэ таму, што не магла зараз заставацца адна, сам-насам з сабой, што ўладна пацягнула яе раптам да людзей, да іх разумення. Вось жа казаў пра яе Ігналь Яўдохін: балесная! — значыцца, шкадаваў. Разумеў. І Ніна іх шкадавала, хворых. Не на словы іхнія, не на позіркі адгукалася, а на боль. Боль яна чула. Усім нутром сваім збалелым адчувала, калі помачы ад яе чакалі. Праўда, не заўсёды магла дапамагчы. Не доктарка ж, нянечка! Ды і ў нянечкі пайшла, бо куды ёй было ісці? І Дзмітрыеўна ўгаворвала. Ратавала...

«— А ХТО — НЕ ЗАБІЎ? Вайна ж. На вайне не ў лялькі гуляюць, са смерцю гуляюць. Не ты смерць апярэдзіш — яна цябе прыбярэ. Не ты — дык цябе.

Я чую хрыпаты, надтрэснуты голас і ніяк не магу ўявіць таго, каму ён належыць. Усіх нібыта ведаю ў атрадзе, а голас — чужы...

— «Не ты — дык цябе!» — перадражніла той голас Дзмітрыеўна (Дзмітрыеўну я адразу пазнаю!). — Жанчына ж гэта, не вам роўня, героям. Ды і што да смерці, не смерць яе шукае, а яна смерць... Кулямётам авалодаць змагла — і авалодала, і страляла лепш, чым каторы, і пад кулі лезла там, дзе і мужык адступіўся б. А гэта ж ва ўпор страляць давялося, твар у твар. Сама з-пад трупа яе выцягвала...

Гэта пра мяне яна. Чую, разам са словамі, як зноў падступае да горла млосць: адкуль той рыжы, з бязбровым, пабітым рабаціннем тварам толькі і ўзяўся? Матлянуўся да кулямёта з-за куста, а ў вялізных, круглых, як у зайца, вачах — страх. І жорсткасць. І не страляў, падла. Да горла майго адразу кінуўся...

Млосць падступае яшчэ вышэй, рот набухае ліпкай, саладкаватай горыччу — ледзь паспяваю павярнуць го-

лаў... Скалапаецца ўсё нутро. Недзе ў жываце расце тупы, працяжны боль.

— І хто толькі бабам зброю ў рукі дае? Цьфу! — мацюкнуўся хрыпаты, адыходзячы.

— Вось ты і не баба, а на дапамогу не кінуўся. Непадалёку ж ляжаў! — кінула ўслед Дзмітрыеўна, падтрымліваючы маю галаву. — Мацярыцца вы ўсе мастакі, а каб не яе кулямёт...

Гэта пра мяне яна. Пра бой апошні. Немцы новыя сілы падцягнулі. Асмялелі нячысцікі — у лес палезлі... І той, рыжы, з бязбровым, пабітым рабаціннем тварам — круглыя вочы, поўныя страху, на ўвесь твар! — аднекуль узяўся. Матлянуўся да кулямёта з-за куста — і да горла майго адразу... Добра, што рука падораны Хведарам, Федзькам Верамеевым, пісталет намацала! Як у сябе страляла...

Млосць усё яшчэ варушыцца ўва мне. Але глыбей. Там, дзе расце тупы, працяжны боль.

— Палегчала? — пытаецца, выціраючы мне рот, доктарка.

Расплюшчваю вочы. Бачу яе заклапочаны, устрывожаны нечым твар і зноў зводжу павекі: памерці не дадуць!

— Бачу, што палегчала, — з палёгкай уздыхае яна. — І добра. Вось і добра. І душа выправіцца. Выпраміцца. Нядоўга ўжо гэтым злыдням па зямлі нашай хадзіць. Гоняць іх ужо адусюль, і мы, чым можам, дапаможам...

Я маўчу, сціснуўшы зубы.

— Ты маўчы, маўчы! А я ля цябе пасяджу, пагаманю. Раненых сёння няшмат: ты ў нас — герой, усю дарогу трымала пад прыцэлам. Добра страляла. Нічога не скажу. Бачыла. А ўсё ж выздаравееш, сама папрашу камандзіра, каб разам з падзякай пакаранне вынеслі: навошта ж вытыркацца, як патрэбы няма? І ад прыкрыцця не ўпершыню адмаўляешся... Хлопцы самі па чарзе прыглядваюць. А ты ж баец. Як і ўсе. Як і я. Я ж не бягу паперадзе агню, ведаю, дзе маіх рук, маёй дапамогі чакаюць. Месца сваё ведаю.

Я маўчу. Я нават злавацца пачынаю, ловячы сябе на тым, што з нечым у яе словах міжволі пагаджаюся. Бач ты! — хлопцы па чарзе прыглядваюць... А запытацца: хто іх прасіў? Хто іх просіць прыглядваць за мной? Няйначай, яна, доктарка гэтая. Жаласлівая над-

та ж! Высахла ўся — на чым толькі акуляры трымаюцца? — а туды ж! клапоціцца! Яе Іван жывы, нябось. Побач ваююць. Разам. І я хачу побач. Няхай мёртвай, але побач... Няхай бы за свайго Івана і перажывала, дык не! Які ўжо раз у душу спрабуе ўлезці. «Я ля цябе пасяджу, пагаманю...» Сядзі! Гамані, як слоў не шкада.

Нейкі ледзь чутны голас ува мне перабівае мае думкі, не дае злосці разліцца, захліснуць душу. Ды што голас! Я і сама ведаю, што несправядлівая да доктаркі: шмат каго яна ўратавала ўжо. На сваім месцы, адным словам. Сам камандзір да яе звяртаецца толькі з імем па бацьку: Вера Дзмітрыеўна. А тэтай Веры Дзмітрыеўне толькі дваццаць чатыры мінула, сама неяк казала...

— Ты зараз, няйначай, думаеш: вось прычапілася! — памерці не дае... І не дам! Ад маладосці ў цябе гэта. Ды ад непамернай тугі тваёй. А ты расплюшчы вочы, зірні, колькі людзей гіне штодня, услухайся ў стогны раненых. Не праз сябе, не праз сваё — услухайся, а як чутна. Не туга павінна ў душы быць, а помста. Не самой пад кулі трэба лезці, а забіваць, забіваць, забіваць гэту погань, што столькі гора на зямлю нашу прынесла.

— Вера Дзмітрыеўна, з кім гэта ты тут гамоніш? Няйнакш, Ніна наша ачуняла?

Камандзір! Васіль Лук'янавіч... Я яшчэ мацней сціскаю павекі, яшчэ глыбей уціскаюся ў дзяружку, пасланую на бярэмак травы. Ну, зараз нагаворыць яму! І пра хлопцаў, якія спадцішка прыглядваюць за мной. І пра тое, што вытыркаюся, што пад кулі лезу. І пра немца таго бязбровага, з-пад чыйго трупа яна мяне вывалакла...

— Ачуняла, Васіль Лук'янавіч. Шок мінуў. Вось вачэй расплюшчваць не хоча, дык я і ўгаворваю яе, як маленькую.

Я, здаецца, бачу, як яна ўсміхаецца, папраўляючы рукой акуляры. Ачуняла! Толькі што ўсю сярэдзіну вывернула... А камандзір, пэўна, узіраецца ў мяне: мурашкі па целе пабеглі — гэткі пільны ў яго позірк. Пэўна ж, узіраецца.

— Ты ўжо глядзі за ёй, доктар. Прыйдзе да памяці, да цябе прыстаўім. Няхай дапамагае. Будзеш вучыць яе сваёй справе...

— Не хачу! — вырываецца ў мяне ледзь чутна, хоць я крычу, перапыняючы іх гамонку.

— Ну-у, а ты казала, Вера Дзмітрыеўна, што яна вачэй расплюшчваць не хоча! Расплюшчыла. Ды яшчэ як шырока: цэлае неба змясцілася ў паглядзе.

— Не хачу! — паўтараю, зглынуўшы горыч.

— Чаго — не хочаш? Хварэць? Правільна. Хварэць няма калі. Ды гэта табе і доктар скажа. Правільна, Вера Дзмітрыеўна?

Ён пайшоў, не чакаючы адказу. Я прыўздымаюся, каб запыніць яго, каб сказаць, што не хачу вучыцца ніякой справе, што я прыйшла ў атрад, каб адпомсціць за Сцяпана і загінуць, што яму, камандзіру, няма ў чым мяне папракнуць, што я страляла, пакуль магла... Я шмат што хачу яму сказаць, але крокаў ужо не чуваць, а Дзмітрыеўна мякка ўкладвае мяне на дзяружку і бурчыць:

— Рана, рана падымаешся, галубок. Паляжаць яшчэ трэба.

Я не заплюшчваю вачэй, хоць і на яе не пазіраю. Пазіраю ўгору, у неба, якое не могуць засланіць нават густа паплеценыя дубовыя галіны. Яно чыстае, светлае, быццам няма на свеце ніякай вайны, быццам ляжу я, дзяўчынка, у траве і цікую, як цэдзіцца яго чысціня, яго светлыня праз голле, праз шырокае лісце...

— І то сказаць, — мовіць Дзмітрыеўна, прымасціўшыся, як вызначаю на слых, на калодзіне непадалёк, — не жаночая гэта справа — забіваць. Жанчыне, галубок, прыродай наканавана: нараджаць. Раджаць. Дзіця, чалавека... Даваць яму жыццё. Супраць прыроды пайсці — гэта супраць сябе... Адно што вайна не разбірае!

Неба адплывае кудысьці ўвысь — бачу толькі пакручаныя, густа паплеценыя галіны ды бярэмкі лісцяў над імі. Стары дуб, непадалёку ад партызанскага шпіталя...

— Думаеш, чаго хлопцы за табой прыглядваюць? Ты ж жанчына, дзяўчынка амаль. Ты прыгожая... Ім бы песні пад тваімі вокнамі пець, ім бы ў вочы твае заглядвацца! А яны мацюкі не заўсёды стрымліваюць побач: цяжка даводзіцца часам. Цяжкая праца ў іх. І ў працы гэтай, галубок, мы — нераўня ім. Не адвагай, не стойкасцю, не сілай нават нераўня, а прыродай — па прыродзе сваёй.

Я маўчу, не абзываюся. Маўчыць некаторы час і яна.

— За Іванам, з Іванам сваім прыляцела сюды, у ва-

рожы тыл, — да вас, у лясы вашы. Сэрца крывёй абліваецца, як няма яго побач. Ды адчула я і іншае: рукі мае тут патрэбны, сэрца маё можа чыесьці пакуты зменшыць, сцішыць. Часта думаю, што гэта не менш важна, як хадзіць на заданні, не менш патрэбна, як страляць, — ціха, даверліва звяртаецца Дзмітрыеўна да мяне, да майго маўчання, і голас яе закалыхвае, здымае тупы, працяжны боль. — Можа, нават больш... Падумай, галубок, якія хлопцы гінуць! Трэці год гінуць, набліжаючы перамогу... Не паверыш: сама, здаецца, памерла б за каторага з іх! Мала медыкаментаў, не хапае бінтоў, зусім няма чым абязбольваць. Бачу: адыходзіць каторы, боль не перамогшы, — гладжу рукі яму, твар, а ён вуснамі руку маю ловіць, развітваецца. Не са мной развітваецца — з жыццём, з маладосцю сваёй. Які раз баюся, што не вытрымаю. Прыйдзе Іван — плачу ў яго на грудзях... Баба і баба!

Яна — баба? Яна — плача? Я спрабую ўявіць, як плача доктарка, хаваючыся ад партызан, а бачу чамусьці, як яна ўсміхаецца, папраўляючы рукой акуляры. І ўжо не змагаюся з дрымотай, што навальваецца зверху, праз густа пераплеценае дубовае голле, хоць нейкі час яшчэ чую яе горкія, набалелыя, мусібыць, словы.

— Вось і ты... Дзяўчынка амаль. А з болю свайго ніяк не выкараскаешся. Колькі смярцей не могуць адну засланіць, Сцяпанаву. Ні на аднаго хлопца не азірнулася, ні да аднаго слова цёплага ніколі не пацягнулася...»

Ні да аднаго слова цёплага ніколі не пацягнулася, не. Праўду казала тады Дзмітрыеўна. Праўдай было б гэта яшчэ і сягоння, скажы яна гэтак. Ад таго і душа Ніна была мёртвай. Цяпер яна гэта бачыла. Разумела. А тады... Тады было мёртвым усё вакол.

Ніна ішла хутка, па-ранейшаму прыціскаючы свой бязважкі пакуначак да грудзей. А час, як ёй здавалася, рухаўся асобна ад яе — павольна, усё замаруджваючы і замаруджваючы хаду. Колькі тут было ісці ад цэнтра да іх бальніцы, а сонца ўжо відочна пасунулася за высокую, як казалі — стогадовую, не меней, ліпу, што расла ля падворка старой Грыпіны і была відаць адусюль, з любой вулічкі пасёлка. Павярнуўшы голаў крыху ўлева, Ніна бачыла яе магутны цёмны абрыс на фоне крыху пабляклага гарачага неба. «Цень ліпы папоўз да Па-

вэлкавага двара», — падумала неяк няўзнак, не заўважаючы, што пра свой двор думае, як пра чужы...

— Дзе ты ходзіш так доўга, галубок?

Толькі зараз змеціла Ніна Дзмітрыеўну — тая спяшалася да бальнічных варот, з суседняга завулка, гэтаксама аднекуль з цэнтра.

— Ды я... Мне трэба было... — не знайшлася Ніна, хоць і абдумвала загадзя, як скажа, як раскажа доктарцы пра свае думкі ў скверы.

— Ведаю. Толькі цябе Віктар Юр'евіч, прафесар, чакаў. Каб развітацца.

— Развітацца? Ён што, паехаў?

Голас Нінін уздрыгнуў так разгублена, што Дзмітрыеўна, ступаючы з ёй поруч, абняла яе за плечы, міжволі прыпыніўшыся на момант і зазіраючы ёй у твар.

— Паехаў. Правяла вось... Лекцыя ў яго сягоння. У мединстытуце... Ну, пойдзем, пойдзем, галубок. Падрыхтуюся да абходу, а потым пасля абходу і пагамонім. Добра?

Ласкава падштурхнутая яе рукой, Ніна ступае да варот, і яны, абедзве невысокія, хударлявыя, ідуць да дзвярэй прыёмнага пакоя — да неадкладных, адкладзеных на нейкі час спраў: Дзмітрыеўна — да сваіх, доктарскіх, Ніна — да сваіх...

У бальніцы ціха. Час пасляабедзеннага сну. Зірнуўшы на гадзіннік, які вісіць у калідоры на сцяне, яна не здзівілася, што дзень хіліўся на вечар, — вызначыла гэта яшчэ на сонцы. Стрэлкі паказвалі пятую гадзіну.

Звыкла выставіла з бакоўкі вядро вады, узяла швабру. Звыкла здобрыла ваду жменькай хлоркі і пачала падціраць, асвяжаць падлогу.

Рухі яе былі нячутныя, хуткія. Цёмная вільготная паласа, шырынёй на ўвесь калідор, блішчала за ёй — здавалася нават: цякла, цеснячы Ніну да кутняй, чацвёртай палаты. Упёршыся ў сцяну, яна ступіла на мокрую анучу, выцерла ногі і нейкі момант перачакала. Шкада было заследжваць вымытую падлогу, пакуль не высахне. І ўсё ж зрабіла крок, другі. Падышла да бліжэйшага акна, згледзеўшы за ім двух знаёмых галубоў: штодня прылятаді — шэры з бляклa-ліловым адценнем паважны голуб і галубка, сяброўка яго, вытанчаная, з малочна-крэмавым пушком на грудцы. Яны нецярпліва тапталіся на падаконні, буркавалі, як перагаворваліся,

чакаючы ласунку і косячы то адным, то другім вокам на Ніну.

Ласунак, крышан хлеба, у Ніны заўсёды для іх у кішэні халата быў. Вось і зараз яна намацала хлеб і, шырэй прачыніўшы акно, пачала крышыць на падаконне падатлівы мякіш. Галубы здзёўбвалі крышынкі, не баяліся Німіных рук і буркавалі, прыўздымаючы галоўкі, грамчэй, задаволена. Здзяўблі ўсё чыста. З хвіліну зіркалі ў яе бок, прыхарошваючыся, апраўляючы пёркі, і разам, шумна, забілі крыламі — узляцелі. Адляцеўшы колькі крокаў, селі на яблыневую галіну і зноў буркавалі, гаманілі адно да аднаго.

Ніна жавала чыста абабраную пальцамі скарынку і яшчэ нейкі час цікавала за галубамі, думаючы, што вось так і людзі мякка, пяшчотна гамоняць адно да аднаго, калі ёсць паміж імі згода і сардэчная прыхільнасць, калі склалася ў іх адно на дваіх жыццё.

У іх з Павэлкам — не склалася. Ды і не складзецца ўжо, відаць. З-за яе, Ніны, не складзецца. Не ляжала да яго душа адразу, і не трэба было яе, душу, гвалціць. Нічога з гэтага не выйшла...

Неяк нечакана згадаўшы Павэлка, упершыню за гэты доўгі дзень, яна спахмурнела, насупілася — тонкая зморшчынка на пераноссі рэзка акрэслілася, паглыбела, нагадваючы рубец. Ніна правяла па ёй пальцам, нібыта разгладжваючы, і адвяла ад галубоў на галінцы, ад акна, позірк. Прычыніла акно і толькі тут убачыла на падаконні кнігу. Прачытала назву: «Медыцынскі даведнік. Для студэнтаў медвучылішчаў». Мабыць, Таня пакінула...

Узяла даведнік у рукі. Наўгад разгарнула. І пабеглі прывабна таямнічыя словы: «Пры сардэчна-сасудзістых захворваннях назіраецца агульны спад жыццёвага тонусу...»

## 19

Пінжак надзяваць Павэлак не стаў: спёка яшчэ не спала. Але ісці не пры касцюме было гэтаксама няёмка. Таму, павагаўшыся які момант, усё ж накінуў пінжак на плечы. А мо не ўпрэе. Пара касцей не ломіць. А гэтак ямчэй. Не ў краму ж сабраўся, у школу. Да настаўніка.

Бачыў з раніцы, як беглі дзяўчаткі ў белых хвартухах — гэта ж экзамены, па ўсім відаць, не скончыліся. Значыцца, і настаўнік, Іван Панцеляймонавіч, у школе.

Каб сказаць, што Павэлак, добра ведаючы настаўніка — хто ж яго не ведае? — з нечым звяртаўся да яго, не скажаш. На «ты» з ім не быў. Раскланьваліся пры сустрэчы, рукаліся, калі здаралася прыпыніцца. Сустрэчу з дзецьмі той Павэлку наладзіў. У каго толькі і выпытаў усё пра яго? Гнась казаў, што музей Іван Панцеляймонавіч збірае, дакументы розныя, здымкі, рэчы, каторыя з вайны засталіся, — дзяцей па іх вучыць. Гісторыі вучыць. Вось і ён, Павэлак, з усімі сваімі буднямі партызанскімі, даўнімі, трапіў у гісторыю. У музей школьны. Хоць нават не пацікавіўся, не зірнуў тады, як быў...

Тады ў школе настаўнік пачаў замест яго расказваць. Шмат нагаварыў: і пра яго, Павэлка, пра аперацыі, у якіх ён удзельнічаў, складна выходзіла, пра медаль ягоны «За адвагу».

А Павэлак так разумеў: навошта ў мінулым бясконца калупацца? Дзецям яно, мусібыць, і цікава. Мусібыць, і карысна пра геройства паслухаць. А яму гэтыя геройствы дагэтуль сон адганяюць, палохаюць — прачынаецца ад выбуху ці ад стогну свайго...

Не, колькі гадоў ужо мінула, а Павэлак азіраецца назад, на гады свае маладыя, мала таго што з нежаданнем — са старой зацятай злосцю. Вайна ўсё заблытвае. І ў свеце, і ў чалавеку кожным. Так страшна заблытвае, што часам і разблытаць нельга. Да самай смерці не разбярэшся, дзе ты вайну абхітрыў, дзе яна цябе аглушыла. Выжыў — і дзякуй богу. Колькі — не выжыла, засталося ляжаць па лясах ды балоцінах! Выжыў — і дзякуй богу. І ўзнагарода ў тым.

А медалі... Не сядзеў жа і Павэлак склаўшы рукі. Што мог, рабіў, каб гэтых нячысцікаў паменшала на зямлі, каб не ўкараніліся яны тут, не прыжыліся на касцях людскіх ды папялішчах.

Рабіў, як жа. Не сядзеў склаўшы рукі. І геройства ў тым. І ўсе, выходзіць, героі. Бо кожны хацеў выжыць. Кожны разам са сваім жыццём і зямлю бараніў. Бо як без зямлі? І жыве, і памірае чалавек на сваёй зямлі, калі па-людску жыў. Так і пры дзядах было. Вось у музей дзяды не патрапілі: не было тады музеяў...

Павэлак прымкнуў дзверы, паклаў ключ пад ка-

мень каля ганка, паправіў пінжак. Скіраваўся да весніц. Разважанні яго былі простыя: гэтак заўсёды ён разважаў, калі далёкія цяпер ужо дні змагання, яго партызанская вайна — нейкім чынам нагадвала пра сябе. Не хацеў ён разбірацца ў тым, што адышло, мінула. Хіба зараз разбярэшся, дзе ты вайну абхітрыў, дзе яна цябе аглушыла, адабраўшы штосьці самае тваё. Невядомае, незразумелае, але, як пасля выходзіць, вельмі неабходнае тваё. Што ж, цяпер у ладкі пляскаць?

Не, у школу, да настаўніка, скіраваўся Павэлак не геройствы свае згадваць. Якое там геройства, калі ад таго перажытага жаху дагэтуль на лбе пот па начах выступае? Не будзе ж ён пра гэта расказваць! — гэта не для гісторыі, не для музея... Размова ў Павэлка была да Івана Панцеляймонавіча, папытацца яму рупіла, распытаць пра падполле. Раптам які след знойдзецца...

Ён і сабе не прызнаваўся ў гэту хвіліну, які, чый след хоча знайсці ў мінулым, лісты, фотаздымкі, дакументы з якога настаўнік так беражна збірае ў свой пакойчык (Гнась казаў: усе сцены паабчапляны рамкамі). Размова ў яго была да настаўніка. І нічога дзіўнага ў тым няма. Усе да яго ідуць. Хто з адным, хто з другім. Іван Панцеляймонавіч — не быў бы ён настаўнікам — пра ўвесь свет, дзе што якое дзеецца, пра ўсю палітыку сённяшнюю раскажа, хоць і гісторык, гісторыі дзяцей вучыць. Сённяшні дзень гэтаксама ж стане некалі гісторыяй. Мо і ў музей трапіць.

Падумаўшы пра сённяшні дзень, Павэлак пахмурна ўсміхнуўся: ды ўжо ж, было што ў гэтым дні на музейную паліцу ставіць ці ў рамку на сцяне ўстаўляць! Хіба што пустую бутэльку з-пад гарэлкі, якую ён распіў з сябруком, згадваючы мінулае. Ці той ліст без подпісу і зваротнага адраса, які знайшоў яго, каб развярэдзіць душу...

— Добры дзень! Добры дзень! — адказваў ён на вітанні школьнікаў, якія высыпалі насустрач з праулка, дзе была школа, мо ўпершыню за колькі год узіраючыся ў іхнія твары запытальна і ўстрывожана.

Іхні гэта быў дзень — сённяшні. Навуку ім далі. Школу новую збудавалі. Усе шляхі перад імі адкрыты. Усе музеі іх геройстваў чакаюць. Ён, Павэлак, сваё адгеройстваваў. Даўно. Як ні спрабаваў забыцца на ўсё, як ні адхрышчваўся ад перажытага, а кіне вокам — нічога, апроч вайны, апроч гадоў тых страшных, і не пры-

гадваецца. Быццам менавіта тыя гады і былі адзінымі гадамі, калі ён жыў. Быццам далей, за імі, і не было ўжо нічога. Жыў, канечне... Дробнымі будзённымі клопатамі. Трывогай за Ніну, якая так і не аправілася ад гора, так і не прыгарнулася да яго, Павэлка, — жыла даўнім, далёкім...

Гэтыя пра вайну не ўспомняць: не бачылі, — з нечаканай зайздрасцю падумаў пра дзяцей, чые галасы былі яшчэ чуваць ззаду, за спіною. Іхні гэта быў дзень — сённяшні.

Яму хацелася курыць. Павярнуўшы ў правулак — усяго нічога заставалася да школы: якіх метраў сорак, — спыніўся. Ступіў у цень клёна, што рос пры дарозе, палез у кішэню. Паправіў ссунуты на адно плячо пінжак, няспешна скруціў цыгарку. Лізнуўшы языком, склеіў канец газетнага шматка, сплюнуў крышынкі тытуню...

«НА ЎСЯКУЮ БЯДУ НЕ НАПЛЮЕШСЯ», вось ужо праўду людзі кажуць. Плюнуў быў і на гэта богам забытае Запярынне, і на дзеўку страчаную, і на шкадаванне сваё, на яблык парагорклае: халера яго бяры з тым шчасцем. Не сёння-заўтра пад кулю трапіш: дурная куля, нікога не разбірае! Што ж па дні ўчарашнім плакаць? Не выйшла і не выйшла. Аж не! Зноў усё ў душы — угору дном. Зноў дзеўка на вочы трапіла — і грызе, точыць скруха, як раней.

Федзька Верамееў учора ў атрад прывёў: скура ды косць. У чым толькі і душа трымаецца? — дзьмухні, і затрымціць уся... Прайшла паўз мяне, не прызнала. А мяне як варам аблілі: стаю і не тое што апраткі — скуры на сабе не чую. Гэтак кахаў яе, ці што?

Хоць не, пры чым тут каханне? Выдумка ўсё. Выбраў яе калісьці з усіх, адну з усіх, а яна да іншага пацягнулася, да прышлага. Вось і ўсё каханне.

«Ніна... Ніначка!» — замітусіліся ўсе вакол. Ведама ж, месяцамі жанчыну не бачылі. З дэсантам доктарку Веру падабралі, сустрэлі радасным гулам, дык і тая Верай Дзмітрыеўнай назаўтра стала, жонкай радыста аказалася... Да яе, да доктаркі, і Ніну прыставілі. Каб у шпіталі дапамагала. Ну, якая з яе помач? Сама як цень ходзіць. Скура ды косць... вочы — два сінія прагалы: зазірнуў учора — як варам аблілі...

Падысці бліжэй, ці што? А чаго? Пайду хлопцаў праведаю. Нанач жа выходзім на чыгунку!

— Табе чаго, Пятровіч! Еду на язык мазануць? Ці мо пераведаць каго прыйшоў?

— Хлопцаў пераведаць, — буркаю.

І накруцілася ж аднекуль! — як з-пад зямлі перада мной вырасла. Акуляры на носе носіць, а ўсё бачыць, халера ясная!

— Хлопцаў, кажаш? Бач ты! Трэці сягоння прыходзіць хлопцаў пераведаць, як не ведаючы, што ў нас толькі дзед Гаўра ляжыць... Ніна! — гукае ў зараснік маладога сасонніку. — Тут да цябе госць. У адведкі прыйшоў.

А каб ты спрахла, з бабай гэткай! Зірнуць хацеў, як няўзнак. А яна, шаляніца, увесь лагер на ногі падыме. Хачу матлянуцца куды ўбок ці назад, але ж я не хлапчук там нейкі. Няхай яна, гэта Вера Дзмітрыеўна, не думае, што я жарту яе напалохаўся. А хоць бы і да Ніны ішоў! Што ёй у тым за цікавасць? Мо што не да яе... Усе яны адным мірам мазаны! І апраўдваюся я не перад ёй, чужой, а перад сабой. Ды і не апраўдваюся...

Чую, як сціскаецца сэрца. Жалем сціскаецца. Шкадаваннем. Ці яшчэ чым... Да нас ідзе Ніна, і мо таму, што пазіраю на яе цяпер адкрыта, што пазіраю доўга, аж пакуль яна не набліжаецца, заўважаю і зжоўклы, схуднелы твар, і тонкую, як перашчыкнуць пальцамі, шыю, што бялее з-пад завязанай пад барадой касынкі, і абыякавы, нейкі нават мёртвы позірк глыбокіх сініх правалаў вачэй. Гэты позірк палохае мяне, міжволі раблю крок назад. І толькі аграмадным намаганнем волі ўтрымліваю сябе, ступаю насустрач.

— Добры дзень, Ніна.

— Здраствуйце.

Не пазнае, мусібыць. Спынілася ў некалькіх кроках ад нас, бліжэй да доктаркі.

— Павел Пятровіч я. Павел Пятровіч Бурш. Не пазнаеш? — спрабую я справіцца з хваляваннем.

— Чаму ж не пазнаю? Пазнала, Павел Пятровіч. Не адзін раз у бацькавым двары былі. Даўно праўда... Цэлае жыццё мінула...

— Што ты, Ніна, якое жыццё? Колькі месяцаў... — пачынаю я бадзёра і натыкаюся на цяжкі пагляд доктаркі, і згадваю, што хварэла Ніна, доўга хварэла. — Ты гэта... Калі што трэба, дык я заўсёды гатоў...

Словы скончыліся. А Ніна пазірае па-ранейшаму абыякава і трэ, трэ рукі адна аб адну. Быццам мерзне. Хоць сёння сонечны жнівеньскі дзень і вакол нас, над намі, калышацца гарачы сасновы водар. Хоць не тое, што зябка, спёку з плячэй не зваліць — я ўпрэў увесь падчас размовы.

А яна раптам абзываецца. Голас затрымцеў, як нацятая струна, тонка, трывожна, быццам што збудзілася ў Ніне:

— У адным дапамажыце, Павел Пятровіч. Страляць хачу навучыцца, кулямётам авалодаць. Папрасіце за мяне камандзіра! Век не забуду.

Вось гэта паварот! Куды і жаўцізна з твару дзелася? Я так яўна разгубіўся, што чмыхнула ў кулак доктарка, Вера Дзмітрыеўна... Нішто сабе жаданне: кулямётам авалодаць! Іх усяго два ў атрадзе, ды і тымі не я распараджаюся. А камандзір і слухаць не стане: дзеўку — за кулямёт?

— Папросіце?

Ніна стаіць зусім побач. Сіні яе позірк гарыць так блізка, што я баюся вочы падняць.

— Ды папрасіць, папрасіць, Ніна, — умешваецца доктарка, дапамагаючы мне адолець разгубленасць. — Чаму б яму і не папрасіць?

— Канечне... Я гатоў, — спяшаюся я. — Толькі... Ды не! Я гатоў. Чаму ж!

— Дзякуй, Павел Пятровіч.

Твар Ніні гасне. Яна адварочваецца, колькі імгненняў марудзіць і ідзе ад нас. У бок шпітальнай зямлянкі. У сасоннік. А я як прырос да таго месца, дзе стаяў.

— Я гатоў. Чаму ж! — паўтараю цяпер ужо гэтай Веры Дзмітрыеўне, што не адыходзіць ад мяне, чагосьці чакае і, пэўна ж, усміхаецца, папраўляючы на носе свае акуляры.

Зіркаю ў яе бок. Так і ёсць. Усміхаецца. Праўда, неяк вельмі сумна ўсміхаецца. Не крыўдна. Разумеючы стан мой, словы мае бязладныя. Спяшаўся дурань. Зірнуць хацеў як няўзнак. А цяпер да камандзіра падыходзіць неяк трэба. Прасіць яго трэба... Ды засмяе ён мяне з просьбай маёй: дзеўку — за кулямёт! На яе дзьмухні — яна затрымціць уся, а тут гэтую цацку на плечы... Нікуды я не пайду! І прасіць ні аб чым не буду!

— Правільна, Пятровіч. Не трэба нікуды хадзіць. Ва

ўсялякім выпадку, зараз... Я сама з камандзірам пагавару.

Яна што, вядзьмарка? Ледзь падумаў, а ўжо ведае, пра што.

— Цьфу ты, халера на вас, з бабамі гэтымі! Так галаву задурыце, што і я ўжо не я. Цьфу!

Раптоўная злосць нечакана вяртае сілу. І цвярозасць. Павярнуўшыся, шпарка іду прэч. Дурань і дурань! Век на жарты сябе выстаўляю з-за дзеўкі. Як сват на ёй заклініла. Нанач на чыгунку ідзём. Не, каб вочы звесці, паспаць з гадзіну якую — па лесе цягаюся, новую бяду выглядаю. Няўжо зноў жылы з мяне цягнуць дам? Няўжо ўсё спачатку пачынаецца, нічыю маці не памінаючы? Плюнуў жа быў і на гэта богам забытае Запярынне, і на дзеўку страчаную, і на шкадаванне сваё, на яблык перагорклае: халера на яго, з тым шчасцем! Вось ужо праўду людзі кажуць: на ўсякую бяду не наплюешся...»

Пра шчасце нешта ўздумаўся... Нібыта мог сказаць што пра яго, пра шчасце чалавечае, Павэлак. Усё — шчасце. І тое, што нарадзіўся некалі, і тое, што не касы, не гарбаты нарадзіўся, і тое, што жывеш, не адну бяду сваю перажыўшы. Даўней і словы гэткія людзі не часта ўжывалі — шчасце, каханне... Аднаму богу маліліся, аднаго ў бога прасілі: здароўя ды дастатку. Гэта цяпер выдумляюць адзін паперад аднаго: моды, нязгоды, разводы — кожны сваю зорку ў небе шукае. А і не хапае на ўсіх тых зорак. Дзе ж яно хопіць?

У каторы раз агледзеўшы пусты завулак, Павэлак прытушыў цыгарку і заспяшаўся: каб хоць настаўнік, Іван Панцеляймонавіч, не пайшоў! Тады атрымаецца, выстрэнчваўся марна, не кажучы пра згублены час. А ён жа з размовай ішоў, не проста абы... Патрэба ёсць. Хай сабе і не пільная, а ўсё ж патрэба.

Ніхто не сустрэўся яму па дарозе, сам з сабой ішоў, разважаў. Шкроб туфлямі пясок укамянелы (гэта ж дажджу колькі тыдняў няма!) і, косячыся на гарачае неба, прыкідваў, ці будуць якія змены ў надвор'і сёння. Пякло дужа. Дзень на вечар пахіліўся, а дыхалася цяжка. Мо загрыміць увечары...

Прахінуў цяжкія, абабітыя знізу бляхай, дзверы, ступіў цераз парог. У вялізным, як двор, калідоры нікога

не было відаць: пэўна ж, экзамены на сёння скончыліся — добра, калі настаўнік яшчэ не пайшоў. І запытацца не было ў каго. Нікога. Павэлак скіраваўся па калідоры ўправа, узіраючыся ў шыльдачкі на дзвярах. Але на іх спрэс былі толькі лічбы і, за якой з іх мог быць Іван Панцеляймонавіч, гадаць Павэлку — не разгадаць. Ён пратупаў назад, стараючыся ступаць лягчэй: у пустым памяшканні гулка перакочвалася рэха, кожны яго рух паўтарала, кожны гук узмацняла і доўжыла. Зрэшты, калі быў хто ў школе, то адгукнецца, выйдзе да яго. Не мог не выйсці, думаў Павэлак, мераючы крокамі другі канец калідора.

Так і здарылася. Ужо вяртаўся да ўвахода, як пачуў, што па лесвіцы, з другога паверха, хтосьці спускаецца. Павэлак спыніўся. Чакаў. Глыбока ў душы варухнулася шкадаванне, што прыйшоў сюды, у школу, да настаўніка, што змушаны будзе цяпер нешта казаць, нешта тлумачыць. Век не хадзіў, а тут прынесла, сам не змог з усім разабрацца. Сам з сабой...

— Рэдкі, рэдкі госць да нас! Добры дзень, Павел Пятровіч. Чую, нехта тупае ўнізе... А я ўжо дамоў зазбіраўся.

— Ды вось тупаю, рэха па калідоры ганяю. Дзе і шукаць вас, забыўся, — падаў Павэлак руку настаўніку.

Парукаліся, пільна зірнуўшы адзін на аднаго. Іван Панцеляймонавіч — а гэта ён спусціўся з другога паверха! — не спытаўся, чаго завітаў у школу, да яго, Павэлак. Ці то сам здагадваўся, ці то звычкі гэткай не было — адразу з пытаннем да чалавека падступаць.

— Давайце падымемся да мяне, — прапанаваў ён. — Вы ж і музея нашага не бачылі, Павел Пятровіч. Не выпадала тады, мінулы раз. Ды і даўно тое было: шмат чаго новага ў экспазіцыі з'явілася.

— Вы ж дамоў ісці сабраліся, — таптаўся ў нерашучасці Павэлак.

Але Іван Панцеляймонавіч ужо крануў яго за плячо, ужо рушыў да лесвіцы, шырока ўсміхаючыся:

— Дом жа нікуды не збяжыць. А вы ў нас госць жаданы, рэдкі госць. Гады чатыры мінула ўжо, ці не так?

— Ды не меней.

— Вось бачыце!

Ён лёгка ступаў з прыступкі на прыступку, зрэдку

азіраўся на Павэлка, быццам падахвочваў яго, увесь ладны, падцягнуты, у белай палатнянай кашулі з кароткімі рукавамі і адкладным каўняром. Ні гальштука, ні пінжака, не раўняючы з Павэлкам, які добра такі ўпрэў у сваім шарсцяным касцюме, а ўсё ж адразу скажаш: настаўнік. Спакойная пастава. Спакойны, злёгку дапытлівы позірк. Спакойны, роўны голас. Спакойна, з годнасцю трымаецца.

Пакой, куды Павэлак увайшоў следам за настаўнікам, цяжка было назваць класным пакоем, хоць там і стаялі з дзесятак сталоў з крэсламі. Усе сцены спрэс былі паабчапляны вялікімі рамамі з малюнкамі, фотаздымкамі, газетнымі ці яшчэ якімі выразкамі. А пад імі, унізе і ўздоўж, — доўгая, укруг ад акна да акна, палічка, на якой гэтаксама раскладзены здымкі, паперкі, рэчы. Побач, у кутку, Павэлак нават кулямёт стары згледзеў.

— Музей наш, — абвёў памяшканне позіркам Іван Панцеляймонавіч. — Справа рук маіх вучняў. Мой больш як дзесяцігадовы клопат.

— Як гэта вы ўздумаліся музей у нас, у Рудні, збіраць? — не стрываў Павэлак, заўважыўшы, з якой гордасцю гаворыць настаўнік: быццам незразумелая рэўнасць кальнула ў сэрцы. — У Мінску ж адкрыўся. Пра ўсю вайну Айчынную...

— Пра ўсю вайну Айчынную расказаць — ніякіх музеяў не хопіць. У кожным паселішчы на нашай зямлі, спаленым, мёртвым ці адноўленым людзьмі, трэба б музей ствараць. Ды вы праходзьце, праходзьце, Павел Пятровіч. Сядайце. Пінжак скіньце, як горача.

— Дзякуй, — удзячна зірнуў на яго Павэлак: яно і горача было, і сэрца раптам захаланула.

Рупіла Павэлку прайсці паўз сцяну, угледзецца ў старыя здымкі і дакументы, ды няёмка адразу, не пагаманіўшы з настаўнікам. І ногі не надта каб слухаліся. Зрэшты, лаcпее яшчэ, супакоіў ён сябе ў думках і прысеў да крайняга стала, падкурчыўшы пад крэсла ногі. Апусціўся на крэсла і Іван Панцеляймонавіч.

— Я вось мяркую: наспеў час, каб па крупіцы, па слову збіраць прыпаміны людзей пра гераізм іхні і пра пакуту іхнюю. Летапіс пісаць гэтымі прыпамінамі, гэтымі словамі балючымі — летапіс змагання народа.

— А навошта? — вырываецца ў Павэлка.

— Што — навошта?

— Навошта ўспамінаць тое даўняе, пякучае? Каму яны патрэбны сёння, тыя прыпаміны?

Голас у Павэлка выраўняўся: ішоў жа да Івана Панцеляймонавіча з гэтай гаворкай — не адступацца ж цяпер!

— Каму, пытаецеся? Дзецям нашым. Унукам нашым. І іх дзецям і ўнукам. Гісторыя не толькі захоўвае памяць пра мінулае, а і вучыць. На ўроках мінулага вучыць. І гэты страшны ўрок спатрэбіцца не аднаму пакаленню — патрэбны ўжо сягоння! Розная поскудзь зноў голаў падымае, і не адно ў Германіі. Не, пільнасць нельга страчваць. Ні на дзень. Яшчэ большай трагедыяй спакой абярнуцца можа. Так што, Павел Пятровіч, забываць нам тыя ўрокі нельга. Рашуча нельга!

Настаўнік гаворыць з пераканаўчай цвёрдасцю, спакойнымі ўзмахамі рукі падкрэсліваючы гэту цвёрдасць, і Павэлак спачатку не рашаецца запярэчыць яму. Нельга забываць... А калі занадта балючыя тыя прыпаміны? А як не хочаш нічога згадваць, прыпамінаць?

— А як не хочаш нічога згадваць, прыпамінаць? — звяртаецца ён да Івана Панцеляймонавіча. — Як пазбавіцца хочаш ад усяго, што перажыў, ад усяго, што бачыў? Тады як?

— Забяры ў чалавека памяць — ён і чалавекам не быў бы. Ні роду свайго не ведаў бы, ні зямлі, да якой сэрцам прывязаны, — штодня жыць бы вучыўся, штодня — наноў. І ніколі б яму ніводнага закону не вывесці, ніколі б дабра ад зла не адрозніць. Вы і самі гэта разумееце, Павел Пятровіч, — углядаецца ў Павэлка настаўнік. — Пытаецеся не таму, што адказу не ведаеце, — каб сумненні свае адвесці.

— Ды не сумненні гэта, — апусціў вочы Павэлак. — Жыць не даюць спакойна прыпаміны гэтыя.

— Вось і трэба да людзей ісці. І з болем сваім ісці да людзей. Чалавек чалавекам дужы. Так спрадвек было.

Ён памаўчаў. Нібыта пра штосьці сваё задумаўся. Потым нечакана ўсміхнуўся, як не аднымі вачыма ўсміхнуўся, і напаўголаса, расцягваючы словы, сказаў:

— І хто гэта калі ўвёў нам у вушы, што жыць трэба абавязкова спакойна? Неспакойна трэба жыць, Павел Пятровіч! У спакоі часта бывае штосьці затхлае, аджытае. Спакой зацягвае, як дрыгва, калі ў яго патрапіш:

год, другі — і нават бултыхацца не схочацца. Па сабе добра ведаю.

Павэлак здзіўлена зіркнуў на Івана Панцеляймонавіча, нават бровы, недаверліва ўздрыгнуўшы, прыўзняліся.

— Здзіўляецеся? — яшчэ шырэй усміхнуўся той. — Думаеце: як гэта так — настаўнік, а пра спакой, як пра дрыгву, што зацягвае, разважае, пра сябе ў тым спакоі... Было, Павел Пятровіч, было! Не ўтойваю. Змог я яго, адолеў. Ды не яго, чаго там! — сябе адолеў. У час спахапіўся.

І верыў, і не верыў яму Павэлак. Верыў, бо ўсё ў настаўніку, здавалася, гаварыла аб шчырасці: і шырокая добрая ўсмешка, і іранічнасць да сябе, да нечага свайго, што чулася ў словах, і адкрыты позірк. А не верыў, бо ні ад каго ён ніколі не чуў, каб настаўнікам жылося спакойна: з ранку да вечара таўкуцца ў школе, у тлуме. Які там спакой! Ужо больш дзесяці год мінула, як прыехаў у Рудню Іван Панцеляймонавіч, а ні ад каго ніколі Павэлак не чуў на яго нараканняў: і дзеці, і дарослыя да яго гарнуліся — з кожным пагамоніць, да кожнага ключык знойдзе. Вось і ён, Павэлак, на старасці ў школу прываложся, парады нейкай шукае...

А Іван Панцеляймонавіч пасур'ёзнеў. Пазірае на Павэлка дапытліва, як пытаецца: казаць ці не казаць?

— Адзінаццаць гадоў я арміі аддаў. Чатыры з іх на вайну прыпалі. Лічы пяць... З фінскай, — апусціўшы пагляд на аркуш паперы, на якім алоўкам чыркаў штосьці — рука яго чыркала, — крыху расцягваючы словы, загаварыў ён. — У сорак пятым пад Берлінам параніла: міна непадалёку ўзарвалася. Урачы думалі: не выкараскаюся... Як бачыце, выкараскаўся. Праўда, спісалі па чыстай — у званні маёра. Пенсію паклалі. Дамок у мамы — з-пад Мінска я родам! — ацалеў. Паехаў да яе, за гаспадарку ўзяўся: садок, гародніна, кветкі... Хату перабудаваў. Матацыкл купіў. Маці не нарадуецца... Мо б і жыў так дагэтуль. Спакойна. З думкай, што ўсё, што мог, зрабіць для людзей, зрабіў — кроў сваю за гэты дзень наш мірны праліў, што час для сябе пажыць.

Павэлак слухаў Івана Панцеляймонавіча насцярожана. І верыў, і не верыў. Надта ж ён ужо глыбока браў, і ўсё — пра тое, аб чым і ён, Павэлак, неаднойчы думаў, у чым пераканаым быў. Мо б так складна ўсё, як

настаўнік, не выклаў, а думаць — неаднойчы думаў. Прыйшла навала, накацілася — дома не сядзеў. Сэрца крывёй аблівалася, калі дом свой, гаспадарку дагледжаную, лічы, на аднаго бога пакідаў, але ж — пакінуў. У лес пайшоў. Падрыўному дзелу навучыўся. Колькі ўсяго за тры гады паўзрываў! — за тры жыцці адбудаваць не змог бы сам, адзін...

— Так, мо б і жыў дагэтуль адно клопатам пра сябе, пра сваё, — працягваў Іван Панцеляймонавіч, па-ранейшаму хутка, неспакойна чыркаючы алоўкам па паперы. — Ды хлопцы ў сны сталі прыходзіць. Аднапалчане. Тыя, чые магілы ад Курска да Берліна шлях палка пазначылі. Адзін прыйдзе... Другі. А то і некалькі байцоў разам збяруцца. Пазіраюць на мяне з дакорам: што ж ты, маўляў, ротны, тлушчам вырашыў абрастаць? Што ж ты, маўляў, жыць спакойненька, у баку ад людскіх спраў і турбот хочаш, на нас, на нашы магілы забыўшыся? Прачнуся, пот халодны ўціраю, бы зноў — у каторы раз! — пахаваў іх, і заснуць больш не магу. Кручуся, і так і гэтак апраўдваюся перад сабой: зрабіў жа, што мог, асколак пад сэрцам дагэтуль нашу... Не дапамагалі апраўданні. Не дапамаглі.

Ён падняў вочы ад паперы, і штосьці балючае ўгледзеў Павэлак у ягоным паглядзе — бліснула і згінула. Асколак пад сэрцам насіць, кажа...

— Вось і вырашыў я, Павел Пятровіч, жыццё сваё перакруціць, — ужо спакайней сказаў Іван Панцеляймонавіч, паклаўшы аловак акуратна побач з лістом. — Вучыцца пайшоў. Перавучвацца на настаўніка. Каб потым не толькі ў сваёй памяці аднавіць падзеі Вялікай Айчыннай вайны, а ўсё зрабіць, каб не сцерліся яны ў памяці людзей, каб і дзеці, і ўнукі нашы, і іх дзеці і ўнукі ведалі, за што загінулі мільёны нашых людзей, мільёны лепшых сыноў і дачок зямлі нашай. І зноў я ў страі. І цяпер дакладна ведаю: неспакойна трэба жыць. Каб існаванне сваё на зямлі апраўдаць перад жывымі і мёртвымі.

Ён змоўк. Зноў апусціў вочы на счырканы алоўкам шматок паперы. Маўчаў і Павэлак. Неяк стомлена маўчаў. Бы гэта не настаўнік, не Іван Панцеляймонавіч, гаварыў толькі што, гаварыў доўга і ўзрушана, адкрываючы перад ім душу, а ён, Павэлак. Мо б у яго і не выйшла гэтак складна, а думаў ён амаль тое ж — і балелі яму гэтыя думкі, даўно балелі. Вось толькі жыццё сваё

перакручваць Павэлку позна. Недавучыўся некалі да вайны (на той час ягонай адукацыі хапала: сакратаром сельсавецкім прызначылі!), а потым не перавучвацца, давучвацца трэба было перш. І жаданне гэткае не ўзнікала. Дом трэба было падправіць, гаспадарка была запушчана...

— Я пайду, — падняўся Іван Панцеляймонавіч, — зазірну ў настаўніцкую. Прыгадаў, што запіс у журнале не зрабіў. А вы пахадзіце каля стэндаў, Павел Пятровіч, паглядзіце: усё рукамі дзяцей сабрана. Я толькі дапамагаў.

Ён выйшаў. Шчыльна зачыніў за сабой дзверы. Павэлак чуў, як аддаляліся яго крокі, гулка раскочваючыся рэхам у пустым калідоры. Мо і сапраўды была патрэба ў таго... А калі і не было асаблівай патрэбы, усё роўна быў удзячны яму Павэлак: не знайшоў бы ён зараз, чым адказаць на гэткую шчырасць, на гэткую гаворку. Не спавядацца ж настаўніку, як папу. І так той усё разумеў. Мо таму і пра сябе пачаў расказваць...

Павэлку рупіла ўскочыць, абабегчы стэнды, угледаючыся ў твары на здымках, у пажаўцелыя паперкі, памацаць рукой кулямёт — правесці пальцамі па яго халоднай шурпатай паверхні. Але ён чамусьці марудзіў. Зіркаў вакол, услухваючыся ў аціхлае водгулле крокаў, — чуў, як трапечацца ў ім сэрца, гарачымі, няроўнымі штуршкамі.

Перш чым падняцца з-за стала, нахіліўся над ім, спрабуючы разгледзець, што чыркаў настаўнік на лістку паперы. Цікаўнасць падштурхнула руку. Павярнуў лісток, крыху пасунуў да сябе. Кароткія нервовыя лініі, пакінутыя алоўкам, складваліся ў выразны малюнак бою: разгорнутая, паднятая выбухам зямля падала, сыпалася на дзве саракапяткі, што чапляліся за пагорак...

## 20

— Што гэта ты з такой стараннасцю чытаеш, галубок? — нячутна падышла да Ніны Дзмітрыеўна. — Калі не сакрэт, канечне.

Ніна паспешліва закрыла кнігу і памкнулася пакласці яе назад, на падаконне.

— Дай жа я зірну, — перапыніла яе рух Дзмітрыеўна. — Мо і мяне раптам зацікавіць.

— Гэта Таня пакінула на акне. А я чакала, пакуль падлога падсохне, — мокрая была...

Ніна быццам саромелася нечага, гаварыла, апраўдваючыся. А Дзмітрыеўна ўжо ўзяла ў яе з рук кнігу, мабыць, яшчэ раней здагадаўшыся, што гэта была за кніга, і цяпер пазірала сур'ёзна, без усмешкі.

— Ніна, скажы ў палатах, каб падрыхтаваліся да абходу. І знайдзі Таню: не відаць нешта, — сказала яна нечакана строга і, змеціўшы, што Ніна ўжо сарвалася з месца, праяснеўшы тварам, нават уздыхнуўшы з палёгкай: не спатрэбіліся ніякія тлумачэнні! — дадала: — І сама потым не знікай. Управішся, пачакай мяне ў маім кабінеце. Гаворка ёсць.

Сказала і павярнулася ісці, паклаўшы кнігу на падаконне, так і не зірнуўшы на назву.

— Адпусціла б ты мяне ў водпуск, Дзмітрыеўна! — нечакана для яе самой вырвалася ў Ніны, і абмерла, насцярожана ўслухваючыся ў раптоўны спалох, душа.

Дзмітрыеўна здзіўлена, як здалося Ніне, азірнулася на яе цераз плячо, знаёмым рухам — папраўляючы акуляры.

— Вось пра ўсё разам і пагаворым.

Пра што, пра ўсё? — падумала Ніна, праводзячы яе позіркам, і, як атрасаючыся ад гэтай думкі і ад нечаканага спалоху за тое, што ўдарыў Дзмітрыеўну воклiч, кінуты ёй у спіну, — паправіла халат, правяла далонню па гладкіх валасах, запраўляючы іх пад касынку. А потым і папракнула сябе: на гэткія дробязі стала зважаць! Ну, зазірнула яна ў даведнік. Ну, вырвалася ў яе пра водпуск. Дык жа справы амаль што перароблены: падлога вымыта, хворых яна зараз пра абход папярэдзіць, Таню знойдзе, — тая, няйначай, недзе на траўцы з кніжкай у руках прылегла. А што да водпуску — у водпуску Ніна не была. Мае ж яна права на водпуск, на жаданне, марнуючы час, паляжаць на траўцы, узіраючыся ў кожную травінку, аж пакуль не паплывуць, не пацякуць яны дзівоснай жывой ракой перад вачыма, раскалыханыя позіркам ці ветрам. Зусім як у маленстве, калі Ніну слухаліся і травы, і сцежкі, і вецер. І нават аблокі, калі яна сцягвала іх позіркам у адну вялікую груду і потым, выцягваючы, вызваляючы адно за

адным з гэтай груды, расквечвала іх сваімі марамі, і адпускала, і верыла, што расквечаныя ёй аблокі перафарбуюць у лета цэлы свет — і можна будзе жыць у ім доўга-доўга, вечна.Ніколечкі не хацелася тады Ніне стаць дарослай, і зусім не таму, што гэта цяжка — быць дарослай. Не, не таму. Проста яна адной чы заўважыла, што дарослых не разумеюць кветкі і птушкі, што іх не слухаюцца аблокі: як яна ні дапамагала тату, колькі ні падказвала, ён не мог разабраць, на што скардзілася скошаная трава, калі яны, кінуўшы бярэмак яе ў вазок, ехалі дадому лугавінай. І аблокі ён называў хмурынкамі...

Прыгадаўшы маленства і бацьку ў ім, Ніна ўпершыню адчула цяжар пражытых гадоў менавіта цяжарам, грузам, які цісну ў на плечы і хай сабе непрыкметна, а рос, вырас: яна даўно стала дарослай, яна нават у згадках не магла аднавіць былую здольнасць разумець усё вакол, размаўляць з кветкамі і птушкамі, фарбаваць аблокі ў колер сваёй радасці. Даўно — гэта пасля Сцяпанавай гібелі...

Сцяпан яе разумеў. Бо любіў. І ўсё вакол разумеў, бо ўсё вакол любіў. Хто-хто, а ён не страціў бы гэтай чароўнай сілы — усё любіць. А яна, Ніна, страціла. Тады — раптоўна — і на ўсе гэтыя гады... А водпуск... У водпуск яна не збіралася, а вырвалася — не то просьба, не то запытанне, — і цяпер ужо рада свайму жаданню. Цяпер ужо — рада. Мо яшчэ не позна ўгледзецца ў свае забытыя сляды на ўзмежку поля, і на вясковай вуліцы, і на беразе Пцічы — у маленстве, сляды, якія вялі яе да сустрэчы са Сцяпанам, якія вядуць да ягонай магілы.

«Дзмітрыеўна прасіла папярэдзіць хворых... і Таню адшукаць», — перапыніла думка ўсе астатнія, і Ніна заспяшалася. Сабрала, кінула ў вядро анучу, прыхапіла швабру і аднесла ўсё ў бакоўку (потым ваду вылье!). Вярнулася, уздоўж па калідоры адчыняючы дзверы палат і гукаючы ў іх: «Абход! Падрыхтуйцеся!» Узяла з падаконня кнігу і, зіркнуўшы ў акно — мо ўгледзіць дзеўку? — пайшла да выхаду. Чула спіной спакойны, роўны гул у палатах, чула свае таропкія крокі па сцежцы, што вяла ў сад, а над гулам, над водгуллем яе крокаў — штосьці пашчоўквала, пасвіствала, трымцела...

Міжволі запаволіла крокі, раптам даўмелася: гэта ж — салавей! Спёка спала, і нясмела, з доўгімі паў-

замі, быццам толькі рыхтуючыся, прачышчаючы горла, падаваў голас салоўка. Ніна нават пашукала яго вачыма — ды дзе ж яго ўгледзіш між лісця, густа ўплеценага ў голле!

Таню знайшла ў самым далёкім кутку саду, на траўцы, у засені, з кнігай, у якую яна ўткнулася тварам, лежачы на жываце, — нават крокаў Ніліных не пачула. Не чула яна, відаць, і салаўя, — чамусьці са шкадаваннем падумала Ніна.

— Ці чуеш, Таня? Дзмітрыеўна абход вячэрні пачынае, цябе гукае. Вось паслала мяне...

Недагаварыла. Усміхнулася на таропкія Таніны рухі: тая ўскочыла як уджаленая, ледзь кнігу з рук не ўпусціла і, часта-часта міргаючы густа падмаляванымі вейкамі, спалохана пазірала.

— Даўно?

— Што — даўно?

— Даўно паслала? Я тут зачыталася... Экзамены хачу трымаць у інстытут. Вера Дзмітрыеўна ведае.

— Вазьмі. Гэта ты на акне пакінула, — падала ёй Ніна кнігу. — А экзамены што ж? Вытрымаеш. Ты ж у нас вучоная. І кнігі ў цябе добрыя...

— Дзякуй, — ужо на бягу кінула Таня: спяшалася.

Ніне спяшацца не было куды. Цётку Варвару яшчэ раніцой Косцік забраў. А астатнія хворыя — няшмат было, як на гэты дзень! — усе хадзілі, усе за сабой глядзелі самі. Пасудзіны ўсе чыстыя, усе паскладваны ў бакоўцы. Падлогу яна ў калідоры падцерла: колькі той бальнічкі! Сцежкі таксама чыста падмецены яшчэ з раніцы... Не было куды спяшацца.

Стаяла. Удыхала гарачы пах зямлі — пахла менавіта не сухой травой, не падвялым ад сонца яблыневым лісцем, а зямлёй. Добра ўгрэтай, перасохлай зямлёй. Хоць зусім не на пагорку была бальніца, акружаная яблынямі. Хоць тут, у засені голля, спёка зусім не адчувалася.

Дажджу даўно не было: адно расу пілі і лісці, і зёлкі, і птушкі... Мо таму так доўга настройваўся на песню салавей, што паветра задужа сухое, — здаецца, ледзь чутна пахруствае на кожны рух.

Слухала і слухала Ніна гэтыя пахруствание, пашчоўкванне, посвіст, якія ўсё часцей пераходзілі ў залівісты пошчак, — пазнаючы за імі песню, пацягнуўшыся, горнучыся да песні збуджанай ад сну душой — усёй

сваёй істотай. Не ўмеючы зразумець гэту песню і ўсё ж — пазнаючы. Той, ранейшай сваёй існасцю пазнаючы і прымаючы.

Мо яшчэ не позна ўгледзецца ў свае забытыя сляды на ўзмежку лета, на ўзмежку свайго самастойнага жыцця, — не ўсё ж у ёй, у Ніне, адмерла! А мо і зусім нічога не адмерла — проста стаілася да часу, да сённяшняга дня, балюча хліснутае, адкінутае нечаканай, занадта вялікай для маладой душы бядой. Бо няхай людзі перад ёй вінаваты: хтосьці ж з іх, каго і чалавекам назваць Ніна не хацела, перастрэў Сцяпана, хтосьці з іх, каго як толькі і насіла зямля, прывёў карнікаў у Запярынне, аддаўшы вёску агню, а вяскоўцаў, хто не паспеў уцячы, — смерці. Няхай людзі... Зямля ж нічым перад ёй не вінавата — гэта яна, Ніна, перад ёй вінавата! — не тое што не разумела, як раней разумела, яе галасы, а і не слухала, не чула. Накапаўшы, чысціла і варыла бульбу, зачэрпнуўшы са студні, піла сцюдзёную ваду, сарваўшы з галінкі, смакавала спелыя крамяныя яблыкі — карыстала зямлю, яе сокі і яе плады. А не чула. Не слухала. Ні стогну яе, ні спеву. Нібыта чужая ёй. Нібыта раптам чужая...

«— ПАРОЖНІ МЯШОК ПЛЕЧЫ МУЛЯЕ... Так, здаецца, у вас кажуць, сястрычка? Давай дапамагу.

Сястрычкай мяне заве толькі Іван, таму нават не паварочваюся: знайшоў да чаго прымаўку прычапіць! Каб жа ў мяшку справа, ды яшчэ ў пустым! Ад абозу адстала. Ітак Гняды, як на тую халеру, ледзьве цёгся, злёгку прыкульгваючы на збітую нагу: ні лейцы, ні ўгаворы не дапамагалі. А тут яшчэ ў глыбокую каляіну ўбіўся — ні тпру, ні но! Зямлю развезла пасля дажджоў, дзе ніжэй — самое балота ўтварылася. Вось і едзь. Вось і выбірайся, калі не баішся, што пуп надарвеш.

— Дзмітрыеўна паслала?

— Не, камандзір. На тваёй жа фурманцы — не адно патроны, сястрычка, а і рацыя. Сама ведаеш, як без яе, калі што якое. Глухія і сляпыя...

Ён падналёг плячом ззаду, стала папіхаць зноў і я, падбадзёрваючы Гнядога. Фурманка кранулася, колы няспешна адплёўвалі гразь, цяжка паварочваючыся, выбіраючыся на цвярдзейшае.

— Но, родны, но! Паднатужся! — прашу я. — Яшчэ трошкі...

І пнуся дапамагчы каню, здаецца, чую, як пахруствае штосьці ў плячы і ад пляча — назад, у бок хрыбетніка.

— Яшчэ, Гняды! Яшчэ...

Стала лягчэй. Колы, адчуўшы цвярдзейшую глебу, круціліся вальней. Можна было аддыхацца. Можна спытацца ў Івана, што — што якое.

— Што — што якое? Што — сама ведаеш? — пытаюся.

— Ці мала што! — адмахваецца той, выціраючыся рукавом ватоўкі. — Група Ігната Засекі на чыгунцы бой прыняла. Як яшчэ здолеем перабрацца на той бок з абозам? І раненыя ёсць, і жанок з дзецьмі ды клункамі замнога...

— Куды ж ім, з дзецьмі ды са скарбам сваім?

— Тое і яно, што няма куды, сястрычка!

Заржаў Гняды, які ўжо больш упэўнена пакульгваў па звілістай лясной дарозе, размытай дажджамі, усцяж у калдобінах, поўных халоднай, чорнай зараз, як дзёгаць, гразі. Конь сам імкнуўся абмінуць іх, бы разумеючы іх небяспеку, і таму не-не і чуваць было, праз чаўканне гразі, як трэцца фурманка аб пашарпаныя, тамсям абламаныя голлі асінак ці алешніку, які амаль спрэс шчыльна абступаў дарогу.

Зноў пачаў церусіць дождж, і я тужэй зацягваю канцы хусткі, пахукаўшы на застылыя, ліпкія ад гразі пальцы.

— Сагрэць, сястрычка?

Азіраюся на Івана, на яго голас, спакойна-ўсмешлівы, быццам вось-вось звыкла загучыць чарговы вясёлы яго жарт, і заўважаю, што Іван гэткі ж вымаклы, як і я, — толькі вышэй, да самага верху, запэцканы граззю яго боты, што Іван гэткі ж стомлены, як і я, — колькі доўгіх дзён пераходу няголены, з пачырванелымі ад бяссоння вачыма. Каб не аўтамат на грудзях — чыста бяздомны, хворы валачобнік...

— Ты, Іван, яшчэ жартуеш?

— Чаму ж жартую? У біклажцы трохі булькае. Зробім па глытку — крыху сагрэемся. Як?

Хачу адмовіцца. Штосьці далёкае, даваеннае ўва мне не пагаджаецца. «Жанчыне? Самагонку? З біклажкі?» — стомлена гудзе, здаецца, само цела. А голас — зноў гэты голас! — аднекуль з цёмнай, страшнай глыбіні, адтуль, дзе павінна быць у чалавека душа, па-

сміхаецца: «А пяты дзень мясіць халодную гразь жанчыне можна? А, надрываючыся, папіхаць гружаную фурманку? А не мець магчымасці не тое што памыцца, касу як след прычасаць? Адпі! Глыні! Усё роўна...»

— Давай, як ёсць, — паварочваюся да Івана. — А то і праўда, зубы клацаюць ад холаду. Пасушымся ж, адагрэемся, відаць, няскора...

— Пакуль не паабсякаем хвасты, не адарвёмся ад немцаў, то не адагрэемся, сястрычка. Гэта ўжо факт.

Бяру ў яго з рук адвінчаную біклажку і, заплюшчыўшыся, стараючыся не дыхаць, не ўдыхаць рэзкі, непрыемны пах, раблю вялікі глыток. Стрымліваю кашаль, які рвецца з апечанага горла. Кашляю. Адчуваю, як расцякаецца ўва мне нязвыклае, незнаёмае цяпло, і, каб патушыць Іванаву спачувальную ўсмешку, раблю яшчэ адзін вялікі глыток.

— О-го, якая ты ў нас храбрая!

— У гэтай храбрай адзін зуб другі зуб даганяе — у адно не сабраць. Тут не тое што самагонкі... Но, Гняды, но! Ідзі, родны!

Іду колькі крокаў паперадзе Івана. Стала цяплей. Ці мо проста напружанне, здранцвенне, выкліканае золлю і стомай, аслабла — і кроў хутчэй пабегла, і думкам стала вальней. Не пра сябе, не пра сваё, як звычайна, думаецца, а пра ўсё, што вакол, пра ўсё, чаго позірк кранаецца.

Дзень як дзень. Не горшы, не лепшы. Дождж цярусіць, дык жа восень, самы час дажджам. Чалавеку непрыемна, а лес парадзеў, пасвятлеў. Нават нізкае шэрае неба не можа прымусіць яго быць змрочным, гэткім жа шэрым, як дзень. То бярэзнік усё асвеціць, то — вунь справа, дзе вышэй! — касцёр сасны галінастай...

Дарога не праз алешнік прадзіраецца, а праз зараснік дубцоў голых — кусты венікамі тырчаць ды на кожнай бязлістай галінцы — россып срэбных лісточкаў-кропелек. Зачэпіць фурманка — асыплюцца, і я чую ціхі стук іх па апалым лісці. Праз чаўканне гразі і пафыркванне Гнядога — ціхі стук лісточкаў-кропелек...

— Іван!

— Я тут, сястрычка. Як ліст перад травой.

— Скажы, — не зважаю я на яго тон, — вось мы бачым, чуем дрэвы, кусты, траву, а яны нас бачаць? Яны чуюць?

— Хто? Дрэвы і кусты?

— Ага. Хоць бы і зараз! Тыя дрэвы і кусты, паўз якія мы ідзём, чаўкаючы граззю. Чуюць?

— Напэўна, чуюць... Яны ж жывыя, як і мы, — крыху разгубіўся Іван. — Чаго гэта ты раптам пра дрэвы, пра кусты згадала? Другі год жывём пад іх скляпеннем — пад аховай іх, і раптам...

— Ды не раптам, Іван. Малой я часта з імі размаўляла — малой я ўмела з імі размаўляць! А цяпер жыву ў лесе, сярод дрэў, чую іх галасы — і не разумею. Значыцца, і яны мяне не разумеюць, не зразумеюць.

— Тут людзі адзін аднаго не заўсёды разумеюць, а то дрэвы...

— Ты не смейся, Іван. Над гэтым нельга смяяцца: раней за ўсім гэтым бог быў, а цяпер... мы не ведаем, што цяпер.

— Як жа не ведаем, сястрычка? Прырода. Сусвет! І мы — толькі пясчынкі ў гэтым сусвеце.

— Ніякія мы не пясчынкі, — падшукваю я словы, адчуваючы, як цяжкімі хвалямі пераліваецца, перакочваецца ўва мне цяпло, нават галава часам пачынае кружыцца. — А мы — хіба не прырода, мы — хіба не сусвет? Вось я... Я ў сябе стала ўвесь час услухвацца. Верыш, такога часам наслухаюся, што вар'яцець пачынаю: кожная тканка сваім голасам вядзе. А душа не адгукаецца. Няма душы.

— Сплюнь, Ніна! — даганяе мяне Іван. — Што ты гаворыш? Душы няма... Што ж тады ў табе баліць, словы балючыя выштурхваючы?

— Не баліць... Адбалела, відаць.

Я спыняюся, паварочваюся да яго, заўважаю занадта пільны яго позірк і ціха, па слову, з нечаканай злосцю паўтараю, тыцкаючы сябе ў грудзі:

— Не баліць. Адбалела. Няма чаму там балець. Няма! Выгарэла. Крывёй сцякло-выцекла.

— Што ты, сястрычка, што ты? — палохаецца Іван, спрабуючы ўзяць, супакоіць маю руку, якой я тыцкаю, тыцкаю сябе ў грудзі. — Табе ж дзевятнаццаць гадоў, ледзь мінула дзевятнаццаць.

Я вырываю руку, адварочваюся ад яго і чаўкаю па гразі, даганяючы фурманку. Дзевятнаццаць гадоў... Якое значэнне мелі і маюць гады, шмат іх пражыві ці мала? Іншыя да старасці, да смерці не разумеюць, іншыя старымі і нараджаюцца. А і тыя і другія ззаду

гады слупкамі расстаўляюць — адмецiны. А ў мяне адна адмеціна — страта. Да яе — жыла...

— Нін, га, Нін? — гукае Іван. — Дарма ты пра тое, што прырода нас не чуе, не разумее. Зірні: пасля слоў тваіх дзень яшчэ больш спахмурнеў і дождж нібыта спарнейшы...

Маўчу. Злосці ўжо няма. Але і слоў таксама.

— Хочаш, як скончыцца вайна, я прыдумаю гэткі апарат, гэткі прыёмнік, праз які можна будзе з дрэвамі, з кветкамі размаўляць? Хочаш? Зраблю — і першы прыёмнік табе падару. Самы першы.

— Но, но, Гняды!

— Думаеш, не здолею? Я ж радыёінжынер, радыёхвалямі магу кіраваць — зусім як ты Гнядым. Нават лепш. Бо мне тэхніка дапамагае, а ў цябе і дубца ў руцэ няма. Я і цяпер тое-сёе магу. Вось глядзі!

Міжволі паварочваю голаў. Іван, адступіўшы ад дарогі, стаіць на шырокім абамшэлым пні з узнятай рукой. Заўважыўшы, што я азірнулася, пачынае дэкламаваць:

— Дожджык, дожджык, перастань! Адчапіся ад куста, ад мяне, ад сцежкі і лаві — усмешку!

Усміхаецца, узмахвае рукой, быццам сапраўды адпускаючы ўсмешку. Я прасачыла за ўзмахам і... Відаць, я проста раней не заўважыла, увагі не звярнула: дождж перастаў. Не імжыць. Неба не павышэла, але ціснe, гняце нібыта і менш. Удалы жарт, нічога не скажаш!

Адварочваюся, каб Іван не згледзеў на маім твары ўсмешку.

— Но, но! Варушыся, Гняды!

Дарога пасушэла: выбраліся з лагчыны. Гняды ступаў весялей, чуючы палёгку, чуючы хуткі адпачынак, — весялей цокалі капыты па ўхабістай дарозе. А я, праз міг забыўшыся і на Гнядога, і на аціхлага, непадалёку, за спіной, Івана, думаю пра тое, што жыццё, страціўшы сваю прывабнасць, ніколі ўжо не адкрые мне сваёй таямніцы. Я даўно не разумею яго галасоў. А часам і не чую іх.

Вось жа слухаю, услухваюся! А чую толькі чаўканне гразі пад сваімі мокрымі, цяжкімі ботамі ды, зрэдку, калі зачэпіць фурманка якую голую алешыну, — ціхае пастукванне срэбных лісточкаў-кропелек па апалым, яшчэ не сшэрхлым лісці...»

Ніна прагна ўдыхала гарачы пах зямлі — пахла менавіта не сухой травой, не падвялым ад сонца яблыневым лісцем, а зямлёй. Добра ўгрэтай, перасохлай без дажджу — які ўжо тыдзень! — зямлёй. Гарачы пах гэты не змагла перабіць нават згадка, у якой імжэў дождж, чаўкала пад ботамі гразь, а словы і пачуцці дыктавала трывога за той доўгі пераход, за хлопцаў, якія вялі бой на чыгунцы, каб людзі, вялізны, расцягнуты, здавалася, па бясконцай лясной дарозе абоз, хлынулі ў адбіты, вызвалены калідор і выйшлі з акружэння, з-пад агню нямецкіх мінамётаў.

А салаўя ўжо не чуваць. Паляцеў з саду. Ці мо проста аціх, вечару чакае, першых бухматых зорак.

Неўзабаве і вечар, падумала Ніна. Цені ўжо ляжалі па ўсім садзе, шырокія, нерухомыя. Як намаляваныя на танюткім бязважкім палатне, якое лёгка трымала на сваіх лістках трава. Ніна ступала — і палатно рвалася, зусім нячутна рвалася, і на траве нейкі час уздрыгваў лёгкі Нінін след. Яна азірнулася раз, і другі, і трэці. Пакуль не схамянулася: за ёй жа магліназіраць з акна! Ды і абход, відаць, Дзмітрыеўна скончыла. Колькі той бальнічкі! — дваццаць чатыры ложкі, ды і тыя сёння не ўсе занятыя...

Голас Дзмітрыеўны быў чуваць з чацвёртай палаты. Што яна казала, Ніна не ўслухвалася надта. Прайшла ў яе кабінет — там жа было загадана чакаць! — і, чакаючы, апусцілася ў крэсла, бліжэй да акна. Акно выходзіла ў двор, а ў двары было зараз пуста. Павяла позіркам па пакоі: шкапчыкі (адзін з кнігамі, другі з бліскучым інструментам), стол, на стале стосік папак, папер доктарскіх, тэлефон... Быццам прыгадаўшы што, ускочыла, падышла да стала, пашукала вачыма і знайшла (тырчаў з-пад верхняй папкі) сіні тэлефонны даведнік. Аўтобусная каса... 3—39...

Абапёршыся на стол, набрала патрэбны нумар.

— Каса? Гэта аўтобусная каса, пытаю? Мне аўтобус патрэбны, на Запярынне. Аўтобус! На Запярынне! Калі ён... Уранку? А сёння, вечарам? Адзін толькі? Не даязджае? Дзякуй...

— Каму гэта ты звоніш, галубок?

Трубка ўпала на рычажок, жаласна дзынкнуўшы.

— Даведку хацела... — пакасілася на тэлефон Ніна.

— А-а! Ты сядай, сядай. Я колькі запісаў каротків зраблю.

Ніна апускаецца на крэсла. На тое ж. Бліжэй да акна. У двары ўжо колькі хворых — сабраліся ўкруг Ігналя Яўдохіна, штосьці слухаюць, у любы момант гатовыя зарагатаць. «Зноў Ігналь свае байкі баіць!» — мелася адвярнуцца ад акна Ніна, але чамусьці марудзіла, усё пазірала на Ігналя, на тое, як ён размахваў адразу абедзвюма рукамі і гаварыў, гаварыў штосьці, паблісваючы вачыма. Цёмныя ў яго вочы, цыганскія...

— Давай пагамонім сур'ёзна, а? — загаварыла Дзмітрыеўна, складваючы і адсоўваючы паперкі. — Даўно мы з табой у вочы адна адной не зазіралі, так даўно, што і не прыгадваецца які такі момант. Нібыта і на вачах ты ў мяне, а я ў цябе ўвесь час, а вось жа — кожная сваёй сцежкай ходзіць.

Ніна міжволі намацала рукой у кішэні пакуначак, які падарыў ёй прафесар.

— Да-а, не тое дзіва, што гады хутка мінаюць, а тое, што мы гэтых гадоў не заўважаем, — цішэй, расцягваючы словы, дадала Дзмітрыеўна, узіраючыся ў яе твар, і быццам схамянулася, заспяшалася перайсці да галоўнага. — Згода твая патрэбна, галубок. Згода на мужны крок. Так, так, на мужны! — на вельмі неабходны крок у тваім жыцці. Вучыцца хачу цябе паслаць, Ніна...

— Што-о... Што? — перахапіла раптам дыханне Ніне.

— Вучыцца хачу цябе паслаць. Вучыцца на медсястру, — голас Дзмітрыеўны загучаў больш цвёрда, і ў ім чулася крыху грубаватая пяшчота. — Чаго, запытацца, спалохалася? Курсы перакваліфікацыі медсёстраў адкрываюцца ў вобласці. Для тых, хто дзесяць—пятнаццаць год таму, як вучыўся. Сáма для цябе.

— Смяешся, Дзмітрыеўна? — спрабавала схаваць разгубленасць Ніна. — Чаго гэта ты раптам жартаваць надумала?

— Дурніца ты, галубок. Калі гэта я з цябе смяялася? І які смех там, дзе пра дзела — важнае не адно для цябе, заўваж, дзела! — гаворка ідзе? Я табе пра вучобу — пра курсы кажу!

— Якую яшчэ вучобу? — агрызнулася Ніна на мякка вымаўленую «дурніцу». — І дзесяць, і пятнаццаць год таму я падлогу падцірала ды пасудзіны выносіла.

— Не толькі падлогу падцірала і пасудзіны выносіла. Не толькі, галубок. Забылася, як асісціравала мне? Як не адно сястру — урача, як трэба, замяняла? Думаеш, не ведаю, што дасюль за маладзенькіх недарэк часта ўколы робіш? Думаеш, не бачу, як за кожным маім рухам сочыш, калі хворага абследую?

Дзмітрыеўна ўскочыла з-за стала і цяпер тупала па невялікім пакойчыку ўзад-уперад перад Нінай.

— Я вінавата, што да смутку твайго прыслухвалася, што слабой цябе задоўга лічыла — раней трэба было ўмяшацца, раней настаяць, каб вучылася: не нянечкай, а медсястрой — урачом ты магла ўжо быць сёння, Ніна. А я ўсё: галубок, галубок...

Заўважыўшы, як марна спрабуе выкараскацца са сваёй разгубленасці Ніна, часта міргаючы і цярэбячы рукамі крысо халата, Дзмітрыеўна змаўкае. Спыняецца. Знешне супакойваецца. Адсунуўшы крэсла ад стала, садзіцца якраз насупраць Ніны і лезе ў кішэню па цыгарэту. Нечакана быццам забываецца на свой рух і, папраўляючы акуляры, гаворыць ціха, не хаваючы смутку:

— Чалавек не заўсёды выходзіць пераможцам у барацьбе за жыццё, таму што не з сабой, не са сваёй слабасцю змагаецца, а з жыццём. Шмат пра каго гэта — праўда. І пра мяне.

— Хутчэй гэта ўжо — пра мяне, — мармытнула Ніна, насцярожыўшыся ад нечаканага смутку, ад яго балючых нотак у голасе Дзмітрыеўны.

— Не, галубок. Ты не ўступала яшчэ ў гэту барацьбу. Ты жыла. Гэтак жыла, як прырода твая патрабавала. І верыла, верыш, што душой ад жыцця адвярнулася. А гэта ты ад сябе адвярнулася, ад барацьбы, якую трэба за сябе, за будучыню сваю весці. Нават калі гэта будучыня — усяго некалькі наступных гадоў ці імгненняў...

Зноў міжволі намацала Ніна рукой у кішэні халата невялічкі пакуначак. Сцяпанавы лісьмы. Штосьці ў словах Дзмітрыеўны было адтуль, з тых пісьмаў, хоць не пісаў Сцяпан гэткіх слоў, не казаў.

— Справамі мы толькі перад іншымі апраўдваемся, перад староннімі, — па-ранейшаму ціха, не хаваючы смутку, казала далей Дзмітрыеўна. — Перад сабой не апраўдаешся. Ні за адно паражэнне не апраўдаешся, колькі б ні апраўдвалася.

— Бог з табой, Дзмітрыеўна! Ды на цябе цэлы раён гатоў маліцца. У цябе — якія паражэнні?

— Цэлы раён, кажаш? А мне аднойчы здалося, што я магу цэлае чалавецтва ўратаваць. Ад пухліны злаякаснай. Назіранні цікавыя былі. Надумала сёе-тое... Патрэбны былі доследы, даследаванні. Але ж яны будучыні былі патрэбны, а людзі захворваюць штодня. І дапамогі штодня чакаюць. Ад людзей не адвернешся, ад будучыні, атрымалася, можна. Вось так, галубок. І табе, жадаючы таго ўсім сэрцам, не дапамагла. А ты кажаш...

— Ды каб не ты... Каб не ты... — ускочыла цяпер Ніна. — І зусім бы я не выжыла, каб не ты!

— Выжыла б, Ніна. Да таго, каго яна ад самага краю магілы адпускае, смерць доўга тварам не паварочваецца. З практыкі ведаю. Мы з табой разам — адна адной — выжывалі. Ды яшчэ болем чужым, які заўсёды здаецца большым, чым свой. Ды ты сядай, сядай, чаго ўсхапілася? Пра аджытае я кажу, не пра сённяшняе. Не паспавядацца перад табой хачу, пагаманіць з табой.

— Які з мяне субяседнік? — адмахнулася Ніна, апускаючыся ў крэсла. — І з прафесарам прамаўчала, і з табой вось...

— Цудоўны ён чалавек, Віктар Юр'евіч! Добрай сілай сваёй прыгожы. Пасля інфаркту, у гэткую спёку ехаў да нас... Да цябе. Сцяпана ён больш чым сына роднага любіў, і ў табе гэтую любоў знайшоў. Так ён мне сказаў, з тым паехаў.

— Але ж...

— Усё ён зразумеў. Праз мяне. Што ведала, што магла расказаць, расказала.

— Не! Асудзіў ён мяне, Дзмітрыеўна. Я адчула. За тое, што адступілася ад былога, і прозвішча вось памяняла... Ды і сама я сябе асуджаю: за што чаплялася? Што адпіхнула? Што на што памяняла?

— Ну-ну-ну, галубок! Не ты жыццём распарадзілася, яно — табой. І нічога заведама страшнага ў тым няма.

— Хочаш сказаць: не я першая?

— Хачу сказаць: страшна тое, што ты сабой кепска распарадзілася. Не за чалавека, не за Павэлка замуж выйшла, а за прыпамін.

— Ён...

— Чакай! Выслухай спярша. Не пра яго гаворка, пра цябе. Я даўно збіралася табе сказаць: прыгледзься да свайго Павэлка, знайдзі ў ім штосьці, павагі вартае, як не любові, — да яго ж, не да каго іншага зрабіла ты некалі крок, паратунку шукаючы. Ёсць жа, была прычына! І не ад былога ты адступілася, галубок, не: назад, у прыпаміны, ты сябе штодзень ледзь не на ланцугу валакла. На момант прасвятлееш тварам, заглыбішся ў справу — і зноў адбіваешся, выплёўваеш усмешку... Ад жывога адступаешся... І я, дурніца, маўчала, маўчаннем сваім патурала.

— Дзмітрыеўна!

— Што — Дзмітрыеўна? Староннi чалавек, Віктар Юр'евіч, які знаць цябе не знаў да майго расказу, адразу разабраўся, адразу ўмяшаўся, а я... Няма ў мяне больш блізкага тут чалавека, чым ты, Ніна, а я — не разабралася, не ўмяшалася, за справамі ды за клопатамі галоўнага не ўбачыла: пры мне ты была ўсе гэтыя гады, а не са мной. Пры мне... Быццам сама я табе гэта месца вызначыла. Вось што горка, галубок. Вось у чым мая віна перад табой.

— Нешта я тут не разумею, — спахмурнела Ніна. — Чалавек — гэта я, значыцца! — не хоча... не хацеў жыць, а ўсе іншыя ў тым вінаваты?

— Не ўсе іншыя. А тыя, хто любіць цябе. Пра сябе я. Пра Павэлка...

— Ніхто перада мной не вінаваты! — рэзка, занадта рэзка (хліснула па сэрцы названае імя!) кідае Ніна, адварочваючыся да акна, і, адчуўшы раптам сорам за свой тон, за рэзкасць, мякчэй, быццам просячы прабачэння, дадала: — Перада мной адна вайна вінавата, а я — перад усімі. І перад Сцяпанам, і перад прафесарам, дзядзькам Сцяпанавым, і перад табой, Дзмітрыеўна, і... перад Павэлкам.

— Ну, вось, — здымаючы ўзніклую напружанасць, усміхнулася Дзмітрыеўна. — Ясна, што пракурора між нас няма, адны вінаватыя.

— Адпусціла б ты мяне ў водпуск, Дзмітрыеўна! У Запярынне хачу паехаць. Трэба мне...

— Як трэба — значыць, паедзеш. Толькі ненадоўга. На тыдзень. Праз тыдзень курсы пачынаюць працаваць.

— Дык я ж...

— Не спяшайся адпекваццa, галубок: тут не тое

што ўзважыць усё раз і другі раз трэба — тут і да мяне, да маіго слова прыслухацца не лішне. Маё ж слова: згаджайся, настройвайся на вучобу! Я ўжо і ў вобласць званіла, месца табе там пакінулі... Баяцца няма чаго: практыка ў цябе ёсць, веды набудзеш. І я дапамагу, як помач маю прымеш.

— Ды жа людзі будуць смяяцца, Дзмітрыеўна! Скажуць: сорак год бабе, а яе за парту...

— Людзі будуць смяяцца, калі ты і далей зневажаць сябе будзеш — цішком у краму бегаць, гарэлку пацягваць, апускацца! — пасуровела тая. — Над тым, хто вучыцца, каб рукам сваім таленавітым лягчэй было, ніколі ніхто не смяяўся. Я жорстка зараз гавару, галубок, бо не хачу і не буду надалей рабіць выгляд, што нічога не бачу, што ўсё добра, як добра.

У Ніны крывіўся твар. Зморшчынка на пераноссі здавалася ёй балючым рубцом, быццам адкрылася раптам старая, забытая ўжо рана. Ніна няўзнак пагладжвала яе і ўсё шукала, і ўсё не знаходзіла пярэчанняў, хоць нечага вартых у гэты момант.

Сесці за парту... Вучыцца... Калі б гэта раней! Хоць на дзесяць гадоў раней, калі наперадзе быў яшчэ нейкі прамежак часу. Ды тады ні ёй, ні нават Дзмітрыеўне не прыйшло б гэта ў галаў. Усё — прафесар, Віктар Юр'евіч. Яго гэта воля. Яго і Сцяпанава...

— І Сцяпан бы табе, Ніна, гэта сказаў, — як падслухаўшы яе думкі, спакойна сказала Дзмітрыеўна. — За сябе, за будучыню сваю трэба змагацца. Нават калі гэта будучыня — усяго некалькі наступных гадоў ці імгненняў. Як у яго, калі ён пісаў...

Яна паднялася. Пасунула на месца крэсла. Дастала цыгарэту і шчоўкнула запальнічкай. Зацягнулася, кольцамі выпускаючы дым і задумліва сочачы за тым, як яны раставалі ў паветры, дадала: — Я зазірну да цябе вечарам. Сама пагавару з Павэлкам. Калі твой аўтобус?

— Раніцой, — не глядзела на яе Ніна, услухваючыся, як цяжкімі хвалямі пераліваецца, перакочваецца ў ёй нязвыклае, незнаёмае цяпло, нават галава пачынае кружыцца.

## 21

Гэткую калатнечу перажылі! — супіў бровы Павэлак, узіраючыся ў фотаздымкі, у дакументы на стэндах школьнага музея. Ля аднаго з іх — ля шматка падпольнай газеты «Бальшавік Палесся» ад 23 мая 1943 года затрымаўся.

«Немцы, як правіла, у кожнай хаце лажылі ўсю сям'ю на падлогу, тварам да зямлі, і пачаргова расстрэльвалі разрыўнымі кулямі з пісталетаў у галаву. Многіх дзяцей бандыты падкідвалі ўверх і на ляту стралялі ў іх...»

Не дачытаў. Не мог. Пачало ўздрыгваць павека... Гэткую калатнечу перажылі!

Колькі, здаецца, фашысцкай погані знішчылі за вайну, а газеты пішуць: зноў галаву падымаюць. Цяпер ужо не фашысты, а неафашысты. Адна халера! — Відаць жа, і ў неа-Гітлера нехта меціць, нічыю маці не памінаючы!

Усё ў ім пачынала клекатаць, быццам не было гэтых мірных гадоў з часу вайны. Быццам не над лістком з дзіцячага сшытка, не над дакументам, пажаўцелым ад часу, стаяў Павэлак, а над адкрытым долам, у які складалі і складалі мёртвых: байцоў, сяброў-партызан, старых, жанчын, дзяцей. «На ляту стралялі...» — усплылі словы, толькі што прачытаныя. Гэтак жа маглі і яго сына... Паўла... яшчэ тады... Штосьці забалела, заныла ў ім, і Павэлак на міг заплюшчыў вочы, знерухомеў, адпачываючы, спрабуючы вызваліцца ад гэтага незнаёмага болю.

«— РАНЕЙ СМЕРЦІ НЕ ПАМІРАЙ, ГАЛУБОК!

Чую голас Дзмітрыеўны і не разумею, як я магу расчуць яго ў гэткім шалёным гудзе, у няроўным, напоўненым стралянінай гуле. Гудзе ўзаранае мінамётамі паветра. Гудзе, хілячыся ўсё ніжэй да краю лесу, неба. Гудзе ўздыбленая, здаецца, перад самымі вачыма чыгуначным насыпам зямля. І гуд гэты нейкім чынам пачынаецца ўва мне — у маёй крыві, шалёна разагнанай тым страшным ударам, які гэпнуў мяне доле, перш падкінуўшы, адарваўшы ад ланцужка нашых агнявых кропак — адной з такіх кропак быў я... Чаму — быў? Я ж вось — жывы! Я чую гарачы гул крыві, бачу няроўны, бліжэй да лесу, да нас, узрыты мінамі лапік зямлі, які

чамусьці расце ўшыркі, адсоўваючы, цеснячы нас ад чыгункі да лесу. Я страляю — страляю ў бок чыгункі, ад якой адгароджаны гэтым шырокім няроўным лапікам мокрай зямлі. Я помню, што мне трэба туды, на той бок, і таму страляю, ледзь толькі мільгане на адлегласці позірку цёмная, прыгнутая, быццам прыплюснутая каскай, фігурка.

— Куды?! Куды, маць твою...

Адкуль яно ўзялося тут, гэта хлапчанё? Абоз жа быў надзейна прыкрыты нашым заслонам, за кіламетр адсюль!

— Ку-ды?!

Крычыць Гнась. Ці я сам крычу, падаўшыся крыху наперад, туды, дзе пятляе, кружыць, кідаецца між варонак дзіця, хлапчук гадоў сямі, ачумелы ад страляніны, ад страху, ад уздыбленай пад нагамі зямлі. Ён разгублена, па-птушынаму, узмахвае рукамі, чапляючыся за прастрэленае з двух бакоў паветра, балансіруючы на тонкай, нябачнай нітачцы жыцця, што яшчэ трымціць перад ім, што яшчэ не абарвалася...

На міг аціхла страляніна. На міг стала так ціха, што я міжволі хітаю галавой, атрасаючы нязвыкла цяжкую цішыню, і тут — урываецца, уламваецца ў вушы пранізлівы дзіцячы крык:

— Ма-ма!!

На крык гэты, напярэймы яму — насустрач страляніне, якая ўсчалася з новай сілай, кідаецца з-за прыкрыцця жанчына. Гнась спрабуе спыніць яе, штосьці крычыць — бачу балюча скрыўлены крыкам яго рот і шалёныя вочы, і раптам разумею, што гэта жанчына — Ніна. Не пазіраючы ўслед ёй, бачачы толькі балюча скрыўлены крыкам твар сябрука, ведаю: гэта жанчына — яна. Ніна!

Хачу закрычаць, хачу спыніць Ніну — вусны не слухаюцца. Сутаргай звяло рот, твар. Сутаргава, абедзвюх сціскаю аўтамат. Яшчэ міг — і ён хрусне, як цацачны, у збялелых ад натугі пальцах... Падкінуты невядомай сілай, выпрамляюся на ўвесь свой рост, здаецца, чапляючы шапкай нізкае шэрае неба, і бачу: ужо амаль дабегшы, ужо амаль пераняўшы ачумелае ад страху дзіця, падае на свае выпрастаныя да яго рукі Ніна — адначасова з ім, з хлапчанём. Раблю крок — і зноў падае на свае прасцёртыя да дзіцяці рукі Ніна... Ступаю яшчэ

адзін крок — і зноў, зноў, як у першы раз, падае адначасова з хлапчанём Ніна, скошаная нямецкай куляй.

— Сукі!! Сукі, маць вашу!

Я не адчуваю, што бягу. Падкінуты невядомай сілай, імкнуся насустрач страляніне, туды, дзе ўпала тварам на рукі Ніна, — і адсоўваюцца, аціхаюць стрэлы, і вузее, змяншаецца лапік уздыбленай зямлі паміж мной і чыгуначным насыпам. Калі ўзрываецца — зусім побач — цішыня, бачу, як няроўным, шчыльным ланцужком набліжаюцца хлопцы да чыгункі, выбіваючы з-за насыпу фашысцкую навалач...

— Пацярпі, галубок! Ужо хутка... Хутка...»

Павэлак пазіраў прама перад сабой, на сцяну, на раму, у якой бачыў сямігадовага хлопчыка з раскінутымі па-птушынаму ручанятамі і ашалелымі ад страху вачыма. Забілі тады таго хлопчыка, з кулямёта па ім і па Ніне стралялі. Ніну параніла, а малога чаргой наскрозь прашыла. Пахавалі яго разам з усімі, хто загінуў, пераход праз чыгунку забяспечваючы. Пахавалі ўскрай лесу...

Думалася пра гэта балюча. Але боль, хоць і не пацішэў, усё ж мучыў крыху меней: адладзілася дыханне, не таўклося бязладна ў грудзях сэрца, перасталі ўздрыгваць, пацяжэлі, наліліся незнаёмай стомай рукі.

Стома распаўзалася ў ім, расла. Ён адчуў, што калі не вызваліцца з яе цяжкога халоднага павучыння зараз, не марудзячы ні хвіліны, то ўжо нішто не адарве яго ад балючых прыпамінаў. Вайна жыла ў ім асобна ад усяго астатняга — і ўсё астатняе было звязана з вайной: і дом, ацалелы ў тую калатнечу, і цішыня ў доме, якую ніколі не парушыў голас, плач дзіцяці, і адчужэнне, адчужанасць, што ўсё расла паміж ім і Нінай, і атрыманае сёння пісьмо. Усё было звязана з вайной, на ўсім яго жыцці ляжала яе чорная, страшная пячатка. Гады і гады мінулі, пачаў згінацца пад іх цяжарам Павэлак, а і год, і два, выхапіўшы іх з пражытага, нічым, здаецца, не ўспомніць. А той час — тыя тры гады! — хоць на імгненні раскладвай: так ярка, так выразна ўрэзаліся ў памяць, так надоўга — на ўсё жыццё — вызначылі ўсё ў ім. На ўсё жыццё...

— Паспелі агледзець усё, Павел Пятровіч, пакуль я ўпраўляўся?

Павэлак рэзка павярнуўся, не паспеўшы сагнаць з

твару балючую грымасу: ён не чуў ні крокаў настаўніка, ні таго, як рыпнулі дзверы, прашчаміўшы рыпенне нягучным стукам.

— Вы кепска сябе адчуваеце?

— Не, не! — заспяшаўся Павэлак, адступаючы ад рамы. — Прыгадалася вось... Не хацеў, а прыгадалася...

— Пра сябе знайшлі? Пра свой...

— Не знайшоў, — перапыніў ён настаўніка. — Што там — пра сябе разглядваць?

— Ну, як жа, як жа, Павел Пятровіч! Не з вашых расказаў, па сведчаннях таварышаў вашых... Вось зірніце!

Іван Панцеляймонавіч мякка ўзяў яго пад руку і падвёў да аднаго са стэндаў.

— Здымак аматарскі. Слава Вайцяшонак рабіў. Але ж памяць пра тую сустрэчу ў школе засталася. Тут і запісана ўсё. Зірніце!

Павэлак пакасіўся на цьмяны здымак, абвёў позіркам намаляваны лес, пераскочыў лісток, на які паказваў Іван Панцеляймонавіч, затрымаўся на іншым, на тым, дзе было напісана, што за мужнасць, праяўленую ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі, сувязная партызанскага атрада Фрося Гуцькава была ўзнагароджана ордэнам. У сорак чацвёртым. Пасмяротна. За год да таго загінула. У канцлагеры...

— Гэта дакументы, якія належаць гісторыі, — перапыніў яго думкі Іван Панцеляймонавіч. — Сказаць, што цяжкі, складаны быў перыяд у гісторыі, — гэта нічога не сказаць. Лёгкіх перыядаў, ведаеце, у гісторыі развіцця дзяржавы — любой дзяржавы! — не бывае. Ёсць лёгкае, аблегчанае ўспрыманне, і тут нямала залежыць і ад гісторыкаў, ад іх разумення і ад іх вытлумачэння прычын і ўзаемасувязей. Я падбяру вам тое-сёе з літаратуры, з таго, што ёсць у мяне. Калі цікавіцеся, пачытаеце.

— Пачытаю, як дасцё. Але хіба зменіць, пераменіць гэта хоць штосьці? Урок — ён хутчэй на паперы ўрок. У кнігах. А ў жыцці ўсё ідзе, як ідзе. Як ішло. Ні на якія ўрокі не зважаючы.

— Ну, мілейшы Павел Пятровіч! Так мы з вамі ўсю філасофію перакрэслім. «Ідзе, як ідзе» — гэта ад няведання законаў грамадскага развіцця. Ёсць жа законы. Ёсць жа палажэнні марксізму-ленінізму.

— Ды не пра палажэнні я, Іван Панцеляймонавіч! Я да чаго гэта... Гэткую калатнечу перажылі. Мёртвых мільёнамі лічылі. Супраць фашызму, як супраць чумы, розныя народы ў барацьбе аб'ядналіся. Міжнародныя могілкі, можна сказаць, у кожным былым канцлагеры... А сёння? Сёння газеты пішуць: зноў фашызм галаў падымае. Рэваншысты, неафашысты... Як ні называй, сутнасць тая ж, фашысцкая, як і раней. Значыцца, урок — не ўсім на карысць. Правільна я разумею?

Сам сабе здзіўляўся зараз Павэлак: ніколі гэтулькі многа ён не гаварыў. Ды яшчэ пра палітыку! Перакінецца колькімі словамі з Гнасем ці з Пахомам. А то і проста пабурчыць сам з сабой над газетай, сплёўваючы крышынкі махоркі ці надакучлівы кашаль, і ўсё. І ні пра якія ўрокі гісторыі не думае. Скрозь жа: каму ўрокі, а каму — барышы. І не яму, Павэлку, у тым разбірацца.

— Вы настаўнік. Вам лепей усё відаць. Ды здаецца мне: сілу толькі сілай зможаш. Колькі б мы ні ўспаміналі былое, колькі б музеяў ні адкрылі, а ўспыхне новая чума ў Еўропе — зноў з ёй змагацца давядзецца. Капіталісты свае ўрокі з гісторыі выводзяць.

— Правата — гэтаксама сіла, Павел Пятровіч, — задумліва ўзіраючыся ў Павэлкаў распараны твар, сказаў настаўнік. — Праўда, калі яна становіцца ўсенароднай, усясветнай, — перамагае варожасць і неразуменне.

— Напэўна ж. Без праўды як? Ды вось я думаю: страшнай навалай была вайна. Страшныя дакументы па сабе пакінула. І згадкі гэтаксама... І ўсё ж тады ясна было: хто вораг, хто свой, хто вораг сярод сваіх — усякі па-свойму выявіўся. І што рабіць, было зразумела — ворага біць, зямлю сваю вызваляць, калі сын ты ёй. А сёння нібыта ўсё паціху заблыталася. І згадкі ад сябе не адпускаюць, хоць так, хоць гэтак ад іх адварочвайся. І жыццё чамусьці прэсным уяўляецца: нічога, як раней, ад цябе не залежыць, нікому, апроч брыгадзіра, калі ў брыгадзе з работай не ўпраўляюцца, ты не патрэбны. Нейкаму набытку свайму маленькаму парадуешся — ці мала што! — абавязкова чыйсьці касы позірк радасць патушыць... І ў газетах — трывогі зашмат. Вось і думаеш...

— Калі думаецца, гэта добра, Павел Пятровіч. Месца ў жыцці знайсці, каб адзіна тваё было, каб справа без цябе абысціся не магла, — вельмі важна. І вельмі ня-

проста. У вайну гэткі выбар было зрабіць лягчэй. Тут я з вамі цалкам згодны. А наконт яснасці... Далёка не ўсё было ясна і тады. Гэта з вышыні сённяшняга дня відаць, хто быў вораг, хто свой, хто вораг сярод сваіх. Тады ж і памылкі былі, і каштавалі часам вельмі дарага тыя памылкі. Ды не пра гэта зараз гаворка ў нас.

— Не пра гэта, — уздыхнуў Павэлак, пакасіўшыся на тую раму, ля якой заспеў яго настаўнік.

— Давайце паспрабуем разабрацца, Павел Пятровіч. Расставіць вехі. Для гісторыі і для сябе, — прысеў да стала Іван Панцеляймонавіч, жэстам запрашаючы і Павэлка. — Фашыстаў мы пагналі са сваёй зямлі. Іншым народам пасабілі адстаяць сваю незалежнасць. Разруху, пакінутую вайной, адалелі — голаду не далі сябе задушыць, спаленыя гарады і вёскі адбудавалі. Падужэлі настолькі, што ніякай праўды, нават самай горкай, не баімся, адкрыта прызнаём і выпраўляем дапушчаныя памылкі. Новы стыль узаемаадносін паміж дзяржавамі ствараем. Усяму чалавецтву дарогу ў космас адкрылі... Подзвіг гэта ўсенародны. Без перабольшання. Так? Але ж народ — гэта ўсе мы разам. Кожны з нас — маленькая часцінка народа, і мала, многа кожны зробіць — ад гэтага агульны набытак залежыць. Схітрыць, сподлічае хтосьці — на некага іншага яго ношка ляжа, іншы за яго несці павінны, хоць праз змогу, а павінны. У вайну за такое нярэдка расстрэльвалі: таварыша падвёў! Сёння неяк інакш трэба. Інакш спрабуем. Праз выхаванне. На прыкладах з мінулага. На яго ўроках.

— Дык я ж не супраць музея, Іван Панцеляймонавіч. Добры ў вас музей, я з удзячнасцю... — збіўся раптам Павэлак: куды яму з яго сямю класамі з настаўнікам спрачацца? — Я пра сілу, якой у сабе не чую... Раней была сіла, хай сабе і страхам падагрэтая, а зараз няма. Не чую... Гэтак і кожны, мусіць.

Словы сталі грувасткімі, цяжкімі — не пракаўтнуць: пачаў гаворку, а сам заблытаўся. І настаўніка заблытаў. Вось так заўсёды з ім: у адзін бок скіруе думкі — нібыта ўсё правільна, у другі — і там свая праўда. Прыйшоў у школу пра сваё пагаварыць — убіўся ў палітыку, і зноў выйшла: ніяк нельга было гэтай гаворкі абмінуць. І ў палітыцы было штосьці яго, Павэлкава, і тут ён не пра сваё, а ўсё-ткі і пра сваё казаў. Раней, у вайну, была сіла, хай сабе і страхам падагрэтая, а зараз няма. Не чуе ён у сабе сілы.

— Сіла — у веры, Павел Пятровіч. У веры, што робіш тую справу, якую ніхто за цябе не зробіць, і чэсна яе робіш. Па сабе знаю. Чаму, думаеце, я вам пра сябе расказаў? Месца ў жыцці знайсці, каб адзіна тваё было, каб справа без цябе абысціся не змагла, вельмі важна. І, часцей за ўсё, вельмі няпроста. Для большасці гэта месца — іх сціплае рабочае месца. А ёсць жа яшчэ творчасць. І грамадская дзейнасць. Ёсць жа яшчэ сем'я, дзеці...

— Я запытацца хацеў, — асмеліўся раптам Павэлак.

— Пытайцеся.

— Хто вам пра Фросю... пра Фросю Гуцькаву паведаміў? І пра сына яе, Паўла...

— Хто? Сястра яе, Вера Сяргееўна Гуцькава. Вы яе ведалі?

— Не. Сястру не ведаў.

— Яна ў Оршы жыве. З вайны. Цудоўны, ведаеце, чалавек. Мы ўжо колькі год абменьваемся лістамі, а ўсё не перастаю здзіўляцца сіле душы яе. Дзяўчынкай — дзіцём! — пайшла за старэйшай сястрой, вернай памочніцай ёй стала ў нялёгкім жыцці пад акупантамі, у яе змаганні, а адчула тая небяспеку, ні словам не запярэчыўшы, з гадавалым сынам яе на руках падалася далей ад пасёлка, каб адтуль, даведаўшыся пра арышт Фросі, пра катаванні яе, вярнуцца. Вярнуцца і, таячыся, праз старую Бабаіху, падтрымаць сястру, падтрымаць яе мужнасць сваёй мужнасцю.

Настаўнік задумаўся, ці то прыгадваючы тыя далёкія часы, ці то падбіраючы наступныя словы, і хоць пазіраў ён некуды паверх яго галавы, Павэлак горбіўся пад гэтым паглядам.

— Гуцькаву ўжо ў канцлагеры пад Оршай закатавалі. За спробу ўцячы. Гэтак Веры Сяргееўне тутэйшыя людзі, з тых, хто ўратаваўся, расказалі, калі расшукала яна след сястры. Балючы след... Так ніколі і не змагла Вера Сяргееўна пераступіць цераз той след, адысціся ўбок. Сына Фросінага гадавала, пра іншы, інакшы свой лёс ніводнага разу не падумала.

— А ці вядома што пра даносчыка, пра таго, з-за каго загінула Фрося?

— Вядома. Нехта Ахрэм Гніляк. З тых паслугачоў нямецкіх, каго і вербаваць не давялося: самую паскудную — патаемную службу неслі, выглядаючы, вы-

шюхваючы арганізатараў змагання, у партызаны ішлі, ненавіснікамі фашыстаў прытвараліся... Вось і Гніляк гэны... Шмат каго загубіў. Выкрылі яго і расстралялі. Але гэта ўжо ў сорак трэцім...

— А-а... Ну, я пайду, Іван Панцеляймонавіч, — заспяшаўся, заёрзаў на крэсле Павэлак. — Затрымаў вас. Зусім задурыў вам галаву.

Ён, не падымаючы на настаўніка вачэй, падхапіўся, ірвануў са спінкі крэсла свой пінжак, скіраваўся да дзвярэй. Затрыманы думкай, што адыход яго хутчэй нагадваў уцёкі, што ён нават не падзякаваў настаўніку за гаворку, за змарнаваны тым на яго час, павярнуўся. Не хаваючы няёмкасці, адкрыта зірнуў таму ў вочы (усё ён разумеў, Іван Панцеляймонавіч!). І на момант схіліў голаў.

— Дзякуй. Дзякуй вам за ўсё, Іван Панцеляймонавіч.

— Заходзьце. Усе нашы гаворкі, я спадзяюся, наперадзе, Павел Пятровіч.

Настаўнік ступіў да яго. Падаў руку. І Павэлак доўга, пакуль спускаўся па лесвіцы, пакуль ішоў пустым гулкім калідорам да ўваходных дзвярэй, адчуваў яго моцны сяброўскі поціск.

## 22

Перш чым ісці дадому, яна зойдзе на станцыю, удакладніць наконт аўтобуса, вырашыла Ніна. Ды і ў магазін станцыйны зазірне, мо што з прадуктаў купіць: трэба ж наварыць Павэлку чаго. Падумала і пра бутэльку — Дзмітрыеўна ж зайсці абяцала! — але, прыгадаўшы яе словы, ад гэтай думкі адмахнулася. З лёгкім шкадаваннем, але — рашуча. Не дык не! Што ж каламуціць душу зноў? Як бы там ні павярнулася з вучобай, ды Дзмітрыеўна цяпер спуску ёй не дасць. І самой ёй адступацца нельга. Не Дзмітрыеўны воля, а Віктара Юр'евіча. І Сцяпанава — праз яго, праз пісьмы, што ён перадаў ёй.

Ніна пацяплелым позіркам кранулася сумкі, у якую паклала пажаўцелыя лісткі і картку, загорнутыя ў касынку, і прыспешыла крокі. Трэба было спяшацца: у сем гадзін зачыняўся магазін, а яшчэ ж забегчы ў касу, папытацца...

Яна не пайшла праз цэнтр пасёлка, скіравалася на Пралетарскую — па ёй да чыгункі, адкуль, уздоўж палатна, яшчэ які кіламетр да станцыі. Гарачыні ўжо не было. Сонца, калі пазіраць у бок пагорка, ляцела ўніз, падчэпленае на сваіх залацістых струменьчыках — як на арэлях! — над самымі стрэхамі. Калі доўга пазіраць... Чамусьці Ніне прыгадаліся арэлі. Хоць якія ж гэта арэлі, калі рух быў толькі ў адзін бок — уніз? Ды і не ляцела сонца, а павольна, амаль незаўважна пасоўвалася, саслізгвала па стрэхах хат уніз, за пагорак. І саслізне, закоціцца, урэшце, у балотца, што каля лесу. Праўда, яшчэ няхутка.

І ўсё ж згадка пра арэлі не адпускала. Не паварочваючыся больш назад, да крыху астылага ўжо, вячэрняга сонца, Ніна ўзіралася ў гэту згадку, пазнаючы сцежку, якой бегала з іншымі дзецьмі да ракі, і лес, што пачынаўся адразу за вёскай, за Юрчыкавай хатай, і — убаку, у гордай адзіноце — магутны галінасты дуб, такі стары, што і самыя старыя людзі ў Запярынні расказвалі пра арэлі, падчэпленыя да яго тоўстай, прасцёртай высока над зямлёй галіны яшчэ іх дзядамі. Так і думала малой Ніна, што ніхто ніколі не здымаў арэлі, не рушыў. Пад дубам, ледзь прыходзіла шарая гадзіна, час пераробленых спраў і нядоўгага перад сном адпачынку, збіралася і дзятва і моладзь. Перш на арэлях з вясёлым гоманам гойдаліся малыя, аспрэчваючы права быць за галоўнага — стаяць і, спружыньваючы цела, разгойдваць іх. Потым старэйшыя, прагнаўшы малечу, з вонкавай абыякавасцю прапаноўвалі забаўку дзяўчатам. І праз міг не было між іх абыякавых: звыкла верашчала Фрося («Вой, выкуліце! Вой, глядзіце: дуб разам з намі ўзлятае! — зараз пасыплемся як гарох...»), смяяўся, прыціскаючы яе да сябе Федзька Верамееў, басіў, супакойваў усіх Варварын Іван...

Даўно не было на свеце ні Івана, ні змалку закаханага ў Фросю Федзькі, ні Фросі. Запярынцаў, што вайну перажылі, па пальцах палічыш, ды і тыя — дзе хто прытуліўся. Як яна, Ніна. А дуб стаіць, дзе і раней. Яшчэ больш пастарэў, а стаіць, моцна трымаючыся за зямлю каранямі, прасціраючы над ёй свае магутныя галіны. Вось толькі арэлі ніхто не чапляе больш у іх засені. Няма для каго. Дзяцей у вёсцы не стала, пастарэла, дажывае, мусіць, свой век Запярынне.

І яе віна была ў тым таксама. Ды ніхто Ніну асаблі-

ва не вінаваціў. Во толькі цётка Варвара перад разві-таннем сказала: «Не магілы, дачушка, травой зараста-юць, а памяць. А без памяці і чалавека няма. І род яго на ім канчаецца...»

Быццам не сваё, а спрадвечнае, спрадвечна чалаве-чае выказала — ад імя вёскі, ад імя ўсіх, хто каранямі ўрос у гэтую лясістую, уздыбленую пагоркамі зямлю. І прагучаў у цётчыных словах балючы дакор: вось жа канчаўся на Ніне род Мікулічаў! А ці ж адзін гэты род? Вось і пусцее, дажывае, мусібыць, свой век іх Запя-рынне...

Заляскаў коламі цягнік, абрываючы думкі. Доўгі, счэплены з аблітых мазутай цыстэрнаў і з контурам на-бітых лесам цёмных, цёмна-карычневых, пашарпаных па баках вагонаў, ён ляцеў, грукочучы, паўз Ніну, метраў за трыццаць ад яе, і яна не магла адвесці позірку, злёгку пахітвала галавой, быццам лічыла, лічыла цяж-кія вагоны і ўсё недалічвалася нечага. Нечага істотнага, калі меркаваць па пацямнелым раптам яе твары і нер-вовых рухах рукі, якімі Ніна чаплялася за сваю спадні-цу. Але цягнік прагрукацеў у бок станцыі, заміргаўшы, адчыніўшы пераезд, і, прымаючы гэты знак, Ніна рушы-ла далей. Не на пераезд — улева ад яго, вуліцай, што вяла да платформы пры вакзале і станцыйнага мага-зіна.

«— ДЗЕСЯЦЬ РАЗ МЕР І ТО НЕ ВЕР! І мне так маці наказвала, і маме яе маці і бабка так казалі. Ве-дама ж, да распусты адзін крок, ды любошчамі не намі-луешся, дзіця, колькі ні мілуйся. І зноў жа — дзіця... Дзіця за распусту матчыну адгараваць павінна.

— Мама, ну якая распуста? Што вы Фросю не ве-даеце? — слаба абараняю я сяброўку, услухваючыся больш не ў маміну ціхую буркатню, а ў птушыныя пера-зовы (трэці дзень, як, асцярожна падтрымліваючы, вы-водзіць мяне мама ў двор, у засень яблынь).

— Ведаю, як жа не ведаю? Лічы, у нашым двары і вырасла. Вось таму і ўздыхаю. І хто гэта з хлопцаў на-паскудзіў, сляды пазамятаўшы? Мо не з нашых? Табе Фрося нічога не казала?

— Не казала, мама.

— Калі ж ёй было табе сказаць? І пэўна ж, пэўна.

Мама папраўляе падушку ў мяне за плячыма, мякка кранаецца вуснамі маіх валасоў, і доўга, салодка шчы-

міць мне гэты яе дотык. Мы маўчым. Мама абірае бульбу, прымасціўшы побач чыгунок з вадой. А я, услухваючыся ў шапаценне лісця і птушыныя перамовы, пачынаю думаць пра Фросю, пра яе дзіця, якое нарадзілася недзе ў пасёлку, занятым немцамі, пра тое, што толькі што казала маці. Думаю без асаблівага ўзрушэння, быццам усё гэта было даўно-даўно, у забытым ужо жыцці, — і маладосць наша, і тэатр, у якім мы хацелі ставіць «Пінскую шляхту», і Фрося, і народжанае ёй невядома ад каго дзіця.

— Нагаруецца дзеўка з дзіцем па гэткім часе, ой, нагаруецца! — зноў заўздыхала мама. — У пасёлку — не ў вёсцы: чужыя ўсе вакол. І прыгарнуцца не будзе да каго: хто і добры душой — немцаў збаіцца. Юрчык быў там, казаў: два дні на вяроўцы матляўся ля іхняй жандармерыі хтосьці з нашых... Партыйны...

Я маўчу. Я нават вочы закрываю, аслабелая ад цяпла, ад шапацення лісцяў. Здаецца, і не разумею, пра што гэта мама...

— Добры дзень, суседачка. Усё шчыруеш вакол дачушкі?

Не расплюшчваючы вачэй, пазнаю Алену Гарбачыху, мачыху Фросіну. Рэзкі, рыпучы голас яе і аціхшы не аціхае — высочвае, на каго б упасці, за што б зачапіцца. Думаю пра гэта з непрыемнасцю, амаль гідліва, згадаўшы Фросіна: «Сава даўгалыгая».

Мама адгукаецца на вітанне, не запрашаючы Гарбачыху зайсці ў двор. Але тая, відаць, не спяшаецца. Рыпнулі варотцы (няйначай, абаперлася на іх!).

— Глядзіш за імі, стрэнчыш, каб не горш, як у людзей, раслі, а вырастуць, замест палёгкі — новае гора.

— Што гэта за гора, Алена, — дзіця? Ці ж твая першая нарадзіла?

— Сучка, сучка яна! — зайшлася злосцю Гарбачыха. — Гуляла ўсё, спеўкі розныя, цеанцеры нетутэйшыя былі ёй патрэбны... Кабель ёй быў патрэбен, сучцы! І малодшую, крывіначку маю, за сабой звяла — блуду вучыць будзе...

— І не ўшчэміцца між слоў гэткіх твой язык, Алена! Што ты кажаш? Што ты на дзяцей сваіх кажаш? Бога ўспомніла б!

— Бога? А мяне, Ганна, бог успомніў? Успомніў, як я за Фомку гарбатага выходзіла, на дзіця яго ішла, каб у дзеўках не застацца? Успомніў пра мяне бог, калі біў

мяне Фомка, бо на падчарку, на сучку гэту, адзін раз руку падняла? Успомніў, як Вера, крывіначка мая, з перакошаным тварам крычала: «Ненавіджу! Ненавіджу цябе!»? Гэта мне, маці сваёй крычала!

— На бога ты забылася, Алена. І дзеці адвярнуліся, бо маткай ты ім не была: усё гыркала злосна, усё помсціла ім за тое, што Фомку свайго палюбіць, пашкадаваць ніколі не ўмела, не хацела.

— А табе што? Ты свайго надта шкадавала! Усох — шкілет чыста.

— Ідзі сабе, Алена. Ідзі з богам, — не зазлавала, не павысіла голасу мама, разумеючы і не прымаючы злосць Гарбачыхі.

— Што, я ўжо вочы муляю, пальцам у твой бок паказаўшы? — не супакойвалася тая. — Бога ўспомніла! Што ж бог табе, гэткай праведніцы, не паспагадаў? Што ж ён цябе дачкой пакараў? Людзі кажуць, калекай застанецца...

— Дзёгцю б табе на язык твой, суседка! — грамчэй, але гэтак жа спакойна, як раней, пажадала мама. — Злосць у цябе ўсё ўсярэдзіне выпекла яшчэ з маладосці, вось і кідаешся ты на людзей.

— А то няпраўду сказала?

— Праўда ад праўды розніцца гэтак жа, як і чалавек ад чалавека. Нядобрая твая праўда, Алена. Нічым мы тваёй злосці не заслужылі — ні я, ні дачка мая. Папраўляцца яна пачала, дзякуй богу, ды не закрануць яе словы твае горкія!

— Папраўляецца — няхай папраўляецца. Я што, Ганна? Сказала, што людзі кажуць. Пра сваё думаючы...

Зноў рыпнулі варотцы — адпусціла іх Гарбачыха. Пайшла, пад нос сабе нешта мармычучы. І зноў толькі лісце шапоча, толькі малінаўка раз-пораз падае голас ды звонка булькае каторая бульбіна, кінутая мамай у чыгунок.

— Колькі злосці ў бабе! Як і носіць у сабе столькі?

— Фрося яе савой даўгалытай звала.

— Сава і ёсць. Рыпіць і рыпіць увесь час... — абзываецца мама. — Ды і Фрося твая сораму не баялася, дзіця нагуляла немаведама ад каго.

— Чаму ж немаведама ад каго?

— Хіба вядома? Ты ж казала...

— Ад таго Фрося дзіця нарадзіла, каго пакахала. А

што не назвала бацьку, значыць, не склалася нешта, мама. Не склалася ў іх нешта. На вёсцы ж звычайна ўсё вядома. Усё — пра кожнага. Пра кожнага, а не пра Фросю. Разумееш? Які ж гэта блуд?

Я расплюшчваю вочы і бачу, што мама, кінуўшы нож, узіраецца ў мяне здзіўлена, з недаверам: занадта ўпэўнена я, відаць, гавару. Але ж я і сапраўды ўпэўнена. Я — ведаю.

— Ніна, дачушка, табе адкуль пра блуд ведаць? Табе адкуль пра Фросю...

— Я таксама кахала, мама.

Кажу спакойна, без аніякага ўзрушэння, быццам тое, пра што кажу, было даўно-даўно, у забытым ужо жыцці. Там, дзе Фрося, і тэатр, у якім мы рыхтаваліся ставіць «Пінскую шляхту», і маладосць мая, і Сцяпан...»

— Ба! Каго я бачу? Ніначка, вечар добры! Вечар добры ўжо тым, што сцежкі нашы на міг сышліся...

Ніна незаўважна дайшла да магазіна і, перастрэтая ля самых прыступак Макавеем, разгублена ўсміхалася на яго занадта гучную ўвагу, на яго падкрэслена сваяцкі тон і жэст, якім ён пацягнуўся да яе рукі. Гэтага яшчэ не хапала! — сагнала яна з твару ўсмешку, і пал Макавея трохі астыў.

— У магазін? Прашу! — прахінуў ён перад ёй дзверы і, ступіўшы ўслед, павёў уздоўж паліц рукой. — Хлеб? Кансервы? Мяса?

— Супыньсе, Іван! Людзі пазіраюць.

— Якія людзі, Ніначка? — перайшоў той на гучны гарачы шэпт. — Мужыкі ў кутку? Дык яны кішэні трасуць, каб на пляшку гары якой капеек наскрэбці. Маладайка ў хлебным аддзеле? Дык яна нетутэйшая: занадта модны андарак начапіла — худымі нагамі праз разрэз свеціць.

— А ты ўгледзіш!

— Я хто, Ніна? Я — Іван Макавей. Першы мужык па гэтай справе, не на людзях будзе сказана.

— І не абрыдне бабам пад спадніцы ўсё жыццё заглядваць?

— Крыўдзіш, крыўдзіш!

— Мне вось той бохан, калі ласка, справа, — звярнулася Ніна да дзябёлай таўсташчокай прадаўшчыцы, адчуўшы ніякаватасць ад таго, што тая ўпрытык, не ха-

ваючыся, агледзела яе з галавы да ног, нібы бачыла ў пасёлку ўпершыню.

«Усё чорт гэты кучаравы! — прычапіўся, ходзіць, пасміхаецца, а людзі немаведама што думаюць...»

— Дзякуй, — уголас сказала яна і рэзка, рашуча адвярнуўшыся ад прылаўка і ад Макавея, які ўжо ўпёрся, лёг грудзьмі на прылавак і жартаваў з дзябёлай, адышла ад вітрыны, дзе сярод бляшанак са скумбрыяй угледзела цэлафанавую абгортку. У гэткіх зрэдку завозілі ў магазін костачкі — супавыя наборы: мяса з іх не з'ясі, а навар быў добры. Усё лепш, чым проста зашкварыць.

Ужо хацела папрасіць прадаўца загарнуць у газету адзін набор і газету дастала з сумкі, як яе перабіў Іван:

— Ігнатавіч, знайдзі што лепшае нашай Ніне Цімафееўне!

— Што тут знойдзеш? Косткі і косткі! — буркнуў той, пакасіўшыся на Ніну.

— Не скажы! Хто-хто, а ты, Ігнатавіч, костку ад косткі адрозніш. Любому мясніку ў міністэрыі фору дасі: прафесіянал, адным словам! Так што не скажы...

— Прафесіянал, як жа? — пакрыўджана азваўся Ігнатавіч. — Прафесійна супавыя наборы ў газеткі пакупнікоў загортваю! На калоду ўжо і мухі не садзяцца...

— Не твая віна, дарагі. Нарыхтоўшчыкі ў шапку спяць, ліха на іх! Жоўкне ў вітрыне завезенае яшчэ ўвесну сала — з іх і спросу няма. Хто гэтага не ведае?

— Загарніце мне адзін набор, — умяшалася ў гаворку Ніна і падала газету.

— Знайдзі што-небудзь, Ігнатавіч! Самая прыгожая ў пасёлку жанчына да цябе звяртаецца.

— Іван! — прарвалася ў яе абурэнне.

Ніна ледзь стрымлівалася, хоць больш нічога не дадала, бо ўсе, хто быў у магазіне, пазіралі ў іх бок: ведалі, што Макавей любіў пазабаўляцца за чый-небудзь кошт, і чакалі. Але той раптам згас, абыякава пазіраў, як Ігнатавіч, пакорпаўшыся пад прылаўкам, загортваў Ніне цэлафанавы пакуначак, потым кароткімі тоўстымі пальцамі доўга адлічваў здачу і, перадаўшы ўсё ёй, усміхнуўся, быццам толькі што, са спазненнем, ацаніў Іванавы закіды.

— Вы і сапраўды самая прыгожая, — усміхнуўся ён

яшчэ шырэй і сумеўся, хуценька прыбраў з прылаўка свае кароткія тоўстыя пальцы, зіркаючы то на Івана, то на яе.

— Ну, дзякуй, усцешылі бабу! Хоць звальняйся з бальніцы і ў артысткі падавайся, — усё яшчэ хмура сказала Ніна, але абурэння ў голасе ўжо не было: знайшла чаго крыўдаваць! — а то Макавея хто не ведаў. Адвыкла яна, мусібыць, ад лёгкасці падобных сутычак, перакідак жартамі — усё шукае за словамі нейкую пэўнасць. А ўсёй пэўнасці — жаданне ўсміхнуцца, забыць на момант пра будзённыя, абрыдлыя з часам турботы, адчуць сябе маладым, здатным на непрадбачаныя ўчынкі і пачуцці. Ва ўсіх — адно...

— Усяго добрага, — кіўнула яна ўсім адразу і пайшла з магазіна, ужо ўсміхаючыся.

Усмешка пагойдвалася ў Ніііным паглядзе, здавалася, гэта сонца зазірнула ў яго глыбокую сінечу, пакінуўшы на паверхні светлы адбітак, водбліск. Усмешка кранула і яе вусны, так, з усмешкай на вуснах, і павярнулася Ніна да Макавея, які выйшаў следам.

— А ты, Іван, чаго ў магазін сунуўся? Не купіў жа нічога.

— Нашто тады жонку браў, як сам купляць усё буду? — азваўся той. — А магазін... Дзе ж яшчэ з людзьмі пагаманіць, як не тут? Не ля клуба збіраюцца ўсе, ля магазіна.

— І то праўда.

— Як жывеш, Ніна?

— Як людзі, так і я. Што завязуць у магазін, тое куплю. Што маю, тое нашу. Перастрэне хто пытаннем — запынюся, пагаманю. Во як з табой.

— Не пра тое я.

— А пра што?

Макавей абмінуў свой драндулет, прыткнуты да вугла магазіна, і ступае з ёй побач, крок у крок, не спрабуючы зазірнуць у твар. Ён нязвыкла сур'ёзны, і, косячы краем вока на яго арліны профіль, выразна, рэзка акрэслены, абрамлёны чорнымі кудзеркамі, усміхаецца сама сабе Ніна: заляцацца ён уздумаў, ці што?

— Пра якое жыццё пытаеш, Іван? Мо бальніцай зацікавіўся? Чула: Кацярына Раманішышына дзіцем ходзіць. Без цябе ж, пэўна, не абышлося, га?

— Што шукала дзеўка, тое знайшла, — не атрыма-



лася ў Макавея ўсмешка. — Ты як жывеш, Ніна? Не крыўдзіць Павэлак?

— Дык цябе Павэлак цікавіць? Не крыўдзіць, не. Чаго яму мяне крыўдзіць? У яго свой клопат, у мяне свой. Хіба мо пакрыўджанай я выглядаю.

— Сёння... не, — зноў паспрабаваў усміхнуцца Макавей. — Сёння ты для ўсіх, як для Ігнатавіча, самая прыгожая ў пасёлку жанчына.

— Дык мо з гэтага ты і засумаваў? — дражніць яго Ніна.

— Не зачапі я цябе, і не зірнула б у мой бок.

Гамонка ўсё менш нагадвала простую перакідку словамі. Іван, нязвыкла сур'ёзны, усё ішоў побач, хоць яны добра такі адышліся ад магазіна, і Ніна адчула, што не зможа аджартавацца, скажы ён яшчэ больш адкрыта.

— Не хадзі за мной далей, Іван, — папрасіла яна, спыняючыся. — Нашто людзі будуць языкі часаць без дай прычыны? Пагаманілі, і будзе. Досыць. Вяртайся.

— Ты б выслухала!

— Не трэба, Іван. Скажаш — не вернеш. А потым і прыпыніцца побач няёмка будзе... Не падыходжу я для забаўкі, не навучылася і не навучуся ўжо гуляць у нашы дарослыя гульні. Час той мінуў...

— Хто хоча пагуляць, той, як мае сілу, заўсёды знойдзе з кім. Павер, Ніна! Пра іншае я.

— Да пабачэння. Спяшаюся я...

Ніна перакінула сумку ў другую руку і таропка пакрочыла сцежкай, бліжэй да платоў, збочыўшы з дарогі. Не азірнулася назад, калі Іван гукнуў яе, прапаноўваючы падвезці. Нічога лепшага не прыдумаў — чорт і чорт! Куды і жарты ўсе дзеліся? — ледзь языком варочаў, вачэй на яе не падымаючы. Відаць, і напраўду думаў, што ўскрабецца Ніна на яго драндулет і на вачах пасёлка пакоціць дамоў, а то і не дамоў, прыціскаючыся, каб не кульнуцца ў пыл, да яго шырокай спіны. Во, пачасалі б цёткі языкі! Во, пасмяяліся б: дзічылася, дзічылася людзей столькі гадоў, а тут на́ табе! — Макавей на сваім драндулеце аб'ехаў...

Зноў усміхнулася сама сабе, але ўсмешка на гэты раз атрымалася горкай, адно глыбей пазначыўшы зморшчынку на пераноссі. Дажыла да сваіх гадоў, каб зразумець, нарэшце, што неўпрыкмет стала чужой усім у пасёлку, не стала — была і засталася. Вайна, смерць Сцяпана адарвалі яе ад зямлі, ад вёскі, ад бацькоў —

і так і не пусціла нідзе яе жыццё карэньчыкі. Ні ў Запярынні, дзе засталіся ў яе адны магілы, ні ў Рудні, куды яна прыехала, скарыўшыся волі Дзмітрыеўны ці волі Павэлка... Хадзіў ценем за ёй Павэлак, столькі гадоў згоды яе чакаў — зацятым чаканнем гэтым і ўзяў. Прыйшла Ніна ў яго хату, што ганарліва высіцца на пагорку, ды як была хата пустой, так і засталася.

Не было ў тым Ніна й віны: вайна, раненне... Не папікнуў яе ніколі Павэлак, ды ўсё больш пуста было вакол з гадамі: здаралася, словы, яшчэ не вымаўленыя, паміралі, камянелі на вуснах — і не тое што да другога, да сябе было не дагукацца.

Таму і да Ганькі цягнулася Ніна скрозь. Чацвёра дзяцей у яе з Пахомам — чацвёра гарэз на вачах раслі. Галадна ў іх хаце было нярэдка: нічога ж не купіш пасля вайны — і не было за што, і не было чаго. А пасядуць укруг стала, укруг чыгунка з бульбай — вачаняты гараць, рукі самі да сопкай бульбы цягнуцца. Уміг расхапаюць! Наеліся не наеліся, а падзякуюць і пасыплюцца з-за стала.

Колькі раз цішком Ніна то кошык бульбы заносіла Ганьцы, то які крышан хлеба, як Павэлак расстараецца, а то і кулёк ліпкіх падушачак, што хто з хворых прыносіў пасля таго, як выпісваўся з бальніцы. Дзеці ж!

І Фросю вось згадала сёння, дзіця яе... І Нінінаму — каб нарадзілася! — было б ужо за дваццаць. Ды не нарадзілася. Крывёй усё з сярэдзіны сцякло-выцекла, так і не акрыяла яна. «Самая прыгожая ў пасёлку жанчына...» Горка-горка ўсміхнулася Ніна, прыгадаўшы гэтыя словы: жанчыну ў ёй вайна забіла!

Прыгожая... Нашто была тая прыгажосць, як род Нінін на ёй заканчваўся? Як ні ў кім не паўтарыліся — не паўторацца вочы яе сінія, валасы шаўкавістыя? Як і прозвішча яе, і воблік яе ніхто ніколі не згадае? Ды і сэрца даўно ўжо не адгукалася на гэткія словы, на гэткія прызнанні. Сцяпан не казаў ёй, што яна прыгожая, — Сцяпан браў яе на рукі і падымаў высока-высока. Ніна расплюшчвала вочы і бачыла толькі неба. Толькі зоркі — многа-многа зорак, што на тонкіх нітачках-промнях звісалі над імі. Вакол іх. Можна было дацягнуцца і крануць якую рукой — лёгка-лёгка крануць, каб звон яе не разбудзіў Запярынне, каб толькі яны ўдваіх — яна і Сцяпан! — чулі гэты ціхі працяжны звон...

## 23

Вечарэла. Адмякла, астывала паветра, паціху, яшчэ непрыкметна гусцеючы ў засені дрэў. Нават тут, на пагорку, сонца ўжо амаль не кранаелася зямлі — промні залацілі вярхі зялёных купчастых вішань і павернутыя да іх грэбні стрэх, заблытваліся ў густа паплеценым голлі старой ліпы ля Грыпінінага двара, што зацяняла паўвуліцы, масцілі краі неба над балотцам, куды закоціцца нанач дзень, каб устаць назаўтра ўжо з другога боку — з-за чыгункі, з-за лесу. Як і ўчора, як і пазаўчора, як з веку ў век на гэтай зямлі.

Не тое што больш людна стала на вуліцы, больш пэўна адчувалася яе абжытасць. Зрэдку міналі двор тыя, хто жыў далей, па Савецкай: хто спяшаўся дамоў са станцыі, хто, пасля змены, з прамкамбіната, які размяшчаўся там жа, ля самай чыгункі, аддзелены ад яе толькі гравійкай, што вяла да пераезду. Ніжэй, недзе на скрыжаванні Савецкай і Чкалава, чуліся звонкія ўдары па пустой бляшанцы і дзіцячы гоман — малыя гулялі ў «пікіра». Калі цішэлі малыя, сюды, у Павэлкаў двор, даносілася фырканнематораў і прыглушаны аддлегласцю жаночы смех: вярнуліся, пэўна, з сенакосу работнікі. Хутка забразгаюць вёдрамі ля калодзежаў бабы, забываючыся на вёдры, ледзь толькі падыдзе хто з суседак ці то па ваду, ці то па навіны пасялковыя. Хутка, павячэраўшы, пацягнуцца на вуліцу, на лавачку ля Пахомавага двара, мужыкі, каб пасядзець, пакурыць, праводзячы пражыты дзень, абгаворваючы тое, пра што пісалі газеты, і тое, пра што не пісалі...

Пераапрануўшыся і акуратна павесіўшы выхадны касцюм у шкап, Павэлак няспешна займаўся гаспадаркай. Злазіў у склеп, набраў у кош бульбы. Лінуўшы прама ў кош з паўвядра вады, абмыў яе і ўладкаваўся ў сенцах, ля адчыненых дзвярэй, з нажом і чыгунком. Керагаз разгарэўся, сіняваты агонь лізаў дно пастаўленай на яго пасудзіны, налітай вадой.

Ніна затрымлівалася, і Павэлак сам пачаў абіраць бульбу, каб зварыць што на вячэру. Не першы раз. Звыкся. Не сказаць, каб рабіў гэта з прыемнасцю, але рабіў. Варыў, як браўся, не горш, чым жонка. Не чакаць жа было ночы! А шкварка з засохлым хлебам не лезла зараз у горла.

Ён нетаропка пакручваў бульбіну ў пальцах, зрэдку паплёўваючы ўбок, за парог. Падразаў нажом як мага танчэйшую стружку і накручваў, накручваў яе на нож, пакуль шкарлупінка не ламалася ці не заканчвалася. Чыста абабраная бульбіна, булькнуўшы, займала сваё месца ў чыгунку, а ў пальцах Павэлка ўжо была другая, гэткая ж буйная, гэткая ж бліскучая ад вады.

Работа не стамляла, не перашкаджала думаць. І, услухваючыся ў гукі звонку, з вуліцы, Павэлак перабіраў у думках сваю гаворку з настаўнікам, з Іванам Панцеляймонавічам, дакараў сябе то за нястрыманасць, то за нерашучасць. І адраса Фросінай сястры не папрасіў, і пра сына не папытаўся...

Хоць што ён мог папытаць? Ці ведаў Іван Панцеляймонавіч пра Паўлаву гібель? Ці ведаў ён, што гэта яго, Павэлкаў сын? Сам жа ён сцвярджаў, што не хоча калупацца ў мінулым, што не хоча нічога аднаўляць і вяртаць. А хоць бы і хацеў, хоць бы і пажадаў аднавіць усё, павярнуць — не адновіць нічога, не паверне. Будаваўся Павэлак, будаваў, выбудоўваў сваё жыццё, а выходзіла: усё яшчэ ў маладосці страціў. І Ніну. І Фросю, якая, можа, адзіная ў свеце і кахала яго. І сына, народжанага ёй не яму, Павэлку, а смерці... Гэтак выходзіла, як ні выстройвай.

Што ж ён тады будаваў усе гэтыя гады? Жыў дзеля чаго? Дзеля таго, каб жыць? Дзе, калі ён памыліўся ў сваіх разліках?

Павэлак адганяў пытанні, як адганяюць вос, і пытанні, як восы, вярталіся і накідваліся на яго яшчэ з большай злосцю. Чым больш адганяў, тым больш джалілі.

«— ЗАТЫМ І СМАЧНА, ШТО ДАРАГА. Не мной гэта прыдумана, брат. Гэтак ужо людзі скроены: прагнуць таго, чаго ўзяць не могуць. Га?

Я ўскідваюся на яго «га?»: мудрэц, нічыю маці не памінаючы! Справа ж не ў тым, каб узяць. Я хачу, каб сама да мяне Ніна пацягнулася, каб сама прыйшла. Узяць бы я, магчыма, і ўзяў: не так, дык гэтак, а далей — што? Яна ж мне для жыцця патрэбна, не для за-

баўкі. Для таго жыцця, пасляваеннага, дзе дом мой, дзе гаспадарка... Гэта я яшчэ раней вызначыў.

— Вырваў бы ты гэту стрэмку, пакуль не загнаілася! Дзеўка ўжо замужам пабыла, а ты...

— Навучы, навучы, даўганогага недарэку! — мацюкаюся я са злосцю. — Дзе ўжо мне самому разабрацца з дзеўкай?

— Га? Чаго ты ўсхадзіўся, Пятровіч? Ведама, дзеўка прыгожая. Не ты адзін сохнеш...

— Мо і ты са мной за кампанію?

— Дурань, маць тваю... А то б я тваё скуголенне слухаў нанач! Ніна, Ніна... І прыгажэйшыя за яе ёсць.

Гнась адварочваецца да сцяны. Спярша я чую яго сярдзітае сапенне — злуецца! — а потым роўны нягучны храп. Заснуў. А тут не тое што сну, спакою няма. Хлопцы цішком пасмейваюцца, Гнась, сябрук, парадамі замучыў... Хто тут што можа параіць? Нежывая яна нейкая, Ніна. Пазнае мяне не заўсёды. Таўкуся ля яе, дзе бліжэй, а яна як не бачыць. Не бачыць! Не бачыць-такі! Нават ад дотыку Дзмітрыеўны ўздрыгвае так моцна, што тая палохаецца.

Ёсць, безумоўна, рацыя ў Гнася, калі ён раіць вырваць з сэрца гэту стрэмку. І я б яму тое ж самае параіў у падобным выпадку: вырві! забудзь! А вось як вырваць, як забыць, калі не вольны ўжо сабой распарадзіцца?

Дурань... Ведама ж, дурань. Хутка трыццаць стукне... Перад маладзейшымі сорамна... Ат! Гэта я зараз так думаю: трыццаць... сорамна... А прывялі хлопцы яе з Запярыння, ледзьве адарваўшы ад магіл, — на кавалачкі даў бы сябе рассекчы, каб зраслося ў Ніны разарванае сэрца, каб ажыла яна, каб ранейшаї, звонкай стала. Ліха яго ведае, што гэта!

Смешна сказаць: я ж перастаў адчуваць у ёй жанчыну — не сохну па ёй у тым плане, як у нас, мужыкоў, вядзецца. Не імкнуся заваладаць ёй, целам яе прыгожым. Як на святую гляджу. А самому боязна: адкуль гэта ў мяне? Бродзіць жа ў жылах сіла п'яная, хмельная, салодкай млосцю падступае часам да сэрца, душыць яго — любую б падкамячыў у той момант пад сябе, каб льга было, каб з лесу льга было выбрацца: кроў шалець пачынае... Ды любую, не яе. Не Ніну. Вось і разбярыся!

Усё ёй даравў. Неяк само сабой выйшла, што ні тое,

як зганьбавала калісьці мяне, ні тое, як за Сцяпана выскачыла і шчаслівых воч ад мяне не хавала, не прыгадваў больш. Мо тады, як абое, параненыя, у шпітальнай зямлянцы, пад наглядам Дзмітрыеўны, ляжалі. Каб застагнала калі Ніна, каб вайкнула! — прытомнасць страціць ад болю, а маўчыць... Забрала яе да сябе Дзмітрыеўна — месца сабе не знаходзіў, у гарачцы кідаўся, імя яе паўтараючы. Ліха яго ведае. што гэта! Цень жа ад дзеўкі застаўся, цень ад той Ніны, прысухі маёй запярынскай, а стаіць перад вачыма, і ўсё тут.

Стаіць перад вачыма, і думай не думай — думкамі не дапаможаш. Адзіна калі палёгку адчуваю — як бой ідзе, як у перастрэлку з немцамі мы ўступаем і страляць пачынаю: такі агонь у грудзях палае, такая нянавісць рукой з аўтаматам водзіць, што ўсё ў гэтым агні, у гэтай нянавісці раствараецца: і думкі, і згадкі, і жаданні. Забіваць! Забіць, перш чым мяне заб'юць! — за дом свой пакінуты адпомсціць! — за Ніну, за жыццё яе і маё паламанае знішчаць і знішчаць гэту погань! — адным гэтым дыхаю. Звярэю, мышыныя або чорныя мундзіры згледзеўшы. Паспрабаваў бы хто спыніць мяне ў той момант, у свайго б кулю ўсадзіў...

Ах, Ніна, Ніна! Не схацеў калісьці Цімох цябе за мяне выдаць, сэрца твайго паслухаў — за прышлага аддаў і твару яго добра не разгледзеўшы. А вось ужо ні Цімоха з Ганнай, ні зяця іх белабрысага няма між жывых, а я, як ад жывых, так і ад магіл іхніх, не магу цябе адарваць...

Здаецца, я зноў уголас гавару з сабой: Гнась заварочаўся, мармытнуў штосьці. Ліха яго ведае што са мной робіцца! Як вар'яцею часам. Гадзінамі сон не ідзе, сам з сабой уголас разважаць пачынаю. Кулю ў лоб пусціць, ці што?

«Цьфу, дурань! Ідзі паветрам падыхай, як не спіцца, ноч паслухай. Не дапаможа — зямлю сырую грызі, каб званітавала, каб усю гэту гаркату з нутром разам вырвала...» Гэта я так сябе супакойваю, лаянкі пазбягаючы...

Крыва ўсміхаюся, і ўсё ж падымаюся, намацваю ў цемнаце адзенне, і выбіраюся наверх, у ноч. Улажу ў штаны. Прыслухваюся. Ціха. І лагер спіць, і бор не калыхнецца. Зоркі ўгары, як яблыкі. Стаю з задранай галавой і пяты ці шосты ўжо раз зазначаю ў думцы: зоркі, як яблыкі. І так горка чамусьці ад гэтай думкі, быццам

у самой думцы — штосьці страчанае мной, штосьці згубленае мной назаўсёды.

Хацеў зноў вылаяць сябе, раздумаў. Вылаяць жа зоркі не пасмеў, не смею: няма бога — гэта і дзецям сёння вядома, але і зямнога, зразумелага сэрцу ў гэтых зорках, па яблыку кожная, мала. Вылазяць, праступаюць з цемры штоноч, а што яны тут, на зямлі, разглядаюць, што бачаць, няма ў каго запытацца. Навуку прыдумалі, астраномію, а што зрабілі? Пранумеравалі зоркі, якім імён не хапіла, і ўсё. І ўся навука. А людзі змалку галовы ў неба задзіраюць, кожны сваё шукае, вышуквае.

· Вось я, да прыкладу, спакой зараз шукаю. Вачам. І сэрцу. Ды не знаходжу ніякага спакою. Пра яблыкі думаю. І пра бога, якога няма. Да возера спусціцца, ці што? Твар вадой астудзіць? Усё роўна сну няма.

Усміхаюся нейкай зорцы, над самай галавой, у сасновым голлі, і, стараючыся ступаць нячутна, пачынаю спускацца да азярца, да вады, нечакана светлай, нават іскрыстай. Нырнуць бы ў гэту нечаканую светлыню і вынырнуць іншым, такім, якім я хацеў быць і не стаў — маладым. З маленства адразу ў сталасць калісьці ступіў, не ведаў ні памылак, ні пераваг юнацтва. Вось толькі зараз Ніна душу перавярнула, берагоў сваіх душа не знаходзіць. Зоркі, возера, душа... Усе прыкметы любога ненармальнага.

Вада ўсплёскнулася, быццам упала што. Ці мо рыба... Застываю ў засені вербалозу, насцярожваюся. Справа, там, дзе азярцо ўразаецца глыбей у бераг, утвараючы невялічкую пясчаную касу — мысок, гукі паўтараюцца. На гэты раз больш выразна. Мільгае здагадка: хтосьці асцярожна ступае па вадзе! А я і зброю не прыхапіў...

Не, пра зброю я, магчыма, дарэмна: пасты ж кругом. Ніякая сволач цішком не падбярэцца. І халадок, што распаўзаецца ў мяне ўнутры, — ад начной прахалоды. Ногі раса, трава росная студзіць, ды і на плечы нічога не ўскінуў — выходзіў жа на мінутку. Паветрам дыхнуць. Вось і дыхаю.

Разважаю гэтак, а сам ціхенька прасоўваюся ўправа. Калі што якое — рук хопіць, як знянацку кінуцца, нічым сябе раней часу не выкрыўшы. Адводжу рукой галінку і ад нечаканасці рэзка адпускаю, не паспеўшы адвярнуць твар. Краем свядомасці адчуваю, як балюча

хліснула яна па твары, закрываючы ад мяне бераг, пясчаны мысок і... Гэта, канечне, Ніна! Не пагляд падказаў, жар, які раптоўна апёк яго і цяпер расцякаўся па целе.

Хачу адвярнуцца — загадваю сабе павярнуцца і ісці назад, да сцежкі, якой спускаўся да возера. І не магу. Як прырос. Нічога з-за лісцяў не бачу — і бачу Ніну ў кароткай сарочцы, з распушчанымі валасамі, з-пад якіх, калі яна ўзмахвае рукой з грэбнем, паблісківаюць голыя плечы. Нерашуча адводжу галінку — усё роўна ж бачу! — і, стаіўшы дыханне, цікую за Нінай, за яе няспешнымі рухамі. Мыла, відаць, валасы, бо яны, кранутыя грэбнем, ззяюць так, нібы ўсе зоркі між іх пазаблытваліся, і счэсвае іх Ніна, не павычэсвае ніяк, стоячы ў вадзе. Зрэдку яна пераступае з нагі на нагу, і тады калыхаецца вада, ціха плёскаецца, зноў абдымаючы ногі.

Я не пазіраю на гэтыя тонкія сцябліны ног: што я ног не бачыў і не мацаў! Я наогул заплюшчваюся, каб нічога не бачыць. Заплюшчваюся, так моцна сціскаючы павекі, што з-пад іх прасочваюцца раптоўныя гарачыя слязіны...»

Што ён, Павэлак, вырашыў не так, як трэба, вырашыўшы не адступацца ад Ніны? Дзе, калі ён памыліўся ў сваіх разліках? Што ўсе гэтыя гады не давала яму падступіцца бліжэй, разламаць сцяну паміж імі? Што?

Ён адганяў пытанні, як адганяюць восаў, і пытанні, як восы, вярталіся і накідваліся на яго яшчэ з большай злосцю. Чым больш адганяў іх, тым больш балюча яны джалілі.

Ні ў бога, ні ў чорта ён ніколі не верыў, не тое што ў сэрца і ў яго волю над ім, над Павэлкам. Зоркі, птушкі, уздыхі на лавачцы, пацалункі нясмелыя... Лухта гэта ўсё! Чыста знешняе. Па маладосці яшчэ сышло б, мажліва. Яму ж сабе голаў тлуміць гэтымі ўздыханнямі, гэтымі шкадаваннямі не выпадала. На кавалкі б даў сябе рассекчы, каб зраслося ў Ніны разарванае, змучанае памяццю сэрца, а лізацца... Не навучаны ён быў лізацца, сюсюкаць, сантыменты розныя разводзіць — працай сваёй, мазалём сваім змалку і хлеб здабываў і радасць. На пасаду выбіўся, думаў: палегчае, павагі больш будзе. І была, была павага. Часу не было пакарыстацца. Вайна накацілася, новую пасаду трэба было асвойваць — падрыўнікі патрэбныя сталі...

Пасаліўшы ваду, якая ўжо ўскіпала, кінуў у яе наабіраную бульбу, папераразаўшы папалам. Прыкруціў трохі агонь, каб не выкіпала, выцер нож, падсунуў пад лаву кош і пайшоў у хату. Па курыва. Пакідаў жа на прыпечку акурак!

Закурыў, не выходзячы ў сенцы: зранку дазваляў сабе тое, чаго раней ніколі не рабіў, і не хацеў зараз нічога мяняць. Курыў, зіркаючы ў акно, праз якое відаць быў вугал хлеўчука і тая частка двара, дзе за старой вішняй сохла раскіданае ім сена — колькі галін вішні пераразалі нізкае з акна неба, вытыркаючыся край шыбы, і па тым, як яны пагойдваліся, Павэлак вызначыў ледзь прыкметную змену ў надвор'і. Вятрыска станавіўся ветрам, хоць пакуль што яшчэ слабым і ледзь заўважным. Мо і хмару прыгоніць: парыла каторы дзень!

Курыў, разважаў пра тое, што нездарма, мусібыць, яго апаноўваюць сёння думкі — нешта павінна было здарыцца. Хоць бы і навальніца, якую вецер нагоніць. Кожны ж раз, калі грымела ўгары, абрывалася і ў ім цішыня. Абрывалася і падала, недзе там усярэдзіне. І разбівалася аб адну і тую ж згадку: вакол — і над ім — рос, шырыўся, засланяючы сонца, чорны гул. Шумеў лес. Гудзеў, падскокваючы, як на выбоінах, на хвалях выбухаў, самалёт з павучыным знакам. Ламала вершалле сосен патрушчанае гэтым гулам неба...

Хоць бы прыгнаў вецер хмару! І зямлі, і яму, Павэлку, стала б лягчэй. А то ў сваёй хаце госцем сябе пачувае. Не прылёг за ўвесь дзень, у двары, на сене, у самую спёку спаў, замест таго каб тут, у халадку, на ложку...

Павэлак з-за перагародкі, якая падзяляла хату на чыстую палавіну і кухню, абвёў хату позіркам. Вялікі фанерны шкап, прыкрыты зверху вышыванай сурвэткай, і на ім, якраз пасярэдзіне, пузатая вазачка з галінкамі папяровых, ужо крыху выцвілых кветак. Старая, яшчэ зінгераўская швейная машынка на століку ля акна. Вялізнае, у цяжкой драўлянай раме люстэрка на ўвесь прасценак паміж вокнамі — і ў ім яшчэ адзін шкап з пузатай вазачкай і рамка са здымкамі, што вісіць побач са шкапам. Крэсла каля ложка і ложак, засланы тканай узорыстай пасцілкай. Ад ложка, бліжэй да дзвярэй і да кухоннай перагародкі, вялікі дубовы стол на тоўстых ножках, які загароджвае шырокую са спінкай лаву: і

стол і лаву рабіў для Павэлка калісьці Гнась і грошай не ўзяў за работу — распілі на стале бутэльку гарэлкі, тым і скончылася. Мо і бурчала яго Тэкля: з месяц жа правалэндаўся той з дрэвам! — але тым і скончылася. Не ўзяў грошай.

Колькі ведаў Павэлак Гнася, а ўсё ж сяды-тады дзівіўся з сябрука. Калі той толькі ўсё паспяваў? Не тое, каб сябе Павэлак у чым-небудзь папракаў. Не! Ды было — зайздросціў спадцішка сябруку: усё лёгка, усё прыгожа ў таго атрымлівалася — што работу зрабіць, што каля кабеты пахадзіць. Ужо на што Ніна маўклівая, унураная ў сваё, а калі заходзіў Гнась, і яна свяятлела тварам. Павэлак так не ўмеў. Поту і ён не баяўся, гаспадарку сваю спраўна вёў, а вось за прыгажосцю, за лёгкасцю — не гнаўся. Прыгожа — не ўмеў. І тую ж табурэтку збіў бы, і навес над сваім каледзезем сам змайстраваў, але майстра ў ім ніхто не прызнаваў. Ды і сам ён не прызнаваў...

А ўжо што да кабет, то рукі самі што трэба знаходзілі, а вось са словамі было горш. У горле ў яго засядалі ўсякія прыгожыя словы. Сароме́ўся ён іх. Усе яны яму нягеглымі здаваліся, не вартымі моманту. Лішнімі папросту. Што яны маглі дадаць да таго, што адчуваў Павэлак?

Жанчыны — іншыя па прыродзе, ён гэта разумеў. Бачыў, што часцей за прыгожай абгорткай, за словамі ды за лёгкім абыходжаннем, нікудышняга чалавечка, гнілога нутра яго не заўважалі: не адна памаялася потым... Не пра Гнася гаворка (не такі ён, Гнась!), ды распусціць каторы, як певень, прыгожае пер'е, пачне біць лоўка прымацаванымі крыламі, падасць голас — і заквохчуць ля яго, і закудахтаюць: і кавалер ён першы! І абыходжанне ў яго мяккае, гарадское! І на словы і на ласункі ён не скупы! Ну, пэўна ж. Тое, што ён ужо трох жонак памяняў дасюль, значна пазней высветліцца. Тады, калі ён добра такі каторай голаў задурыць.

Не любіў гэткіх Павэлак і ў дурыкі розныя не верыў. Словы словамі, галоўнае — як жывеш, што носіш у сабе, якое пачуццё. Шкада толькі, што ён не ўмеў гэта растлумачыць нікому, і ў першую чаргу — Ніне. Чакала яна, здаралася, ад Павэлка нейкіх слоў, нейкіх тлумачэнняў, а ў яго не было ні гэтых слоў, ні гэтых тлумачэнняў. І адварочвалася Ніна, зноў, як і раней, абыякавая да яго маўчання, да яго маўклівага пачуцця. І

яму хацелася заплюшчыцца, моцна сціснуць павекі — так моцна, каб выціснуць з-пад іх раптоўныя гарачыя слязіны, што апякалі, пяклі нутро.

Хацелася не хацелася... Не вельмі каб і зважаў на гэта Павэлак. Хаценню свайму ніколі не дагодзіш, як ні дагаджай. Таму і не варта чапляцца за яго, чаго б яно ні тычылася. Ніхто ж не прымушаў жыць, а жыў, значыцца, быў у тым нейкі высокі, вышэйшы за ўсё астатняе, сэнс. Колькі загінула ў вайну! — і маладзейшых за яго, за Павэлка, і аднагодкаў... Як жа можна крыўдаваць на жыццё? Ці лічыць, што штосьці табе ў жыцці недададзена?

Не, усё ў яго, Павэлка, ёсць. Жывы. Здаровы, дзякуй богу. У сваёй хаце жыве, па свеце не бадзяецца. Тую, каго хацеў прывесці гаспадыняй у хату, прывёў. Дзяцей у іх з Нінай не было, дык тут вайна вінавата: хоць гэтым, а і з іх узяла плату — не абмінула.

Сумным паглядам абвёў усё вакол Павэлак. Мо і не лепш, ды і не горш, як у іншых. Дзяцей вось не было...

## 24

Ніна толькі што не бегла: таропкімі, роўнымі крокамі адмерала з добрых паўкіламетра, перш чым дагнала яе ўласнае недаўменне. Куды, запытацца, ляцела, куды — спяшалася? Не Макавея ж, на самой справе, напалохалася! Не ўпершыню той прыпыняў. Не ўпершыню спрабаваў то з аднаго, то з другога боку пад'ехаць, языка свайго не шкадуючы. Мо ўпершыню гэткую сур'ёзнасць на сябе напусціў, дык чаму і не напусціць сур'ёзнасць, як іншае не дапамагае? Усё ж выпрабаваў. Ат! Знайшла, пра што думаць. Макавею абы сілу дурную збыць — ніводнай спадніцы не прапусціць: за кожную позірк яго зачэпіцца і валачэцца колькі крокаў услед — а раптам! Рэдка, часта надараліся ў яго гэтыя «раптам», нашто было Ніне ведаць. Плявузгалі жанкі немаведама што, а ніводная ж ніколі не прызналася, не пахвалілася, што трапіла Макавею пад руку. Адна на аднуківалі. Вядома ж, бабы.

Паступова цішэлі думкі. І крокі запавольваліся. Не было куды асабліва спяшацца. Дзмітрыеўна ўжо прыцемкам зойдзе, а да таго часу Ніна яшчэ пяць раз управіцца. Работы той! — есці наварыць...

Яна раптам адчула стому: натамілася-такі за дзень. Туды-сюды па калідоры набегаешся, то з венікам, то з анучай, то з лякарствамі. Тое прыбяры, гэта прынясі, з адным хворым пагамані, другога паўшчувай. Ігналь Яўдохін, дык той запатрабаваў — і кожны дзень гэтак! — каб укол яму яна, Ніна, зрабіла... Ды і столькі гаворак, столькі хвалявання, як сёння, не выпадала ні на адзін іншы дзень — і ўсё сур'ёзныя гаворкі: кожная штосьці ў яе жыцці вызначала ці спрабавала вызначыць. Доўга яшчэ давядзецца расстаўляць усё па сваіх месцах, раскладваць усё на палічках памяці. Адбыліся ў ёй нейкія змены. А якія? Што змянілася? Як яно далей будзе.

Адказваючы на вітанні — не ўсіх ведала ў пасёлку, але многіх: каго па суседству, каго па бальніцы, — яна няспешна звярнула ад камбіната на Савецкую, доўгую-доўгую вуліцу, якая і вяла да двара, здалёк, з кіламетр, успаўзала на пагорак, і там, з-пад магутнай ліпы, што высіцца, калі пазіраць адсюль, над усім пасёлкам, а не-над хатай старой Грышіны, імкнецца далей, зноў коцячыся ўніз, пераразае яшчэ некалькі вулічак і завулкаў і ўпіраецца ў клін поля. За полем, ніжэй, аддзеленае раўчуком, да самага лесу цягнулася балотца — яго збіраліся асушваць, але так даўно збіраліся, што Ніна ўжо не верыла, што калі-небудзь асушаць: прыбытку нямнога, а працу ўкладаць... Ды і патрэбы не было асаблівай, відаць, яго асушваць. Трэба ж, каб і птушкам было дзе параскашаваць зрэдку!

Вуліца як вуліца. Ад самай чыгункі — у канец. І такая знаёмая Ніне, што даўно не заўважала яна ні выбоін, прысыпаных жвірам, ні ўплеценых у падарожнік крывулін-сцежак абапал яе, паўз платы, ні курэй, што сям-там грэбаліся каля лавачак, ні гусянят укруг спodка з вадой, бліжэй да гаспадынінага двара. Машыны ездзілі па Савецкай нячаста, і вуліца, хоць і адна з цэнтральных у пасёлку, хутчэй нагадвала вясковую. І ўсе звыкліся з гэтым. І яна, Ніна, звыклася і па-свойму любіла яе.

Яна наогул часам думала аб тым, што ўсё, што вакол, што звязана з зямлёй, з прыродай, любіла больш, чым людзей. Задумваючыся, магла падоўгу сачыць за мурашом, за ўпартым цярпеннем, з якім той валок праз лес травы якую сухую зёлку. Ці за тапалёвым лістком, раскалыханым ветрам і кожнае імгненне новым — пры

новым асвятленні: то адным бачком павернецца да святла, то другім... Узіралася, услухвалася, далучаючыся душой да таямнічага, вечнага жыцця прыроды.

З людзьмі было інакш. Больш складана. Усе чагосьці чакалі ад Ніны. А то і патрабавалі — працы, увагі, усмешкі, пяшчоты. А яшчэ — слоў! Магчыма, слоў нават часцей, чым чаго іншага, нават калі за словамі была пустата. Маўчання людзі не разумелі, не прымалі, таму што ў яго трэба было ўслухвацца. Куды як лягчэй абыходзіцца са словамі! — адно і тое ж ва ўсіх падобных выпадках гаворыцца, паўтараецца. «Люблю...», «пашкадавала б...», «самая прыгожая...». Ці іншае: «якасныя паказчыкі...», «а калі трэба?..», «заслужана...».

Не, Ніна была не супраць слоў: словы ж не вінаваты, што зацягалі, выстудзілі іх людзі! Ніна была супраць няспыннага патоку слоў, які, здавалася, размываў дні, робячы іх падобнымі, як блізняты: ранішняя фіззарадка, распараджэнні па службе, канцэрт па заяўках слухачоў, жартамі прыкрытае жаданне аблапаць як не рукамі, дык хоць позіркам — яе, другую, трэцюю... Ці таго, другога, трэцяга... Мабыць, яна штосьці спрошчвала.

І ўсё ж, чаму так няўтульна, так адзінока было ёй часта між людзей, з людзьмі? Адна, сам-насам з мурашом ці з парай буслоў высока ўгары, над клінам поля, Ніна не адчувала так балюча сваё адзіноцтва, сваю адчужанасць, як між людзей, як дома. Вось і думала: чаму так?

«З ВЯЛІКАГА НЕ ВЫПАДЗЕ... Гэтак тата любіў казаць. Мама не стрымаецца, бывала, і папракне яго за лішнюю шчодрасць: хто б гэта апошні воз сена ўвесну перадзяліў, бо ў суседа не хапіла? Хто б за «дзякуй» два дні хлеў камусьці дапамагаў крыць? «Калі б хоць радня якая!» — ушчувала яго мама. На што ён, не на першы ўжо звычайна папрок, адказваў: «Усе мы радня на гэтай зямлі, Ганна». І калі тая не супакойвалася, дадаваў пасля паўзы: «З вялікага не выпадзе, яй-богу...»

Тата, мама... Карнікі... Няўжо ўсё — праўда, і сэрца маё не разарвалася, пачуўшы гэту праўду? А мо няма ў мяне ў грудзях сэрца, не было? Пакідала іх — не заплакала, і цяпер слязіны не выцісиуць. І цяпер... калі няма ўжо іх на свеце... Не, не! Як гэта — няма? Няма маміных рук? — я ж помню, як прыпадала да іх, ха-

ваючы заплаканы твар, — я чую пах кмену, пах малака — я ўдыхаю гэты родны пах, задыхаюся ім!

— Ніна, не бяжы так. Гэта ж не адна вярста наперадзе.

А-а! Гэта я ад хады хуткай задыхаюся. Хлопцы не паспяваюць. Дык чаго было ісці за мной? Навошта? Я ж прасіла. Я ж настойвала. Ніхто не паслухаў. Камандзір у адказ — за плечы мяне абняў. «Трымайся!» — загадаў. Хоць бы хто адзін сказаў: «Заплач! Паплач, Ніна!», хоць бы хто адзін.

Толькі мама ўмела адчуць той міг, калі пуста рабілася ўва мне — ні болю, ні спадзеўкі... Адчувала — і немагчымае рабіла, а прабівалася, прадзіралася праз гэту пустату, каб збудзіць боль, збудзіць душу маю. У мяне слёз не было — яна за мяне плакала. Хто ж цяпер за мяне паплача? Вочы паўвальваліся, так пякуць, што шлях з цяжкасцю намацваю сляпым позіркам, а — каб хоць слязінка! Мо няпраўду сказалі? Мо не было ніякіх карнікаў? У баку ж ад шляху, затуленае ад яго лесам, Запярынне, абміналі ж яго дасюль немцы! Прыбягу да хаты, да ганка, а на ганку тата з мамай мяне чакаюць — яны ж чакалі, яны ж гэтулькі мяне чакалі...

— Думалі з бацькам: замуж ты пойдзеш, многа дзетак народзіш — сабе і нам, старым, на радасць. Ды вайна праклятая нелюдзяў на нашу зямлю прывяла. А ты зноў па-свойму разважыла: ні мяне, ні бацьку не хочаш паслухаць. Пашкадаваць не хочаш.

— Не твая гэта справа, дочка. Мне трэба было ў лес ісці, яй-богу. Мне, а не табе. Папярэдзе бацькі хочаш...

Быццам натыкаюся на галасы. Тапчуся, тру сляпыя вочы: толькі што гучалі словы. Непадалёку ад мяне. Гучалі так выразна, што я гукнула:

— Мама!

Гукнула і спалохалася свайго воклічу — ён патануў у пошуме соснаў, у водгуллі... крокаў.

— Чаго ты, Ніна? Стамілася?

А-а! Гэта хлопцы. Не адстаюць. Шыбуюць за мной. Баяцца, што не дайду: яшчэ ж больш трох кіламетраў ад Сіняй Грады да вёскі. Я — дайду. Мяне чакаюць. Тата з мамай чакаюць. Я дайду, дабягу да хаты, да ганка, яны — на ганку. Яны ведаюць, што я павінна па-

спець. Яны не даюць: я не веру, што няма ўжо іх на свеце. Як гэта — няма? Няма мамінай песні? — я ж помню, як адагравала ля яе свае думкі, свае мроі і, перабіраючы пражу, пачынала тонка падпяваць, падцягваць:

А чыё ж то жыта? Чые то пакосы?
А чыё ж то жыта, чые то пакосы,
Чыя то дзяўчынка распусціла косы?..

Сумная песня. Пяеш — сум гэты ў грудзях баліць. Тата кожны раз, бывала, доўга, разгублена пакашлівае, потым, калі наступіць цішыня, калі скончыцца песня. А ў мяне — чыста, светла на душы. Святочна. Хоць і боль яшчэ не мінуў. Колькі помню — маміна гэта песня...

Вось і дуб знаёмы. Непадалёку ад вольхі, пад якой я са Сцяпанам сустракалася. Самы стары ў гэтым лесе, самы магутны дуб. У тры камлі, як абняць, пераходзіць асноўны, карэнны — вышэй, як рукой дацягнуцца, там, дзе шуміць у лісці вецер. А ўжо што да іншых галін і галінак, лічыць іх не пералічыць: аднойчы, ужо ўвосень, стоячы на тоўстым, хрусткім дыване асыпанага лісця, мы спрабавалі са Сцяпанам падлічыць, на сто дваццаць восьмай збіліся... Колькі ж тады лісця і жалудоў асыпаецца штогод на зямлю! Хіба што зямля, якая ўскарміла яго, ведае колькі. Тата казаў, што дуб ускрай вёскі, за Юрчыкавай хатай, хоць і стары — дзяды не помнілі яго маладзейшым! — а гэтаму на самай мяжы Сіняй Грады хіба што прапраўнукам будзе.

Пастарэў дуб за год. Нібыта не год, а век мінуў... Залысіна з'явілася: галіна, голая, як рагач, тырчыць з лісця, разрываючы, расколваючы на дзве часткі яго зялёны пошум. Не помню гэтага рагача, не было яго. І лісце... Зялёнае, а пакурчанае, быццам агнём прыхопленае. Далёка яшчэ да восені, а дуб — асенні, па-асенняму журботны. Уздрыгнуў, як і я, здаецца, калі размінулася з ім. Мо і да яго горкая вестка дакацілася? Мо паверыў ён ёй, гэтай вестцы?

Не, не! Гэта няпраўда. У баку ж ад шляху, затуленае ад яго лесам, Запярынне, абміналі ж яго дагэтуль немцы. А цяпер ужо і вайне хутка канец: гоняць адусюль немца, на ўсіх франтах гоняць. Камандзір зводку зачытваў. І сама я чытала. Перапісвала з Дзмітрыеўнай уначы, пры газнічцы, каб па вёсках сувязныя весткі з Масквы разнеслі. І ў Запярынне панеслі...

— Калі і ёсць за што нас з бацькам вінаваціць, дык адно за тое, што сыночка хацелі, сыночка чакалі. Бо ці ж не шкадавалі мы цябе? Ці ж пакрыўдзілі аднаго разу? Выгадавалі. Прыгожая ты ў нас расла. Красуня чыста вырасла.

Зноў мамін голас! Зноў я натыкаюся на голас, як на сцяну, і балюча тапчуся на адным месцы.

— У цябе кроў, Ніна. З губы...

Кроў? Якая кроў? Я толькі што з мамай размаўляла — чула яе голас. Ужо блізка. Раўчук перайсці па кладачцы, а то і проста пераскочыць, звярнуць па сцежцы ўправа, у бярэзнік...

Паварочваю ў бярэзнік, яшчэ прыспешваю крокі, стрымліваючы гарачае дыханне. Лес заканчваецца. Павінен ужо быць бачны адсюль комін Юрчыкавай хаты і край страхі... Нічога не бачу. Няўжо — праўда?!

— Няўжо — праўда?! — паварочваю галаў да Сашкі Варварынага, ужо скаваная жахам, жахлівым разуменнем: праўда!

Сашка апускае галаў.

Уздрыгваю ад дотыку чыёйсьці рукі і, быццам адагнаная гэтым дотыкам, адбягаю колькі крокаў, бездапаможна азіраюся вакол, не ведаючы раптам, куды ісці, куды звярнуць: вакол незнаёмы, пачарнелы ад дыму лес, і дым паўзе не ўгару, як звычайна, а зверху, з голля, на сцежку, пад ногі. Падсвядома разумею, сцежкай трэба ісці, на дым наступаючы, тут недалёка.

Баляць вочы. Ад гэтага горкага дыму, відаць. Нічога з-за болю не бачу, хоць лес радзее, заканчваецца, пераходзіць у гароды — я ўжо ступаю па бульбоўніку, спатыкаючыся ў разорах.

— Ніна! Ніначка!

Гэта не мамін голас. Хто ж мяне гукае? Хто мяне гукае і адкуль?

— Ні-на!

Нечакана я ўсё ўсведамляю. Бачу цётку Варвару, што, уся ў чорным, стаіць, абапіраючыся на кавеньку, за які крок ад мяне («Гэта яна і гукала!»). Бачу зялёныя палосы агародаў — то радкі бульбоўніку, то шнуркі высокага жыта — нібы пашырэлыя, папрастарнелыя зараз. Хаты... Хат няма. На падворках сярод папялішчаў тырчаць каміны («Як рагач на дубе!» — мільганула ашалелая думка), — іх астылыя кульці падпіра-

юць нізкае бясколернае неба. Адна гэткая кульця — на падворку Юрчыка — зусім побач. Улёршыся ў яе паглядам, я не магу ўжо адарваць пагляд ад апаленых, са слядамі сажы, цаглін — толькі пагляд і трымае мяне нейкі момант.

— Ды што ж гэта такое? Што ж гэта? — шапчу, і шэпт спаўзае следам за паглядам, ніжэй і ніжэй, па апаленых і астылых ужо цаглінах доле, у чарнату...

Відаць, я страціла прытомнасць, бо, лыпнуўшы вачыма, бачу ўстрывожаныя хлапечыя твары — хлопцы падтрымліваюць мяне, шчыльна абступіўшы.

— Цётка... Варвара!

— Я тут, Ніна. Чакаю.

Сашка адхінаецца і — там, дзе стаяла, праз колькі крокаў ад мяне, уся ў чорным, стаіць, абапіраючыся на кавеньку, цётка. Штосьці трагічнае — і разам з тым штосьці нязломнае! — у яе нерухомай постаці, у яе нерухомым позірку, у яе чаканні. Быццам яна ведае пра жыццё і пра смерць такое, чаго не ведаю я.

— Што ж гэта такое, цётачка? — ступаю я да яе.

— Гора.

Яна нічога больш недадае. Ні пра вайну, што прынесла людзям гэтулькі гора. Ні пра карнікаў, якіх трэба знішчаць, як знішчаюць пошасць, чуму. Ні пра тое, што адбылося тут, у Запярынні, два тыдні таму... Яна не спрабуе суцяшаць мяне. Яе рука апускаецца на маё плячо, Варвара горне мяне да сябе, бязгучна шавеліць цёмнымі, як прыцярушанымі попелам, вуснамі.

— Мама! — гукае яе Сашка.

Не паварочваючыся да яго, як і не яму, адказвае цётка Варвара:

— Ідзіце Фомку дапамажыце зямлянку дакончыць, яму лягчэй будзе ўправіцца.

— Ды мо ў лес...

Варвара, не адпускаючы маё плячо — цяпер я сама ўжо гарнуся да яе! — паварочвае да Сашкі, да хлопцаў голаў.

— Што ж, усім зямлю сваю кінуць, каб бур'яном зарастала, і ў лес падацца? Вы — бараніце яе, нам, хто жывы, — даглядаць яе трэба, засяваць. Хлеб нас перажыве, сынок.

Яна падалася ад іх сцежкай, што вяла на Юрчыкаў падворак, змусіўшы ступіць за ёй, ісці за ёй і мяне. Мне карціць заплюшчыцца, не пазіраць, не бачыць ні паля-

лішча, якое мы абмінаем, ні пакарабачанага жалезнага ложка крыху ўбаку, ні рэшты абгарэлай агароджы. Але нейкі голас ува мне — я не пазнаю яго! — гучыць, не сціхае, загадвае: «Глядзі! На ўсё глядзі. Ты не можаш, ты не маеш права адвярнуцца, не маеш права заплюшчыцца. Глядзі і запамінай!» І я не магу адвярнуцца. Не магу заплюшчыцца. Я — крок за крокам — адчуваю, як ледзянее, камянее ў мяне ўсё ўнутры. І толькі ў плячы, на якое абапіраецца цётка Варвара, на якім ляжыць яе рука, яшчэ б'ецца, штурхаецца, разыходзячыся хвалямі па целе, жывое цяпло...»

— Аб чым задумалася, сяброўка? Крычу, гукаю — хоць бы што! Шыбуеш і шыбуеш, людзей не бачачы.

— А-а! Ганька! Добры вечар. Задумалася вось...

— Калі ты кінеш дурную гэту справу? Думаннем жыццё не падменіш, колькі ні думай.

Ганьчын позірк, у якім мільганула на момант трывога, супакойваецца, цяплее. Ганька і не пазірае больш на яе, зіркае вакол, быццам вышукваючы, каго яшчэ зачапіць. Высокая, мажная, з ладнай касой, скручанай вузлом на патыліцы і вясёлым карым позіркам, яна — поўная супрацьлегласць Ніне. Энергія не проста перапаўняе яе, энергія, энергічная сіла і ўпэўненасць кіпяць, клякочуць у ёй, шукаюць выйсце. І знаходзяць. То ў рухах, таропкіх і нярэдка няўклюдных. То ў словах, гэтаксама таропкіх і сказаных не заўсёды да месца.

— А Пахом дзе? Разам жа на касьбу збіраліся.

— Вой, нашто мне гэты хвост? Яму з мужыкамі вальней і цікавасці больш. І мне... Ён мне ўночы збрыдне: як прычэпіцца, дык не адаб'ешся. Што ж, яшчэ каб і ўдзень за мной валэндаўся? Я — цябе здалёк згледзела, дагнала вось, каб словам якім пацешыць. Дома ж часу не будзе: кароў хутка прыгоняць, вячэру гатаваць, парсюку назаўтра наварыць...

— Ганька, вось скажы, чаму так атрымліваецца: згадаеш даўнейшае, — здэцца, калі і было тое! — а ўсё ясна бачыцца, ясней, чым сённяшняе што. Колькі гора было, колькі адпакутавана, а тая, паўмёртвая ад гора, я сабе даражэйшая. Чаму так?

— Таму што маладая была. Маладосць усё перамагала: і гора, і пакутныя думкі, і хваробу. А сёння... Сённяшняму дню ты доўга, на працягу многіх год то ў адным, то ў другім саступала. А ўсё назад азіралася. І ця-

пер азіраешся, нябось, і ўсё думаеш, думаеш. А што тут думаць, Ніна? Баба ты і да смерці бабай застанешся. Пакуль не пераняла на шляху старасць, жыві. Павэлак жа яшчэ нібыта і нічога...

— Пра іншае я, — азвалася Ніна, шкадуючы ўжо, што пачала гэтую гамонку.

Ганька перастала круціць галавой і шалёна размахваць рукамі, утаропілася ў Ніну. І тут жа, атрасаючыся ад спакою, зноў закіпела, зноў захадзілася.

— Усё тваё іншае — да аднаго зводзіцца. Да таго ж, што ў кожную з нас прыродай закладзена. Не разбудзіў у табе жанчыну Павэлак, засцярогся ад нечага і ўпусціў свой момант. Крыўдуй не крыўдуй, Ніна, я і раней табе гэта казала, і зараз кажу: недарэка табе трапіўся, хай ён будзе здаровы. Ад вялікага кахання нябось збаяўся тугу ў табе скалыхнуць.

— Не чапай ты яго, Ганька, — папрасіла Ніна.

— Цьфу, дурніца! Ды каб не ты, а іншая, я б яму даўно ўсё выказала, твайму любезнаму: не ведае, як да бабы падступіцца, хай у людзей папытае! Хоць бы і ў майго Пахома.

— Супынься. Якая муха цябе ўкусіла? — зазлавала ўжо Ніна, засаромеўшыся раптам Ганьчыных слоў. — А то ў цябе — усяго клопату, як лаўчэй пад бок Пахому падкаціцца!

— О, калі б мне адно гэты клопат! — засмяялася Ганька, набычваючыся і нечакана яшчэ больш мякчэючы тварам.

— І я кажу.

— Калі б мне адно гэты клопат, у нас бы з Пахомам не трое дзяцей было, а ўсе трынаццаць. Свят, свят, свят!

Яна смяялася, уся, ад шырокіх клубоў і высокіх грудзей — да касы, скручанай на патыліцы ў ладны вузел, калыхаючыся ад смеху. І, косячыся на яе, на гарачае калыханне яе цела, заўсміхалася і Ніна: на Ганьку цяжка было пакрыўдзіцца, нельга было крыўдаваць доўга — не было ў тае злосці ні да каго. Больш! Ніна была ўпэўнена, што ў гэткім мяккім, гарачым, вялікім целе, у якім кіпела, клекатала столькі добрай, няўклюднай энергіі, злосць папросту не змагла б укараніцца, нават калі штучна прышчапіць яе. Розную яна Ганьку бачыла, ведала — злоснай не бачыла, не ведала. І цяпер не са зла тая казала. Хутчэй за ўсё, жарты, якімі пера-

кідваліся з мужыкамі там, на лузе, у хвіліны адпачынку ды ў машыне, едучы з сенакосу дамоў, у пасёлак, падагрэлі яе, не паспеўшы астыць на языку.

Бы пацвярджаючы Німіны здагадкі, ужо не смеючыся, а выціраючы мокрыя ад слёз вочы, Ганька неяк адразу супакоілася, зусім сур'ёзна сказала:

— Ты не зважай. Словы за дзень так язык змулялі, што не трымаюцца на ім, саслізгваюць самі па сабе. Ты не зважай. Каб жа ўсяго шчасця — мужык пад бокам!

— Ды я разумею. Чаго там, Ганька!

— Ты аб нечым пыталася. Я словамі абмінула...

— Ды не, нічога. Запярынне сваё спаленае прыгадала, сябе маладую.

Нейкі час жанчыны ідуць моўчкі. Плячо да пляча. Адна адну падтрымліваючы маўчаннем. Такія розныя: адна высокая, мажная, разгарачаная хуткай хадой і сваімі словамі, другая, невялічкая з ёй побач, хударлявая, па-дзявочы стройная, — яны ўсё-ткі родніліся чымсьці. Чымсьці большым. Глыбейшым. Зараз, у хвіліну задумення, любы, хто ўгледзеўся б у іх твары, застаўся б перакананы, што яны заўсёды лёгка разумелі адна адну. У кожным выпадку. Нават не пагаджаючыся часам, разумелі.

Чаму яна, Ніна, прывязалася за доўгія гады суседства да Ганькі, Ніна ведала. У суседзяў заўсёды было хоць і тлумна, але ўтульна: і спрэчкі шчодра перасыпаліся жартамі, і ўшчуванні дзецям хутчэй нагадвалі дасціпныя казанні-прытчы: і дзядоў, і прадзедаў, ажно да самога бога, Ганька прыгадвала, каб зразумеў яе смаркаты Пецька, што ў школьным сшытку павінна быць гэтак жа чыста, як і ў думках, у душы. І калі Пецька сумняваўся — хіба былі раней школьныя сшыткі? — яна, хуценька прыгадаўшы старонку з падручніка старэйшага сына, Змітрака, урачыста абвяшчала: «А як жа! Толькі яны былі не гэткія, як сёння, тыя сшыткі, а каменныя. Сцяна цэлая, ці гэта... скала!» І з усмешкай, абводзячы рукою самую большую, без вокнаў, сцяну, дадавала: «З гэткім было цяжэй справіцца, а? А ты са сваім не ўпраўляешся!» І перакананы хлапчук утыкаўся ў сшытак, старанна выводзячы акруглыя літары...

Ганька ўмела, непрыкметна для іншых, усё трымаць у сваіх руках: дом, гаспадарку, выхаванне дзяцей, свайго Пахома. Усё рабілася, рухалася, спынялася, здавалася, безадносна да яе волі, але гэта толькі здавалася.

І хатнія справы, і ўчынкі дзяцей, і клапатлівая ўвага мужа натхняліся ёй. Хто-хто, а Ніна гэта ведала. Бачыла. І сама колькі раз адагравалася каля Ганьчыных слоў, сама колькі раз чэрпала ў яе мяккай, шумнай дабрыні добрую сілу. Вось і цяпер завяла з ёй гаворку, спадзеючыся ўразумець больш таго, што разумела. І калі не атрымалася гаворка, не пакрыўдзілася на Ганьку. Значыцца, момант быў не той.

— А я вось сваю Яблынеўку рэдка згадваю, — перапыніла яе думкі Ганька. — Мо таму, што тут гаравала пры немцах, тут дзяцей нараджала, плачучы цішком па начах ад страху, што голад іх у мяне пазабірае... Да вайны ж яшчэ сюды за Пахомам прыехала.

Ніна не адгукаецца, адно паварочвае да яе галаў.

— Ды ўжо ж. Гора і нястачы мацней прывязваюць да зямлі, чым дастатак, — працягвае тая. — Зірні, што робіцца: з папялішчаў вылезлі, у хлеб мякіну перасталі дамешваць, чыстымі, гладкімі парабіліся і — хто куды ад зямлі! Які наш пасёлак, а ў саўгасе рабіць няма каму. Пралупяць раніцой вочы, памыўся не памыўся — ляцяць праменька да станцыі: да цягніка трэба паспець. Усе, хто маладзейшы, у горад едуць. На работу. Бы тут работы не хапае.

— А мне ў Запярынне рупіць паехаць. Заўтра паеду.

— Так-такі заўтра? Дык жа не субота быццам.

— Водпуск дала Дзмітрыеўна.

— А-а. Ну, тады, канечне.

— Час настаў, мусібыць, да канца ва ўсім разабрацца.

— У чым, ва ўсім, Ніна? — устрывожана павярнулася да яе Ганька. — Не забываецца былое — не забывай, памятай! Хто ж супраць? Але нашто ж разбірацца, нашто бясконца душу вярэдзіць? Колькі гадоў, падумай, мінула...

— У тым-то і бяда, што шмат гадоў мінула. Раней мне, Ганька, трэба было. Раней! Ды сілы ў сабе не знаходзіла раней.

— А сёння знайшла?

— Напэўна. Як праз нешта ў сабе пераступіла. Як паветра чыстага глынула. Ажно галава закружылася напачатку...

— Ой, глядзі, дзеўка! — узмахнула рукамі Ганька,

усміхаючыся. — Ой, глядзі! Каб жа хвароба якая не накінулася раптам.

— Якая хвароба? — не зразумела Ніна.

— Ну, хоць бы нешта накшталт Макавея.

— Ма-ка-вея?..

Ганька ўжо рагатала, і смехам, і няўклюднымі ўзмахамі рук раскалыхваючы сваё вялікае цяжкое цела. І Ніна, нават прыпыніўшыся на міг ад нечаканага павароту гаворкі, — вось так з Ганькай скрозь! — толькі квола адмахнулася ад яе жарту і пакрочыла далей. Дагнала суседку і, калі тая, рагочучы, павярнулася да яе, схавала сваю ўсмешку за сярдзітым:

— Табе б усё смяяцца!

## 25

Бульба выкіпала. Агонь патрэскваў, жаўцеў, спалохана ціснуўся далей ад пеністага струменьчыка вады, што, кранаючыся гарачай бляшанай падстаўкі керагаза, шыпеў, як раззлаваны, надзьмуты злосцю гусак, і знікаў — сыходзіў парай ці сваёй злосцю выпаранай: не мог жа перамагчы, згасіць агонь.

Павэлак яшчэ на адзін зрух прыкруціў агонь, яшчэ на колькі міліметраў ссунуў крышку і, узяўшы відэлец, тыцнуў ім у крайнюю бульбіну. Бульбіна была цвердаватая, хоць і падалася, накалолася на відэлец. Яшчэ хвілін пяць, і можна будзе выключыць агонь зусім, адцадзіць бульбу... Падумаў пра гэта абыякава: есці ўжо не хацелася, ды і Ніны дасюль не было.

Шчыльней прыкрыў дзверы ў хату, каб не нацягнула чаду: невялікі чад, але ж газа згарала, брудны пах яе злёгку казытаў у горле. Азірнуўшыся на прыціхлы агонь і задаволена хітнуўшы галавой, выйшаў на ганак. Адкашляўся. Агледзеў свой падворак, бы праверку яму ўчыніў, ці ўсё на месцы, праверыў. Прычыненыя вясніцы. Акуратныя, нідзе не скошаныя вароты. Старая вішня ледзь не пасярэдзіне двара. Сцежка да хлеўчука і прыбудаванай да яго пуні. Пад страхой, прымацаваная да бярвенчатай сцяны, драбіна...

Згледзеўшы драбіну, Павэлак насупіўся, прыпамінаючы, дзе хацеў скарыстаць яе сёння. Прыпомніў. Ступіў з ганка на сцежку і скіраваўся да пуні. Зняў з крукоў, убітых у сцяну, драбіну і панёс яе да вішні: адцэдзіць

і накрые ручніком бульбу — і агледзіць шпакоўню, паспрабуе знайсці тлумачэнне таму факту, што ў ёй даўно не сяліліся шпакі. Шпакі самі па сабе яго не цікавілі, але ж Ніна скардзілася... Ды і весялей было бавіць час за нейкім клопатам у двары пад іх валтузню і спевы.

Драбіна прыкамячыла колькі гнуткіх галін, але стаяла як укапаная: з верхняй прыступкі якраз ільга будзе зірнуць, у чым там справа. Павэлак задаволена хмыкнуў, яшчэ раз хістануў рукой драбіну і, упэўніўшыся, што тая стаяла сапраўды добра, адступіўся, пайшоў назад, у сенцы, зірнуць на бульбу.

Бульба пачала ўжо развараваца, і, выключыўшы керагаз, Павэлак прыхапіў льняным ручніком каструлю, зліў у памыйнае вядро ваду, з асалодай удыхаючы пару, пах сопкай бульбы. Зручней склаўшы ручнік, накрыў ім шчыльна пакладзеную крышку, каб яна даўжэй астывала, — управіўся! Прыйшла б зараз Ніна — і павячэралі б. Ды няхай, вячэра трохі пачакае, а ён, Павэлак, за гэты час яшчэ адну справу зробіць. Высветліць усёткі, чаму гэта раптам шпакоўня для шпакоў непрыдатнай стала і не прылятаюць яны да яе, не селяцца там. — Усё б жывыя галасы ў двары! Ды і Ніна скардзілася...

«— ТАК НА СВЕЦЕ ВЯДЗЕЦЦА: АДЗІН ПЛАЧА, ДРУГІ СМЯЕЦЦА.

Кажу, хаваючы ад Гнася вочы: чамусьці непрыемна, што ён пачаў гэту гаворку. Ніна — гэта маё. Калі не радасць мая, дык боль мой. І гэта зусім не значыць, што кожны можа калупацца ў ім. Хай сабе Гнась і не кожны, хай сабе сябрук ён мне, ды і яму лепш памаўчаць пра гэта. Я ж — маўчу. Я ж не хаджу ад аднаго да другога з болем сваім, не скарджуся. І да Ніны не чапляўся ўвесь гэты год... да ранення свайго... Мо б і зусім ніхто нічога не ведаў... Гнась кажа: выздараўлівае яна. І я — выздараўліваю: не зачапіла куля сэрца, і на тым дзякуй. А сволачы той, што страляла, я адплачу, я паспею яшчэ адплаціць. Дасюль не шкадаваў гэту погань, а цяпер, як падымуся, лічыць буду, колькі перастраляю, — кулямі лічыць.

— Ну, чаго ты дзьмешся, Пятровіч? Га? Не смяюся

я: З чаго ты ўзяў, што смяюся? Не ў цябе аднаго сэрца ў грудзях бунтуе, паслухаў бы ты маё!

— Што — тваё? — не паспеў я адвярнуцца ад сваёй думкі.

— Сэрца маё. Думаеш, Гнась Засека без сэрца жыве, га? Думаеш, Гнась Засека не нарадуецца, што ў абдымку з ватоўкай зашмальцаванай не першы год ужо спіць, га? Думаеш, Гнась Засека смяецца, што ты з-за дзеўкі пад кулі палез, га? Ды я можа...

— Пры чым тут дзеўка?

— Знайшоў чаго саромецца, дурань! Ды хлопцы калі і кажуць што, дык зайздросцячы. Дзеўка тут можа быць і ні пры чым, га? А вось сэрца. Ты хоць разумееш, Пятровіч, га, што гэта сэрца тваё подзвіг здзейсніла?

— Подзвіг, подзвіг... — перадражніў я Гнасеў хрыпаты голас, пачынаючы злавацца. — Які подзвіг, Гнась? І на якое ліха табе маё сэрца, скажы? Ганяе кроў — і няхай ганяе: работа ў яго такая. А то: сэрца... подзвіг... Дурыш галаву!

— Ды цябе ж да ўзнагароды прадставілі за той бой на чыгунцы! Ды каб ты не падхапіўся тады з крыкам, з мордай перакошанай, га? — дык невядома яшчэ, як бы што павярнулася. Немцы ж там моцна сядзелі, замацаваўшыся...

— А я падхапіўся — і не ўседзелі!

— Цьфу! Я яму пра папа, а ён пра папову яечню, га? — пачынае злавацць і Гнась, разумеючы, што я смяюся з ягоных спроб супакоіць мяне, пераканаць у тым, што без мяне, Павэлка, зямля павольней круціцца і кулі на ляту ржавеюць. — Бачу: выздараўліваеш. Па слова ў кішэню не лезеш. Га?

— У цябе вучуся, — буркаю.

— Во, во! Вучыся, пакуль мне язык не адарвала разам з усімі словамі нявыказанымі. Другі месяц нябось, га, на палку качаешся, а Гнась Засека адзін на чыгунку хадзі ці з дзедам Гаўрам нявопытным на пару...

Не пазіраю на Гнася і бачу, як той усміхаецца, спецыяльна пра дзеда Гаўру падпусціўшы: ведае, што прыгадаю адразу, як Іван таго галяком на сонцы паставіў, пра банцік развязаны паплёўшы. Во дзед! Пастаяў, пастаяў з рукамі задранымі і да Дзмітрыеўны раіцца пабег. Што там яму ўжо доктарка сказала, ніхто не ведаў, але калі хто з хлопцаў, ледзь стрымліваючы смех, цікавіўся ў дзеда вынікам, Гаўра чухаў патыліцу і, косячы

рудым, выцвілым за столькі год — яму ж як не восемдзесят ужо! — вокам, глыбакадумна казаў: «Дзе мне, нявучанаму, у выніках разабрацца! Не коле ў спіне — і добра».

Гнась, згледзеўшы, відаць, што ў мяне па твары поўзае-ткі ўсмешка («Во дзед!»), пырскае ў кулак. Не смехам, а кашлем, у які адразу пераходзіць яго хрыплаваты смех.

— Прастудзіўся, халера, га? — адкашляўшыся, адсмяяўшыся праз кашаль, сказаў Гнась. — Свая зямелька, родная, а не толькі затуляе ды корміць. Паляжыш, прыціскаючыся да яе, гадзіны са тры за купінай — нічым потым не адагрэцца.

Я кранаюся пальцамі яго рукі, абмякшы, аслабеўшы раптам. Нібыта гэта я, а не Гнась колькі хвілін хрыпла адкашліваў прастуду. Вінавата неяк кранаюся: і праўда ж, другі месяц качаюся на палку — рана не зацягваецца, а яны... Што — яны, недадумваю, бо Гнась, нечакана ўстрывожана, схіляецца нада мной.

— Баліць, Пятровіч? Га? Ты прабач, брат. Задурыў табе галаву!

— Ат! Была б галава...

Позіркі нашы сустракаюцца. Я ўпершыню заўважаю, што ў Гнася зеленаватыя, у цёмную іскарку вочы, і святло ў іх не тоне, а быццам пялёхкаецца, мяняючы штоміг адценне іх дзіўнага, дзікаватага колеру, паглыбляючы, ці, наадварот, засланяючы позірк. Я нават хачу сказаць пра гэта Гнасю і лаўлю словы, што называецца, за хвост: што ён — жанчына, каб пра вочы свае выслухоўваць? Сумныя ў сябрука вочы. А якога колеру гэты сум, не гэтак ужо і важна.

— Яшчэ сямёра нашых загінула.

Я ўздрыгваю. Тузануліся і ўпалі на падсцілку мае пальцы, адпусціўшы руку Гнася.

— Дзе?

— На засаду напароліся, ужо вяртаючыся, га? На кулямёт, маць тваю... Як чакалі іх немцы! Мёртвых пазабіралі, га? На машыну паўскідалі і паехалі... Мы назаўтра толькі мяшок пад алешынай знайшлі, і хлеб у ім. Хлеб у атрад хлопцы неслі.

— А адкуль...

— Пастушок іванаўскі бачыў. Ён і расказаў, прыбегшы.

Гнась гучна вылаяўся і зноў закашляўся, старанна

адварочваючы голаў убок. Кашаль яго адгукаецца ўва мне, у грудзях, лявей раны, нязвыклым, працяжным болем, і я міжволі цягнуся рукой да грудзей, прыкрываю тое месца, дзе расце, расцягваецца гэты боль.

Naцірання б якога, мазі ці хоць бы шкіпінару зараз Гнасю, каб нанач нацёрся! Ды дзе тут, у лесе, шкіпінар? Гарэлкі і той не разжывешся зараз. І па вёсках людзей пачалі выбіваць ды выпальваць. Нічым не павінных людзей. А калі ўжо хто з партызан трапляў ім у рукі... Мёртвых, кажа, пазабіралі, на машыну паўскідалі? А мо хто і жывы быў, паранены...

— Ненавіджу! Ненавіджу! — хрыпіць Гнась праз задушлівы кашаль. — Як жа я іх ненавіджу!

— Доктарцы табе трэба паказацца. Чуеш, Гнась?

Ён не чуе. Душыцца кашлем, старанна адварочваючы ўбок голаў. Калі кашаль аціхае, уціраецца рукавом ватоўкі і ўжо спакайней паўтарае:

— Як жа я іх ненавіджу! Быццам бяздомныя, па лясах хаваемся, га? Як ён і парыпвае, нармальны ложак, не помнім. Ні цяпла, ні ежы чалавечай тыднямі не бачым. А яшчэ ж і радавацца павінны, бо жывыя пакуль што, га? Бо вунь, куды ні прыйдзеш — смерць і смерць. Мала мы б'ём іх, сук! Мала, Пятровіч.

— Але б'ём жа.

Вылаяўшыся, Гнась змаўкае. Маўчыць. Чуваць толькі яго цяжкое дыханне: быццам штосьці хрыпіць, захліпаецца, раз-пораз абрываючыся ў яго ў грудзях. Я хачу зноў нагадаць яму пра доктарку і, разумеючы, што справа не ў доктарцы, а ў сабачым холадзе, ад якога ў лесе не ўратуешся, кажу іншае, мо каб падбадзёрыць і Гнася, і сябе:

— Хутка гэта ўсё скончыцца, Гнась.

— Га? — ускідваецца той. — Хутка, кажаш, скончыцца? Нам з табой яшчэ хопіць, Пятровіч. Мы іх, сук, да Берліна пагонім. Га?

— Пагонім, — ківаю.

Пагаджаюся, а сам думаю пра нязвыклы, працяжны боль у грудзях, што ніяк не адпускае, наадварот — расце, распаўзаецца па целе, знясільваючы мяне ўсё больш. Пра рану, што ніяк не зацягваецца. Пра задушлівы Гнасеў кашаль, пра яго цяжкое дыханне, калі чуваць толькі, як штосьці хрыпіць, захліпаецца, раз-пораз абрываючыся ў яго ў грудзях... Хто б ведаў, як яно

абернецца! Пагонім, канечне, калі галовы не складзём.

— Пагонім, — ківаю Гнасю.

Гнась уважліва глядзіць на мяне і, ці то заўважае кроплі поту (я чую, як яны студзяць лоб!), ці то звяртае ўвагу на маю руку, якой я па-ранейшаму прыкрываю, заціскаю боль у грудзях, падымаецца.

— Баліць, Пятровіч? Га? Прабач, брат. Зайшоў і замест таго, каб падбадзёрыць... Не атрымалася. Прабач, га?

Ён горбіцца, бо зноў пачынаецца кашаль, і ён спрабуе заціснуць яго далонню, і, не чакаючы, пакуль адыдзе, адступіцца кашаль, выбіраецца з зямлянкі. Чую, як Гнась кашляе там, наверсе, захінаючыся ад ветру, і думаю пра тых семярых, што трапілі ў засаду, думаю, што нават не запытаўся ў Гнася, хто гэта быў, хто — сямёра... Расце, распаўзаецца па целе нязвыклы, працяжны боль, і я стагну, кусаючы вусны, — але не ад болю, не ад гэтага болю! Зноў, як калісьці, я адчуваю сваё бяссілле, поўнае бяссілле перад той аграмаднай, бязлітаснай, крыважэрнай пачварай, імя якой — вайна...»

Згадка прыйшла, апаліла Павэлка сваім трывожным святлом і знікла. Растала. Дзесьці там, дзе позірк яго ўсё яшчэ коўзаўся на гарачай чырвані заходу, — у гэтай чырвані і растала. А боль у грудзях застаўся. Глухі, працяжны — каторы ўжо раз за сягоння! — ён рос, расцякаўся ў ім...

Боль звычайна апярэджваў згадку, і Павэлку заўсёды здавалася, што гэта душа пачынала балець у прадчуванні былога — вяртання ў былое. Павэлак даўно забыўся на сваю рану: зажыла і зажыла! Чаго было пра яе думаць? Зацягнулася, зарасла. Лёгкая была рана: навылёт. Чаго было праз столькі год трывожыцца? Калі толькі душу закранула тая куля...

Ён сцепануў плячыма, непрыемна здзівіўшыся таму, што, як калісьці ў размове з Гнасем, заціскае боль далонню. Упэўненасць пачынае страчваць, ці як? Згадкі з рэчаіснасцю блытаюцца, міжволі колішнія рухі паўтарае... Адняў руку, міг адзін услухваўся ў боль, потым сплюнуў, прыгадаўшы колькі смачных Гнасевых слоўцаў, і пайшоў да вішні. Для нечага ж валок ад пуні цяжкую драбіну!

Хістануў рукой — стаіць! — і, заціснуўшы зубамі

ўздых, пашкробся на вішню. Не далез да шпакоўні, падумаў, што робіць марную справу зараз, бо ці ж зазірнеш у дамок праз гэткае маленькае акенца. Відаць, трэба адбіць стрэшку, а не — дык і зусім зняць шпакоўню... Уздыхнуў, спусціўся па драбіне ўніз і пайшоў да пуні шукаць малаток. Павэлак шкадаваў ужо, няйначай, што захадзіўся, што прыйшло ў галаву займацца птушкамі, іх гняздоўем, — як работы іншай не было па гаспадарцы! Ды, зрэшты, пачаўшы, трэба было заканчваць — высвятляць ці выпраўляць што, як ёсць што.

Малаток быў на месцы, у скрынцы з інструментамі. Павэлак прыхапіў яшчэ і колькі цвікоў, каб, у выпадку чаго, не сунуцца назад яшчэ раз, і вярнуўся да вішні. Зноў пашкробся ўгору, асцярожна намацваючы прыступкі: загрымiць з драбіны — доўга будзе чухацца!

Працаваць наверсе, трымаючыся раз-пораз за хісткую галіну, было не вельмі зручна. Але і адбіць зараз шпакоўню было б не лягчэй. Таму і мудраваў. Таму і чапляўся за шпакоўню, спрабуючы адбіць, падняць стрэшку. Тая падавалася: дошка была старая, трухлець пачала ўжо — ледзь што не крышылася з краю пад малатком.

Адарваўшы дошку, Павэлак адвярнуў яе цвікамі ўбок, сунуў малаток у кішэню і запусціў руку ў дамок. Зазірнуў і спахмурнеў: у пакінутым гняздоўі бялелі тонкія шпачыныя костачкі. Кот напаскудзіў, паласаваўся... Ці так, сама па сабе птушка... Гэта было не ясна, ды не так і важна. Галоўнае, што прычына ўсё-ткі была і справу можна было паправіць.

Чамусьці адчуваў Павэлак непрыемнасць, непрыемная была справа, але ён не вагаўся, падчапіў усе гэтыя сухія травінкі, пёркі і костачкі і выкінуў — кінуў уніз. Выцер руку аб штаніну, зірнуў яшчэ раз у дамок, кашлянуў і пачаў закалочваць стрэшку, пасунуўшы яе крыху ўперад. Зрабіў работу, агледзеў шпакоўню і пасунуўся ўніз, асцярожна намацваючы нагой прыступкі.

Боль у грудзях не аціхаў, але Павэлак не дужа ўслухваўся ў яго. Прыбраў усё на месца, змёў на шуфель рэшткі гнязда і аднёс іх на грудок яшчэ леташняга гною за хлявом. Пачаў ужо мыць рукі, густа намыльваючы іх, — чамусьці было непрыемна тое, што зрабіў, — як учуў Макавееў матацыклет. Падумаў, што той нешта пазніўся сёння: звычайна гадзіны на дзве ра-

ней ляцеў са станцыі, ды Макавею, ведаў, усё з рук сыходзіла — усё было добра.

Матор зароў зусім побач, зачмыхаў, затузаўся. Не выключаючы яго, Макавей прыпыніўся ледзь не насупраць Павэлкавага двара, і Павэлак распраміўся, выціраючы рукі, зірнуў лаверх плота. Макавей упіраўся абедзвюма нагамі ў зямлю, стрымліваючы ахутаную дымам і трэскам сваю машыну, а з задняга сядзення нязграбна спаўзаў Пахом, выпрастаўшы перад сабой руку з авоськай, завязанай вузельчыкам.

— Дзякуй, браток. Падвёз, — незадаволена гукнуў ён, моршчачыся ад дыму і трэску.

— Будзь здароў! — раўнуў, перакрываючы трэск матору, Макавей і рвануў, як кажуць, з месца ў кар'ер — толькі пакручастая стужка дыму матлянулася ззаду.

— Звер, а не машына! — сказаў, як паспачуваў суседу, Павэлак.

— Звер, халера на яе, — пагадзіўся Пахом, прыпыняючыся. — Не рады ўжо быў, што і сеў. А Макавею хоць бы што.

— Што яму зробіцца? Здаровы, чорт. Як вы там? Управіліся з сенам?

— Дзе там! Хоць бы за тыдзень управіліся. І пякло, сушыла ж тыдні тры, а трава — у пояс, як касу ўбіць. Добры сенакос.

— То і я з вамі пад'еду заўтра. Усё лішнія рукі.

— Ды ўжо ж. Рук не хапае, Пятровіч, сам ведаеш. Жанчынам косы не дасі — не пацягнуць, а нас у брыгадзе па пальцах лёгка пералічыш. Сам ведаеш.

Пахом нецярпліва пераступае з нагі на нагу, зрэдку азіраецца, пазірае ўздоўж вуліцы.

— А Ганьку дзе згубіў?

— Ідзе. Вунь, — паказаў рукой той кудысьці назад, — разам з тваёй ідзе.

Павэлак перагінаецца праз плот колькі льга і крыху воддаль, двароў праз пяць, бачыць жанчын. Плот рыпіць пад ім, і ён, засаромеўшыся свайго руху — жонкі даўно не бачыў! — наўмысна абыякава бурчыць у адказ:

— Усё ніяк не нагаворацца. Адкуль толькі і словы бяруцца? То слова не выцягнеш, а то і не спыніш, каб і хацеў...

— О, браток, мы з табой давеку ў тым не разбяром-

ся! — рагатнуў Пахом, паказваючы два ўстаўныя зубы. — Дык я гукну цябе, каб не праспаў уранку?

— Ага, Пахом. Гукні. Пакашу з дзень...

Пахом пайшоў. А Павэлак стаяў дзе стаяў, чакаючы Ніну. Чуў, як ляснулі Пахомавы весніцы, як загаманіў той да свайго Шарыка, хоць кабель быў такі стары, што, пэўна, даўно ўжо і вушы не натапырваў ні на адзін гук. Так... жыў, смерці сваёй чакаў. Шмат хто пытаўся ў Пахома, чаму ён не пазбаўляецца гэткага вартаўніка, за што корміць яго: глухі ж кабель, як пень. І Павэлак пытаўся. «Жывое ж! — адказаў яму Пахом. — Жывое...»

Нельга было вось так, без справы, стаяць ля плота, чакаючы Ніну. Павэлак гэта разумеў. І — не кратаўся з месца. Чакаў. Чуў глухі, працяжны боль у грудзях, які не аціхаў — наадварот, рос, расцякаўся ўсё шырэй, і не было на яго ніякой управы. Ён спрабаваў, як часта раней, адмахнуцца ад болю, не зважаць на яго, рашуча не зважаць, але гэты раз у яго нешта не вельмі каб атрымлівалася. Чуў боль усё больш выразна і з горыччу думаў, што ж там, крыху правей сэрца, магло так балець? Што?

## 26

— Ці не твой гэта Павэлак стаіць за плотам, нас чакае? — пазнала здалёк Ганька. — Во ўжо хто маецца скрозь са сваім даўганосым характарам: каб мог, хвастом бы за табой усюды валокся, а не! — усё маўчыць сам сабе, усё думае.

— Не чапай ты яго, Ганька.

— А я — не яго, я — цябе. Павярніся ты аднаго разу да яго з усмешкай, выкажы ён аднаго разу табе свае думкі запаветныя, жыць бы маглі — людзі не нарадаваліся б.

— Мы ж жывём...

— Жывяцё! Толькі радасці ў тым мала і табе, і яму — абаім. Людзям — што? Ці парадуюцца, ці пашкадуюць — усё абгавораць. Раз, другі абгавораць — і забудуцца. Вы ж на вачах адзін у аднаго...

Ніна сумна адмахваецца ад пацішэлага голасу суседкі.

— Ой, глядзі, намахаешся, дзеўка! На старасці і прыгадаць не будзе чаго.

— Во ўжо чаго хопіць да самай смерці — прыпамінаў! — ціха абзываецца Ніна, не зводзячы позірку з высокай, худой постаці Павэлка, які, па меры таго як яны набліжаліся, прыкметна горбіўся, ніжэў, уцягваў галаву ў плечы. — І сёння не ведаю, куды ад прыпамінаў дзецца, а ты кажаш.

— Не пра тое я, Ніна.

Яна змаўкае. І маўчыць да самага двара, прымерваючы свае цяжкія шырокія крокі да Ніниных хуткіх, дробных. Падняўшы голаў на Павэлка, вітаецца:

— Добры вечар, Пятровіч, зачакаўся?

— Вячэра стыне...

Ганька лёгка таўханула Ніну ў бок, падштурхваючы да весніц, звяртаючы яе ўвагу на словы, і заспяшалася са сваімі няхітрымі тлумачэннямі, замахала рукамі, загула:

— Гэта ж мы, Пятровіч, забалбаталіся. Гэта ж мы сустрэліся на паваротцы ля камбіната, Пятровіч, і ішлі, не вельмі каб і хутка, сваё рознае абгаворваючы. Ведама ж, бабы. То адно, то другое знойдзецца, каб пагаманіць. Звычайная справа, Пятровіч.

— Звычайная. І пагаманіць трэба, чаму ж? Вячэра толькі стыне...

— Пойдзем, Павэлак, — перапыніла Ніна суседку, якая зноў збіралася штосьці тлумачыць. — Дзякуй, Ганька.

— За што... — пачала тая і папярхнулася словам, аціхла.

Ніна ўжо спіной чула, як, патаптаўшыся міг, другі на месцы, пашыбавала Ганька да сваіх весніц, не тое каб пакрыўджаная — зніякавелая нейкая. Не зразумела нічога, пэўна. Ну, ды гэта ў яе пройдзе. А Ніна... Ніна, уважліва зіркнуўшы на мужа, нечага ўстрывожылася: і той Павэлак, і нібыта не той. Згорблены, пастарэлы, ён нават рухаўся нязвыкла запаволена. Быццам нёс непасільны для яго цяжар і баяўся ўпусціць, не ўтрымаць яго.

— Ты не захварэў?

— Я? — здзівіўся і ўзрадаваўся Павэлак Ніжнай увазе. — Чаго гэта мне хварэць сярод лета? Бульбу вось зварыў.

— А-а! Я ў магазін станцыйны заходзіла, колькі ко-

стачак узяла. Ты распалі керагаз, пастаў ваду ў большанькай каструлі, а я пераапрануся. Потым і павячэраем.

Ніна, прачыніўшы дзверы, ступіла ў хату. Паморшчылася, учуўшы цыгарэтны дым, — не вельмі каб накурана было ў хаце, але адчувалася: курыць звычайна Павэлак выходзіў у сенцы, нават зімой. Мо што здарылася? Нешта ён сёння не такі...

— Ат! — паспрабавала сябе супакоіць Ніна. — Гэта я сёння хаджу цэлы дзень узвінчаная. Вось і здаецца немаведама што.

Яна сказала гэта ўголас і азірнулася на дзверы.

«БОГ НЯРОЎНА ДЗЕЛІЦЬ: каму колькі пакладзе — каму шмат, каму меней, каму і ўсяго нічога. Я, я загінуць павінна была б! — сама кулю шукала, а загінула хлапчанё гэта неразумнае. Убачыў мяне ў апошні момант, слёзы на крык пырснулі... Кулямётчык, падла нямецкая, ні пра сваё дзіця — калі нараджаюцца дзеці ў такіх! — ні пра свайго бога не ўспомніў.

Бог... Паскуда ён, бог, калі ёсць ці быў калі: гэткай погані даў на зямлі разрасціся! Б'юць, паляць, жыўцом у зямлю людзей закопваюць, каб ім магілы родныя маткі іх пакапалі!

А хлопчык... хлопчык танюткі быў, нятледзячы што ў ватніку, завялікім для яго. І без шапкі. З шапкай белых-белых валосікаў — зусім як у Сцяпана майго валасы... Думала: уратую. Не ўратавала. Сцяпана любоў мая не ўратавала, хлапчанё гэтае ўратаваць самім жыццём сваім не змагла. Мала, значыцца, майго жыцця. Не вартае яно нічога, відаць.

Вось ляжу, клопатам доктаркі, Дзмітрыеўны, жывая, а чаму — жывая? Навошта? Для каго ці для чаго? І запытацца няма ў каго. Вось хіба толькі ў Дзмітрыеўны! — чуваць: ідзе, управілася з іншымі раненымі...

Стукаюць, злосна папіхнутыя ветрам дзверы, халоднай хваляй (я адчула, як халоднае паветра калыхнулася нада мной) змывае кволы агеньчык газнічкі. У поўнай змроку зямлянцы робіцца ціха. Як у магіле, — усміхаюся ці спрабую ўсміхнуцца я на свае думкі.

— Гэта ты, Дзмітрыеўна?

— Гэта я, Павел Пятровіч. Гэта я, Ніна. Ты толькі не палохайся. Я зараз запальнічку знайду. Я хутка.

Ён калупаецца там, ля дзвярэй, напалоханы, відаць,

і сваёй смеласцю (прыпёрся нанач гледзячы!), і раптоўнай цемрай, і маім ціхім голасам з гэтай цемры. Як з магілы! — усміхаюся я ці спрабую ўсміхнуцца.

— Павел Пятровіч... Бач... як вы пра сябе! З павагай, — заўважаю яму. — Як пра начальніка.

— Якія зараз начальнікі? — буркае ён у адказ і шчоўкае запальнічкай. — Кожны над сваім жыццём не начальнік.

Агеньчык, хіснуўшыся, слаба асвятліў зямлянку. Больш — Пятровіча, ягоны азяблы, пачырванелы ад сівернага ветру твар, нос гарбылём і шчокі, якія ледзь што не паўвальваліся за скулы. На момант мяне працінае жаль — у гэты момант пашкадавала я яго, шкадую: гэтаксама пад смерцю ходзіць. Дзмітрыеўна казала, што ратаваць мяне кінуўся Пятровіч, увесь атрад за сабой павёў... Даўганогі, даўганосы, а сэрца гэткае ж нікудышнае, як і ў мяне! — адганяю я жаль.

Агеньчык набліжаецца. Захінаючы яго ад руху далонню, Павэлак шукае газнічку.

— На акенцы, — падказваю. — Глядзіце, за столь галавой не зачапіцеся!

Момант мінуў, жаль змяняецца звыклай абыякавасцю: чаго мне раптам уздумалася шкадаваць Пятровіча? Выжыве! Гэткія доўга жывуць. Глядзіш, яшчэ і ў начальнікі выйдзе пасля вайны. Гэткія дамагаюцца свайго. Заўсёды дамагаюцца.

Адчуваю, што сваім «гэткія» абражаю госця, але падшукваць больш дакладныя вызначэнні не хачу. Ён жа маіх думак не чуе, а для мяне і так добра. Наведаць вырашыў! А хто яго прасіў?

— Я гэта... — павярнуўся ён да мяне, — я здароўем пацікавіцца прыйшоў. Сам з тыдзень як падняўся...

Нагадвае, мусібыць, што з-за мяне, што, мяне ратуючы, быў паранены. Дык сам жа палез. І не падумаю падзякаваць: дабрадзей, ты ж разумееш, вышукаўся!

— Дзякуй, — кажу. — У адной магіле маглі б ляжаць, калі б крыху інакш павярнулася.

— З жыцця, як і са смерці, нельга смяяцца, Ніна. Ёсць на тое вышэйшая воля.

—Вышэйшая? — перабіваю яго словы, і яго таптанне (топчацца паміж мной і святлом газнічкі, ценем сваім няўклюдным позірк мой змуляўшы!). — Ці не пра бога ўспомнілі, Пятровіч? Дык жа сакратару сельсавец-

каму неяк не да твару гаворку пра бога распачынаць.

— Не пра бога я.

— А пра каго?

— Пра чалавека. Пра тое, што ў кожнага з нас прырода ўклала. Не ўмею я пра гэта...

Згінаючыся, каб не чапляць галавой нізкую столь, Пятровіч топчацца непадалёку ад мяне, засланяючы святло газнічкі, — ганяе палахлівыя цені з кутка ў куток.

— Не ўмею, не ўмею... Чаго ж тады пачынаць? — хачу я схаваць раздражнёнасць. — Прысядзьце вы, Пятровіч! Ажно ў вачах замільгала ўсё ад...

— Я пайду. Я на хвілінку заходзіў, — ступае да дзвярэй той, відаць, учуўшы-такі раздражнёныя ноткі ў маім голасе.

— Вы ж хацелі пра здароўе маё распытаць. Ці мо знікла цікавасць, як зірнулі на мяне, учарнелую ад болю перанесенага?

— Не, не! Што вы, Ніна? — таропка вяртаецца ён, зачапіўшыся ўсё-ткі за столь галавой. — Я прысяду, я...

Чорт яго ведае з гэтым Пятровічам! І так і гэтак зірнеш: недарэка нібыта. І росту непамернага, як для мяне. І нос гарбылём тырчыць — за вярсту нябось відаць. І кудзеркі — над гэткім-то носам! — радзець пачалі, лоб падаўжаючы. Ды і да слоў не вялікі ахвотнік: пачне гаварыць — і блытаецца. А вось жа... Не адступаецца ад мяне. На кулямёт кінуўся, ратуючы. Раней смяялася з яго, а зараз... Зараз то прыкрасць адчуваю, то жаль — немаведама чаго.

— Я пра цябе, Ніна, у доктаркі пытаўся. Сказала: на папраўку пайшло. І сам бачу...

— Вось ужо не думала, — падтрымліваю гаворку, з цікаўнасцю пазіраючы на тое, як ён, нібы склаўшыся ўтрое — калені на ўзроўні твару тарчаць! — прыткнуўся на краёк чурбака непадалёку, — што пры гэткім святле можна штосьці ўбачыць.

— А голас? Ты ж раней размаўляць не хацела...

— Думаеце: зараз хачу?

— Але ж...

— Шкада вас, Пятровіч. Сябе не шкада, а вас чамусьці шкада.

— Шка-да? — крыўдзіцца ён. — За што ж мяне

шкадаваць? Жывы. Рана зацягнулася. Не калека, яшчэ паваюю... За што ж?

— Не ведаю.

Я і сапраўды не ведаю. Пазіраю на яго, павярнуўшы голаў, і нібыта ўсё жыццё ягонае бачу наперадзе: дом, работа, гаспадарка... Ды яшчэ прыпаміны. Ні асаблівых перажыванняў, ні асаблівае радасці. Ат! У мяне і гэтага не будзе. Мо і самога жыцця не будзе.

— Не ведаю, Пятровіч, ці навучацца людзі пасля гэткіх жорсткіх баёў, бясконцых пахаванняў, актаў помсты, калі жылі, дыхалі адным: забіваць! забіваць! — зноў радавацца нейкім простым жыццёвым падзеям і рэчам, простым учынкам і словам. Мо і навучацца. Ды кошт усяго гэтага будзе іншы.

— Ды ўжо ж. Столькі люду гіне.

— І ніхто ніколі гэтага не забудзе. Не нас, не тых, хто склаў і складзе яшчэ да канца калатнечы свае галовы, не! — а таго, што гэткае крохкае чалавечае жыццё. Ёсць яно — а праз міг можа і не быць: куля можа абарваць, чыесьці рукі ў агонь падпіхнуць, чыесьці боты ў яму з трупамі ўтопчуць. Разумееце, пра што я? Пасля вайны ніхто ніколі ўжо не паверыць у вечнасць, у вечнае. У вечнае каханне, у вечнае жыццё.

— Дзіўныя твае словы, Ніна. Жыццё ж застанецца!

— Дык я ж не пра тое, што не застанецца, я — пра адносіны да жыцця жывых: занадта кароткім яго кожны знойдзе, занадта крохкім — чапляцца за яго пачне.

— А хіба сёння няма такіх, што чапляюцца? Боты гэтым паскудам гатовы лізаць, каб жыццё пакінулі. І сёння людзі розняцца. Хто ваюе, хто ад вайны хаваецца, хто на службе сабачай...

— Усё так, Пятровіч. Толькі іншае я мела на ўвазе.

— А-а...

— Вось вы што пасля вайны будзеце рабіць?

— Я? Жыць буду. Радавацца, што зямлю ад нячысцікаў вызвалілі, што выжыў у гэткай вайне.

— Жыць і радавацца, выходзіць? А нянавісць сваю сённяшнюю — куды дзенеце? Памяць сваю — куды? Памяць жа не адпусціць. Не адпускае...

Зноў гэты туман напаўзае! Адчуваю, як адно за адным згасаюць пачуцці і словы. Ледзьве закончыла... Чаго гэта я ў размову кінулася? І з кім? Зайшоў чалавек, параведаў і няхай бы ішоў сабе. Не! — маўчала,

маўчала і выгаварыцца схацела. Напляла немаведама чаго. Пятровіч ажно вочы вылупіў: не чакаў, пэўна, ні гэтулькі ўвагі, ні тэтулькі слоў. Ён жа таксама не надта каб гаваркі. Маўчу — і ён маўчыць. Дзівіцца...

— Ішлі б вы, Пятровіч. Стамілася я.

Ён ускоквае, у апошні момант нахіліўшы голаў, каб не рэзнуцца аб столь, камечыць у руках шапку.

— Набірайся сілы, Ніна. Выздараўлівай.

Моўчкі, абыякавая ўжо і да яго, і да сябе, пазіраю, як ён, згорбіўшыся, ідзе да дзвярэй, спатыкаецца, мармыча штосьці сабе пад нос. Калупаецца нечага ў кішэні ватоўкі і, павярнуўшыся, кладзе штосьці на край ложка. Шархаткое штосьці. Як не цукерку. І, кашлянуўшы ад няёмкасці, праціскаецца ў шчыліну дзвярэй, прытрымлівае іх, каб зноў не задзьмула хваляй паветра маю газнічку. Агеньчык калыхаецца, але не гасне. І, прыўзняўшыся, бачу, што Пятровіч прынёс шакаладку: здабыў жа недзе па гэткім часе! Мо ў немцаў...

Бяру ў рукі лёгкую, амаль бязважкую плітку, паварочваю да святла. Наша! Савецкая!..»

Ніна пазірала на дзверы, быццам чакала: вось зараз яны адчыняцца і ўвойдзе Павэлак, і трэба будзе сказаць яму... Але дзверы былі па-ранейшаму шчыльна зачынены, а з сенцаў чулася пабразгванне посуду, плёсканне вады — Павэлак ставіў на керагаз памытыя і залітыя вадой мясныя костачкі.

Уздыхнуўшы, пачала пераапранацца. Замітусілася па хаце, прыбіраючы апратку, выціраючы стол, збіраючы на стол што-якое да бульбы: хлеб, гуркі, прынесеныя Павэлкам раней... Згадала, што ў склепе на палічцы стаяў жбанок кіслага малака. Кінулася да дзвярэй.

— Я ўжо нясу бульбу, — перапыніў яе імкненне Павэлак, ступаючы цераз парог з міскай у руках.

— Малако кіслае стаіць у склепе... — прапускаючы яго, растлумачыла Ніна. — Я мігам.

— А я і забыўся пра малако.

Ніна матлянулася паўз яго ў сенцы, выскачыла на ганак. Глыбока ўдыхнула прыемна прахалоднае паветра. Упершыню, з незразумелай прыкрасцю, адчувала яна віну перад Павэлкам. Віну не віну — а няёмкасць. Выгляд, твар ягоны бянтэжыў, ці што? Вось і згадка хутчэй падказку нагадвала...

Здрадай Сцяпану, здрадай памяці колькі раз за сён-

няшні дзень яна жыццё сваё называла. Так і ёсць, напэўна. Прозвішча Сцяпанава памяняла. Любоў сваю да яго ўпамінальны — без адзінай слязінкі — плач ператварыла. Ад людзей і ад гадоў абыякавасцю сваёй скрозь адгароджвалася... Усё так. Але быў жа ўсе гэтыя гады і ён, Павэлак. Што з ім яна зрабіла?

Адказу ў Ніны не было. І адмахнуцца ад пытання — сілы ў сабе не знаходзіла. Упершыню, з незразумелай прыкрасцю, усведамляла яна сваю віну перад тым, хто быў ёй мужам, хто, колькі помніць яна сваё гора, быў з ёй побач. Ён, Павэлак, быў побач, а яна часцей папросту не зважала на яго, як не зважаюць на свой цень, на даўно і заведама сваё. Ды і зараз... Не пражыві яна гэтак нязвыкла ўсхваляванa сённяшні дзень, не заўважыла б яна ні ўвагі Павэлка, ні яго згаслага, пацямнелага твару. Не папыталася ж ніколі, чым ён займаецца, пакуль яна ў бальніцы, пра што думае, узіраючыся ў яе, чаму прачынаецца часта ўночы і падоўгу сядзіць ля акна, твар у твар з ноччу, з начной цемрай. Не зараз жа пытацца! Што ён зараз адкажа?

Папраўдзе, Ніна збаялася б папытацца: яна ж і так ведала ўсё, што ён мог сказаць ёй і не скажа. Не скажа, бо не знойдзе слоў, як не знаходзіў іх у маладосці. А і знойдзе — не паверыць ім. Словы скрозь нямнога значылі для Павэлка, няшмат ён іх песціў за сваё жыццё. У хаце гадзінамі, цэлымі днямі вісела, зрэдку лагоймдваючыся ад крокаў ці ад кашлю, асветленая высокімі вокнамі цішыня. І ўначы, калі не працівілася Ніна, скараючыся хутчэй абавязку, чым пачуццю, адно і выціскаў Павэлак з горла, з сэрца, — паўторанае колькі разоў яе імя.

Вось і згадка хутчэй падказку нагадвала...

Няспешна, свядома запавольваючы крокі, вярталася ад склепа Ніна. Слухала вячэрнія перазовы птушак, слухала паніжэлае пасля захаду сонца неба, дзе ледзь чутна, затоена, расло дзіўнае вуркатанне — быццам перуны прачыналіся. Хмары не было, а прадчуванне нечага пагрозлівага, цяжкога, не знікала.

— Хмару, відаць, прыцягне зямля: неба вуркатаць пачынае, — звярнулася яна да Павэлка, ставячы жбанок на стол.

— Пякло дужа, — адзываецца той. — Садзіся еш, бо зусім бульба астыне.

Есці Ніне не хочацца, але яна паслухмяна падсаджваецца да стала, бярэ цёплую яшчэ бульбіну, качае яе ў далоні, адкусвае і кладзе на талерку.

— Малака наліць?

Не чакаючы адказу, бярэ жбанок, размешвае малако і разлівае яго па кубках, прынесеных Павэлкам, напэўна, загадзя.

— Заўтра з мужыкамі на сенакос паеду. Брыгадзір прасіў дапамагчы. Рук не хапае.

— Во! — раптам узрадавалася Ніна. — А я з раніцы збіраюся ў Запярынне. Варвару з бальніцы Косцік ейны забраў. Ды і так... Ля магіл пастаю...

Вусны не слухаюцца: не прывыкла яна з Павэлкам гаварыць на гэткай ноце, ды і не так, і не тое, мусібыць, трэба было зараз гаварыць. Павэлак ніяк не мог зглынуць пражаваную бульбу, ды і ў яе, Ніны, горка стала ў роце — бадзёра пачаўшы, апошнія словы вымаўляла праз сілу.

Цяпер абое маўчалі. Павэлак піў, прыхлёбваючы, як гарачы чай, налітае малако. Ніна пазірала на яго, не пазнаючы — не ведаючы! — спакойных яго рухаў, выцвілых, як абгарэлых, веек над апушчаным, упёртым у стол позіркам, цёмнай, у цёмных кропельках поту, пралысіны над ілбом, рэдкіх, не пасівелых, а нібыта прысыпаных попелам кудзерак — усяго, што засталося ад яго чупрыны. Колькі гадоў, акружаныя цішынёй, удваіх у гэтай хаце, пражылі, а сядзелі адзін супраць другога зусім як чужыя. Ды і чужыя!

Ніна падумала гэта, і на момант ёй стала страшна. Ніхто ж не змушаў яе прыйсці сюды, да Павэлка, — сама прыйшла, сама выбар зрабіла. Што ж яна з сабой і з ім учыніла?

Не ўмеючы справіцца з гэтым раптоўным пачуццём, не ў стане адвесці ад Павэлка позірк, загаварыла:

— Дзмітрыеўна абяцала забегчы сёння. Хацела ўзяць у магазіне гарэлкі, каб было чым сустрэць яе, ды яна забараніла. Нельга было не паслухацца. Яна не піла б, а мы... а мы абыдземся.

Павэлак маўчыць. Па-ранейшаму не падымае ад стала вачэй, па-ранейшаму няспешна, па глытку адхлёбваючы, п'е малако.

— Нейкі ты не такі сёння. Захварэў мо? — спрабуе прабіць яго маўчанне Ніна. — Маўчыш, не пазіраеш...

— Ты гэта... Не зважай, Ніна, — падняў ён нарэшце позірк. — Не хворы я.

Павэлак нават усміхнуцца хацеў, ды ўсмешка ў яго не атрымалася: раскіс побач з Нінай — адно свой боль у грудзях і чуў. І маўчаў, бо баяўся, што вырвецца, прарвецца боль якім-небудзь словам, Ніну напалохае.

— Ну, не хворы, дык і добра, — супакоіла сябе Ніна. — А то Дзмітрыеўна забяжыць, хай бы глянула.

Апошняе яна сказала ўжо з ранейшай абыякавай інтанацыяй: чаго б гэта Дзмітрыеўне глядзець няхворага чалавека? Павэлак, відаць, проста дзьмуўся, бо яна, Ніна, прыпазнілася: у магазін заходзіла, з Ганькай прабалабоніла, а тут яшчэ і пра Запярынне, пра сваю паездку ў Запярынне адразу гаворку завяла. Вось і ўчарнеў ён: не любіў гэтых яе паездак, да памяці, да мёртвага Сцяпана раўнаваў больш, чым раўнаваў бы да каго жывога. Праўда, ні на каго Ніна і не зірнула ніколі, ды гэта ўжо іншае.

— Я... — пачаў быў Павэлак, зноў паспрабаваўшы ўсміхнуцца, і толькі слаба ўзмахнуў рукой. — Ат, нічога!

Ён падняўся, паставіў кубак, зіркнуў на Ніну.

— Пайду ў двор, пакуру. Глядзі, каб не выкіпела ў цябе...

— Я зараз, — абзыўнулася Ніна, праводзячы яго позіркам.

Ціха прычыніліся дзверы. Ціха стала ў хаце. Толькі цікалі ходзікі, паказваючы дзевятую гадзіну вечара, ды гула недзе, за стосам кніжак на падаконні, раз-пораз б'ючыся аб шыбу, муха. Ад гэтай цішыні, ад гэтага ўпартага, цяжкога гудзення Ніне стала не па сабе. Стала душна. Яна падхапілася, падышла да акна, пакасіўшыся на рамку з фотаздымкамі, на яе адбітак у люстэрку, і шырока, наросхліст адчыніла акно. Збіраецца навальніца? Няхай! няхай — з громам, з дажджом — уломіцца навальніца і сюды, у хату, няхай разаб'е, змые са сцен гэтую ліпкую, задушлівую цішыню!

## 27

Высокае цёмнае неба, здавалася, сабранае ў лёгкія складкі, ледзь прыкметна пакалыхвалася над Павэлкам, зрэдку, пасля таго як воддаль, нават не над пасёлкам,

адну ці другую складку гэткую распорваў кароткі бліск, вуркочучы. Вуркатанне гэта нагадвала далёкі смех: быццам рагатне хтосьці там, над ім, і зноў сцішыцца, затоіцца — кароткія бліскі нічога не высвечвалі, апроч мяккіх бела-чорных тканак хмары, занадта высокай, каб з яе мог лінуць дождж. Былі і яшчэ гукі, якія міжволі насцярожвалі і прыроду якіх Павэлак вызначыць не мог: штосьці патрэсквала ўкруг, у самім паветры. Ён спыняўся, услухваўся — было гэтак ціха, што стук сэрца здаваўся не проста гучным, а аглушальным; рабіў крок, другі — зноў пачынала патрэскваць, ледзь чутна пашчоўкваць паветра.

«Д'ябальшчына нейкая! — падумаў ён, адступаючы ад загадкі. — З самага рання сёння мроіцца невядома што. Мабыць, усё проста: занадта сухое паветра, а тут яшчэ навальніцай запахла...» Апошняе слова прымусіла Павэлка глыбей уздыхнуць, прынюхацца. Пахла сухім сенам — вунь яно ляжала, за старой вішняй! — ды яшчэ злёгку дымком, сухім, падобным на той, які нябачна струменіцца над надпаленым бікфордавым шнурам... Так, столькі мастоў, чыгуначнага палатна, будынін розных паўзрываў ён за тры гады барацьбы супраць фашыстаў, тры жыцці не хапіла б, каб адбудаваць усё самому. Ды толькі хто яму дасць гэтыя тры жыцці? Тут адно б дацягнуць...

Пахла добра высахлым сенам, і, удыхаючы з прыемнасцю гэты пах, Павэлак няспешна шнураваў узад-уперад, паміж вішняй і расчыненым хлеўчуком — без вілаў, ахапкамі, згробшы як мага болей, пераносіў сена пад страху: а раптам усё-ткі будзе дождж! Сухія травінкі, трапіўшы за каўнер, пад кашулю, салодка казыталі скуру на спіне, і на грудзях, і не чуў нібыта Павэлак свайго болю — ці адступіўся, нарэшце, ці проста аціх, чакаючы іншага, больш зручнага моманту.

Склаў сена, пастаяў, прысланіўшыся да шула і ўзіраючыся ў далёкія сполахі. Прыгадаў, што хацеў агледзець усю сваю няхітрую гаспадарку: не зрабіў па дню, дык хоць увечары! — і стаў зачыняць хлявчук. Потым прымкнуў старым, без ключа, замком пуню, паправіў на яе сцяне трохі крыва пачэпленую драбіну. Пасунуўся да калодзезя. Зглядзеўшы наросхліст адчыненае акно, памкнуўся быў яго зачыніць, ды падумаў, што гэта, пэўна, Ніна хацела праветрыць пакой, цыгарэтны дым учуўшы, і не запыніўся. Зручней падчапіў калодзежнае

вядро, ступіў на вузкую сцежку, што вяла міма градак, засланых буйным гурочнікам (як не будзе дажджу, заўтра трэба абавязкова паліваць!), абмінуў іх і падышоў да маладзенькай грушы. Бузгучна шавелячы вуснамі, пералічыў будучыя плады: дзевяць, усе на месцы! — першы ж год груша родзіць, Павэлак яшчэ і смаку груш не ведаў...

За грушай, паўз рады яблынь, ляжаў бульбяны палетак — сотак восем дагледжанага, кусцістага бульбоўніку, які пачаў ужо сям-там жоўкнуць, прысыхаць. І — невялікім клінам, уразаючыся ў бульбоўнік і нагадваючы яркую, расквечаную чырвоным хустачку, цвіў мак... Яго насеяла Ніна: яна любіла і яго вялікія, яркія кветкі, якія, раскрываючыся, былі падобны на жывых вогненных матылёў, а адцвітаючы, ператвараліся ў прыгожыя, увянчаныя каронкамі шышакі, і разлапістыя, узорыста павыразаныя яго лісты, з якіх калісьці нават вянок сплятала Ганьчынай меншай дачцэ.

Сёлета мак урадзіў. Высокі, густы, ён расквечанай, яркай нават зараз, пад цёмным навальнічным небам, хустачкай трымцеў ля самых ног. Павэлак не ўтрымаўся, прыгнуўшыся, правёў далоняю па халаднаватых, здавалася, што і вільготных агеньчыках кветак і як апёкся. Адняў руку, паднёс яе да твару, узіраючыся...

«— ПАСЛЯ БЯДЫ КОЖНЫ РАЗУМНЫ, а як прыйдзе бяда, не знаеш, з якога боку падступіцца. Мы ж вось дзяжурым, каб, у выпадку чаго, бяду апярэдзіць, а паспрабуй! Сядзім, сігналу чакаем... А калі гэта было, каб сігнал своечасова прыходзіў?

Гэта Вінцук зноў завёў сваю шарманку: не можа сам-насам са сваімі думкамі (а мо і не думае ні пра што?) і колькі хвілін уседзець — то да аднаго, то да другога прычэпіцца.

— Прылёг бы ты, Вінцук, паспаў...

— Во, во! І так ужо людзі кажуць: спіць як пажарнік. Колькі можна спаць? Колькі, я вас пытаюся?

— Не хочаш спаць, чытай, — пачынаю я злавацца: даў жа бог гэткаму язык без костак!

— Хопіць, што ты слепішся, Пятровіч. Хутка акуляры будзеш вымушаны выпісваць. Папомні маё слова! Во карціна будзе: доўгі, як пажарная каланча, пажарнік з акулярамі на носе!

Ён загадзя шмыгае да дзвярэй, за дзверы. І ў час.

Бо я ўжо запусціў у яго пустой бляшанкай з-пад кансерваў — тым, што трапіла пад руку. Вось халера языкастая! Шафёр, праўда, добры. Інакш даўно б з каманды вылецеў: каго ён толькі не дапякаў! З адной групы ў другую пераходзіў, але трымаўся. Трымалі. Шафёр класны, халера на яго язык. Калымагу нашу лепш як гаспадарку сваю глядзіць.

Дзверы зноў рыпяць. Я ўжо намацваю рукой што цяжэйшае, але ад дзвярэй не даносіцца ні гуку. Падымаю галаў.

— Што там? Пажар?

— Пажар! — выціскае з сябе Вінцук і як вызваляецца ад сваёй раптоўнай скамянеласці. — Гарыць нешта ў тым баку, дзе нафтабаза. Слуп дыму стаіць. Хутчэй! Я — заводзіць...

— Дык жа сігналу не было!

Той не адказвае, знікае ў гаражы. Тузаю Рыгора, памочніка: і сапраўды, які сігнал? Хіба дым — не сігнал?

— Рыгор! Едзем. Штосьці ў тым баку, дзе нафтабаза...

Кідаюся ў гараж да машыны — хай даганяе Рыгор! — натыкаюся на Вінцукова: «Вароты!» і, разам з падаспелым памочнікам, адчыняю, адцягваю цяжкія вароты, на хаду ўскокваю на прыступкі. Мо і марная трывога, ды лепш быць на месцы раней. Мала што! Ды яшчэ побач з нафтабазай.

Вінцук толькі на міг уключыў сірэну: вуліцы ў гэты час — дзесятая гадзіна раніцы — пустыя, машын не відаць, а вось дым, слуп светлага дыму (значыць, не паліва гарыць!) добра бачны. І я злосна думаю: сігналу ж не было! Нават калі і не на нафтабазе пажар, адтуль жа не маглі не заўважыць. Спяць яны там, ці што?

Гарыць хата (ды чаго там: хатка — комін ды два акенцы пад яшчэ саламянай страхой!), хата Пашкі Коршака. Дакладней: Соні ягонай, афіцыянткі з пасялковага рэстарана. Пашка ўжо двойчы сядзеў за хуліганства ці за п'яны дэбош. Я і не памятаю, калі бачыў яго цвярозым. Выпадку гэткага не было на маёй памяці. Два-тры гады не відаць яго зусім у пасёлку, потым зноў, хістаючыся, бадзяецца па станцыі ці аціраецца ля рэстарана. За што яго толькі корміць Соня? Во, і хату, пэўна ж, падпаліў з п'яных воч. Ці здуру... З гэткага — што возьмеш?

Не патушым ужо хату... Патушыць — патушым, ды не хату — галавешкі ад хаты. Занялася ўжо страха, нават дыму няма, адно агонь над страхой ды з акенцаў...

Вінцук зноў уключае на момант сірэну і, становячыся бокам да агню, метраў за дзесяць ад яго, рэзка тармозіць. Цяпер толькі б спрыту хаціла. З боку нафтабазы ўжо завіхаюцца людзі... Зараз, зараз! Мы ўжо гуртам падключаемся да работы, цягнем цяжкія шлангі — Вінцук чакае, каб падключыць ваду, ледзь толькі мы ўправімся.

— Вы на страху, на страху ўсю ваду! Каб агонь, не дай бог, не перакінуўся на нашу тэрыторыю, — мітусіцца ля нас маленькі, лысы (не галава, а макаўка!) пузач, начальнік з нафтабазы нябось. Штосьці я яго не ведаю... Сігналу не маглі падаць своечасова, разявы! І гэта ці тое, што ён увесь час лезе пад руку, раздражняе. Чаго, запытацца, мітусіцца? Пазваніць трэба было раней! Размазня, нічыю маці не памінаючы.

— Ды пайшоў ты... — адаслаў яго, не шкадуючы слоў, і Рыгор: трапіўся-такі і таму пад руку! — Давай, Вінцук. Уключай!

Тузануўся, заскакаў у руках пругкі, яшчэ больш пацяжэлы рукаў шланга. Цяпер ужо не да размоў. На нагах бы ўстаяць. Шалёна вырвалася з брандспойта вада, з шумам, з шыпеннем, падымаючы клубы пары, уразалася ў гушчу агню. І — зніклі ўсе гукі, зніклі з поля зроку людзі і цыстэрны з палівам метраў за пяцьдзесят ад нас. Бачу толькі агонь: ён, агонь, засціле вочы, ён, агонь, — супраць мяне. Мне трэба перамагчы. Агонь — ці я? Я, толькі я! Не рукаў шланга, не брандспойт у руках, а аўтамат... Трэба прайсці. Трэба! Я павінны!

...Хтосьці крычыць? Ці я сам крычу, падаўшыся крыху наперад, туды, дзе пятляе, кружыць, кідаецца між стрэламі дзіця, хлапчук гадоў сямі, ачмурэлы ад страляніны, ад страху, ад узды бленай пад нагамі зямлі. Ён разгублена, па-птушынаму, узмахвае ручанятамі, чапляючыся за прастрэленае з абодвух бакоў паветра, балансіруючы на тонкай, нябачнай нітачцы жыцця, што яшчэ трымціць перад ім, што яшчэ не абарвалася...

Чаму раптам так ціха? Чую, як капае вада. Напружваю слых — хтосьці ціхенька, раз-пораз смаркаючыся,

плача... Адарваўшы позірк ад чорных, абгарэлых сцен, дзе сям-там яшчэ бліскае пераможаны агонь, бачу Рыгора — ён уцірае твар, адпусціўшы шланг, цяпер пусты і бясформенны, і — непадалёку — хлопчыка гадоў сямі-васьмі. Мурзаты, са слядамі сажы на шчоках, якія ён час ад часу трэ кулачкамі, той пазірае не на папялішча, а кудысьці ўбок, паўз мяне. Міжволі, скараючыся бездапаможна-горкаму дзіцячаму позірку, у якім стаяць слёзы, паварочваюся. Пашка! Вось у чым справа...

Бацька, нічыю маці не памінаючы! — сядзіць на зямлі, п'яна звесіўшы голаў, зрэдку ўскідвае тупы, абвіслы твар, лыпаючы сляпымі ад выпітай гарэлкі вочкамі (надраўся, паскуда!) і, канечне ж, не ўсведамляючы, што тут адбываецца, што адбылося. З п'яных воч і хату, мусіць, падпаліў.

— Во, падла! — ладышоў Вінцук. — Заліў вочы і дзіця без хаты пакінуў... Страляць гэткіх трэба! Ды адпусці ты шланг, Пятровіч! Пальцы, зірні, спалатнелі, сціскаючы...

Злосна зіркаю на яго, але кладу брандспойт на зямлю, ціха расціраю пальцы.

— Хлопца шкада. Нават плача бедалага не па-дзіцячы, — далучаецца Рыгор. — Скручваць будзем сваю гаспадарку, ці як?

Ніхто яму не адказвае. Нават Вінцуку як зарвала: сапе побач і — каб слоўка! Да нас ідуць нафтабазаўскія, сярод іх і некалькі жанок. Абыякава гляджу, як яны набліжаюцца, а бачу — спіной бачу! — мурзатага, са слядамі сажы на шчоках, малога, яго бездапаможна-горкі пагляд, які засцілаюць слёзы, яго дрогкія вусны, з якіх так і не зляцела ніводнага разу дзіцячае: «Мама!» — ён пазіраў паўз мяне, на п'янага асалавела-тупога бацьку...»

Калі гэта было? Гадоў пяць... Шэсць, мусібыць. Так, шэсць. Соня з малым з'ехала. Да бацькоў падалася, кутка для сына шукаць, а мо і абароны ад Пашкі... Той з месяц яшчэ цягаўся па пасёлку, потым знік. Мо зноў пасадзілі. З гэткага — што возьмеш?

Павэлак не асабліва задумваўся над Пашкавым лёсам: сам за сябе чалавек вырашыў і здохне недзе пад плотам, ніхто не пашкадуе. Хлопчыка было шкада. Сажа тая са шчок адмылася, а ў душы — чорны рубец, пэўна, застаўся.

Чаму ён нечакана ўспомніў даўні выпадак, Павэлак і сам не ведаў. Таму, што доўга на мак дзівіўся, або таму, што здалося: руку апёк аб гарачыя кветкі. А мо і з іншай прычыны. Вось жа і ён не быў бацькам свайму сыну. Не той выпадак, безумоўна. А вынік — той жа. Без бацькі вырас сын, а цяпер ужо і не ўведае ніколі, хто быў яго бацька, чаму не аб'явіўся за гэтулькі год ніводнага разу. Не ўведае... Дзіка лёс распарадзіўся, не па-людску. Бацька не павінен свайго сына перажыць. Не па-людску гэта і не па-божаску.

Быццам голас чыйсьці ўсё гэта цвердзіў Павэлку: сам ён зараз ні пра што не думаў. Пазіраў на паднесеную да твару руку, злёгку дзьмуў на яе, студзячы. Буйна цвіў мак, густа. Праўда, згаслі, астылі кветкі ў паўзмроку. Толькі калі бліскала неба, цеснячы, папіхаючы хмару ўбок і ўгору, далей ад гэтай шарай гадзіны, на міг трывожна ўспыхвалі макі, на міг трывожна асвятляўся Павэлкаў твар, і зноў калыхаўся паўзмрок.

Павэлку раптам захацелася вярнуцца ў хату, убачыць Ніну. Здалося: калі б вось зараз, не адкладваючы ні на хвіліну, ён убачыў яе, то зразумеў бы, нарэшце, дзеля чаго жыве, дзеля чаго жыў усе гэтыя гады. Не дзеля ж прыпамінаў, якімі мучыўся сёння зранку, не дзеля гэтай шарай гадзіны, у якой хавае свой цяжкі душэўны боль. Так, так, нічога там, у грудзях, не магло балець, апроч душы. Душа і балела. І гэты душэўны боль ён, Павэлак, не заўважаў больш, быццам там, дзе быў боль, цяпер было пуста. Пуста і холадна. І надалей — заўсёды! — будзе пуста і холадна. Ён быў чамусьці ўпэўнены ў гэтым, і дзіўна: гэта ўпэўненасць яго не палохала.

Колькі ні адышоўся ад хаты, а крокаў дваццаць адышоўся. Вярнуцца, дайсці назад, да сенцаў, дзе Ніна гатавала, — хвіліны не хапіла б. Яна мінула ўжо, тая хвіліна, калі Павэлку рупіла неадкладна вярнуцца, убачыць Ніну. Ды і што б ён зразумеў больш таго, што разумеў, ведаў з самага пачатку? Ён жа ведаў, на чым спатыкнуўся калісьці, — на жаданні даказаць самому сабе і заадно цэламу свету, што варты шчасця, што варты самага вялікага на зямлі шчасця. А што яно ўявілася яму жанчынай, што толькі Ніну жадаў як шчасце сваё, — гэта ўжо не яго воля. Нічога ён тут не мог зрабіць. І ён, і любы — не мог бы тут нічога зрабіць. Ці —

дамагчыся свайго, ці — памерці. І ўвесь выбар. Вось і выбірай!

Ён, Павэлак, свайго дамогся. А чаго свайго — шчасця, або чаго іншага, або нават і няшчасця! — няхай людзі разважаюць. Няшчасным ён сябе ніколі не адчуваў. Нават калі горыччу душыўся, усё роўна не адчуваў. У кожнага шчасця свой смак. У ягонага — смак горычы, мусібыць... Які ўжо ёсць! А толькі б нічога ў сваім жыцці ён не мяняў. Чаго хацеў, таго дамогся. І не яго віна, што не здолеў лепш распарадзіцца сваім шчасцем: тое, што складала ўсё яго жыццё — чым хочаш гэта назаві! — не складала Ніпінага.

Не ўмеў Павэлак пра гэта ні гаварыць, ні думаць. Пра гэта... У кнігах усё пра любоў пішуць. Гэта — можна назваць і любоўю. Ды справа ж не ў назве, не ў слове. Выбару ў Павэлка не было. Ці — дамагчыся свайго, ці — памерці. І любоў у тым. Калі без слоў гэта не разумець, дык і словы нічога не дададуць. Балабонь ён пра ўсё, што адчувае, Ніне дзень і ноч, што б памянялася? Словы — словы і нараджаюць. Галаву імі задурыць, канечне, можна, а душу не збудзіш.

Хоць чорт іх ведае, жанчын! Мо для іх словы важней? Ды не. І Фросі ж ён, магчыма, і двух дзесяткаў слоў не сказаў за іх знаёмства, і Марфа калісьці не да слова ягонага прыляпілася... Не! Словы — словы і нараджаюць. Што ён, Павэлак, слоў ад Ніны чакаў?

Чакаў... Ён і зараз усё яшчэ чакаў нейкіх змен у сваім жыцці ці ў адносінах Ніны да яго і да іх сумеснага жыцця. Жыў і жыве гэтым чаканнем, калі разабрацца. Але ніхто не будзе ні ў чым разбірацца. І яму, Павэлку, не трэба. Іншыя іншым жывуць. А ён — гэтым. І не можа сказаць, што нешчаслівы ён.

Думай не думай, а і ў прыродзе гэтак жа, як у людзей. Вось і гэты вечар узяць. Сасмягла зямля, дажджу чакаючы. А хмара як прыплыла, так і адплывае, маланкамі паблісквагочы. Каб кропля ўпала! Зямля ж чакае. І заўтра чакаць будзе — у ёй, у зямлі, новая, невядомая сіла знойдзецца, каб чакаць і дачакацца. Быць не можа, каб не дачакалася. Чалавек — меншы ад зямлі: здаецца, і не хопіць сілы, не знойдзецца... Але тады ўжо ўсяму канец. І чаканню. І жыццю.

Павэлак абвёў вачыма агарод, два рады яблынь — усё было аднолькава цёмнае: і яблыневае лісце, і лісце бульбоўніку, і кветкі густа насеянага Нінай маку. Фар-

бы згаслі, як гасла неба, адкуль не чуваць ужо было пагрозлівага вуркатання. Зрэдку — недзе задужа далёка — паблісквала, але перуны так і не прачнуліся: у хмары не было той сілы, што збудзіла б іх. Навальніца адкочвалася далей, на захад, — менавіта там, у тым баку, і паблісквала, а над пасёлкам зноў вісела задушлівая цішыня.

Цішыня — гэта толькі так здавалася. Бо, перастаўшы ўслухвацца, перш у неба, а потым і ў свае думкі, Павэлак чуў і пастукванне колаў чарговага цягніка, які мчаўся паўз пасёлак на поўнач, да Мінска, і рыканне Ганьчынай каровы, Зоркі, — прыспешвала, мусібыць, рыканнем Ганьку, гаспадыню, што бавілася, выціраючы падойнік, і нават прыглушаную адлегласцю музыку з рэпрадуктара, які вісеў за скверам, ля рэстарана... Цішыня — гэта так здавалася. Не грымела, не загрымела зверху — вось і цішыня. Неўзабаве — на ўсход ад пагорка, ад Павэлкавага гарода, з'явяцца першыя зоркі.

Пра зоркі ён уздумаў мімаходзь: сцямнела — значыць, і зоркі павінны з'явіцца. А яму ўжо час рухацца ў двор. Агледзеў агарод, як хацеў, — хоць што тут аглядаць, ад калодзезя б усё ўгледзеў! — трэба было ісці. Ніна казала: Дзмітрыеўна абяцала зайсці. Была ж, пэўна, да яго, да Павэлка, патрэба. З Нінай жа бачылася — дзень у дзень на вачах адна ў другой.

Ён паціху пасунуўся агародам назад, пільна ўзіраючыся пад ногі — каб не зламаць, не растаптаць часам якую жывую расліну. І так без дажджу прысыхаць усё пачынае, хоць бярыся і па дню ўвесь агарод палівай!

Аціхлы, супакоены, з прыемнасцю адчуваючы дотыкі яблыневага лісця — ішоў жа паўз самыя дрэвы! — Павэлак няспешна набліжаўся да хаты, да яркай палоскі святла, што з сенцаў, праз ганак, падала на дарожку. Было адчуванне, што зроблена яшчэ адна справа. Яшчэ адна важная справа...

28

Выключыўшы керагаз, Ніна святло гасіць не стала — Дзмітрыеўна павінна была зайсці! Выйшла на ганак і апусцілася на прыступку. Не тое каб стамілася, — размарыла душнае цяпло. Ды і навальніца, навальнічная хмара, якая круцілася над самым пасёлкам, адступіла-

ся, так і не прынёсшы дажджу, прахалоды, — пабліскавала, пастрашыла і адступілася. І цяпер здавалася, што гарачыня і не спадала. Ветрык так і не набраў сілы. сціх — млявасць, якая ў хуткім часе пяройдзе ў сон. ахінала ўсё вакол. Млява прыслухвалася яна да звыклых навакольных гукаў і чакала. Дзмітрыеўну чакала. І Павэлка. Пайшоў у гарод, а што там рабіць цёмначы?

Магчыма, Ніна і гукнула б яго, калі б ведала, што Павэлак гэтак, як яна, дзівіцца на неба, якое зрэдку адкідваецца кудысьці ўгору, вышэй позірку, кароткімі халоднымі бліскамі. Што, як і яна, услухваецца ён у наўколле, каб не слухаць, не чуць сваіх думак. Магчыма, і гукнула б. Ды мала куды мог адысціся агародамі Павэлак! — не сказаў жа нічога. Прыйдзе. Куды ён дзенецца. Абое яны звыкліся за гэтыя гады з тым, што часцей былі — жылі — паасобку. Яшчэ ўчора і ў думках бы не прамільгнула, што трэба пагукаць мужа...

Учора... Сёння... Нібыта цэлае жыццё паміж імі прайшло, прамінула — гэтулькі перадумана і перажыта ёй. Для каго іншага і дзіўнага б у тым не было нічога: жыццё якраз і складаецца з гэткіх вось кавалачкаў — у кожным і для былога, і для будучага месца знаходзіцца. Бо што ж іншае, як не думкі, як не прыпаміны і спадзяванні, фарміруюць усё астатняе, усё рэальнае: учынкі, дзеянні, справы? Колькі ні адмахвайся, ні адбівайся ад сваіх думак, нікуды ад іх не дзенешся: усюды знаходзяць. Толькі надарыцца хвіліна адпачынку, толькі спадзе напружанне — думкі ўжо з чалавекам. Тут як тут. Ужо ацэньваюць зробленае ці толькі пажаданае, ужо распараджаюцца.

Каго б іншага, больш звыклага да ўнутраных ацэнак, да разважанняў, гэта ніколькі б не здзівіла. Ніна ж часцей не разважала, а проста ўзіралася ў прыгаданы малюнак з даўно мінулага, падоўгу ўзіралася, да кругоў уваччу, ніяк не суадносячы яго з тым, што рабіла, чым жыла ў гэты момант ці ў гэты дзень. Тым, мінулым, і жыла б, калі б льга было. А сёння... Сёння два Сцяпанавы пісьмы нечакана спалучылі, знітавалі розныя прамежкі часу, бы не было паміж імі дваццаці гадоў тужлівага маўчання і адчужанасці, бы толькі зараз ачуняла Ніна пасля сваёй хваробы, пасля свайго гора — і жыццё ляжала перад ёй адзіным вялізным кавалкам, жаданае і зразумелае, і жыць ёй было і жыць у ім.

Яна яшчэ не знайшла, як распарадзіцца гэтым пачуццём, ды і да самога пачуцця аднеслася насцярожана, з недаверам: нельга ж вось так, адразу, змяніцца! Нават папікала сябе ў душы: чаму радавалася? Пісьмам? Дзіўнаму вызваленню ад тужлівай абыякавасці? Планам, крыху смешным ужо ў яе ўзросце? Сваёй цікавасці да гэтых планаў? Чаму? Ну, ды ўсё з цягам часу праясніцца, усяму знойдзецца тлумачэнне. Над гэтым не варта было надта мудраваць.

Ніна і не мудравала. Ведала: усё паціху вырашыцца. І з працай. І з вучобай. І з Паўэлкам...

«— ЗА ГРОШЫ І БОГА КУПІШ. Ведама ж, работа: з-пад хворых пасудзіны збіраць і выносіць! Ды яшчэ ледзь не задарма, — у які ўжо раз абураецца Ганька. — Ішла б у саўгас. І плацяць зараз няблага, і паветра — не раўняючы з бальнічным. А то як і не баба: скура ды косць...

Чаго, запытацца, разышлася? Не ўсё адно, дзе рабіць. Ганьцы на свежым паветры лепей, а я з бальніцай звыклася. Не кідаць жа Дзмітрыеўну з той прычыны, што падыхаць вальней уздумалася!

— Пры чым тут мае косткі, Ганька? — кажу. — Усё адно.

— Кінь, суседка. Сама кажаш: сэрца па начах баліць. Чаго, думаеш, баліць? Наглядзішся, наслухаешся там...

— Дык хварэюць жа людзі, дапамогі нейкай чакаюць!

— Да-па-могі! А ты што — урач? Ты — чым дапамагаеш? Тым, што пыл лішні раз вытраш ці падлогу да зіхцення адмыеш?

— Я вось думаю, — спрабую перавесці гаворку ў іншы бок, — няма ў цябе злосці, Ганька. Ні да мяне, ні да каго. А ты ўсё злосць у сабе шукаеш, злоснае слоўка, каб укалоць як. Навошта?

Яна зіркае на мяне, вырашаючы, мусібыць, ці варта прымаць пытанне ўсур'ёз. Прымае. Бо перастае махаць рукамі і, счакаўшы які момант, адводзіць позірк.

— Добранькіх зашмат развялося. Вось ты, скажам, — марудна падшуквае яна словы. — Ты ж за два іх шкрабеш і чысціш у сваёй Дзмітрыеўны. Трэба — медсястру замяняеш. Калі ласка...

— Ці ж гэта так дрэнна? Я думаю...

— Ты думаеш! Ды нічога ты не думаеш. Ты працуеш, а двое за тваёй спіной усміхаюцца: рачкуй, маўляў, рачкуй, а мы паглядзім, падзівімся.

У мяне ажно захаланула ўсё ўсярэдзіне.

— Хто — мы? Апамятайся, Ганька! Пра каго ты кажаш?

— Не пра Дзмітрыеўну тваю, не бойся. Пра яе грэх было б што сказаць благое каму. У мяне язык не павярнуўся б: сына мне ўратавала, ты ж ведаеш!

— Вось бачыш, — абдымаю я яе за плечы.

Яна мякка адхінаецца.

— Чакай, я недаказала. А Дуня Шлапакова? А Тамарка, медсястра? Чула б, што людзі пра іх расказваюць, што яны самі пра бальніцу ды пра цябе з доктаркай кажуць! Ненармальныя, кажуць, абедзве. Бо не было, кажуць, ніколі такога, каб доктарка з прыбіральшчыцай, з нянечкай, сяброўства вадзіла. Чуеш? А ты рачкуеш і за сябе, і за Дуню, замест касалапай Тамаркі ўколы хворым робіш. Вось і смяюцца.

— Ты ж не смяешся.

— Я? — не зразумела напачатку Ганька. — Не пра мяне гамонка, Ніна. Ці ж я не бачу?

— Вось і іншыя бачаць. Бачаць, што хворым людзям дапамагаю, чым магу, а не Дуні Шлапаковай і Тамарцы.

Я ўсміхваюся на Ганьчыну раптоўную разгубленасць: няйначай, думае зараз пра мяне, як Дуня: ненармальная. А што ж тут ненармальнага: не зважаць на чыюсьці несумленнасць або злосць? Смяюцца — і няхай смяюцца. Не мяне ж, іх не любяць хворыя — значыць, мая праўда, а не іхняя. А лішняе што зрабіла ў бальніцы, ну дык і што? Рукі ж не паадсыхалі.

— Добранькіх зашмат развялося, — бурчыць Ганька.

Не адказваю. Зноў абдымаю яе за плечы, прыхінаюся да яе, да яе гарачага мяккага пляча. Маўчу. І яна маўчыць. Думаем кожная пра сваё. А мо пра адно і тое ж: пра Дзмітрыеўну. Бо я думаю пра Дзмітрыеўну, спрабуючы раскласці ў думках пачутае. Доктарка з прыбіральшчыцай... Неяк дасюль і ў галаў не прыходзіла як-небудзь называць нашы адносіны. Склаліся як склаліся. Яна, Дзмітрыеўна, дужэйшая. Яна яшчэ ў атрадзе мой боль чужым болем лячыла — прымушала ўслухвацца ў чужое, а не ў сваё, каб адчуць, што некаму можа быць горш, чым мне, што некаму больш ба-

ліць. Адчуць і, адчуўшы, зрабіць штосьці — сказаць, як не зрабіць, хоць словам дапамагчы, цяплом яго... Ці было тады тое цяпло ўва мне? А вось жа ўслухвалася, вучылася аблягчаць пакуты, штосьці казала параненым хлопцам, штосьці казала, калі пэўна ведала, што нічым ужо не ўратаваць...

— Знаеш, Ганька, я не змагла б кінуць сваю працу. Раней думала: паедзе Дзмітрыеўна ў Маскву — і я пайду з бальніцы. Не! Усё роўна засталася б. Перад чужым — большым — болем за свой сорамна. Я толькі ў бальніцы на сябе забываюся.

— Як гэта: на сябе забываешся? — закудахтала тая, зноў губляючы спакой. — Як гэта можна не помніць, што ты жанчына, што ты — маладая прыгожая жанчына? Як гэта за чужое — за чужы боль — чапляцца? Як гэта — не хацець жыць лепей?

— Лепей? Лепей, чым хто? Чым Дуня Шлапакова? Чым Тамарка? Лепей, чым ты, Ганька?

— Ты, дальбог, чыста дзіцё малое, — спрабуе супакоіцца, хаваючы пяшчотныя ноткі ў голасе за гучнымі, гучна вымаўленымі словамі Ганька. — З табой жа не пагамоніш, як з бабай: і плёткі цябе не закранаюць, і мужыкі не цікавяць, і на суседку, гэта на мяне значыць, ты глядзіш, як на старую саву.

— Ага. Толькі не як на саву, а як на сароку, — падтрымліваю я яе гульню, — як на сароку-белабоку, у якой пад крылом штораз адагрэцца спяшаюся, ледзь хвілінка вольная выпадзе.

— Чаму ж да сваёй Дзмітрыеўны не бяжыш?

О, гульня, мусібыць, скончылася, не пачаўшыся. Гэта ўжо на гульню не падобна. Шчакой, прытуленай да яе пляча, адчуваю, як наструнілася Ганька: знайдзі, маўляў, адказ, адкажы на гэткае!

— Чаму? — паўтараю, расцягваючы паўзу. — Адным словам не адкажаш.

Ганька ўзрушана маўчыць, знарок адвярнуўшыся, і я мушу прадоўжыць свае тлумачэнні.

— Папраўдзе, дык і не ведаю. Мо таму, як Дуня тлумачыць, што яна, Дзмітрыеўна, — доктарка, а я нянечка. А што? Можа быць. Як перагародка між намі. Нябачная, а ўсё ж перагародка. Не так проста пераскочыць. Не з маімі кароткімі нагамі.

Жарт не атрымаўся: у Ганькі ажно плечы сцепануліся.

— Во, во! Пачні за Дунькай паўтараць, ужо ж парадуеш яе!

— Ды гэта я хачу цябе апярэдзіць, твае словы. Ну, чаго ты захадзілася? Чаго ты вечна Дзмітрыеўну памінаеш? Вайна нас звязвае, гора маё ды яе, што ў розных кутках, у розных магілах пахавалі мы. Ды яшчэ жыццё, якое прымусіла яна мяне прызнаць і прыняць, ад смерці мяне ўратаваўшы. Двойчы ўратаваўшы. Вось я і думаю, што маё жыццё ёй належыць больш, чым мне.

Тлумачу спакойна, калі не сказаць абыякава. Столькі раз даводзіла гэта сабе — не магла ж я не давесці гэтага — даўно, раней! — і Ганьцы. Ажно не! — зноў павярнула: «Чаму да сваёй Дзмітрыеўны не бяжыш?» Якая яна мая? Маліцца б на яе, калі б наогул умела і магла маліцца, я яшчэ б магла: калі хто і заслугоўваў таго ўсім сваім жыццём, і сваёй працай, дык Дзмітрыеўна. А прыйсці да яе з азяблымі рукамі, з душой сваёй азяблай — не магла. Да той, хто для цябе вышэй, чым любы бог, з гэтым не прыйдзеш. Ат! Не верыць ніхто сёння ні ў бога, ні ў малітву. Дзмітрыеўна першая б на смех падняла. А ўжо Ганьцы пра гэта лепш і не заікацца: праходу потым не дасць. Усё ёрзае на лаўцы, не задаволеная маім прызнаннем.

— Жыццё, жыццё... Ты пра боль у сэрцы ёй казала?

— Слухала Дзмітрыеўна. Нічога не знайшла.

— Значыць, нічога і няма, — з палёгкай уздыхае Ганька. — Інакш знайшла б.

Яна мякка пагладжвае маю руку, што ляжыць у яе на калене, і думае, зацята думае аб нечым хвіліну, другую. Пакасіўшыся, бачу яе шырокі, бульбаваты нос і край падбародка, круглы, з невялікай зазубрынкай пасярэдзіне. Навошта штосьці тлумачыць? Навошта згадваць рэзкі (быццам шкло разбіваецца!) смех цыбатай Дуні ці Тамарку, у якой не рукі, па словах хворых, а драўляшкі? Навошта, калі ёсць вось гэта летняя вячэрняя хвіліна, калі побач з Ганькай адчуваю я сябе той, ранейшай, яшчэ і не дарослай нават?..

— Калі б не было вайны, ты б на доктарку вывучылася, праўда?

Дык вось яна аб чым думае, мая Ганька! Калі б не было вайны... Была вайна, была! У гэтым і ўся праўда.

— Ты што, заснула? Не чуеш?

— Чую, Ганька. Толькі да вайны я не доктаркай хацела стаць.

— А кім? — усміхаецца. — Артысткай, як мая Светка?

— Можа, і артысткай. Хоць не дужа мы ведалі тады, што гэта такое — артыстка. Ганна Піліпаўна, настаўніца, расказвала пра тэатр. Мы нават «Пінскую шляхту» хацелі паставіць, спектакль такі зрабіць па кнізе вядомай.

— І не зрабілі?

— Не паспелі. Забылася ўжо ўсё. Даўно было. Каб ты не нагадала...

— А чаго там? Ты ж — не я. З гэткіх, як ты, прыгожых, якраз і выходзяць артысткі. Калі б не вайна...

— Тое і яно, — змрачнею я, адчуваючы, што хвіліны супакоенасці, размякчанасці душэўнай мінаюць: я ўжо і ад Ганьчынага пляча адхінулася, і рукі мае звыкла счэплены адна з адной, і ў голасе з'явілася ранейшая абыякавасць.

Ганька таксама гэта адчувае, таму што раптам насцярожваецца, натапырваецца, мяккасць яе зноў абарочваецца разгубленасцю: ніяк яна не звыкнецца з тым, з чым даўно звыклася я. Ганьцы здаецца, што зусім неабавязкова ў сваю шкарлупіну лезці (гэта яна так называе маю хваробу), калі яна побач са мной, калі яна можа што-якое сказаць, расказаць, ды і я толькі што з ёй гаманіла... Гаманіла. Ды гэта хвіліна гэткая выдалася. Было, і маўчала ля яе пляча. Было, і зусім па тыдню не падыходзіла: не тое што патрэбы не было, сілы ў сабе не знаходзіла. Ды гэта не растлумачыш.

Мне і самой непрыемна. Нітачка гаворкі згублена, шукаць гэтую нітачку я, канечне, не буду. Марна. Што сказалася — сказалася. Словы, усе да аднаго, адступіліся ад мяне, ды і я сярод іх не пазнаю знаёмых. Ганькі шкада, пакутна шукае нейкай зачэпкі, сцэпкі — нават лоб моршчыць ад натугі.

— Я пайду, Ганька?

— Чакай! Нешта я яшчэ хацела... Вечар дужа цёплы. У гэткія вечары раней жанкі песні пелі. Запяюць, запяюць жанкі ў розных канцах Яблынеўкі, ажно зоркі ўгары калыхаюцца ад песні. Цяпер усё больш маўчаць...

Я маўчу. Я нават не ўслухваюся больш у тое, што кажа Ганька. Адно слова запала ў памяць: зоркі... Ды і то таму, што пазіраю я не на суседку, не на свае счэ-

пленыя рукі на каленях, а ўгору — на цёмнае неба, дзе, рассейваючы халоднае святло, калыхаюцца зоркі. Яны такія халодныя, такія чужыя, што ніяк не закранаюць душы — не змушаюць мяне аб нечым шкадаваць, аб нечым згадваць.

Што-о за во-о-осень доўгая-я...
Гэй! Што за восень доўгая,
Ночка цёмная, кароткая-я...

Ганька запела? Чаго гэта яна? І песню нейкую незнаёмую вядзе, усё запавольваючы мелодыю... Ціха пяе, ледзь чутна, здаецца. Словы сумна, тужліва перагукаюцца, паўтараючы адно другое, — і ад іх не атрэсціся, не абараніцца.

У-устань, мі-і-ілы, не ляжы-ы!
Гэй! Устань, мілы, не ляжы,
Шлях-дарогу пакажы-ы...

Ад слоў песні не атрэсціся, не абараніцца...»

— Што гэта ты, галубок, мармычаш сабе пад нос? Грамчэй трэба. Каб мелодыю льга было распазнаць.

— Га?

Ніна адарвала позірк ад высокага цёмнага неба, дзе, рассейваючы халоднае святло, калыхаліся першыя зоркі, з недаўменнем зіркнула на знаёмую постаць: як гэта Дзмітрыеўна так нячутна падышла? І крокаў не было чуваць, і весніцы не стукнулі... Мабыць, задумалася, не пачула ні крокаў, ні стуку весніц.

— Праходзь, Дзмітрыеўна, — падхапілася яна з прыступкі. — У хату праходзь. Я зараз...

— Ніна, галубок, не трэба мітусіцца. Ну, навошта — у хату? Я ж на мінутку зазірнула. Во тут, на ганку, і прысяду ля цябе.

— Як гэта — на ганку? Не па-людску неяк. Раз у год надарыцца табе прыйсці — і ў хату нават не зойдзеш? Павячэрала б.

— Вячэрала я ўжо, галубок. Дзякуй. І крыўды тут ніякай, што на ганку з табой пасяджу: грэх жа ў гэткі вечар у хаце хавацца. Колькі ішла вуліцай — людзі на лавачках сядзяць. Гамоняць. Кураць. Маўчаць. Вось толькі песень не чуваць.

— Якія сёння песні? Радыё за ўсіх пяе.

— Для ўсіх, а не за ўсіх. Чуеш розніцу? Ды ты сядай, сядай! Паўлка што, дома няма?

— Ды дома, — прымасцілася Ніна побач з Дзмітрыеўнай. — Адышоўся на хвіліну. Гукнуць мо?

— Прыйдзе. Галасы нашы ўчуе і прыйдзе.

— І то праўда. Я ж казала яму...

— Пра вучобу казала? Пра курсы?

— Пра вучобу не казала.

— Што так? Не надумалася? Ці збаялася? Мяне чакала... Справа ж вырашаная, галубок. Надарылася магчымасць, трэба выкарыстаць. Так і Павэлку твайму скажу. Ён у цябе мужык разумны і мяне зразумее.

— Ён зразумее, — ціха пацвердзіла Ніна. — Толькі не кажы ты яму сёння нічога, Дзмітрыеўна. Як-небудзь іншым разам. Мо сама я... Потым, як вярнуся... Як з Запярыння прыеду.

— Глядзі, галубок. Час яшчэ ёсць. Можна і адкласці гаворку на дзень, другі, — кранулася Ніінай рукі Дзмітрыеўна. — Толькі я не разумею...

— І я мала што разумею. Не такі ён нейкі сёння. Ці мо я ўпершыню ўгледзелася ў яго. Пачакаем трохі з маімі курсамі, добра? Мо я сама... Потым...

— Як знаеш, Ніна.

Яны змоўклі. Бы словы ў абедзвюх раптам скончыліся. Ніна, падняўшы вочы, узіралася ў цьмяныя зоркі, у іх невыразнае яшчэ мігценне (таму і здавалася, што яны рассейвалі, сеялі святло) і думала пра заўтрашнюю дарогу, пра сустрэчу з вёскай і з тымі, каго ведала ў ёй і ніколі не забывала, нават мёртвых не забывала. Дзмітрыеўна цвёрда, па-мужчынску, сціскала Ніну далонь і нібыта ўслухвалася ў штосьці. Яна і ўслухвалася! У галасы, у невыразныя словы, што даносіліся сюды з вуліцы, ад Пахомавых варот, ля якіх была ўкапана шырокая, са спінкай, лаўка. Ці ў шолах — у чыесьці ціхія, няўпэўненыя крокі ад Ніінага калодзезя, аднекуль са змроку.

— Павэлак, мусібыць, ідзе, — адазвалася на рух Дзмітрыеўны (тая міжволі павярнулася на шолах) Ніна. — Недзе ж хадзіў цёмначы.

— Добры вечар... Вера Дзмітрыеўна, — падзяліў вітанне паўзай на два кавалкі Павэлак, ступаючы ў палоску святла. — Што гэта ты, Ніна, госцю на ганку трымаеш? Пойдземце ў хату.

— Дзякуй, Павел Пятровіч. Я ж на мінутку, — паднялася Дзмітрыеўна. — Хацела дамовіцца з вамі наконт справы адной невялікай, ды Ніна не раіць. Кажа: заняты вы дужа. Дык іншым разам.

Яна папраравіла акуляры, усміхнулася, абярнуўшыся

да Ніны, якая па-ранейшаму сядзела, сашчапіўшы на каленях рукі.

— Навошта ж адкладваць? — таптаўся ў кроку ад яе Павэлак. — Мо толькі калі спяшаешся...

— Спяшаюся, галубок, — падхапіла тая. Вы ўжо прабачце, што я так па-свойску да вас, Павел Пятровіч. Спяшаюся. Вы трохі забавіліся... Іншым разам. Тым больш што справа церпіць. Ты правядзеш мяне хоць бы да варот, Ніна?

Ніна ўсхапілася. Нават пахіснулася ад занадта рэзкага руху.

— Як жа! Як жа! Канечне, правяду.

Павэлак моўчкі адступіў убок, у паўзмрок, даючы ім дарогу, і Ніна павярнулася да яго.

— Капуста зварылася. Ты б паеў што, Павэлак.

— Паешце, абавязкова паешце, Павел Пятровіч. Ніна, відаць, не так часта балуе вас гарачай стравай: гэта за ёй здаўна вадзілася. Усяго вам добрага. Я днямі зайду.

— Да свідання, — буркнуў Павэлак і, каб не пакрыўдзіць доктарку (чаго, запытацца, прыходзіла?), вяла дадаў: — Будзем рады.

Ніне нечакана стала шкада яго: які высокі, худы, няўклюдны быў Павэлак побач з імі, нават у паўзмроку было відаць! Але яна нічога больш не сказала, заспяшалася ўслед за Дзмітрыеўнай — да весніц і на вуліцу.

## 29

Павэлак стаяў нейкі час нерухома, пазіраючы прама перад сабой, на цёмны, таямніча акрэслены зіхоткім зоркавым святлом абрыс вішні, — і не пазнаваў старое дрэва. У цёмным гушчары яго голля то тут, то там мітцелі, мільгалі крыху святлейшыя, загадкавыя плямінкі — яны рухаліся, узляталі і зноў апускаліся на нябачнае лісце, на міг асвятляючы той або іншы лісток. Нават не асвятляючы, выяўляючы яго з агульнага гмаху, унушальнага зараз, у цемры. Бы ўвесь час то тут, то там успырхвалі, узляталі і зноў апускаліся на нябачнае лісце матылькі, не белыя — зіхоткія, колеру гэтага вечара. Сачыць за імі было цяжка. Лёгкасць, з якой мігцелі, мільгалі загадкавыя святлінкі, не перадавалася Па-

вэлку. Ён цяжкім, нерухомым паглядам сачыў за імі, думаючы аб тым, што мала чаго паспеў уведаць за сваё жыццё: вось і гэтую гульню святла і ценю назіраў упершыню, хоць хіба гэта першы зорны вечар, хіба ён, Павэлак, не стаяў у гэтакія вечары ў сваім двары з пачуццём адасобленасці, адчужанасці ад усяго зямнога, неабдымнага ні позіркам, ні думкай.

Здзіўляла нават не тое, што ён не пазнаваў зараз старое дрэва: у цемнаце шмат што здаецца аграмадным, таямнічым, губляе знаёмыя, звыклыя рысы. Здзіўляла іншае. Тое, што ён адчуваў незразумелую трывогу, пазіраючы на цёмную вішню, на цьмяныя блiскі святла на яе лісці, што думаў зараз не пра Ніну, не пра доктарку, якая з нечым прыходзіла да яго і не сказала з чым, а пра бязмежны гэты вечар пад высокім зорным небам, пра лёгкасць, бязважкасць святла, якое адно і ажыўляе ўсё, надаючы яму акрэсленасць і значнасць.

Што азначала яго трывога, Павэлак не ведаў. Разумеючы ўсю сваю нязначнасць, нікчэмнасць перад бязмежнасцю прасторы, перад бязмежнасцю жыцця, ён усё-ткі не дапускаў думкі, што ў нечым вінаваты за гэту сваю нязначнасць. Звычайны, нечым шчаслівы, нечым не шчаслівы чалавек, што ён мог супрацьпаставіць гэтаму бязмежжу? Сваё жаданне мець дом, сад, простае зямное шчасце? Сваю сілу, якой хапіла толькі каб выжыць пасля ўсяго, што перажыў? Сваё сэрца, поўнае жалю, трывогі і шкадаванняў?

Няхай сабе гэта і не дробязі — жаданні чалавека, сіла яго рук і яго сэрца, — але гэтага мала, каб паспрачацца з жыццём, з гэткім вось бязмежным вечарам, з гэткім вось зорным небам. Мо таму і яднаюцца людзі, спрабуюць супрацьстаяць магутнай невядомасці гуртам, грамадой...

Не, гэта любую справу рабіць гуртам, грамадой лягчэй: адзін з аднаго канца возьмецца, другі з другога... Ці рашэнне якое агульнае прыняць... Адзін разважыць, другі нешта падкажа — глядзіш, і знойдзецца рашэнне! Правільнае ці памылковае, потым выявіцца, пазней, а як на той момант, дык мо і адзінае. Не аднаго разу было, што і грамадой памыляліся, ды, значыць, на той момант не знайшлося нічога лепшага. Не знайшлося. Не прыдумалася.

А ў сваім, у асабістым, ніхто не падкажа. Сам сабе і суддзя, і памагаты. І яго ўзяць, Павэлка, — хто на-

раіў яму яго жыццё? Хто паставіў зараз пасярод двара перадаграмадным зорным небам — перад усім пражытым і пражытым? Каб жа хоць адна святлінка, хоць адна зіхоткая плямінка ўпала паблізу — не асвятліла, дык выявіла, акрэсліла штосьці пэўнае, вартае гэтага моманту!

Была толькі незразумелая трывога, невядома адкуль узніклая. Павэлак услухваўся ў яе і чуў, як, тоненька вызваньваючы, асыпаліся з вішнёвага лісця, асыпаліся і гаслі, перад тым як упасці, святлінкі, іскаркі дзіўнага. нябеснага святла.

Ці гэта яму толькі здавалася? Якія святлінкі? Якія іскаркі? Двор тануў у паўзмроку, і цёмны абрыс вішні пераразаў гэты паўзмрок на дзве крыху няроўныя часткі — між хатай і плотам, — якія былі святлейшыя, вось і ўсё. З-за плота, з вуліцы, ад Пахомавага двара даносіўся невыразны гул трох ці нават чатырох галасоў: там гаманілі мужыкі, сабраўшыся перад сном пакурыць, пагаманіць, абгаварыць свае адвечныя справы і зямныя, далёкія ад Рудні і гэтага ціхага летняга вечара трывожныя падзеі і клопаты.

Трэба было і яму, Павэлку, перакурыць. Яно і не хацелася зараз ды і пазней, праз колькі часу, ужо класціся спаць — тады не пакурыш. І таму, не кратаючыся з месца, ён няспешна дастаў свой скураны капшук і акуратна, на роўныя долькі складзеную газету, і, адарваўшы кавалачак, роўна па згібе, пачаў скручваць цыгарку. Падысці да мужчын, памаўчаць з імі побач? Або пакурыць тут, у сваім двары, і потым плесціся ў хату і ўкладвацца?

Ён вагаўся, пакуль не бліснула запалка, асвятляючы яго жылістыя, дрыготкія зараз рукі (выпітая гарэлка, відаць, давала аб сабе знаць), пакуль не ўдыхнуў горкі дым, не папярхнуўся першай зацяжкай. Вырашыў — не стаяць жа пасярод двара! — хоць і не ісці на вуліцу, да Пахомавай лаўкі, а ўсё ж падысці, паўз свой плот, бліжэй. Учуць ці не ўчуць што-якое, а пабыць непадалёку. Абмінуць — тырчыць жа няўклюднай гаргарынай на шляху! — старую вішню і, абапёршыся на плот, пакурыць. І атрымаецца: і разам з суседзямі, і асобна — калі неабавязкова ўступаць у гаворку, а можна стаяць, слухаць галасы або цішыню ўкруг іх і думаць пра сваё.

Мала карысці, а галоўнае мала радасці было Павэл-

ку з тых думак, ды і каб давялося выказаць усе перадуманае ўголас, нічога пэўнага не атрымалася б. Так, некалькі разрозненых малюнкаў мінулага, некалькі пытанняў, якія, па сутнасці, павіслі ў паветры.. Цяжка было нават проста вызначыць, ці гэта ён, Павэлак, павінен быў адказаць мінуламу і не мог, не адказаў, ці ў мінулым павінен быў знайсціся адказ, а адказу не было. Што змог і чаго не змог ён у сваім жыцці? У чым вінаваты ён перад людзьмі, у чым жыццё ці людзі вінаваты перад ім? Магчыма, адказу на гэтыя пытанні зусім не было і не магло быць. Сабе іх, пытанні, Павэлак ставіў, сабе, а не мінуламу. А вось жа ўзнікла невядома адкуль трывога і не адпускала яго — і ён змушаны нянькацца з ёй, улагоджваць яе, згадваць новыя і новыя моманты, каб зноў і зноў даводзіць нешта, апраўдвацца за нешта.

Перад кім апраўдвацца? Каму даводзіць? У чым спавядацца? Ніводзін з людзей — не святы. Ніводзін. Хоць каго бяры, за кожным нейкі грэх водзіцца. Кожны ў нечым вінаваты — не перад жывымі, дык перад мёртвымі. Перабіраючы грахі, да самога бога, калі быў ён, дабярэшся.

Дык за што ж апраўдвацца? Перад кім? Перад мёртвымі? Хіба ён адседжваўся ўбаку? Столькі раз мог быць забітым, колькі раз кулі свісталі побач. Прастрэлены, можна сказаць, наскрозь быў. У музеі пра яго дакумент захоўваецца... Зрэшты, Павэлак мог бы пра гэта і не думаць: ніхто ж з яго апраўдання не цягнуў, усе ўсё пра яго ведалі. На віду жыў. На пагорку. З любога месца пасёлка дом ягоны пад шэрай чарапіцай згадаеш. Добрая чарапіца. Вечная. Не адзін дождж яе мыў за гэтыя гады, а каб пацёк дзе! Добрая чарапіца. Даваеннага гатунку яшчэ...

Пра што гаманілі мужчыны, здагадацца Павэлку было няцяжка, нават не дужа ўслухваючыся. Хутчэй за ўсё — пра тое, што ў газетах сёння́шніх паведамлялася. Павэлак у газету за ўвесь дзень не зазірнуў — усё з раніцы наперакасяк пайшло! — але быў упэўнены, што, калі б што якое дзе здарылася асабліва важнае, ён бы нейкім чынам учуў дасюль. Хоць бы і ад настаўніка, ад Івана Панцеляймонавіча, — той жа за ўсімі навінамі сачыў, папэўна, і сачыў пільна, не ў прыклад яму ці Пахому.

— Дагнаць тую Амерыку мы, мажа, і дагонім. Ты

вось растлумач мне, на якога д'ябла нам яе даганяць? Што ў нас — сваіх спраў мала?

Юзік, сусед насупраць, — пазнаў Павэлак Юзікаў бляклы, без адзінай цвёрдай літары вымаўленай, голас. «...На якоха т'япла нам яе таханяць?..» — гэтак прыкладна прагучала яго пытанне.

— Ты ж разваж, Юзік, раскінь мазгамі: якая нам радасць у тым, што нехта дужэйшы, чым мы? — хоць немцаў узяць, хоць Амерыку гэтую, невядомую... — пачаў пераконваць яго Пахом. — Не глядзі, што далёка, за акіянам. Думаеш, там, за акіянам, пры іх сытым жыцці, якога-небудзь гітлера на нашу галаву не знойдзецца? Толькі пакажы слабінку, толькі сагні перад імі спіну, як тут жа і ўскочаць.

— Гэта верна, — падтрымаў трэці голас, чый, Павэлак неяк адразу і не ўгадаў.

— Не, Пахом, ты мне гітлерам рот не затыкай. Ты мне скажы: на якога д'ябла нам іх даганяць на гэту... на душу насельніцтва? У іх свае душы, у нас свае. Навошта мераць адной меркай? У нас жа, можа, свае меркі, савецкія, — і вайной, і голадам мераныя. Ім, можа, па нашых мерках, даганяць нас ды даганяць.

— Дак тут жа пытанне ставіцца: — мы — або яны? Мы ў мірным жыцці пераможам або яны? У вайну — адно, а цяпер — другое. Цяпер трэба, каб хлеба было больш, малака, мяса. Больш, чым у іх, чым у капіталістаў.

— Гэта верна, — зноў падтакнуў трэці голас, і зноў Павэлак яго не пазнаў.

— Я што — супраць хлеба, супраць таго, каб больш было хлеба ды малака? У мяне дзіцёнак у сорак сёмым, ледзь нарадзіўшыся, памёр, бо з галадухі ў Алены маёй малака ў грудзях не было... А дзе яго ўзяць было тады? Ты ж помніш, Пахом. Я што — супраць хлеба, супраць малака? Я — супраць пагоні гэтае. Будзем даганяць, даганяць, а сваё па дарозе разгубляем. Можа ж такое здарыцца, а?

«Бач ты, як ён Пахома прыціскае! — здзівіўся з Юзіка Павэлак. — Вечна гугніць нешта, я не надта каб і прыслухоўваўся. З Пахомам яшчэ перакінуся словам калі-нікалі, а з Юзікам...»

— Здарыцца што хочаш можа, Юзік. Я дык думаю, што ўсё — не разгубляем, — стаіць на сваім Пахом. — Не адно дагнаць, а і абагнаць іх мы па ўсіх лініях па-

вінны, каб сябе, каб сваё ў свеце сцвердзіць на векі вечныя.

— Гэта верна.

— Што ты, Кастусь, далдоніш: «гэта верна, гэта верна»? Што — верна? Што мы лaперадзе сябе гэту Амерыку ставім? Што мы ў вечныя даганятыя сябе запісваем?

— Чаму — у вечныя? — зноў умешваецца Пахом, не спадзеючыся на Кастуся (Кастуся Шпака з правулка, — пазнаў нарэшце таго, хто быў трэцім у гаворцы, Павэлак). — Пяцігодка, другая — і ўправімся.

— Бач, які хуткі! Ці не з тваімі даламанымі касілкамі ды з гуртам баб, на якіх брыгада трымаецца? — падчапіў таго Юзік. — У сянажныя ямы што летась закладалі? Фігу? Сёлета што з поля возьмем, як дажджу яшчэ з тыдзень не будзе? Маўчыш?

— Маўчу. Ды з іншай прычыны. Ты, Юзік, чаго злуеш? Ты што — не верыш у планы, у сілу нашу? — заёрзаў, мусібыць, Пахом: дапёк яго Юзік (ніводнае цвёрдай літары не вымаўляе, а бач, разышоўся — і ўсё цвёрда расставіў, прыпёр Пахома да спінкі ўласнае лаўкі!).

— Верыць-то я веру, браце, ды больш не ў словы, а ў справы. Амерыка, шмерыка... Хай яна стаіць, дзе стаіць. Нам свой парадак трэба весці. А то адно поле так засеем, другое — па-другому, на трэцім — чорт ведае што хочам сабраць, ніколі з насеннем гэткім справы не меўшы... Хутка зусім гаспадарыць развучымся, дзедаўскую навуку занядбаўшы. А то дзяды гэту зямлю па грудачцы не перабралі, а то яны жыта на гэтай зямлі не сеялі! Цьфу!

Мужыкі замоўклі. Моўчкі курылі. Павэлак бачыў немітуслівыя рухі агеньчыкаў і шкадаваў, што яго цыгарка даўно патухла. А мо шкадаваў, што не выйшаў на вуліцу, не пасядзеў, не пагаманіў з суседзямі. Гаворка ж зацікавіла і яго: разважалі пра тое, пра што пісалі штодня газеты і што не магло не закранаць і іх — усе трое працавалі ў саўгасе.

Ён задумаўся над горкай праўдай Юзікавых слоў (хай сабе і не працаваў у брыгадзе, а ведаў, што робіцца ў гаспадарцы, на зямлі): дай волю — усе ў гарады паз'язджаюць, кінуўшы неўрадлівыя палеткі. Перастала зямля трымаць. Карэньчыкі адсыхаюць... Усім вальнейшага жыцця захацелася: каб вылюднець, каб пот

меней вочы заліваў, каб і з'есці смачней, і выпіць часцей. Ды дзе ж яно на ўсіх набярэшся тае смакаты? I тое яшчэ ўзяць — абяцанні розныя... Не на перніках, а на хлебе вырастае чалавек, нашто ж яго пернікам дражніць? Не ўсе — вось ён бы, Павэлак, наседжанае гняздо не кінуў! — на тоі пернік рот разяўляюць. Больш маладыя, маладзейшыя: не ведаюць, што ён і ў горле перасесці можа, той пернік, — ні пракаўтнуць, ні выплюнуць...

— Цьфу! — сплюнуў Павэлак услед за Юзікам, і гэтак жа горка, бездапаможна.

Не яго гэта справа — у палітыцы калупацца. Хай думаюць тыя, хто да яе прыстаўлены! Шкада аднаго: хутка зусім гаспадарыць развучымся, дзедаўскую навуку занядбаўшы, — міжволі паўтарыў у думках Юзікавы словы, збіраючыся ўжо ісці, укладвацца, і ўслухваючыся ў першыя зрухі болю, які вяртаўся, зноў варушыўся ў грудзях.

— Ляціць! ляціць! — ускочыў раптам з лаўкі Кастусь. — Вунь! Правей ліпы.

— Хто ляціць? Што ляціць? — заёрзаў, закашляўся Пахом.

— Ды вунь жа! Над намі. Карабель гэты... касмічны!

— Вочы падымі, Пахом. Па правы локаць уверсе — зорачка рухаецца, — спакойна, як здалося Павэлку, удакладніў Юзік. — Бачыш?

— Бачу, халера на яго. А то: ляціць! ляціць! А што ляціць...

Павэлак убачыў хуткі агеньчык яшчэ раней за Кастуся. Але неяк не ўсвядоміў, адкуль ён. Позіркам бачыў, а не розумам. I цяпер здзіўляўся: паўнеба адным росчыркам той карабель, або спутнік, перакрэсліў — з'явіўся і знік за якую мінуту ці дзве. Мала хто і заўважыў, пэўна. Ведама ж, не ўсе стаяць з задранымі ўгору галовамі, на ноч гледзячы. Гэта яму, Павэлку, руціла сёння нешта неба: што ні рабіў, пра што ні задумваўся, усё галаву задзіраў, на прастору, на вышыню дзівіўся. Хоць што на яе дзівіцца! Неабдымная, бясконцая ўшыркі і ўглыб, яна не гняла, не ціснула на плечы — і на тым, як кажуць, дзякуй: мошка чалавек перад ёй. Карабель вось прыдумалі, спутнік гэны, дык ён лятае, пакуль што не сапсуецца ў ім, а як сапсуецца — неба яго ці паглыне, ці сплюне. Як непатрэбшчыну. I зноў пры-

думляй нешта чалавек! І зноў змагайся! Канца гэтаму змаганню не будзе...

«— ДУША Ў ЧАЛАВЕКА РАГАТАЯ, БЕЗ ПАРЫ НЕ ВЫЙДЗЕЦЬ». Хто гэта казаў? Не знаеце? І я, людцы, не знаю. Разумны нехта казаў. Бо ўсяму жывому на зямлі свой час пакладзены. І кветцы, і лісцейку, і сініцы малой, і зверу. А ўжо чалавеку — як каму. Як каму, людцы мае. Адзін і сына свайго лёгка перажыве, а другі толькі вочы не свет белы расплюшчыць — а бог і прыбярэ. Усяго і жыцця — жабіны прыгаршчы. А наракаць — не смей. Ні-ні! Значыцца, суджана гэтулькі. Значыцца, на раду гэтае напісана.

— Ды кім суджана? Кім напісана, Міхал? Богам тваім? — сумна, уціраючы ражком хусткі вочы і ўсім сваім выглядам асуджаючы занадта гучную гаворку, не шэпча, а сіпіць Раманішыха. — Вось жа пішуць, расказваюць, што няма — няма яго, твайго бога. Быў бы — пашкадаваў бы людзей: адну навалу перажылі, другая накацілася. Голад — па ўсёй зямельцы нябось... Вось і мруць дзеці. Колькі ж таго дзіцёнка! — а бач, не пашкадавала смерць, прыбрала.

— Значыцца, суджана гэтак, — упарта даводзіць сваё стары, і па-ранейшаму гэтак жа гучна, на поўны голас. — Богам ці кім іншым, не нам, людцы, разбірацца. Шкадаваць — шкадуй. Хто ж немаўля бязгрэшнае не пашкадуе? А наракаць не смей. Ні-ні! Няма на гэта нашай волі і не будзець.

Міхалу хоча адказаць Пахом, ды я прытрымліваю яго за рукаў: яшчэ не хапала ў двары, дзе гора, дзе дзіця, першынца, аплакваюць, мітынгаваць ці спрэчкі ўчыняць! Міхал — вядомая справа, не ў сабе. З розуму даўно выжыў. Божы чалавек, адным словам. А Пахому — нашто? Парцейнасцю сваёй выхваляцца? Разуменнем моманту? Дык момант — сумны. Жалобны, можна сказаць. Вялікіх слёз не льецца: немаўля ж! — усяго жыцця, калі за Міхалам паўтарыць, жабіны прыгаршчы. Але ж прыйшлі людзі, спачуваюць Юзіку і Алене ягонай па-суседску. З любым можа здарыцца, не сёння-заўтра...

— З любым можа здарыцца, людцы мае. Не сёння-заўтра! — падбадзёраны маўчаннем (бач, думку маю перахапіў!) і тым, што ніхто не пярэчыў, працягваў дзед, малітоўна склаўшы на грудзях рукі. — Не стары

ўміраець, а паспелы. Як у бібліі сказана: спатрэбіцца богу чысты душою і пакутай ачышчаны...

— Ды не сказана гэткага ў бібліі, дзед, — не стрымліваецца ўсё-ткі Пахом. — Ты ж і ў вочы ўсіх гэтых пісанняў не бачыў, ніводнай літары не ведаеш прачытаць, а туды ж: сказана!

— Сціхніце вы!

— Супыніся!

— Смерці пасаромеліся б! — засыкалі жанчыны.

А Міхал, божы чалавек, ні на іх, ні на Пахома і вачэй не падняў. Як не чуў. Сухой вузлаватай рукой сцягнуў з галавы шапку-аблавуху, якую насіў і зімой і ўлетку, і як наструніўся ўвесь, нават ростам павышэў — прыслухваецца да нечага. Сівы, распатланы — пругкія, непаслухмяныя, даўно не стрыжаныя валасы кранае, не прыгладжваючы іх, вецер; у доўгай, невядома калі шытай світцы з грубага сукна землянога колеру, ён нагадвае злавесную вастраносую птушку ці яшчэ... прарока! Гэткага, якога, калі прыгледзецца, згледзіш на старых абразах (на гарышчы недзе валяюцца дзве размаляваныя дошкі ў рамках — яшчэ цётчыны!). Да чаго ён, цікава, прыслухваецца?

— Выносяць... — ледзь чутна, праз зубы цэдзіць Пахом.

Паварочваюся. Заглядзеўся на старога — пра выкінутыя цётчыны абразы згадаў! У самы час памаліцца, калі б умеў... Бабы ўжо дружна, адна ля аднае, усхліпваюць.

— Людцы добрыя, цішыня павінна апусціцца на нашы душы, — ступае наперад Міхал, узвышаючы голас. — Чыстае, бязгрэшнае дзіця пакідае нас літасціваму богу нашаму.

— Камедзіянт, маць тваю! — злосна цэдзіць праз зубы Пахом, але так ціха, што і я хутчэй здагадваюся, чым чую.

— Ніхто свету не перабудзе, ніхто пакуты не абміне. Не па мёртвым дзіцяці мы плачам, а па сабе, грэшных, ад таго, што баімся мы смерці, а трэба граху баяцца. Зірніце, людцы, на дзіця божае, на светлы тварык яго...

— А-а! — пачынае галасіць, біцца ў руках Юзіка Алена. — Сіні ў яго тварык, сіні! Не глядзіце на яго, на маю крывіначку! Балюча яму ад вашых позіркаў, балю-ю-ча...

— Алена, нельга так. Так нельга, Аленка. Не вернеш жа, — трымае яе, спрабуе суняць Юзік.

— А-а! Чаму я не памерла? Я, я забіла сваё дзіцятка, я забіла яго-о... На маіх грудзях яно памерла, на гэтых вось грудзях, што як мяшкі пустыя, учарнелыя...

— Ніхто свету не перабудзе.

Цьфу ты! Гэнаму ўсё рупіць пагаварыць. Маладзіца грудзі, валасы на сабе рве, што першынца свайго на чацвёртым дзесятку дачакалася і тут жа страціла, наглядзецца, нарадавацца не паспеўшы, а гэны, нічыю маці не памінаючы, у прапаведнікі лезе. Ведама, з розуму выжыў. Сядзеў бы дома! Дык не. З-за чыгункі, здалёк прывалокся. Мо каб на памінках прыкусіць чым голад — знеслі ж суседзі хто што меў: хто бульбін колькі, хто колькі грыбоў сушаных...

Алена змаглася. Абмякла, абвісла ўся. Юзік ледзь што не нясе яе на сабе. Невялічкага расточку, з шырокімі квадратнымі плячыма і лысай галавой (толькі кусцік рэдкіх русых пасмачак без аднае сівінкі прыляпіўся над ілбом, ды ззаду, ад вуха да вуха, валасы дужкай падтрымліваюць голы, крыху завостраны на макаўцы чэрап), Юзік выглядае старэй сваіх гадоў. Адчуваецца, што найбольшы клопат яго — Алена, якую прыгняло, пазбаўляючы сілы, гора, што са смерцю дзіцяці ён ужо зміры́ўся і баіцца адно за жонку.

— А-а! — зноў пачынае біцца яна ў Юзікавых руках.

— Усяму жывому на зямлі свой час пакладзены: і кветцы, і лісцейку, і сініцы малой, і зверу. Кветка зацвітаець, раскрываецца насустрач сонцу і засыхаець, каб зноў налета зацвісці. Лісцейка апранаець дрэвы, шуміць усімі вятрамі зямнымі і аблятаець, зямельку ўгнойвае...

— Сціхніце, дзед Міхал, — бярэ яго за руку мая Ніна і адводзіць убок, туды, дзе стаіць колькі жанок. — У такую хвіліну памаўчаць трэба.

Кажа яна гэта так спакойна, так упэўнена, што Міхал нечакана слухаецца. Губы ў яго па-ранейшаму варушацца, але слоў не чутно — няма больш слоў. Зіркае ўслед Ніне і жуе, жуе свае зусім белыя, парэпаныя губы... А Ніна — і для мяне гэта таксама нечакана! — даганяе Юзіка з Аленай і не бярэ кабету за плечы, а падстаўляе сваю руку, прымаючы на сябе частку яе змо-

гі, частку яе гора. І тая пакорна прымае дапамогу, нават крыху выпрамляецца.

Людзі, колькі тут нас сабралася, пачынаюць ціха выстройвацца за імі; ступаем на сцежку і мы з Пахомам. Пахом, відаць, перахапіўшы здзіўлены мой позірк, абзываецца:

— Твая лепей за доктарку ўправілася.

Ківаю ў адказ: з нас жа ніхто не здагадаўся выправіць мінуту — кожны са сваім спачуваннем убаку трымаўся. А Ніна... Вось так заўсёды. Жыве, як у сне, няйначай, — здаецца, не бачыць, не чуе нічога вакол, на мяне, як на чужога, лыпне вачыма і адыдзе... А то нечакана так разважыць альбо зробіць, што дзіва не перабудзеш. Хоць з Ганьчынымі дзецьмі ўзяць... Думае, нябось, што я нічога не бачу. Як жа, бачу! Вось і сёння, з Аленай, з Аленіным горам... Нібыта толькі перад чужым болем, перад чужым горам, яе, Ніна, адступае.

— Няскора мы, відаць, гора гэта, вайной пасеянае, збудзем, Пятровіч. А жыць жа хоць як трэба. У мяне вось трое... Часам хоць сам на стол кладзіся: ні крышынкі ў хаце, — глуха, пакашліваючы, гаворыць Пахом.

Мы ідзём, месячы веснавую гразь, і я раптам заўважаю, неяк вельмі абвострана заўважаю, што пахне вясной, цяплом, што гразь пачынае падсыхаць: які тыдзень,-другі — і можна будзе сеяць...»

Адагнаўшы згадку (Юзікавы словы вярнулі той даўно забыты дзень!), Павэлак ніяк не мог адагнаць адчуванне, што чуе пахі зямлі, пахі ночы, надзвычай абвострана, нутром усім, — і яны перашкаджаюць яму, вярэдзяць збуджаны боль. У галодныя гады ўсім хапіла. І Павэлак той жа хлеб з самой мякіны, што і іншыя, еў. Таму і гаворка суседзяў яго закранала, яго таксама тычылася. Таму і згадаў зараз, як дзіця хавалі... Нагледзеўся за сваё жыццё на пахаванні, а вось, выходзіць, і тое помніць. І Міхала, што даўно ўжо сам нябожчык, і Алену, і Ніну сваю ў той дзень, на тым пахаванні помніць, і сябе, свае колішнія адчуванні.

А далей... Як яно пойдзе далей, шмат ад чаго залежыць. Ад яго, Павэлка, на жаль, не залежыць. Не рваў пупа ніколі, а зараз ужо, каб і схацеў, дык не шмат бы змог. Быў конь, ды з'ездзіўся. Адно во засталося: паслухаць гамонку, самому што сказаць ці падумаць. Хто

гэта ў яго пытацца, што ён думаў, будзе? Нехта запускаў караблі ў неба, нехта планы складаў і дыктаваў, нехта цягнікі ганяў узад-уперад па зямлі — грукочуць дзень і ноч! — а ён, Павэлак, як жыў на сваім пагорку, так і жыве. Спатрэбілася — ваяваў: не было іншага выйсця, не было жыцця пад немцам ні яму, ні людзям. Спатрэбілася — пажары тушыць: не ў стане ўсюды, на ўсёй зямлі іх патушыць, а ў Рудні і яе наўколлі — парадак. Па першым сігнале выязджаюць...

Так, ён, Павэлак, як жыў на сваім пагорку, так і жыў. Сваімі звыклымі клопатамі, сваёй, мо і не самай важнай у свеце, работай, сваёй, мо і не самай шчаслівай у свеце, сям'ёй. Вушы на тое, што рабілася ўкруг і шырэй, не затыкаў, газету, якую прыносіла ў двор ледзь не штодня Марфа-паштарка, чытаў. Пэўна ж, калі гаворка ідзе пра народ, дык і ён, Павэлак, — нейкая там малюсенькая частачка народа. Гэта ён разумеў. Але далей разуменне не ішоў. З людзьмі жыў, людзей не цураўся, а ўсё ж — сам па сабе.

Які ён, Павэлак, народ? Не рваў пупа ніколі, а зараз ужо, каб і схацеў, не шмат бы змог. Выйдзе заўтра на работу ў брыгаду, бо брыгадзір прасіў, бо перад Пахомам няёмка, — дапаможа трохі: сенакос жа! Ды колькі ён там дапаможа? І каб жа ад яго дапамогі што залежала! Як ні павярні: то з ворагам біцца трэба было, то з голадам, то з непарадкамі... Канца гэтаму змаганню не будзе!

Далей... Як яно пойдзе далей, ніхто, пэўна, не ведае. Ён, Павэлак, не ведае. Што зямлю трэба даглядаць, каб не аслабла, каб радзіла і радзіць магла, — ведае. Розум гэты, разуменне гэтае ў спадчыну атрымаў, лічы. Спрадвек так ішло. А куды той карабель, які паўнеба адным росчыркам перакрэсліў, з'явіўшыся і зніклы за якую мінуту ці дзве, прыляціць, толькі час адкажа. І не яму, Павэлку, адкажа, некаму іншаму. Потым. Некалі...

## 30

Ніна з Дзмітрыеўнай адышліся недалёка. Абмінуўшы колькі двароў, яны спыніліся на скрыжаванні Савецкай і Пралетарскай — тут Дзмітрыеўне трэба было звярнуць управа, і яна рашуча настойвала на тым, што Ніне лепей вярнуцца.

— Што я — маленькая, каб дадому мяне весці? Пастаім хвілінку ды разбяжымся. Ты калі едзеш?

— Уранні. Аўтобус да Запярыння не даязджае з кіламетр, ды ўсё якраз да лепшага. Прайду і падыхаю паветрам маленства... Гэта я так у адной кнізе прачытала: «Падыхаю паветрам маленства...» Запомніла. Бо і праўда ж: паветра дома ўсё тое ж, сасной ды чаборам прапахлае, на сонцы настаянае. Тое ж паветра. Толькі я — іншая.

— Усе мы іншыя, — задумліва сказала Дзмітрыеўна, узіраючыся ў цемнаце ў Ніну. — Я што хацела спытаць...

— Пытайся.

— Даўно хацела спытаць. Не пыталася адно таму, што ведала: ты не адказала б. Яшчэ ўчора не адказала б.

— А сёння — што ж?

— Сёння — ты іншая, — заўсміхалася тая, папраўляючы на носе акуляры. — Сама кажаш.

Ніна не адазвалася. Раптам зразумела: тое, пра што хацела спытаць у яе Дзмітрыеўна ўсе гэтыя гады, яна сама ў сябе ўсе гэтыя гады спытацца баялася. Баялася парушыць пытаннем хай сабе і ўяўны, а спакой. Спакой, якім даражыла, у якім адно і магла жыць. Сабе пра такое не скажаш, не тое што каму іншаму. Нават ёй, Дзмітрыеўне...

— Што? — схамянулася яна ад дотыку рукі.

— Як, чаму ты магла паверыць, што Пятровіч твой не варты нічыёй прыхільнасці, не заслугоўвае твайго разумення?

— Як... не заслугоўвае?

Пытанне было павернута такім чынам, што не давала ніякай магчымасці схавацца ад адказу, аджартавацца або зрабіць выгляд, што яна не разумее, аб чым ішла гаворка. І Ніна разгубілася. Чакала ж гэткага павароту гаворкі, а — разгубілася.

— Мы жывём на вачах у людзей, на вачах адна ў адной. Што ж баяцца шчырасці? Некалі мяне здзівіла, галубок, тваё замужжа. Не адзін жа да цябе заляцаўся, аб прыгажосць тваю сэрца апёкшы. Хто-хто, а я гэта бачыла! І захаплялася табой, хваробу тваю, галубок, любові занадта моцнай прыпісаўшы: ні да каго ты не прыгарнулася ў слабасці сваёй, нічыйго заляцання не прымала. Не ўтаю: калі ты, не збіраючыся дужа, за

Пятровіча выйшла, галубок, і я, грэшным дзелам, падумала, што дом яго, гаспадарку яго ты выбрала.

— Не, не!

— Ды тое, што «не, не!», я хутка зразумела. А тады — што? Што?

— Спакойна побач з ім... было. У душу не лез. На словы дзьмуў, перш чым сказаць што. Разумеў маё гора і спачуваў.

— Кахаў ён цябе, галубок. Усё жыццё кахае!

— Можа, і кахае.

— «Мо-жа»! Бач, як ты спакойна пра гэта. А ты ж душу яму, няйначай, растаптала, галубок.

— Я? Рас-таптала? Пабойся бога, Дзмітрыеўна! Ды я і слова ніколі не сказала...

— Ты думаеш, толькі словы забіваюць? У бязводнай пустыні нічога не расце. Колькі ні аддаеш абыякаваму сэрцу любові, яно пустым застаецца, мёртвым. Вось я пра што, галубок. Даўно гэта сказаць табе хацела.

— Але ж Павэлак... Але ж я казала тады яму, што Сцяпан... Усё ён ведаў, Павэлак! Усё спачатку ведаў.

— Ратаваў ён цябе, галубок. Здараецца, пад кулі лягчэй кінуцца, чым жыць побач і чакаць, чакаць. Позірку чакаць. Слова чакаць. Хоць маленькай радасці... Не дзень, не год — ужо дваццаць гадоў чакае ён. Як, чаму ты магла паверыць, што ён не варты прыхільнасці, не варты разумення?

— Чаму — не варты? Так у нас выйшла, Дзмітрыеўна. Хто ж тут вінаваты?

— Падумай, Ніна, до-обранька падумай, едучы заўтра. Для таго і гаворку завяла. А то ты ўвесь час на мінулае азіраешся, ён — лепшага дня чакае, спадзявання не губляе, — а чалавечы век, ён не ў мінулым і не ў будучым. Ён — сёння. Зараз. У тым, чым жывеш.

Ніна, зніякавелая, нават крыху напалоханая гэтай гаворкай (вось здалося ж ёй сёння, што Павэлак нейкі не такі, як звычайна!), слухала Дзмітрыеўну і ніяк не магла прыняць, прызнаць яе праваты: а то ў іншых сем'ях толькі любоў ды згода! Каб яшчэ было ў іх з Павэлкам дзіця, мо і павярнулася б неяк інакш. Але каб ды кабы... Разважаць можна колькі хочаш, а якое ліха развражыш? Не самы горшы, урэшце, гэта варыянт: разам — і паасобку. Сам жа браў да сябе Павэлак, за нешта ж выбраў!

Думкі здаліся раптам чужымі. Больш таго: ілжывы-

мі наскрозь. Сам жа... Да сябе... Што яна, Ніна, рэч — прынёс, паставіў і дзівіся? Яна ж таксама сама выбірала: Пакору Павэлкаву выбірала. Разуменне яго. Згоду, гатоўнасць яго служыць ёй... Вось яно, тое слова, знайшлося: служыць! Сабачае штосьці — сабачую вернасць, калі дакладна — учула яна тады ў Павэлку. Так, так. Не спакой (спакойна, бачыце, ёй з ім побач было!), а тую сабачую вернасць, з якой ён гатовы быў служыць ёй, Ніне. Ды і служыў. Калі разабрацца, усе гэтыя гады служыў, ні аб чым ніколі не папрасіўшы, ні на што ніколі не паскардзіўшыся ёй. Мо каму іншаму, а ёй — не...

Ад знойдзенага нечакана адказу ёй стала не па сабе. Значыць, недарэмна Дзмітрыеўна абвінавачвае яе, кажучы пра пустое, мёртвае сэрца. Сабаку ж за тое, што верна служыць, кормяць добра і лашчаць калі-нікалі... Не па сабе Ніне стала. А тут яшчэ Дзмітрыеўна змоўкла, маўчыць ужо хвіліну якую. Лепш бы гаварыла. Лепш бы лаяла яе, Ніну, чым маўчаць, адгароджваючыся ад яе сваім маўчаннем.

А тая, нібы ўчуўшы нямую просьбу Ніпіну, паклала руку ёй на плячо і ціха, задумліва прамовіла:

— Зірні ўгору. Правей. Бачыш: зорачка рухаецца. Ляціць. Бачыш? Гэта зорачка — касмічны карабель, спадарожнік Зямлі, які ляціць у будучыню. У шчаслівую для ўсіх будучыню, галубок.

— А ён не ўпадзе?

— Ён згарыць. Але тады ўжо новы карабель, новы спадарожнік будзе шлях пракладваць. Новы. Больш дасканалы. Больш магутны. Зусім так, як людзі... Таму будучыня абавязкова наступіць. Людзі знойдуць да яе шлях. Ужо знайшлі — трэба толькі пераадолець перашкоды, не збаяцца іх.

— А пры чым тут мы з табой, Дзмітрыеўна?

— Ну-у, галубок! Нам з табой сачыць, каб людзі здаровымі былі і сёння, і ў будучым. Гэта немалая справа. Калі чалавек нездаровы і не верыць у свае сілы, уся яго будучыня ў бутэлечку з мікстурай змесціцца. Вось яно як выходзіць.

— Ужо не відаць. Праляцеў, — чамусьці са смуткам зазначыла Ніна, неўпапад да таго, што і як толькі што казала Дзмітрыеўна.

Гаворка гэтак жа раптоўна, як і пачалася, скончы-

лася. Яны яшчэ стаялі побач, рука Дзмітрыеўны ляжала ў Ніны на плячы, спалучаючы, яднаючы іх нябачным, вельмі патрэбным ім абедзвюм цяплом, а думкі ўжо разбягаліся — вось-вось павінны былі жанчыны развітацца і пайсці кожная ў свой бок, кожная — да сваіх клопатаў.

Над імі, нерухомае, велічнае ў гэтай сваёй вонкавай нерухомасці, стаяла высокае зорнае неба, стаяла, нібыта ўзіраючыся ў іх і ў цэлы свет, — і празрыстым хісткім слупом уцягваючы ў сябе, у сваю глыбіню паветра і іх позіркі...

— Я пайду, галубок. Ты ведаеш: я люблю цябе і не магла не сказаць табе тое, што сказала.

Яна лёгенька сціснула пальцамі Ніціна плячо, развітваючыся, і пайшла. Пайшла хутка, не азіраючыся, паступова зліваючыся з цёмнымі абрысамі вішань: вуліца крыху выгіналася, мінаючы пагорак. Ніна пазірала ўслед Дзмітрыеўне, у асветлены небам калідор вуліцы, і думала, што так і не адказала на яе пытанне. Ёй — не адказала. Хоць яна, Дзмітрыеўна, пэўна, і не чакала адказу: не ёй жа ён быў патрэбен, а Ніне. Самой Ніне. «Як, чаму ты магла паверыць...» Самае галоўнае ў пытанні: магла. Таму што — магла паверыць...

«— ВЕК І КАМЕНЬ НЕ ВЫТРЫМАЕ. Чуеш? І камень, кажу, колецца, не вытрымлівае. А ты маўчыш, церпіш.

Кажу абыякава. Абы нешта сказаць. А то цішыня гудзе ўжо ў вушах і ў галаве. Мо ад таго, што глынула ў бальніцы спірту... Ат! Колькі я там глынула? А гэты ўжо набычыўся. Маўчыць, як цыгарку сваю смярдзючую праглынуў.

— І камень, кажу, колецца... Чуеш, Павэлак?

— Чалавек — не камень.

А! Адказаў. Чуе, значыць. І люстэрка на сцяне хіснулася... Не, гэта я паднялася, таму яно хіснулася. Давядзецца зноў сесці, а то яшчэ бразне са сцяны. А ў ім далёка відаць, у люстэрку, гэтак далёка, што і на маіх хуткіх нагах не дабяжыш ужо. Не-а, не дабягу. Гэтак во і буду жыць сярод сцен, перад вялізным — цэлы прасценак займае! — люстэркам. Жыць-пажываць, бабін век дажываць. Вось тут. Сярод сцен. У гэтай ліпкай цішыні, што нават да твару прыліпае. Колькі ні змахваю, колькі ні выціраю рукой, ніяк не магу выцерці. Прылі-

пае, і ўсё тут. Рука ўжо ўчарнела ад гэтых узмахаў — уверх, уніз — тру і тру, а ўжо не толькі лоб і шчокі ліпкія, а і вейкі. Гэта цішыня хоча, каб я вочы заплюшчыла, каб нічога не бачыла, а яна будзе калыхацца туды-сюды, туды-сюды, наліпаючы ўсё болей і болей.

— Ты б лягла, Ніна.

— А-а, ты ўсё-ткі не камень, калі гаворыш. Камяні не гавораць, а гудуць. Вуха прыкладзеш — і чуеш цёмны, невыразны гул. Зусім як цяпер. Быццам не ў хаце сяджу, а ўнутры вялізнага каменя. Гу-у, гу-у-у... Чуеш?

— Ты б лягла, Ніна. Я паслаў.

— Пасла-аў... Нябось не спытаешся, ці хачу я класціся ў гэту пасцель. Ніколі не пытаўся і зараз не спытаешся. Збаішся. Раптам скажу: «Не, не хачу». Не бойся. Не скажу. Мне ўсё роўна куды — у пасцель, у магілу...

— Ты... Ты...

Чаго гэта ён падхапіўся? Падбег і стаіць, і руку адвёў, нібыта ўдарыць хоча. Ат! Не ўдарыць. Не хопіць яго на тое, каб ударыць. Спалатнеў увесь і заікаецца. «Ты... ты...» А што — я? Ненавіджу гэту цішыню! У гэтай цішыні — усё адно што ў магіле. Я нешта сказала, мусіць, пра магілу — вось ён і падхапіўся... Усё жыццё стаіць паміж мной і магілай і таго не ведае, што там мне было б нават лепш.

Зноў люстэрка на сцяне хістаецца. Храснуць бы зараз па ім чым-небудзь, каб асколкі пырснулі: асколкі шкла — асколкамі майго жыцця... Цікава, убачыла б я гэта ці не? Убачыла б напаследак... Блакітныя асколкі асыпаюцца ў чарнату — прыгожа! У Сцяпана былі вочы блакітныя. У мяне — сінія, а ў яго — блакітныя. А ў Павэлка — зялёныя, як раскай зацягнутыя, нічога ў іх не разгледзець. Бултыхаецца нешта, а што? Ударыць хацеў... Хай бы ўдарыў! Мо б асколкі пасыпаліся прыгожыя вакол. Ці не асколкі, не. Не асколкі, лепш — слёзы мае высахлыя. А то зноў — цішыня. Рука ўжо ўчарнела ад узмахаў — уверх, уніз — тру і тру, а ўжо не толькі лоб і шчокі ліпкія, а і вейкі. Не-не і зліпаюцца, склейваюцца, ледзь раздзіраю.

— Ты выпіла, Ніна. Пойдзем! Ідзі кладзіся.

— Што я выпіла?

Мусіць, я занадта рэзка паварочваюся на голас — люстэрка хістаецца так моцна, што вось-вось... Люстэрка падае-такі са сцяны! На мяне... Я пераможна ўскід-

ваю рукі і — падаю. Толькі чамусьці не ўніз, а ўгору. Прабіваю галавой люстэрка і — каб сіняя іскарка! — бачу блізка-блізка спалатнелы Павэлкаў твар, яго зацягнутыя зялёнай раскай вочы. Зноў ён на дарозе!

— Пусці! — шапчу ў гэты спалатнелы твар, шапчу злосна, ледзь не з нянавісцю: вечна ён стаіць у мяне на дарозе!

— Супакойся... Што ты? Што ты, Ніна?

Твар яго адхінаецца, а перад вачыма пачынае плаваць штосьці нясцерпна жоўтае. А-а... Гэта лямпачка, укручаная ў нядаўна куплены абажур. Яна адплывае кудысьці ўбок, а нада мной зноў знаёмы твар. Ён набліжаецца — я хачу адвярнуцца, адхінуцца сама, каб не сустрэцца, не сутыкнуцца з гэтым тварам, і яшчэ раз падаю. Мякка. На штосьці мяккае. На ложак, мусібыць.

Становіцца цёмна. Чорна. Чарната хвалямі перакочваецца ўва мне, пачынае падступаць да горла. Яшчэ міг і... Мне становіцца горача і яшчэ страшна. Я не хачу — я баюся! — быць адна ў гэткай чарнаце, я не хачу адна!

— Уключы! Уключы святло, — прашу.

Я знаю: ён павінен быць побач. Ён заўсёды стаіць у мяне на дарозе. Ён не мог пакінуць мяне зараз адну — тут, у гэтай гарачай пустаце.

— Па-вэлак!

З цемры выплывае яго твар, ён ужо не белы, ён жывы і добра знаёмы. Я магу паскардзіцца, магу папрасіць, магу...

— Мне страшна.

— Супакойся... Што ты? Што ты, Ніна?

Чую, як яго рукі зручней падсоўваюць мне пад галаў падушку, як яны пачынаюць распранаць мяне, мякка, пяшчотна паварочваючы, прыўздымаючы, каб зняць кофтачку, каб паслабіць гузікі, каб вызваліць мяне з апраткі, і з чарнаты, і з незразумелага страху. І я скараюся гэтым мяккім, пяшчотным рухам, гэтым пяшчотным рукам — чую іх цяпло, жывое, знаёмае цяпло, і адмякаю, раствараюся ў ім.

«Дзіўна, што гэты твар і гэтыя рукі належаць аднаму і таму ж чалавеку», — думаю я і моцна заплюшчваю вочы, каб не бачыць твару, які нахіляецца нада мной, і — аддаюся ва ўладу рук, ва ўладу поўных сілы, пяшчотных рухаў...»

Неба было такім высокім, што ў Ніны кружылася галава. Тут, на самым пагорку, які, здавалася, уразаўся, рассоўваючы зоркі, у вышыню, яна адчувала, магчыма, упершыню ў жыцці, сваю роднасць не толькі з зямлёй, а і з небам. Іншую радасць, чым у птушак: птушкі ж не ведалі, што значна вышэй, чым яны, высока-высока ляціць зямны карабель, што будучыня ёсць толькі ў людзей, якія вераць у сваю сілу.

Справа была нават не ў веданні — у адчуванні. У адчуванні сілы. У прадчуванні заўтрашняга дня, яго светлай, сонечнай раніцы. Згадка хоць і змусіла яе пачырванець, не разбурала гэтага прадчування: урэшце, усё яшчэ можна было выправіць, усё яшчэ можна было павярнуць, памяняць. Адно, што не трэба з гэтым спяшацца. Дзень, другі, трэці... Жыццё ўсё паставіць на свае месцы. Як паставіла сёння — правёўшы рэзкую рысу між пражытым і не пражытым, між мінулым і тым, што ёсць, што патрабуе ўвагі, разумення ці вырашэння.

Канечне, яна ўсё вырашыць. Яна ж не адна на гэтым свеце. Ёсць Дзмітрыеўна, і цётка Варвара, і Ганька, і Віктар Юр'евіч... Ёсць муж Павэлак і тыя ледзь не два дзесяткі гадоў, калі ён быў побач, калі ён кахаў яе і чакаў, — магчыма, як і яна, Ніна, чакаў гэтага дня, дня балючага душэўнага абуджэння.

Канечне, Ніна ўсё вырашыць. Мо не сёння. Бо дзень ужо даўно дагарэў і на яго папялішчы паўсходзілі буйныя летнія зоркі. Сёння — ужо позна. Але ж будзе і заўтра, і паслязаўтра! Будзе шмат яркіх сонечных дзён і вось гэткіх зорных вечароў, перш чым прыйдзе ў пасёлак азызлая, мокрая восень, перш чым пастукае яна ў дзверы іх дома. Да восені яшчэ ёсць час — добры прамежак часу, — і яна, Ніна, усё паспее, усё вырашыць, усё, што зможа, перайначыць.

Думкі супакойвалі. Ніна нават усміхнулася сваёй упэўненасці — нязвыклай тая была і ад гэтага яшчэ больш прывабнай — і паціху рушыла назад. Дамоў. Узіраючыся і ўслухваючыся ў вечар, у высокае неба, якое, нягледзячы на сваю бязмежную вышыню, здавалася блізкім і зразумелым. Ішла, міжволі ціснулася бліжэй да плота, у густа-ліловыя цені вішань, каб не быць сам-насам з гэтай вышынёй, каб не быць навідавоку, бо сям-там чуліся яшчэ знаёмыя галасы, а Ніне не ха-

целася зараз ні прыпыняцца, ні вітацца з кім з суседзяў: яна ўслухвалася ў сябе, у сваё сэрца — і чула, як тоненька вызвоньваюць высока ўгары раскалыханыя яе хадой зоркі.

Яна пераходзіла ўжо вуліцу, кіруючыся да свайго двара, як пачула нягучнае, патрабавальнае:

— Ніна!

Зіркнула ў той бок, у бок Пахомавай лаўкі, гадаючы, хто б гэта там мог быць у гэткі час — хіба што голасу свайго суседа не пазнала! Зіркнула, але што там убачыш у гэткім змроку? Зіхотка-ліловыя цені вішнёвага голля ды чыясьці цёмная постаць на лаўцы...

— Ды я, я гэта, Пахом, — гукнуў яшчэ раз голас (ну, пэўна ж, Пахомаў!). — Ці не прызнала?

— Не прызнала, Пахом. Вас жа тут як не трое сядзела. Што, паразыходзіліся? — падышла яна бліжэй. — А чаго ты адзін сядзіш?

— Цябе чакаю.

— Мяне?

— Але. Бачыў: Дзмітрыеўна да вас заходзіла, а потым ты за ёй матлянулася паўз нас. Мо што з Пятровічам?

— Не. Чаго гэта раптам? Не, Пахом. Па справе Дзмітрыеўна заходзіла. Абгаварыць адну справу.

— А-а-а... — расчаравана і ўсё ж з палёгкай працягнуў той. — Па справе... А я быў падумаў, мо штоякое здарылася. Пятровіч жа і на вуліцу сёння не выйшаў, як звычайна, пасядзець, пакурыць з намі, пагаманіць. Вось я і падумаў...

— Натаптаўся, мусібыць, за дзень. Па спякоце гэткай — не дзіва. З вамі ж на сенакос заўтра збіраўся.

— Ну, то і добра. Пайду і я класціся: заўтра ўставаць на досвітку. І цябе во дарэмна запыніў... Дабранач!

— Дабранач, Пахом, — абярнулася Ніна са сцежкі.

Да яе вярнулася колішняя трывога: і Пахом нешта нейкае заўважыў — чакаў жа яе, каб папытацца пра Павэлка. А што пытацца? Натаптаўся той за дзень, няйначай, змогся на спякоце, вось і лёг спаць раней. Уставаць жа на досвітку! — вось і лёг раней...

Ні ў хаце, ні ў сенцах святла не было. Гледзячы на цёмныя вокны, Ніна праціснулася ў веснiцы, зябка ўздрыгнуўшы на іх ледзь чутнае рыпенне, звыкла падперла іх напач драўляным бруском (не замок, а ўсё ж

трымае!) і пайшла да ганка. Ішла з думкай, што толькі зірне, ці ў хаце Павэлак, а потым даробіць нязробленае: вынесе ў склеп звараную капусту, апаласнецца, паглядзіць што-якое на сняданак...

## 31

Гучна цікалі ходзікі. Так гучна, што ўздрыгвала, колючыся на светлыя балючыя бліскі, цішыня. Ад гэтых бліскаў ужо ў вачах стракацела, а Павэлак упарта не зводзіў павекі, не заплюшчваў вочы. Павекі гэтаксама ўздрыгвалі на кожны ўзмах маятніка, на кожны перашчоўк. У яго нават мільганула ў нейкі міг жаданне падысці і самаўпраўна, сваёй рукой спыніць гадзіннік — спыніць час, які некуды гэтак спяшаўся, што зусім не зважаў на ўстрывожанага сваімі згадкамі і болем у грудзях чалавека. На яго, на Павэлка, не зважаў.

Не, Павэлка падштурхвала не крыўда, а нейкая няўцямная злосць, такая слабая, што і злосцю яе цяжка было назваць. І ўсё ж — злосць. Ён пазнаваў яе па гарачым калыханні чырвані дзесьці глыбока, за сямю сценамі яго душы, па вострых іголачках, што танцавалі ў кончыках пальцаў, нягледзячы на тое, што ён то сціскаў, то расціскаў пальцы рук, жмакаючы імі край коўдры. Спрабаваў супакойваць сябе, глыбока, на некалькі ўзмахаў маятніка, уздыхаў, затрымліваючы дыханне, змушаў сябе думаць пра заўтрашні дзень, пра лугавіну, затканую высокім квяцістым разнатраўем, над якой узыдзе яркае і на гэты раз нечакана вялізнае сонца. Але думкі слізгалі па згаданым малюнку і знікалі, раствараліся ў гулкім, пакутліва гучным ціканні — і з кожным імгненнем адмірала тканка жыцця.

Колькі такіх тканак ужо адмерла, і ўявіць было цяжка, не тое што палічыць, а ён так і не навучыўся шкадаваць іх — і сябе, урэшце! — адно злаваўся часам, як зараз, на сваё бяссілле: ляжыць, слухае, чакае... Чаго — чакае? Лепш было б заняцца нечым, хоць бы тытуню накрышыць на заўтра — на сенакос жа едзе!

Калі рыпнулі сенцы і Павэлак пачуў лёгкія Нініны крокі, у яго трохі адлягло ад сэрца: ужо ж будзе не адзін, не сам-насам з цішынёй, з ноччу, з гэтым няўмольным часам, які падае кудысьці ўніз — звяно за звяном — за ланцужком ходзікаў — і не дае яму ада-

рваць ад падушкі галаву, і не дае думаць пра заўтрашні дзень. Бы ёсць толькі гэтая ноч — гэтыя хвіліны — гэтыя імгненні... Не, не! Цяпер і ходзікі прысмірэюць, і думкам стане слабадней: Ніна праводзіла Дзмітрыеўну і вярнулася. Цяпер стане лягчэй. Так было заўсёды, калі Ніна прыходзіла дамоў і, няхай не словамі, дыханнем сваім запаўняла пусты пакой, запаўняла яго чаканне. Чаго ён чакаў?

Павэлак напружана ўслухваўся ў гукі: вось яна запаліла ў сенцах святло і бразнула накрыўкай каструлі, вось шырока прачыніла ў хату дзверы і на міг аціхла, не пераступаючы парог, напэўна, узіраючыся ў паўзмрок, у яго, Павэлка, — ці на месцы? — і ціха адступіла назад. Дзверы не зачыніліся шчыльна, і было чуваць, як Ніна тупае па сенцах, ля керагаза, як яна, прыхапіўшы каструлю (зноў ціхенька бразнула накрыўка), пайшла ў склеп і потым доўга плёскалася пад рукамыйнікам, стараючыся рабіць гэта як мага цішэй. Гукі былі невыразныя, пазнаваў іх Павэлак хутчэй па звычцы, — і ўсё ж час гаспадарыў ужо ў хаце не з гэткай рашучасцю, як раней, колькі хвілін назад.

Дыханне ў Павэлка выраўнялася, рукі супакоіліся і, свабодна распасцёртыя паверх коўдры, адпачывалі. Толькі павекі па-ранейшаму бяссонна ўздрыгвалі, не даючы яму заплюшчыць вочы, адгарадзіцца ад неспакойна пражытага дня і ад ночы, што насоўвалася на яго аграмадным, цяжкім ценем. Гэты цень будзе калыхацца над ім, то ўціскаючы ў ложак, то адпускаючы, да самага світання, да пеўняў, якія прагоняць сваім крыкам змрок і разбудзяць сонца. Не адну такую ноч без сну мог бы прыгадаць Павэлак. Ён ужо нібыта і звыкся са сваімі частымі бяссонніцамі — не палохаўся іх, але кожны раз адно толькі прадчуванне гэткай ночы — цэлай ночы наперадзе! — абяссільвала яго, напаўняла бяссільнай злосцю, якую трэба было хаваць, не даць адчуць яе Ніне.

Для Ніны — Павэлак спаў. Роўна дыхаў, толькі ледзь-ледзь затрымліваў дыханне, калі яна набліжалася, калі яна, нячутна адхінуўшы коўдру, укладвалася побач.

Ён і зараз ледзь-ледзь затрымаў дыханне пасля таго, як яна ў цемнаце, не запальваючы святла, распранулася і на яго дыхнула свежасцю яе цела. Павэлак бачыў, як цьмяна акрэслілі вокны на міг яе светлы абрыс

(«Няйначай, лілея на цёмнай вадзе!» — падумаў, як заўсёды думаў ён у падобны момант), і міжволі заплюшчыў вочы. Вось толькі зараз заплюшчыў, баючыся напалохаць Ніну нават позіркам. Для яе — ён спаў.

Гучна цікалі ходзікі. Праўда, зараз Павэлак зважаў хутчэй не на іх гучнае цікание, а на гучныя і, як здавалася яму, няроўныя ўдары свайго сэрца. Маўчаць побач з Нінай, прытварацца абыякавым або сонным, ён навучыўся — быць абыякавым побач з ёй, так блізка ад яе, не мог. Нічым не паказваў, не выказваў свайго хвалявання і— хваляваўся, бы кожны раз яму трэба было наноў заваёўваць Ніну, яе згоду знаходзіцца, жыць побач з ім, дзяліць з ім гэты ложак. Дык так яно, па сутнасці, і было: ніколі не ведаў Павэлак пэўна, ці адгукнецца Ніна на яго слова, на яго ласку. І таму часцей маўчаў. Часцей — чакаў...

Ніна лягла. Гэтак жа ціха, бязгучна, як заўсёды. Варухнулася лёгкая коўдра, мякка спружыніла, прымаючы яе, пасцель. Уздыхнула, адхлынуўшы ад ложка, цішыня. А Павэлак усё не мог расплюшчыць вачэй, баючыся напалохаць Ніну нават позіркам...

«— БУДЗЕ ТОЕ, ШТО БУДЗЕ, А БУДЗЕ, ШТО СУДЖАНА. Суджана мне гэта, значыць. Лёсам суджана. Ты, Вера Дзмітрыеўна, — доктарка, не табе пра тое казаць. Адна справа — косткі выправіць, другая — душу растаптаную сабраць... Вы ж, дактары, ні ў бога, ні ў чорта, ні ў чалавека не верыце.

— А вы, Пятровіч, верыце? Адкінем бога і чорта! У чалавека — верыце?

— У сябе — веру.

Кажу цвёрда. Не толькі каб адказаць ёй або сабе, а каб сцвердзіць сваё рашэнне. Зараз і назаўсёды. Цярпеннем усяго можна дамагчыся — адно хапіла б цярпення! У мяне — хопіць. І цярпення, і сілы, каб несці ношку за дваіх. І няхай гэтая доктарка (бач, з гэткіх гадоў — ужо Вера Дзмітрыеўна!) не думае, што, ўратаваўшы мне жыццё, вылечыўшы пасля ранення, можа прадыктаваць мне ўсе мае далейшыя ўчынкі і рашэнні. За жыццё, за лекі — удзячны ёй да скону... Дзякуй. Як кажуць: калі спатрэбіцца... А тое, як мне жыць далей, апроч мяне, ніхто не можа ведаць. І ўсё. І кропка.

Сказаў ёй цвёрда. А яна ўсміхаецца:

— Малавата, галубок, веры ў сябе. Малавата, прама скажам.

— Верыць у сябе — гэта і ў другога верыць. Правільна? — усміхаюся і я. — У адну веру мы ўсе ахрышчаны, Вера Дзмітрыеўна: чалавек — чалавекам жывы, таварыствам людскім трымаецца. У законе нашым гэта запісана, вайной гэты закон праверапы. Правільна?

— Правільна, Пятровіч. Калі ўвогуле браць — правільна. А калі не ўвогуле, галубок, дык застанецеся: вы — і Ніна. І Ніпіна каханне да Сцяпана — паміж вамі.

— Сцяпапа няма. Ён мёртвы.

— Гэта не мае значэння.

— Прабачце, як гэта не мае значэння? Ён — загінуў. Ён даўно ўжо мёртвы. А Ніна... Ніна жывая. Маладая. Адна. У цэлым свеце адна. Ніводнай роднай душы жывой у яе няма. Як гэта не мае значэння?

— Каханне — страшная сіла. Бязлітасная сіла, Пятровіч, калі яна супраць цябе скіравана. Калі яна, гэта сіла, не стварае, яна — разбурае, рушыць усё ў чалавеку. На падман чалавек пойдзе, на злачынства, нават на забойства, калі дасць ён парушыць у сабе, у душы, штосьці крохкае, чыстае.

— Нешта я тут не разумею. Гэта папярэджанне, ці як? — не хаваю я раздражнення, шкадуючы, што ўлез у гэту гаворку.

— Ніна — жывая. Маладая. Прыгожая. Адна ў цэлым свеце. Усё так, Пятровіч. Але Ніна — хворы чалавек, у яе вельмі глыбокая душэўная дэпрэсія, ад якой я на працягу ўжо чатырох гадоў не магу яе вылечыць і, магчыма, наогул не вылечу. Кажу вам гэта як урач. На што ж вашы спадзяванні?

— Ты хочаш, Вера Дзмітрыеўна, каб я адступіўся?

— Я не ведаю... Я хачу, каб вы, Пятровіч, яшчэ раз усё ўзважылі, прадумалі. Новага спусташэння Ніна не перажыве. І вы... Вам будзе цяжка, галубок, так цяжка часам, што вы можаце пашкадаваць...

— Няўжо ж адступіцца, распяць сябе на гэтай здрадзе — лягчэй?

— Здрадзе?

— Сама ж кажаш: хворая Ніна. Душэўная... пустата ў яе пасля ўсяго перажытага. Я адступлюся, другі адступіцца, трэці... Куды ёй з сабой, з гэтай... пус-

татой? Куды? Пяць гадоў за ёй хадзіў. Суджана мне, значыць.

Нешта я разгаварыўся! Ці не таму, што ў самога сумненне не адно? Ліха яго ведае як яно там будзе, як павернецца. Здурэў, няйначай, што дзеўкі пяць гадоў дамагаюся... Нават доктарка мяне не разумее. А яна ж сама ля Ніны не адзін год ходзіць. Здурэў, брат... Стаю, разважаю, а сам на ганак бальнічкі паглядаю: калі Ніна выйдзе? На чацвёрты дзесятак пайшло даўно, дзяцей поўная хата павінна б ужо быць, а я ніяк яшчэ даваенны мазоль з сэрца не зрэжу. Ужо і не зрэжу, відаць. Да жадання — яшчэ шкадаванне... Поўная нявыкрутка, дарагая доктарка!

— Ніна не любіць вас, Пятровіч. Можа, ніколі не палюбіць, — адводзячы позірк, быццам саромеючыся таго, што кажа, працягвае пачатую гаворку Дзмітрыеўна. — Вы не баіцеся гэтага?

Ну-у! Гэта яна ўжо да маёй душы дабіраецца! «Вы не баіцеся?..» Баюся. Ды так я табе гэта і скажу! Не любіць — дык палюбіць. Чаму мяне не палюбіць? Чаму? Калі я да яе з пяшчотай, з ласкай, калі я да яе з душой адкрытай, дык і яе душа адгукнецца, ажыве. А шмат мне і не трэба: я ўсё сам... Сам! Сам удыхну ў яе цяпло. Не хопіць цяпла — душу сваю ўдыхну. Ды так я табе, Вера Дзмітрыеўна, гэта і скажу!

— Што? — раблю выгляд, што не пачуў пытання.

— Вы не баіцеся, што Ніна не палюбіць вас? Ніколі не палюбіць...

— Чаму ж, Вера Дзмітрыеўна, ніколі? — змушаю сябе ўсміхнуцца, і ўсміхнуцца як мага святлей. — Жыццё не такое кароткае, як мы прывыклі думаць. Цяпер, пасля гэткай вайны, мы будзем доўга-доўга жыць. І ніхто не ведае, як што павернецца.

— Што ж, у вас, галубок, ёсць права так гаварыць. І так лічыць.

— А хіба ў вас.. у цябе...

— Я — іншая справа, Пятровіч, — перапыняе яна мяне, не даўшы скончыць пытанне. — Мой Іван таксама загінуў. Вы ж ведаеце! Ён — загінуў. Ён даўно мёртвы. А каханне маё да яго — жыве. Жывое яно ўва мне. Таму і сказала вам тое, што сказала.

— Прабач, Дзмітрыеўна, калі што не так... Толькі і я шчыра казаў, — мармычу я свае прабачэнні, разу-

меючы, што нечым (можа, тонам?) пакрыўдзіў яе. — Я шчыра...

— Ды чаго там! Усё я разумею. З павагі да вас, Пятровіч, і любячы Ніну, спрабавала штосьці змяніць, папярэдзіць.

— Што тут зменіш?

Пытаюся горка. Не чакаючы адказу. Ведаючы адказ. У прыгожыя словы адказ не здолеў бы загарнуць — зроду не ўмею! — а ведаць ведаю. І таму стаю тут, у бальнічным двары, ва ўсёй бальнічкі на вачах, як кажуць, чакаю Ніну, каб моўчкі праводзіць яе да цёткі Грыпіны, у якой Ніна жыве за дваццаць рублёў у месяц, каб узяць яе халодныя рукі ў свае і сагрэць іх, каб зноў, у які ўжо раз, запытацца: «Ты не вырашыла яшчэ, Ніна?..»

— Вы любіце казкі, Пятровіч?

— Каз-кі? Якія казкі? — уздрыгваю я ад нечаканасці, ад нечаканага пытання, падазрона зіркнуўшы на доктарку, пажартаваць са мной уздумала, няйначай...

— Ну, хоць бы рускія.

— Смяешся, Вера Дзмітрыеўна. Грэх табе смяяцца... Хто гэта мне калі казкі баяў? Малым быў — цётка адно глядзела, каб спіну спраўна гнуў, каб лынды не біў. Урок часам недавучыш, не тое што казкі расказваць. А ты...

— А я хачу адну казку вам расказаць, не сваю — народную. Мама мне яе часта расказвала, пакуль жывая была...

— А-а! — супакойваюся я: не смяецца, маці згадвае. — Толькі з чаго гэта раптам у нашай гаворцы казка спатрэбілася?

— Добрая дужа казка. Ніна забавілася з нечым, а вы, пакуль яе чакаеце, паслухаеце. Як?

— Чаго ж не паслухаць, калі добрая, — адгукаюся, зручней прываліўшыся да гонкай таполі, пад якой мы стаім, і разглядаючы доктарку: вось, здаецца, ведаў пра яе гордасць, пра яе ўмелыя рукі, пра яе востры язык — ледзь не тры гады ў адным атрадзе ваявалі! — а гэткай рыскі, выхавацельскай, ніколі не заўважаў. Трэба — і голас павышала, і так магла адбрыць самага што ні на ёсць глухога да ўсякіх слоў, што ў таго вушы чырванелі. А вось каб казкі расказваць... І каму? Мне? Ледзь не на дзесяць гадоў старэйшаму за яе?

— Было ў бацькі трое сыноў. Калі прыйшоў час жаніць іх, ён выбраў вышэйшае месца, і даў ім лукі і стрэ-

лы. «Кожны з вас павінен пусціць стралу, і куды ўпадзе страла, там ён знойдзе сваю суджаную», — мовіў, і сыны не пасмелі аслухацца. І — двое старэйшых займелі, што хацелі, — дзявок дзябёлых з пасагам немалым, а меншы, Іван, доўга расшукваючы стралу, знайшоў яе ў балаціне: лягушка яе трымала. Засмуціўся ён, а лягушка і кажа яму чалавечым голасам: «Не сумуй, Іван, бяры мяне ў хустачку і нясі да бацькі, у бацькаў дом».

Што таму было рабіць? Загарнуў яе ў хустачку, панёс да бацькі: сам жа знайшоў сабе суджаную! Спачуваў яму бацька, смяяліся з яго браты, а жыць трэба было. І жыў Іван, і хутка пераканаўся, што не простая гэта лягушка, а цароўна зачараваная. Што можа яна скуру скінуць і абярнуцца дзяўчынай-красуняй, каб бацьку яго самы лепшы хлеб спячы, самы лепшы ручнік саткаць. А аднойчы, паверыўшы ў добрае Іванава сэрца, у любоў яго, скінула лягушка сваю скуру, каб у госці да бацькі пайсці, на званае свята, — і ўсе вачэй з яе не зводзілі, любаваліся ёю. А Іван... Не сцярпеў Іван, пабег дамоў, знайшоў скінутую скуру і кінуў яе ў агонь. Спаліў.

Горка-горка сказала яму суджаная: «Што ж ты не пачакаў трошкі, Іван? Чарам канец прыйшоў бы... А зараз шукай мяне за трыдзевяць земляў і мораў. Бывай!» Сказала і знікла. І шмат дзён і начэй ішоў па свеце Іван, шукаў цароўну-лягушку...

— Знайшоў? — цікаўлюся я, бо Дзмітрыеўна нечакана змаўкае.

— Знайшоў. Пасля доўгіх пошукаў, — пачынае яна выціраць акуляры, зусім так, як выціраюць слёзы на вачах. — Толькі ж гэта ў казцы знайшоў, а ў жыцці...

— У жыцці гэткага не здараецца.

— Чаму ж не здараецца, Пятровіч? Пра любоў гэта казка. Не скуру лягушкі Іван спаліў неасцярожна, а любоў. Ці мала хто ў жыцці гэтак са сваёй або з чужой любоўю абыходзіцца? А?

Мусіць, я вылупіўся на яе, не здолеўшы схаваць бязмернага свайго здзіўлення (бач, як павярнула!), бо Дзмітрыеўна неяк горка ўсміхнулася і, адварочваючыся, каб ісці ў сваю бальнічку, ціха дадала:

— Казкі складаліся не толькі для малых, галубок.

Разгублена пазіраю ёй услед: бач, як павярнула! Гэта ж, выходзіць, пра Ніну яна мне казала. Пра мяне

і пра Ніну. Мо і казку паралгала, пераіначыла, каб больш пераканаўча было. Хоць не. Наўрад. Не так гэта проста — казку перайначыць. Была, значыцца, гэтакая гісторыя, калі людзі казку пра цароўну-лягушку склалі. Складна склалі, ліха на яго. Якраз як пра мяне і пра Ніну. І пушчаная страла тут ні пры чым, відаць... Сам жа даводзіў доктарцы, будзе тое, што будзе, а будзе, што суджана. Сам жа...»

Варухнулася коўдра, мякка спружыніла, прымаючы Ніну, пасцель. Уздыхнула, адхлынуўшы, нарэшце, ад ложка, цішыня. А Павэлак усё не мог расплюшчыць вачэй, баючыся напалохаць Ніну нават позіркам. Слухаў лёгкае яе дыханне, кожны яе рух. Здавалася, чуў нават, як б'ецца жылка ў яе на скроні... Хоць не. Гэта спакойна, упэўнена цокалі імгненні, перабягаючы ноч, і то спалучалі, то раздзялялі яго з Нінай — два іх дыханні, два іх бяссонні. Бо Ніна таксама не засынала: гэта Павэлак адчуваў па тым, што ў ім не аціхала хваляванне, не аціхала жаданне дакрануцца да яе, пяшчотным дотыкам пальцаў сказаць ёй... Усё роўна што сказаць, абы яна адчула яго цяпло, яго пяшчоту.

Ніна таксама не засынала — Павэлак быў упэўнены ў гэтым. Калі яна спала, ён дыхаў раўней, ён не чуў салодкага, казытлівага пакалвання ўздоўж па ўсім целе — супакойваўся і проста думаў пра яе, і слухаў ноч, чакаючы, пакуль закрычаць пеўні, і можна будзе ціха падняцца, падысці і сесці ля акна, узіраючыся ў золак, а то і выйсці на ганак — патупаць там, пакурыць...

Ніна зварухнулася? Падалася крыху да яго? Не, відаць, яму проста пачулася: занадта напружана Павэлак услухваўся ў кожны рух. Але чаму тады гарачая хваля ўжо залівала яго, блытаючы думкі, абрываючы дыханне? Чаму рванулася, пачало расці, павялічвацца сэрца, набухаючы жарам? Міжволі рука на коўдры ўздрыгнула, пасунулася туды, дзе рвалася з грудзей яго сэрца. І тут... Павэлак выразна пачуў: Ніна хінулася да яго. Асцярожна. Нібыта неўзнарок. Нібыта ў сне, калі хінешся да таго, хто прыцягвае, хто кліча, і — немінуча правальваешся ў пустату. Міг, другі...

Павэлак чакаў. Вось ужо кранулася яго нагі Ніна халаднаватая нага, злёгку ўздрыгнула і засталася там, адаграваючыся, цяплеючы. Вось ужо Ніна павярнулася да яго, апякла зусім нячутным цяпер дыханнем яго шча-

ку. Вось ужо крануліся яго... Не, больш ён не вытрымаў. Расплюшчыў вочы, адкінуў край коўдры, за які чапляўся дрогкімі пальцамі, памкнуўся насустрач Нінінаму руху, прыняў яе ў кола рук, прыгарнуў, прыціснуў да сябе. Слёзы цяклі ў яго па шчоках. Ён баяўся, што Ніна заўважыць іх, не зразумее, чаму ён раптам заплакаў, і таму гарнуў яе да сябе ўсё шчыльней, прыціскаў усё мацней.

— Цароўна-лягушка...

— Што? — не зразумела Ніна, пытаючыся амаль бязгучна, самімі вуснамі.

Але Павэлак не адказаў. Ён цалаваў Ніпіны валасы, удыхаючы іх ільняны пах, раствараючыся ў гэтым паху і ўсведамляючы адно, толькі адно: ён кахаў Ніну, ён усё жыццё кахаў яе адну, ён ніколі не кахаў яе так, як сёння, як зараз...

## 32

Ніна прачнулася ад дотыку сонца, ад дотыку цёплага сонечнага праменьчыка. Расплюшчыла адно вока: сонца; расплюшчыла другое вока: сонца! У хаце гаспадарыла летняя сонечная раніца. Ніна засмяялася: яна, гаспадыня, спіць, а шчыруе, завіхаецца вакол яе само сонца. Нязвыклая карціна!

Ускочыла з ложка. Засаромелася сваёй галізны (так і заснула ўчора): гэта ж белы дзень на двары, Павэлак з мужыкамі, напэўна, ужо двойчы косы адкляпалі... Падумала: трэба накінуць што, але толькі ціхенька зноў засмяялася і апрануцца не кінулася. Пакасілася на люстэрка: падысці? Вось так, як ёсць, як стаіць, — падысці? Ніхто ж, урэшце, ніадкуль не падглядваў, а самой сябе чаго ж саромецца?

У яе — чула! — загарэліся шчокі, і ўсё ж цікаўнасць перамагла. Ніна, нерашуча заплюшчыўшыся, ступіла да люстэрка. Адкрыла вочы — і засмяялася: тая, саракагадовая жанчына ў люстэрку ёй спадабалася. Белае, нідзе не кранутае загарам цела было маладзейшае за яе, вось так: не ўціснутая ў спадніцу і кофтачку з адкладным каўняром, які яна сцягвала тасёмкай, і завязвала невялікім банцікам пад самым падбародкам, Ніна выглядала зусім інакш. Няйначай, дзяўчо... Калі яшчэ валасы распусціць!

Кранула сколатыя ў вузел валасы, і тыя рассыпаліся па плячах, надаючы Нініламу крыху разгубленаму зараз твару зухаваты, надта ўжо нязвыклы выраз. Ніна ўпершыню падумала пра сябе: прыгожая, сапраўды прыгожая! І падумаўшы, сумелася: замест таго каб устаць з пеўнямі, сабраць і праводзіць мужа на работу, качалася ў ложку, а потым стала перад люстэркам, бессаромна ўзіраецца ў выгіны цела... Зіркнула на гадзіннік: палова восьмай. Замітусілася. Трэба было паспець на аўтобус.

Па твары яе блукала ўсмешка, але Ніна даўно ўжо не паварочвалася да люстэрка — таму не бачыла гэтага. Адчувала незразумелую ціхасць у сабе: радавалі самыя простыя рухі, самыя простыя клопаты. Нават паспешлівасць, з якой збіралася ў дарогу, была прыемнай і стрымлівалася ўпэўненасцю, што ўсё яна паспее: з'ездзіць і вернецца, і заўтра пачнецца не проста новае жыццё — жыццё. Якое яно, яе заўтрашняе жыццё, адсюль, з гэтай раніцы, не ўбачыць, ды гэта стане ясна заўтра. Чакаць было нядоўга: міне толькі гэта раніца, міне гэты дзень, і ўсё — і можна будзе ступіць насустрач таму, што ўжо чакае яе, што столькі гадоў чакала яе, Ніну.

Недзе за гэтай думкай, так глыбока, што здавалася невыразным водгуллем ужо даўно мінулага, мільгала трывога, нейкае трывожнае пытанне, але нашто было ў яго ўслухвацца, калі ва ўсе вокны глядзела сонечная раніца, калі ўсё вакол дыхала ціхасцю, ціхай, амаль неўсвядомленай радасцю?

Прымкнула дзверы. Перабегла двор, усміхнуўшыся нізкаму, негарачаму яшчэ сонцу. Зачыніла за сабой веснічкы і абвяла позіркам вуліцу. У густым росным цені, якім адгароджвалася ад вуліцы старая ліпа, гагаталі чыесьці гусі. У завулак, які вядзе да школы, заварочвала вясёлая гурма школьнікаў, дзесяцікласнікаў (у іх заканчваліся сёння экзамены). Уніз, у бок станцыі, каціўся хтосьці на чырвоным (Ніна і не ведала, што ёсць гэтакія!) веласіпедзе. Звычайная, звыклая для вачэй вулічная сцэнка, у якой і яна самым непасрэдным чынам прымала ўдзел. Бо марудзіла ўсяго колькі імгненняў і вось ужо ішла ў бок станцыі, дзе, калі перайсці праз чыгунку, спыняўся цёмна-сіні, вастраносы аўтобус, якім можна было даехаць да Запярыння, да запярынскай развілкі. Мінула ўжо адзін правулак, другі, мінула

скверык, што молада кусціўся за невысокай агароджай, і калодзезь з прыгожай стрэшкай, аздобленай узорамі і разьбяным вільчаком над ім — Гнасевай работы. Мінала пошту, як за колькі крокаў ад яе ступіла з дзвярэй на сцежку паштарка. Марфа, здаецца, — прыгадала Ніна яе імя і павіталася.

— Добры дзень, добры дзень, — заўсміхалася тая, папраўляючы на плячы сумку. — У Мінск, нябось?

— Не, — коратка адказала Ніна і не прыпынілася.

Марфіна пытанне дагнала яе з-за спіны. Спачатку ёй здалося, што яна папросту недачула.

— Што гэта за пісьмо атрымаў учора Павел Пятровіч?

— Пісь-мо? — спатыкнулася Ніна, і спынілася, і ўсё ніяк не хацела павярнуць галаву, азірнуцца — бы знарок марудзіла: мо недачула што...

— Ага.

Яна ўсё-ткі павярнулася. Убачыла, што Марфа крыва пасміхаецца, і нечакана супакоілася. Неяк адразу. Чаго, запытацца, гэтак адкрыта здзівілася? Ну, не атрымліваў ніколі раней Павэлак ні ад каго пісьмаў. Ну, атрымаў ён учора пісьмо раптам. І што?

— І што? — спакойна перапытала паштарку.

Тая на момант сумелася. Чакала, пэўна, іншага пытання, чакала цікавасці да навіны — была ж у душы, няйначай, упэўнена, што не сказаў Павэлак ёй, Ніне, пра пісьмо.

— Ды нічога, — заспяшалася Марфа. — Разгублены нейкі быў. І канверт... жаночым почыркам быў падпісаны.

Закончыла Марфа з выклікам, націскаючы на «жаночым», і, не зірнуўшы на Ніну, пайшла. У адваротны бок. Ніна праводзіла яе недаўменным позіркам: штосьці ж хацела сказаць, сказала... Ат! Што яна там сказала? Пісьмо... Жаночым почыркам... Ведама ж, спецыяліст па почырках! Мо сама...

Што — сама, Ніна недадумала. Збаялася. Ды і бегчы трэба было — аўтобус праз колькі мінут адыходзіў.

Прыспешыла крокі. Раз і другі раз павяла на хаду плячыма, быццам атрэсвалася ад наліплага да спіны Марфінага, хоць і ўсмешлівага, але злоснага — раўнівага — позірку. Ніколі ж тая раней не зачапіла Ніну, ніколі і словам не абазвалася: павітаюцца, як выпадзе

сустрэцца, і разыдуцца. Кожная па сваіх справах. Кожная ў свой бок. Нічога іх ніколі не звязвала. Нічога ім ніколі па трэба было дзяліць. І раптам — цікаўнасць, цікавасць да яе, Ніпінага, жыцця, да яе сям'і: ці мала каму штодня носіць Марфа пісьмы! Што ж яна за ўсімі заўважае радасць, або разгубленасць, або недаўменне?

Думаць пра гэта не варта было: жанкі ўсе адна да аднае скрозь раўнуюць — ці ёсць з-за чаго, ці няма з-за чаго. Скрозь іх вочы самі вышукваюць, за што зачапіцца, скрозь іх словы самі сябе абганяюць, не даючы саспець тлумачэнню альбо хоць бы думцы якой-ніякой. У самой прыродзе іх жаночай гэтая рэўнасць. Думаць пра гэта не варта было. А чамусьці — думалася.

Ды і пісьмо, пра якое ёй нічога не сказаў Павэлак... Мажліва, яно і было прычынай Павэлкавай і яе, Ніпінай, няўцямнай трывогі. Мажліва, яно і было прычынай. «Мо не ехаць нікуды сёння?» — мільганула думка. Мільганула і знікла, адгароджаная іншай, спакайнейшай: «Павэлак жа на сенакосе з мужыкамі, вернецца толькі ўвечары...»

«— КАМУ ШАНЦУЕ, ТАМУ ПАДЧАС І ВОЎК КОНІ ПАСЕ. Вось ужо праўду кажуць, любка мая. Сёння ніхто, мабыць, і не помніць, што дзед ягоны ў пана наглядчыкам быў. Тры скуры з мужыкоў не драў, але службу, бацька расказваў, спраўна спраўляў: што трэба было з каго ўзяць — браў, нікога не шкадуючы.

— Калі тое было, Варвара? — абзываецца мама, косячыся ў мой бок: ці чую?

Бачу гэты яе рух праз няшчыльна прыкрытыя павекі і пачынаю прыслухвацца. Так, каб было незаўважна. Ляжу на свежым сене, па-ранейшаму шырока раскінуўшы ўтомленыя рукі, па-ранейшаму прыкрыўшы вочы, адпачываю: столькі сена перавярнуць, падгрэбці! — ніякага дзіва тут няма.

— Калі б ні было, а было. І бацьку яго, Пётру Спірыдоныча, усёй грамадой раскулачвалі, за свет некуды саслалі. А вось жа яго, малога, не зачапілі. Колькіх цэлымі сем'ямі высялялі, а яго — цётка, былая параабчанка ў свайго роднага брата, адстаяла, пры сабе пакінула. Дзе б ён быў зараз, любка мая, каб інакш павярнулася?

— Дзеці ж за бацькоў адказу не павінны несці.

— І я кажу. Канечне, не павінны. Ды толькі не ўсім гэтак пашанцавала. Вось я пра што.

— Ат, Варвара! Якое там пашанцавала? Цімох казаў: з малых гадоў той парабкам быў пры сваёй цётцы — дарма што дзіця, усю мужыкоўскую работу па гаспадарцы рабіў. Не запярэчыў ёй і словам ніколі. Ногі цалаваў за тое, што ў школу аддала.

— Адкуль Цімоху ведаць, як там што было?

— Ад людзей, Варвара. Не глядзі, што пасёлак нібыта і не пад бокам, ад людзей нічога не ўтоіцца. Блізка, далёка — адзін у аднаго на вачах жывём.

— Хіба што так, любка мая. Хіба што так. Вось жа кажуць: сватоў Пятровіч хоча заслаць — Ніну вашу нагледзеў...

Я наструнілася. Уціскаюся ў мяккае сена, з усёй моцы стрымліваюся, каб не зварухнуцца, не паказаць, што ўсё чую, што хачу далучыцца да гаворкі. Мама, відаць, яшчэ раз азіраецца на мяне, бо пераходзіць на шэпт:

— Хацець-то ён хоча, Варвара, ды Ніна мая ў яго бок не пазірае, дарма што той пры пасадзе...

— Пасада — што? Пасаду далі, дык і забраць заўсёды могуць. Як ужо, любка мая, паны за сваё чапляліся, а ні грошы, ні гербы ім не дапамаглі — паскідалі! Пасада — што? Чалавек па яго пашане да зямлі, да ўсяго жывога на зямлі відаць.

— Якая ўжо там пашана! Праца ды праца, з рання да вечара.

— Праца і ёсць пашана, Ганна. Словамі палетак не ўробіш.

— Але. Словамі не ўробіш.

Яны змаўкаюць. Чуваць толькі, як шабуршыць сена. Ці то ад чыйгосьці неспакойнага руху, ці то ад майго неспакойнага дыхання. Ды яшчэ мама ўздыхае колькі разоў, разважаючы як не пра сваё, дык пра штосьці маё, цьмянае і мне невядомае.

Крыху разляпляю павекі і, стрымліваючы іх трымценне, бачу пухнатую, няроўную па краях аблачынку. Так нізка, што, здаецца, гэта яна, прыляпіўшыся да павек, і перашкаджае мне адкрыць вочы, атрэсці млявасць і ўтому, прыняць удзел у гаворцы (тады б гаворка не зачапіла мяне!). Тата з мамай вольныя вырашаць мой лёс, як вялося і дасюль вядзецца, але ж і я, я сама гэтаксама штосьці вырашаю. Пра мяне ж турбота, пра

маё жыццё — не з гэтым жа даўганогім, насатым Пятровічам мне яго дзяліць! Хадзіў, хадзіў паўз двор і ў двор — вось ужо і пра сватоў гаворка...

— Мо б ён і зяцем неблагім быў, Варвара. Хто яго ведае па сённяшнім часе? І Цімох мой гэтак кажа. Ды ў дачкі да яго сэрца не ляжыць. Ад мяне ж не ўтоіш. Бачу. Як жа.

— Сабе пад пару шукае. Яно і судзіць за гэта грэх, любка мая: кожны па сабе шукае, па сабе мерае. Толькі сэрца ў тым благі дарадца. Дзявочае сэрца — як вясновы клейкі лісточак, да каго прылепіцца, да таго і прырасце.

— Вой, Варвара, не ведаю, што і рабіць, — зусім ціха, ледзь чутна завойкала мама. — Вой, прадчуванне ў мяне нейкае нядобрае. І па-свойму вырашаць не хочам — адна ж яна ў нас! І на яе спадзявацца страшна. Маладзенькая, прыгожая, вольналюбівая... Вой, ды ты ж усё сама бачыш, Варвара! Было б у мяне іх трое, пяцёра... Мо б меней трывожылася...

— Адно ці трое дзяцей, любка мая, — трывога адна. Мы — у старасць ідзём, яны — у жыццё. А як тое жыццё для іх павернецца, якім бокам? Каб жа ведаць наперад!

— Раней да папа з гэтым ішлі. Дапаможа не дапаможа — спадзяваліся: богу той усё перакажа, просьбы ўсе, малітвы ўсе нашы яму перадасць. А сёння...

— Дык і сёння ж дарога да папа вядомая.

— Вядомая яна вядомая, ды мала хто цяпер па ёй ездзіць, Варвара. Што поп, як веры няма? Рука помніць, як крыж пакласці, а душа спакою не ведае: сумненне ў душы.

— Тое і яно, — уздыхае цётка Варвара і падымаецца. — Пайшлі, Ганна. Мо ўправімся да вечара.

Мама азіраецца, пэўна, на мяне і, вырашыўшы пакуль што не чапаць, падымаецца ўслед за ёй.

— Хай паспіць яшчэ колькі мінут, — апраўдваецца за мяне перад суседкай. — Пройдзем туды ды назад — разбуджу...

— Шкадуеш дужа... Ды няхай, няхай паспіць!

Хачу ўскочыць, сказаць, што не сплю, што ўжо адпачыла і гатова завіхацца з імі побач, крыху папярэдзе, — не дазваляе адчуванне хай сабе і невялікай, але віны: прытварылася соннай і падслухвала — падслухала іх

размову. Калі б яшчэ штосьці, што мяне не тычылася, а то: Пятровіч — я — сваты ў двор — дзявочае сэрца... Як гэта можна ўявіць дзявочае сэрца клейкім лісточкам? «Да каго прылепіцца, да таго прырасце...» Бач ты! Не цётка Варвара, а гэты... гэты... паэт, адным словам! А галоўнае, і праўда: можна ўявіць сабе дрогкі лісточак, што ад дыхання, як ад ветру, б'ецца, шапоча аб нечым у грудзях. Вунь як той, на алешыне, непадалёку, — можна рукой дацягнуцца...

Не, рухацца, зварухнуцца, перашкаджае млявасць — салодкая млявасць, што разлілася па целе і ледзь прыкметна пагойдваецца, калыхаецца ўва мне. Магчыма, яна пагойдвае і адьховы лісток крыху правей ад позірку, ды гэта ўжо менш цікава, чым тое, што ўва мне, унутры, з левага боку, там, дзе сэрца. А там — шум, шапаценне, штуршкі — быццам хто мяне ўвесь час расштурхвае: жы-ві! жы-ві! жы-ві!

А я і жыву. Буду доўга-доўга жыць, колькі змагу. І мама будзе. І тата. І цётка Варвара. І гэты Пятровіч даўганогі. Усе, каго ведаю. І ўсе, каго не ведаю. Гэта ж так радасна — жыць! Гэта ж так добра, што нават страшна. За што чалавеку — вось мне! — дадзена ўсё? За што? І нашто? Нешта ж і я павінна аддаць, аддаваць штодзень, штоміг? Што? Працу? Радасць сваю? Любоў да ўсяго: да лісточка, да алешыны, да лугавіны гэтай, да зямлі, да людзей? Што?

Ну, ды я гэта, пэўна, яшчэ зразумею. Буду доўга-доўга жыць, колькі змагу, — і ўсё зразумею. І пра сябе. І пра ўсіх. І пра гэты вось летні дзень, высока над якім — і нада мной! — вісяць жаўранкі. Невядома колькі — шмат — жаўранкаў. Званочкаў, што ўсё вызваньваюць, выспеўваюць: жы-ві! жы-ві! жы-ві! Вось я і жыву. Вось я і жыву...»

— Грамадзяначка, да раёна едзеце, ці як? Ці мо аўтобус зблытала? З маладымі і прыгожымі гэтакае здараецца.

Ніна сумелася. І ад слоў круглатварага, з цёмнымі круглякамі вачэй шафёра, і ад усмешак пасажыраў, тых, хто пачуў. А яшчэ ад таго, што задумалася і нават не ўсвядоміла, як падкаціў аўтобус і яна ўціснулася ў яго нешырокую са слізкай, пагнутай прыступкай дзверку. «З маладымі і прыгожымі...» Бач, утаропіўся сваімі круглякамі!

— Вазьміце за білет, — ледзь не са злосцю падала таму Ніна драбязу. — Мне да запярынскай развілкі.

— Ага, — заўсміхаўся шафёр, і твар яго ад усмешкі яшчэ больш пакруглеў (гарбуз, няйначай!). — Тады парадак. Тады паехалі. А то я думаў...

Што ён думаў, Ніна не даслухала. Пачала прасоўвацца ўглыб, туды, дзе побач з сухенькім дзядком з бародкай, што, здаецца, адна і тырчала з-пад шырокага саламянага капелюша (твар неяк не праглядваўся) было незанятае месца.

— Ці можна, дзядуля, каля вас прысесці?

— Чаму ж нельга? Сядай, дочка. У нагах праўды няма. Удваіх і трэсціся будзе весялей. Дасць бог, не растрасе гэная машына.

— Не растрасе, — апусцілася Ніна на сядзенне. — Мне і ехаць усяго з паўгадзіны. І пастаяць можна было б, ды як ёсць месца...

— Ага, ага, — заківаў дзядок, перавесіўшы галаў (капялюш!) і зазіраючы ёй у твар. — Чаго ж стаяць, як ёсць месца. У нагах праўды няма.

— А дзе ж яна, праўда, дзядуля? — разгледзела, нарэшце, у цені капелюша яго вузенькія, калючыя вочкі і ўсміхнулася (надта ж хітра той на яе жмурыўся!) Ніна.

— Дзе? У свеце, вядома.

Кажа, а сам гэтак хітра на Ніну жмурыцца сваімі вочкамі-шчылінкамі, ледзь не дастаючы да яе барадой: не возьмеш яго, маўляў, за рубель дваццаць...

— У свеце — яно, канечне. А ў чалавеку? У чалавеку? — перапытала Ніна.

— Гэ-э, дочка, — кашлянуў, хаваючы ў бараду ўсмешку, той. — У чалавеку гэтулькі ўсяго намешана ды наблытана, што да праўды цяжка дакапацца. Як яно дакапаешся, калі ў целе адно хваробы жывуць, а душы, як кажуць, і зусім няма. Пуста, кажуць, там, дзе душа была раней. Дзюрка. Праз якую колькі ні ўзірайся, нічога, апроч пустога неба, не ўбачыш.

— І-ы-ы! Анціхрыст! — павярнулася кабета ў белай, пад барадой завязанай паркалёўцы. — Барады б сваёй сівой пасаромеўся!

— Не я, а час — анціхрыст, галубка. Мяне лёгка ўджаліць, а ты вось час паспрабуй уджаль! — гэта ж ён, час, так і прышпіліць твой язык да сцяны. Каб іншыя лаяцца не думалі.

— Цьфу! — сплюнула тая і ўтаропілася ў акно, за якім мільгала ўжо светла выбеленая агароджа бярэзніку.

— Няўжо так-такі і няма праўды ў чалавеку? — не схацела адступіцца ад свайго пытання Ніна, — зіркнула на кабету і зноў да дзеда павярнулася: цікавы дзед ёй трапіўся!

— Як гэта няма? Ёсць, дочка. Толькі сёй-той да самай смерці ўразумець не можа яе. Сваёй праўды, значыцца. Пра дзюрку заместа душы — гэта я так, для прыкладу, сказаў, каб суседку сваю дужа набожную ўкалоць. Бачыш, натапырылася! Заместа малітвы праклёны на маю лысую галаву нябось мармыча зараз, грэх на душу бярэ. Кхэ-кхэ-кхэ...

Дзядок, чымсьці задаволены, засмяяўся. Сухі яго смех нагадваў кашаль, але ў вачах ці то цёмныя іскаркі, ці то цёмныя чорцікі скакалі, не супакойваліся.

— Анціхрыст, кхэ-кхэ-кхэ... Змалку ў анціхрыстах хаджу, кхэ-кхэ-кхэ... А колькіх грахаводнікаў, у якіх... кхэ-кхэ-кхэ... у якіх малітва на губах не высыхала... кхэ-кхэ-кхэ... перажыў і пахаваў. Чуеш, Тэкля?

— Барады б сваёй пасаромеўся! — абзыўнулася тая, але галавы не павярнула.

— А чаго ж яе саромецца, барады, як гады дазваляюць, як душа не супраць? — адсмяяўся дзед і зноў зіркаў, жмурачы вочы, не на цётку, якую, відаць па ўсім, не адзін год ведаў, а на яе, на Ніну. — Бога як не было, так і няма. А душа — чаго ж... Душа на месцы: моцна за жыццё, за зямлю чапляецца.

— Душа — за зямлю? — не змагла схаваць здзіўлення Ніна.

— За зямлю, дочка. А як жа! На зямлі мы нараджаемся, на зямлі паміраем, зямлёй, урэшце, становімся. За што ж яшчэ душы чапляцца? А, дочка?

І пазірае. Хітра так на Ніну пазірае.

— А... неба? З небам — куды? Яно ж гэтаксама для нечага...

— Як не знойдзеш неба ўнізе, угары яго, дочка, не знойдзеш.

— Нешта хітра задужа, дзядуля. Незразумела.

— Незразумела, кажаш? Хіба? А мне старому і няўцям. Я думаю: задужа проста кажу. Вось сама развраж, дочка: птушкі і тыя толькі па песню ў неба ўзлятаюць. Узляцяць, захліпнуцца хараством, спяюць сваю песню

і садзяцца... Гэта іх зямля прыцягвае. А як жа! Ніводная душа, бачыш, не вытрымлівае, калі замнога характва, замнога прасторы. Хоць бы нават і птушыная... Думаеш, чаму чалавек бога прыдумаў? Сябе захацеў на неба ўссадзіць, а не атрымалася. Зямля не адпусціла. Бо слабы чалавек. Душа ў яго слабая: не вытрымала б.

У Ніны, напэўна, быў вельмі разгублены твар, бо дзядок, ссунуўшы далей на патыліцу свой саламяны капялюш, зноў засмяяўся, закхэкаў — зноў заскакалі ў шчылінках яго вачэй цёмныя чорцікі.

— Гэта і ёсць... ваша праўда?

Ён папярхнуўся смехам. Пакрыўджана зморшчыўшы твар, доўга кашляў. Адкашліваўся. На Ніну не пазіраў, і той стала няёмка за сваё пытанне: дарога, траскі аўтобус, лёгкая гамонка, каб хутчэй час мінаў, а яна... Дзядок жа спадабаўся ёй. Сваёй няўрымслівасцю. Вясёлымі разважаннямі пра вельмі важнае, як не самае важнае, у жыцці, калі словы так добра стасуюцца да настрою, настрой — да думак, думкі — да гэтага летняга, сонечнага дня.

— Прабачце мне... Я не думала вас пакрыўдзіць.

— Слабы чалавек. Душа ў яго слабая: ад думак, ад цяпла, ад цела адарвацца не можа, а туды ж! Неба ёй падавай!

— Дык жа і неба скараецца: спадарожнікі, касмічныя караблі лётаюць. Ці чыталі, дзядуля?

— Чытаў, — буркнуў дзед, па-ранейшаму не паварочваючыся да Ніны.

— І не верыце?

— Чаму ж гэта не веру? І птушкі па песню ў неба ўзлятаюць...

— А гнёзды іхнія на зямлі. Так? — радасна, толькі зараз зразумеўшы, што даводзіў ёй колькі хвілін назад стары, закончыла за яго Ніна. — І як не бачыш неба ўнізе, угары яго не знойдзеш, так?

Дзядок утаропіўся на Ніну, у яго нават шчылінкі вачэй пакруглелі, акругліліся ад нечаканага павароту гаворкі назад — на цэлых паўкруга назад.

— Бач ты! — толькі і сказаў ён.

— У мяне такое было, калі я — на зямлі — магла рукой зорак крануцца, любой з іх. Усяго аднойчы было, — ціха дадала яна.

— Значыцца, шчаслівая ты, дочка. Шчаслівейшая за мяне. Шмат за каго.

Дзядок пазіраў на Ніну з павагай.

— Пад'язджаем да запярынскай развілкі! — гукнуў з-за паркалёвай фіранкі шафёр. — Хто там пытаўся?

— Табе гукае. Ідзі, дочка.

— Бывайце, дзядуля. Добрага вам здароўя!

Ніна пачала праціскацца паміж клункаў, прасоўваючыся да дзвярэй. Чула, як штосьці бурчаў сабе пад нос дзядок, але слоў ужо не разбірала. За паваротам, там, дзе шаша пабяжыць уніз з пагорка, — паваротка на Запярынне. Ніна пазнавала мясціны і дзівілася, што даехала так хутка: здаецца, толькі выязджала з Рудні...

— Дзякуй, — павярнулася Ніна да шафёра, які прытармазіў якраз на скрыжаванні.

— Памятай, што ты шчаслівая, дочка! — пачула яна сухі дзедаў голас, саскокваючы на траву ўзбоч дарогі, і доўга, захінуўшы вочы далонню, пазірала ўслед цёмнасіняму, вастраносаму аўтобусу — ажно пакуль не ператварыўся той у цёмную кропачку на роўнай стужцы шашы, якая сонечным ззяннем цякла з усходу сюды, на пагорак, — у адваротным ад сонца кірунку. Апярэджваючы яго на цэлы доўгі дзень. На дзень, які ледзь не ўвесь яшчэ быў наперадзе.

— Ну, вось я і дома, — на поўныя грудзі ўдыхнула Ніна настоенае на смолах ды на травах паветра і збочыла з шашы на прасёлак. — Ну, вось і дома...

І быццам адазвалася на гэтыя яе словы, на прызнанне яе, наўколле: ледзь чутны шолах пабег па верхах прыдарожнай бярозы, перакінуўся на сосны — і вось ужо зашумеў у вершаллі соснаў прастор, зашумеў, заспяваў, збіраючы ўсе зрухі і ўсе гукі ў адзін магутны акорд — у акорд жыцця. І вось ужо хутка-хутка пабеглі медна-зялёныя бліскі, водбліскі святла ад замшэлых, прысыпаных ігліцай каранёў да маладых, колкіх галін, тонучы там, угары, у бязмежна высокім ранішнім ззянні — у небе. І вось ужо, злёгку прыгінаючыся, каб не зачапіць бярозу-крывуліну на паваротцы, выбегла дарога на зарослую званцамі паляну — і праз бязмежна высокае ззянне ранішняга неба ўніз, на плечы Ніны, на працёртыя насустрач ёй рукі заструменілася, палілася жаўруковая песня: там, дзе шырэла паляна, абцякаючы тры купчастыя сасёнкі, пачыналася поле. Жытнёвае поле, знаёмае ёй да кожнай камяністай пралысіны, да кожнага з шасці валуноў, якімі адгарадзілася яно ад лесу.

Гэта цяпер лес парадзеў, пасвятлеў, дарогамі — шашой заасфальтаванай — на кліны папераразаны. Ніна помніла яго іншым: цёмным, таямніча глухім — праз гушчар не прадрацца... Помніла іншым, але ўсё ж пазнавала і сёння, і такім, якім ён стаў. І такі, сённяшні, ён быў родны. Родны чымсьці большым, чым падабенствам, чымсьці больш глыбокім. Між яго замшэлых, прысыпаных сухой ігліцай каранёў — і яе, Ніны, карані. Яна не магла адчуць, выказаць гэта больш пэўна. Проста — адчувала ўсё вакол родным, сваім. І радасць была ў тым. І шчасце.

Нетаропка, стараючыся не абмінуць шчаслівым позіркам ніводную з красак, ніводны парастак (без яе яны ўзышлі, выраслі тут — але на той жа зямлі, што і яна!), Ніна абыходзіла паляну — спускалася да поля, узмежкам якога, а не збітым прасёлкам, хацела ісці ў Запярынне. Перш выйдзе да пагорка, які асобна ад лесу, адгароджаны ад яго нешырокім палеткам, імкнецца цёмнымі вершалінамі дрэў угору, у неба, нагадваючы цёмны, вячысты сабор. Пад скляпеннем яго тлустых, пакарабачаных цяжарам голля соснаў ляжалі шмат хто з запярынцаў: мёртвых здаўна было больш, чым жывых — у вёсцы, у тых адзінаццаці хатах, што губляліся ў лесе, у гэтай бязмежнай прасторы лесу і неба над ім.

Так, перш выйдзе да пагорка. Да кладзішча. І памаўчыць — або ціха паплача — над роднымі магіламі, ціха кранецца дрогкімі пальцамі ўтравелай за столькі гадоў зямлі — паклоніцца мёртвым, як пакланілася б жывым.

Для яе, Ніны, яны былі жывымі: і мама, і тата, і Сцяпан... Жывымі — там, у мінулым жыцці. Жывымі ў памяці. Бо вось жа магла яна размаўляць з імі ў думках, у згадках — не проста згадваць, а размаўляць! І нават разуменне знаходзіла ў іх, у іх словах, сама шмат што па-новаму разумеючы... Шмат што і — вось гэты дзень, падораны ёй жыццём, высокі і светлы: ні хмары ў небе, ні хмурынкі ў душы.

Трывога, што была вярнулася пасля сустрэчы з Марфай, адступіла. Знікла. Растала ў блакітнай празрыстасці ранку. І значыцца, не было для тае трывогі прычыны, значыцца, не было ёй месца ў душы падчас сустрэчы з мілымі сэрцу мясцінамі.

Ніна правяла далонню па прыемна-колкіх зялёных каласах. Раз. І другі (быццам дзіця па галоўцы гладзі-

ла). І, не адымаючы далоні, пайшла ўздоўж поля ў той бок, дзе, адасоблены ад лесу зялёным палеткам, высіўся зарослы магутнымі соснамі пагорак. Няйначай, сабор, на зялёных купалах якога адпачывала апоўдні сонца, і потым гракі, цэлая калонія неспакойных, крыклівых гракоў, да вечара студзілі крыламі — і крыкамі — яго гарачы след. Пра сабор яна падумала, прыгадаўшы, што тата неаднойчы гэтак казаў, — яшчэ малой ёй паказваючы здалёк пагорак, пра сабор згадваў. Бор — сабор... Нават па гучанні падобныя, родныя словы!

Што ж, перш Ніна выйдзе да пагорка, да кладзішча. Адтуль, памаўчаўшы, ціха паплакаўшы над магіламі, нешырокім, выгінастым шляхам пойдзе ў вёску. Пакланіцца кожнай хаце, не пытаючыся, дома яе гаспадары ці няма, — усім новым хатам, што выраслі на папялішчах, на месцы спаленых, пакланіцца. Не таму, што была ў чымсьці вінаватай перад вяскоўцамі. Не. Чым яна была вінавата? Тым, што не вярнулася сюды пасля вайны? Не змагла б адбудаваць тут зламанае, спаленае вайной сваё жыццё. Хату з дапамогай людзей адбудавала б, хай не адразу, спакваля, а жыццё — не... Таго, мінулага яе жыцця, больш не было. Новае... Да новага яна толькі-толькі падступалася...

Нетаропка, стараючыся не абмінуць нічога позіркам, ішла Ніна ўскрай поля: збажына шумела, спявала па левую руку ад яе, лес — па правую. А паміж імі, якраз на яе шляху, адзін за адным выраслі з зямлі магутныя шэрыя валуны: ні на вяршок не ссунулі іх ні вятры, ні магутныя карані дрэў, быццам іх карані, карані гэтых валуноў, былі глыбейшыя, дужэйшыя за ўсе іншыя. Быццам менавіта яны трымалі наўколле, і якія б змены ні адбываліся вакол — у лесе, на палетку, у вёсцы, стрэхі якой ужо відаць былі з-за пагорка, — зямля, дух гэтай зямлі, будзе па-ранейшаму, як было спрадвеку, трывала трымацца іх моцы, іх веры ў сваю моц і непарушнасць.

Першы валун. Другі. Трэці... І апошні, шосты, самы вялізны — пагрозліва вялізны. Побач з ім Ніна (і на дыбачках недацягвалася яна да яго верху) выглядала маленькай і кволай, зусім як тая, ранейшая Ніна, што дзяўчынкай падоўгу — марна — спрабавала ўскарабкацца на яго і адчуць сябе вялікай і дужай. Згадаўшы тыя спробы, тую сябе, яна ўсміхнулася. Бо і зараз —

каб магла! — радасна ўскараскалася б яна наверх, на валун, каб агледзець усё з яго вышыні. Каб адчуць сябе вялікай і дужай.

Трывога, што была вярнулася пасля сустрэчы з Марфай, даўно адступіла. Знікла. Растала ў блакітнай празрыстасці ранку. Была толькі радасць сустрэчы з роднымі мясцінамі. Былі толькі радасць і вось гэты дзень, падораны ёй жыццём, высокі і светлы: ні хмары ў небе, ні хмурынкі ў душы.

## 33

— Што, прытаміўся, Пятровіч?

— Адпачываю.

— За брыгадзірам і вопытным касцам цяжка ўгнацца. Здаро-овы мужык наш Цярэнцевіч! Пракос вядзе, як баразну, — пад шнурок. А памерай — усё роўна шырэйшы за астатнія будзе, — Пахом чыркаў па касе і раз-пораз зіркаў на Павэлка: збялеў у таго твар, ці мо яму толькі падалося? — З непрывычкі ты, Пятровіч. Адна справа — для сябе шчыраваць, стажок які накасіць: на няўдобіцы не разгонішся. Памахаеш касой, пакурыш... А тут — шыраня! Размах зусім іншы. Адно паспявай за іншымі.

— Ды ўжо ж.

— Глядзі, руку ў плячы не сарві. Здараецца...

— Дзякуй, Пахом, — перасіліў сябе, нейкую сваю скамянеласць Павэлак. — Ты ідзі. Ты ўжо з мужыкамі... Я даганю.

— А-а, ну, глядзі, — адышоўся той, заняўшы пракос крыху папераддзе, і праз міг-другі яго каса ўжо вызвоньвала сваё: чырк! чырк! чырк!

Павэлак нейкі час пазіраў яму ў спіну, на цёмную пляміну поту на сарочцы, пакуль тая была відаць. Ён, працуючы, гэтаксама ўзмок. Зараз, ужо астываючы, чуў, як прыемна-прахалодна аблягае цела кашуля, прыліплая да спіны. Напружыў плечы, нацягваючы тканіну, — тая адстала, апусціў рукі — зноў наліпла. Ну, ды няхай! Высахне, як час прыйдзе. Трэба было весці пракос далей. Мужыкоў ужо ён не дагоніць, але пракос, хоць і пазней, чым яны, давядзе.

Гэта ўсё боль у грудзях... Нязвыкла вострый. Узнік і знік праз колькі імгненняў, парушыўшы дыханне, спы-

ніўшы работу. Занадта, відаць, Павэлак прыслухваецца да яго: не ўпершыню ж балела! Пабаліць і сціхне. Сціх жа ўжо...

А дзень які! Ні хмаркі ў небе, на выцвілым блакіце. Тут, на лузе, непадалёку ад рачулкі, не адчувалася, што даўно не было дажджу, што яшчэ тыдзень гэткай спякоты — і пачне сохнуць, жаўцець усё вакол. Не, тут было хораша. І вочы радаваліся, і душа. Усё радавала: і прастора, якая адкрывалася вачам, і праца, якая была ў асалоду. Тое, што адстае ад мужыкоў, — нічога. Дагоніць. Звыкнецца і будзе ісці з імі крок у крок: і ён, Павэлак, не ўломак — ці мала папрацаваў на зямлі!

Гэта боль у грудзях яго прыпыніў, выбіў з рытму: звыкла ўслухаўся ў яго Павэлак і чагосьці на момант спалохаўся. Вось і збіў дыханне. Вось і прастаяў колькі імгненняў як скамянелы. Няўжо і праўда старэць пачынае, што гэтак з-за нейкага там паколвання ў грудзях трывожыцца? Рана. Рана нібыта.

Папляваў на рукі, зручней узяў касу і зноў стаў звыкла адмерваць дыханне: узмах — крок, узмах — крок...

«— ЦІ Ж Я БЫЎ ТАМ, ДЗЕ ДЗЯЛІЛІ? Такім нарадзіўся, Цімох Васільевіч, якім маці нарадзіла. Мо яе косці даўно дзе ў зямлі парацца, а я — такі, як ёсць: не з самых прыгожых, але ж і не пачвара якая — рукі, ногі, галава на месцы! І не ўломак, і сэрца маю — і ў сэрцы яна, Ніна ваша. Чаго ж яшчэ?

— Ды я б з дарагой душой, Пятровіч. Яй-богу, — муляецца Цімох, не знаходзячы слоў: ён і ў лепшыя хвіліны гаварун невялікі, а тут на злосць маю наткнуўся — і зусім як зарвала.

— Маёй ёй наканавана быць, разумееце? Маёй! Кожным нервам сваім чую, кожным позіркам...»

Чырк! — і перарвалася згадка. Яшчэ апошнія словы дрыжаць дзесьці ў душы яго, а Павэлак бачыць не Цімоха, а Ніну. Ніну! Бо вось жа яна, распараная ад працы, ад сонца, схіляецца, каб узяць з-пад снапоў жбанок з квасам, і Павэлак бачыць яе...

«— Якім ветрам вас сюды занесла, Пятровіч? А? Другі дзень паветра не зварухнецца.

Я не адводжу вачэй ад яе сарочкі, у разрэзе якой толькі што бачыў пругкія дзявочыя грудзі, і Ніна, рап-

там уразумеўшы, у чым справа, у чым прычына майго здранцвення, весела бліскае вачыма і смяецца, прыкрываючы твар далонню. Са жбана, які яна трымае ў другой руцэ, выплёскваецца квас, і, змеціўшы гэта, я раблю рух да яе, да жбана:

— Упусціце, Ніна.

Яна выпускае жбан. Відаць, ад нечаканасці. Лаўлю яго на ляту, абліваючы рукавы кашулі.

— О-го! А вы не такі ўжо няўклюдны, Пятровіч, як здаецца...»

Чырк! — і зноў перад вачыма стары Цімох. Сядзіць, горбіцца ад няёмкасці і смокча, смокча сваю цыгарку.

«— Ну, добра, у бога мы даўно не верым. Але ж ад лёсу, ад долі сваёй яшчэ ніхто не адмовіўся. Нельга ад долі сваёй, Цімох Васільевіч, адмовіцца. Нельга. Таму і хаджу ў ваш двор. Таму пасмешышчам не баюся стаць. Ды чаго там! — стаў. Упару не сватоў засылаць, а з'ехаць куды вочы глядзяць.

— Ды я, яй-богу...

Зноў зарвала! Пазіраю на старога не тое што са злосцю, з нянавісцю. З балючай нейкай нянавісцю, якая — ведаю! — абернецца на сябе самога. Не зараз, дык потым. І нічога не магу зрабіць. Кусаю вусны, раз-пораз тузаю за повад сваю ні ў чым не вінаватую кабылу, не навязаўшы яе раней. І гавару. Хай слухае! Хай усё выслухае. Апошні раз кажу. Апошні раз да двара завярнуў.

— Думаеце, не ведаю, чаго дзеўка нос верне? Куды бегае штовечар з вашага маўклівага дазволу? Ды пра гэта ўсе ўжо ведаюць. Уся вёска! З прышлым, белабрысым мараком яна блытаецца, пакуль ён ёй пуза не зробіць.

— Злосць у табе гаворыць, яй-богу...

— Злосць? А хоць бы і злосць! Каторы месяц вашу дачку, дурань, і вас, Цімох Васільевіч, з усіх бакоў абхаджваю, павагу сваю з усіх бакоў і з усіх сіл маіх выказваю, а вы на паводзіны дачкі сваёй вочы закрываеце. Закрылі! Адна яна, бачыце, у вас, адна крывінычка... Дык што ж, як адна, дык няхай саліднага чалавека пры пасадзе ўсюды высмейвае і носам сваім круціць? Дык няхай з кожным, хто тварам перада мной

узяў, хто больш ёй даспадобы, над рэчкай, на волі гуляе, пакуль вы на яе не нарадуецеся?

— Не смей! Не смей так пра Ніну, Пятровіч. Не такая яна, яй-богу, не такая...»

Чырк! — і зноў перарвалася згадка. І зноў з-за прыгаданага, з-за размытага кропляй поту, што скацілася з пераносся, малюнка выплыў Нінін твар. Шчаслівы кожнай сваёй тканкай, кожным рухам твар: смяюцца, увабраўшы ў сябе ўсё святло зімовага дня, сінія вочы, радасна прыўзняты лёгкія, падобныя на стракоз бровы, ружовяцца ўкруг мякка-акруглых ямак шчокі, уздрыгваюць ля паднесенай рукі пульхныя, крыху прыадкрытыя вусны...

«— Мама, гэта мой Сцяпан. Мой...

— Канечне, твой, любая. Цяпер, каб і схацеў адмовіцца ад гэтага шчасця, дык нельга: дакумент — вось, складзены. І сведка маецца. І ты цяпер — мая жонка.

— Жон-ка! — успыхвае Ніна, як макаў цвет, і горнецца да Сцяпана, прыпадае да яго пляча, не хаваючы шчаслівага твару.

Не магу глядзець на яе твар і гляджу, гляджу, ледзь стрымліваючы балючыя, злосныя слёзы: сам, сваёй рукой...

— Ты праходзь, Пятровіч. Праходзь да стала, — замітусілася раптам Ганна. — Чаго ж мы стаім? Вяселле не вяселле, а выпіць з такой нагоды знойдзецца якое каліва.

— Пайду я. Выбачайце. Час ужо. Мне водпуску камандзір не даваў, — каўтаю я словы: засталося толькі расплакацца перад імі... перад гэтымі... — Ат!

Махнуў рукой і — у дзверы. Далей ад граху. Зрабіў справу і — няхай святкуюць. Але — без мяне-е... Без мяне!

— Куды ж ты, Пятровіч, яй-богу?

Азіраюся ад парога і бачу шчаслівую ўсмешку на Ніныным твары, руку яе, уплеценую ў шырокія Сцяпанавы далоні...»

Чырк! — і стала на момант цёмна ў вачах. Змрок калыхнуўся, стаў набракаць чырванню, святлець, і вось ужо перад Павэлкам калыхаецца полымя кастра і з-за

яго — праз яго! — узіраецца ў яго, усміхаючыся, крывы Ахрэм...

«— Тагды маю, калі ў руках трымаю! Залатыя словы. Правільныя. Планамі ды абяцаннямі не пажывішся. А рукой намацаеш ці да рота паднясеш — во! тваё! Тваё-ё-ё, брат. Ніхто не вырве.

— Ты пра што? — адводжу я позірк ад агню, ад кастра, што, урэшце, разгарэўся.

— Пра што? — жмурыцца той. — Хліпкі мужык цяпер пайшоў: сваё аддае. Кішка тонкая, ці як? Ты як думаеш, Павел Пятровіч?

— А што мне думаць? Сам, сваёй рукой Ніну, можна сказаць, аддаў... таму, белабрысаму...

Мільгае думка: нашто? Нашто я гэта яму, Ахрэму, кажу? Чорт за язык цягне — крыўду маю выцягвае... А Ахрэм набліжаецца. Ужо зусім побач. Хіліцца да мяне. Твар у твар гаворыць:

— Сваёй рукой, Павел Пятровіч, і туды і сюды можна. Вайна шмат што спіша. А за сваё шчасце і пастарацца не грэх. Гэта за жыццё сёння ніхто ломанай капейкі не дасць, а шчасце... О, шчасце — до-о-орага цэніцца!

— Ну, чаго ты пад'ялдыкваеш? Чаго ты пад'ялдыкваеш? — ускіпаю, гатовы выхапіць з кастра галавешку і тыцнуць ёй у гэтага дабрадзея, у паскуду гэту, што дабрадзеем прыкідваецца: бач! — жмурыцца, хаваючы ўсмешку...

— Што? Кішка тонкая? Папрасіў бы каго іншага падмагнуць, Павел Пятровіч.

— Вось і дапамог бы, як умееш! А то душу муціш...»

Чырк! — і змрок адступае. І разам са змрокам знікае касцёр. І няма ўжо побач крывога Ахрэма, твару ягонага, перакошанага паскуднай ухмылкай.

«Крычыць хтосьці? І страляніна аціхла... На міг стала так ціха, што я міжволі заплюшчваюся, прыгнечаны нязвыклай, цяжкой цішынёй. І тут — урываецца, уломваецца ў вушы пранізлівы дзіцячы крык:

— Ма-ма!!

На крык гэты, напярэймы яму — насустрач страляніне, якая ўсчалася з новай сілай, кідаецца з-за пры-

крыцця жанчына. Не пазіраючы ў той бок, услед ёй, бачачы толькі балюча скрыўлены крыкам твар Гнася, непадалёку, зусім побач, — ведаю: гэтая жанчына — яна. Ніна!

Хачу закрычаць, хачу спыніць Ніну — вусны не слухаюцца. Сутаргай звяло рот, твар: на верную ж смерць кінулася... Падкінуты невядомай сілай, выпрамляюся на ўвесь рост, здаецца, чапляючы шапкай нізкае шэрае неба, і бачу: ужо амаль дабегшы, ужо амаль пераняўшы ачумелае ад страху дзіця, падае на свае выпрастаныя рукі Ніна — адначасова з ім, з хлапчанём. Раблю крок — і зноў падае на свае прасцёртыя да дзіцяці рукі Ніна.

— Сукі! Сукі, маць вашу!

Не адчуваю, што бягу, падштурхнуты невядомай сілай. Я не адчуваю, што бягу...»

Чырк! чырк! — падсякае Павэлак касой высокую, ледзь не ў пояс траву, адсякаючы далёкую згадку, якая ў каторы раз ужо трывожыла яго, вяртала тое даўняе, балючае, што прыпала на ягоную маладосць, што вызначыла ўсё яго далейшае жыццё.

Ні аб чым ён не шкадаваў. Не магло ў яго скласціся іначай. А жыццё, што ж? Жыццё ва ўсіх аднолькавае. Горшае або лепшае, даўжэйшае або карацейшае — адно. Адно яно, жыццё. Што — ты ў ім вызначыш, што — яно ў табе... А два вякі — не жыць, дзве долі — не мець.

«— У атрадзе ты добра, па-геройску сябе паказаў, Павел Пятровіч. Як верны сваёй зямлі, свайму народу салдат ваяваў. Народ і адзначыў цябе. Колькі ўзнагарод маеш?

— Пяць, камандзір... — адказваю па звычцы партызанскай, выцягнуўшыся, пацягнуўшыся рукой да непрыкрытай галавы. Змеціў яго ўсмешку — спахапіўся, паправіўся: — Пяць, Васіль Лук'янавіч.

— Пяць... — усё яшчэ ўсміхаецца ён. — Вось бачыш: герой!

Няўжо дзеля таго, каб нагадаць пра мае ўзнагароды, выклікаў сакратар? Не, за ўсмешкай сур'ёзнасць праглядваецца: думка нейкая ў яго наконт мяне...

— Правільна мысліш, Павел Пятровіч. Думка наконт цябе мяне — лічы: райком! — непакоіць. Вучыцца

табе трэба. Сямі класаў сёння замала. Трэба на вучобу настройвацца. А то як жа аўтарытэт сельсавета, ды і твой аўтарытэт?

Во, значыцца, куды сакратар гне: вучыцца... Відаць, здымаць будуць з пасады, калі гаворка такая зайшла. Не ў школу ж ісці на самой справе!

— Чаго маўчыш? Тваіго слова чакаю, Павел Пятровіч.

— Сям'ёй я толькі абзавёўся, камандзір... Не ведаю, што і казаць зараз.

— Думай. І мы тут падумаем. Добра думай, Павел Пятровіч...»

Чырк! чырк! чырк! — адмервае каса няспешныя Павэлкавы крокі і думкі... Нібыта не пракос ён вядзе, а шлях свой жыццёвы, не згадкі — гады мінаючы. Трэба было б перадыхнуць, пот уцерці, а то твар залівае потам і дыхаць усё цяжэй, але Павэлак не спыняецца. Не можа спыніцца. Быццам падганяе яго хто, быццам хто яго ў спіну падштурхвае.

«Нібыта клямка бразнула... Мо Ніна раней сёння вярнулася? Не церпіцца, мусібыць, зірнуць, ці выканаў яе просьбу... Выканаў. Куды дзенешся! Праз увесь пасёлак валок, прасцінай прыкрыўшы. Усе, хто б ні сустрэўся, пыталі, на чорта, гэткую гаргару ў хату валаку.

— Ніна, ідзі зірні. Купіў, што прасіла, — гукаю ў сенцы, у прачыненыя дзверы.

І — наросхліст дзверы. Убягае. Недаверліва зіркае на мяне. Потым — паўз мяне, на сцяну, на прасценак паміж вокнамі і ўсплёсквае далонямі:

— Бацюхны! Няўжо сам прынёс?

І, не слухаючы майго адказу, навобмацак, як слялая, пайшла да люстэрка. Бліжэй. Бліжэй. Вось ужо на поўны рост змясцілася ў ім (мне з-за стала добра відаць яе недаверліва-радасны твар — гэта з-за гэткай дробязі!) і зноў усплёсквае далонямі:

— Бацюхны! Гэта ж уся, як ёсць, адлюстраваная, а яшчэ ж і цэлы пакой у ім змясціўся. Няўжо сам прынёс, Павэлак?

І зноў не чуе адказу — узіраецца, узіраецца ў шкло (нават не ў сябе: мне ж відаць! — а ў шкло), уся недзе далёка адсюль, у лятунках, уся недаверліва-радасная ад убачанага або прыгаданага. Уся — чужая. Упершыню

чую, як расце, разрастаецца ў грудзях нязвыкла працяжны, глухі боль, і не ведаю, што мне рабіць. Што рабіць з гэтым болем... І з гэтым адчуваннем... І з сабой...»

Чырк... чырк... чырк... Рухі Павэлка незаўважна для яго запаволываліся. Пот ручайкамі сцякаў з ілба, з-пад наліплых да скроняў валасоў. Пот перашкаджаў глядзець — усё плыло, расплывалася перад вачыма. Трэба было спыніцца, уцерціся, скінуць кашулю, якая абляпіла ўтомленае, аслаблае цела і перашкаджала рухам. Гэта была нават не думка — нейкае глыбокае, неўсвядомленае жаданне. Але і яно згінула, як згінулі кудысьці ўсе думкі, усе адчуванні. Нічога больш не адчуваў Павэлак: ні болю, які толькі што свідраваў грудзі, ні ўтомы, ні халоднага поту, які студзіў, скоўваў цела.

Каса, цененька свіснуўшы, двойчы падрэзала самое паветра — ён і не заўважыў бы, каб не загукаў Пахом:

— Уга-а! Каб толькі здароўя, дык Пятровіча да самай ракі ніхто не спыніў бы.

Уздрыгнуў Павэлак, учуўшы знаёмы голас. Уздрыгнула рука — жаласна дзынкнула, увайшоўшы на чвэрць у зямлю, каса. Тузануў яе — не вырваў і тут жа забыўся на свой рух. Нешта ён павінен быў зрабіць... Што? Усё плыло, расплывалася перад вачыма. Нічога не бачыў. Мітусіліся, расплываючыся, бела-жоўтыя плямiны, і ўсё... Ні мужыкоў. Ні Пахома. Хоць вось жа ён, Пахом, — толькі што гукаў, вось жа ён ідзе, цяжка ступае насустрач: Павэлак чуе яго крокі...

— Ты чаго, Пятровіч? Нездаровы хіба?

Голас — устрывожаны. Трывога прачынаецца і ў ім, у Павэлку. Лёгкая, не цяжэй за аблачынку, трывога: што гэта ён? Давёў жа пракос! Як Пахом. Як усе... Зараз ільга будзе адпачыць, глынуць чаго-якога, а то ў горле захрасла...

— Скідай кашулю, Пятровіч. Яе ж хоць выкручвай! Дарэмна ты...

Што — дарэмна, хацеў спытацца Павэлак. Але вусны не слухаліся. Не слухаліся і рукі, якімі ён нязграбна спрабаваў сцягнуць мокрую, ліпкую кашулю. Сцягнуў. Кінуў яе на траву.

— На ручнік! Утрыся. Дарэмна ты...

Што — дарэмна, хацеў спытацца Павэлак. І не змог. Не змог вуснамі паварушыць. Пот заліваў твар (так

яму здавалася!), і не тое што вымавіць колькі слоў — вочы не мог расплюшчыць.

Пахом ціхенька паляпаў яго па плячы (ачомайся, маўляў), сунуў у руку ручнік — і ён паднёс ручнік да твару, да вачэй. Прыкрыў вочы, уткнуўся ў яго тварам.

— Брыгадзір, нясі вады! Чуеш? Вады! — адчуўшы, мусібыць, што нядобрае, загукаў да мужыкоў, да брыгадзіра Пахом хрыпла-густым і нізкім, як не сваім, голасам. — І-і-эх, Пятровіч! Дарэмна ты...

Чуючы яго словы, разумеючы яго трывогу, Павэлак заставаўся да яе абыякавым: чаго было гэтак трывожыцца? Сціснулася ў яго нутро на які момант — дык адпусціла ж. Адпусціў боль. Павэлак і дыхаў ужо раўней, і думкі да яго паціху вярталіся. Звыкла-спакойныя думкі... І пракос свой ён давёў. Няйначай, як Пахом. Як усе. Хай сабе і пазней, але сваё зрабіў.

Адняў ад вачэй, ад твару ручнік і, перш чым згледзеў брыгадзіра, Цярэнцевіча, з біклажкай у руцэ, убачыў бяздонную глыбіню неба. Не ўгары, не над сабой — прама перад сабой, за якога паўкроку ад сябе.. І — не злякнуўся. Чамусьці нават не здзівіўся. Быццам было гэта звычайнай з'явай, звычайнай справай — стаяць на самым крайку зямлі, перад неабдымнай прасторай неба аднаму. Хоць ён — іншым зрокам — бачыў і Пахома, і Цярэнцевіча: тыя штосьці казалі, звяртаючыся да яго...

Не ўслухоўваўся Павэлак у іхнія словы. Мо і зусім іх не чуў. Бо слухаў неба, яго звон. Такі бязмежны, такі зычны звон, быццам сотні, тысячы жаўранкаў агучвалі неба, агучвалі гэты дзень, высокі і светлы. І, абганяючы гэту светлыню, несучы гэту тысячагалосую песню неба, ішла да яго, да Павэлка, Ніна. З распушчанымі валасамі, у незнаёмай бела-белай сукенцы, ішла, не кранаючыся травы босымі нагамі, каб сказаць яму... штосьці вельмі важнае сказаць!

«Хоць бы яна паспела, перш чым накоціць новы прыступ болю!» — бліснула думка і як падштурхнула Павэлка. Падштурхнула насустрач Ніне. Ён зрабіў крок. Другі. І спатыкнуўся. І, падаючы на прасцёртыя чаперад — да яе! — рукі, пачуў ціхі, жаласны плач. І словы. Нейкія няўцямныя — праз плач — словы:

— Я забуду сваё імя... Забуду... Што можна даць таму, хто ўзяць не хоча? Сэрца ўсохла... Ніводнай кветачкі ў ім... І птушкі даўно не прылятаюць.. Птушкі не могуць жыць ва ўспамінах!

# ЧАС, КАЛІ НАС ЛЮБІЛІ

аповесць



# I

Няўжо ніколі не скончыцца гэты дождж, гэты ўсясветны плач па леце, якое асыпалася, згарэла, збуцвела ў масляністай лужыне праз увесь двор — праз увесь горад? Як прарвала неба... Ледзь адхлыне, ледзь падымецца, каб не віснуць на мокрым учарнелым лісці ліп — і зноў правісае пад цяжарам вады ледзь не да самай зямлі. Ад яго не схавацца: беспрасветна-шэрае, цяжкое, ліпкае, яно калышацца зусім побач, за шклом, у акне на ўсю сцяну, не адпускаючы позірк. Не паспею адвярнуцца ад стала, на якім раскладзены для работы паперы, як неба (быццам і няма паміж намі дваййнога шкла!) пачынае перацякаць у пакой, наліпае да спіны, да плеч — і вось ужо дрогкія струменьчыкі холаду працінаюць цела, вось ужо расплываюцца, распаўзаюцца па стале папкі, дакументы, востра заточаныя алоўкі...

Нельга ж так раскісаць, так паддавацца настрою і надвор'ю! На тое і восень, каб дажджы змылі сляды пражытага года. Яшчэ аднаго года. Трыццаць восьмага для мяне... Па ўсіх мерках — восень!

Спрабую супакоіцца. Спрабую ачысціцца ад густой ліпкай шэрані, што, як каша, распаўзаецца па стале, па пакоі, паступова запаўняе яго, прыціскаючы мяне да акна. Здаецца: вось-вось хрусне шкло... Рэзка, адным рухам паварочваюся — усё на сваіх месцах: цяжкая аконная рама з двайнымі ва ўсё акно шыбінамі, беспрасветна-шэрае неба за ёй, дождж...

Ну, некалі ж павінен скончыцца гэты дождж! Каго ён аплаквае столькі дзён? Лета? Яна — за кратамі адной з камер папярэдняга зняволення? Мае спадзяванні? Рука які ўжо раз цягнецца да магнітафона.

«— Ваша прозвішча, імя і імя па бацьку?

— Радзінскі. Ян Станіслававіч Радзінскі.

— Год нараджэння?

— Тысяча дзевяцьсот трыццаць восьмы.

— Адукацыя?

— Рамеснае вучылішча.

— Якое?

— Горнае. У Шахцёрску.

— Чым займаліся ў Рудзенску?

— Жыў.

— Я пытаю: чым займаліся?

— Адказаў жа: жыў! Калі наконт працы — працаваў там, дзе трымалі. Больш двух месяцаў не трымалі.

— З-за п'янства?

— І з-за п'янства...

— А яшчэ з-за чаго?

— З-за п'янства?

— У вас жа, Радзінскі, была добрая прафесія.

— Была, ды сплыла. Зараза нейкая ў лёгкіх з'явілася...

Паўза.

— Вы прызнаецеся ў тым, што дваццаць трэцяга кастрычніка гэтага года...

— Прызнаюся! Забіў! Трапілася б мне гэта паскуда пад руку яшчэ раз, зноў бутэлькі «чарніла» на яго галаву не пашкадаваў бы — храснуў па чэрапе.

— Як даўно вы ведалі пацярпеўшага?

— Гэта ён — пацярпеўшы? Колькі людзей цярпелі ад яго, колькіх ён у той гнусны час загубіў!

— Радзінскі, адказвайце на пытанне! Як даўно вы ведалі Шатэрніка Міхаіла Самсонавіча?

— Усё жыццё гэту паскуду ведаў...»

Спыняю магнітафон. На тых жа словах, што і кожны раз, спыняю. Усё жыццё... Летам Яну споўнілася сорак тры. Што ж, выходзіць: жыццё пражыта? Але ж гэта — з ваеннай зімы сорак другога — і мае гады. І мае! — на тым жа корані, сярод тых жа людзей, з тымі ж спадзяваннямі на шчасце, на сваё шчаслівае абранніцтва. На сваё, і яго, і ўсіх... Мы ж любілі адно аднаго калісьці. Як, калі прайшла паміж намі расколіна, калі гэта расколіна абярнулася прадоннем? Чаму хоць бы кроўная роднасць не змусіла нас з'яднацца, счапіцца разам, каб не апынуцца перад гэтым прадоннем, на самым краі яго?

Як, калі? Чаму? Як? Калі?.. Словы — пытанні! — цяжкімі халоднымі кроплямі падаюць і падаюць адно-

куль зверху, адтуль, дзе павінна быць неба, а зараз у густой мутнай шэрані ўздрыгвае матавы абажур лямпы на доўгім, невядома да чаго падвязаным шнурку. І я не магу нічым прыкрыцца (мецъ бы хоць нейкі адказ — не маўчаць!), не магу спыніць, як спыніла толькі што магнітафонную стужку, іх размеранае, няспыннае падзенне. Кап... кап... кап...

— Што, сястрычка, яшчэ не ўсе слёзы выплакала?

Уздрыгваю ўсім целам, ускідваюся як ашпараная: Ян?! Тут? Зараз? Адкуль?! Азіраюся раз, другі, зіркаю на шчыльна зачыненыя дзверы, за якімі, у невялікай прыхожай, сядзіць Зоя, сакратарка. Зноў разгублена азіраюся, нікога! Пачулася?

— Марна шукаеш, сястрычка. Няма мяне. Нідзе няма. Ні ў гэтым жыцці, ні ў тым.

Выцершы лоб халоднай, паледзянелай далонню, цяжка апускаюся ў крэсла, націскаю рычажок сувязі з прыёмнай: нервы зусім расхадзіліся, у санаторый даўно пара з'ездзіць...

— Выклікалі, Аляксандра Станіславаўна? — звыкла звяртаецца да мяне Зоя, уваходзячы імгненнем пазней, і я звыкла заўважаю яе акуратна, на прабор зачасаныя валасы, яе ўважлівы позірк, яе спакойны, без намёку на ўсмешку твар і зацягнутую ў строга-сіні шарсцяны касцюм фігурку.

— Прынясіце мне шклянку гарачага чаю, Зоя. Калі можна... Нешта мерзну. І дождж не перастае...

Пра дождж — ужо лішняе: Зоя сцепанула плечуком. Апускаю вочы ў паперы, чакаю, пакуль зачыняцца дзверы, недаверліва, спружыніўшыся ўся, чакаю з'яўлення голасу.

— Страх — гэта знак нашага роду, — голас цяпер загучаў з-за спіны, скоўваючы мае рухі і жаданне азірнуцца. — Знак нашага часу. Так што не саромейся, сястрычка!

Які страх? Пра што ён? — мільгае ў думках, але я не расшчапляю вуснаў: не хапала яшчэ загаварыць з прывідам!

— О не, ты нават і сабе не прызнаешся, што баішся, што да смерці напалохана маім з'яўленнем. Як жа! Жыў недзе, падыхаў недзе ў падгнілай, кінутай усімі хаце, а тут раптам аб'явіўся, цябе, чысценькую, занэцкаў.

— Ты не смееш! Ты... ты... — задыхнулася я ад раптоўнай нянавісці.

— Спакайней, сястрычка! — уздыхнуў голас. — Мяне ж няма. Я толькі прывід. І заўсёды быў прывідам. Для цябе... Раней. І зараз. Зараз — больш чым калі б там ні было, нават з'явіся я перад табой з той жа, жывой, плоці і крыві, што і ты, падобны на цябе. Мы ўсе, Радзінскія, падобны. І не толькі даўгаватым з гарбінкай носам і шырока прарэзанымі вачамі, над якімі, сыходзячыся над пераноссем, буйна кусцяцца бровы. Ва ўсіх нас у венах бродзіць шалёная кроў. Кроў роду. Ці самога часу...

— Пры чым тут час?

Здаецца, я прамаўляю гэта ўголас, бо ззаду, ля акна, чуецца задаволены смяшок.

— Ну, не скажы, сястрычка! Адно вайну згадаць — душа поўсцю абрастае, не прызнаючы ў чалавеку чалавека. Колькі страху і нянавісці было на крыві замешана! І потым... Зараз... Хіба вайна не пакінула ў нас адчування катастрофы розуму? Усё разумнае, добрае, вечнае стала распаўзацца ў пальцах — ад аднаго дотыку пальцаў. І што? Хто кінуўся латаць яго, чым знайшлося, думаючы, што яшчэ можна штосьці ўтрымаць, ўратаваць, хто адкінуў і стаў вучыцца жыць інакш — іншымі, больш важкімі каштоўнасцямі. Разумнае... добрае... вечнае... Камуфляж. Словы! Іх не пакладзеш у кішэню. Не нацягнеш на плечы. Не выставіш перад гасцямі. Дык тады навошта яны? Тады...

— Ты не смееш! — вырываюся я са здранцвення і паварочваюся да акна, да беспрасветна-шэрага неба за ім.

— Цс-с-с! — чуецца з процілеглага кутка пакоя. — Ідзе ўціснутая ў тваё занадта вузкія догмы сакратарка.

Прымушаю сябе засяродзіцца — хоць знешне, вонкава, выглядаць звыкла засяроджанай. Адказваю на стук у дзверы. Чакаю, пакуль Зоя пастsavіць спадачак са шклянкай чаю на краёк стала. Дзякую.

— Што-небудзь яшчэ, Аляксандра Станіславаўна?

— Не, не! Дзякуй, Зоя, — падымаю я вочы на дзяўчыну.

Яна пайшла. Пакой злёгку пагойдвае раскалыханая яе крокамі цішыня, і я міжволі мацаю лоб гэткі ж ха-

лодны, паледзянелы, як і далонь. Штосьці здарылася... Што?

— Нічога не здарылася, сястрычка. Проста словы даўно не маюць ранейшай — хоць бы ранейшай! — сілы і не могуць перамагчы жыццё. Не могуць, якімі б прыгожымі, якімі б правільнымі ні былі. І не змогуць. Колькі б ты або гэткія, як ты, з імі не насіліся. Людзям здалося, што яны ўведалі, якое яно, «прыгожае» жыццё, і кожны хоча ўрваць ад яго хоць трошачкі больш, чым сусед, мае ці не мае ён на гэта права.

— Не табе гэта казаць.

— Ды ўжо ж, не мне. Толькі хто, апроч мяне, па ўсіх тваіх мерках — забулдыжніка і сукінага сына, скажа табе, што жыццё, калі да яго пільна прыглядзецца, даволі гнусная штука. Смерць забірае пустыя абалонкі, трупы, якія яшчэ да таго, як спыніцца сэрца, пачынаюць распадацца. Жыццё — гэта мільёны раз услаўленае намі жыццё! — забірае душы.Ператрушчвае іх у лёгкі ружовы пыл і развейвае, каб прыцерушыць, прыпудрыць самыя мярзотныя свае праявы. Ты ніколі не задумвалася навошта?

Я маўчу. Я ніколі не задумвалася над такімі непатрэбнымі пытаннямі і спадзяюся: ніколі не буду задумвацца. Дыялектыка развіцця не адмаўляе супярэчнасцей, жыццё не адмаўляе смерці, і пыл, хай сабе і ружовы, — прадукт матэрыі, а не духу. Гэта яшчэ школьныя ісціны!

— Ты не задумвалася, я знаю. За цябе даўно падумалі тыя, хто пісаў, складаў падручнікі, даведнікі, тлумачэнні, параграфы. Ты змалку любіла далдоніць завучанае. І ўсё было б добра, калі б жыццё пацякло так добра намаляваным некалі рэчышчам...

— Гэтае, як ты кажаш, рэчышча крывёй людской, працай іх цяжкой для новых дзён прабіта! — не вытрымліваю я гвалтоўнага дотыку да святога, балючага. — Як ты можаш? Як ты можаш, Ян, гэта гаварыць?!

— Магу. Я цяпер усё магу, сястрычка. Адсюль, дзе я, гавораць толькі тое, што мае сэнс быць сказаным.

— Сэнс? Ты ўзапраўду думаеш, што ў злосных, бязладных тваіх словах ёсць нейкі сэнс?

— Нейкі — ёсць. Калі прыняць маю кропку адліку — знізу, з самага нізу, куды ты не можаш зазірнуць з-за гары сваіх папер і паперак. А там не так ужо і бязлюдна, сястрычка, можаш паверыць мне на слова. Хоць

якое слова? У цябе ж, пэўна, і лічба патрэбная ёсць пад рукой, і тлумачэнні падрабязныя, на колькі чалавек і з якой прычыны вырасла, расце яна з году ў год. Вось і ўяві, на кароценькі міг уяві, што кожная адзінка з гэтай лічбы — твой няшчасны брат...

— Ты памкнуўся забіць чалавека!

— Я б ганарыўся сваім учынкам, калі б забіў гэтага, па твайму разуменню, чалавека дваццаць гадоў таму, а не зараз, калі ён ужо сам падыхаў ад з'едзенага і выпітага за сваё гнуснае жыццё.

— Ты пайшоў на забойства, забыўшы...

— Што — забыўшы? Што я сын былога суддзі Радзінскага? Што я брат суддзі Радзінскай? Я не забыў таго, што забыла ты, што ты не хацела помніць і не помніш.

— Што я павінна была помніць? Закон адзін для ўсіх.

— Толькі не ўсіх бачыць... Вось ты, сястрычка, змалку абгарадзіла сваю душу высокімі, у свой рост, перакананнямі: «вернасць абавязку...», «справядлівасць для ўсіх...», «шчаслівае абранніцтва...». А што, каго ты бачыла з-за гэтай агароджы? Дзе, над кім плакала твая душа?

— Над табой, дурнем, — стомлена, амаль абыякава абзываюся я з-за стала.

— Хлу-сіш! Не мне, а сабе хлусіш, сястрычка. Дабранькай ты нават прыкідвацца ніколі не ўмела. Вось і зараз не пра мяне думаеш, а думаеш пра тое, куды цябе могуць перавесці, ці намнога і як панізяць, ці выкараскаешся ты зноў, у другі раз, наверх. Толькі дзе ён, твой «верх»? Ты ненавідзіш мяне за тое, што я, вось такі, як ёсць, ужо мёртвы не адно для будучыні, а і для жыцця, — твой брат. Ты ненавідзіш мяне, хоць павінна б ненавідзець час, у які мы жылі, у які раслі. Маленства... Сям'я новым часам народжанага інтэлігента і ім жа, гэтым новым часам, адпрэчанага... Спробы спалучыць, зрасціць у нас жывёльнае і духоўнае, хоць усё духоўнае, калі ўзнікала ў тым патрэба, лёгка падстрыгалася пад нуль... Развенчаны энтузіязм, друзкі ад якога абярнуліся тлустымі, прывабнымі для вачэй парасткамі новага мяшчанства... Ты, як і я, павінна б ненавідзець гэты час!

— Пры чым тут час? Чаму я павінна яго ненавідзець? Гэта — мой час. Наш! Які б ён ні быў.

— Во-во! Ты зараз скажаш: «Вернасць абавязку...», «Ты павінен быў бы...», «Калі б усе...» Азірніся хоць бы на сваё жыццё, як не на маё! Чым яно было, калі не бясконцым караскаинем угару — ад адной удачы да другой, ад адной пасады да другой? Раней між інтэлігентаў гэта называлася кар'ерызмам, а сёння — ростам.

— Адкуль табе гэта ведаць? Ты ж...

— Гэта ведаеш і ты. А я... Я, як пішуць пісакі, раздушаны няўмольным колам лёсу. Ці колам часу, калі так зручней... Вось і паспрабуй апраўдай гэта кола — гэты час! Хоць бы наша маленства!

— Гэта быў час, калі нас любілі.

— Га-га-га! Га-га-га...

Кроў стыне ў мяне ў жылах: нечакана гучны рогат скаланае сцены пакоя, хістае, расхіствае іх. Чужы, амаль нечалавечы гэты рогат то аддаляецца — і тады робіцца падобным на вухканне сыча, то набліжаецца, грыміць над самым вухам — і тады глухне, абвальваецца кудысьці ў бяздонную чарнату сэрца.

— Га-га-га...

## II

Рэзка, пранізліва звініць тэлефон. Не паварочваючы галавы, намацваю апарат, здымаю трубку — і адразу цішыню ўзрывае трывожнае: «Лёкса? Лёкса!» Маруджу нейкі момант, услухваюся ў трывогу сястры, прыгадваю, што здарылася зусім нядаўна, колькі хвілін (гадзін?) таму...

— Лёкса! Чаму ты маўчыш?

— Ты ж не даеш уставіць ні слова. І не вітаешся.

— Ну-у, дзякуй богу, — выдыхнула тая, і адразу пацішэў, супакоіўся голас. — А ў мяне ўжо і сэрца ўпала, і рукі закалаціліся.

— Чаго? А раптам не спрацаваў бы апарат?

— Твая сакратарка пазваніла...

— Ох, ужо гэтая сакратарка! — буркаю незадаволена, прыгадваючы збялелы Зоін твар, спалоханыя яе вочы, што ўсё спрабавалі ўсміхнуцца і не ўсміхнуліся ў адказ на маю ўсмешку.

— Што здарылася, Лёкса? Новы сардэчны прыступ? Ператамленне? Што ўрач сказаў?

— Сказаў тое, што гавораць усе ўрачы на свеце: трэба паляжаць, адпачыць, набрацца сілы. Вось і ляжу, адпачываю.

— І ляжы! Ляжы, не ўставай. Урачы дарэмна не скажуць. А я зараз прыеду. Дачакаюся дзяцей са школы і прыеду. Мішу я пазваніла, ён ведае, як з домам і дзецьмі ўправіцца.

— Не мітусіся, Лёна. Боль ужо адступіўся. І не вернецца, я спадзяюся. І ніякай пільнай патрэбы...

— І дзякуй богу, што ніякай пільнай патрэбы. Што ж, толькі з пільнай патрэбы прыязджаць? Я хуценька!

Спрачацца не выпадае. Размова абрываецца, быццам Лёніна «я хуценька!» падштурхнула яе да неадкладнага дзеяння і ў той момант, як у мяне ў руцэ, у забытай трубцы папісквае ўстрывожаны яе словамі прасцяг, яна ўжо імчыцца з аднаго канца горада ў другі, са сваёй цеснай, застаўленай вазонамі, акварыумамі, птушынымі клеткамі, мадэлямі планераў і караблёў кватэры ў маю, прасторную, са строга падабранай мэбляй і пустую, калі б не паліцы з кнігамі і гадзіннік. Кнігі і гадзіннік пасяліліся тут адначасова са мной, на роўных правах. Часам здаецца, што ў іх нават большыя правы на гэтую жылплошчу, чым у мяне: я тут практычна толькі начую, а жывуць, гаспадараць яны — і звязвае іх паміж сабой штосьці важнае, штосьці нябачнае, незразумелае мне. Што?

Абводжу позіркам пакой, амаль не асветлены зараз акном: ужо добра такі сцёмнілася, і з усіх куткоў прарастае, расце, кусціцца змрок, мяняючы абрысы рэчаў, іх велічыню і значнасць. Кніжныя паліцы зліліся са сцяной. Пісьмовы стол нагадвае цёмны бясформенны груд чарпаты, да якога няўклюдна, ілбом, прыткнулася крэсла. Другое крэсла, быццам праткнутае двухгаловай дзідай таршэра, расплылося бліжэй да мяне, да маёй канапы — я чую, як яно ледзь стрымлівае ціхі стогн, уціскаючыся ў падлогу пад цяжарам майго позірку. Ці пад цяжарам мернага, гучнага пашчоўквання гадзінніка.

Можна ўключыць святло — настольная лямпа побач! — і тады загавораць, перабіваючы, заглушаючы, гадзіннік, кнігі. Спярша — бязладна, усе разам, калі разабраць толькі імёны, назвы або парадкавыя лічбы тамоў, потым — цішэй і больш разборліва, каб я магла спакойна выбраць якую з іх у субяседніцы. Адну, дру-

гую, трэцюю... Любую! А можа, гэта яны мяне выбіраюць, каб расказаць пра чыёсьці жыццё, пра чыйсьці час, — і тады цішэе гадзіннік, бы і да яго вяртаецца памяць.

Бом! Бом! Бом!

Што гэта з ім? Сцёмнілася. Вечар. А ён як спатыкнуўся — прабіўшы тры разы, уздрыгнуў, затросся (тоненька зазвінела штосьці ў яго ўнутры) і аціх... Тры... Што можа быць звязана з гэтай лічбай? Адзін, два, тры...

Усміхаюся, згадаўшы сябе трохгадовую, з мяккімі шчочкамі, адзетую ў белую блузку з рукавамі ліхтарыкам і вязаную спаднічку са шлейкамі, — стаю на крэсле з гнутай спінкай і гучна, з інтанацыяй дэкламую завучаны з голасу бацькі верш. Скончыўшы, прысядаю, узяўшыся за спаднічку: зараз усе кінуцца да мяне, будуць цалаваць, перадаваць з рук на рукі... Але ўсе кідаюцца ў другі пакой, як забыўшыся на мяне раптам, і я стаю, чакаю. Доўга чакаю, пакуль не пачынаю плакаць — гучна, злосна, патрабавальна...

— Не блытайся пад нагамі! — адпіхвае ад сябе маці, нават не зірнуўшы на мяне.

— Ян, глядзі, каб Шура не лезла да калыскі! — незнаёма-сурова загадвае бацька, абмінаючы мой недаўменны позірк.

— Ідзі пагуляй з пясочкам, — выстаўляе мяне за дзверы Ян. — І не ўздумай лезці на шашу!

Кідаюся насустрач кожнаму, хто з'яўляецца ў двары або ў доме, — не па гасцінец, не! — толькі б мяне заўважылі, толькі б спыніліся і загаварылі да мяне! Але ўсе спяшаюцца павіншаваць бацькоў з новай дачушкай, схіліцца над калыскай, знайсці колькі ласкавых слоў для той, якой усё роўна: яна спіць.

— Не блытайся пад нагамі! — сіпіць маці ў каторы раз..

— Ян, я каму сказаў глядзець за Шурай? — падтрымлівае яе, выводзячы мяне за руку з пакоя, бацька.

— Чаго ты пішчом лезеш туды, адкуль цябе гоняць? — незадаволена бурчыць Ян.

Крыўда становіцца большай, чым я. Усе мяне пакінулі, кінулі — ніхто ні на мае слёзы, ні на мае крыкі не азіраецца, не адгукаецца. І не трэба! І няхай! Я і не хачу блытацца пад нагамі. Не хачу пішчом лезці туды,

адкуль мяне гоняць. Не хачу сама сабе плакаць.

Азіраюся на дом ад самай шашы, пачынаю выбірацца на дарогу, набіраючы пясок у свае паўбаціначкі, дапамагаючы нагам рукамі. Выбралася. Яшчэ раз азіраюся: раптам пагукаюць! Ніхто не гукае. Што ж, і няхай. Зямля на шашы цвёрдая, зусім як на сцежцы, што вядзе да ганка, — ступаць па ёй зручна. Адно што пясок трэ, націрае пальцы, і я саджуся на жвір, скідаю паўбацінкі, не развязваючы, і вось яны ўжо засталіся ззаду, а я, амаль не вылучаючыся на шэра-жоўтым палатне дарогі, шлэпаю туды, дзе над самай зямлёй вісіць бліскучы вогненны шар. Ён здаецца цацачным, да яго можна дайсці, дацягнуцца... І я іду, не заўважаючы, што ўжо ўступіла ў ранак, у аграмадны, незнаёмы свет і гэты свет недаверліва ўзіраецца ў мяне, у маю адзінокую маленькую постаць. Іду, спыняюся, разглядваю нязвыкла блізкае неба, зноў іду, прываблёная ці то шолахам крыл (нейкая хвастатая птушка ляціць увесь час паперадзе), ці то нябачным званочкам песні дзесьці там, дзе пагойдваецца ад маіх крокаў бліскучы вогненны шар.

Шаша, яе калдобіны, яе дашчаны мост над зараснікам аграмадных лапухоў, яе няспешны спуск да глінішча — да старога глінавага кар'ера, яе паварот ад кар'ера да рачулкі, па самы струмень вады зарослай аерам, — усё незнаёмае, яркае, загадкавае. Ранак уцягвае мяне, адсоўваючы кудысьці назад спалены вайной і яшчэ не адбудаваны пасёлак, дом з чарапічным дахам на самай выспе ля шашы, маю забытую крыўду, — я радасна перасыпаю нагамі, кручу галавой і ні адно імгненне не адпускаю ад сябе сонца. Аграмаднае, яно пагойдваецца ад маіх крокаў, і вакол святлее, святлее...

— Ты спіш, Лёкса? — у паласе святла, што падае з адчыненых у калідор дзвярэй, стаіць у нерашучасці Лёна.

— Не, не сплю. З гадзіннікам вось размаўляла, цябе чакаючы.

— З гадзіннікам... — няўцямна паўтарае яна. — А я ўпершыню тваім ключом пакарысталася: не хацела падымаць цябе. Я зараз!

Адрываюся ад канапы, ямчэй, вышэй падкамечваю пад плечы падушку і ўключаю настольную лямпу. Не азіраючыся на шолах кніг на кніжнай паліцы, сачу праз адчыненыя дзверы за сястрой: яна адшчоўквае і ста-

віць сушыць парасон, скідае намоклы плашч, сцягвае боцікі і ўсоўвае ногі ў хатнія пантофлі — рухі ўсё занавольваюцца, быццам абцяжараныя нечаканай думкай, нечаканай здагадкай: напружваецца, спружынваецца спіна, нерухома застывае кукса светлых валасоў... І вось ужо Лёна ўбягае ў пакой, абцягваючы ўкруг стану, добра пакруглелага за апошнія гады, сукенку.

— Як гэта... ты з гадзіннікам размаўляла? Пра што? Ледзь паспяваю сагнаць з твару ўсмешку.

— Пра што? Пра час.

— А-а-а... Ты тэмпературу мерала? Ты, відаць, есці хочаш? Я там прынесла гародніну і малако. Можна зрабіць... — яна, знясіленая не столькі словамі, колькі думкай, якая не адпускае яе, бухаецца ў крэсла і з недаўменнем зіркае то на мяне, то на гадзіннік. — Слухай, навошта табе здаўся гэты гадзіннік? Даўно хацела спытаць: навошта ты ўзяла яго пасля смерці маці?

— Не знаю, Лёна. Сама часта думаю... Ненавідзела ж яго ў маленстве. Асабліва па начах, калі не магла заснуць. Думала, што буду ненавідзець яго ўсё жыццё. Але рэчы — не людзі, іх, відаць, нельга ненавідзець усё жыццё. Стары, драўляны, зроблены невядома ў якія далёкія гады невядомымі швейцарскімі майстрамі, гадзіннік не расклеіўся за столькі вандровак па свеце, не згарэў, калі гарэлі вёскі і гарады, калі сама зямля гарэла, і тым не мог не выклікаць маёй павагі. Напэўна, так. Уяўляеш? — яго двайныя рымскія лічбы на цыферблаце паказвалі час яшчэ ў мінулым стагоддзі. А мо і ў пазамінулым. Дзесьці ў Еўропе, магчыма, у самім Рыме. Ён гэтак жа рытмічна, шырока, у поўны ўзмах маятніка, адмерваў дні, месяцы, гады якому-небудзь пласкагрудаму чыноўніку, як адмервае іх зараз мне.

— Ну, і што? — не разумее яна.

— І то праўда. Дуру табе галаву, — згасаю я раптам: разумею ж, што балбачу што якое, толькі каб адцягнуць гаворку, адцягнуць тлумачэнні. — Як там твае?

— Здаровы. Мы ўсе здаровы, дзякуй богу. Ты, Лёкса, як? Што-небудзь здарылася? Сакратарка сказала: самлела ты над шклянкай гарачага чаю.

— Так і сказала?

— Лішылася чуств, сказала. Ды ці так ці гэтак — адна халера: штосьці здарылася!

— Ян...

— Памёр?! — сціснуўшы, сплёўшы пальцы, падхопліваецца Лёна і не садзіцца — падае ў крэсла. — Гэтага трэба было чакаць. Мы ўсе кінулі яго, мы ўсе, асудзіўшы яго за бязволле, прытварыліся, што не любім, не любілі Яна.

— Ян у турме. Ён... забіў чалавека.

— За-біў! Ян — забіў! Каго? За што? Ён не мог! Ён не мог, Лёкса! Няўжо ты не разумееш, што ён не мог?

— Ён быў п'яны, — пераадольваючы змогу, што ўжо навальваецца на мяне, гасіць словы, вочы, выціскаю з сябе і, знясіленая, адкідваюся на падушку.

— Дапіўся! — жаласна ўсхліпвае Лёна. — З гэткім жа, як сам, п'янтосам гáры гэтай праклятай не падзяліў!

Я маўчу. Я спрабую вярнуць душэўны спакой, душэўную раўнавагу, колькі хвілін таму знойдзеную і, здавалася, ужо непахісную. І не пазіраю на сястру. І бачу, як яна бязгучна плача, не выціраючы слёз, узіраючыся кудысьці ў мінулае. І ледзь стрымліваюся, каб не папікнуць яе за гэтыя слёзы, бо і сама ўжо бязгучна плачу, сама ўзіраюся ў мінулае, дзе нас было трое.

— Нічога нельга зрабіць, Лёкса? Нічым ужо не дапамагчы?

— Калі Шатэрнік памрэ, Яну ніхто ўжо нічым не дапаможа. Нават сам гасподзь бог, Лё.

— Пры чым тут...

— Той, каго храснуў па галаве бутэлькай Ян, — Шатэрнік Міхаіл Самсонавіч. І ён у бальніцы. З праламанай галавой. І гэта ўсё, што я ведаю, — таропка заканчваю я тлумачэнні.

— Шатэрнік... А-ёй! Што ж гэта такое, Лёкса? Што ж гэта будзе зараз? — зноў падхопліваецца Лёна, заломваючы рукі, і пачынае хадзіць з кутка ў куток, уздоўж кніжнай паліцы, туды-сюды, туды-сюды. — Шатэрнік... Здурэў Ян! Як ёсць, здурэў, відаць, ад гарэлкі, што руку падняў на... Ты сказала: калі памрэ? Дык ён — жывы? Ён мо выжыве?

— Я званіла. Надзеі амаль ніякай.

— Амаль ніякай... Значыць, Яну не выкараскацца.

Лёна зноў усхліпвае. Цяпер ужо гучна, уголас. І раптам, як злякнуўшыся нечага, рэзка прыпыняецца, усім грузным целам паварочваецца да мяне і застывае. Міргаюць павекі, шаволяцца губы, а ні слязінкі — з воч, ні слова — з пабялелых губ. Страсаючы здранцвенне,

яна праз немалое намаганне робіць крок, яшчэ адзін крок да канапы і ціха апускаецца на краёк, побач са мной.

— А ты? Што будзе з табой, Лёкса?

## III

Ноч. Зноў навалілася ноч. Зноў вярнулася адчуванне бяздоннай у абодва бакі чарнаты, з якой мне ніколі не выбрацца. Змрок чорнымі цяжкімі хвалямі, ліпкімі ад задушлівай гарачыні, калыхаецца ўшчыльную да твару — я не магу адарваць галаву ад падушкі, не магу расплюшчыць вочы і бачу — бачу! — чорнае калыханне, і кароткія, на адзін перашчоўк гадзінніка, таямнічыя бліскі за ім, і гадзіннік... Стары, у невядома далёкія гады зроблены, драўляны гадзіннік на сцяне, — там, дзе павінна быць сцяна, а зараз — чорны прагал, бяздонная яма, прыкрытая хвалямі змроку. Усё паглынула яма, а гадзіннік вісіць, пашчоўквае — толькі што вырас і стаў аграмадным: калі б я здолела расплюшчыць павекі — не ўмясціўся б у позірку. Я ведаю. Я неаднойчы падглядвала за ім, калі ночы былі яшчэ цямнейшымі, чым гэта, і ўсе ў хаце засыналі.

Калі ўсе засынаюць, я перастаю баяцца ночы, чарнаты і пашчоўквання гадзінніка на цвіку, убітым у гэту чарнату. Я — застаюся сам-насам з усім гэтым, і лёгка ўгаворваю свой страх, і магу расплюшчыцца, адкрыць вочы і пераканацца: ніхто, нішто і ніадкуль не пагражае мне, і ён, страх, — гэта я сама, гэта маё худое цельца пад мяккай ільнянай пасцілкай, вільготнай ад няроўнага, гарачага дыхання там, дзе я пакусвала яе край, каб не застагнаць ад злоснага, на мяжы слёз, бяссілля. Усё яшчэ дзіцячага бяссілля! Таму што калі б мне споўнілася не мае сем год, а, скажам, семнаццаць, я адмяніла б і ноч, і сон, што кожны раз падоўгу не прыходзіць, і пакутнае чаканне святла, золку і... таго дня, калі я стану вялікай, дарослай, і ўцяку ад гэтых чэпкіх, нястомна таропкіх стрэлак гадзінніка і яго аграмаднага, на ўсю ноч, маятніка, што раскалыхвае цяжкі змрок. Раскалыхвае так моцна, што пачынаюць хістацца падлога і ложак, і высокі, набіты саломай сяннік, на якім спім мы з Лёнай. Лёна — спіць. Побач са мной. Ледзь уткнулася носам у маё плячо і ўжо цёпла пасапвае, не

зважаючы ні на чарнату, ні на гадзіннік, які гулка адбівае кожныя паўгадзіны, ні на бацькоўскі ложак, каля акна, ад якога разыходзяцца па хаце гарачыя хвалі шэпту, шолаху, незразумелых і чамусьці брыдкіх гукаў. Хвалі пракочваюцца і па мне, цераз мяне, хоць я шчыльна затыкаю вушы пальцамі, да болю ў вачах сціскаю павекі і стараюся думаць пра штосьці чужое, далёкае. Але пра чужое, далёкае — не атрымліваецца, таму што ўсё далёкае адразу пачынае нагадваць бяздонную пачцую чарнату, якая ўцягвае мяне і не можа ўцягнуць, як не можа ўцягнуць стары драўляны гадзіннік з вялізным, асветленым невядома кім і адкуль цыферблатам і пляскатым, занадта гучным маятнікам. І я пачынаю думаць пра гэты гадзіннік. Пра яго пляскаты маятнік, што не робіць ніякіх засечак на сцяне, хоць і адсякае, няспынна адсякае маленькія прамежкі часу — імгненні, якія спакваля складваюцца ў гадзіны, ночы, гады. У мае ночы, у мае гады. Як раней у чыесьці іншыя.

— Няўжо ты не разумееш? — выразна чую раптам матчын голас і, паслабіўшы крыху палец, вызваляю адно вуха: усё роўна чуваць.

— Няўжо ты не раскумекаў дагэтуль, што гэта Шатэрнік і з'еў цябе, глынуў, нават не папярхнуўшыся? У сябрах скрозь хадзіў, вочы табе заліваў...

— Кінь, Воля, не пачынай! І Шатэрніка не чапай. Пры чым тут Шатэрнік?

— Пры чым?! Ты яшчэ пытаеш, пры чым? Госпадзі божа ты мой, — не зашаптала, засіпела маці, — чэрці яму пелі, твайму сябруку, калі ён думкі свае выношваў. Ды ён спаў і бачыў сябе ў тваім крэсле! І каб жа толькі крэсла выбіваў з-пад цябе, сляпога, ён жа на аўтарытэт твой пакваліўся, на павагу людскую да цябе. Хто ты зараз для ўсіх? Хто? Былы герой? Былы партызанскі камандзір? Былы суддзя Радзінскі?

— Кінь, Воля! Жывы я яшчэ!

Я скаланулася. Словы, вымаўленыя цвёрда, у поўны голас, скаланулі мяне і ўціснулі ў гэты рух. Спярша — у гэты рух, потым — у наступны: таропка затыкаю пальцам вуха, спрабуючы праваліцца ў чарнату, у чорную бездань, толькі б нічога не чуць. Нічога, нічога, нічога! Навошта мне гэты пузаты, круглатвары і круглавокі Шатэрнік у вечнай скуранцы, які ніколі не праміне, каб сваёй гарачай, потнай далонню крануцца маёй шчакі і шапялявым з нейкім салодкім прысвістам голасам пра-

гугніць: «Расцеш?» Быццам я магла не расці! Расту. Толькі вельмі марудна расту: як навязвае хто...

Шатэрнік, Шатэрнік! Наш дом як пракляты гэтым чалавекам. Быў сябрам — стаў суддзёй, змясціўшы бацьку, і ходзіць з вялікім бліскучым партфелем... Заходзіць ледзь не штодня і кожны раз прыносіць у партфелі акуратна загорнутую ў газету бутэльку... Памінае нейкія завершаныя ці незавершаныя справы ў судзе. Маці ж цёнгле памінае яго, Шатэрніка. Нават у ложку, калі трэба спаць. Калі так хочацца спаць!

— Ты ж чысты. І Шатэрнік ведае, што чысты. Ты ж не браў тых грошай. Гэта я, па сваёй дурацe, узяла. Дык я ж не ведала, што з-за іх гэткае ўсчацца можа, што з-за іх цябе... Ты чуеш, Стась? Я ж не ведала.

Бацька не адгукаецца, а маці (быццам за дзень таму душу не пераела!) шэпча і шэпча:

— На кватэру дзяржаўную вока загарэлася, на пасаду... А мо і ўва мне прычына? Мо гэта я паміж вамі ўстрагла? Яму ж не першыня: цёнгле аблізваўся, на мяне гледзячы, на маё шчасце. Грошы тыя, узятыя мной, згадаў... Дык аддалі ж, вярнулі мы тыя грошы! Чуеш, Стась? Чуеш? Як жа мы жыць будзем зараз? Маці твая, відаць, склінае мяне...

Бацька маўчыць. Глуха, заціскаючы рот рогам пасцілкі, кашляе зрэдчас і маўчыць. І я ўслухваюся не ў словы матчыны (штосьці зноў пра Шатэрніка, зноў пра сябе), а ў гэта яго пакашліванне, у яго маўчанне, і прашу, немаведама каго бязгучна прашу: зрабі так, каб яна замоўкла, каб яна заснула!

— Ты зусім не слухаеш, Стась. Ты зноў за сваё...

— Жывы я яшчэ, — адзываецца той, і я не пазнаю яго голасу, глухога і быццам асіплага. — Жывы ж я яшчэ, жывы, Воля...

Словы як расталі ў чарнаце, зніклі, згубіліся сярод знаёмых, невыразных і чамусьці брыдкіх гукаў ці рухаў; і зноў я трапляю ў палон да гадзінніка, да пястомна таропкіх яго стрэлак і аграмаднага, на ўсю ноч, маятніка, што раскалыхвае цяжкі змрок і робіцца ўсё больш падобным на бліскучы вогненны шар... І вось ужо хтосьці нябачны адарваў маю галаву ад падушкі, асцярожна ўзяў мяне на рукі, падняў і пасадзіў на гэты бліскучы шар, на пляскаты яго край. Як на арэлі. Я баюся апячыся і ўсё ж чапляюся рукамі за край, каб не зваліцца, і лячу — лячу спачатку ў адзін бок, туды,

дзе далёка на ўсходзе ледзь прыкметна бялее палоска святла, пасля ў другі бок, туды, дзе згушчаецца цяжкі, ліпкі ад задушлівай гарачыні змрок. Туды-сюды, туды-сюды...

У мяне кружыцца галава. Я хачу саскочыць і не бачу, куды можна скочыць: з абодвух бакоў — бяздонная чарната, з якой потым ніколі не выбрацца, унізе — ні ложка, ні падлогі... Становіцца страшна. Страшна, што я так і не выраслу — не паспею, што я буду гайдацца над гэтай ноччу, пакуль стане сілы трымацца, чапляцца, пакуль не ўпаду ў ноч, у яе бяздонную яму. Страшна, што больш нічога не будзе — нічога! — хоць для нечага ж я нарадзілася, для нечага расла на зямлі.

Усё вышэй увінчваецца ў цёмнае неба вогненны шар. Усё больш кружыцца галава. Я баюся ўпасці і — падаю...

— Лёкса! Прачніся, Лёкса!

Хтосьці будзіць мяне, а я ніяк не пазнаю, чый гэта голас. Бабулін? Матчын? Што яна хоча ад мяне?

Штосьці вільготнае, прыемна прахалоднае апускаецца на лоб — становіцца лягчэй дыхаць і лягчэй думаць. Я павінна — павінна! — прыдумаць і ўсё-ткі прыдумаю, як ачысціцца ад мінулага. Яно, мінулае, не мае на мяне ніякіх правоў... І не мела. Урэшце, ніколі не мела! Я сама — няхай за валасы часам, але сама выцягвала сябе з чарнаты, са страху, са слабасці. Я не дам сцягнуць сябе назад. Усё зраблю! — выракуся мінулага, выракуся брата... Хіба ён не выракся мяне сваім учынкам? Нікога не хачу! Я сама... Адна... Я не дам сябе растаптаць, не дам!

— Лёкса! Божа мой, Лёкса!

Расплюшчваю вочы: на шкляной сцяне, праз якую відаць паліцы з кнігамі, пагойдваюцца разныя, амаль празрыстыя цені лісцяў. Якія лісці? На вуліцы восень...

— Лёкса, ты чуеш мяне?

Я чую. Я раптам разумею, хто так доўга будзіць мяне: Лёна. Яна вечна цягнецца за мной хвастом, вечна хоча мне ўслужыць... А плача — па Яну! Слязінкі капаюць мне на твар, прапякаючы скуру, а плача нябось па Яну... Хто яго штурхаў? Мсціўца, ты ж разумееш! Душа не вытрымала! А чаму мая душа магла вытры-

маць столькі... Столькі... Не, ён не здолее пацягнуць мяне за сабой. Я ўсё зраблю. Усё, і звыш таго, што ўсё...

Штосьці балюча ўпіваецца ў руку. Я хачу атрэсці гэтае «штосьці» і не магу: рука заціснута чыйсьці дужай рукой і не можа нават зварухнуцца.

— Ну, вось. Усе страхі мінулі, Алена Станіслаўна. Пры сардэчнай недастатковасці гэта зрэдку здараецца.

— Не ведаю, як і дзякаваць вам! Падняла да пеўняў...

— І правільна зрабілі. Калі не змагу зайсці праз гадзіну-другую, прышлю «хуткую».

— А гэтага... Вадзім Пятровіч, рабіць не трэба! — умешваюся ў размову нечакана для іх дваіх: Лёна ўскрыквае і хуценька заціскае рот далонню, а Звонаў, азіраючыся ўжо амаль ад дзвярэй, насцярожана і ўсё ж задаволена хмыкае:

— А што я казаў!

— Лёкса! Як ты мяне напалохала! — зглынуўшы з уздыхам радаснае здзіўленне, ускліквае Лёна.

— Дык не трэба «хуткай», Аляксандра Станіслаўна?

— Не трэба. Дзякуй.

— Тады я сам зайду. Вы дазволіце?

— Буду рада.

Штосьці балюча ўздрыгвае ўнутры і тут жа, адкінутае маім пагардлівым: «Глупства!», сцінаецца, аціхае. Ды я больш і не ўслухваюся: раскісла! назад азіраюся! як паненка спешчаная млець пачынаю! Дзейнічаць трэба, штосьці рабіць трэба, а не ляжаць.

## IV

Электрычка ідзе хутка. Вагон амаль пусты. На другім канцы яго, адсунуўшыся ад акна, хутаецца ў вялікую клятчатую хустку бабулька. Праз дзве лаўкі ад яе — адтуль зрэдчас чуюцца нягучныя ўсхрапы — вытыркаюцца ў праход чыесьці запырсканыя граззю боты, перада мной — спіна з амаль уцягнутай у плечы галавой у берэце, з-пад якога тырчаць няроўна падрэзаныя, пабітыя сівізной валасы. Ды збоку, за якія два крокі, азіраючыся на мяне, шэпчуцца дзяўчаткі — у аднолькавых паралонавых куртачках, зашпіленых да падбародка, аднолькава падстрыжаныя пад «алімпійку», яны, усе

трое, здаюцца блізнятамі ад розных бацькоў: мода заўсёды ўсіх абязлічвае...

— Станцыя Седча! — хрыпіць схаваны пад абіўкай рэпрадуктар, і я міжволі кратаю плячамі, страсаючы здранцвенне: у вагоне халаднавата.

Праз тры прыпынкі — яшчэ хвілін пятнаццаць ехаць — Рудзенск! Ру-дзенск... Немаведама адкуль узнікла назва. Нсвядома нават: назва чаго? Пасёлка, які вырас укруг чыгуначнай станцыі ў другой палове мінулага стагоддзя, ці чыгуначнай станцыі — пасля таго як чыгунка ўрэзалася ў старое, акружанае барамі паселішча? Паселішча, а то і горад. Калі па назве меркаваць, дык тут, ва ўзгорыстай лагчыне, між Пціччу і Свіслаччу, стаяў некалі горад, хай сабе не такі вялікі і слынны, як Менск, Віцебск або Смаленск.

Не ведаю чаму, але мне скрозь хацелася, каб хоць у мінулым Рудзенск быў горадам. Гэта надало б яму вагі, а то нават раён перавялі далей на дваццаць кіламетраў. Я шмат каго распытвала, толькі ніхто нічога не помніў. Большасць людзей пасяліліся тут пасля нядаўняй вайны, калі ўсяго, што ацалела, было — чыгуначны насып з пакарабачанымі рэйкамі ды цагляны будынак школы без аднаго зашклёнага акна, дзе, па словах бацькі, была ў вайну нямецкая жандармерыя. Бацька ведаў. У вайну ён камандаваў разведкай у партызанскім злучэнні. А мне і з яго слоў усё было відаць. І чыгуначны насып — там, дзе ён высіцца і дагэтуль, грэючы на сонцы сталёвыя бліскучыя рэйкі, здалёк, з пагорка, падобныя на гадзюк. І тры галоўныя вуліцы — адна за чыгункай, дзве ў цэнтры пасёлка, што студзілі і ніяк не маглі астудзіць папялішчы наўкруг. І двухпавярховы з чырвонай цэглы будынак школы з павыбіванымі вокнамі і абгарэлым дахам... Але ж гэткім пасёлак быў у вайну, калі я нарадзілася. А раней? Даўней? Ніхто нічога не помніць...

— Помніш, ён сказаў: «Пляваць мне на вашых амураў! Вядома, чым усё завяршаецца...» Помніш?

— Адумысла ўсё. Сам жа пад тваімі вокнамі кожны вечар высвіствае!

— Дык не забароніш. Нораў нораву не ўказ.

— Ой, дзевачкі, што я вам скажу!

— Цішэй, Аня...

Паварочваю галаву ў бок паралонавых куртачак, але яны ўжо згрудзіліся на лаўцы, зліўшыся ў адну

чырвоную пляміну, у адно неразборлівае «ш-ш-ш...». І я зноў пачынаю пазіраць у акно, на голыя, пашкуматаныя ветрам і дажджамі пералескі, на нізкае, сям-там з яркімі ультрамарынавымі разрывамі неба за імі.

Рудзенск. Суддзя Радзінскі. Лёкса Радзінская, я... Раней мне чулася ў гэтых словах нейкая загадкавая сувязь, быццам менавіта тут, у пясчанай (калупні рыдлёўкай — і пясок!) зямлі, у цьмяным, адцятым ад людской памяці мінулым і знаходзяцца дужыя, не высахлыя праз столькі пакаленняў карэньчыкі майго жыцця. Знайдзі я іх, крані — і стала б зразумела, што я не проста дачка суддзі Радзінскага, што я — гэта Я. Дачка гэтай зямлі. Асобна ад усіх і побач, за крок ці нават за паўкроку ад цэлага народа маіх сваякоў, падобных і непадобных на мяне, з маім і зусім не з маім прозвішчам.

Ды гэта толькі сказаць лёгка: знайдзі і крані... Дзе ты іх знойдзеш, тыя карэньчыкі, калі колькі хто ні капаў, усё выварочваў пясок, друз, патронныя гільзы, асколкі, што яшчэ не паспелі заржавець і зусім іржавыя — рассыпаліся ад дотыку. Мы таксама капалі, на пусташы за школай, — дык рыдлёўку было не ўбіць! Чаго толькі не выкалупвалі з зямлі! І салдацкую каску, і ружжо яшчэ часоў вайны 1812 года, і срэбны, пабіты чарнатой нацельны крыжык, і цэлы стос старых сцёртых манет — гэта калі не лічыць усякага непатрэбнага для гульні ламачча і самай сапраўднай гранаты, што ўзарвалася каля агню раней, чым Юзік, Юзік Чарнуш з Пралетарскай, скаціўся ў канаву, адкуль я махала яму. Махаць махала, а ён не паспеў. Выбух скалануў зямлю, у якую я ўціснулася носам, а Юзік з таго дня пакульгваў — асколкам нагу зачапіла. Спраўная была граната.

Карэньчыкаў не знаходзілі. Калі яны і былі, дык недзе глыбей, вельмі глыбока — не дакапацца. Таму і не помніў ніхто нічога з даўніны, што ніхто не мог садраць ці хоць бы прабіць напластаванні пяску, друзу і жалеза — напластаванні самых розных часоў. То ў адзін бок, то ў другі каціліся ваенныя армады, сціраючы самыя сляды чалавечага жыцця, а жыццё зноў адраджалася, людзі зноў будаваліся на ранейшым месцы, зноў спадзяваліся, што новая навала абміне іх. Як і сёння спадзяюцца.

Пасёлак, канечне, самы звычайны, адзін з дзесяткаў, а то і сотняў гэткіх жа або падобных, але як ён выгля-

даў у мінулым, якім ён стане ў будучым, невядома. І людзі, як і я, жывуць у гэтай невядомасці, акружаныя ёй, адасобленыя ёй ад сваёй уласнай будучыні.

— Станцыя Рудзенск! — адкашляўшыся, захрыпеў рэпрадуктар, быццам я магла раптам не пазнаць забалочаны выган укруг спрамленай у канаву безымяннай ручаінкі, удзірванелы двор былой нафтабазы з трыма скасабочанымі цыстэрнамі, высачэзную ліпу з буслянкай насупраць станцыйнага склада...

Ліпы — няма! Як скінуць вокам — пуста. Я нават не паверыла спачатку. Саскокваю на платформу і ўсё шукаю вачамі знаёмы абрыс... Здзіўлена ўслухваюся ў балючае шкадаванне: яно ўзнікла раптоўна і не адпускае, быццам не старую ліпу, а штосьмі вельмі маё адцялі ад пасёлка.

— Лёкса?

Азіраюся, зрабіўшы ўсяго колькі крокаў па платформе. Хмурнею: гэтага трэба было чакаць — не адзін, дык другі пазнае!

— Прабач. Ты ж цяпер Аляксандра Станіславаўна нябось?

— Ю-зік? Чарнуш? — нават не спрабую схаваць непрыемнага здзіўлення, пазнаючы ў чалавеку з уцягнутай у плечы галавой, якую быццам сплюснуў занадта цесны берэт, колішняга сябрука сваіх не па-дзіцячы занятых пошукаў свабоды ад усіх (тады думалася, што гэтакая свабода бывае!).

— Чарнуш. Думаў, не пазнаеш. Добры дзень! — падае ён мне руку, і, калі, не падрыхтаваная да гэтага руху, я нейкае імгненне маруджу, супіць бровы і цішэй дадае: — Думаў, не пазнаеш.

— Чаму ж! — спадцішка разглядваю я яго скуласты, стомлены зараз твар, яго плашчовую, зашмальцаваную ля кішэняў куртку і тупаносыя з тонкай не па сезону падэшвай карычневыя туфлі.

— Здараецца, людзі пазнаюць толькі тых, каго могуць паставіць побач з сабой.

— О-о! Ці не філосафам ты стаў за гады, калі мы не бачыліся? Тое я і гляджу, што ў валасах сівізны багата, — няўдала жартую, нават сама не ўсміхнуўшыся на жарт, і ў думках падшукваю ўжо іншыя словы, каб неяк загладзіць сказанае. Нічога вартага не знаходжу і сур'ёзна, сумна зазначаю: — Побач з чалавекам, Юзік, часта толькі яго цень.

— Цень? — прыжмурваецца той, пачэсваючы тым жа рухам, што некалі ў маленстве, нос. — Гэта штосьці з кніжак. А я — пра жыццё, Лёкса.

Мы сходзім з драўляных масткоў, пакладзеных паміж рэйкамі, і кіруемся праз з'езджаны, разбіты машынамі прыстанцыйны пляц лявей, да вышчарбленага і, відаць, за ўсю восень ніводнага разу не чышчанага тратуара — шляхам зараз не прайсці з-за гразі і вялікіх, цераз увесь шлях, лужын.

— Калі спілавалі старую ліпу? — пытаюся, каб не маўчаць. — Неяк пуста стала.

— Не спілоўвалі. Сама ўпала, калі вецер пачаў лютаваць. Тры зімы таму.

— А буслянка?

— Што буслянка? Зімой жа было.

— Буслянцы якое месца вызначылі? Дзе яна зараз?

— Не ведаю. Пра гэта неяк ніхто не думаў.

Ну, канечне! Хто б гэта сёння пра буслянку думаў? І я ж проста так згадала: позірк зачапіўся... У душы нечакана ўспыхвае злосць. Бязлітасны, пякучы яе агеньчык ліжа нутро, здзекліва высвечвае якіясьці цёмныя расплывістыя плямiны. Словы не словы... Свабода ад усіх! Сябрук! Старая ліпа! Чаго, запытацца, ехала? Гразь пасялковую мясіць? Юзіка, што, калыхаючыся з боку на бок, пакульгвае побач, разгаворваць? Дык навошта яго разгаворваць? Ён жа не можа не здагадвацца, з якой нагоды я завітала ўпершыню пасля матчынай смерці. Носа не паказвала, а тут з'явілася! Дурань і той бы здагадаўся, а Юзіка ў дурні не запішаш. Дык чаму і не спытаць яго прама, як ёсць?

— Ты, пэўна, з-за брата прыехала? — зіркае той раптам на мяне: учуў, няйначай, перамену ў настроі.

Нашы позіркі сустракаюцца.

— Ты што-небудзь ведаеш, Юзік?

— Тое, што і ўсе.

— А што ведаюць усе?

— Мінулага не падзялілі. Штосьці пра бацьку Ян крычаў, пра паперы трыццацігадовай даўнасці... Іуду памінаў... Хварэў Ян апошнія месяцы. Усю восень, лічы. Хмуры быў. Нелюдзімы. Нават выпіваў рэдка. Нячысцік яго ў той дзень у сталоўку панёс! І з хлопцаў нікога побач не аказалася.

Моўчкі, не адказваючы Юзіку, думаю над яго словамі: усё рассыпаецца — ніяк не магу сабраць словы ў

адно. Бацька... Паперы... Былі нейкія паперы? Але, каб яны былі, я ведала б пра іх! Якія паперы? Адкуль?

— Якія паперы? — прамаўляю ўголас.

— Немаведама якія. Зараз ужо і не высветліць, мусібыць. Калі хто што ведаў пра іх, дык толькі яны двое. А мо і яны не ведалі: хвароба ці хмель розум аднялі.

— Хмель, кажаш? А людзі... суседзі як да ўсяго гэтага паставіліся?

— Ты не павіталася са сваёй былой настаўніцай, Лёкса.

— Што? — здзіўлена зіркаю на яго, потым — цераз плячо — назад: жанчына ў шэрым габардзінавым макінтошы, старанна абмінаючы лужыны, кіруецца да газетнага кіёска. — Соф'я Захараўна? Я не заўважыла. Гарадская звычка, ведаеш. З сотнямі людзей на вуліцы размінаешся штодня. Звычка.

І тут жа думаю, што звычка ў гэтым выпадку, напэўна, ні пры чым: проста ў гэту хвіліну, абмінуўшы школу, дарога забірала крута ўгору, а там, за ўзгоркам — праз тры хаты, на рагу Савецкай і Пралетарскай — стаіць хата майго маленства. Пустая зараз. Замкнёная... Але пра гэта лепш не думаць!

— Ты не адказаў мне, Юзік.

— А што суседзі? Шатэрніка ў нас скрозь не любілі, ты ж ведаеш. Але не любіць — адно, а бутэльку аб галаву разбіць — другое. Старасці яго спачуваюць. Дажываў жа ўжо, маўляў, стары сваё... А Ян? Хто для іх Ян? Адзін з Радзінскіх, кінуты сваёй сям'ёй. Адзін з тых, хто п'е ўжо без просыпу, без ачунку, прапіваючы рэшту свайго жыцця... Пагаварылі бабы, павойкалі, згадваючы былое, і зноў — кожная сама ў сабе, у сваіх клопатах, у сваіх дзецях. Неаднойчы ж і раней да панажоўшчыны даходзіла: сп'яну і белае чорным здасца!

З няўцямнай тугой услухваюся ў Юзікавы словы, ужо не чуючы іх, не прымаючы: хата, родная нават у сваёй балючай адчужанасці, пакінутасці, набліжаецца, насоўваецца на нас — на мяне! — як ні запавольваюцца мае крокі, як ні працівіцца мой пагляд. Пастарэлая, прыгорбленая (відаць, кроква струхлела ці надламалася пад цяжарам цяжкой цэментавай чарапіцы), яна быццам урасла на цэлую прызбу ў зямлю, у набраклую дажджамі раллю агарода, і латаны-пералатаны, чым траплялася пад руку, плот толькі падкрэслівае яе недагледжаную старасць, яе пакінутасць. Чым больш я ўзі-

раюся ў хату, тым больш яна нагадвае пастарэлую, апранутую ў паношаныя лахманы з чужога пляча, абыякавую да сябе і ўсяго вакол жанчыну, у якой амаль немагчыма пазнаць калісьці знаёмую постаць. Зводжу павекі: на кароткі міг раптам здаецца, што не да двара свайго, не да хаты я іду, а да нерухома застылай, як урослай у зямлю, жанчыны, плечы якой акрыты парудзелай ад часу плюшаўкай, і не пазнаю, не хачу пазнаваць, што гэта жанчына за колькі крокаў ад мяне — матка...

— Лёкса? Табе кепска? Ты не можаш ісці?

Тут толькі заўважаю, што стаю на месцы, учапіўшыся здранцвелымі пальцамі ў Юзікаў рукаў, і адно вуліца, бліжэй да платоў зарослая палыном і пырнікам, перабягаючы Савецкую, па якой мы ішлі, аддзяляе мяне ад нашай сядзібы.

— Можа, да нас зойдзем? Чаю вып'ем, пагамонім, былое прыгадаем, даўняе і нядаўняе. Колькі гадоў не бачыліся! Знайшлося б, пра што пагаманіць.

— Не-не! Дзякуй, Юзік. Прабач, мне і сапраўды на якую хвіліну кепска стала. Сэрца, ведаеш...

— Вось і зайшла б. Адпачыла. Мама б на цябе парадавалася... У вас жа, няйначай, замок вісіць.

— Дзякуй. Іншым разам.

— Іншым дык іншым. Будзь здарова, Аляксандра Станіславаўна. Калі што якое, мяне адшукаць лёгка: і двор стары, і дом стары, і памяць з дому ніхто не выганяе.

Юзік не пазірае на мяне. Дагаворвае наогул сам сабе. І вось ужо так і не падняўшы вачэй, зварочвае на сваю вуліцу і шпарка, значна мацней кульгаючы, аддаляецца ў бок сваёй хаты. Міжволі праводжу яго позіркам, не могучы адвярнуцца ці хоць бы адмахнуцца ад раптоўнага, раптоўна ўзніклага пачуцця сораму, як у судзе з Юзікам размаўляла — ні пра сям'ю, ні пра занятак ягоны не распытала. І запрашэнне не прыняла... Пакрыўдзіла чалавека, моцна, відаць, пакрыўдзіла, а ён жа калісьці быў сябрам. Калісьці... у маленстве...

Ат! Калі тое было! Хоць і не забылася, а мінулася. Нават хата, што некалі ганарліва высілася на пагорку, выхваляючыся шэрай, ямчэ даваеннай чарапіцай, асела ў зямлю, згорбілася. Што ж пра нас сказаць. І мы пастарэлі. І мы іншыя. Што карысці на сябе ранейшых азірацца? Разышліся сцежкі. Разміналіся гады. Што я сюды ў госці ехала? Што я...

Затрыманая гэтай думкай, спыняюся пасярод вуліцы, апускаю вочы на свае запэцканыя граззю боты, разгублена азіраюся: а чаго я ехала? Куды? Навошта? На хату апусцелую паглядзець? Сябе ёй паказаць. Суседку, у якой жаба на языку не ўседзіць, распытаць пра тое, што здарылася? Глупства. Непралазнае глупства: ёсць жа матэрыялы следства, ёсць жа сведчанні добрага дзесятка людзей!

Рэзка, не зважаючы на лужыны, што пазаплывалі граззю (боты на станцыі ля вадакачкі абмыю!), паварочваю назад. Не назад, а ўніз па Пралетарскай, каб выйсці ёй да шашы і шашой вярнуцца на вакзал. Іду. Ледзь не бягу. Ногі ў каленях млеюць, а я прыспешваю і прыспешваю крокі, спіной адчуваючы пустыя, цёмныя вокны хаты, быццам чыйсьці пусты, цёмны позірк — зацята-настойлівы позірк услед. Гэта нагадвае ўцёкі. Я разумею. І нічога не магу зрабіць або змяніць: невядомая сіла, невядомы страх гоняць мяне прэч. Далей і далей. У бок станцыі. Назад. Да звыклай, даўно здабытай для сябе бяспекі і ўтульнасці.

## V

Зноў гэты няўлоўны, зацята-настойлівы позірк! Хто, адкуль заўсёды сочыць за мной, адумысла не адпускаючы ні на хвіліну? Што ні зраблю, што ні скажу ці толькі падумаю — тут жа заварушацца, пабягуць па спіне халодныя ліпкія мурашы. Азірнуся ж — ззаду прыкрытая засланкай печ. Або ўрослае ў бэзавы куст акно. Або сцяна і на ёй фотаздымкі, зашклёныя чыёйсьці — не маёй! — памяццю. Або вялізнае, пад самую столь люстэрка ў чорнай разной драўлянай раме, набытае недзе маткай.

Прычына, відаць, якраз у гэтым люстэрку. Ці мо ў маёй пагардзе да яго, да яго роўнай бліскучай паверхні, якая аднолькава абыякава адлюстроўвае ўся і ўсіх, чый цень на яе патрапіць, да яго зацятай праўдзівасці і ўмення выгледзець кожную рыску, кожную радзімку або гарбінку, хоча таго чалавек ці не хоча, да яго шырокай чорнай рамы, якую кожны тыдзень, па загаду маці, праціраю анучкай, змочанай у керасіне, а яна ўсё роўна відочна старэе і пакрываецца дробнымі белымі кропачкамі. І няхай старэе. Хутчэй рассыплецца, хутчэй

асыплецца дробнай пацярушкай. Бач, узяло за звычку назіраць за мной!

Ведама, прычына толькі ў ім. Недарэмна матка яго так любіць, як ні сядзе, дык усё так, каб пераглядвацца з ім, — зловіць, што я пагардліва ўсміхаюся, ажно закалоціцца ўся: «Не маеш, чым заняцца? Прэч адсюль!» А адкуль — адсюль? З вачэй? З хаты? З сям'і? Дык я ж і так ледзь не ўвесь час на вуліцы.

Сям'я! Гучыць зусім як «сем я». Праўда, нас не сем, а шэсць. Нават пяць, калі не лічыць мяне. А мяне можна не лічыць. Я неяк непрыкметна для ўсіх — ды і для сябе самой — выпала. Не старэйшая і не малодшая з дзяцей. Не сын — прозвішча і тое не захаваецца. Не красуня, каб хваліцца мной, як прыгожай лялькай, перад гасцямі і суседзямі.

Не красуня? Ды чаго там! — брыдкае качаня. Нельга ж гэтага не разгледзець у такім аграмадным люстэрку. Бачу. Не маленькая. Ат! Усё гэта як за плот... Лепш бабулю слухаць. І чакаць. Чакаць, пакуль вырасту і тады ўжо... О, тады ўжо я сама сабе вызначу ролю. Вялікую. Ганаровую. Самую ганаровую! Такую, для якой не важна, даўгаватыя ў мяне твар і нос ці не, мяккія хвалістыя валасы, ці каляныя і непаслухмяна тырчаць за вушамі, выбіваючыся з тонкіх, чыста казіных коскаў. Чалавека, урэшце, вызначаюць не нос і не твар. І не валасы. Не пазірае ж ніхто на бацькаў нос або на яго залысіны над ілбом, калі прыходзіць да яго па справе. Ну, а калі ўжо ён у судзе прысуд чытаў!..

Я магу стаць гэткай, як бацька. Я і па характару пасачыла яго, і з твару — зусім як ён: і лоб, і нос ягоныя, і падбародак гэтакі ж непрапарцыянальна малы, як да ўсяго доўгага твару. Нават у косці шырокая, як бацька. Нават ростам яго даганяю. Высокая і вострая ўся: плечы сабе тырчаць, локці сабе, каленькі сабе... Зрэдку, як зараз, калі нікога ў хаце няма, я ўсё ж узіраюся ў люстэрка, чаго там! І бачу, што нічога не паправіш. Толькі што высалапіць, паказаць язык можна. Люстэрку. Ці свайму адбітку ў ім...

— На месца іконы ніхто ніколі люстэрка не чапляў, — ціха, як сама сабе, прамаўляе ў мяне за спіной бабуля, і, калі я азіраюся (злавілі!), строга ківае галавой і смешна, па-птушынаму, узмахвае рукой у бок люстэрка. — Робіце што хочаце!

— Ты несправядлівая, ба. Я б хацела запусціць у гэ-

тае люстра як не каменем, дык хоць каменьчыкам. Дзынь! — і пасыпаліся б зіхоткія асколкі.

— Бог з табой! І не ўздумай, Ляксандра, — хмурыцца яна. — Не ўздумай зрабіць гэткае ўзапраўду. Чаго добрага потым маці...

— Толькі і чуеш скрозь: маці, маці, маці! Маці сказала... Маці хацела... Маці загадала... — успыхвае ва мне калючы, злосны агеньчык: я нават не даслухала таго, што памкнулася сказаць бабуля. — А чаго яна камандуе ўсімі: бацькам, мной, табой. Ты ж у гэтай хаце гаспадыня, ба! Ты, а не яна.

— Што гэта за тон, Ляксандра? Як ты можаш асуджаць яе? За што? Яна — твая маці.

— Маці? А што гэта такое — маці? Чаму я павінна паважаць маці ў жанчыне, якая, нарадзіўшы мяне, мяне не любіць? Не любіць... і саромеецца мяне.

Бабуля маўчыць. Сумна, з балючым сумам у вачах узіраецца ў мой счырванелы ад узрушэння твар і маўчыць. А я, адступіўшы крыху ад яе пагляду, ужо не магу спыніцца.

— Так, так, не любіць. І саромеецца. І ты маўчыш, бабуля, бо не ўмееш схлусіць: ты адна ў гэтай хаце ніколі не хлусіла мне. А яна... Яны... Мне схлусілі ўжо тады, калі далі мне жыццё: нікому не патрэбна было маё нараджэнне. «Брыдкае качаня, якое ніколі не стане лебедзем...» — вось што яна сказала нядаўна пра мяне пузатаму Шатэрніку. Як жа! Яна — светлавалосая прыгажуня з зялёнымі, як у вядзьмаркі, вачамі, а дзеці — у бацьку: гарбаносыя і даўгатварыя! А навошта было нараджаць нас? У мяне спыталі, ці хацела я нарадзіцца? Можа, я не хацела?

Адчуваю, што мае словы нейкім чынам крыўдзяць бабулю — не ёй іх трэба выказваць. Але хто б яшчэ выслухаў мяне — маю злосць, маё злоснае бяссілле? Злосць даўно душыла мяне, не давала спаць па начах, не давала дыхаць, і, калі раптам зачапілася за яе, пацягнула нітачку слоў, мне здалося, што разам са словамі я магу выдраць з сябе і яе — вызваліцца, нарэшце.

— Вы ўсе думаеце, што я малая, што я нічога не бачу, нічога не разумею. Лепш бы і сапраўды, пазычыўшы ў сабакі вочы, не бачыць нічога і не разумець. Дык не! Кожны ў вочы, у вушы, у душу лезе, а адбівацца, хоць бы адгарадзіцца неяк — не смей! Глядзі! Слухай! Пры-

тварайся, што шчаслівая ўсім, што бачыш і чуеш! А ў мяне спыталі, ці шчаслівая я? Можа, я і на свет з'яўляцца не хацела...

Слоў раптам не стала. Схавацца ж, шмыгнуць за парог не дае бабулін позірк. Цяжкі, упершыню ледзь не да канца згаслы (толькі недзе на самым дне яго ледзь-ледзь свеціцца шэрань), позірк скоўвае мяне, прыкоўвае да падлогі — я не магу зварухнуцца, не магу зварухнуць губамі.

— Ты засмуціла мяне, Ляксандра. Глыбока засмуціла, анягож? Воляй бога ці воляй выпадку, як зараз пішуць, адзін нараджаецца сярод шчаслівых людзей у шчаслівы час, другі — сярод спакутаваных горам людзей у горкі для ўсёй Айчыны час. Не ўсякая маці сваім дзецям роўна. Але маці і Айчыну не выбіраюць. Той жа, хто адмаўляецца ад маці або ад Айчыны, адмаўляецца ад чалавека ў сабе. Гэта высокія словы, Ляксандра, і калі ты дарасцеш да іх, ты зразумееш, што не кагосьці, а сябе, душу сваю ты таптала зараз. Вось толькі не табе забалела, а мне, старой. Анягож?

— Але ж я...

— Сказала праўду? — яшчэ больш выпростваецца, вышэючы ростам, бабуля. — А ці ўся гэта праўда, ты ў сябе запыталася? Каб судзіць чалавека, трэба яго палюбіць. Анягож? Трэба любіць яго, ведаць усё жыццё яго, пачынаючы з маленства, а не толькі тое, што на вачах. А маленства ў тваёй маці, Ляксандра, было галоднае — яна і двух класаў пачатковай школы не скончыла. Спаткала маладою Стася, пакахала, за сваёй душой пацягнулася — вайна прыйшла, пажарамі ды крывёй усё затапіла. Жыццё не забрала — маладосць забрала... Слабая ж душа з-пад гнёту ўспамінаў і мар няспраўджаных вырвацца не можа.

— А мы, ба? А я? — разгубілася я ад яе слоў: ніколі гэтак сур'ёзна, па-даросламу, не гаварыла яна са мной.

— Жыць трэба. Чытаць трэба больш, Ляксандра. Вучыцца. Анягож? Краса да вянца, а жыццё да канца. Жыццё нас усіх рассудзіць.

Бабуля раптам адводзіць пагляд, якім утрымлівала мяне ля парога, і нечакана цяжка апускаецца на крэсла. Як абвальваецца на яго. Крэсла жаласна рыпіць, і ў хаце становіцца так ціха, што нават гадзіннік на сцяне сцінаецца, аціхае: я не чую яго гучнага, зацятага

пашчоўквання. Чую, як дзесьці на вуліцы, за тры двары ад нашага, пастукваюць калёсы, а ля ганка, невядома чаму здзіўляючыся, кудахча курыца. Чую, як за колькі крокаў ад мяне няроўна, натужна дыхае бабуліна сэрца. Дыхае цяжка, з сябе...

Пяшчота, сорам, боль, шкадаванне, незразумелая віна, удзячнасць — усё разам уздымаецца ва мне, абуджанае гэтай хвілінай, падштурхвае, кідае да бабулі. Грукаюць аб падлогу каленькі — і вось я ўжо ўткнулася тварам у яе спадніцу, вось ужо шапчу штосьці няўцямнае, просячы прабачэння, вось ужо плачу, баючыся, што бабуля заўважыць, што я плачу, і зразумее... Не словам яе веру, а ёй: жыццё — большае за чалавека, яно ўсіх нас рассудзіць. Магчыма, не лепшым чынам рассудзіць, але ў гэту хвіліну я чамусьці наперад пагаджаюся з яго судом, з яго правам судзіць нас. Мо таму і плачу, мо таму і баюся паказаць бабулі заплаканы твар, свае слёзы, што слёзы быццам і не дзіцячыя. Гарчэйшыя. Даўжэйшыя...

## VI

Чым бы я апраўдвала Яна, калі б мне давялося — калі б я захацела яго апраўдваць? Апаленым вайной маленствам? Але ж гэткім яно было для цэлага пакалення людзей. Нялёгкім жыццём? Але ж лёгкім ніхто сваё жыццё не назваў бы. Старой нянавісцю да чалавека, які, магчыма, па самой натуры сваёй мярзотнік? Але ж нянавісць, хоць бы і да мярзотніка, не апраўдвае злачынства. Хваробай?

Думкі перашкаджаюць засяродзіцца, засяродзіць увагу на папцы з дакументамі следства, што Фёдар Ануфрыевіч, следчы, моўчкі, не адвёўшы акружаных зморшчынкамі (яны відаць нават з-пад дужак акуляраў), выцвілых да самага донца вачэй, у якіх лёгка чыталася спачуванне, паклаў перада мной колькі хвілін таму. Хоць і не меў права гэтага рабіць. Як я не мела права прыехаць у раён, прыйсці да яго, ведаючы, што ён любіць мяне, што ён не адмовіць... А мо і не думкі перашкаджаюць, а гэта адчуванне сваёй няправаты, сваёй здрады? Бо што ж гэта, калі не здрада — вось так раптам, з-за глыбока свайго асабістага, парушыць эты-

ку адносін, парушыць адно з непарушных правіл у часе следства?

Мо адкласці, не чытаць пратаколы? Усё ж і так ясна. Цяжкія цялесныя пашкоджанні, якія прывядуць да смерці... Сто шосты артыкул... І потым — гэта спачуванне старога, усімі паважанага Ануфрыевіча... Я ж не хачу нічыйго спачування! Ні-чый-го. Мінулае дастала — дагнала! — мяне, і адзінае, што я магу: паслабіць удар. Не адвесці, а толькі крыху паслабіць. Каб усё-ткі ўстаяць. Выстаяць.

Позірк слізгануў па разлінаваным аркушы: «Сведчанні Ганны Шэлег». Шэлег... Шэлег... А! Гэта ж, пэўна, старая Шэлежыха, што ўсё жыццё прабегала за сваім мужам, раўніва высочваючы яго яўных і ўяўных паклонніц. Часцей уяўных... Чаго яна раптам патрапіла ў сведкі? Няўжо ўсё яшчэ працуе буфетчыцай? За маёй жа памяццю — ледзь пралазіла за сваю стойку...

Схіляюся над сталом, разгортваю пратакол. Прапускаю добрую палавіну напісанага — усё, што тычыцца высвятлення асобы сведкі: асоба вядомая, нічога новага і важнага ў анкетным апытанні не знойдзецца. Вось!

«— Радзінскага даўнавата ўжо не было відно. Я нават падумала, што яго зноў у бальніцу сілком уклалі: тоўкся ж раней паблізу дзень у дзень... Аж не! З'яўляецца. Не выпімшы, не. Не скажу. Учарнелы нейкі, але цвярозы. Налі, кажа, Адамаўна, — гэта я, значыць, — сто грам. Я і ўгледзела, што ён учарнелы нейкі, што пад вачамі ў яго ацёкі, як мяшкі, быццам яму чэрці з вечара пелі, бо зірнула больш уважліва: апошнім жа часам «пладоваягаднага» хапала, а тут — сто грам! Па мне, таварыш следавацель, зусім бы гэтай гары горкай не было, аніякай, — але ж работа... Разбагацеў, пытаюся, ці як, што душа іншага папрасіла? Разбагацеў, кажа. А сам і не зірнуў на мяне.

— Так і сказаў: разбагацеў? А ў чым гэта праявілася? Грошы ў яго вялікія былі?

— Да не! Адкуль у яго вялікія грошы? Чырвонцам разжывецца — вось і грошы. У аднэй і тэй жа світцы колькі гадоў хадзіў... Адумысла сказаў, бо расплаціцца меў чым.

— І расплаціўся?

— Спачатку гэты другі, з азызлым тварам, — Шатэрнік — падкруціўся. Зыбаўся ўжо, як на вяроўках, а

туды ж! «Мо б і мне на твае грошы палегчала, Ян?» Гэта ён так — Радзінскаму. Той, праўда, змоўчаў. Моўчкі кульнуў свае сто грам. А стары ўсё зыбаецца ля яго.

— Шатэрнік?

— А то хто ж! Стары, сапсеў увесь — кіслым ад яго верне, а туды ж! — скрозь у бутэльцы нос мачыў. Бывала, і канючыў перад кім, не саромеўся. Вось і тады. Учуў гаворку — і захадзіў вакруг, зазыбаўся. З аднаго боку зазірне, з другога боку пад руку таму падлезе, а ў самога не тое што рукі трасуцца... Радзінскі на яго перш не зважаў. Вазьмі грошы, Адамаўна, кажа, і давай сюды ўсю пляшку гарэлкі. І яшчэ «чарніла» — гэтаму... І галавой павёў.

— І вы падалі ўсё, што ён прасіў? Так?

— А як жа! Грошы ж былі заплочаны! Адкуль мне ведаць, што паміж імі бойка выйдзе і бутэлька на іншае спатрэбіцца? Я буфетчыца. Я грошы бяру, а за грошы...

— Як усё здарылася?

— А хто ж іх ведае! Выпілі. Гарэлку абодва пілі, віно і не адкаркавалі яшчэ. А потым — як за чэрці яго ўзялі — малады нечага захадзіўся.

— Радзінскі?

— Але. Ён. Загневаўся нечага і ўсё лупіў па стале кулаком і крычаў.

— Што крычаў?

— Больш нецэнзурнае, таварыш следавацель. У нас, канечне, гэта, як і ўсюды, забаронена. Я так і сказала. Усе вам пацвердзяць, што сказала: дома, халера на вас, мацюкайцеся. Так і сказала. Ды што я ім — указ?

— У сталоўцы ж былі і іншыя наведвальнікі?

— Былі. Ды хто гэта палезе ў п'яную сварку? Ці мала хто калі лаяўся! Натрапіць чорт на д'ябла, зальюць вочы і... Мо каб ведалі, што крывёй скончыцца, дык і зрабілі што якое гуртом. Але ж не ведалі, аніяк не думалі.

— А з-за чаго яны пасварыліся, Ганна Адамаўна? Чаго яны не падзялілі?

— Хіба што мацюкоў. Я дужа не ўслухвалася: звыклыя да ўсяго вушы, а ўсё ж спакайней не слухаць. Дзе ж гэта вытрымаеш усіх слухаць! А тут яшчэ — малады са старым... Са сваяком, лічы.

— Са сваяком?

— Дык гэта ж усе ў пасёлку ведаюць: Волька, матка Янава, з Шатэрнікам гуляла. Да самай смерці, царства ёй нябеснае, пад бок таму клалася. Году пасля мужавай смерці — харошы быў чалавек! — не счакала, ні дзяцей, ні свякрухі не пасаромелася — дзіця ад хахеля панесла. І нарадзіла! Суду людскога не збаялася. Дык і тое, як няма божага, дык людскога суду не страшна... Вось і сваякі!»

Чытаць непрыемна. Агідна. Быццам супраць сябе сведчанне чытаю, і словы бруднымі масляністымі плямінамі прыстаюць да рук, да шчок... Увесь бруд, ужо прышэрхлы, зляжалы, скаламуціў брацік! Колькі выбіралася з гэтай гразі, колькі чысцілася, юнацтва, жыцця свайго не шкадуючы, — на табе! Зноў зачэрпнуў з самага дна і па твары маім размазаў!

«Сведчанні Міхаіла Кручка». Кручка? Не ведаю такога. Не прыгадваю. З прышлых, напэўна. У звестках пра яго: інжынер... з трыццатага года... з Магілёўшчыны... камандзіраваны на завод пластмасавых вырабаў...

«— Вы прысутнічалі пры тым, як за адным с суседніх сталоў усчалася сварка?

— Так. На жаль, прысутнічаў.

— Чым выклікана ваша шкадаванне?

— Не люблю, калі чалавек, хто б ён ні быў, становіцца быдлам і кідаецца на другога, каб абламаць адрослыя раптам рогі.

— Можа, вы растлумачыце, пра якія рогі гаворка?

— Гэта вобразна сказана.

— А калі не вобразна? З чаго ўсчалася сварка?

— З чаго ўсчалася, не чуў. А калі маладзейшы, з тварам былога інтэлігента, перайшоў на крык, шчодра перасыпаны салёнымі словамі, гаворка ішла пра стары рахунак.

— Грошы?

— Не. Здаецца, штосьці ў плане подласці.

— Канкрэтней, калі можна.

— Штосьці пра сталінскую суку, прабачце, і пра пераведзеную на гнуснасці паперу... І яшчэ — пра круглямордага Іуду, па якім усе гэтыя гады плакала вяроўка. Вось і ўсё.

— А яго... субяседнік — што ж? Нічым не адказваў?

— Мармытаў спачатку: «Паслухай, Ян! Паслухай, Ян!», а потым толькі брыдка лаяўся ў адказ.

— Вы не спрабавалі спыніць сварку?

— Я?! Ну, што вы! З чаго б раптам? У мяне дома сям'я...»

— Шурачка, ты занадта блізка да душы ўсё прымаеш. Я разумею... Але ж на табе твару няма, без перабольшання, і я ўжо шкадую, што дазволіў зараз... Так і да бяды недалёка, — абняў мяне за плечы, падышоўшы зусім нячутна, Фёдар Ануфрыевіч.

— Не магу чытаць — і чытаю, — міжволі прыкрываю я далонню лісты пратакола. — Лепш бы не варушыць усё — трымацца ўбаку, збоку. Сама сябе не разумею, Ануфрыевіч! Занадта глыбока паласнула мяне тое, што здарылася, — нутро выварочвае. Запіхваю, запіхваю былое назад, а яно зноў вылазіць.

— Гэта нервы, Шурачка.

— Гэта несправядлівасць, Ануфрыевіч. Несуразная. Жахлівая ненавіта сваёй несуразнасцю несправядлівасць: мінулае, здавалася б, даўно адпрэчанае, пераможнае ўсім маім жыццём, усёй маёй работай, усімі маімі намаганнямі, усё ж дастала — дагнала! — мяне, і я нічога не магу зрабіць. Нічога!

— Ты пра брата?

— Я пра сябе.

— Ну, ну, ну! — ціха пастуквае ён мяне па плячы, шукае яшчэ нейкія словы і, не знаходзячы, зноў адыходзіць да акна, папраўляючы акуляры.

Я застаюся з пратаколамі. Не магу чытаць далей — не хачу! — і ўсё ж машынальна перагортваю колькі старонак: мо трапіцца знаёмае прозвішча? Штыхаў... Медзвядзюк... Чарнуш... Чар-нуш?! Але ж ён нічога не казаў... Я ж толькі сёння з ім размаўляла! — перад тым як паехаць сюды, у раён, дзе столькі гадоў калісьці прапрацавала ў судзе. І Юзік — праходзіць як сведка?!

Абмінаю першую старонку, шукаю пытанне, якое падвядзе да галоўнага. Вось!

«— Вы знаходзіліся ў зале сталоўкі ў той час, калі ўсчалася бойка?

— Не. Я зайшоў да Адамаўны, у буфет, прапусціць кілішак. Пасля лазні. Як звычайна заходжу па суботах.

— Але ж буфет, па сутнасці, не аддзелены ад залы?

— Па сутнасці, не аддзелены.

— Значыць, вы не маглі не бачыць, што адбывалася ў той момант у зале, ля аднаго са столікаў?

— Позна ўжо было.

— Што — позна?

— Позна было як-небудзь перашкодзіць таму, што адбылося. Гэта ж адно імгненне нейкае.

— Раскажыце, што вы бачылі ў тое кароткае імгненне.

— Па суботах там часта бывае тлумна. Неяк і не зважаеш на шум зазвычай. I гэты раз я не ўзіраўся асабліва (пасля ж не адчапіцца ад каторага!), а падышоў напрамкі да стойкі. Да Адамаўны. Яна ўжо налівацъ стала: норму маю ведае... I тут — грукнула аб падлогу перакінутае крэсла, заглушаючы крык, воклiч: «Ах, ты, паскуда!»

— Хто крычаў, пазналі?

— Радзінскі крычаў. Я як адчуў нядобрае — рэзка павярнуўся, гатовы падысці, падбегчы, калі што якое... Але позна ўжо было.

— Што адбылося?

— Глуха, страшна закрычаўшы, Ян у той жа момант, адначасова, зрабіў і непапраўны рух: перш чым Шатэрнік падхапіўся з крэсла, ён жахнуў яго па галаве паўлітэркай. Той як сядзеў, скурчыўшыся, відаць, так скурчаны і абваліўся.

— А што Радзінскі?

— Радзінскі? Ведаеце, у той момант я не пазіраў на Радзінскага. Здранцвеўшы, не мог адарваць вачэй ад скурчанага старога, які ляжаў на падлозе, аплыўшы крывёй, ад лужынкі віна ці крыві ўжо... Ачомаўся — Адамаўна званіла ў бальніцу і ўчастковаму.

— Што было далей?

— Далей Адамаўна, пэўна, не дазваніўшыся, распарадзілася сама. Дала Мядзведзюку, шафёру з пластмасавага, — ён яшчэ нейкім далёкім сваяком ёй даводзіцца, — чысты ручнік перавязаць старога і папрасіла завезці таго ў бальніцу, тым больш што машына стаяла пад вокнамі.

— А вы ніяк не ўдзельнічалі ў тым, што адбывалася?

— Якое там удзельнічаў! Перш ногі як звялі, а потым мітусіўся, як усе астатнія. Дзверы прытрымаў, калі



Шатэрніка выносілі. Ужо і выпіць расхацелася! Думаў пайсці дадому, але згадаў пра Яна — на яго быццам забыліся ўсе ў тыя мінуты. Павярнуўся: той сядзіць за тым жа столікам, дзе яны ўдвох сядзелі перад гэтым, падпёр рукамі галаву і сядзіць, утаропіўшыся ў сцяну насупраць, — позірк пусты, халодны. Як мёртвы.

— І вы падышлі да Радзінскага?

— Не, не падышоў. Сам не ведаю, чаму не падышоў. Стаяў ля стойкі і пазіраў на яго — чакаў, каб ён загаварыў, устаў ці хоць бы зварухнуўся. Але Ян так нерухома і праседзеў, пакуль не прыйшоў участковы...»

— Ён жа не пераносіў крыві, — ціха прамаўляю, быццам адказваючы Юзіку, і зноў адчуваю плечуком руку Фёдара Ануфрыевіча.

— Ты пра брата, Шурачка?

— Пра Яна...

## VII

Спектакль вось-вось пачнецца. Наросхліст адчыненыя вароты даўно перацягнуты вяроўкай і завешаны дзвюма пасцілкамі. За імі, як за заслонай, расстаўлены стол і тры табурэткі. Ля адной з табурэтак — трызубец (звычайныя вілы, перавітыя папяровай стужкай). Ян з хлопцамі завяршаюць падрыхтоўку, я... Мяне выгналі б, напэўна, бо Ян не прымае мяне ў спектакль, але заступіўся Эдзік Шумілін, яго сябра, і вось я то выглядваю праз шчыліну на вуліцу, дзе проста на траве расселіся ўсе, хто прыйшоў паглядзець, то зноў кідаюся да Яна або да Эдзіка:

— Ну, няўжо нельга знайсці маленькай, самай малюпасенькай ролі? А, Ян?

— У нас усяго чатыры ролі. І дзяўчынак нам не трэба. Будзеш адкрываць заслону.

— Але у жыцці гэтак не бывае, каб без дзяўчынак! — спрабую знайсці я хоць адзін доказ.

— У нас жа не жыццё, а суд, Лёкса. Суд над гісторыяй, — паблажліва тлумачыць Эдзік, прыладжваючы на свой непаслухмяны віхор зубчастую карону з бліскучай фальгі.

— А ў судзе... а ў судзе патрэбна ісціна! — чапляюся я за апошняе імгненне.

— Ісціна?

— Ісціна мне знайшлася! — зіркае спадылба Ян, і я

міжволі абцягваю сукенку, каб хоць як прыкрыць пазбіваныя каленькі.

— Ісціна, кажаш? — спыняе яго Эдзік. — Зараз падумаем!

— Час пачынаць, — бурчыць брат.

— Чакай, Ян. Штосьці тут ёсць! Помніш, у кнізе пра старажытную Грэцыю... Бяжы па бабчыну хустку, бяры чым большую! — без усякага пераходу паварочваецца да мяне Эдзік.

Мяне як ветрам здзьмула. За паўхвіліны абярнулася: каб хоць не перадумалі! Як'я буду іграць ісціну, я не думаю. Неяк сыграю. Абы іграць. І вось ужо Эдзік перакідае мне цераз плячо прынесеную хустку, завязвае яе на спіне і, падумаўшы трохі, адломвае невялікую галінку вішні і ўтыркае яе мне ў валасы.

— Залазь на табурэтку, — камандуе. — Ды на край накідкі не наступі, а то, чаго добрага, грымнеш уніз — слёз потым усе разам не пазбіраем.

— Што я, маленькая?

— Ну, ну!

— Давай лезь! — неахвотна падае руку Ян, незадаволены, пэўна, тым, што не ён гэта ўсё прыдумаў пра ісціну. — І не ўздумай рот раскрыць! Стой, слухай і пасля майго прысуду павольна падымай над галавой правую руку і гэтак жа павольна апускай. Зразумела?

— Так, Эдзік? — знарок перапытваю я ў яго сябра.

— Так, так. Стражэй трымайся, вось і ўсё.

Папраўляю хустку, наструньваюся. Ян бярэ ў рукі трызубец. Яша Чмыр ссоўвае ў бакі дзве пасцілкі, і тут жа малыя (яны бліжэй да нас) пачынаюць пляскаць у ладкі. Я ўжо хачу ўзяцца за край накідкі і грацыёзна прысесці — спыняе злосны Янаў шэпт:

— Не ўсміхайся! Ты ж ісціна...

Чаму ісціна не можа ўсміхнуцца, я не ведаю — не запытаешся ж зараз! — але паслухмяна хаваю ўсмешку і застываю на сваёй табурэтцы, вышэй за ўсіх.

— Гады складваюцца ў дзесяцігоддзі, і іх паглынае гісторыя, — пачынае Ян, ссоўваючы на нос зробленыя з дроту акуляры і папраўляючы надзетую брылём назад шапку. Мінаюць дзесяцігоддзі, і летапісец пазначае на календары новае стагоддзе.

— А летапісец — гэта хто? — пытае хтосьці з гледачоў.

— Летапісец — суддзя, і ён судзіць гісторыю. Тую, што вы яшчэ будзеце вывучаць у старэйшых класах, — ніколечкі не губляецца Ян і працягвае: — Гэткі суддзя — перад вамі, і судзіць мы сёння будзем цара, недабітага буржуя і фрыца.

Я падымаю правую руку.

— Рана... — сіпіць, апускаючы галаву, каб незаўважна, Ян (я хуценька хаваю руку за спіну) і гучна аб'яўляе: — Цар-крывасмок!

Яша выпіхвае да стала Эдзіка ў кароне: той недаўменна круціць галавой, нервова скубе пальцамі край кашулі, потым рашуча падыходзіць да заслоны, сцягвае адну пасцілку, акрывае ёй, як світкай, плечы і адразу становіцца спакойным, упэўненым, і адразу ганарліва ўскідвае галаву.

— Ух, ты! — рэагуе публіка.

А Эдзік папраўляе сваю світку, садзіцца на краёк табурэткі і паварочваецца да Яна, на яго голас:

— Адказвайце на пытанні прама, без хітрыкаў. Ваша імя, імя па бацьку і прозвішча?

— Цар. Хіба табе не відаць, мілейшы? Я — цар! — каўзануўся на табурэтцы Эдзік.

— Сацыяльнае паходжанне?

— Што?! Якое паходжанне? Царскае, кручкатвор. Я ж сказаў: я — цар.

— Ваш занятак?

— Не разумею.

— Бач, не разумее! Тады я скажу. Спрадвечны занятак — піць людскую кроў.

— Фэ! Фэ, мілейшы! Цару піць кроў?

— І не толькі. Гнаіць усіх чэсных людзей у турмах, раз. Рабаваць тых, хто пот пралівае ў полі, каля станка, два. Хадзіць у золаце ў той час, калі тысячы людзей пухнуць з голаду, тры. Загадваць страляць у кожнага, хто хоча справядлівасці, чатыры. Яшчэ пералічваць ці хопіць і гэтага?

Эдзік усё вышэй нацягвае пасцілку, вось ужо і галавы з-пад яе не відаць.

— Шаноўная публіка, чаго заслугоўвае гэты цар-крывасмок? — звяртаецца Ян да ўсіх.

— Смерці! — крычу я, ускідваючы ўгору руку.

— Смерць цару! — падхопліваюць усе з вуліцы, і Эдзік-цар, з галавой захутаны ў пасцілку, павольна валіцца на зямлю, перакідваючы табурэтку.

Яго праводзяць воплескі. На мяне ніхто не зважае, і я пачынаю ёрзаць на сваім пастаменце: што гэта за роля, калі трэба ўвесь час маўчаць? Ніхто, напэўна, і не ведае нават, што я — Ісціна. Стаю як ёлупень...

— Стой, калі напрасілася, — цэдзіць праз зубы Ян у мой бок, а сам тройчы стукае віламі — трызубцам з пяццю зубцамі — аб зямлю. — Народ скінуў цара. Ура народу!

— Ура-а! — радасна закрычала ўся грамада.

— Ура... — запішчаў, вылазячы з-за варот, Віця Воўчык, і так круглы змалку, а пасля таго, як яму Эдзік падушкі на жывот падвязаў, чыста пузыр на дзвюх кароткіх нагах.

На міг усталявалася цішыня, і тут жа грымнуў рогат, такі дружны, такі гучны, што Воўчык памкнуўся быў назад за вароты, але Ян трызубцам загароджвае яму шлях.

— Ку-ды?! Адказвайце грамадзе: хто такі? Як завуць?

— Бур... буржуй я... — лапоча Воўчык, забыўшыся на вывучаныя словы.

— Буржуй — гэта мянушка, — апускае Ян трызубец. — А імя і імя па бацьку як?

— Цыліндр Цыліндравіч, — падказваю я шэптам.

— Цыліндр Цыліндравіч, — паўтарае за мной Воўчык, а сам учапіўся абедзвюма рукамі ў падушку, быццам яе хто выдзірае ў яго.

— А дзе ж цыліндр згубіў. Уцякаючы ад Чырвонай Арміі?

— Цылі-ндр?

Воўчык на міг забывае пра падушку на жываце і ліхаманкава абмацвае голую, падстрыжаную пад машынку галаву. Рогат ужо не змаўкае. Рагоча, залягаецца ўся вуліца. І я рагачу, забыўшыся на сваю ролю, забыўшыся, што стаю на хісткай табурэтцы.

— Адправіць буржуя ўслед за яго цыліндрам?

— Адправіць!

— Туды яму і дарога!

— Бач, раз'еўся!

Воўчык бокам, бокам, валюхаючыся, як гусь, праціскаецца назад. Ян падпіхвае яго трызубцам.

— Туды яму і дарога! — падхопліваю я вокліч, падскокваю і раптоўна губляю апору.

Калі я, хапаючы рукамі паветра, грымнула з табу-

рэткі пад ногі Воўчыку-буржую і той, пераляцеўшы цераз мяне, распроставаецца жыватом-падушкай угору, становіцца ясна, што заслону трэба закрываць. Рагоча нават Ян. Утыркнуў свой пяцізубы трызубец у зямлю і рагоча, размахваючы драцянымі акулярамі.

— Артыстка! Ну і артыстка!

— Я не артыстка! Я Ісціна! — крычу, каб не заплакаць, хоць ужо ўскочыла на ногі і спрабую сарваць з сябе назграбна завязаную хустку. — А так, як ты, не судзяць, не судзяць! Ты не судзіш, а смяешся з усіх. Ты сам артыст!

Крык мой тоне ў рогаце і ў радасным гуле малечы з усіх прылеглых да Савецкай вуліц і завулкаў.

— Ура-а! — коцяцца хваля за хваляй, і я ніяк не магу зразумець, з чаго б гэта столькі шуму выклікаў мой канфуз...

Шум не аціхае. Нават расце. Адарваўшыся ад сваіх думак, у першы момант не магу ўцяміць, як я сюды трапіла: кафэ перапоўнена, агучаныя магутнымі мікрафонамі, брынчаць гітары самадзейнага ВІА, шаснаццаці-семнаццацігадовыя хлопцы і дзяўчаткі таўкуцца на свабодным ад сталоў пятачку.

Зіркаю на гадзіннік: штосьці каля дзевяці... У гэтакую пару я звычайна сюды не заходжу. А сёння... Дзень як пачаўся недарэчна — з размовы з сябрам маленства, — так недарэчна і заканчваецца. Вось і тлумачэнне. З гадзіну як прыехала, зайшла паесці. Недаедзены біфштэкс усё яшчэ ляжыць на талерцы... Біфштэкс як біфштэкс. Толькі есці ўжо не хочацца. Адно што мушу дачакацца афіцыянткі.

Чакаю. Абводжу позіркам невялікую залу: сталы заастаўлены талеркамі і, яшчэ ў большай ступені, бутэлькамі. І не толькі бяскрыўднымі бутэлькамі з-пад піва. Шампанскае, віно, каньяк... Колькі вось гэткіх — падобных! — маладзят, разбэшчаных дабрабытам і бацькоўскай слепатой, бяздумных, бязвольных ва ўсім, што тычыцца іх будучыні, іх будучай працы, прайшло за гэтыя гады, асабліва за апошнія гады, цераз залу суда, ужо і не палічыць. Ужо і не прыгадаць. Усе на адзін твар — спешчаныя лянотай і добрымі харчамі, з першымі слядамі распусты і злоўжывання алкаголю, усе — чужыя сваім бацькам, часцей за ўсё сціплым, працавітым людзям.

Гукнуць бы афіцыянтку! Не, у гэткім тлуме, пэўна,

не дагукацца. Пачакаю. Мо не закладзе вушы, а пазіраць — можна і не пазіраць... Можна і не пазіраць... Перачакаць колькі гэтых імгненняў, не зважаючы на іх. Мо ўдасца не зважаць?— сёння ж усё не так, як зазвычай, як заўсёды. Хатні тэатр згадала, суд над гісторыяй, Яна — у ролі суддзі... Божа мой, калі тое было? Ды і ці было наогул? Не могуць жа самі па сабе знікнуць любоў і разуменне, не могуць жа самі па сабе абарвацца повязі роднасці, пакінуўшы ў сэрцы толькі няўцямны боль!

Род Радзінскіх. Дом Радзінскіх! Усё трымалася, пакуль яна трывала, на бабулі. Усё. А лічылася ж, што Радзінскія — гэта мы. Бацька, самы паважаны ў пасёлку чалавек — суддзя, потым — былы суддзя. Маці, пасля яго перамяшчэння змушаная пайсці працаваць білецёрам у невялікім дашчаным кінатэатры, што побач з грачыным скверам. Ян, за нейкі ўчынак, які ад мяне з Лёнай зацята ўтойвалі, выгнаны ў пятнаццаць гадоў з дому, кудысьці на Украіну, у шахцёрскі гарадок. Я. І Лёна.

Малюнак, канечне, вельмі невыразны. Прыблізны. Каб скласці больш поўны партрэт сям'і, трэба было б не толькі пра бабулю расказаць, а і прыгадаць незнаёмага мне дзеда па матчынай лініі, што, як і ўсе з яго роду, быў селянінам, меў беднаватую (па ўсіх мерках) гаспадарку і таму не трапіў пад раскулачванне — трапіў на вочы п'янаму фашыстоўцу ў час акупацыі і не падняўся са скрываўленай лавы, да якой, па загаду таго, дзеда прывязалі і дзягамі з шырокімі бляхамі і выбітымі на бляхах словамі «З намі Бог» вучылі пакоры... Трэба было б згадаць і другога — па бацькавай лініі — дзеда, чые продкі на працягу цэлага стагоддзя імкнуліся ўліцца ў шляхту, пасылалі сыноў у гімназію і потым жанілі іх на непрыгожых дзеўках-пярэстарках, дочках шляхцічаў, — калі б я магла што-кольвечы згадаць пра таго, каго не помніў нават бацька: дзед скруціўся з нейкай заезджай цыганкай і згінуў, не дачакаўшыся сынавага нараджэння...

Ды гэта ўсё згадваецца з чужых слоў. Я пра гэта нічога не ведаю. Чула і то не помню ўжо ад каго. Напэўна, ад Яна. Даўно... Ніводнага разу дасюль і не згадвала. Анкеты гэтых звестак не патрабавалі, а тое, якой галінкай на нашым генеалагічным дрэве пазначаны мой лёс, мяне не цікавіла. Не зацікавіла. Гэтае старое, зам-

шэлае дрэва расло ў нейкім іншым, не маім, часе: мой час належыць да тых, у якія пачыналася выпілоўка не нейкіх там асобных дрэў — цэлых бароў на дзялянках мінуўшчыны.

Мой час... Вось і гэта кафэ, і гэту гучную, пошлую музыку, і гэтыя юныя, ужо крыху асалавелыя ад выпітага віна твары не адпрэчыць ад яго, ад майго часу. І што я — нават я, столькі гадоў аддаўшы ахове законнасці! — магу запярэчыць? Устань я зараз з-за стала, скажы на ўсю залу, што гэта — кепская, пошлая музыка, што ў іх узросце трэба ставіць рэкорды, улюбляцца, пісаць вершы, іграць у пастаўленых па сваіх уласных сцэнарыях спектаклях, што віно можа прывесці да згубы ці да злачынства, мяне папросту падымуць на смех: старая, маўляў, песня! Старая. Новай, на жаль, няма. Новую павінны скласці яны. Ці складуць?

Падымаю позірк. Узіраюся ў шматтвары, безаблічны натоўп. Хвіліну. Другую. Пакуль усё не пачынае нагадваць мігатлівы россып каляровых шкельцаў у дзіцячым калейдаскопе: сіняе, зялёнае, чырвонае! Сіняе, зялёнае...

— Вы хацелі разлічыцца?

## VIII

Дзень ніяк не хоча адпускаць мяне. Здаецца, і дагарэў жа ўжо даўно — нават вокны ў доме цераз вуліцу ні на адным з яго дзевяці паверхаў не свецяцца, а вось жа адцягвае і адцягвае назад стрэлкі гадзінніка. Як ні зірну — усё дванаццатая гадзіна... Ці мо што занадта часта зіркаю ў той бок?

Трэба слаць пасцель. Час! Вадзім так і не зайшоў. Не знайшоў, пэўна, вольнай хвіліны. Ці раней заходзіў, калі мяне не было. Гэта і да лепшага. А то і яму давялося б штосьці тлумачыць. Што тут тлумачыць? Была Аляксандра Станіславаўна Радзінская і няма. Ёсць сястра Яна Радзінскага, які знаходзіцца пад следствам і будзе асуджаны за забойства... О ўжо гэты недарэка лёс! Не змог усё-ткі адбіцца ад мінулага. Сам не змог і мне не даў.

Шкада і Яна. Хоць не. Па-сапраўднаму шкада толькі сябе: так настойліва ісці — дайсці! — каб усё так недарэчна страціць... З-за яго нястрыманасці. З-за яго

п'янай нянавісці. І ніхто, і ніпто нічога не зменіць і не адменіць. І менш, чым хто б там ні было, я сама.

І справа не ў паламанай кар'еры. Не, не! Вывучала законы развіцця грамадства, хацела і хачу не толькі ведаць, не толькі апраўдаць прызначэнне чалавека на зямлі, а і сцвердзіць яго — хоць бы сваім жыццём! — як высокае прызначэнне. Ці ж гэта адно імкненне да кар'еры, да больш высокай пасады? Вышэйшая пасада адкрывае большую прастору для дзейнасці, для пошуку. Гэта проста маленькая перавага. Шукала ж я ўсе гэтыя гады прычыну існавання ў свеце зла. Шукала і спрабавала змагацца з ім. І змагалася... Праўда, так і не зразумела, чаму чалавек вечна пакутуе ад самога сябе, так і не вытлумачыла да канца, чым ён можа быць шчаслівым, чаму нават мінутная асалода абарочваецца гадамі болю і шкадавання. Дагэтуль спрабую вытлумачыць...

Звоняць? Гэта Вадзім! Мо не падыходзіць да дзвярэй? Позна ўжо. Занадта позна ўжо для візіту ўрача. Мо папросту не адчыняць? Не адчыніць?

А сама ўжо — каля дзвярэй. Рука, апярэджваючы позірк, намацвае замок. Ён шчоўкае — адступаю на крок, прачыняю дзверы: Вадзім. У халаце. Яшчэ б! Адпусціла б яго Соня, інакш гледзячы! Магла б — хвастом да яго прышпілілася і не тое што жанок, пагляды б іх адмятала.

— Прабач, я прыходзіў днём... Можна?

— Перад людзьмі ў белых халатах дзвярэй не зачыняюць, — недаверліва ўслухваюся я ў раптоўна збуджаны згадкай пра Соню душэўны пратэст, бездапаможны пратэст супраць гэтай сустрэчы, супраць сваёй няўцямнай радасці.

— Я дзяжуру. Да шасці гадзін раніцы.

— І вырашыў падкараціць ноч са сваёй пацыенткай? Гэтак трэба разумець позні візіт, Вадзім Пятровіч? — зачыняю дзверы, не пазіраючы на госця.

— Чаму? Не... Навошта ты так? Я думаў...

— Думаў — што? Што я сяджу і чакаю? Што даволі нейкай выпадковай прычыны: укол спатрэбіўся! — і ўсё пойдзе адваротным ходам, усё і найперш — гады? — пратэстуюць словы.

Адчуваю: штосьці я не тое кажу, не так. Бо раптам абрываецца, правальваецца кудысьці ў немату, у цішыню сэрца. Словы яшчэ не адгучалі, а сэрца аціхла. Як абмерла. Не чую ні яго штуршкоў, ні яго ўздыхаў. Зусім

як тады (калі гэта было? — мільгае і адступаецца ўстрывожаная думка), калі я ўпершыню назвала Вадзіма Вадзімам Пятровічам і развіталася, каб пры сустрэчы, з таго часу толькі выпадковай, трымацца з ім, як з усімі іншымі, з усімі чужымі.

— Думаў, што патрэбна мая дапамога. Відаць, памыліўся.

Да Звонава, быццам і ён згадаў колішняе расстанне, вярнулася ўласцівая яму ўпэўненасць: казаў — як цвікі заганяў. Рашуча. Без боязі зачапіць мяне якім словам. І мне чамусьці адразу стала лягчэй. Чаго, запытацца, ускінулася? Сама ж дазволіла прыйсці. Сама ж паабяцала: буду рада... Вось ён, той міг, калі трэба радавацца. Радуйся! — злосна паддражніваю сябе ў думках. Сябе — чаго саромецца? Хацела ж, каб Вадзім зайшоў. Чакала, што зойдзе. Чаго, запытацца, ускінулася? Прыйшоў і пойдзе. Нават паспрабуй я ўтрымаць — не ўтрымаю. Нават паспрабуй, пажадай я...

— Відаць, я памыліўся.

— Не памыліўся, Вадзім Пятровіч, — жэстам запрашаю яго прысесці і, запаліўшы верхняе святло, апускаюся ў крэсла насупраць. — Толькі ты не зможаш мне дапамагчы. І ты не зможаш. На жаль.

— Я ўрач. Добры ўрач, на думку маіх калег, — молада, на ўсе зубы ўсміхаецца ён. — І на маю ўласную думку.

— Ты ўрач, а не гасподзь бог.

— Што здарылася, Лёкса? Сэрца ў цябе патрабуе лячэння, але ж небяспекі няма. Трэба, канечне, легчы ў клініку, абследавацца...

— Чаю, Вадзім Пятровіч? — не вельмі гасцінна перапыняю я яго дзяжурныя сумненні.

— Ты не адказала на пытанне.

— Прасцей — і прыемней! — абысціся без пытанняў. Ты не думаеш? Пытанне — адказ, пытанне — адказ... Зусім як у судзе. Гэта сумна. Гэта не гаворка. А мы даўно ўжо не гаманілі, проста не гаманілі.

— Гэта папрок сабе? Ці мне?

— Жыццю.

— Э, не! Ты папросту хаваешся за жыццё. Жыццё ідзе, як ішло. Як стагоддзі, як тысячагоддзі таму ішло. Абвінаваціць яго — самую прыроду чалавека абвінаваціць. Лагічна? Ды і якія з нас абвінаваўцы? Вось ты... Праўда, што тычыцца цябе, дык ты зараз — самое

ўвасабленне суддзі, — пільна ўзіраючыся ў мяне, зноў шырока ўсміхаецца Звонаў. — Гэткая змрочна-ўрачыстая ўся!

Я не ўсміхаюся на яго словы, на яго ўсмешку, якая так не стасуецца з пільным, сур'ёзным яго позіркам, і гэта Вадзіма ніколькі не бянтэжыць. Бы ён і не чакаў, што я ўсміхнуся. Бы сказаў гэта, толькі каб перайсці да наступнага:

— Госпадзь бог жа, якога ты памянула, нарадзіўся і жыў сярод людзей. І калі была ў яго прафесія, то гэта была прафесія не суддзі, перапрашаю, а ўрача. Угу! І як ні павярні, усё атрымаецца, што я ўсё-ткі самы неабходны зараз для цябе чалавек. Не бог, а ўсё-ткі... Ты не згодна?

— Згодна, — спрабую я сагнаць хмурынку з твару. — Хто-хто, а ты, Вадзім Пятровіч, да ролі бога паставіўся б, як ніхто, сур'ёзна: спярша вылечыў бы, а потым перад страшным судом паставіў. Нягледзячы што не ты, а я — суддзя. Была...

Спатыкаюся на слове. Яно, нечакана вымаўленае ўголас, адразу як захрасла ў горле: апякаючы горла, пякучай кропляй коціцца назад — і вось ужо гарыць, палымнее ўва мне, б'ецца: была! была! была! Зразумела гэта даўно — адразу, а ўсвядоміла толькі зараз?

— Страшны суд, як і любы суд, — не што іншае, як суд сумнення, не табе, Лёкса, кажучы. Мы, кожны...

— Кожны?

— Кожны! — самі сябе гонім, валачом на гэты суд. Мы, кожны, самі насыпаем сваю галгофу, і тым — людзі. І тым — вечныя.

— «Зорнае неба над намі і маральны закон унутры нас...»

— Філосафы — гэта разумныя людзі. І кожны разумны чалавек, так ці іначай, — хоць крышачку філосаф.

— Пакрыўдзіўся?

— За што? За Канта? Глупства, Лёкса. Мукі сумлення ведаюць нават злачынцы. Ты гэта ведаеш лепш, чым я. Ды не пра іх я. Я пра нас... Дзень, які, здаецца, абярнуўся пад нагамі прадоннем, — простае выпрабаванне. Ён выпрабоўвае нас. Не больш таго.

Мне няма куды дзецца ад пільнага позірку Вадзіма — мушу сядзець твар да твару, мушу ўзірацца ў яго цёмныя, залаціста-карыя вочы, шукаючы ў іх тлума-

чэння яго позняга візіту, яго ледзь кранутай іроніяй сур'ёзнасці, яго прыхаванай трывогі.

— Ты ўсё ведаеш! — апераджае думкі здагадка.

Ён ківае.

— Не бог, а ўсё-ткі...

У пакоі ўсталёўваецца цішыня. Яна ўсё шчытней сціскаецца вакол нас — вакол кожнага паасобку, падзяляючы, размяжоўваючы нас яшчэ больш. Марна ўслухваюся я ў яе і ў сябе: ніводзін гук, ніводзін рух не нагадвае знаёмае, звыклае адчуванне дома, цеплыні, утульнасці. І я — адна ў гэтым аглушаным цішынёй пакоі. Нават побач з Вадзімам — адна. Таму і маўчу.

Заўважаю, што плачу, не адразу. Зноў і зноў бачу перад сабой стол, заліты чарнілам, якое расцякаецца, падцякае да самага краю, каб пераліцца, закапаць мне на калені, на сукенку... Болю няма. Толькі вусны балюча крывяцца, праз сілу прамаўляючы адны і тыя ж, ціхія, поўныя адчаю словы: за што?!

За што?! Мяне тата пагукаў з гарода!

Я добра-такі ўпрэла, полючы ў гародзе фасолю: самы ж санцапёк! А тут тата гукае:

— Лёкса! Кінь грады і добра вымый рукі. Ты мне патрэбна для іншай работы.

— Пісаць? — падхопліваюся ў тое ж імгненне і хуценька — атрэпваюся ад пяску: пісаць, перапісваць трэба заўсёды штосьці не вельмі зразумелае, але гэта ўсё ж лепш, чым па гэткай гарачыні калупацца ў градах.

— Пісаць. Ідзі вымый рукі.

Іду. Старанна тру рукі, плёскаючы на іх вадой з кадкі. Не выціраючы — высахнуць! — спяшаюся ў хату, куды пайшоў ужо бацька, адразу кіруюся да стала, за якім звычайна рыхтую школьныя ўрокі. На стале, з парога відаць, ляжаць падрыхтаваныя паперы — некалькі старонак, густа спісаных прыгожым бацькавым почыркам. Іх мне і трэба перапісаць на чыстыя аркушы, хоць я так і не вазьму ў толк, навошта: напісана ж усё роўненька, прыгожа, з мудрагелістымі закавыкамі, пералётамі літар адна да адной так імкліва, што нават хвасты ў самых хвастатых з іх, «у» і «д», нагадваюць ластаўчыныя хвасты. У мяне так не атрымліваецца. Я спрабавала.

— Акуратна перапісвай. Што не зразумееш, лепш перапытай. Я прылягу, — нічога не тлумачачы (не ад-

наго ж разу рабіла гэту работу), кіруецца бацька на другую палавіну хаты, дзе ў прасценку паміж вокнамі стаіць вялікая, абабітая чорнай скурай канапа, і, ступіўшы колькі крокаў, захлынаецца кашлем — ніяк не можа стрымаць, суцішыць натужны, калючы кашаль.

Мне робіцца шкада яго: зараз жа колькі доўгіх хвілін будзе адкашлівацца, зацікаючы рот насоўкай. Хвароба, відаць, нейкая навалілася (я ж чула, як бабуля яму выгаворвала!), а слухаць нікога не хоча і да дактароў не ідзе. Нават матку не слухае...

Уздыхаю. Абмакваю пяро ў чарнільніцу.

«У судзебную калегію абласнога суда ад грамадзянкі Бокуць Сцепаніды Захараўны», — старанна выводжу я на паперы, у правым верхнім кутку лістка, спрабуючы ўявіць гэту грамадзянку — старую, нямоглую, пэўна: сама ж не напісала заяву — бацьку папрасіла! Пішу. Стараюся не прапусціць якую літару, не зрабіць памылку, бо перапісваць давядзецца. А заява даўжэзная:

«Народны суд Рудзенскага раёна ў складзе народнага суддзі Шатэрніка М. С. і народных засядацеляў Кондрусь Н. К. і Сарокіна У. П., разгледзеўшы крымінальную справу па абвінавачванні ў наўмысным злачынстве калгаснага кладаўшчыка Юркевіча Івана Ізотавіча, прызнаў яго вінаватым і прысудзіў да двух гадоў зняволення. Звяртаюся ў абласны суд с просьбай перагледзець гэта рашэнне.

Калі ўжо хто і вінаваты ў тым, што адбылося, дык я, удава загінуўшага за Радзіму ў 1944 годзе Бокуця Івана Іванавіча — Бокуць Сцепаніда Захараўна, маці двох пакуль яшчэ жывых дзяцей, калгасніца. Юркевіча абвінавацілі ў тым, што ён, будучы калгасным кладаўшчыком, выдаў мне чатыры кілаграмы зерня, калгаснага збожжа. Прызнаюся: не вытрымала я, не змагла ў той дзень глядзець у галодныя, амаль згаслыя ўжо вочы маіх дачушак (дваіх жа дзяцей ужо страціла!) і пайшла да кладаўшчыка, да Івана Юркевіча: ён з мужам маім ваяваў на адным фронце. Прыйшла, у ногі яму пакланілася, ратуй дзяцей, апошніх маіх крывіначак, кажу. Па дзве нормы цягнуць у калгасе буду, каб адрабіць гэтыя кілаграмы зерня. І адрабіла б, няўжо ж?

У ногі пакланілася Івану, заплакала... Вось і пашкадаваў ён мяне і дзяцей маіх. І не ён, таварышы суддзі, вінаваты, а я гаротная. Не ў адной жа мяне дзеці з голаду пухнуць, а пайшла папрасіла. Мяне і судзіце...»

Ад старання, а яшчэ ад спачування гэтым чужым людзям, пра якіх пішу, цішком шморгаю носам. Адно што чужыя яны — як у кніжцы, калі чытаеш, — а то б і слёз не стрымала: бедныя яны, бедныя!

— Закончыла?

Я яшчэ раней пачула татава набліжэнне (не па кроках — табакай яго горкай запахла), але не паварочваюся. Складваю паперкі.

— Бачу, што закончыла. Кляксаў не наставіла? — усміхаецца ён, беручы лісткі ў мяне з рук.

Я асмельваюся:

— Тата, пухнуць з голаду — гэта паміраць? А чаму ж мы не паміраем?

Ён павольна, цяжка падымае позірк ад акуратна перапісаных мной лісткоў на мяне.

— Бачыш як: у нас жа ў сям'і цэлых тры кармільцы, Лёкса. А Сцепаніда адна з чатырма дзецьмі пасля вайны засталася. Бачыш як.

— А вы б... вы б не судзілі гэтага Юркевіча?

— Закон адзін для ўсіх, Лёкса, — згорбіўшыся, закашляўшыся адварочваецца ад мяне, ад стала бацька, і ў гэтым яго руху, у гэтых яго словах столькі балючай бездапаможнасці, што я не перапытваю, што я і слоўка больш не кажу, хоць на языку ўжо круціцца злосна-разгубленае: «Навошта ж тады заява?»

Бразгае клямка. Калыхаецца за плячамі гарачая хваля паветра. Я ўжо хачу павярнуцца: бабуля, напэўна, прыйшла...

— Ах, ты поскудзь шкадлівая! Ах, ты, зараза!

Голас балюча сцебануў па плячах. Я сціскаюся на табурэтцы ў балючы камячок і ў тое ж імгненне разумею, што гэта не голас, што гэта дубец паласнуў па спіне — раз і другі. Са стогнам падхопліваюся: матка! За што?!

— Воля, ты што, ачмурэла? — кідаецца паміж намі бацька.

Дубец са свістам апускаецца на яго руку, на тую, якой ён імкнецца перахапіць наступны матчын рух, і я — праз слёзы — яшчэ заўважаю, як наўскос, да самага бацькавага, дакуль падкасаны рукаў палатнянай сарочкі, локця, успухвае, налівасцца чырванню тоўсты рубец... Ужо ад дзвярэй чую: гнеўна, перамагаючы новы прыступ кашлю, бацька выгаворвае матцы:

— Зноў выпіла? Ці мо ад спёкі ачмурэла, што на дзіця кідаешся? Ёй жа дзевяці гадоў няма...

Мне здаецца, што я не заплакала. Што я не плачу, уткнуўшыся ў горкую, жорсткую траву на пусташы за агародамі, хоць рубцы на спіне і на плячы смыляць, нясцерпна гараць і, відаць, зусім такія ж, набрынялыя чырванню, як у бацькі. Хвіліна мінае ці значна больш, — я надта не ўслухваюся, але раптам, быццам вяртаецца свядомасць, адчуваю, што не адна, што хтосьці ўвесь час быў побач. Падымаю галаву.

— Бабскія слёзы лёгка цякуць. Нарумзалася?

Ян. Высачыў жа неяк маё сховішча!

— Скідай сукенку, — камандуе. — Халодныя лісткі крываўніку прыкладзём. Лекі невялікія, а ўсё лягчэй стане.

Я маўчу.

— Штосьці з маленства прыгадала? — перапыняе імгненні Вадзім.

Я насцярожана зіркаю на яго і, супакоеная яго пацяплелым, добрым тварам, ківаю.

— Усё наперакасяк пайшло. Прыгадваецца тое, што і помніць даўно забыла. Адхіснулася ж ад усяго, асудзіла... Як магла, падсаджвала сябе ўвесь час крышачку вышэй, імкнучыся расці, вырасці! А атрымалася: без мінулага і сягоняшняе — адна бачнасць. Кранi — і рассыплецца. Рассыпалася ўжо.

— І гэтак разважаеш ты, Лёкса? Ты, усё жыццё цвёрды, непахісны чалавек? Нешта я тут не разумею. Што — адна бачнасць? Што — рассыпалася? Не хочаш жа ты сказаць адно тое, што сказала? Не хочаш жа ты пераканаць мяне ў тым, што свет твой трымаецца ці трымаўся толькі на тонкай нітачцы службовага росту?

— Не толькі. І ўсё ж, у значнай ступені, — не вытрымліваю я яго ўзрушанага, запытальнага позірку і апускаю вочы на рукі — рукі ледзь прыкметна ўздрыгваюць, пакручваючы, перастаўляючы з месца на месца лёгкую керамічную попельніцу. — Магчыма, я толькі зараз гэта ўсведамляю.

— Глупства, Лёкса. Гэта момант такі. Дні такія! Адзіна правільную прафесію для сябе ты выбрала. Адданая ёй усё жыццё. Сам чуў: жартам цябе Ісцінай Станіславаўнай твае калегі называюць. Падумай, колькім

людзям, якія заблыталіся ў сваіх жаданнях і ўчынках, ты дапамагла!

— Брату — не дапамагла.

— А ты магла, змагла б яму дапамагчы?

— Не ведаю, Вадзім. Ад гэтага і пакутую, што не ведаю. Можа, і змагла б. Калі б ён чужым мне быў, не братам. А то...

— А то?

— А то нібыта і ўзапраўду запэцкацца аб яго баялася: гадамі не бачыліся, пагаварыць не сабраліся... Ён жа добры, мяккі, Ян. Піць пачаў пасля таго як жонка яго кінула. Усміхаўся на мае папрокі.

— Дзе ж тут твая віна, Лёкса? Не бачу, — спакойна перапыняе мяне Вадзім не толькі словамі, колькі рухам рукі — дужымі, упэўненымі пальцамі кранаецца маіх нервова мітуслівых рук.

І я адгукаюся на яго рух, цягнуся да яго паглядам. Словы ўжо хлынулі, прарваўшы ўсе запоны недаверу і перасцярогі.

— Я асудзіла яго за бязволле і адвярнулася. П'е — і няхай п'е, сабе ж горш робіць! Дарослы чалавек, старэйшы ў сям'і... Не няньчыцца ж з ім! Не паверыш, якія недарэчна простыя былі мае разважанні: ну п'е... ну, сап'ецца ў выніку... І гэта я, Вадзім, гэтак разважала, я! — чалавек, які выслухаў за гэтыя няпоўных дваццаць год столькі прызнанняў у розных грахах, у свядомых або несвядомых злачынствах, што павінна была б хоць крыху ведаць зло! Хоць крыху... Разумееш, можна быць аднолькава, роўна добрым, чэсным на працягу многіх гадоў, а то і ўсё жыццё, але нікому не дадзена — ніхто не здольны! — утрымацца на адным узроўні зла. Ніхто! Бацька траіх дзяцей, чыю дабрыню адчувае не толькі яго сям'я, але і ўсе, хто яго ведае, пачынае піць — і становіцца жорсткім. Усімі паважаны чалавек, улюбёны ў сваю справу і сваю жонку, неспадзявана сутыкнецца з падманам — і, ачышчаючыся ад яго, гразне ва ўласным падмане, гразне ў распусце. Праўдалюб, заняты змагар за чалавечую справядлівасць у гневе забівае чалавека — і непазбежна пачынае лгаць... Ці ж мне не ведаць гэтага, Вадзім! Выходзіць: кепска ведала. А цяпер... цяпер, калі гэта зачапіла і мяне, мяне асабіста, я з болем азіраюся назад. Далёка назад — у маленства. І ўсё спрабую зразумець штосьці, усё пытаюся ў сябе, ці ёсць у мяне права судзіць Яна, ці ёсць у мяне права судзіць

мінулае. Мажліва, у Яна было на гэта нават большае права.

— Права судзіць... Я ведаю яго цяжар, Лёкса. Гэта самае цяжкое права, яно можа сагнуць чалавека, а то нават і разгнесці.

— Ды ўжо ж. А раптам памылішся... Раптам я памылялася, Вадзім? — вырываецца ў мяне разам з балючым уздыхам.

— Табе нельга так хваляваццa!

— Раптам я памылялася? Раптам прагледзела ў сваім жыцці штосьці галоўнае, штосьці самае сваё? Мне важна, мне жыццёва важна гэта ведаць. Разумееш? Каб выжыць. Каб жыць далей.

— Урачы, як і вы, юрысты, не застрахаваны ад памылак. Толькі здаецца мне, што ты — пра іншае.

— Пра іншае, Вадзім. Судзяць не толькі суды і кансіліумы ўрачоў — тут хоць бы прафесійная падрыхтоўка дапамагае! Судзіць любы — кожны, хто знаходзіць у сабе гэта права. Вось як Ян. Ці як я ў выпадку з Янам... І тады памылка абарочваецца чалавечай трагедыяй. Ты разумееш?

— Я разумею: Ян — твой брат. І ўсё ж, што тычыцца гэтага выпадку, — пры чым тут ты?

— Ты не разумееш. І я, і Ян — кожны паасобку і кожны па-свойму — асудзілі мінулае. За бацькаву смерць, за матчыну здраду яго памяці і ўсім нам, за багадзельню, у якой памерла бабуля, асудзілі. І вось мінулае судзіць нас. Не адно яго судзіць, але і мяне.

— Ну, ну! Не трэба гэтак змрочна, гэтак змрочна-ўрачыста, Лёкса, — мякка сціскае мае рукі ў сваіх пальцах Вадзім, падшукваючы нейкія іншыя, лягчэйшыя словы. — Цябе — за што ж?!

— Не ведаю, — адымаю я рукі і хаваю іх, апускаю на калені. — Мо за тое, што вось шукала прычыну існавання ў свеце зла, вывучала чалавека, а сама ўвесь час нібы адасабляла сябе ад яго, а сама не магла ды часта і не хацела паставіць сябе на яго месца, зрабіць ці не зрабіць тое, што зрабіў ён. Нібы збоку на яго пазірала. Збоку і крышачку-крышачку зверху... Яно і незаўважана было для староніх, а я... Я была перакананa: ісціна вышэй за ўсё. Ды і зараз перакананa. Толькі зараз думаю: вышэй за ўсё зусім не азначае: вышэй за чалавека.

Змаўкаю. Маўчыць і Вадзім. Спачувальна маўчыць.

І мне раптам робіцца не па сабе: столькі часу мінула — паўтара, амаль два гады не сустракаліся! — а мне нечакана зарупіла душу яму адкрыць. Ледзь што не выганяла напачатку, а тут слоў не стрымаць...

— Ты занадта затрымаўся ў мяне, Вадзім. Прабач, я доўга і бязладна гаварыла, а цябе, напэўна, чакаюць, — праводзячы далонню па твары, быццам сціраючы з яго нядаўняе ўзрушэнне, звяртаюся да яго, прыціхлага, насцярожанага.

— Выганяеш?

— Ты на рабоце.

— Кубачак кавы выпіць я яшчэ паспею, калі ты згатуеш. Сцяпан, шофер, пазваніў бы, калі б што якое... Калі б выклік быў. Мы з ім дамовіліся.

Даслухваю яго тлумачэнні ўжо на кухні, рыхтуючы ўсе неабходнае для пачастунку. Рукі, якія нарэшце, знайшоўшы занятак, супакоіліся, звыкла шчыруюць над сталом і плітой. Думкі стомлена вяртаюць занятаму кавай позірку воблік нечаканага, такога доўгачаканага госця: высокую, гнуткую постаць яго, дужыя рукі з тонкімі, як вытачанымі пальцамі, злёгку прадаўгаваты, правільнай формы твар, асветлены залаціста-карымі ўсплёскамі ўважлівых, добрых вачэй... Менавіта ўсплёскамі! — гэта ўражанне ствараюць лёгкія частыя ўзлёты доўгіх, распушаных веек, крыху цямнейшых, чым валасы колеру спелага лёну...

Учуўшы набліжэнне Вадзіма, наструньваюся: зараз жа паміж намі няма стала, які падзяляў, аддаляў нас адно ад аднаго!

Не паварочваю галавы. Вадзім спыняецца за якога паўкроку ад мяне, міг-другі стаіць нерухома, назірае, услухваецца ў маё напружанае дыханне і — робіць нечаканы рух: не падымаючы рук, пяшчотна, ледзь чутна прыхінаецца да мяне, да маіх валасоў ілбом. І маўчыць. Бясконца доўга маўчыць...

## IX

Вар'яцтва і адчай заслугоўваюць патолі. Не помню, калі першы раз сярод ночы згадала я гэтыя словы, але, згадаўшы, ніяк не магу ад іх адчапіцца. Вар'яцтва і адчай... Якое вар'яцтва? Чый адчай?

Гэта ўсё — бяссонне. Цэлую ноч не звяла вачэй: то

ад думак пра злачынства, то ад думак пра каханне адбівалася. Уключала настольную лямпу — пляміна святла, хіснуўшыся, застывала на падлозе і праз хвіліну ўжо нагадвала лужыну крыві, у якой, быццам твар мінулага, калыхаўся круглы твар Шатэрніка. Выключала лямпу — раптоўная палёгка праз якую хвіліну змянілася новым прывідам: з цемры, усё набліжаючыся, узіраліся ў мяне залаціста-карыя вочы — і вось ужо спаўзала з пляча начная сарочка, вось ужо дужыя мужчынскія рукі патрабавальна лашчылі цела... І я зноў уключала лямпу, зноў пазнавала і не пазнавала твар мінулага...

Досыць! Праспект даўно прачнуўся і рытмічнымі роўнымі звівамі калон транспарту між зялёнымі і чырвонымі бліскамі светафораў тузаецца, ірве павадкі праваДоў, імкнецца з аднаго канца горада ў другі і назад, нервова, скрыгаючы тармазамі, перамігваючыся каляровымі лямпачкамі, равучы ўсімі сваімі маторамі. Быццам не горад будзіць, а ранак, захутаны ў змрок і золь. Быццам гэтыя змрок і золь яму не перашкода, і ён перакананы, што нікому — і мне — не павінна гэта перашкаджаць.

Рашуча падымаюся, уключаю не настольную лямпу з яе абрыдлым занач, інтымным цёмна-ружовым святлом, а ярка-матавы свяцільнік над галавой і прыступаю да ранішняй фіззарадкі. Каб падбадзёрыць сябе. Каб разагнаць кроў у жылах і растаптаць, разгнесці начныя думкі, начныя страхі і спадзяванні. Хоць так — дзейнічаць!

Калі ляскаюць за спіной фанерныя дзверы пад'езда і я лёгкім кіўком галавы вітаюся з насупленым ранкам і гэткай жа насупленай дворнічыхай, ніводная з перажытых, перадуманых хвілін ночы ўжо нават не абзываецца: фіззарадка, душ, два кубачкі пеністай кавы вярнулі мяне ў рэчаіснасць, у якой жыву, з якой мушу лічыцца, якую не магу адпрэчыць, як адпрэчваю недарэчнае сёння жаданне спакою. Які тут спакой, калі брат у турме, а я, па сутнасці, адхілена ад сваёй звыклай, звыкла-напружанай работы, па-за якой не бачу сябе, не ўяўляю? Не да спакою... Няхай не як належнае прыняць тое, што адбылося і адбываецца, але ж неяк трэба, пэўна, прыняць. Прыняць і — самой — штосьці вырашыць. За сябе. І за сваю будучыню. Гэта ж я разумею!

Нічым, хачу таго ці не хачу, я не апраўдваю Яна. Можа, і сябе не апраўдаю. Нездарма ж азіраюся назад, узіраюся ў дзяўчынку са збітымі каленькамі і калючымі агеньчыкамі бяссільнай нянавісці ў вачах. Нездарма мераюся з ёй ростам. Хіба я не вырасла з той нянавісці? Хіба толькі нянавісць была ў маім сэрцы? Вось жа прыгадала таго, з перапісанай у маленстве заявы, Юркевіча, як віну перад ім адчуўшы. Хіба ён быў больш вінаваты, чым любы з нас сённяшніх? Ён гору паспачуваў, ён дабрыні сваёй не запярэчыў, а быў асуджаны. Па законах часу, хай сабе і жорсткіх з адлегласці гадоў, асуджаны за перавышэнне сваіх правоў: не сваё аддаў — дзяржаўнае. Цяпер — яшчэ больш чым тады, — думаю, што завялікае пакаранне ён панёс (здаецца, пасля перагляду справы суд нават павялічыў меру пакарання), а судзі я яго не сёння, а тады... Закон на тое і закон. Закон адзін для ўсіх. Адкуль жа тады пачуццё няўцямнай віны? Навошта — і перад кім? — я апраўдваю таго Юркевіча? Або Яна?

Ян — не злачынца... Магчыма. Напэўна! — датуль, пакуль не падняў руку на чалавека, думаючы, што вершыць правы суд. Суд яго кваліфікуецца як самасуд і прыроўніваецца да злачынства. І гэта справядліва. І гэта не можа разглядацца інакш.

Ян — злачынца... Магчыма. Для ўсіх будзе відавочна! — пасля смерці Шатэрніка і суда. І я адразу апынуся — ды чаго там, апынулася ўжо! — за рысай свайго яшчэ толькі ўчарашняга становішча, а то і за рысай свайго лёсу. Давядзецца ўсё пачынаць спачатку. І гэта — справядліва, колькі б я ні мучылася несправядлівасцю. Справядліва?

Перапыняю свае разважанні: гэтак чорт ведае да чаго дадумаешся! Вінавата — не вінавата... Ёсць неабвержны факт. Ёсць неабвержнае правіла: калі пад суд трапляе хтосьці з самых блізкіх сваякоў — суддзя падае ў адстаўку. Ёсць, урэшце, першая заява ў сумачцы — заява на адпачынак, на дні роздуму і пошуку прыстойнага выйсця. Хоць дзе яно, тое прыстойнае выйсце? Ну, ды гэта потым...

— Потым — гэта калі? Гэта ніколі? А, Лёкса?
— Адчапіся ты!
— Я запыталася ў бабулі, яшчэ ўчора, калі можна

будзе есці тое, што наварылі, а яна сказала: потым. Я ў мамы запыталася...

— Бяжы яшчэ раз запытайся, можа, па посе ўхопіш! Бачыш жа: у хаце — чужыя людзі, — спрабую я адчапіцца ад Лёны, што, як смала, прыліпла да мяне з раніцы і то хныкае, то балбоча пад вухам абы-што якое: нічога за ёй не ўчуць. — Цікава, што яны так хмура выпытваюць у нашых?

— Хто? — лезе пад руку сястра.

— Тыя, што прайшлі паўз нас, у кіцелях, гэткіх жа, які ў бацькі быў! Нікому не дазваляюць у хату заходзіць і ўсё пра нешта гавораць і гавораць там з маткай. І з бабуляй... Падслухаць бы!

— Падслухваць брыдка. Тата казаў.

— Ужо не скажа... — ледзьве прамаўляю я, і словы раптам робяцца цяжкімі і ліпкімі: кожнае — як вялізны камяк смалы.

Лёна зноў пачынае хныкаць. Мне здаецца, што яна ўсё-ткі не да канца разумее, што бацька памёр — памёр і яго ніколі не будзе! — і хныкае, бо проста адчувае блізкасць чагосьці таямнічага, незразумелага і таму нястрашнага. Адчувае ўсё інакш, чым я, і ўсё-ткі адчувае. Вось і туліцца да мяне, шукаючы апору. А я і сама заплакала б, каб не гэты ліпкі, горкі камяк у горле: каўтаю яго сюды-туды, а ён ніяк не пракоўтваецца — захрас у горле і сядзіць. У мяне нават голас змяніўся: словы — кожнае! — усякі раз ціхенька ўздрыгваюць, абрываючы адну за адной тонкія нітачкі спакою. Абарваць бы іх усе разам і загаласіць на ўвесь двор, як бабуля... пазаўчора, калі ўсё здарылася...

Здарылася... Мы збіраліся снедаць, бабуля каля печы завіхалася, а тут маці ідзе з другой палавіны хаты. «Дзеці, — кажа, — ваш бацька памёр». Твар спалатнелы, спалоханы, але ні слязінкі на твары. Сказала і выйшла ў сенцы. І, відаць, самлела там, бо, калі на бразгат перакінутага вядра я кінулася да дзвярэй, яна, нязграбна ўткнуўшыся галавой у парог, ляжала на падлозе, адкінуўшы левую руку. І тут — загаласіла, запрычытала бабуля...

— Ян! Ян прыехаў! — верашчыць, як мне здаецца, на ўвесь двор Лёна, нецярпліва падскокваючы і выціраючы вочы кулачкамі.

Тузаю яе за руку: чаго верашчаць? Я ўжо і без яе

бачу: прыехаў. Пасталелы. З тым жа партфелем у руцэ, з якім паехаў з дому. Мо назусім прыехаў?

Стараюся трымацца па-даросламу: я ж старэйшая! Я ж — не Лёна, якая ўжо вісне на Янавай шыі, хныкаючы і радуючыся адначасова. Павітацца таму не дала, абслюнявіла пацалункамі. Што, калі б і я...

Дадумаць, што, калі б і я, да канца не паспяваю. Адной рукой стрымліваючы радасць малодшай сястрычкі, другой рукой Ян моцна прыціскае да сябе, да пляча, мяне. І вось ужо я тыцкаюся тварам некуды яму пад паху, не дастаючы да пляча, вось ужо ўсхліпваю — наўзрыд плачу, быццам толькі зараз, побач з Янам, усведамляю, што адбылося непапраўнае, што мы застаёмся толькі з маткай, якая не любіць ні нас, ні бабулі, і нам яшчэ доўга-доўга расці, пакуль мы станем дарослымі.

— Ну, вось, усяго мяне слязьмі залілі, — усё мацней горне, туліць нас да сябе Ян, і голас яго ўздрыгвае, няйнакш, як у мяне зусім нядаўна. — Пойдзем у хату, да бацькі.

Я адхінаюся ад яго, успомніўшы, што не сказала, не паспела сказаць яму пра чужых дзядзькоў у кіцелях, якія дагэтуль не выходзяць з хаты. Працягваючы плакаць, адхінаюся даволі рэзка, так, што Ян адразу разумее: ёсць яшчэ штосьці, чаго ён не ведае.

— Што-небудзь не так, Лёкса? — зазірае мне ў заплаканыя вочы. — Бацьку ж яшчэ не выносілі?

— Не выносілі, — выціскаю з горла. — Але там...

— Што там?

— Там чужыя, — спяшаецца апярэдзіць мяне Лёна. — Чужыя. У кіцелях.

— Ты можаш штосьці растлумачыць, Лёкса? — зіркае на вокны хаты Ян, гатовы ступіць да парога, не дачакаўшыся майго адказу.

— Я не ведаю, што растлумачваць, — хлюпаю я носам, спрабуючы супакоіцца. — Яны не пускаюць нас у хату. Штосьці выпытваюць у маткі. І бабуля там. А нас не пускаюць.

— Да труны — не пускаюць? Хто яны, каб распараджацца ў дзень пахавання.

— Не ведаю...

Ян ужо не слухае. Падхапіўшы партфель, рашуча кіруецца да парога. І не паспявае: адчыняюцца дзверы і з сенцаў, насустрач яму, выходзяць двое. Высокія, ладна збітыя (не тое што высахлы за апошні год бацька). У

цёмных, чорна-зялёных кіцелях, наглуха зашпіленых да самых падбародкаў, яны абмінаюць Яна, адчужана, абыякава змерыўшы яго паглядамі, — і Ян не можа стрымацца.

— Што вам трэба ад мёртвага?

— Ян, сыночак! — кідаецца да яго маці, якая выходзіць следам за незнаёмцамі. — Маўчы, сыночак, маўчы!

Я пазіраю не на маці і не на Яна, які моршчыцца, як ад болю, а на тых двух: ніводзін з іх не тое што не адказаў — галавы не павярнуў у бок Яна. Прайшлі цераз двор, да самых весніц, і праз купку людзей, што сабраліся ля двара і зараз адступіліся, даючы ім дарогу, з зацятымі, як скамянелымі тварамі — і каб слова, каб рух у чыйсьці бок!

— Што ім трэба было ад вас? Чаго яны прыходзілі? — непрыязна і не хаваючы гэтай непрыязнасці, вырываецца Ян з матчыных рук.

— Потым раскажу, сын. Людзі ж прыйшлі! Трэба ж, каб усё, як у людзей! — усхліпвае тая, усхліпвае занадта гучна, бы спецыяльна для людзей, што сабраліся, каб праводзіць бацьку.

Прытвараецца! — мільгае ў мяне думка, і я палохаюся гэтай страшнай думкі...

Згадка не адпускае. Я ўсё азіраюся на яе, быццам спрабую лепей разгледзець твары: Янаў твар, матчын і тых двух, што ў кіцелях, а яны, гэтыя твары, распаўзаюцца, размываюцца адлегласцю, і. няўцямная трывога расце. За ўсе гэтыя гады я ніколі не спыталася ў Яна, што ён ведаў пра тыя падзеі, што сказала яму матка ці бабуля. Мне здавалася, што я ўсё ведаю і так. А што я ведала? Што яшчэ я магу згадаць сёння, апроч Янавага прыезду, вакол якога бездапаможна кружаць зараз думкі. Бабуліны галашэнні? Доўгі-доўгі шлях да могілак і дождж, што пачаў накрапваць у тыя апошнія хвіліны, яшчэ больш азмрочыўшы іх?

Дождж... Тады, як усе гэтыя дні запар, церусіў дробны дождж. Я яшчэ падумала: зараз не будзе відаць, хто плача, а хто проста супіцца і думае сваё...

— Лёкса! Ідзі развітайся з бацькам, — тузае мяне за руку старая Антоля, суседка. — Сіроткі вы цяперака. Нага-ру-ецеся!

— Ніякія мы не сіроткі! — хачу агрызнуцца, а губы

ніяк не варушацца. Не вельмі слухаюцца і ногі, калі я хачу крануцца з месца: нябачны аграмадны цяжар наваліўся раптам на плечы і гняце, уціскае мяне ў зямлю, падгінае ў каленях ногі — другая правальваецца ў мокры, занадта яркі сярод аднастайнай шэрані пясок. Ступаю крок, другі. Спатыкаюся. Спалохана азіраюся на людскі натоўп: усе чагосьці чакаюць. А чаго?

— Я не хачу! — крычу — спрабую закрычаць, а губы па-ранейшаму не варушацца.

— Я не хачу без бацькі! Ён быў добры, ён быў самы лепшы, хоць і хворы, — вы ніхто не ведалі яго! — не магу я выпіхнуць гэтыя словы, гэты крык з грудзей, і таму вырываецца з грудзей сэрца.

І вырвалася б! — калі б не бабуля, не яе далонь, якой яна мякка прыкрывае мне бязгучны рот, быццам пачула, адчула мой задушаны крык і спалохалася.

— Пойдзем, дзетка. Пойдзем, Ляксандра. Аняго ж? У такую хвіліну няможна пра сябе думаць.

І я паслухмяна іду за ёй. Спыняюся там, дзе яна спыняецца, не ўсведамляючы, чаму, навошта. Спыняюся, пазіраю на бацьку ў труне — не на васковы твар яго, які, схіляючыся, цалуе бабуля, а на рукі. На недарэчна складзеныя на грудзях, нерухомыя, нежывыя бацькавы рукі, у якіх заціснута белая паркалёвая насоўка. І думаю: чаму раптам — насоўка? Бацька ж звычайна пяро ў руцэ трымаў, альбо лісткі паперы, спісаныя яго прыгожым почыркам, альбо дакументы.

Апошняе, што чую: бабулін гучны шэпт.

— Божа, божа, за што ты пакараў яго і караеш нас? Мо няма цябе, божа, калі смерць ад людзей ён прыняў, калі смерць забрала яго, а не мяне, старую...

Апошняе, што бачу: пачынае распаўзацца грудок занадта яркага сярод аднастайнай шэрані пяску, хістаецца і ўсплывае ўгару і ўбок ад майго пагляду абабітая чорным крэпам труна і з перакошанага яе края з жалобным звонам падаюць на пясок бацькавы медалі. Адзін, другі, трэці...

— Скажы, грамадзяначка, дзе тут самы галоўны музей?

Страпянуўшыся, паварочваюся на голас: дзядок — невысокага росту, у шытай вясковым краўцом світцы і магазінным капелюшы, у хромавых, добра начышчаных ботах, з лёгкім, відаць, паўпустым рэчмяшком у руцэ.

— Пэўна ж, у горадзе руху не пазычаць. Усё некуды бягуць, штурхаюцца — і за руку каторага не спыніш. А ты, так зразумеў, дочка, не спяшаешся нікуды, калі прыпынілася. Дай, думаю, папытаю, каб не блудзіць сярод людзей. У лесе б я не заблудзіўся, не, а сярод людзей... Усе бягуць, штурхаюць адзін аднаго. Спяшаюцца!

— Вы нешта спыталіся, дзядуля?

— Ага. Пытаўся. У самы галоўны музей я прыехаў, дочка. З Лунінца. Казалі: недзе тут ён, музей, у цэнтры.

— Гэта ж які такі галоўны музей? — з цікавасцю разглядваю старога, урэшце вырваўшыся са згадкі.

— Як гэта які? Музей вайны. Хіба што не ведаеш...

— Чаму ж! Ведаю. Усе ў горадзе гэты музей ведаюць.

— Вось жа і кажу, — задаволена хмыкае ён, — галоўны музей. Хіба не гэтак назваў?

— Гэтак, гэтак. Хадземце, я вас праводжу. Тут недалёка.

— Дзякуй, дочка. А то я й разгубіўся па-свойму, павясковаму: гэта ж ні з кім словам не перакінуцца, усе як чужыя.

Міжволі ўсміхаюся ў сабе, слухаючы дзеда: не відаць, каб ён дужа разгубіўся! Жвавы, не згорблены ні гадамі, ні нягодамі, ён крочыць побач упэўнена, не мітусіцца, разглядваючы праспект і людзей вакол, зрэдку, спадылба, хітравата зіркае на мяне і штосьці сам сабе думае ўвесь час.

— Вы што ж, з Лунінца спецыяльна ехалі музей Вялікай Айчыннай вайны паглядзець? — пытаюся.

— А як жа! — адразу абзываецца. — Раней не сабраўся, бо ўсё не выпадала. Ніяк не выпадала: баба мая дужа хварэла... Акрыяла трохі, ды і работы якраз у гаспадарцы паменела — паеду, кажу. І паехаў. Анягож?

— Цікава ці інтарэс нейкі свой маеце?

— Цікавага ў вайну мала было, дочка. Гэта ў кіно паглядзець катораму цікава, як на «ўра» немца бралі. На «ўра» не заўсёды атрымлівалася, я так думаю. Магіламі, касцьмі ўся зямелька засеяна.

Бач, як ён мяне! — адзначаю ў думках. З павагай адзначаю. Няпросты дзядок трапіўся, казённымі пытаннямі гаворкі з ім не адбудзеш. Так павярнуў, што і сказаць няма чаго.

— Скрозь, дзе ні паедзеш, — магілы. І ў кожнай як не дзесяткі, дык сотні людзей. Штабялямі, няйначай, складалі... А ты кажаш: цікава, — працягвае дзядок, перакідваючы рэчмяшок з адной рукі ў другую. — Якая ж цікавасць у тым, што не па-людску і не па-божаску? А?

— Прашу прабачыць мне: не так сказала... — нічога лепшага не знаходжу я ў адказ.

— Ужо ж, не так сказала. Абыякава. І тым мяне, старога, угнявіла, — кашлянуў ён, не пазіраючы больш у мой бок. — Лёгка ў вас, сённяшніх, усё: было — мінула, трывожыць — абыдзецца... Ні да людзей, ні да сябе не прыслухваецеся. Спяшаецеся. Нібыта час вось-вось за хвост ухопіце... А я вось прыехаў сыноў сваіх шукаць. На той вайне шукаць, памяць пра якую ў галоўны музей зямлі нашае адусюль звезлі і знеслі. Знайду, як думаеш?

— Знойдзеце. Калі шукаеце — знойдзеце.

— Вось і я сваёй старой сказаў: знайду.

Ён уздыхае і доўга, да самай плошчы, да якой мы набліжаемся, маўчыць, затрымліваючы позірк на кожным, хто абмінае нас, бегучы да аўтобуснага прыпынку. Хачу запытацца ў яго, хто ён будзе і хто яго сыны (мо я дапамагла б яму чым?), і не пытаюся, згадаўшы суровае: «Магіламі, касцьмі ўся зямелька засеяна». Трыццаць пяць пасляваенных гадоў не пакідаюць надзеі...

— Вось ён, Дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны, дзядуля, — паказваю на шэрую камяніцу ў дальнім кутку плошчы.

— Вось і добра. Вось і дзякуй, дочка, — заспяшаўся адразу стары.

— Толькі музей яшчэ зачынены. Зарана вы прыйшлі.

— Што зарана, не бяда. Пасяджу. Пачакаю, пакуль адчыняць. Спраў жа пільных у мяне няма, апроч гэтай. Пасяджу... Пачакаю...

Не азірнуўшыся, быццам ужо і забыўся на мяне, дзядок тупае далей, цераз плошчу, і я ледзь не да ўсходцаў у музей праводжу яго позіркам. Бач, чым папікнуў: «Лёгка ў вас, сённяшніх, усё...» Каб жа ўсё лёгка!

Зіркаю на гадзіннік: дзевяць, без чвэрці. Трэба бегчы: спазняюся...

## X

— Трэба прымусіць народ жахнуцца сябе самога, каб удыхнуць у яго адвагу. Чые вы, думаеце, гэта словы? Карла Маркса! Маркса, Аляксандра Станіславаўна. Цытую даслоўна. А ён, як вядома, што марна не казаў.

— Ён жа гэта не ў сувязі з п'янствам казаў.

— Не ў сувязі. Толькі вось згадваецца і ў сувязі... Можна, канечне, і далей жыць, заплюшчваючы вочы на ўсе праявы п'янства, не бачачы ў ім пагрозы, страшнай пагрозы для грамадства, для будучыні. А тое, што ледзь не тры чвэрці ўсіх злачынстваў, у тым ліку самых цяжкіх, — на долі тых, хто злоўжывае алкаголем, на што спішам? А і гэта ж — не самае страшнае. Выраджаемся, мілейшая Аляксандра Станіславаўна! Не так ужо і прыхавана перараджаемся... З-за знешняй небяспекі не бачым унутранай. Мажліва, не меншай.

Пазіраю на добры, блізарукі, напалову закрыты вялізнымі з тоўстымі шкельцамі акулярамі і ад таго яшчэ больш невыразны твар Рыгора Цітавіча, нязменнага на працягу апошніх дзесяці гадоў старшыні суда, і спрабую здагадацца, да чаго ён хіліць: і двух слоў не даў мне сказаць, каб растлумачыць, з чым я ішла да яго. Ведае ж, безумоўна, з чым ішла, а гаворку завёў пра іншае, пра тое, што толькі за вушы можна прыцягнуць да майго выпадку: гэта ж толькі агульныя словы — пра заведама невырашальную ў сённяшніх умовах праблему.

— Вось вы думаеце зараз: чаго гэта старога Цітавіча да філасофіі раптам пацягнула? Думаеце, думаеце, мілейшая Аляксандра Станіславаўна! — заўважыўшы нязгоду ў маім хуткім руху насустрач яго словам, перапыняе ён сам сябе і мяне — гатовыя ўжо вырвацца ў мяне словы. — І вось што я вам на гэта скажу. Мы ўсё больш губляем адчуванне часу. Так, так! Пры ўсім тым, што спасылаемся на яго так часта. Адбываецца, як мне здаецца, непапраўнае: мы ў масе сваёй страчваем уменне мысліць — засяродзіўшыся, адасабляцца ад знешніх падзей, ад гаворак, ад мітусні, калі душу трывожыць не дробязнае, не толькі пачутае або пражытае, а вечнае — тое, што звязвае душу з вечнасцю, чалавека з народам. Гэта высокія словы. Згодны. Але ж у страху перад пустатой такіх вось высокіх, неаднойчы паўтораных

слоў, мы, на маю думку, адхіснуліся ад таго, што за імі, — здраджваем самаму галоўнаму ў сабе, таму, што належыць вечнасці і складае самую сутнасць чалавека. Духоўную яго сутнасць.

— Вы пра духоўнасць і бездухоўнасць? — чамусьці закранутая яго безлічным «мы», спрабую адасобіцца я ад сваёй трывогі і падтрымаць гаворку.

— Пра прагу духоўнасці. Пра прагу духоўнага ўзбагачэння, пра якую мы гаворым так рэдка, што ўсё часцей узнікае трывожная думка: ці не закранула, ці не захліснула і нас, інтэлігенцыю, гэта масавае ап'яненне жыццём, гэты гон у імя прэстыжу і розных даброт? А? Гэта, пэўна ж, зваблівa — акружаць сябе моднымі прыгожымі рэчамі...

— Перш рэчамі, а потым словамі, — не стрымліваюся я.

— Так, так, — не заўважае ён маёй нястрыманасці, думаючы пра штосьці сваё, і мне становіцца няёмка ад адной думкі, што зразумей ён падтэкст сказанага, пакрыўдзіўся б.

— Прызнаваць самую вялікую каштоўнасць у духоўнай культуры, а не ў матэрыяльнай лягчэй, чым сцвердзіць яе, — кажу. — Патрэбны нейкія новыя рашэнні, нейкія новыя законы, Рыгор Цітавіч.

— Магчыма, патрэбны і новыя рашэнні, і новыя законы. Згодны, мілейшая Аляксандра Станіславаўна. Але ж рашэнні прымаюцца, і законы пішуцца для людзей. Для людзей, на жаль, ужо дарослых, у кожнага з якіх ужо склаўся нейкім чынам лёс. Нейкім чынам... З горыччу гэта кажу, бо мы — і мы з вамі, Аляксандра Станіславаўна, — часцей гаворым пра людзей, а не пра чалавека. Чалавека ж заўважаем толькі тады, калі ён здзейсніць подзвіг. Або, як у нашым выпадку, злачынства. Бачыце, які аграмадны прамежак — паміж подзвігам і злачынствам — запоўнены пустатой! Пустатой, назва якой — абыякавасць.

Яго словы адгукаюцца ўва мне болем. Болем глыбокім, які перашкаджае адказаць, не пагадзіцца: мы ж, судзейскія, якраз маем справу не з людзьмі наогул, а з чалавекам, кожны раз з канкрэтным чалавекам, якому павінны дапамагчы. Дапамагчы, нават пакараўшы. Пра што ж тады ён?

— Вы не прымаеце, відаць, шчырую высокаўзнёсласць маіх слоў?

— Не, не! Што вы, Рыгор Цітавіч!

— Дык вось пра чалавека... Чалавек павінен паважаць самога сябе не за тое, што ён мае, а за тое, што аддае. Грамадству. Свайму народу. Чалавеку побач. Найперш, чалавеку побач. Любіць кагосьці — многіх! — каго не бачыш, не ведаеш і ніколі не сустрэнеш, так лёгка, так зманліва! Тым больш што і ахвяраваць нічым асабліва не трэба, і сумленне нібыта чыстае — так чыста падманута... Дапамагчы ж чалавеку побач цяжэй. Хоць толькі ў гэтым — яго сапраўднасць, яго годнасць. І яго разуменне, што ён варты найвысокага. Вы не згодны? — зноў заўважае ён мой нецярплівы рух.

— Толькі ўсё чалавецтва разам з'яўляецца сапраўдным чалавекам. Гэта ж таксама ісціна, — не хачу я адступацца ад якойсьці няўцямнай і балючай нязгоды з ім, з сабой, з цэлым светам, хоць заўсёды — раней! — думала амаль гэтак жа: прызнаць сябе вартай найвысокага...

— Аляксандра Станіславаўна, мілейшая, ды вы ж нічога не зразумелі!

— Не зразумела?!

Я нечакана крыўджуся, у думках нават чорта лысага памінаю, маючы на ўвазе шырокую, цераз увесь чэрап, плешыну старшыні: сам скача ад адной думкі да другой, ніводную не даводзячы да яснасці, а мне папікае. Чалавек... А я што, не чалавек? Са справай да яго прыйшла, а яму сваё рупіць — няйначай, свой чарговы трактат на мне правярае!

— Вы не зразумелі. Я ж пра сілу чалавечага памкнення — пра прагу духоўнасці, якой гэтак не хапае многім і за якую мы з вамі, мілейшая Аляксандра Станіславаўна, павінны змагацца ў кожным чалавеку.

— Мы змагаемся за прафілактыку правапарушэнняў, — буркаю.

— Вось, вось! Вы пачынаеце разумець. Замест таго каб выказаць — у любым выпадку — чалавечнасць сваёй прыроды і сэрца сваё, чалавек становіцца адно адбіткам свайго занятку ці сваёй навукі, — усе іншыя здольнасці занядбаны ім дзеля адной, на яго думку, галоўнай: той, якая дае, набліжае ўшанаванні, узнагароды — простую ўвагу, урэшце! І гэта не толькі прыстасаванства: з ім мы б неяк управіліся! Не, тут не толькі прыстасаванства. Заўважаем жа мы таго, хто здзейсніць подзвіг. Або злачынства. Парадокс? А разабрацца: усё

проста. Усё да крыўднага проста, мілейшая Аляксандра Станіславаўна.

— Пасля трыццаці гадоў работы ў органах юстыцыі вам, Рыгор Цітавіч, уяўляецца гэта простым? — не хаваю я недаўмення. — Гэта ж, магчыма, адна з самых складаных і невырашальных праблем: індывід — і грамадства, асоба — і народ.

— Індывід неаддзельны ад грамадства, асобу вылучае народ... Дзе ж тут мяжа, у чым — процістаянне? — блізарука жмурыцца ён, неяк незнаёма прыглядваючыся да мяне. — З моманту нараджэння свет уплывае на нас. Ды што там уплывае! Паспрабуйце ўявіць чалавека без людзей, без яго акружэння... Тое і яно. Што, мілейшая Аляксандра Станіславаўна, мы можам назваць уласна сваім — апроч энергіі, сілы, жадання? А?

— Лёс.

— Ну, гэта ўжо штосьці з метафізікі!

— Род... — нечакана губляю я ўпэўненасць, хоць неаднойчы чула разважанні старога Цітавіча менавіта вакол родавых, генетычных асаблівасцей людзей і цэлых народаў.

— Род — народ — прырода! Нават словы маюць адны карані, што ж да нас, смертных... Вы ж самі сказалі, мілейшая Аляксандра Станіславаўна: толькі ўсё чалавецтва разам з'яўляецца сапраўдным чалавекам. Я прадоўжу: і кожны з нас, смертных, можа толькі тады знайсці сваё прызначэнне і радасць у тым, калі ён валодае мужнасцю — так, так, мужнасцю! — адчуваць сябе ў гэтым цэлым, адчуваць сябе частачкай гэтага цэлага. А мужнасці якраз і не стае. А мужнасці — гэткай мужнасці! — чалавека якраз ніхто і не вучыць. Цяпер вы разумееце, пра што я казаў колькі хвілін таму?

Адчуваю, што чырванею: і Рыгор Цітавіч, як учора Вадзім, завёў гаворку, адзіна думаючы, што тым ратуе маю душу, а я добрай паўгадзіны спрабую даўмецца, да чаго ён хіліць, з чаго гэта ён пачаў раптам філасофстваваць у гэткі не адпаведны для гэтага момант. Задужа на сабе засяродзілася: душа слепнуць пачынае...

— Згодна антычнаму міфу, — працягвае Цітавіч, цярэбячы рукой дужку акуляраў, — багіня мудрасці Мінерва нарадзілася з галавы Юпіцера ў воінскіх даспехах, з дзідай і шчытом. І ў гэтым глыбокі сэнс, мілейшая Аляксандра Станіславаўна. Мудрасць з'яўляецца не для таго, каб даношваць аднойчы здабытыя лаўры, а для

таго, каб змагацца. Змагацца за чалавека ў чалавеку. Штодзень. Штоміг. Вы не згодны?

— Згодна, Рыгор Цітавіч. Толькі...

— Што — толькі? Ёсць пярэчанні?

— Гэта не пярэчанні, гэта са свайго асабістага... Нельга ж бясконца чэрпаць сілу з самога сябе, са сваёй душы. Я, відаць, няясна кажу, — падшукваю я неабходныя словы, каб выказацца ясней і ўсё-ткі не сказаць нічога з таго, што прыадкрыла б самае патаемнае, самае маё: добры, мяккі чалавек наш старшыня суда, але адлегласць паміж намі, і дагэтуль вялікая, зараз вырасла ўдвая, а то і ўтрая. — Заўсёды прыходзіць такі міг, такі дзень, калі трэба, жыццёва трэба адчуць побач, поплеч сябра... сяброў... каб выстаяць. І калі не знаходзіш... Я ўдзячна вам, Рыгор Цітавіч!

— Ну, ну! Проста мне, старому, здалося, што вы вось-вось пачнеце папракаць жыццё. Але ў чым жа можна папракнуць жыццё, мілейшая Аляксандра Станіславаўна? У тым, што яно не даецца нам дарма? Не даецца лёгка?

Роўны, без націску на націскныя галосныя голас старога старшыні гучыць нават тады, калі ён замаўкае. Я ведаю гэту яго здольнасць (калісьці нават спрабавала пераняць яго гучанне), і ўсё ж кожны раз узнікае паўза на некалькі імгненняў: я працягваю слухаць адгучалыя словы і спазняюся з адказам. А Рыгор Цітавіч чакае, не прыспешвае мае думкі, быццам усе яго справы на сёння — вось гэтая, мажліва, апошняя наша з ім гаворка.

— Я не жыццё папракаю. Ніхто мне такога права не даваў і не дасць ніколі — папракаць жыццё, няхай сабе і ёсць у мяне, за што, — зазначаю сумна. — Я сябе зараз папракаю, Рыгор Цітавіч. Не ўсё, далёка не ўсё рабіла і зрабіла, каб што-кольвечы ў ім, у жыцці, змяніць. Вось што засмучае.

— Не збядняйце, мілейшая Аляксандра Станіславаўна, таго, што зрабілі і робіце. Не заўсёды можна ўлічыць непрадбачанае. Не заўсёды. На жаль.

— Дзякуй вам за разуменне! — не хаваю ўзрушанасці, адгукваючыся на яго ціхія словы. — Дзякуй, Рыгор Цітавіч!

— Я гаварыў у міністэрстве... — адводзіць ён позірк і, дастаўшы насоўку, уцірае спатнелы лоб. — Ёсць пуцёўка ў санаторый. З наступнага тыдня. Адпачнеце.

Падлечыцеся. Што-якое потым знойдзецца... Для вас. Вас паважаюць і цэняць, і вы гэта ведаеце.

Голас яго затухае. Разумею, што гаворка закончана. Што ён, Рыгор Цітавіч, адстойваў штосьці маё ў міністэрстве і не адстаяў. Што тлумачыць ні яму, ні каму іншаму нічога не давядзецца. Што дні роздуму, дні пошуку нейкага выйсця наступілі, а дзень сённяшні і ёсць тая мяжа, якую я мушу пераступіць, — сама, і з годнасцю.

Развітваюся і, пакінуўшы сваю заяву на стале, выходжу з кабінета. Пуцёўка ў санаторый... Саслаць хочуць. Далей ад падзей і маёй трывогі. Саслаць...

— Яго маглі саслаць туды, дзе беды зімуюць, — і былыя ваенныя заслугі перад Радзімай не дапамаглі б. Ужо хто-хто, а я гэта ведаю, Оля.

Шатэрнік! — яго шапялявы, заўсёды з нейкім салодкім прысвістам голас я пазнаю з першых слоў. Бач, зноў з'явіўся! Зноў гугніць нешта матцы... Ненавіджу! Абаіх ненавіджу. Магла б — кінулася б на яго ці на матку, галавой білася б у яе твар, у грудзі: як яна можа?! Як яна смее?! На магілкі ніводнага разу не схадзіла за гэтыя чатыры месяцы, на нас — на мяне і на Лёну — ніводнага разу не зірнула лагодна... Як жа! Усё гэтага пузатага, няйначай, выглядвае. А бабуля ў закутку за печчу плача. Плакала... Я чула... Гэтак жа выразна чула, як зараз чую гнусны шэпт гэтага... І ніякі ён не суддзя, хоць і сядзіць днём у судзе! Суддзёй быў тата, а гэты...

— Адкуль ты ведаеш, Міша?

«Мі-ша!» передражніваю ў думках маці: яшчэ б Мішачкам назвала, аблашчыла.

— Кажу — значыцца, ведаю. Папера на яго была. Што вораг народа. Што розным злосным элементам пасабляў.

— Стась — вораг народа? Стась — розным злосным элементам пасабляў? Ды ён нават тым, на што права меў, ніколі не пакарыстаўся. Сам не пакарыстаўся і мне не даў. А то ты гэтага не бачыў! — смяецца маці.

Яна с м я е ц ц а!

— Бачыў. Але ж сёння не чалавеку вераць, а паперы. А на паперы чорным па белым напісана: вораг народа. Так і памёр твой Стась ворагам народа. Таму ім

і адпаведныя органы цікавіліся. Мной нябось не зацікавяцца...

— Ты! Ты! — улятаю я ў пакой, не помнячы сябе: гэта ж пра бацьку яны! гэта ж з бацькі смяюцца! — Ты і мізінца бацькавага не варты... Вы абое! Ён чэсны быў. Ён, а не ты, суддзёй быў: суддзі не бываюць такімі гнуснымі!

— Лёкса! — кідаецца да мяне маці, пагражальна ўскінуўшы руку. Але мне ўсё роўна: няхай стукне! няхай б'е! — я ўсё адно скажу, усё адно скажу ёй — ім! Слёзы, злосныя слёзы нянавісці і бяссілля цякуць па твары — няхай цякуць! Я скажу...

— Людзі не павінны быць такімі гнуснымі! У іх жа не толькі рукі, ногі, твар... У іх жа сэрца ў грудзях, у іх жа дабрыня і любоў у сэрцы! Тата такім быў, а не ты! не вы, абое!

— Змоўкні, Лёкса!

— І не падумаю! — крычу, не паварочваючы галавы ў яе бок: чаму ж, замахнуўшыся, не стукнула, чаго чакае? — Прывесці ў дом, які бацька будаваў для бабулі, гэтага... гэтага таўстапузага... магла толькі сляпая, асляпленая самой сабою жанчына!

Запінаюся — і ўсё ж дагаворваю. Сцінаюся, чакаючы ўдару. Але матка за спіной не зварухнулася — маўчыць, не абзываецца. Хапае ротам паветра і Шатэрнік, не могучы выгаварыць, вымавіць штосьці няўцямна злоснае, — толькі круглыя вочы яго яшчэ больш пакруглелі, наліліся вадзяністай чырванню і зацята, злосна ўпіраюцца ў мой позірк.

— Бацька быў добры, не роўня табе! — крычу ў гэты ненавісны твар, у гэтыя круглыя вочы. — Такі добры, што гэткую гадзюку ў сваёй хаце не задушыў, не растаптаў у час!

Матку я не бачу — Шатэрніка як токам працяла: затузаўся ўвесь, мармытнуў штосьці праз зубы, ступіў да мяне. Калі яго рука, на міг толькі апярэджваючы шапялявае, з прысвістам: «Прэч адсюль!», учапілася ў маё плячо, каб падштурхнуць, выпіхнуць з пакоя, я, вырываючыся і перамагаючы раптоўную гідлівасць, упіваюся ў гэту чырвоную, пульхную руку зубамі. І яшчэ заўважаю, як другая, гэткая ж чырвоная і пульхная набліжаецца...

— Адпусці дзяўчынку.

Словы прагучалі так ціха, што я падумала спачатку:

здалося. Але чырвоная, ліпкая ад поту рука, ужо крануўшыся маіго вуха, нечакана адхінаецца — ніхто мяне не трымае. Не разумею, чаму мяне б'е калатун і я ніяк не магу сцяцца ў камячок, змагчы яго. Гэта ж бабуля ўвайшла ў пакой. Цяпер жа ўсё ясна: словы прагучалі. І гэта бабуля стаіць у парозе. І гэта яна толькі што сказала: «Адпусці дзяўчынку», і пульхная, ліпкая ад поту рука Шатэрніка адразу абвяла, адхінулася.

— Пойдзем, Ляксандра, — па-ранейшаму спакойна, не павышаючы голасу, кажа бабуля.

І я ступаю колькі крокаў у той бок, адкуль прагучаў голас. І, мокрай ад слёз шчакой адчуўшы дотык бабулінай шурпатай далоні, азіраюся. Спадылба зіркаю на матку — на іх абаіх: Шатэрнік, хаваючы за спіну рукі, бязгучна жвакае ротам паветра, матка, прыстылая да падлогі, не адводзіць ад яго твару, ад яго налітых вадзяністай чырванню вачэй спалоханага, нерухомага позірку...

— Добры дзень, Аляксандра Станіславаўна. Я не спазнілася, я была...

— Да, да, Зоя. Я ведаю, — адказваю кіўком галавы на вітанне сакратаркі. — Зайдзеце да мяне, мы падрыхтуем колькі спраў да перадачы.

— Вы...

— У мяне адпачынак. З заўтрашняга дня, — апярэджваю я Зоіна пытанне і праходжу ў кабінет.

Не абмінаючы стол — не дайшоўшы да свайго месца за сталом, цяжка апускаюся ў крэсла. Абводжу позіркам пакой, праводжу далонню па цёмнай паліраванай паверхні стала. Раз і другі. Быццам чакаю каго: вось зараз зойдзе ён, сядзе ў крэсла насупраць, і я буду доўга-доўга маўчаць, адпачываючы ад сваіх балючых думак, млява разгладжваючы позіркам кожную зморшчынку на родным твары, кожную хмурынку...

Злёгку ўздрыгваю на рэзкі, як заўсёды сярод цішыні, тэлефонны званок (шкада, не папярэдзіла Зою з паўгадзіны ні з кім мяне не злучаць), цягнуся рукой да апарата, маруджу яшчэ нейкі момант і пасля новага званка ўсё ж здымаю трубку.

— Слухаю.

— Добры дзень, Лё... Аляксандра Станіславаўна. Гэта Чарнуш з ва... з табой гаворыць, — чую праз лёг-

кае пашчоўванне ў трубцы (відаць, з тэлефоннай будкі гаворыць) і чамусьці не здзіўляюся таму, што звоніць Юзік Чарнуш, што нават на кароткае імгненне не зачапіла думка пра тое, як дазнаўся ён нумар патрэбнага тэлефона. Так, мільганула думка і згінула.

— Я слухаю, Юзік.

— Прабач, што нечакана турбую. Мне здалося, што табе гэта будзе не проста цікава, што табе гэта спатрэбіцца. Алё! Ты чуеш, Лёкса?

— Я слухаю, Юзік, — абзываюся.

— Справа ў тым, што прыехаў малодшы Радзінскі.

— Хто прыехаў? — не разумею.

— Мікалай. Мікалай Радзінскі, Шатэрнікаў сын. Нейкім чынам твой брат, Лёкса.

Незадаволена хмыкаю ў душы на гэтае яго «твой брат» (яшчэ адзін брацік!), але не перапыняю Юзіка.

— Ён прыехаў па выкліку: ты ж ведаеш, што Шатэрнік калісьці ў свой час хацеў нават перавесці Мікалая на сваё прозвішча — у яго ж толькі дзве дачкі было. Хацеў, ды Мікалай сам, хлапчук тады яшчэ, не пагадзіўся. Але па выкліку Тамары Шатэрнікавай (ты павінна яе помніць: даўгалыгая такая нязграба!) усё ж прыехаў. Быў і ў Рудзенску. Я гаманіў з ім. Ён у Мінску, у гасцініцы «Беларусь» спыніўся. Ты б пагаварыла з ім, Лёкса!

— Пра што?

Юзік не адказвае. Разгубіўся, напэўна, на гэта маё абыякава-спакойнае: «Пра што?» А чаму тут здзіўляцца? Я — мы ўсе! — ніколі не прызнавалі Мікалая за брата: непрыязнасць, дзіцячая нянавісць да мацi перайшлі на хлопца, і той гэта адчуў — адчуваў змалку. Бач ты, заслуга! — прозвішча не памяняў. А якое ў яго права на гэта прозвішча?

Адчуваю, што думкі збудзілі ў душы даўнюю, бяздумна-жорсткую злосць: гэты новаяўлены Мікалай — адно горкі напамін пра скалечаную, разбураную сям'ю!

— Мне няма пра што з ім гаварыць, Юзік, — злосна прамаўляю ў трубку. — Пра што? Пра Шатэрніка? Пра Яна, якога ён практычна не ведаў? Пра сябе?

— Гэта ты павінна ведаць, Лёкса. Я хацеў як лепей.

Хачу з'едліва падзякаваць за турботу — спыняе гучнае, манатоннае: пі-пі-пі... Адстаўляю, здзіўленая, трубку, пазіраю на яе: як? Юзік павесіў трубку? Сам аба-

рваў размову? Ці мо проста перарвалася сувязь, не спрацаваў тэлефон-аўтамат?

Нейкую хвіліну, паклаўшы трубку, яшчэ чакаю, што Юзік перазвоніць, хоць ведаю, адчуваю, што чакаю марна. Ат, чорт! Аднекуль жа кожны раз з'яўляецца гэта пагарда, калі гаворка ўсчынаецца пра сям'ю! — з'явіцца, збудзіць душэўны пратэст, зблытае думкі, зробіць жорсткімі словы. Юзік немаведама што пра мяне думае...

«Не сэрца хворае, душа хворая ў вас, мілейшая Аляксандра Станіславаўна!» — думаю пра сябе словамі Рыгора Цітавіча. Горка думаю — нават у роце горыч з'яўляецца, быццам балючыя, нявымаўленыя ўголас словы загарчылі.

Павольна падымаюся, абедзвюма рукамі праводжу па гладка зачасаных і сабраных на патыліцы ў невялікі вузел валасах, азіраюся на дзверы. І рашуча кіруюся да свайго крэсла; на стале чакаюць раскладзеныя з раніцы паперы.

## XI

Цішыня пакояў, у якіх захоўваюцца архівы, асаблівая. Пах дрэва, пах старой, зляжалай паперы, ледзь улоўны пах пылу, няўлоўны шолах, які, здаецца, тоіцца ў самой гэтай нерухомасці, некранутасці, спалучаючыся, зліваючыся, і становяцца цішынёй — паветрам, якое ўдыхаю. Асцярожна ўдыхаю, нібыта і ўзапраўду дыхаю паветрам мінулага, гэткім жа зляжалым, як і бясконцае мноства папер, папак, асобных і сшытых у кнігі.

— Шурачка, я знайшла.

Не хаваю нецярпення, ступаю насустрач Веры Якаўлеўне, невялічкай жанчыне, добра раздабрэлай, падобнай на шчытна абцягнуты шаўковай сукенкай ружовашчокі пузыр, з роўна падстрыжанымі і высока над ілбом забранымі грэбенем сівымі валасамі: яна мякка, нячутна перасыпае нагамі — як коціцца між шчыльна пастаўленых паліц. У руцэ ў яе — дзве тонкія, амаль бязважкія папкі, і я пазіраю не столькі на круглы, заўсёды ўсмешлівы твар яе, колькі на гэтыя папяровыя папкі, у якіх захоўваюцца ў архіве дакументы, звязаныя з суддзейскай дзейнасцю бацькі, даваеннай і пасляваеннай, і яго асабовая справа.

— Вось тут у крэсла сядайце, Шурачка, і пагартайце. Папер няшмат, за якія дзесяць — пятнаццаць хвілін управіцеся.

— Дзякуй, Вера Якаўлеўна, — адгукаюся больш па звычцы, яшчэ на хаду разгарнуўшы адну з пададзеных папак.

І вось ужо сяджу ля невялікага століка, пільна ўглядаюся ў даваенны здымак, знаходзячы і не знаходзячы ў твары на здымку свае рысы. Я, як і Ян, падобна на бацьку, які памёр маладзейшым за нас. Памёр... Здымак зроблены ў трыццаць восьмым... Пазіраю на яго так доўга, што на міг пачынае здавацца: гэта Ян, такі, якім ён прыехаў з Данецка ў Рудзенск. Вось толькі ў позірку бацькавым штосьці незнаёмае: апроч упэўненасці — яшчэ і насцярога. Ледзь заўважная. Ледзь адчувальная. І трывожнае пачуццё, узнікшы, ужо не пакідае мяне: адкуль у бацькі гэта прыхаваная насцярога? Ад неразумення таго, што чакала яго наперадзе? Ці наадварот — ад разумення?

Сціслая мова дакументаў нічога не тлумачыць. Год нараджэння, сацыяльнае паходжанне, адукацыя, воінскія ўзнагароды, сям'я... Марна я спрабую за словамі, напісанымі прыгожым яго почыркам — літары пераляіаюць адна да адной так імкліва, што хвасты ў самых хвастатых з іх, «у» і «д», нагадваюць ластаўчыныя хвасты, — убачыць штосьці яшчэ, штосьці неразгаданае. Анкета як анкета, з усімі патрэбнымі звесткамі і тлумачэннямі. Да анкеты прыкладзены характарыстыкі, акты праверак работы, даведкі аб праходжанні курсу перападрыхтоўкі народных суддзяў у Мінску. У трыццаць дзевятым накіраваны ў Заходнюю Беларусь, у час вайны змагаўся ў атрадзе імя Варашылава, з сорак чацвёртага па сорак дзевяты — народны суддзя ў Рудзенску. Апошнія паперы: бацькава тэлеграма ў Мінск, што з-за хваробы не можа працягваць вучобу, і загад аб адлічэнні яго са складу групы, якая займаецца на шасцімесячных юрыдычных курсах. І ўсё. І нічога больш. І — ніводнай згадкі пра змяшчэнне або перамяшчэнне бацькі. Марна я спрабую зразумець больш таго, што прачытала і магу зноў перачытаць.

— Колькі можна перачытваць адно і тое ж пісьмо? — нецярпліва адмахваюся ад Лёны. — Я яго ўжо на памяць ведаю.

— На памяць? Ты скажаш! — недаверліва і ўсё ж з захапленнем пазірае яна на мяне: сама ж толькі-толькі чытаць не запінаючыся навучылася.

— Не верыш? Сачы па лістку.

Я адсоўваю падручнік па рускай мове, заплюшчваюся, прыгадваючы Янаў невыразны, расплывісты почырк, і пачынаю:

— «Мілыя сястрычкі! Як вы там жывяце-расцеце? Як вучыцеся? Напісаў бы: старайцеся, шчыруйце! — калі б не ведаў, што вы ў мяне і так старанныя. І я змог, нарэшце, выйсці ў перадавікі: норму сваю цяпер штодня перавыконваю. У шахце ж — ці ты вугальны пласт адолееш, ці ён цябе... Ды і ў жыцці гэтак: ці ты пераможца, ці жыццё. Вось і вучуся перамагаць.

Калі не возьмуць увесну ў армію, абавязкова забяру вас на канікулы да сябе. Шахту пакажу. Хоць не... Лёну ў шахту пускаць, канечне, рана: яна мышэй і пацукоў баіцца, а тут яны страчаюцца. Ну, ды пра гэта гаворку будзем весці, калі прыедзеце. Хутчэй расціце!»

— Як па пісаным! — не можа стрымаць захаплення Лёна. — І пра шахту, і пра мяне... Я нават сачыць не паспявала.

— Ведама ж, цяжкасць! — расплюшчваю я вочы і зноў бяруся за падручнік.

— Табе, канечне... — уздыхае тая, і мне робіцца яе шкада: малая ж яшчэ.

— І ты навучышся, — кажу. — Падрасцеш і ўсё-ўсё будзеш умець. Усё на свеце.

— Усё не буду, — расцягвае яна словы і, быццам згадаўшы што, пытае: — А куды бабуля збіраецца, Лёкса?

— Бабуля? Чаму ты ведаеш, што яна некуды збіраецца?

— Яна рэчы ў куфры перабірае.

— Ну і што? — абыякава абзываюся, хоць адчуваю, што ад нядобрага прадчування пачынае сцінацца ўсё ўнутры і дрыжыкі па спіне пабеглі.

— Дык яна ж не толькі перакладвае іх, а выбірае што якое і ў хатулёк складвае.

Я ўжо не слухаю. Падхопліваюся з табурэткі і кідаюся ў другі пакой, на другую палавіну хаты, дзе за шафай стаіць бабулін куфар: няўжо я, зачытаўшыся, прагледзела, як туды прайшла бабуля?

Гучна бразгаюць за спіной дзверы, раз і другі, бо за мной шчэміцца і Лёна. А бабуля — яна стаіць, прываліўшыся бокам да высокай з палічкамі спінкі канапы, — як не чуе. Нават не зварухнулася. І калі я, адолеўшы некачанае здранцвенне, ступаю ад парога, ашчапервую яе сухенькае цела абедзвюма рукамі, яна толькі апускае на мяне позірк, поўны ціхіх, балючых слёз.

— Ба, ты чаго? Ты чаго? — тармашу я яе.

— Ба-бу-ля! — пачынае хныкаць, горнучыся да яе, і сястра.

Бабуля неяк спалохана, бы толькі зараз згледзела нас, зміргнула, і слёзы пераліліся цераз край і ціха паплылі, папаўзлі па яе маршчыністых шчоках. І так балюча пазіраюць на іх, што я, не могучы заплюшчыцца і не глядзець, тыцкаюся тварам у бабуліну кофту і адтуль, з мяккіх складак кофты, усё паўтараю, усё шапчу:

— Ба, ты чаго? А?

Мінае хвіліна, другая. А мы так і стаім усе ўтрох, шчытна прыгарнуўшыся адна да аднае, адчуваючы, што гэта хвіліны расстання, незразумелага, непатрэбнага, несправядлівага. Бо якая ж справядлівасць у тым, што расстацца павінны мы — мы і бабуля, калі мы любім яе і ведаем, што яна любіць нас?

— Дзеці, — пяшчотна адхінае, адрывае нас ад сябе яна. — Не асуджайце мяне стражэй, чым я сама сябе асуджаю. Няма ў мяне сілы пазіраць на ўсё, жыць, як я жыву, у гневе, пры думках пакутных. Шкадую вас, дужа шкадую: на маіх жа руках вы выраслі! — ды моцы больш няма трываць. Вочы мае не глядзяць...

— Ты з-за маткі, ба? З-за таго, што з пузам яна ходзіць?

Яна зірнула на мяне з нямым папрокам — паглядам яго выказала — і адказваць не стала: словы мае, відаць, грубаватымі здаліся. А якія ж яны грубыя: сказала ж не тое што праўду — праўду, якую ведаюць усе. Усе ў пасёлку. І мы з Лёнай.

— Быў бы тата жывы...

— Ляксандра, ты старэйшая. Табе я кажу. Не давай разрасціся злосці ў душы: агонь адмсціцца, як яго ўкеліш... Шукай і знайдзі ў сабе не злосць, а разуменне. Разуменнем усё перабудзеш. Разуменне дасць табе сілу любіць.

— Лю-біць?! Каго? Што ты гаворыш, бабуля? Ты ведаеш, як называюць у пасёлку матку? Ды ўсе толькі і

гавораць пра нас, па вуліцы не праісці! — праз сілу ўтрымваю я на языку іншыя, больш жорсткія і балючыя словы.

— Вось і цябе не змагла я ўсцерагчы, Ляксандра, — душу тваю змякчыць, і Алену не падгадавала... Маці не выбіраюць, дзеткі. Але яна — ваша маці, помніце гэта. І асуджаючы, трэба любіць чалавека. Анягож?

— Вазьмі нас з сабой, бабуля! Мы будзем слухацца, праўда, Лёна?

— Мы будзем слухацца, — шморгае ўжо носам тая.

— Няма як мне вас узяць. Няма куды. Я ж у дом састарэлых еду. Прыют такі для старых і інвалідаў. Месца далі, па маёй просьбе, сэрца маё пашкадавалі. Няма як мне з вамі туды.

Яна прамаўляе гэта так ціха, такім згаслым голасам, што сэрца ў мяне болем заходзіцца: я ўжо не пра сябе, не пра нас з Лёнай думаю, а пра бабулю, пра невядомы прыют той, куды збіраюць старых, пакінутых, нямоглых... Бабуля ж наша не нямоглая!

— Ты з-за іх... Ты з-за маткі! — усхліпваю зусім як Лёна, хоць мне, не раўняючы, ужо адзінаццаты год і хлюпаць носам нібыта і не выпадае: не малая ж. — А мы, ба? Як мы без цябе?

Бабуля горне мяне, нас абедзвюх, да сябе, гладзіць па валасах — штосьці нячутна прыгаворвае і гладзіць, гладзіць па валасах. Мінае хвіліна, другая. А мы так і стаім усе ўтрох, шчытна прыхінуўшыся адна да аднае, не хаваючы гора, не хаваючы слёз...

— Вы плачаце, Шурачка? — спалохана ўскідваецца са свайго месца Вера Якаўлеўна. — Я спадзяюся: нічога сур'ёзнага не здарылася? Я спадзяюся...

— Не, не! Прабачце, Вера Якаўлеўна. Парушынка трапіла ў вока — і ўвесь клопат! Неасцярожна абышлася з ёю — адразу слёзы аднекуль узяліся.

— Тут у мяне люстэрка. Хадзіце сюды, Шурачка! — мітусіцца яна, зіркаючы на мой размыты згадкай твар не адно са спагадай, як мне, здаецца, а і з недаверам. — Я і сама паглядзела б, ды маімі пальцамі не дужа зграбнымі... У вас гэта лепей атрымаецца, Шурачка!

Папікаю сябе ў душы за тое, што спакваля страчваю ўменне стрымлівацца, трымаць сваё ў сабе: пачынаю ўспамінаць былое і на сябе сённяшнюю забываюся — і хто я, і што я, і дзе я. Быццам напраўду вяртаюся ў

гады маленства. Быццам сцяна гадоў робіцца празрыстай, а то і зусім знікае, агаляючы мае балючыя думкі, — і кожны раз любы можа ўсміхнуцца: «У вас гэта лепей атрымаецца!»

— З-за гэткай дробязі вас непакою, Вера Якаўлеўна. Вы ўжо прабачце, калі ласка.

— Што вы, што вы, Шурачка!

— Вазьміце, калі ласка, дакументы на століку. Мне і трэба было ўсяго — зверыць адну дату. Зверыла. Дзякуй.

Дзякую шчыра. Хоць нічога новага для сябе не вычытала. Ці, можа, і ўдзячна таму, што нічога новага не вычытала і не тое што паспакайнела — зняла яшчэ адно пытанне, крышачку адсунула трывогу. Недалёка, ненадоўга адсунула, і ўсё ж... Цікава, што сказала б, ці падумала Вера Якаўлеўна, ведай яна пра маю трывогу!

— Дзякуй, Вера Якаўлеўна! — яшчэ раз дзякую ад парога, павярнуўшыся да жанчыны, міжволі ўсміхнуўшыся (яна як кацілася з праходу між паліц!), і ціха прычыняю за сабой дзверы.

Што ж, нічога не здарылася, апроч таго, што здарылася. Лёс — няхай гэта і катэгорыя метафізікі — ёсць лёс. Мо б і патаргавалася з ім, ведай я, як да яго падступіцца. Ды не! Павярнуўся спіной — і быццам цэлы свет адвярнуў. Нават у звычайным звычайнае не пазнаю. Нават сярод знаёмых, блізкіх мне людзей — чужая. Перад адной бабуляй — была б яна жывая! — і выплакалася... Уткнулася б у яе калені, як маленькая, і плакала, плакала! Ад бяссілля. Ад болю, які вяртае згадкі. Ад таго, што не зрастаецца, а расце, глыбее балючы злом у душы. Бабуля зразумела б. Яна знайшла б тыя мудрыя словы, што змірылі б мяне з сабой і з прысудам, які вынесла мне жыццё. Яна знайшла б. Калі і была на зямлі хоць адна святая, то гэта яна, бабуля. Толькі побач з ёй цішэла мая нязгода, толькі любоў да яе вынішчала ўва мне атрутныя парасткі нянавісці...

— Вадзім... Пятровіч? — натыкаюся, падымаючы позірк, на Звонава і тут жа спрабую схаваць разгубленасць. — Часам не перанеслі ваша міністэрства бліжэй да нашага, што мы на рагу, ля самых дзвярэй яго, пачынаем сустракацца?

— Не перанеслі, хоць і няскепска было б: усё адзін да аднаго прыглядваліся б больш пільна. Добры дзень, Лёкса.

— Добры, — не прыпыняюся я, і ён не марудзіць — ступае следам, лёгка падбіраючы адпаведныя маім крокі.

— Ты не рада, што надараюцца такія выпадковасці?

Паварочваю галаву, але не адказваю: недарэчнае, па ўсіх мерках, пытанне. Рада не рада... Не высвятляць жа гэта штодня!

— Бачу, што рада, — усміхаецца.

Я не ўсміхаюся на яго словы (хлапчук, дый годзе!), але пачынаю вальней дыхаць: унутранае напружанне спадае, адпускае знясіленую думкамі душу.

— Тлумачыцца ж проста. Званіў — сказалі: пайшла ў міністэрства, ужо не будзе, ужо ў адпачынку.

— З заўтрашняга дня.

— Перапрашаю, з заўтрашняга дня, — пацвярджае, злёгку кранаючыся рукой маёй рукі. — Дай, думаю, з гэтай нагоды прапаную Аляксандры Станіславаўне паабедаць за адным сталом са мной. Вось і прапаную! Як?

— Я не ведаю...

— Значыцца, прапанова прынята! Дзякуй, — зноў кранаецца ён маёй рукі і цішэй, з ледзь прыхаваным смуткам дадае: — Дзякуй, Лёкса. Мне так хацелася пабыць з табой гэту гадзіну.

Мякка абрываецца і ўсплывае, вырываючыся са свайго палону, сэрца — не знаходжу, чым адказаць на гэты смутак, на гэты Вадзімаў рух.

## XII

З цікавасцю аглядаю рэстаран: вітражы, гэткія своеасаблівыя вітражныя сценкі-перагародкі з металічных сцяблін і лісцяў і шкляных, з каляровага шкла, кветак і птушак, надаюць памяшканню святочнасць, святочную ўрачыстасць, і неяк немагчыма ўявіць, што і тут па вечарах поўна маладзят у джынсах і гэткія ж маладыя ў гэткіх жа падчэпленых на стракатых падцяжках джынсах хлопцы, трасучыся, трасучы ў рытм, які адбіваюць барабаны, галавою, крычаць у мікрафоны штосьці, накшталт «Мясоедовская улица моя...». Хоць, напэўна, крычаць, бо вунь жа, у кутку, крыху прыкрытая калонамі,

пустая зараз эстрада з цёмнымі, цёмна-бліскучымі скрынямі апаратуры.

— Не была тут раней? — заўважае маю цікавасць Вадзім. — Адзін з лепшых рэстаранаў у горадзе.

— Ведаеш, не хаджу ў рэстараны. Ні ў горшыя, ні ў лепшыя. Так што няма з чым параўноўваць. Ды і чым ён можа быць лепшы? Лепшае асвятленне? Лепшае афармленне? Лепшы выбар він? Усюды — той жа тлум, тыя ж пустыя, хмелем, як смугой, зацягнутыя вочы, тыя ж горы посуду і распітых бутэлек штовечар. Не люблю, як было напісана ў адным з прачытаных мной нядаўна пратаколаў, калі чалавек, хто б ён ні быў, становіцца быдлам.

— Не занадта строга, Лёкса? — задумліва абводзіць залу позіркам Вадзім.

— Ды якая гэта строгасць? Не люблю — гэта простая нязгода, а не пратэст. А тут бы пратэставаць, крычаць... Гэтулькі злачынстваў, гэтулькі паламаных лёсаў, Вадзім! Ведаеш, у мяне раней ніколі не было страху. Дапамагала ўпэўненасць, вера ў тое, што мы — і я! — зможам, адолеем зло ў чалавеку, што светлыня, духоўная сіла ў кожным невычарпальная і трэба толькі збудзіць, зрушыць яе словам. А зараз... Зараз мне часам робіцца страшна. І за слова, такое бездапаможнае, нават калі яго вызначае закон. І за самае светлае ў чалавеку — хоць бы і ў сабе! — якое так незаўважна і так уладна зацягвае якаясьці разбухлая за апошнія гады каламуць. Не ведаю, чым гэта выклікана, чым тлумачыцца.

— Не можам жа мы заплюшчыць вочы на тое, што робіцца ў свеце, Лёкса. Жыць адным днём — гэта не проста мяшчанскае жаданне: тады б з ім і змагацца было лягчэй! У гэтым жаданні — яшчэ і свядомае ці падсвядомае адчуванне кожным небяспекі, якая тоіцца ў любой, дакладней — за любой газетнай інфармацыяй. Амаль за любой...

— Я ўжо некалькі дзён не праглядвала газеты, — прамаўляю ўголас тое, што раптам прыйшло ў галаву.

— Гэта натуральна.

— Натуральна? — пратэстую, не хаваючы смутку. — Натуральна сваім асабістым адгароджвацца ад свету? Думаць, што твая бяда большая за ўсе беды на свеце і таму засланяе іх? Чакаць нейкай палёгкі для сябе, усё роўна, за які кошт? Не, гэта страх... Страх за сябе, Ва-

дзім, пра які я толькі што казала. Ён не адпускае гэтыя апошнія дні...

— Ты пра сваю работу?

— Я — пра сваю душу.

— Лёк-са! — з жартаўлівым папрокам перапыняе мяне Вадзім, прыўздымаючы над сталом рукі. — Гэта рукі хірурга, які дзесяць гадоў працуе на станцыі «Хуткай дапамогі». Загадай — і яны знойдуць і вынуць усё лішняе.

— Угу! — не даю яму дагаварыць. — Ужо ўявіла, як ты вымаеш з мяне душу і ўшываеш штосьці пластмасава-мёртвае.

— Ну, навошта ж пластмасава-мёртвае? Сваю душу аддам, не пашкадую. Як? Падыходзіць?

Не адказваю. Спрабую стрымаць, не даць захліснуць мяне якойсьці цёплай кісла-салодкай хвалі раптоўнай пяшчоты, што, дай я ёй волю, размые, змые месяцы ўзніклай было паміж мной і Вадзімам раўнавагі — адчужанасці, і зноў я буду жыць чаканнем, пакутным чаканнем тэлефоннага званка, кароткай сустрэчы, слова, усмешкі... Не, не! Я адмовіла ў гэтым праве і сабе, і яму, і не трэба адступацца, варушыць старое. Незабытае яшчэ не азначае не адпрэчанае. Апошнія нашы сустрэчы і размовы значаць роўна столькі, колькі значаць любыя сустрэчы і размовы паміж людзьмі.

Ён як чытае мае думкі, бо калі падымаю на яго позірк, то не бачу на твары Вадзіма і следу ўсмешкі, якая толькі што асвятляла яго. Сур'ёзны, злёгку журботны твар са слядамі стомленасці... Лашчу позіркам гэты твар, знаёмы да непрыкметнай зморшчынкі над правым, крыху вышэйшым брывом...

— Калі ласка. Усё, што прасілі. Грыбы, смажаныя ў смятанным соусе. Зялёныя салаты. Лангеты... Што-небудзь яшчэ?

— Мінеральнай, як ёсць. Пакуль будзе кава гатавацца, — дзякуе Вадзім зграбнага, абыякава ўважлівага афіцыянта, злёгку павярнуўшы да яго галаву.

— Адну бутэльку? Дзве? — пазірае той паверх яго галавы.

— Дзве... Піць дык піць.

Гэта Вадзім — ужо мне. Усміхаючыся. І лёгкімі, вытанчанымі рухамі беручы са стала відэлец і нож. Зусім, відаць, як свой інструмент, — мільгае параўнанне, і мне чамусьці не падабаецца гэта параўнанне. Суплю бровы

і не пазіраю больш на Звонава. І, не здзівіўшыся згадцы, прыгадваю, што з самай раніцы, пасля тых двух невялікіх кубачкаў кавы, якія глынула нашча, нічога не ела.

Хлеб прывозілі звычайна апаўдня, бліжэй да вечара. Усе гэта ведаюць, але ўжо з раніцы ля крамы таўчэцца народ, і жывая чарга то разбухае, калі сыходзяцца жанкі, каб падмяніць на якія паўгадзіны дзяцей, то зноў сцінаецца, калі, утрымліваючы якуюсьці нябачную і, як мне здаецца, непатрэбную лінію, застаёмся чакаць той яшчэ няблізкі час толькі мы, дзеці, і колькі старых. Трымае не столькі месца ў чарзе — хто згадвае пра гэта месца, калі прывозяць хлеб і Галена Восіпчыкава, дзябёлая, з пабітым воспай тварам і добрымі цялячымі вачамі прадаўшчыца, пускае ў магазін? — трымае страх, што хлеба не хопіць і ўся сям'я застанецца галоднай.

— Колькі дзён мінула, уга-а! А голад не адступае, палёгкі народу няма, — зноў забурчала сабе пад нос старая Антоля.

Звычайна я не зважаю на яе словы (вечна ж бурчыць нешта сабе пад нос), а тут, мо таму, што ўжо з паўгадзіны не магу прыдумаць што вартае, каб адагнаць дакуку, пачуўшы гэта яе: «палёгкі народу няма», пачынаю развакаць. Уголас. Каб Юзік уступіў у гаворку (а то набычыўся, раззлаваны маёй дражнілкай, і ўжо колькі часу сядзіць на зямлі, абхапіўшы рукамі калені). Каб разгаварыць яго і знайсці новую зачэпку для жарту: змаглася ж ужо маўчаць.

— Няйначай, Антоля і сябе народам лічыць. А народ — гэта штосьці вялікае. Аграмаднае. Як сама зямля. Праўда, Юзік?

— Народ і ёсць народ, — не падымае той вачэй.

— А калі прыгледзецца? — не адступаюся. — Калі блізка-блізка стаць? Пра каго гэта — народ?

— Пра ўсіх. Пра ўсіх разам, — цэдзіць праз зубы Юзік, сплюнуўшы ў пясок пражаваны, абсмактаны камячок цёмнай вішнёвай смолкі.

— Цябе паслухаць, дык і старая Антоля, што вечна бурчыць і суе нос у любую шчыліну, народ. І нямая Дуська Павучыха са станцыі, што ходзіць з жабрацкай торбай з вёскі ў вёску. І валацуга Пашка, якога нават сонца не можа разбудзіць пад Марусьчыным плотам.

І Маруська з вывадкам дзяцей немаведама ад каго. Усе — народ? Так?

— Ну, а куды ж іх? — недаўменна зіркае ён на мяне.

У мяне і ў самой з'явілася сумненне: не падзеліш жа людзей на — гэта народ, а гэта не народ... Але ж народ — штосьці вялікае, аграмаднае. Народ стагоддзямі цярпеў царскі прыгнёт. Народ вяршыў рэвалюцыю. Народ перамог у вайне з фашыстамі. А тут — нямая Павучыха, Маруська...

— Куды іх? — знарок перапытваю, хуценька перагортваючы ў памяці старонкі падручнікаў. — На задворкі эпохі. Вось куды.

— На чые задворкі? — улазіць у гаворку старая Антоля, не дачуўшы, відаць, што якое.

— Э-по-хі. Чулі пра такую?

— Чуць не чула, не раўняючы з вамі, вучонымі. Мудрэй за старых сталі, як жа! Хто ж вам, анціхрыстам, увядзе калі ў вушы — у душу! — што смяяцца з людзей — грэх? Вялікі грэх.

— А хто ж смяецца, баба Антоля? — нехаця падымаецца з пяску Юзік. — Вы спыталіся, вам адказалі. Правільна адказалі.

— Бач, памагач! Адка-за-лі... А вы ведаеце, што гэта з вайны Дуся нямая, што немцы яе катавалі, скуру палосамі спускаючы, — як толькі і выжыла? А вы ў Пашкі спыталіся пра яго жонку і двух сынкоў, якія пад бамбёжкай загінулі? А вы Марусін медаль, які ёй, дзяўчынцы тады, за падарваны мост далі, бачылі? Не? А туды ж, пра народ... Мудрэй за старых сталі, як жа!

Я счырванела ўся і ўсё спрабую адвярнуцца, схаваць вочы. Здаецца, усе, хто стаяць у чарзе, прыслухваюцца да Антоліных слоў і ківаюць галовамі: мудрэй за старых сталі, як жа! Быццам ужо і сказаць нічога няможна... Я ж не ў крыўду каму сказала, я ж не ведала...

— Хлеб вязуць! — перапыняе непрыемную гаворку Юзік радасным воклічам, і хоць усе адчуваюць, што яшчэ не час, што яшчэ з гадзіну трэба чакаць, пакуль прывязуць хлеб, але ціснуцца шчыльней да дзвярэй, выцягваючы шыі і спрабуючы ўгледзець з-за павароткі Ахрэмавага буланага каняку, падводу, пастаўленую на падводу самаробную драўляную скрыню, у якой возяць з пякарні хлеб.

— У-у, сараматнік! — зноў пачынае бурчаць старая, прыхінаючыся да сцяны. — Людзі злякаліся, а ён...

Але Юзік не слухае. Нават не азіраецца на яе голас. Стараючыся падкрэсліць сваю абыякавасць, ледзь чутна прапануе:

— Збегаю прынясу колькі яблыкаў з Антолінага саду?

— Не трэба! — адмаўляюся нечакана рэзка і, уздрыгнуўшы на свае рэзкія словы, цішэй дадаю: — Хутка і праўда хлеб будуць везці.

І вось ужо расце натоўп, і вось ужо чуваць няспешнае пацокванне капытоў. І вось ужо людзей пахіствае гарачы пах хлеба, свежаспечаных буханак, якія па драўляным жалабку, устаўленым у прыадчыненую дзверку акна, пасоўваюцца ў магазін, да спрытных Галеніных рук. Нядоўга стаяць хлебу ў магазіне на шырокіх дубовых паліцах — умомант расхапаюць яго, душачы адзін аднаго, людзі.

Кожны раз, задоўга да таго, як хлыне ў магазін натоўп і мне, заціснутай у натоўпе, абавязкова трэба далезці, дапяць да прылаўка, адчуваю, як да горла падступае горкая, даўкая млосць. Вось і зараз я змагаюся з млосцю, упіраючыся локцямі ў жывую людскую сцяну: нельга ж, каб мяне адцяснілі, адпіхнулі далёка ад дзвярэй — тады ўжо не прабіцца! І Юзіка побач няма: далей, бліжэй да дзвярэй прадзіраецца, дзе пад рукой чыёй, дзе паўз ногі чые... Я не магу гэтак. Здаецца, схілі я галаву, угніся — і зблажыць, не адно зялёнай слінай зблажыць, а і гэтым потным, ліпкім пакалыхваннем шчыльна сціснутых людскіх тулаваў, гэтым галодным, гарачым пахам хлеба, гэтым страхам быць выцесненай, выпхнутай з натоўпу. Не, не! Трэба трымацца. Трэба трываць. Недзе ж матка павінна была падысці, — будзе з-за спін, цераз натоўп Галене гукаць: «Тут я, Галена, і на мяне адпускай!»

Учора шмат каму хлеба не хапіла (прывезлі меней, ці што?) і сёння, відаць, падушацца ля прылаўка. Думаю пра гэта надзіва спакойна, хаця млосць не адступае, а ціснуць усё мацней з усіх бакоў. Думка не адступае, зноў і зноў даводзіць: падушацца. Мо таму, што ціснуць усё мацней, што натоўп затузаўся, скрануўся, пачаў шчаміцца ў дзверы, і я перастаю адчуваць сваё цела — не сваёй воляй, воляй натоўпу кратаюся з месца, тузаюся, шчамлюся ў вузкія дзверы магазіна.

— Не душыцеся! — узлятае над устрывожаным гулам дзесяткаў людзей Галенін крык. — Сёння ўсім хопіць хлеба!

Крык узлятае і падае, коцячыся па галовах, а людзі ўжо хлынулі ў магазін. І ва ўсіх — як у мяне, дык дакладна — адзін клопат, каб не збілі з ног, каб толькі не збілі — затопчуць!

Мяне ўносяць, уціскаюць у памяшканне, шпурляюць да драўлянага прылаўка: край прылаўка балюча ўразаецца недзе якраз пад грудзьмі — боль, узнікшы, не адпускае. Я цярплю, упіраюся што ёсць моцы ў прылавак рукамі, а рукі слабеюць, слабеюць...

— А-а-а!! — немым крыкам вырываецца з мяне боль.

— Лёк-са!

Мне здаецца, што крычыць матка, дзіка крычыць, і я спрабую сцяць рот, стрымаць боль, змагчы мігценне ярка-чырвоных плямін перад вачамі.

— Лёкса, я тут! Я зараз! Пусціце!

— Дзіця задушылі!

— Адхлыньце, ашалелі зусім...

Галасы зліваюцца, дзе чый не разабраць, але натоўп быццам сцяўся раптам, на колькі міліметраў, на ўздых адзін, адпусціў мяне. І вось ужо са мной побач маці з няўцямным, шалёным позіркам, вось ужо калыхаецца над раптоўнай цішынёй гнеўнае Антоліна:

— Бог ад нас, няйначай, адступіўся: людзі — няйначай, звяры. Дзяцей сваіх не шкадуем.

І вось ужо распараная гарачынёй і гневам Галена совае нам у рукі цёплыя буханкі хлеба, вось ужо расступаецца, выпускаючы нас, натоўп.

— А ў нас што, не дзеці? Учора без хлеба былі...

— Азвярэеш тут, як тры дні хлеба не пакаштуеш.

— Адной лебядой жывы не будзеш!

— Усё вайна, праклятая, адрыгаецца.

Здаецца, не з натоўпу я выбіраюся ўслед за маткай, а з гулу галасоў, і калі ступаю раптам за парог, на паветра, і ўпершыню глыбока ўздыхаю, — боль вяртаецца. Нечакана вяртаецца, перарваўшы дыханне і ўгінаючы, згінаючы мяне напалам. Хлеб выслізгвае з рук, падае на ўтаптаную нагамі, цвёрдую, як камень, зямлю, і я пужаюся, што ён знікне, згіне і мне зноў давядзецца шчаміцца ў магазін, да зашмальцаванага, гладкага прылаўка з вострым краем. Нязграбна, галавой уніз, ва-

люся на зямлю, хоць болю не адчуваю больш — нічога не адчуваю.

— Дачушка! Што ты, дачушка?

Спалоханая, расплюшчваю павекі і блізка-блізка бачу ўчарнелы матчын твар, яе вочы — два зялёныя азерцы пакуты і страху... Страху за мяне? — мільгае недаўменне, недаўменная думка, і я хачу прыўзняцца, устаць на ногі. Яе рукі дапамагаюць.

— Што ты, дачушка? Нічога не ела, мусіць... Пойдзем. Зараз устанеш, і пойдзем дамоў.

Я прымаю матчыну дапамогу, але позіркам шукаю хлеб, дзве цёплыя буханкі хлеба, што мы вынеслі з магазіна, і знаходжу іх не адразу. Хоць яны ляжаць зусім побач, за якога паўкроку, проста на зямлі, зліваючыся з зямлёй...

— Дагэтуль бачу дзве гэтыя буханкі хлеба. На зямлі. Колеру зямлі самой.

— Гора не забываецца.

— Гора? — падымаю на Вадзіма вочы, чамусьці не здзіўленая тым, што ён зразумеў, пра што я, быццам сапраўды толькі што расказвала яму ўсё, быццам не думала, а расказвала. — Не, гэта штосьці іншае. Большае.

— Штосьці большае, чым гора? Што?

— Што? Жыццё.

— Ну-у, Лёкса! — з усмешкай супіць бровы Вадзім, паклаўшы відэлец і адсунуўшы прыбор. — Ты зноў хочаш уцягнуць мяне ў філасофскую спрэчку. Я паеў, я магу выслухаць, канечне, але...

— Што выслухаць? — адсоўваю і я талерку. — Тое, аб чым я прамаўчу?

— Ты ніколі не маўчыш са мной, Лёкса. Ніколі. Толькі я марна ўслухваюся: ніводнай думкай ты не закранаеш мяне — мяне ў табе няма... І не было.

— Вадзім! — квола пратэстую я, не так супраць слоў пратэстую, як супраць смутку ў гэтых словах.

— Угу. Я ведаю, Лёкса. Я сам вінаваты, што не ўмею забываць, што не забываю.

— Забудзеш. Жыццё дужэйшае за нас, як казала некалі бабуля. Яно, жыццё, для нечага дадзенае кожнаму з нас, і дыктуе ўсё — і думкі, і рашэнні, і ўчынкі. І нікому нічога не тлумачыць. Гэта мы ўсё спрабуем растлумачыць. Сабе. І іншым. Пасля таго, як звароту назад няма.

— Куды назад, Лёкса? Там, у мінулым, — тое ж, што тут, сёння: я кахаю цябе.

— Такую сухую, уціснутую ў сухія догмы, жанчыну? Такую непрыгожую? — хачу звесці ўсё на жарт, не зважаючы на сур'ёзны, напружаны Вадзімаў твар.

— Гэта ты — непрыгожая? Ты — заціснутая ў сухія догмы? Ды я дасюль уначы, сярод ночы, прачынаюся, убачыўшы цябе ў сне на беразе Мінскага мора, асветленую, адагрэтую сонцам і маёй пяшчотай!

— Вадзім!

— Што — Вадзім? Ты і гэта апратэстуеш? — ледзь стрымлівае ён пацяжэлы свой голас. — Тады зірні праверй: з цябе ўжо добрых паўгадзіны малады афіцэр вачэй не зводзіць. Я нават нервавацца пачынаю. Што за манеры? Зірні, зірні!

— Яшчэ чаго! Я шкадую, што...

— Не трэба, Лёкса, не дагаворвай. Не зважай на мае словы, калі яны табе непрыемныя: я проста не ведаю, што казаць, што сказаць.

— Хіба абавязкова штосьці казаць?

Я шкадую, што пагадзілася прыйсці сюды з Вадзімам. Што не павінна слухаць яго, а слухаю, хачу слухаць — і пра сябе, і пра дні, асветленыя сонцам і... пяшчотай, і пра толькі што прыдуманага афіцэра. Невялікая радасць, а радасць. Адпусці я зараз гэту радасць — яна апусцілася б на плячо Вадзіма галубкай.

Пра галубку я дарэмна: так, чыёсьці пошлае параўнанне згадалася. А радасць — са мной, бо не-не і чую то салодкае казытанне ў горле, то цёплае пакалыханне паветра паміж сабой і Звонавым, адкуль ніяк не выберацца мой позірк. Дапамагчы Вадзім хоча — быць побач ці хоць бы непадалёку ўсе гэтыя дні. А мне боязна. І за сябе боязна. І за яго. Міне гэтая гадзіна — і радасць адхлыне. Застануцца балючы смутак і прысмак віны. Гэты вечны, горкі прысмак віны! За што? Перад кім? Перад Соняй? Але ж Соня — шчаслівая, а я...

А што — я? Я нават шчаслівейшая. Адчувала яшчэ змалку, яшчэ дзіцёнкам, што свет для мяне занадта малы, занадта цесны! Скрозь адчувала і хацела як-небудзь рассунуць яго межы, прымусіць іх рассунуцца. Хоць для мяне. Хоць для мяне адной. Можа, у гэтым памылка? Бо хіба не гнала мяне ўсё жыццё, з году ў год, прага вучыцца, працаваць, працаваць упарта, працаваць як змагацца? Усё жыццё я вучылася, па Янавым

вызначэнні, перамагаць. Перамагаць сябе, свой характар і абставіны. І — тупік?! Не, не. Яшчэ ёсць час. Яшчэ ёсць вера ў тое, што выйсце знойдзецца. Яшчэ ёсць Вадзім, і ён не адступаецца, ён...

Вадзім так напружана сочыць за чымсьці ці за кімсьці, што я бачу, як тоненька ўздрыгвае жылка ў яго на шыі. Што там? Музыкі з'явіліся? Паварочваю галаву — да нас, да нашага століка набліжаецца высокі малады афіцэр. Зграбны. Падцягнуты. Прыгожы... Дык яго не выдумаў Вадзім? Ён і ўзапраўду сядзеў непадалёку і цікаваў за намі?

— Аляксандра Станіславаўна? — ледзь чутна шчоўкае зведзенымі абцасамі афіцэр, спыняючыся за крок ад стала і кароткім прыгожым жэстам галавы вітаючыся перш са мной, а потым з Вадзімам.

Я яго ведаю! — кальнула мяне раптоўная думка, але я ад яе адмахваюся. Адкуль я магу яго ведаць? Спакойна аглядваю маладога чалавека, няспешна адводжу пагляд.

— Аляксандра Станіславаўна Радзінская, калі вам гэта пра што-небудзь гаворыць.

## XIII

Не сказала б, што дужа люблю вясну. Не. Мне заўсёды шкада снегу, яго чысцюткай белізны, яго марознага водару, яго крохкасці, якойсьці крохкай казачнасці. Колькі ўзораў, колькі зорак патрушчыш, зрабіўшы адзін-адзіны крок! Адзін крок, другі. Аднаго кагосьці крокі, другога... І вось ужо блытаныя, неразборлівыя ўзоры слядоў на снезе. А зачараваныя хараством дрэвы! А закутая ў лёд рачулка!

Не, зіму мне заўсёды шкада. Як ні мерзну ў сцюжу ў сваім лёгкім паліто, як ні абрыдне лямпа з самаробным абажурам за доўгія, бясконцыя зімовыя вечары, а ўсё праводжу яе са шкадаваннем. Нездарма ж нават нарадзілася зімой. Гэта мая пара года. Прывяжу лыжы — а то і без лыж, вышэй каленяў правальваючыся ў снег, — на Мацієўскую гару (граду пагоркаў вакол яе гэтак мы называем). І блукаю там, а то, знерухомеўшы, стаю зачараваная хараством наўколля. Хораша вакол. Ціха, чыста на душы. Ніводная крыўда не прыгадваецца, ніводнае чужое слова не крапае думак —

плывуць яны, лёгкія, свабодныя, плывуць, рассоўваючы, адсоўваючы далягляд, абяцаючы ўсё, чаго я жадаю. Усё, і нават крышачку больш. Бо дадае ж кожны перабыты дзень штосьці да таго, пра што марыцца. Несумненна, дадае. Нават калі нічога не здарыцца — здарыцца цэлы дзень жыцця.

— Лёкса, куды ты ўвесь час узіраешся? Пра што думаеш? — нецярпліва тузае мяне за рукаў Юзік. — Індык думаў-думаў...

— Індык — якраз той, хто не думае, — агрызаюся. — Надзьмецца, распушыць пер'е і праходжваецца на вачах у цікаўных, увесь важны, увесь наліты шыпеннем. А пужані яго — куды і форс дзенецца!

— Гэта ж прымаўка такая.

— І прымаўкі трэба да месца ўжываць, — не даю яму бараніцца. — А то зашмат індыкоў развялося.

— Ты што, Лёкса! Ты пра мяне? — крыўдзіцца.

— Цьфу! Я яму — пра індыкоў, а ён — пра сябе. Індык мне знайшоўся! Спачатку што якое з апярэння гэтага прыдбай ды пуза, як у Шатэрніка, адгадуй.

— Кінь ты пра гэтага Шатэрніка! Сто разоў на дзень памінаеш, — буркае Юзік. — Мы ж хацелі на крыгах паплаваць.

— Ну, дык пайшлі. Чаго ты топчашся ўкруг мяне?

Кажу і першаю ступаю са шляху на снежны цалік. Снег, канечне, ужо не ранейшы, не зімовы, падтаў, асеў, пачарнеў, але ступаць па ім прыемна. Буркі правальваюцца неглыбока (адно трэба сачыць, каб галёшы не згубіліся), снег парыпвае, сляды ззаду заплываюць вільгаццю і таму цёмныя, выразныя, як адціснутыя на мяккай паперы. Можна было б і сцежкай пайсці — уздоўж крайніх гародаў, да самага мастка, а там павярнуць, збочыўшы, да рачулкі, але сцежкай любы пройдзе. Я ж сябе да любых не аднашу ды і Юзіка, хоць і радзей, таксама. Нам зручней там, дзе мы самі шлях выбіраем, дзе я выбіраю.

— Ты ненавідзіш Шатэрніка?

Пытанне такое нечаканае, такое не Юзікава...

Мо пачулася? Паварочваюся ўсім тулавам, запытальна пазіраю на сябрука: мо мне здалося, што ён пытаўся пра Шатэрніка?

— Ты так моцна ненавідзіш яго? — зацята паўтарае ён.

— Каго? Шатэрніка? Яшчэ чаго! На чорта ён мне

здаўся, гэты таўстапузы? Работы ў мяне другой няма, ці што?

— Не гэткі ён ужо і таўстапузы.

Я нямею. Абурэнне сябрам, яго словамі, гнеўнае і нястрымнае, адняло мову. Лыпаю вачамі, жвакаю ротам штосьці няўцямнае — і каб слова з губ! Не гэткі таўстапузы?! Не гэткі...

— Не гэткі ён і таўстапузы, — як здзекуецца Юзік, паўтараючы толькі што сказанае. — За нешта ж яго ўпадабала твая матка.

— Ма... матка? — пракаўтнула, глынула я, нарэшце, гаркоту, якая заляпіла была рот, не даючы выліцца майму абурэнню. — Ды яна... Ды яе людзі сучкай бясхвостай называюць! Ды з-за яе ўвесь сорам, і бабуля...

Раблю невялікую паўзу. Каб стрымаць, не даць пырснуць балючым слязам — гэтага Юзік ад мяне не дачакаецца! — і набраць, на поўныя грудзі ўдыхнуць паветра. Гэткай кароткай паўзы хапае, каб заўважыць спалоханы, перакошаны болем твар сябрука і, заўважыўшы, адвярнуцца.

— Не Шатэрніка я ненавіджу, а матку... За Шатэрніка, — сплёўваю я горкія словы пад ногі і, пераступіўшы іх, насупленая, зніякавелая, крочу прэч, у бок рачулкі.

Юзік, перачакаўшы нейкі момант, ступае следам. Я чую яго незадаволенае пасопванне і цяжкія, знарок цяжкія крокі. І злуюся. На яго. І на сябе. Шатэрнік, Шатэрнік! Куды ні ступі — усё аб гэта імя спатыкнешся. Ледзь не пасварыліся з Юзікам, а з-за чаго? З-за таго, што жыццё такое, якое ёсць? Што я ніяк не магу вырасці і пайсці, з'ехаць з дому, каб знайсці сябе ў іншым жыцці? Пасопвае, снег нагамі разграбае... А чаго палез са сваім дурацкім пытаннем? Чаго, запытацца? Ідзём жа на крыгах катацца. Вунь ужо сёй-той катаецца!

Паварочваю крыху правей, туды, дзе калупаюцца з нечым на беразе хлопцы. Трое. Адзін — Пеця Восіпчыкаў. Адсюль відаць. Каго-каго, а яго ні з кім не зблытаеш — даўгалыгі і плоскі, як дошка, — што ў паліто, што без паліто.

— Дзевак не прымаем, — піскнуў з-за Восіпчыкавай спіны Стасік з шостага «б», па мянушцы — Мурзік.

— Я табе што, дзеўка? Прыхлопну, як камара, калі пішчаць будзеш, — адказваю, нават не зірнуўшы ў яго бок. — Мы з імі ці самі сабе плот выберам?

Гэта я — да Юзіка, які, валочачы па снезе ногі, па-

дыходзіць да берага. Але адказвае не Юзік, а Восіпчык:

— Слухай ты Мурзіка! Мы ж ужо амаль расчысцілі фарватэр, Лёкса. І шост запасны маецца. Якраз збіраліся на крыгу пераходзіць.

— Доўга збіраецеся, — саскокваю я на тую крыгу, што бліжэй да берага, і калі яна здрыганулася, нахіляючыся, тонучы адным канцом у ледзяной вадзе, адчуваю, як салодка сцялася сэрца.

Ступаю бліжэй да сярэдзіны — плот выраўніваецца, сэрца супакойваецца.

— Кідай шост, — камандую. — Я падам крыгу да самага берага.

Пакуль усе, апроч Мурзіка, размяшчаюцца на крыгах, балансіруючы і перакідваючыся словамі, аглядаю затоку. Крыгаход яшчэ не пачаўся, хоць лёд на рачулцы і патрэскаўся, і хлопцы, відаць, нямала пашчыравалі, каб абламаць лёд па краях затокі і расчысціць дзесятак метраў, каб крыгі маглі плаваць у затоцы, як у возеры, сутыкаючыся адна з адной і натужна парыпваючы. Крыгі не сказаць каб тоўстыя, але ўстойлівыя, не абломваюцца нават па краях, і калі не падступаць занадта блізка да краю, небяспекі амаль ніякай. Трэба быць Мурзікам, каб баяцца ступіць на крыгу. Ну, ды што з яго возьмеш!

Чыстай ад лёду вады малавата, крыгі раз-пораз сутыкаюцца, і трэба добра папрацаваць шостам, каб адпіхнуцца, адплысці. А калі шырэйшымі краямі счэпяцца дзве крыгі, то і шост не вельмі дапамагае. Як зараз. Юзікаў плот зашчаміла між Восіпчыкавым і маім, і марныя ўсе намаганні. Мо пасунуцца бліжэй да краю, каб крыга злёгку пахілілася і зачэрпнула вады?

— Лёкса, а на каго ты матчынага байструка пакінула? — зноў задзіраючыся, крычыць Мурзік, і хтосьці з хлопцаў заціскае далонню хуткі смяшок.

— Што?! — паварочваюся я, ужо зрабіўшы крок. — Ды я з цябе кішкі...

Ні дагаварыць, ні ўсвядоміць, што здарылася, не паспяваю. Крыгі сыходзяцца над галавой, і я захлынаюся пякучым холадам, халодным змрокам і жахам. Змрок на імгненне радзее, і я ліхаманкава чапляюся за краёк цьмянага святла, чапляюся, ужо захлынаючыся, з жахам — самім нутром! — усведамляючы, што гэта канец, канец усяму.

Жах хутка знікае. Усё знікае, апроч адчування пякучага холаду. А рукі шкрабуцца па лёдзе — і вось ужо, кімсьці падхопленая зверху, хапаю ротам паветра, вось ўжо ўпіваю пазногці ў пададзены шост і павольна ўспаўзаю жыватом на крыгу, вось ужо, усцягнутая на крыгу, бачу перапужаных хлопцаў, якія — ланцужком, счапіўшы рукі і ўпіраючыся самым доўгім шостам у дно затокі, — утварылі лёдавую сцежку да берага, па звязаных рукамі, іх намаганнямі крыгах.

— Смялей, Лёкса! Ступай! Мы счапілі крыгі, — падбадзёрвае мяне Юзік, і голас яго дрыжыць.

Холад скоўвае мяне (вады, мусіць, не паспела наглытацца), але я, перамагаючы здранцвеласць і страх, ступаю крок, другі, трэці... І ўжо на беразе адчуваю, як б'е мяне калатун.

— Хутчэй! Бягом, Лёкса! Давай руку, — тузае мяне Юзік.

І я паслухмяна іду, бягу, за ім у накірунку пасёлка, бягу ўсё хутчэй і хутчэй, ледзь паспяваючы за ім. Апратка задубянела, перашкаджае, але з рухам вяртаецца жыццё, абуджваецца няўцямная яшчэ радасць: жывая! не захлынулася!

— Можа, да нас? — крычыць Юзік, перасільваючы, стрымліваючы разгарачанае хуткім бегам дыханне.

— Не... Дамоў...

Трэба ж скінуць усё, пасушыцца — не ў чужых жа людзей гэта рабіць! Дома — Лёна, з малым сядзіць. Яна дапаможа і шкіпінарам натрэ. Юзік — малайчына, ён усё разумее. Мо каб не ён...

Думаць цяжка. Гэтак, як і дыхаць. Але мы ўжо ўбеглі ў пасёлак. Зараз пераскочым шашу і па Пралетарскай, праз дзесятак хат, будзе наш двор. Восіпчыкава хата, Міхайліхі, Шумілiных...

— Дзя... дзякуй, Ю-юзік... — з цяжкасцю прамаўляю я: зуб на зуб не трапляе.

— Ты на печ адразу! — адпускае ён маю руку і ўзмоклы, распараны, спыняецца на правулку, дыхаючы гэтак жа цяжка, як і я.

Я не азіраюся. Я потым усё яму скажу! — мне нельга прыпыняцца, мне трэба дамоў, мне холадна. Лёна спалохаецца, канечне, але ўсё зробіць, як загадаю. Давядзецца прыдумаць што-небудзь, вартае моманту. Больш для маці, чым для Лёны, якая і так прыпіша

гэты выпадак да іншых маіх геройстваў. Геройства! На Мурзіка, на піск ягоны павярнулася!

Бразгае клямка, бразгаюць за спіной, зачыняючыся, вырваўшы мяне з холаду, дзверы.

— Гэта ты, Лёкса? — гукае з другога пакоя Лёна.

Я не адказваю. Стрымліваючы клацанне зубоў, пачынаю сцягваць з плячэй цяжкое, задубелае зверху паліто.

— Бо... божа! — усоўвае галаву ў дзверы, усплёсквае рукамі сястра, нагадаўшы гэтым жэстам матку. — Хто цябе гэтак абліў?

Я не адказваю і на гэта: чаго, запытацца, лезці са сваім «хто цябе...» у гэткі момант? Лепш бы дапамагла, бо сама я з рукавоў да маркоўчыных загавін не выцераблюся. Бач, утаропілася! — а тут слова ў роце не сабраць...

— Давай я сцягну! — кідаецца тая нарэшце да мяне, быццам пачуўшы, адчуўшы маю злосць, маё злоснае бяссілле. — Табе на печ трэба, Лёкса! Я зараз!

Цяжка падае на падлогу паліто, потым пададзетая пад яго камізэлька. Сапучы ад натугі, здзіраем з ног мокрыя, як квачы, буркі (дзіўна, што нават галёшы на месцы, не саслізгнулі ў ваду). Далей пайшло лягчэй, і Лёна бяжыць да шафы, па ручнік, мітусіцца ў пошуку шкіпінару (ніхто ім, апроч маткі, не карыстаецца), нецярпліва совае мне ўсё ў рукі.

— На печ! Лезь на печ! — просіць. — Я толькі раскладу, развешу неяк апратку і буду дапамагаць табе расціраецца. Шкіпінар ванючы, але ён дапамагае. Мама ім нават Міколку нанач расцірае. Калі ён пачынае кашляць.

— З... змо... змоўкні... — вырываецца ў мяне няўцямна-злоснае. І Лёна спалохана адступае, змаўкае.

Паскідаўшы з сябе ўсё, што на мне было, — набраклая холадам і вадой груда апраткі застаецца на падлозе і табурэтцы, — лезу на печ. Ссоўваю ўбок пасцілку, прыпадаю голым, дрогкім цельцам да гарачых цаглін і не магу стрымаць глухі, амаль жывёльны нейкі стогн.

— Ты што, Лёкса?

Вокліч павісае ў цішыні, і я чую яго чыста знешне, чыста гукава, не дабіраючыся да сэнсу. Усім целам, усёй істотай услухваюся я ў цяпло, што пачынае пакалваць цела, пачынае расцякацца па ім, не саграваючы,

пакуль што толькі здымаючы напружанасць, якуюсьці здранцвеласць. Зубы па-ранейшаму клацаюць, адбіваюць непрыемны, агідны нават танец-калатун, дрыжыкі па-ранейшаму скаланаюць мяне раз-пораз, прыціскаючы да гарачых цаглін печы, але чую я і цяпло, маленькія астраўкі яго, якія кратаюцца, счапляюцца адзін з адным, расплываюцца, зусім як крыгі ў затоцы.

Згадка пра крыгі халодная, я адпіхваю яе, чапляюся рукамі за скручаную, ссунутую ў куток пасцілку. Балюча ўздрыгваю, пачуўшы на спіне ледзь чутны дотык далоні: Лёна са сваім шкіпінарам ушкраблася на печ. Што ж, няхай трэ, расцірае! Мне б толькі дрыжыкі суняць, калатун гэты змагчы — і тады да прастуды не дойдзе. Колькі я там была ў той ледзяной вадзе! — наглытацца не паспела.

У Лёны слабыя рукі: трэ, трэ, а я іх амаль не адчуваю. Праўда, астраўкі цяпла сталі рухацца хутчэй, клацанне зубоў пацішэла. Яшчэ хвіліна-другая — і салодкая млявасць пераможа холад, і можна будзе накінуць на плечы пасцілку або нават коўдру з ложка і адагрэцца. Адагрэцца па-сапраўднаму.

— Вы на крыгах каталіся ў затоцы, так? — здагадваецца і выгаворвае мне, карыстаючыся момантам, Лёна. — І хтосьці спіхнуў цябе ў ваду? Хто? За што?

Я і не думаю адказваць. Я ўслухваюся не ў словы, а ў рухі яе далоняў, якія раскочваюць, расціраюць па маім тулаве цяпло, хоць і пачынаю ў душы злаваць: усё ўсім скажы, усё растлумач! А яна не адступаецца.

— За што, Лёкса? З-за чаго? — паўтарае раз, і другі, і трэці.

— З-за байструка матчынага, вось з-за чаго, — цаджу я скрозь зубы, каб неяк адчапіцца ад яе.

— Ну, які ж Міколка бай... байструк? Ён жа малюпасенькі, ён жа такі бяскрыўдны, такі прыгожы! — не спыняе Лёна расціраць мне плечы, але штосьці ўва мне ўжо спружыніла, вырываючы з бяссілля, з бяссільнай млявасці.

— Прыгожы?! Ён — пры-го-жы? — рэзка паварочваюся я на спіну і адпіхваю Лёніны рукі. — А што з-за яго ўвесь пасёлак смяецца з нас, гэта як? А што яму наша прозвішча матка дала, сораму не збаяўшыся, гэта як?

— Міколка ж невінаваты.

У мяне нават дыханне заняло: невінаваты?!

## XIV

— Я Мікалай. Мікалай Радзінскі.

Вунь яно што, думаю: не хацела гэтай сустрэчы — выпадак, атрымлівасцца, дапамог! Думаю амаль абыякава, хоць і наструнілася ўся, натапырылася. На новаяўленага Мікалая не пазіраю, пазіраю на Вадзіма, які разгубіўся (не дзіва: і слыхам жа пра таго не чуў!) і пераводзіць позірк з капітана на мяне, з мяне на яго, не хаваючы недаўмення.

— Аднафамілец? Ці радня...

— Знаёмцеся, — перасільваю сябе. — Мікалай Радзінскі. Брат. Па маці... А гэта Вадзім Пятровіч Звонаў.

Вадзім падымаецца, імклівым рухам адсоўваючы сваё крэсла ад стала, робіць крок да Мікалая, падае руку.

— Рад. Шчыра рад. Мне Аляксандра Станіславаўна казала.

— Няўжо? — не хаваю я насмешлівых нотак.

Моўчкі абменьваемся позіркамі: Мікалай — запытальна — зіркае на мяне, я — з папрокам — на Звонава, той — сур'ёзна — на нас абаіх. Позіркі не адразу, але разбіваюць узніклую напружанасць, бо мужчыны раптам усміхаюцца адзін аднаму (о гэта вечная мужчынская салідарнасць!) і з усмешкамі паварочваюцца да мяне.

— Рад. Шчыра рад, — паўтарае Вадзім.

Як папугай, няйначай! — адзначаю ў думках.

— Вы мяне не праганяеце, Аляксандра?.. — злёгку запінаецца і ўсе ж не прамаўляе, адкідае імя па бацьку Мікалай.

— Не праганяе, не праганяе! — спяшаецца апярэдзіць мяне Звонаў. — Вам трэба пагаманіць, а ў мяне, на жаль, перапынак заканчваецца. Трэба ісці.

Ён абмінае стол, яшчэ не закончыўшы гаварыць, лёгенька кранаецца майго пляча пальцамі, нахіляецца і вачамі просіць прабачэння, вачамі просіць: не будзь рэзкай, не будзь жорсткай... Адгароджваючыся ад яго позірку, ад яго нямой просьбы павекамі і калі падымаю іх — Вадзім ужо развітваецца з Мікалаем.

— Я пазваню, Аляксандра Станіславаўна, — схіляе ён галаву, заўважыўшы, што я пазіраю за ім, за імі, і ідзе да дзвярэй.

— Вы дазволіце?

— Сядай. Чаго ж цяпер! Не хацела я гэтай сустрэчы, шчыра скажу. Ну, але як сустрэліся — лёс, відаць! — дык не кідацца ж адно ад аднаго. Сядай. Прынясуць — разам каву вып'ем.

— Дзякуй, — апускаецца ён у крэсла, тое, што побач з Вадзімавым. — Я хацеў, каб мы сустрэліся, і ўдзячны выпадку ці лёсу... Я жыву тут, у гэтай гасцініцы.

Пра гэта я не падумала, ідучы сюды з Вадзімам, — мільгае запозненае шкадаванне, але я нічым яго не паказваю. Разглядваю Мікалая. Шукаю якіясьці знаёмыя рыскі. Шукаю і не знаходжу. Твар не круглы, хутчэй выцягнуты, як ва ўсіх нас, і валявы. Колькі яму? Дваццаць шэсць... А на пераноссі глыбокі рубец, ад якога разбягаюцца пакуль што яшчэ ледзь прыкметныя зморшчынкі, і светлыя валасы, радзець пачынаюць — залысіны пазначаюцца. Вось хіба толькі вочы... Так, вочы ў яго чужыя. Не насцярожаныя, як у Шатэрніка, але гэткія ж, як у яго, цёмныя, глыбокія. Мікалай Радзінскі! Прыгожы, з першага позірку, а калі прыгледзецца...

Штосьці, відаць, адбілася ў мяне на твары: Мікалай сцепануў плячамі і, хаваючы гэты рух, адкінуўся на спінку крэсла.

— Не адпавядаю таму, што ты хацела ўбачыць, — бадзёрыцца і таму, напэўна, падкрэслена рэзка пераходзіць на «ты»: брацік, як жа!

— Я не хацела цябе ўбачыць.

— Я ведаю. Але не разумею.

— І не зразумееш. Для гэтага трэба быць Радзінскім.

Ён усміхаецца. Даволі нечакана для мяне. Куды толькі ўся нядаўняя няёмкасць яго адразу дзелася! — сама ўсмешка перада мной.

— Незаконнанароджаны — яшчэ не вырадак, Аляксандра.

— Я не гэта мела на ўвазе.

— А што?

Ён працягвае ўсміхацца, і я ліхаманкава шукаю ў думках нейкае тлумачэнне гэтаму. Мікалай, безумоўна, не хлапчук, ды і капітанскае званне не прысвойваюць у дваццаць шэсць гадоў за шырокую ўсмешку. Лётчык... Склалася б усё інакш, гэткага і за брата прызнаць бы-

ло б не грэх! А так няма чаго размагнічвацца. Не ўсміхацца ж мне ў адказ на яго ўсмешку!

— Ты не збоку ведаў сумную гісторыю нашай сям'і, цяпер ты ведаеш і трагічны фінал гэтай гісторыі, — абрываю я ўзніклую паўзу, адчуваючы, як напружваецца, становіцца халодным, жорсткім мой голас. — Не думаў чаму? Таму што нічога не вырастае на гнілым корані, таму што нічыё шчасце не выбудуецца на злачынстве. Гэта разумелі яшчэ ў старадаўнія часы.

— На злачынстве? Ты згушчаеш фарбы, Аляксандра, — пасур'ёзнеў Мікалай. — Любоў, няхай сабе і такога кшталту, — не злачынства.

— Любоў, нелюбоў... — рэзка абрываю я яго. — З гэтым хтосьці іншы няхай разбіраецца! Я пра злачынства. Пра данос, пра данос на бацьку, які пісаў Шатэрнік.

— Пісаў? І ёсць доказы?

— Былі б доказы, не зараз і не гэткі быў бы фінал.

— Адкуль жа тады...

— На ўсё мог бы адказаць Ян, — не выпускаю я ініцыятыву, хоць гавару з ім прафесійна непісьменна: доказаў у мяне сапраўды няма. — Мог бы адказаць, калі б захацеў.

— Значыць, ты апраўдваеш Яна, Аляксандра? — выпростваецца ён у крэсле.

— Не. Нічога гэта не значыць. Я не апраўдваю яго, я яго разумею. А гэта розныя рэчы. Судзі я Яна — асудзіла б у адпаведнасці з нашым заканадаўствам. Але ж мы не на судзе.

— О, я пачынаю разумець! Закону служаць не дзеля таго, што ён сцвярджае, а таму што закон? Так? — ціха гаворыць Мікалай. — Седзячы за сталом суддзі, ты асудзіла б яго за забойства, а ў жыцці — не? А як жа наконт сумлення?

— Ян — мой брат, — не знаходжу я нічога лепшага, заблытаная яго пытаннямі і сваімі сумненнямі.

— Зусім як у адным італьянскім фільме, — не хавае ён насмешкі, — дзе камісар паліцыі, перакананы ў сваёй праваце, становіцца забойцам, — плюнуўшы на закон, проста страляе ў таго, каму не можа з-за недахопу доказаў прад'явіць нават абвінавачанне. Ты ж юрыст, Аляксандра! Трыццаць год мінула, амаль трыццаць год.

— А мне часам здаецца, як зараз здаецца, што ўсё было толькі ўчора.

Мікалай, зіркнуўшы на мяне, задумваецца: гартае, напэўна, назад дні, гады свайго жыцця. Хоць што ён можа помніць? Што ён можа згадаць сёння?

Вецер... Вецер не сціхае ўжо колькі дзён. Ён не па-зімоваму голы, бяссснежны — проста пераносіць, перасыпае прамерзлы, сыпучы, як рачны пясок у спякоту, снег з месца на месца, змушаючы кожнага, каго заспее на вуліцы, угінацца, чапляцца рукамі то за каўнер, то за крысо свайго паліто, каб неяк захінуцца ад холаду. Спыніцца хто, стане да ветру спіной, услухаецца — вецер не завывае, як звычайна, а тонка, злосна высвіствае. І свіст гэты часам нагадвае здзеклівае, злоснае: «с-су-кі-ны с-сыны...», як вызначыў Шатэрнік, скардзячыся маці на холад. І я помсліва ўсміхаюся штораз, згадваючы яго словы: вецер ведае, каму што высвістваць. Я такссама спынялася, слухала: свіст як свіст — і я гэтак умею. Толькі ў мяне кароткі свіст, а вецер свішча колькі хоча. Доўга на гэткім ветры не ўстоіш, канечне: скразняк, проста такі ўсясветны, б'е пякучым духам, ну, ды і скардзіцца мне на яго ў галаву не прыйшло б. На тое і зіма, каб холад. На тое і вецер, каб зямлю прадзьмуць, павветра ачысціць. А то ходзяць розныя-ўсякія, плююцца то злосцю, то гадасцю...

З ветрам добра размаўляць дома, ля грубкі: не я з ім размаўляю — агонь, але думкі мае сплятаюцца з іх галасамі і набываюць іншае, мацнейшае гучанне. Яны ўжо нібыта і не мае — мне да іх дацягвацца, дарастаць трэба. І гэта не палохае. Дарасту! Налета пайду ў наш прамкамбінат прасіцца на работу. Не на канікулы, а на тыя два гады, якія мне давучвацца ў школе трэба; школа ж працуе і вечарам, для рабочай моладзі. Паўгода не дацягну да шаснаццаці, але калі пераканаць начальства... Там жа Юзікава маці працуе. У бухгалтэрыі. І яна дапаможа.

— Лё-ка!

— Табе чаго? — адпіхваю, адсоўваю рукой малога, нават не зірнуўшы на яго: не падумаць за ім!

— Мама казала, што ты казку пачытаеш, — перамагае добра чутныя ў голасе слёзы той, другі раз не набліжаючыся, баючыся наблізіцца да мяне.

— Чаго ж мама табе не пачытала? Дужа занятая?

— Мама казала: ты...

— «Мама казала: ты...» — перадражніваю малога: бач, смэркі павесіў! — Мне толькі з казкамі тваімі сядзець, галаву сабе дурыць!

— Лёка!..

— Адчапіся, сказала!

Ён усхліпвае, глытаючы слёзы: яны так і не пакаціліся па шчоках, малы — з характарам! Заўважаю гэта нейкім дзесятым пачуццём, але сорам у душы ўсё ж зварухнуўся: зусім жа малы, і не смаркаты, і не слязлівы... Адно што чужы. Як падкінуты ў сям'ю. І таму мне няма чаго саромецца. Матка ж не саромелася яго нарадзіць, падкінуць нам! Казку, казала, яму пачытаць? Што ж. Знойдзецца і адпаведная казка.

— Дык што? Матка казала, каб я табе казку пачытала? — паварочваюся да малога.

— Казала...

— Ідзі сядай на канапу і слухай. Ведаю я адну казку.

Той паслухмяна, шмарганууўшы рукавом па сухіх вачах, ступае да канапы. Доўга, лёгшы на край жыватом, караскаецца на яе. Узлазіць. З сур'ёзным — ніякай радасці — тварам глядзіць на мяне. Чакае.

— Ну, дык вось. Жылі ў вясновым сонечным лесе птушкі. Многа птушак. Самых розных. І кожная ганарылася сабой і сваім заняткам: дзяцел — тым, што лячыў дрэвы і прыносіў карысць лесу, сарока — тым, што папярэджвала лес і яго жыхароў аб з'яўленні любога чужака, салавей — тым, што пеў і песняй сваёй ахоўваў яго ад злых чар. Адна зязюля нічым карысным не займалася — гуляла сама з сабой і цэлым светам у хованкі, і ўсё. Пракувае сваё «ку-ку» і хаваецца, на іншае месца пералятае. Быццам усе так адразу і кінуцца яе шукаць! Здаралася, хтосьці шкадаваў яе: сівая, адзінокая... Але тут жа сумняваўся: чаму адзінокая! Штогод жа яйкі адкладвае! Значыцца, ёсць у яе гняздо, ёсць дом, толькі глядзець яна яго не хоча. Адкладзе яйкі, з якіх птушаняты малыя павінны павыводзіцца, і тут жа разнясе іх, падкідваючы ў чужыя гнёзды, у гнёзды іншых птушак. Няхай, маўляў, выводзяць, няхай глядзяць потым, кормяць. А сама зноў лятае па лесе, сумна кувае, гукаючы таго, хто будзе гуляць з ёй у хованкі. Таму і не любіў яе ніхто: убачыць яе якая птушка ля свайго гнязда і прэч гоніць. Ды гнаць гоніць, а таго не ведае, што чужое

яйка выседжвае і з'явіцца ў хуткім часе з таго яйка пражэрлівае, непрыгожае птушаня, якое задушыць яе ўласных дзетак?

— Задушыць? — крывіцца твар, круглеюць вочы ў малога.

— Не задушыць? У той казцы, што я расказваю, не задушыць. Не паспее. Таму што ў гняздзе івалгі нарадзіліся разумныя птушаняты: яны адразу зразумелі, што побач з імі — не іхні брацік, што побач чужы. І аднойчы, сабраўшы ўсю сілу, ухапіліся дзюбкамі за крыльцы зязюлінага сынка і выкінулі яго з гнязда.

— І ён паляцеў, Лёка?

— Ён яшчэ не ўмеў лятаць. Ён чмякнуўся аб зямлю — і канец яму прыйшоў.

Памешваю ў грубцы прагарэлыя дровы, падкідваю палена, з'едліва пытаю:

— Як? Цікавая казка?

Той маўчыць. Усміхаючыся, паварочваюся да канапы — малы сядзіць, як і сядзеў, толькі ручкі сашчапіў на каленях і па шчоках цурком слёзы цякуць: моўчкі, не ўсхліпваючы, зусім па-даросламу плача.

— Чаго ты? — злосна, каб заглушыць раптоўнае шкадаванне, кідаю малому.

— Сын... сынка шкада... — шэпча.

Чамусьці вельмі выразна, вельмі ясна чую, як тонка, злосна высвіствае за вокнамі халодны лютаўскі вецер.

— Нянавісць, як іржа, — яна раз'ядае душу, — урываецца ў мае думкі голас Мікалая. — Раней мне здавалася, што гэта ў табе, Аляксандра, дзіцячая жорсткасць, а цяпер бачу: не ты яе змагла, а яна — цябе.

— Хто ты такі, каб судзіць мяне?

— Хто? Адказаў бы: брат, калі б для цябе гэта штосьці азначала калі. Чалавек я. І, як усе людзі, жыву, думаю, разважаю, параўноўваю. Больш за ўсіх усё жыццё я паважаў цябе, Аляксандра, цяпер, сустрэўшыся пасля стольких гадоў, больш за ўсіх буду шкадаваць.

— Шкадаваць? За што гэта, цікава? — свідрую яго позіркам, адчуваючы, як балюча лопаюцца, ірвуцца ва мне нейкія важныя неабходныя ніточкі.

— За жорсткасць тваю, скіраваную не адно на людзей, а і на сябе. Ты ж спапяляеш ёй усё ў сваёй душы! — успыхвае, ускідваецца ён.

— Душу маю ты не чапай, хлопчык: я неяк сама з ёй

разбяруся, — нечакана амаль супакойваюся я. — І за людзей ніхто табе права не даваў гаварыць: не адзін чалавек за тыя пятнаццаць гадоў, што я працавала ў судзе, застаўся мне на ўсё жыццё ўдзячны. А што да жорсткасці маёй... Можа, ты мне скажаш, як іначай магла я выжыць — духоўна выжыць! — у той гразі, сярод тых п'яных оргій, якія пазначалі кожны прыход твайго бацькі? Можа, ты ведаеш, чаго мне каштавала мая вучоба, чаго каштавала мне мая дарога?

— Я ведаю, Аляксандра. Таму ніколі і не павярнуўся ў мяне язык папікнуць цябе, што ведаю.

— Што ты можаш ведаць! Малы ты быў, каб усё зразумець. Плакаў — і з-за мяне таксама, — дык скрозь жа слёзы табе было каму ўціраць. А ў мяне і слёз не было — выгарэлі! Ды і заплач я — хто б пашкадаваў?

— Мама любіла цябе.

Мне здаецца, што Мікалай сказаў: «Мама любіла цябе...» Здзіўлена гляджу на яго. У любы іншы момант засмяялася б. І тут — хачу засмяяцца. І не магу.

— Яна любіла цябе, — не адводзіць балючага позірку той. — Сама казала мне. Перад смерцю. Любіла і баялася тваёй зацятасці. Ведала, што ты ніколі не даруеш ёй. Што ніколі нічога не даруеш. Зусім, як бацька. Так яна казала.

— Такога ніхто не даруе.

Мікалай не абзываецца, і я пачынаю думаць, як, чым завяршыць гэту непатрэбную гаворку, каб льга было падняцца і пайсці.

— Два кофе. Усё ўжо аплочана, — ставіць на стол два кубачкі кавы афіцыянт і, не зірнуўшы на нас, адыходзіць.

Я згадваю Вадзіма, і становіцца крыху лягчэй. Вальней. Быццам зноў бачу яго злёгку ўстрывожаныя вочы і просьбу ў вачах: не будзь жорсткай!

— Ці шчаслівая ты, Аляксандра? Мне хацелася б памыляцца...

— Я была б шчаслівая, калі б мяне не даганяла, не дагнала, урэшце, мінулае. І хопіць аб гэтым. Ты ж не з-за гэтага падышоў, каб спытацца, ці шчаслівая я!

— Якраз з-за гэтага. Іншае мне Чарнуш расказаў.

— Што іншае? — не хаваю я недаўмення.

— Усё. І пра жыццё тваё, і пра работу, і пра становішча пасля таго, як Ян...

— Божа мой! — міжволі павышаю я голас, абураная гэтым «усё», і азіраюся: у рэстаране ўсе ж! — А ён адкуль усё гэта ведае: і пра жыццё, і пра работу, і пра становішча?

— Я не пытаўся. Ён, як і я, любіць цябе, Аляксандра, і я кажу табе аб гэтым толькі таму, што баюся: другога выпадку ў мяне не будзе, другой нашай гаворкі, мяркуючы па сённяшняй, ты папросту не дапусціш.

З цяжкасцю глытаю ягонае: «ён, як і я, любіць...», а Мікалай працягвае і, па ўсім адчуваецца, не дасць сябе перапыніць.

— Я разумею: ты, змушаная шукаць, прабіваць сваю сцежку самастойна, адна, бо аднойчы, не перамогшы крыўды, аднесла да чужакоў усіх, усіх агулам, не магла змірыцца ні з намі, ні з сабой. Так, так! — заўважае ён маю спробу аспрэчыць сказанае. — І з сабой. Змалку я не спускаў з цябе вачэй, пераймаў тваю манеру гаварыць, горда, не схіляючы, паварочваць галаву да таго, з кім гаворыш, нават моршчыць лоб, насупіўшыся... І толькі з гадамі зразумеў: штодзень, штохвіліну ты згладжваеш, выпраўляеш заблытаныя адносіны з самой сабой, углядаючыся, разглядваючы свет і людзей у ім з глыбіні сваёй вырослай індывідуальнасці, — і балюча моршчышся, прачытаўшы ў нечых вачах яе непрызнанне.

— Усё? — пытаю, укладваючы ў слова ўсю іронію, на якую здольна зараз.

— Не, не ўсё, — стараючыся гаварыць мякчэй, адзываецца ён. — Ты вось сказала, што была б шчаслівая, калі б цябе не даганяла, не дагнала, урэшце, мінулае. І схлусіла. Не мне схлусіла — што я для цябе! — а сабе. Бо ніколі ты не адпускала ад сябе мінулае далей, чым за крок. Я хачу сказаць: з галавы ў цябе не выходзіла, што там, у Рудзенску, ты з'явілася на свет. Я хачу сказаць — ад іх дваіх, ад бацькі, якога ты запісала ў святыя, і маці, для якой ён святым не быў. Я хачу сказаць: ты ўвесь час адшукваеш сябе ў іх, у іх абаіх, любячы і ненавідзячы. І ведаеш: так будзе заўсёды, колькі б гадоў ні мінула. Чым бы ты ні займалася, ты будзеш імкнуцца пазбавіцца ад гэтых думак, і не зможаш пазбавіцца... Гэта твае карані, Аляксандра. І нашы, хочаш ты таго ці не хочаш. Мы ўсе быццам сплецены адно з адным. Хочаш ты таго ці не хочаш. Адсюль — і твая нянавісць, і твая пакута.

— Ах, які ты ў нас разумнік! Вось ужо і ўявіць не магла, што побач са мной рос мой будучы абвінаваўца.

Іронія мая з нейкім горкім прысмакам: якая-ніякая праўда ўсё ж у словах Мікалая, магчыма, і ёсць. Няўтульна мне робіцца, не па сабе. І раззлавацца — устаць і, не развітваючыся, пайсці — штосьці не дае, і адпор, варты чаго-небудзь большага, чым нязгода, даць нова-яўленаму брацiку не магу: лагічна разважае, і праўда якая-ніякая ў яго словах ёсць.

— Хіба я цябе абвінавачваю? Ты не зразумела, Аляксандра, — апускае Мікалай вочы на некрануты кубачак даўно халоднай кавы і, быццам толькі зараз згледзеўшы яго, пачынае пакручваць на адным месцы. — І табе, і сабе спрабую растлумачыць тое, што развяло, раз'яднала ўсіх нас. У табе, дзяўчынцы, нібыта была сканцэнтравана ўся воля, на цябе кожны з нас міжволі азіраўся. Нават Ян... Мне так здаецца.

— Што ж, дагаворвай. Можа, і руку Ян падняў на чалавека скараючыся маёй волі?

— Думаю, ён шкадуе аб тым, што зрабіў. У Шатэрніка...

— Менш за ўсё мяне хвалюе зараз Шатэрнік! — вырываецца ў мяне, і я са страхам адпіхваю думку: нянавісць у маёй душы — яго, Мікалаева, праўда!

— Вось табе яшчэ адзін доказ таго, што ўсё сплецена, зблытана, што ўсе мы зніtaваны адно з адным жывымі, жыццёва важнымі повязамі: маці, Ян, ты, я...

— А табе чаго хвалявацца? Ты ж...

Я недагаворваю. Утаропліваюся на яго пагоны (і блізка ж не ведаю, дзе ён служыць, як паўплывае на яго службу, на яго кар'еру гэты судовы працэс, хоць якраз яго ён і не павінны быў бы закрануць), адчуваю, што да шчок прыхлынула чырвань. А Мікалай быццам здагадаўся, што я недагаварыла і чаму, ціха, неяк вельмі даверліва тлумачыць:

— Я лётчык-выбрабавальнік, Аляксандра. Я хачу лятаць. І баюся толькі аднаго: мне могуць не даверыць новыя самалёты.

## XV

— Лёна, прымаеш гасцей? — адступаю ў бок ад дзвярэй, прапускаючы, даючы магчымасць увайсці ў прыхожую Мікалаю.

— Мі-калай, — гучыць недаверліва, і тут жа хлынула, затапіла ўсё радасць: — Міколка!

Кідаецца яму на шыю — я, і не азірнуўшыся, ведаю і міжволі ўздыхаю: вось жа ніколі не мучаць сястру родавыя знакі, пляміны, непаразуменні. Маці для яе — гэта маці. Ян — гэта Ян. Нягледзячы ні на што. Мікалай — гэта Міколка... Ды і ўсё, што адбылося, для яе — проста гора. Наша агульнае гора. І ўсіх ёй шкада, усіх яна шкадуе. Ёй і ў галаву не прыйшло б згадаць тых герояў Дастаеўскага, хто дазваляў сабе праліць чалавечую кроў і апраўдаць свой учынак сумленнем. Кроў па сумленню... І не скажаш жа, што гэта глупства: ёсць сапраўды ў чалавека права абараняць сваё жыццё, забіць ворага зямлі сваёй, пакараць здрадцу — няхай часцей у ваенны час, але ёсць. І я не магу пазбавіцца ад гэтай думкі, адрачыся ад яе. Здаецца, асудзі я Яна, прызнай я яго да канца вінаватым, мне, як гэта дзіка ні прагучыць, было б лягчэй. А так — і асуджаю, і апраўдваю адначасова. І гэта я, суддзя, які не ведаў у душы сумненняў!

Усміхаюся на гэта сваё «суддзя, які не ведаў...» ці мо не на свае, а на якіясьці Лёніны словы: пра мяне яна згадвае мімаходзь, занятая Мікалаем, размовай з ім.

— А дзе ж твае ўсе? — пытаю.

— Бацьку ў кіно павялі. Тры дні яму галаву дурылі, што фільм прыгодніцкі, што яго ўжо ўвесь горад паглядзеў... І мяне ўгаворвалі, ды мне — што той іхні Зора?

Тлумачыць яна не мне, а Мікалаю. Я дужа і не ўслухваюся. Іду на кухню. Апаласкваю і набіраю чайнік. Уключаю пліту. Падсаджваюся да акна, за якім — на сем паверхаў ніжэй, праз вуліцу — Палац шлюбу. Нейкі час узіраюся ў картэж машын, аздобленых стужкамі і каляровымі шарыкамі, спрабую ўявіць маладых. Бачу ж чамусьці не святочную залу Палацу шлюбу і маладых, акружаных сябрамі і сваякамі, а будзённую, казённую залу суда, дзе ідзе шлюбаразводны працэс. Бачу залу суда і тых, хто, як і гэтыя сёння, кахалі адно аднаго і разыходзяцца. Хоць, можа, і не кахалі... Можа, і не ўмее сёння ніхто кахаць. Я ж вось не ўмею...

Мне не дужа падабаецца гэты пераход, пераскок думкі на маю асобу — адварочваюся ад думкі, і ад акна, і ад Палаца шлюбу за акном. Няма чаго ўглядацца. Без гэтага млосна. І сядзіць жа ўва мне змалку нейкая халера! — не-не і парадуецца злоснаму ўменню бачыць,

убачыць людзей такімі, якія яны на самай справе, больш таго — якія яны ў іх самай патаемнай сутнасці. Яны... Быццам я — не адна з іх! Ды і потым, што датычыцца ўмення. Сказаць, што гэта прафесійнае ўменне, яшчэ можна, а што прафесійная радасць... Не, прафесію тут лепш не чапаць. Нават мая прафесія не можа апраўдаць гэту ў нечым подленькую радасць разгадкі, прадбачання, прадчування. Як хочаш называй! Мажліва, у судзе яно і дарэчы, а ў жыцці занадта ўжо нагадвае штосьці мярзотнае, безымяннае. Штосьці, накшталт разумовага стрыптызу.

Разгадка, прадбачанне... Свет — такі, які ён ёсць, які я знаходжу штораніцы, прачынаючыся і ўступаючы ў яго, і не трэба нічога ў ім выдумляць, тасаваць, адмяжоўваць. Хацець бачыць свет лепшым зусім не азначае адпрэчыць яго, свет, такі, які ён ёсць. Ды і не адпрэчыш, колькі не адпрэчвай.

— Лёкса! Што ты там забавілася на кухні?

— Чай паставіла. Зараз завару і прыйду. Гаманіце!

Няхай гамоняць. Не хачу падпускаць да сябе Мікалая бліжэй — і так занадта блізка падпусціла, прызнаўшы якуюсьці яго правату. Якуюсьці... А якую? «Мы ўсе быццам сплецены адно з адным, хочаш ты таго ці не хочаш...» Хай сабе і сплецены, зніцаваны. Усе адзін з адным зніцаваны, свае і чужыя, блізкія і далёкія: зямля задужа маленькай стала — на фотаздымку ўмяшчаецца, і край свету зусім побач. Побач з кожным. Бо нават зараджанае ружжо на сцяне ад доўгага чакання само страляе. А тут не ружжо, а ядзернае начынне. Небяспека заўсёды зближае людзей. Заўсёды.

Гэта ж і мы з'ехаліся, сышліся, калі паленым запахла. Ян... Трывога, калі разабрацца, — зусім не пра Яна. Проста атрымалася: водсвет яго ўчынку, крывавы і страшны, упаў на кожнага з нас. Вось і затузаліся, вось і дзейнічаем: Лёна кінулася да Яна, Мікалай — да мяне, я... Круг, няйначай, замыкаецца на мне. Ад мяне чагосьці чакаюць. «Ты верыш у тое, што робіш?» — «А ты?» — «Я веру...» Ён верыць! Як жа! Будучыня належыць тэхніцы і тым, хто ёй валодае і авалодвае. Ледзь не азбучная ісціна на сённяшні дзень. Звышгукавыя, звышдальнія самалёты важней за адвечныя пытанні жыцця і смерці. Ужо ж. Жыццё — вечнае. У гэтым неяк не ўзнікае сумнення. Нягледзячы ні на што. Нягледзячы на атамную пагрозу. А калі жыццё — вечнае, дык

што тады — смерць? Чаго яе баяцца? Пазнаю цябе, чалавек, і ў табе — сябе! Паміж смерцю і жыццём — адно закон, на ахове закону — дзесяткі, сотні тысяч гэтакіх, як я. Усё замыкаецца на мне. А я...

Я сяджу і перабіраю свае сумныя думкі. І думаю, што, калі маральная сіла страчваецца, закон мёртвы.

— Лёкса!

— Іду.

Пачынаю збіраць посуд для чаю, а ў кухню ўжо ўлятае (калі можа такая мажная жанчына, як Лёна, уляцець у такія вузкія кухонныя дзверы) сястра, узрушаная размовай, прысаромленая тым, што не яна, гаспадыня, а я шчырую на кухні. Улятае — і вось ужо шырока прачыняецца халадзільнік, вось ужо на стале звычайныя магазінныя прысмакі, вось ужо пыхкае завараны ў мяне з-пад рук чайнік. І ўсё гэта — за тыя імгненні, што гучыць яе мяккі, зараз крыху прыглушаны голас:

— Хіба я сама не зрабіла б? Ты як спецыяльна хаваешся, Лёкса. Няёмка ж. Гэтулькі год Міколку не бачылі! Ён і да капітана даслужыцца паспеў, і ажаніцца, і сына займець — Аляксандрам яны яго назвалі... Як ляцяць гады! Божа мой, як ляцяць гады! Можа, мне ў магазін адскочыць, а Лёкса? Мы ж у хаце не трымаем нічога выпіць, ты ж ведаеш.

— Чаго ты мітусішся? Не п'е ён. Мы ж з ім у рэстаране пасядзелі перад гэтым, — спрабую я спыніць яе. — Кожны асобна паелі, а каву хацелі разам выпіць і не выпілі: схаладнела зусім, пакуль адносіны высвятлялі. Так што чай дарэчы будзе.

— Няёмка. Госць жа ў хаце. І Міша, як на грэх, сышоў з хаты, і ты хаваешся...

— Не выдумляй, — абрываю сястру. — Ідзі накрывай столік, а я чай прынясу.

Яна з недаверам зіркае на мяне, але, узяўшы абрус і чысты льняны ручнік, вяртаецца ў пакой. І ўжо адтуль гучыць яе голас — апраўдваецца:

— Хацела ў магазін адскочыць, віна якога купіць, ды Лёкса не параіла. Не п'еш, кажа. Зусім не п'еш, Міколка? Правільна.

Я не ўслухваюся. Наперад ведаю ўсё, што скажа, — змалку над ім квахтала: Міколка! Міколка! І адкуль у ёй столькі дабрыні? На ўсіх хапае: і на мужа, і на дзяцей, і на мяне... Магла б — усіх пад крыло сабрала. Лёна, Лёнка, белая маслёнка! Чаму маслёнка, адкуль

дзіцячая гэта мянушка, нязлосная, але незразумелая, узялася, ужо і не помню. Гэта цяпер Лёна раздабрэла (траіх усё-ткі нарадзіла!), а была ж, як і я, як і ўсе мы тады, худая — рабрыны на спіне палічыш...

— Цяжка табе, відаць, Лёкса?

— Што цяжка? — раблю выгляд, што не разумею Яна: занадта нечакана ён, дэмабілізаваўшыся, заехаў на адзін дзень — праездам у свой Данецк, да сваёй нявесты, занадта абыякава цікавіцца маёй работай і вучобай.

— Цяжка табе, відаць, працаваць і вучыцца? Я ж вось, паступіўшы, кінуў тэхнікум... — нехаця тлумачыць ён, услухваючыся ў штосьці сваё, далёкае.

— Ты хочаш, каб і я кінула школу?

Ян зіркае на мяне больш уважліва — учуў ноткі непрыязнасці. З адказам жа нейкі час марудзіць. Абдумвае, напэўна. А што тут абдумваць! Дарадцаў, што параілі б мне, калі б пасмелі, кінуць школу, і тут хапае. Толькі ні ў чыіх парадах у мяне патрэбы не ўзнікае. Ды нікога б я і не паслухала: яшчэ чаго! У мяне — свая дарога. У мяне хопіць сілы ёй пайсці. Я буду, як бацька, суддзёй. Буду. Дарма што зараз шыю купальнікі на тлустых, звыклых да ляноты жанок. Не раўняючы з ім, Радзінскім ужо дзякуючы адно свайму нараджэнню: нарадзіўся мужчынам, а ўсяго мужчынскага — жаданне хутчэй абзавесціся жаночай ласкай і пасцеллю.

Думаю з непрыязнасцю, нават не хаваючы яе. Старэйшы з нас, Ян за тыя пяць гадоў, пражытых асобна, далёка ад дому, стаў чужым: два, тры пісьмы на год, два кароткія прыезды...

— У мяне язык не павярнуўся б сказаць табе: кідай вучобу. І ты гэта ведаеш, Лёкса. І марна хочаш балючэй укалоць мяне, — папраўляе на галаве пілотку Ян. — Калі б у мяне была магчымасць дапамагчы табе... вам — табе і Лёне! — я зрабіў бы гэта, павер. Вучыся. Дапамагу, чым змагу. Як толькі стану на ногі. Як толькі вырашу ўсё са сваёй жаніцьбай.

— А ты яшчэ не вырашыў? — з'едліва ўсміхаюся.

— Ты стала калючай, Лёкса. Калючай і злоснай.

— Па-твойму, стаяць убаку, чужым, абыякавым да таго, што бачыш і не хочаш бачыць, лепш?

Ян дасюль ніводным словам не абазваўся пра матку. І пра бабулю. Ён наогул не пацікавіўся тым, як мы

жылі ўсе гэтыя гады, як жывём. «Цяжка табе, відаць, Лёкса?» Не, лёгка! Яшчэ лягчэй было б, калі б і хвіліны не заставалася для дома, калі б я магла кінуць дом, як кінуў некалі ён. Ды вось не магу. Пакуль што — не магу.

— Можа, і праўда Рудзенск стаў мне чужым. Як і дом, дзе я рос, — задумліва прамовіў Ян, хоць смутку ў яго задумлівасці я не пачула і насцярожылася. — Але ж і ты, Лёкса, і Лёна — мае сёстры. Мае любыя сястрычкі!

Ён яшчэ смяецца! І абняць за плечы спрабуе! Гульня ўсё. Прыехаў — і сёння ж едзе далей. З цэху мяне выклікаў, каб сказаць, што я стала калючай і злоснай.

Бяссільныя, балючыя слёзы пачынаюць ускіпаць у душы. Каб Ян нейкім чынам не адчуў іх (мне ўжо шаснаццаць, а не дванаццаць, як у яго мінулы прыезд!), адхінаюся ад яго рукі, ад яго ласкі.

— Я для цябе чужы! Зусім чужы, Лёкса?

— Не, — выціскаю з сябе, перамагаючы слёзы.

— Я ў нечым вінаваты?

— Вінаваты, невінаваты... Не ў тым справа.

— А ў чым справа, Лёкса?

— Ты прыехаў і паедзеш. Ты можаш дазволіць сабе не любіць наш дом, не любіць маці, гадамі не бачыць мяне і Лёну. Ты верыш, што ніколі не вернешся сюды.

— Ніколі! — міжволі горача вырываецца ў Яна, вырываецца з такой сілай, што змякчыць вокліч немагчыма, што і дурню стала б ясна: ён не вернецца.

— Вось бачыш, — кажу.

— Але ж і ты, Лёкса, вырваўшыся адсюль, ніколі не памкнешся назад, — быццам апраўдваецца Ян. — Хіба не праўда?

— Праўда, — пацвярджаю, падымаючы на яго вочы (бач, пачырванеў!). — Толькі я бацьку, ягонай справе не здраджу. І прытварацца не буду, што міру ў сваёй сям'і хачу. Няма ў нас сям'і.

— Лёкса!

— Не трэба, Ян. Не прытварайся. Давай не будзем прытварацца адно перад адным. Ты цудоўна ведаеш, што сям'я развалілася яшчэ да смерці бацькі. Потым жа... Я не маленькая. І хоць расла на вуліцы, сёе-тое бачыла і помню. Бацька — святы чалавек, вера ў гэта дапаможа мне стаць такой, як ён.

— Ты зусім дарослая.

— Я ніколі не была дзіцем!

Рука Яна, якой ён усё спрабуе яшчэ зрэдку абдымаць мяне за плечы, балюча ўздрыгвае. І ён адводзіць яе. І спалохана зіркае на мяне. І калі я апускаю вочы, дзвюма рукамі рашуча паварочвае мяне да сябе.

— Лёкса, што я мог зрабіць інакш? Тры гады службы... І раней... Я ж толькі-толькі асвоіўся на шахце! Што я мог?

— Я нікога не абвінавачваю.

— Не, ты абвінавачваеш. Усім сваім выглядам. Тым, што такая калючая і злосная. Тым, што не хочаш мяне зразумець.

— Чаму ж не хачу? Проста мне раней здавалася, што і ты ва ўсім імкнешся паходзіць на бацьку. На жаль, толькі здавалася.

— І бацька — не святы. Марна ты так думаеш, — супіць бровы Ян, адступаючыся, відаць, бо пачынае абцягваць гімнасцёрку і папраўляць бляху на рэмені.

— Для мяне — святы, — падкрэслена адчужана кажу і азіраюся на гадзіннік, што вісіць на сцяне над прахадной: няхай бачыць, што я чалавек заняты і не даражу нашай сустрэчай, гэтак жа, як і ён.

— Што ж, сястрычка, кожны сам сабе выбірае святых. Ты — выбрала добрага: ён даў нам жыццё. Бывай!

Ян, перамагаючы ўзніклую паміж намі адчужанасць, ступае да мяне, знарок грубавата абдымае адной рукой, на міг прыціскае да свайго пляча і цалуе ў шчаку.

— Калі будзе дужа цяжка, напішы. Дапамагу, чым змагу, — кажа, паварочваючыся ўжо ісці: не чакае майго адказу, быццам ведае, што я адкажу, калі адкажу.

Я не адказваю. Моўчкі пазіраю, як шырака, цвёрда ступае Ян па заасфальтаванай дарожцы і, перайшоўшы шашу, не азірнуўшыся на мяне, кіруецца не ў бок дома, а ў бок станцыі. Не адчуваю нават горычы расстання. Чамусьці зацята думаю, што нічым ніколі Ян ні мне, ні Лёне не дапаможа, што ні я, ні Лёна ніколі не звернемся да яго за дапамогай.

«І бацька — не святы...» Ён яшчэ смее гэтак пра бацьку! Кожны сам сабе выбірае святых.

— Вось і чай, — уваходжу ў большы Лёнін пакой, які служыць і гасцёўняй, і спальняй уначы, а зараз усімі сваімі рэчамі і двума люстэркамі буфета, поўнага розных

шкляных мадэлей самалётаў і караблёў, узіраецца ў строгага, падцягнутага госця ў вайсковай форме. — Перад дарогай чай якраз дарэчы.

— Перад дарогай? — Лёна пераводзіць позірк з мяне на Мікалая. — Ты сёння і едзеш, Міколка?

— Лячу. Праз дзве няпоўных гадзіны — мой самалёт.

— І не пабыў у нас! І з Мішам сваім я цябе не пазнаёміла: ён жа не быў на пахаванні, калі ты прыязджаў, — з дзіцем хворым быў. І дзеці будуць шкадаваць — не павераць, як раскажу пра гэткага героя! Што ж гэта, Міколка? — замітусілася Лёна, выціраючы мокрыя ўжо вочы і расстаўляючы на століку посуд. — Толькі прыйшоў і ўжо збірацца пачынаеш!

— Ты ж не прызнаваў Шатэрніка за бацьку! Што ж па тэлеграме прыехаў? — знарок рэзка абрываю Лёну (яе не спыні, так і правохкае да канца гаворкі!) і зусім ужо нятлетліва звяртаюся да Мікалая: — Новую радню знайшоў?

Лёна знямела. Знерухомела. А ён (відаць, звыкся за час нашай гаворкі ў рэстаране з маім тонам) спакойна адказаў:

— Дзякуй за прызнанне.

— Якое яшчэ прызнанне?

— Новая радня можа быць толькі калі ёсць старая. Лагічна? — усміхаецца ён.

— Лёкса! — вяртаецца голас да сястры. — Я цябе прашу...

— А як цябе адпусцілі? Радзінскага — да Шатэрніка? Ці мо растлумачыў усё камандзіру? — не зважаю я на Лёну: цяпер мая чарга падтрымліваць гаворку з госцем!

Мікалай трымаецца з годнасцю — гэта я і раней адзначала, але ж сёе-тое і дазнацца не грэх, калі ўжо выпала нам сустрэцца і пагаманіць.

— Ці мо водпуск далі па сямейных абставінах?

— Два дні паміж палётамі скарыстаў: у тэлеграму асабліва ніхто не ўчытваўся — так паглядзелі, а я... Вас усіх хацелася ўбачыць. Ды і Шатэрнік, як бы я да яго ні ставіўся ўсё жыццё, бацькам даводзіцца. У Яна, няйнакш, была прычына, але ж таму было ўжо за шэсцьдзесят...

— Шэсцьдзесят шэсць, — ціха абзываецца Лёна, і я зіркаю на яе з цікавасцю: адкуль ведае?

— Ты быў у яго?

— Не, Аляксандра. Ездзіў. Не пусцілі. І да памяці не прыходзіць, і не памірае — гэтак сказалі. І не пусцілі ў палату.

— Божа мой, божа мой! Трэба ж было гэткаму здарыцца! І ад Яна цяпер усе адвернуцца, — па-ранейшаму хітаецца ў крэсле Лёна.

— А што ж яго, слязьмі абліваць, як ты? Чаго заслугоўвае, тое і мае.

— Лёкса! — усплёсквае яна рукамі. — Ён жа твой брат!

— Быў.

— Быў?! Ты ўжо адраклася ад яго, Лёкса? — падымаецца з-за стала Лёна. — Ты ўжо, можа, пахавала яго?

Узрушаная, са слязьмі ў вачах і гнеўным недаўменнем на твары, яна выбягае з пакоя, і ў пакоі становіцца ціха. Так ціха, што чуваць, як у кухні капае з крана вада.

— Яну зараз цяжэй, чым табе. Чым усім нам, Аляксандра, — падымаецца Мікалай. — Я ўвесь час хацеў табе гэта сказаць.

## XVI

Змяркаецца. Якія кароткія, якія доўгія дзень пражыты! Азірнуцца — ранку не ўгледзіш за гадзінамі, за людзьмі, за грудамі сказаных і пачутых слоў. Упершыню так ясна адчуваю, заўважаю, як многа мы гаворым. Бясконца. Па справе і без справы, з ветлівасці і са злосці, з гневам і з любоўю, пераканана і абыякава, урачыста і зацята... Такое адчуванне, што са слоў наша быццё і зляплена, на іх трымаецца. Ат! Гэта стома гняце, аграмадная душэўная стома, з якой я спрабую справіцца: як не адолець, дык хоць бы прыглушыць, прыцішыць яе як-небудзь, каб льга было расчуць што іншае, апроч яе цяжкога, гарачага гулу! Газеты перагледзела— у свеце тая ж страшная напружанасць, што і ўва мне. Што і ўва мне... Па-шкалярску трохі гучыць — задужа «я» вытыркаецца, ды куды ж мне ад гэтага «я» дзецца, куды схавацца? Яно маленькае, амаль нябачнае, ды чаго там! — нябачнае, калі ўздумацца і ўявіць аграмадны, супярэчлівы, раздзіраемы бясконцымі канфліктамі свет

(куды ўжо раўняцца з гэткімі маштабамі!). Але яно вырастае да памераў самога жыцця, самога лёсу, калі ўслухвацца ў яго раптоўны боль, у яго сусветную — не меней — тугу. Тады і свет — не вакол, а ўнутры мяне, ува мне. Тады і душэўны боль мой можа на міг пераважыць водгук далёкай, чужой трагедыі. На міг, другі... Адзін раз, другі... І вось ужо здаецца, што ніколі з гэтых чэпкіх, моцных спратаў свайго болю не вызвалішся.

Не! Нельга ўвесь час углядацца, услухвацца ў сябе — у сваё былое ці ў сваю будучыню. Былое было, будучыні можа і не быць. Ці мала што. Я жыву. Дыхаю. Думаю! Значыцца, знойдуцца і патрэбнае рашэнне, і неабходная сіла. Заўсёды раней знаходзіліся. Толькі не трэба нічога драматызаваць, не трэба слухаць збуджаную згадкамі злосць. Яна, як іржа, раз'есць усё ўсярэдзіне. Хвілінамі ж чую, як раз'ядае — лёгка рушыць, трушчыць тое, што на працягу ўсяго жыцця я будавала, узводзіла... Не, не! Я сама загнала сябе ў круг, адразу ж рашуча не адасобіўшыся ад таго, што здарылася, — і бягу па крузе, загнаная згадкамі, думкамі, нейкімі бессэнсоўнымі апраўданнямі. Стома, душэўная змога — адсюль.

Бег па крузе... Ці ў крузе? Ну ды гэта ўсё роўна. Я — за загарадкай, і загарадку — усё вышэй — гараджу сама. Дзень і ноч гараджу, са сноў і згадак. Яны, як вялізныя люстэркі, як люстры ў чорных драўляных рамах, выгінаюцца ўздоўж майго шляху, уздоўж майго бегу: згадка — люстра, згадка — люстра! То пазнаю, то не пазнаю сябе ў іх, то ўсміхаюся свайму адбітку, то спрабую адвярнуцца ад яго — ад сябе, а ўсё цягнецца люстраная сцяна. Быццам мне ўжо ніколі не вырвацца з мінулага — як толькі паспрабую разбіць, прабіць яе, гэту сцяну, разаб'юся... Ат, чорт! Гэта стома гняце. Аграмадная душэўная стома. Якія люстры?

Не трэба нічога драматызаваць. Усё на сабе замыкаю я сама. Колькі спраў разгледзела за гэтыя гады ў судзе, лёсы колькіх людзей імкнулася выправіць, аддзяляючы хлусню ад праўды, боль ад нянавісці, злосць ад крыўды... З кім толькі ні зводзілі жыццё і работа! Каб ратаваць іх, я павінна была іх любіць. Павінна была — і не любіла. Разумела, хацела зразумець, так! Але ніколі не змушала сябе любіць іх. Як толькі справу закрывалі — тут жа выкрэслівала ўсё са сваёй свядомасці. Поўнасцю. Да самай апошняй рыскі. І гэта было справядлі-

ва — толькі так можна было жыць, працаваць: на стале ж ужо ляжала новая справа, у мяне з надзеяй, з непрыязнасцю, а то і з нянавісцю ўзіраўся са старонак пратаколаў хтосьці іншы, яшчэ незнаёмы, каму трэба было дапамагчы, каго трэба было змусіць задумацца над сваім жыццём, над сваім учынкам. У мяне было роўна столькі часу, каб разабрацца ў справе, — ні хвіліны больш. У мяне не было часу калупацца ў сваіх адчуваннях.

Канечне, Ян — не хтосьці іншы... Ён сваім учынкам ударыў непасрэдна па мне, і не так гэта проста — аддыхацца, адысці пасля гэткага ўдару. І ўсё ж... Усё ж, Яну горш зараз, чым мне, — праўда Мікалая. Як ні злуйся, як ні апраўдвай я сваю злосць, а праўда — у словах Мікалая. Гэтак выходзіць. І яшчэ выходзіць, што, не прымаючы яго словы, я не прымаю, адпіхваю праўду. Нават з Лёнай пра яе паездку да Яна не пагаварыла...

Рашуча падымаюся з канапы, набіраю Лёнін нумар.

— Алё! Лёна?

— Чаму ты мяне не дачакалася? Ты ж хацела дачакацца мяне, Лёкса. Я ж і не забавілася дужа. Пасадзіла Міколку на тралейбус і хуценька дамоў...

— Пачакай! Ты мне не пра Міколку расказвай, ты скажы, чаго цябе ў раён панесла? Чаму ты мне пра свой намер нічога...

— Ты адгаварыла б, Лёкса! — спалохана перапыняе яна мяне, не хаваючы жаласлівых нотак. — І я паслухала б цябе, як заўсёды слухала. А тут... А тут мне не трэба было цябе слухаць!

Ды што яны ўсе супраць мяне? — мільгае адчайнае, у нечым нават бездапаможнае: знайшлі злую волю! Брата, бачыце, я асудзіла! А што ж яго па галоўцы за гэткае гладзіць?

— Ты пакрыўдзілася, Лёкса? Што ты маўчыш?

— Як... Ян? — спатыкаюся я аб сваю думку.

— Хворы... Не, не! Ён не ляжыць, — спяшаецца Лёна запоўніць узніклую, ледзь прыкметную паўзу. — Але ён хворы, Лёкса. Хворы нейкай страшнай нерухомасцю. Ён ніводнага разу не зварухнуўся, пакуль я з ім гаварыла. У яго хвілінамі нават павекі не ўздрыгваюць.

Яна ўсхіпвае. Мне здаецца, што я бачу, як, не выпускаючы трубкі, Лёна выцягвае з кішэні халата насоўку, уцірае мокрыя вочы: асуджае мяне, напэўна, за чэрст-

васць. А я не магу ды і не хачу, як яна, распускаць нюні. Не хачу і не буду.

— Не буду, не буду! Гэта я не табе, Лёкса. Гэта Сяргейка мой побач носам захлюпаў. Ідзі, сынок. Мама з цёцяй Лёксай пагамоніць. Ідзі гуляй!

— Што ты гаварыла Яну?

— Вой, Лёкса, я і не помню. Усё гаварыла. Што гэта на яго, відаць, зацьменне нейкае найшло з-за гарэлкі. Што мы... што я па-ранейшаму люблю яго. Што яму трэба папрасіць прыслаць доктара. Што Шатэрнік яшчэ, можа, выжыве... Трэба ж было нешта казаць!

— А ён? Ён што?

— Ён? — голас сястры зноў уздрыгвае, зноў намакае слязьмі, але яна не ўсхліпвае, стрымліваецца. — Ён ніводнага разу не зварухнуўся. Пазіраў то на мяне, то паўз мяне, кудысьці ў сцяну, і вуснаў не расшчапіў. Не кіўнуў нават... Што ж гэта такое, Лёкса? Што ж ён з сабой учыніў?

— Ты яшчэ загаласі! — буркаю, не даючы прарвацца ў словы жалю і нейкай горкай разгубленасці: Яна, нягледзячы ні на што, шкада.

— Няўжо нельга нічым дапамагчы, Лёкса?

— Чым тут дапаможаш?

— Я не ведаю. Я разумею... Але ж так шкада Яна, так шкада, што і слоў, і слёз мала. Бедны ён, бедны!

— Дурань ён! — вырываецца ў мяне разам з цяжкім, балючым уздыхам.

— Лёк-са! — не хавае папроку сястра. — Навошта ты ўвесь час імкнешся здавацца горшай, чым ёсць? Ты ж мяне, калі я хварэла, тыднямі выходжвала, помніш? Ты ж нават Міколку, не прызнаючы нібыта, ад злосці матчынай бараніла, неаднойчы бараніла... Гэта словы ў табе злосныя, а ты... ты добрая!

— Ну, даволі! А то ты дагаворышся... — цішком глытаю я яшчэ адзін горкі ўздых. — Што Ян? Так нічога і не сказаў?

— Нічога. Аднойчы ўсяго і абзыўнуўся, калі я нечага пра цябе загаварыла.

— Пра мяне?

— Але. Я сказала, што ён мог бы табе ўсё растлумачыць сам пра сваю хваробу... Гэта ж хвароба, Лёкса? Гэта ж зацьменне нейкае на Яна найшло, а?

— Што ён табе адказаў? — пытаю, крыху паслабіў-

шы пальцы (пабялелі, сціскаючы трубку). — Што ён не хворы?

— Сказаў: «Лёкса не прыедзе».

— І ўсё?

— І ўсё. Больш нічога. Хацела пацалаваць яго на развітанне — адхінуўся. Неяк нязграбна адвярнуўся. І ўсё.

Паўза, якая раптоўна наступіла пасля Лёніных слоў, доўжыцца і доўжыцца. Чую дыханне сястры на другім канцы провада, чую, як ціха, цяжка б'ецца ў мяне ў грудзях сэрца, чую ліпкую, задушлівую цішыню гэтай хвіліны... Думак няма. Так, круцяцца апошнія Лёніны словы, падымаючы, варочаючы ў душы нейкія іншыя словы, цяжкія, як камяні. Нейкія іншыя словы, не яе і не мае.

— Ты паедзеш да Яна, Лёкса?

Гэта Лёна спытала? Ці мо мне здалося? Трубка ж, сціснутая дрогкімі пальцамі, па-ранейшаму маўчыць, ціха дыхае мне ў вуха і маўчыць...

— Ты не паедзеш да Яна? — пытаецца Лёна: цяпер я выразна чую яе голас.

— Не ведаю.

Не развітваюся з сястрой, проста кладу на месца трубку і апускаюся на канапу: я не ведаю, ці паеду да Яна, ці хачу яго пасля ўсяго, што адбылося, бачыць. Хутчэй за ўсё, не хачу. Пуста ў маёй душы. Толькі якіясьці чужыя словы, цяжкія, як камяні, ледзь чутна варочаюцца, варушацца на самым дне, будзячы боль, балючыя згадкі...

Які ўжо раз дзіўлюся рэзкаму кантрасту: выскокваю з тралейбуса на люднай, амаль заўсёды тлумнай плошчы (тут падыходы не толькі да вялікіх прамтаварных магазінаў, а і да Батанічнага саду і да парку Чалюскінцаў — іх алеі пачынаюцца ледзь не ад тралейбуснага прыпынку), пераходжу на другі бок яе і ста метраў не прайду па вузкай, забудаванай старымі двух- і трохпавярховымі дамамі вуліцы Калініна, як трапляю ў ціхі, зарослы высознымі кустамі бэзу і язміну двор. Двор пампезнага, з калонамі і штучнымі порцікамі асабняка на два паверхі, які займае зараз дом для састарэлых і інвалідаў. Раней падобныя дамы называлі багадзельнямі, і для багадзельні месца было выбрана кімсьці сапраўды шчодрым і міласэрным: асабняк мог служыць якой заўгодна ўстанове — быў на ім той знешні, хай

сабе і не вельмі дыхтоўны лоск, што ўражваў з першага позірку. Уражанне гэта падтрымлівае, нават паглыбляе сам двор-сад: старыя, магутныя ліпы, высозныя, ледзь не да самых акон другога паверха кусты, паміж якімі пятляюць засыпаныя яркім асеннім лісцем сцяжынкі, — усё гаворыць аб адметнасці гэтага месца, усё пакрыта нябачным налётам невядомасці, невядомай таямніцы. Хоць, напэўна, пажадай я, і было б няцяжка дазнацца, калі, кім і для каго будаваўся гэты асабняк: вельмі старых будынкаў у Мінску не захавалася — захавалася мала, большасць з іх пазначаны гэтым векам, другой паловай яго. І гэты асабняк меў, хутчэй за ўсё, нядоўгую і зусім звычайную гісторыю. Мне ніводнага разу не захацелася яе аднавіць. Можа, таму, што мне падабалася якраз таямнічасць гэтага месца, падабалася, што я нічога пра гэты дом не ведала.

Падабалася... Гэта адзінае, што прываблівае мяне тут. Бо ледзь заходжу я ў гэты двор, у гэты дом, як сэрца сціскаецца жалем, і пачуццё нейкай маёй незразумелай віны гняце так моцна, што я з цяжкасцю ўдыхаю і выдыхаю кіслае, застаялае паветра калідораў і пакояў. Быццам менавіта я і вінавата ў тым, што тут уладарыць гэты нічым невынішчальны пах старасці і тлену, што пакінутыя, агароджаныя высокім каменным плотам, ад горада, ад жыцця людзі, чужыя, незнаёмыя мне, так радуюцца кожнаму майму прыходу да бабулі, што не толькі неадступна сочаць за мной, за кожным маім рухам, а імкнуцца загаварыць, крануцца мяне, бы незнарок, рукой, ці плячом, ці хоць бы голасам: я для іх — адтуль, з-за агароджы, з маладога, поўнага надзей і руху жыцця. Я і сама тут, сярод гэтых людзей, адчуваю, што я — адтуль, і гэта паглыбляе маю віну перад імі. Хоць што я магу? Я нават бабулю забраць з гэтага дома да сябе не магу: жыву ў студэнцкім інтэрнаце — пяцёра ў адным пакойчыку, жыву на адну стыпендыю, і зноў трэба чакаць, пакуль вывучуся, стану юрыстам — стану суддзёй, як бацька. Чакаць, чакаць... І не проста чакаць — упарта працаваць, вучыцца, набліжаючы той дзень!

Вось і зараз, пакуль не зарыпелі, не зачыніліся за мной цяжкія, як вароты, дубовыя весніцы, упускаючы ў цьмяны, базрадасны, хоць і строга дагледжаны сад чужой старасці, я думаю пра той дзень, абавязкова светлы і ўрачысты, пра сябе і сваю першую прамову ў судзе, пра тое, як здзівіцца бабуля, як яна абрадуецца, калі я

прывязу яе ў сваю новенькую, абстаўленую простай мэбляй кватэру і скажу: «Тут мы з табой, ба, і будзем жыць».

Кожны раз, падыходзячы да каменнай агароджы, да весніц у гэтай агароджы, думаю пра адно і тое ж, адны і тыя ж словы прамаўляю ў думках...

Піхаю рукой і потым плячом весніцы, чакаю і ўсё ж уздрыгваю, калі яны рэзка, непрыемна рыпяць за спіной, вітаюся з сухім, невысокім дзядком у заечай шапцы-аблавусе з апушчанымі краямі, што як прырасла да яго галавы — і ўлетку ў ёй, помніцца, хадзіў, ківаю на ягонае: «Да Каці? Ну, ну...» і, адхінаючы рукой галіны язміну з парудзелым, парадзелым лісцем, прыцярушанай гэтым лісцем алеяй іду да ўвахода ў дом, не да цэнтральнага — той, забіты, і, відаць, ніколі за апошнія гады не адчыняўся, а да бакавога, чорнага, як сказалі б даўней. Які момант яшчэ маруджу і рашуча штурхаю дзверы. Моршчуся, раблю намаганне — чапляюся рукамі нават за складкі плашча, — каб міжволі не заціснуць нос, пакрыўдзіўшы гэтым каго-небудзь, хто мяне мог бачыць. Паварочваю да лесвіцы, спрабую дыхаць неглыбока і нячаста, падымаюся на другі паверх — там, за якіх дзесяць крокаў ад лесвіцы ў кутнім пакойчыку чакае мяне бабуля. Гаманіць мы з ёй будзем не ў пакоі, а ў калідоры, прысеўшы на старую скураную канапу, — хоць і на вачах ва ўсіх, ды ўсё ж суседку бабуліну, Агаф'ю Ціханаўну, падслепаватую, вечна ўсім незадаволеную і змрочную, не патурбуем. Ды і нікога асабліва не патурбуем, бо гамонім звычайна нядоўга і нямнога: мяне праз пяць—дзесяць хвілін апаноўвае такі сум, што чэзне, знікае голас і на вочы наварочваюцца слёзы, неяк самі сабой, і бабуля, заўважыўшы гэта, пачынае мяне выправоджваць. Трэба вучыцца стрымлівацца і не выказваць сваіх пачуццяў: бабулі і без маіх слёз тут не салодка даводзіцца, напэўна, — увесь час на вачах чужых людзей...

— Добры дзень, Агаф'я Ціханаўна! — вітаюся са старой, якая сядзіць ля акна і насцярожана павярнула вуха да дзвярэй, пачуўшы мой стук, і стараючыся не зважаць на яе акружаныя чырвонымі падцёкамі вочы і дрогкую галаву, на яе незадаволенасць, бездапаможную і такую жаласную, што немагчыма глядзець (бабуля расказвала, што яна па просьбе дачок прадала сваю хатку недзе на Асіпоўшчыне і, не мінула і трох гадоў,

апынулася, урэшце, тут, у гэтым доме). — Як ваша здароўе?

Адказу яе не чую — мо яна і не адказвае, бо ў гэты момант ужо абдымаю плечы бабулі, прыціскаюся да яе, ласкава шапчу ёй сваё вечнае: «Як ты, ба? Сумавала?»

— Пойдзем, Ляксандра, — спрабуе надаць свайму голасу строгасць бабуля. — Ты як маленькая...

І вось мы ўжо сядзім на канапе, і я штохвіліну адрываюся ад нашай нягучнай гамонкі, каб адказаць на вітанні старых, якія праходжваюцца па калідоры знарок, як мне здаецца, непадалёку ад нас, і я не адрываюся ад бабулінага пляча, не адводжу ад яе шчаслівага зараз твару вачэй.

Студэнцкія навіны кароткія: не расказваць жа бабулі пра тое, як я вучуся канспекціраваць лекцыі дробным почыркам, каб надаўжэй хапіла агульнага сшытка, як з'ядаю часта па два малочныя крупнікі ў сталоўцы, бо крупнік таннейшы за катлету, як баюся заводзіць з кімнебудзь блізкае знаёмства, каб не быць нікому абавязанай і не паказаць, што расцягваю дваццаць сем рублёў стыпендыі на цэлы месяц. Бабуля і так перажывае, што не можа мне якія пяць—дзесяць рублёў падкінуць (не выплачваюць ім тут пенсіі), і то пра матку, то пра Яна запытае, пра іх цікавасць да маёй вучобы. А якая цікавасць? Матка задаволена, што я пакінула дом і не свідрую яе і яе Шатэрніка злоснымі позіркамі, а пра тое, чым дапамагчы мне, і не згадвае: не загадвала ж ісці ў горад вучыцца, маўляў, была ж някепская работа ў камбінаце, маўляў... Ян? Ён і пісьмы два разы на год піша. Пахваліў за імкненне да вучобы...

— Ты б сама напісала Яну, Ляксандра! Брат ён твой. І старэйшы ў сям'і, ужо на сваім хлебе. Цяжкі ў яго хлеб, гэта праўда, ды зарабляюць жа шахцёры няблага.

— Бабуля! Я ж прасіла цябе... — крыўджуся я. — Ты ж абяцала не думаць больш пра гэта. Дзяржава плоціць стыпендыю, і мне хапае гэтых грошай. Я ж казала табе. Колькі сукенак і паліто справіла да паступлення ва універсітэт, да прысмакаў, ты ж ведаеш, не прывучана змалку.

— Худзенькая ты дужа, — уцірае бабуля вочы, цішком, хаваючыся ад мяне. — Я тут сабрала табе масла...

— Якога масла?! — палохаюся, чырванеючы ўжо ад балючай здагадкі, і азіраюся на калідор, на інвалідную каляску, акружаную чатырма сівенькімі жанчынамі, што раз-пораз зіркаюць у наш бок.

— Я зараз, зараз, — заспяшалася яна. — Ты пасядзі, Ляксандра, пачакай. Я хуценька.

— Не трэба, бабуля! — з роспаччу хачу я яе спыніць, чапляюся нават за яе руку, як малая, але яна толькі з папрокам пазірае на мяне і знікае ў сваім пакоі.

Паднялася б, пабегла ўніз па лесвіцы, каб не ведала, што глыбока пакрыўджу бабулю, што не змагу потым паглядзець ёй у вочы. Ёрзаю, тузаюся на канапе, ледзь утрымліваю сябе на месцы. Устаю насустрач ёй, насустрач яе руху.

— Вось, вазьмі, Ляксандра. Цэлы тыдзень адкладвала, у слоіку з вадой трымала, так што масла не сапсавалася, добрае. Мне залішне, мне хапае тут, а ты з'ясі.

— Нашто ты, бабуля?! — адгароджваюся я рукамі і адчуваю, як цяжка яны ўздрыгваюць. — Нашто? Я ж не паміраю з голаду. Я...

— Ты не можаш не ўзяць. Гэта ўсё, чым я багатая на сённяшні дзень, Ляксандра. Нічога іншага мне для цябе не здолець.

Яна трымае перад сабой невялічкі, лёгенькі пакуначак, і слёзы цякуць па яе маршчыністых шчоках.

— Хачу ўбачыць цябе вучонай, Ляксандра. Суддзёй... Хачу дажыць і ўбачыць, што ты заменіш свайго бацьку. Ты зможаш, я ведаю.

Ногі ў мяне падкошваюцца. Нікога, нічога няма ў цэлым свеце, апроч нас дзвюх, мяне і бабулі, апроч горкіх нашых слёз. Стоячы перад ёй на каленях, абдымаю бабулін стан, прыціскаюся палаючым тварам да казённай, калянай яе спадніцы і не магу астудзіць яго, каб ільга было падняць угару вочы.

— Што ты, Ляксандра? Ты ж не маленькая, — гладзіць яна мае валасы, мае плечы, што ўздрыгваюць на кожны пяшчотны дотык яе далоні. — Ты ж не хочаш, каб я потым плакала цэлы тыдзень, згадваючы гэтыя хвіліны?

Я не хачу, каб бабуля плакала, каб плакала з-за мяне і збіраю ўсю сваю волю, і падымаюся, зглынуўшы цэлы камяк слёз, і цалую яе маленькія, цяжкія ад пакру-

чаных жыл рукі, перш чым бяру з гэтых рук акуратна загорнутыя ў паперу бязважкія кубікі масла, сабраныя для мяне ў часе сняданкаў. Нічога і нікога не бачу, кіруючыся па калідоры да дзвярэй, што вядуць на лесвіцу. Пакуначак пячэ мне пальцы, а я не магу, не маю права, разняць, паслабіць іх. Азіраюся ад дзвярэй на бабулю — і не бачу яе: размытае слязьмі, пякучае святло сцякае па маіх шчоках...

Таропка праводжу па шчацэ далонню — далонь мокрая. Разгублена ўзіраюся ў яе, у рэзка прачэрчаныя на ёй глыбокія і ледзь прыкметныя лініі, у якіх запісаны, калі верыць хірамантам, мой лёс, так, быццам хачу ўбачыць не гэтыя лініі, а размытую слязьмі пляміну святла і ў ёй — прадаўгаваты, як у святых на іконах, пасечаны складкамі і зморшчынамі бабулін твар, атулены белай у дробную гарошыну паркалёўкай, завязанай пад барадой, яе шэрыя выцвілыя вочы, пяшчоту і трывогу ў гэтых вачах. Не дажыла бабуля, не прычакала майго дыплома... Так ніколі і не змагла я аддзячыць яе за любоў!

Прыкрываю мокрай далонню вочы: даўно не слухала музыку, даўно не памінала бабулю — адсюль і горыч. Адсюль і роспач перад прыпамінамі, што вяртаюцца і, вяртаючыся, прыгнечваюць, гнятуць, а не ачышчаюць душу. Ніхто мне не замяніў бабулю, ні перад кім не дазваляла я сабе плакаць пасля яе смерці — плакала пад гукі скрыпкі, сама, адна з сабой. Палёгкі гэтыя слёзы не прыносяць, але не было б гэткіх хвілін, душа ачарсцвела б, акамянела — і я не змагла б яе несці ў сабе: завялікі цяжар не аддадзенай нікому пяшчоты, і любові, і змогі...

Ах, як светла плача скрыпка Ойстраха ў ноктюрне з першага скрыпічнага канцэрта Шастаковіча — светла і ачышчальна! І што такое жыццё, калі не гэта спалучэнне, узаемапранікненне і ўзаемазнішчэнне святла і адчаю, адчайнага разумення сваёй сілы і сваёй бездапаможнасці? І што такое жыццёвы шлях, калі не гэта вечнае імкненне са змроку сумненняў і страхаў да святла, да такога яркага святла надзеі, якое толькі і можа вытрымаць душа? Можа, і нельга ўбачыць сапраўдны воблік жыцця, можа, і нельга распазнаць яго нораў, але ж і прызнаць сябе яго пакорнай паланянкай, рабой, а не гаспадыняй, няхай сабе і часовай гаспадыняй свайго

лёсу гэтаксама нельга. Адчай калі і перамагае, то на хвіліну-другую — перамагае, урэшце, святло, перамагае, павінна перамагчы надзея.

Ах, як светла плача скрыпка Ойстраха! — я не заўважаю горычы сваіх слёз. Здаецца, што як у маленстве, стаю на каленьках, уткнуўшыся тварам у бабуліну спадніцу, — і адступаюць, знікаюць роспач, роспачная злосць і недавер, і зноў са сколкаў патрушчанага крыўдай дня ўстае, падымаецца вакол дзівосны, бязмежны свет, асветлены сонцам і маёй надзеяй. І вось ужо ледзь заўважная ў высокім жыце пакручастая сцежка гукае мяне, бяжыць паперадзе, адводзячы ад майго твару каласы, бяжыць усё вышэй і вышэй на гару Мацееўскую, на самую выспу, дзе на цёплым, угрэтым за дзень валуне я буду ляжаць, шырока раскінуўшы рукі, адна, сам-насам з высокім небам. Сцежка пакідае мяне сам-насам з небам, па якім, ва ўсю шырыню майго пагляду, плывуць лёгкія белыя аблокі. Як аграмадныя белыя гусі, якіх лічыць не злічыць, колькі б на кожны дзесятак ні загінала я пальцы...

Святло пераліваецца ў мяне, пялёхкаецца дзесьці ў душы, і белымі, калючымі іскаркамі тонуць у гэтым святле цені аблокаў. Гэтыя цені, гэтыя іскаркі працінаюць мяне наскрозь, нябачнымі тонкімі ніцямі-промнямі прывязваючы да валуна і — праз валун — да зямлі, працінаюць і ідуць глыбока-глыбока, углыб гары, углыб зямлі, якая становіцца зараз мной, маім целам, маёй істотай. Ці гэта я станаўлюся ёй, зямлёй, адчуваючы шчаслівую блізкасць неба, блізкасць сонца? Ах, як спявае скрыпка, ах, як спявае! Голас яе, светла-ўрачысты і шчымлівы, не заглушыць аркестру, не заглушыць, не зламаць... Святло дужэйшае за цемру, надзея дужэйшая за адчай, заўтрашні дзень шчаслівейшы за сённяшні. Душа, ачышчаючыся, прагне гэтай веры і знаходзіць яе. Знаходзіць у сабе ж, сярод вечных сумненняў і страхаў. Знаходзіць, каб зноў развінуць нябачныя крылы і акрыць імі мяне, і маё мінулае, і маю будучыню.

Калі шчоўкае аўтастоп, спыняючы пласцінку, я балюча ўздрыгваю і чую: у дзверы звоняць, хтосьці націскае і націскае на званок. Кідаюся ў прыхожую, паварочваю ключ — дзверы ў той жа момант адчыняюцца.

— Вадзім?!

## XVII

Плыць у спакойнай вадзе прыемна. Праўда, далей ад берага яна стала халаднейшая — глыбіня большая, але рухі мае па-ранейшаму строга вывераныя, упэўненыя: плаваць я люблю і плаваю добра. Няшмат вольнага часу, але, як выпадае, выязджаю, за адсутнасцю лепшага, сюды, на Мінскае мора. Часам — у кампаніі саслужыўцаў, часцей — адна. Адной вальней. Адной можна блукаць уздоўж берага і, адышоўшыся далей ад агульных пляжаў, слухаць ціхі пошум ветрыка ў траве або соннае пялёхканне вады ў аеры. Ды і вось так заплысці на сярэдзіну затокі, як зараз, можна толькі ў баку ад тлумнага людскога лежбішча і бела-сініх лодак выратавальнай службы за дваццаць — трыццаць метраў ад яго.

Плыць прыемна. Яшчэ больш прыемна — адчуўшы лёгкую стому, перавярнуцца на спіну, раскінуць рукі і пагойдвацца на вадзе, прыкрытай сінім бяздонным небам, неба такое нізкае, што я нават адчуваю яго сухія гарачыя дотыкі. А вось вада халаднаватая, і, азірнуўшыся на бераг (далёка заплыла!), я вырашаю кіравацца да пясчанага астраўка, крыху правей, каб адпачыць там, сагрэцца і тады ўжо вяртацца. Пачынае паколваць у пальцах правай нагі, і раптоўна ўспыхвае трывога: занадта далёка ад берага, — дапамога ў выпадку чаго не паспее...

Цьфу! Знайшла пра што думаць на вадзе. Галоўнае — не мітусіцца, не прыспешваць рухі, каб не збіць дыхання. Да астраўка недалёка, метраў сорак — сорак шырокіх узмахаў рукі, сорак штуршкоў. Я нават пачынаю ў думках лічыць: чатыры, пяць... Нагу пачынае зводзіць. Адчуваю, што нямеюць пальцы, і міжволі паскараю рухі. Вось гэтага рабіць не варта: грабок павінен быць шырокі, штуршок — моцны. Сем, восем... Адзінаццаць... Дыханне ўсё-ткі збіла. І боль нарастае, штуршкамі перадаецца тулаву. Трэба нешта рабіць. Што? Што ў такіх выпадках робяць вопытныя плыўцы? Было б што-небудзь вострае...

Спрабую перагнуцца, сагнуцца напалам і дастаць пальцы, каб заламаць іх угору, балючым рухам зняць сутаргу, — даю нырца і глытаю трохі вады. Выныраю, адплёўваюся, зноў спрабую перагнуцца і ўшчыкнуць пазногцямі зведзеную сутаргай нагу — і зноў глытаю вады. Ат, чорт! Не тануць жа на самой справе.

Упершыню з'яўляецца страх. Нейкі вельмі спакойны страх. Ледзяны. Ён скоўвае рухі, і марна я спрабую падняць галаву і прыкінуць, колькі метраў застаецца да астраўка: нічога, апроч зеленаватай вады, не бачу. Быццам ужо апускаюся ў ваду, усё глыбей і глыбей... Раблю адчайнае намаганне і вынырваю — палоска зямлі блізка! Калі б не гэта зеленаватая, як бутэлечнае шкло, сцяна вады, мне трэба было б толькі зрабіць дзесяць—пятнаццаць узмахаў. Калі б не гэты холад, які скоўвае, ператварае мяне ў зеленаватую, як вада, лядзяшку.

Можа, закрычаць, загукаць? Мо пачуе хто і дапаможа? На астраўку звычайна нікога не бывае, але раптам? Раблю яшчэ адно намаганне — на кароткае імгненне выштурхваю з грудзей, з вады крык, адчайна чапляюся паглядам за блізкую палоску зарослай аерам зямлі, потым за светлую палоску неба... Аказваецца: тануць зусім не цяжка. Вось толькі грудзі занадта сціскае... Але вада раптам цяплее, не здаецца больш халоднай, чужой і страшнай: яна запаўняе мяне ці гэта я раствараюся ў ёй... Трэба зрабіць яшчэ адно намаганне, яшчэ адно! Не тануць жа на самой справе...

Вачэй я не заплюшчваю і таму не разумею, чаму раптам становіцца так цёмна, чаму я нічога не бачу. Грудзі, грудную клетку то сціскаюць, то адпускаюць якіясьці чорныя хвалі, пругкія і гарачыя, хутка яны пачынаюць калыхацца ўжо і ўва мне. Адчуваю, як растуць мяккія і моцныя штуршкі, ушыркі і ўгору, — вось-вось хлыне з мяне, выварочваючы нутро, вада. Яшчэ адзін штуршок... Яшчэ адзін... Боль разануў упоперак тулава, здаецца, разрываючы яго, імкліва рвануўся ўгару — горлам! — скаланаючы цела. На міг усведамляю, што хтосьці ўтрымлівае, падтрымлівае мяне, — і зноў толькі сутаргавыя ўсплёскі болю, калі ўсё, што адчуваю, — боль, рэзкі, нясцерпны ўжо: ледзь аціхае і зноў накочваецца, зноў скаланае мяне, — выдзіраючы вантробы.

Калі боль цішэе настолькі, што я пачынаю ўсведамляць, што жывая, што ляжу на цвёрдай зямлі і ад яе, ад зямлі, ідзе той калатун, які я ніяк не магу адолець, мне становіцца страшна. Па-сапраўднаму страшна. Я ж магла ўтапіцца — я ўжо танула! — і мне нічога не было шкада на гэтай зямлі... Нічога? Няўжо нічога? А сухія гарачыя дотыкі неба, калі ляжыш, шырока раскінуўшы рукі? Вось жа я чую іх зноў, гэтыя дотыкі! — менавіта

яны і вяртаюць мяне да жыцця: мякка, пяшчотна ўціраюць у мяне, у маю скуру цяпло — і ледзь прыкметна аціхае калатун, нават боль аціхае...

— Што? Ачуняла?

Чаму я нічога не бачу, хоць вачэй не заплюшчвала? Хтосьці спытаўся ў мяне, ці ачуняла, а сам хаваецца. Павярнуцца, перавярнуцца б на спіну, ды перашкаджае слабасць. Ад слабасці горка, горка ў роце. І яшчэ холадна, вельмі холадна. Калі б не гэтыя мяккія, пяшчотныя рухі, што ўціраюць у мяне цяпло, я прымерзла б да вільготнай, слізкай травы, на якой ляжу. Гэта чыесьці рукі! — здагадваюся, і вяртаецца страх. І насуперак яму, агіднаму, жывёльнаму страху, гарнуся да гэтых дужых рук, да іх жывога цяпла.

— Вось мы ўжо і паружавелі! Яшчэ дзве-тры хвіліны масажу — і можна вяртаць жыццю, — усміхаецца голас, а рукі, знаёмыя, дужыя рукі крышачку прыўздымаюць мяне за плечы і пасоўваюць на сушэйшае месца, нагрэтае сонцам. — Яшчэ трэба трошачкі пацярпець.

Ува мне прачынаецца радасць, дзіўная, незнаёмая радасць цела, калі радуецца жыццю, цяплу, сонцу кожная тканка, кожная жылка. Адчуваю, што па твары цякуць слёзы, цякуць, змываючы ўсё толькі што перажытае, няўцямна страшнае і халоднае. І вось я ўжо бачу светлую палоску неба, якая шырыцца, якая ператвараецца ў яркае сіняе ззянне, у перапялёсіны сонца над ім, і... І добры ўсмешлівы твар — не тушачы гэтае ззянне, гэтае сонца, набліжаецца да майго твару чыйсьці добры, усмешлівы твар.

— Ачуняла? Лягчэй?

Я не ведаю гэтага голасу. Я не ведаю гэтага твару! Спрабую адвярнуцца, адхіснуцца — і адчуваю: чужыя і такія знаёмыя рукі адпускаюць мяне, адступаюцца. Я не чую больш іх рухаў, іх цеплыні... Не, не, я не хачу! Мне холадна, мне вельмі холадна...

Падаюся назад, хінуся да іх, прыкрываючы позірк вейкамі — і рукі паслухмяна працягваюць пагладжваць, масажыраваць маё дрогкае, кволае цела. Такіх рук не баяцца, такім рукам верадь. Думаю праз сілу і п'ю, п'ю цяпло рухаў, цяпло рук, занадта пяшчотных для мужчыны.

— Я не гаспадзь бог. Я толькі ўрач, — адзываецца ён на мае думкі. — А ты прыгожая. Нават гэткая сінезялёная — прыгожая.

Няйначай, яго смех вяртае мне сілу, бо я раптам вырываюся з чараў моманту, са свайго здранцвення і, перамагаючы боль у жываце, саджуся. І зіркаю на яго, пакрыўджаная і разгубленая. Твар у мяне, відаць, добра перакасіла ад болю і крыўды, бо мой выратавальнік (хто ж яшчэ мог уратаваць мяне!) цяпер ужо не смяецца, а рагоча. На ўвесь астравок. Рагоча неяк вельмі добра, някрыўдна, па-дзіцячы шчыра і весела. Я ўжо гатова ўсміхнуцца ў адказ і тут заўважаю побач, на траве, свой ліфчык і палатнею.

— Адвярніцеся, — прашу, разгубленым рухам прыкрываючы рукамі грудзі.

— Ну, ну! — перастае ён смяяцца, заўважыўшы мой спалох. — Я ж добрых паўгадзіны рабіў масаж... І наогул, хаваць гэткую прыгажосць грэх.

Апошняе ён дагаворвае, ужо адвярнуўшыся, чакаючы, пакуль я спраўлюся з завязкамі.

— Дзякуй.

— За што? — жыва паварочваецца ён. — За тое, што вадзянікам не аддаў — сабе вырашыў прысвоіць? А?

— За ўсё, — з цяжкасцю прамаўляю, стараючыся стрымаць дрыжыкі: хапіла дотыку цяжкой, усё яшчэ мокрай тканіны, каб калатун вярнуўся з новай сілай.

— Э-э, ды ты зарана крыльцамі замахала! Гэтак уся мая праца прахам пойдзе... Падсаджвайся бліжэй.

— Не, не... Я сама, — пярэчу я: яшчэ чаго! цяпер жа я ўсё ўсведамляю!

— Ну, вось што! Я ўрач. Хірург. Звонаў Вадзім Пятровіч. І калі ўжо вывалак вас з вады — паспеў! — дык будзьце ласкавы слухацца. Не ўтапіліся, дык ад запалення хочаце памерці? Не выйдзе. Гэта — без мяне.

Ён нечакана пераходзіць на «вы», на афіцыйны докторскі тон, і гэта мяне калі не супакойвае, дык ацвярэжвае. Я не адхінаюся, калі ён падсаджваецца бліжэй, зусім побач, і горне мяне да сябе, замыкаючы ў моцным і, галоўнае, цёплым абдымку. Мне няёмка за свой калатун, за тое, што так гучна, як ні стрымліваюся, клацаю зубамі, але ў ім — цяпло, і я гарнуся да цяпла, стараючыся сцяцца ў як мага меншы камячок. Галаву паводжвае з боку на бок, і гэты нябачны, унутраны рух незаўважна пераходзіць у галавакружэнне. Цісне ў грудзях, баліць, здаецца, разваліваецца надвое галава.

— Хо... холадна... — хачу я растлумачыць штосьці яму і сабе, — прабачце...

— Не адхінайцеся! — загадвае. — А я буду расціраць далонямі скуру. Ні спірту, ні хоць бы ручніка, на жаль, няма.

І ён зноў расцірае па тулаве, па нагах цяпло, і я скараюся яго рукам, і баюся толькі аднаго — страціць, як маладушная паненка, прытомнасць: здаецца, усё набліжаюцца цёмныя халодныя хвалі, якія закалышуць мяне, зацягнуць у якуюсьці бездань...

Калі расплюшчваю вочы, бачу ўстрывожанага доктара (так, быццам ён раптам засумняваўся ў карыснасці сваіх дзеянняў, — мільгае недарэчная думка) і нечакана ўсміхаюся. Усмешка кволая — і я сама адчуваю, але гэты Вадзім Пятровіч ловіць яе радасна, увесь твар яго, да залацістых агеньчыкаў у позірку, святлее.

— Ну, нельга ж так палохаць урача! Вось... ледзь не дадаў па звычцы: хворая. Вас як завуць?

— Лё... Лёкса. Аляксандра Станіславаўна.

Губы слухаюцца з цяжкасцю, але выгаворваю я словы выразна — я ляжу на траве, сухой, колкай, мяне ўжо не калоціць: відаць, масаж і сонца зрабілі сваё.

— Дык вось, Аляксандра Станіславаўна, нам трэба неяк з гэтага становішча выбірацца. А вы, баюся, не даплывеце ў такім стане. Кволасць перашкодзіць. Як?

Хачу сказаць: даплыву. Але пры адной думцы, што давядзецца зноў лезці ў зеленаватую халодную ваду, сцінаюся, дзеравянею.

— Вось і я кажу: не даплывеце. Падняцца можаце?

Я павольна падымаюся. Пільна сочачы за мной, за кожным маім рухам, падымаецца і доктар.

— Брава! Маладцом! — падбадзёрвае. — А зараз зрабіце колькі крокаў.

Паслухмяна ступаю крок, другі... Кружыцца галава, цела цяжкое і непаслухмянае. З таго свету, лічы, выцягнуў... Двойчы пашанцавала: і што ён апынуўся тут, на гэтым астраўку, і выцягнуў мяне з вады, і што доктарам аказаўся... Скажу яму...

— Маладцом! Цяпер, мяркую, самы час меры нейкія прымаць. А?

Насцярожваюся. Упіваюся ў яго паглядам, старанна адварочваючыся ад шырокай і цёмнай паласы вады.

— Зробім так, — пазірае ён на гэту паласу вады ў мяне за спіной. — Я паплыву. Пакіну вас...

— Не! — нечакана нават для самой сябе кідаюся я да яго — якаясьці сіла кідае! — я павісаю ў яго на шыі. — Не, не!

Ён, відаць, разгубіўся: не чакаў такой імклівасці. А я пачынаю разумець, што гэта за сіла падштурхнула мяне, — страх! Страх застацца адной, бездапаможнай, агароджанай ад берага, ад жыцця шырокай, цёмнай паласой вады. Страх, большы за мяне. Таму што я не адчуваю ні сораму, ні простай няёмкасці: толькі б утрымаць гэтага чалавека! толькі б ён не пакінуў мяне!

Доктар асцярожна абдымае мяне за плечы, не горне да сябе і не адштурхвае. Толькі мякка паўтарае: «Ну, ну! Ну, ну!»

— Вы не пакінеце мяне? Вы не кінеце мяне тут? — адхінаю я галаву ад яго пляча і зазіраю яму ў твар. — Не кінеце?

— Дурненькая! Які ж гэта ўрач кідае таго, каго ратуе? — сур'ёзна, вельмі сур'ёзна адзываецца той і цяпер ужо мякка і моцна прыціскае мяне да сябе, так мякка і так моцна, што я раптам захлынаюся незнаёмым п'янлівым цяплом, адчуваючы: у грудзях б'ецца нібыта не адно сэрца, а цэлых два — гэткі шум усчаўся.

— Востраў Наш... Гучыць! Давай назавём яго так, Наш?

— Лепш ужо востраў Тапельніцы, дакладней, — адказваю яму ў тон і чую, што чырванею: вішу на шыі ў чужога, незнаёмага, па сутнасці, чалавека, няхай сабе ён і доктар, і яшчэ жартую ў адказ на яго жарт.

Спрабую ціхенька, каб не пакрыўдзіць Вадзіма Пятровіча (сама ж кінулася на шыю!), вызваліцца з абдымку — ён паслабляе рукі, але па-ранейшаму горне мяне да сябе. Раблю яшчэ адно намаганне — маё напружанне перадаецца і яму.

— Што? Няўтульна? — пытае. — Ці былы недавер вярнуўся?

— Мы як двое закаханых.

— Мы і ёсць двое закаханых. Закаханых у жыццё, у сонца, у лета. Пастаім...

Не знаходжу ў сабе сілы вырывацца. Ні сілы, ні асаблівага жадання (тады ж адразу трэба будзе нешта вырашаць!) няма, і ён адразу гэта разумее.



— Пастаім... Набірайцеся сілы. І цярпення дачакацца мяне з лодкай. Ці паплывём?

У адказ толькі шчыльней прыпадаю да Вадзіма Пятровіча, злёгку адварочваючы твар ад гарачага дыхання яго цела. Гэта страх. Гэта нейкі падсвядомы страх страціць апору, страціць цяпло. А можа, і яшчэ штосьці... Штосьці таемнае, незразумелае...

— Што-небудзь здарылася, Вадзім? — адступаю ад дзвярэй, прапускаючы яго.

— Я думаў... Мне пачулася, што ты гукала мяне, Лёкса. Што ты роспачна гукала мяне аднекуль здалёк, ледзь не з таго вострава, які помніць нас, шчаслівых выпадковай сустрэчай. І я кінуўся да цябе. Нават пра тэлефон не ўспомніў. Вось! — без перадыху выклаў тое, што яго трывожыла, што яго прывяло.

— З дому? — зачыняю дзверы і, не запрашаючы Вадзіма прайсці ў пакой, кіруюся з прыхожай, паўз яго.

Вадзім прытрымлівае мяне за руку, мякка вяртае, нібы падцягвае да сябе, абдымае.

— Сказаў, што задыхаюся ў доме, што мне трэба надыхацца свежым паветрам. Я, праўда, задыхаюся, Лёкса. Чуеш?

Яшчэ адзін міг, яшчэ адзін дотык яго вуснаў да маіх валасоў — і я не змагу, не здолею адхінуцца, адарвацца. Неяк вельмі балюча ўсведамляю гэта і пачынаю вызваляцца з палону яго рук, з палону яго пяшчоты.

— Што? Няўтульна? — пытае, не хаваючы смутку. — Значыцца, ты не гукала мяне. Мне проста пачулася.

— Мы як двое закаханых.

— Закаханы тут адзін.

— І гэта, канечне, ты! — вяртаецца да мяне неабходная душэўная сіла: ледзь не зблытала згадку з рэальнасцю. — Пойдзем, закаханы, чаем напаю. Ці свежае ў маім пакоі паветра, сам вызначыш, а чай свежы завару.

Іду прама на кухню: няхай Вадзім супакоіцца. Шчырую там хвілін пяць, мо крыху даўжэй, не ўслухваючыся ў тое, чым займаецца госць. Я рада, што ён прыйшоў, і не хаваю гэтага. Але ж не кідацца яму на шыю. Мінулася тое... Сям'я ў Вадзіма, дачка... Радасць сваю можна і не паказваць яму, сэрца сваё можна і не слухаць.

Паднос з посудам уздрыгвае ў руках: Вадзім з шэрым, мёртвым тварам (гэткі ён нерухомы!) і староннім,

чужым позіркам сядзіць, згорбіўшыся, на канапе. У першы момант мне здаецца, што ён плача. Ступаю да століка, стаўлю — упускаю паднос, рассыпаўшы кавалачкі цукру. Кідаюся да Вадзіма, укленчваю перад ім, абхопліваю рукамі яго стан, прыціскаюся тварам да грудзей.

— Што ты, Вадзім? Так кепска табе? Так горка?

Ён быццам прачынаецца. Выпрамляецца, стараючыся не адштурхнуць мяне. Абхоплівае далонямі маю галаву, узіраецца ў мяне, цалуе вочы, апярэджваючы ціхія; горкія мае слёзы, і доўга шукае ў сабе ўсмешку. Нарэшце ўсміхаецца, і падымае мяне за плечы, і, не адпускаючы, усаджвае на канапу, і паўтарае мой нядаўні рух — апускаецца на калені, горнецца да мяне. І зноў цалуе. Цалуе вочы, шчокі, балюча сцяты мой рот. Прыкрыўшыся павекамі, бачу, што ён плача. Ці гэта я плачу, і слёзы трапляюць на яго губы... Калі я сама цягнуся да яго пацалунка, гладзячы, лашчачы яго валасы, адчуваю: пацалунак салёны.

## XVIII

Згадкі... Дні, што даўно належаць мінуламу... Адны з іх нічым ніколі пра сябе не нагадваюць: так, усякага кшталту старызна, варонніна пяро пад скручанай у жгут касынкай, бухматыя матылі над рамонкамі, воклічы, забытанае ў зялёнай павуціне рэха, старыя каракулі, веласіпедныя колы, пісьмы з неразборлівымі подпісамі, розныя папрокі, шкадаванні, пабляклыя мроі, розныя пахі, закінутыя, парослыя крапівой сцежкі саду, самадзельныя дэкарацыі да сваіх жаданняў, штосьці, сама не ведаю што... Другія ж не проста нагадваюць пра сябе — нагадваюць патрабавальна, зноў і зноў вяртаюцца, нежаданыя, здавалася, забытыя, здавалася, пераможаныя, заслоненыя поўнымі спраў і мітуснімі буднямі, і афарбоўваюць сваім яркім і рэзкім, не прыглушаным гадамі святлом хвіліны роздуму. Ды што там афарбоўваюць! — паглынаюць. Вяртаючы пачуццё нейкай вінаватасці, нейкай віны. Сцвярджаючы сваё значэнне, ці сваю важнасць, ці сваё непадабенства: урэшце, усе іншыя дні і падзеі былі ці перад імі, ці пасля іх. Яны — адмеціны. Ад іх — адлік. Які адлік? Адлік чаго? Пра гэта няма ў каго запытацца...

Часам невыносна цяжка думаць, што гэтыя згадкі —

усё, што засталося ад пеража́ытага. І горш таго — усё вартае. Думка жахлівая, нават калі яе не прымаць: былі ж гады работы ў судзе, гады складанай, цікавай работы! Былі... Можна прыгадаць самыя неверагодныя выпадкі, самыя хвалюючыя працэсы... Які б прыгадаць? Ат! Колькі ні ўспамінай — цьмяныя абрыўкі чыіхсьці прызнанняў, стомленыя ці, наадварот, бліскучыя ад цікаўнасці вочы ў зале суда, параграфы кодэксу, спалоханы твар (менавіта твар, а не чалавек) на лаве для сведкаў, пракурорскае: «Я прашу вынесці самую строгую меру пакарання...» Хоць кожная мера — строгая, кожны прысуд абскарджваецца. Кожны. Апроч таго, які выносіш сабе сам.

Ян, канечне, свіння. Калі не сказаць больш. Але ж хвалюе мяне, па сутнасці, не той прысуд, які яму вынесуць на судзе (ён абсалютна відочны!), а той, які вынесены мне. З-за яго. З-за яго ўчынку. Хіба я гэткую меру заслужыла? Хіба заслужыла?

А тут яшчэ і згадкі... Іду назад, па сваіх слядах, ад згадкі да згадкі, і губляюся сярод іх — то знаходжу, то не знаходжу знаёмыя адмеціны, калісьці зробленыя памяццю засечкі-крыжыкі: згінуць і няма ніводнай, каб учапіцца, зачапіцца, усвядоміць хвіліны — хоць бы хвіліны! — паміж учора і тым, што было раней. Ці пазней...

Спрабую ісці назад, па сваіх жа слядах, і разумею: гэта марныя спробы, гэта спапялёныя сляды. Дзверы ў мінулае... Сцежка ў мінулае... Глупства. Несусветнае глупства! Ды калі б і былі такія дзверы, я забіла б іх, я заклала б іх цэглай і замуравала — сама, як бы ніхто іншы не ўзяўся! Ды калі б і напраўду існавала гэткая сцежка, я засеяла б яе дзядоўнікам, лесам засадзіла б нашмат кіламетраў уздоўж і назад: толькі б адступілася яна ад мяне, толькі б не змушала вярнуцца. Я не хачу вяртацца. Ні ў сваё маленства, ні ў сваё юнацтва. Вось бы ўжо ніколі не ўсклікнула: о, каб мне мае васемнаццаць год... Не, не. Адмовіцца ад мінулага, на жаль, нельга — я ж чую яго звярынае дыханне за спіной, але жыць, увесь час азіраючыся... Не, не! Не хачу. Не буду. Няхай сабе гэта толькі страх, раней заўсёды мой страх, што мінулае, урэшце, не адступіцца — затопіць, зможа загнаць мяне назад, у свет хлусні, у свет задушаны злосцю, злосным неразуменнем дабрыні, той свет, які даўно нагадвае могілкі. Ды чаго там нагадвае?

Ён і ёсць магілкі, на якіх ужо не раз і не двойчы зялёнай пенай перакіпала трава. Над бацькам. І над бабуляй. І над маткай...

Упершыню так балюча адчуваю тугу ў крыві. Быццам на мне сыходзіцца і закончыцца род Радзінскіх, на мне, на жанчыне, а я... А што я? Не прадугледзіш жа ўсё, што можа здарыцца. Усё, што хочаш, заўсёды магло здарыцца ў нашай сям'і: у кожным — штосьці ад шалёнай матчынай тугі. Вось гэтай тугі крыві, якая высмоктвае сэрца і цёмнымі, ліловымі кругамі праступае штораніцы пад вачамі, тугі, ні прычыны, ні тлумачэння якой я ў сабе не знаходжу.

Ну, еду я зноў у раён, да Фёдара Ануфрыевіча — да Яна! Нават цёплы світэр яму захапіла... Ян, канечне, свіння, калі не сказаць больш, але ж усім не растлумачыш. Фёдар Ануфрыевіч яшчэ мінулы раз пытаўся, ці не прыехала я наведаць брата, ці не збіралася пагаварыць з ім. Не збіралася. Тады гэтак і сказала. Я і сёння не збіралася — як падштурхнула што. Упэўненасць Янава, што я не прыеду. Ці згадкі, якія так лёгка перайшлі ў сон, што, прачнуўшыся, я доўга не магла супакоіць сэрца. Ці мо гэтыя кругі пад вачамі, якія так засяроджана паўтарае люстэрка.

Хаваю люстэрка ў сумачку, здымаю з крука плашч — прыехала. Платформа ў рэдкіх падцёках учарашніх лужын няспешна напаўзае на акно. Цягнік раздругі тузануўся і застыў. І я падымаюся, іду да дзвярэй, раздражнёна адганяю невядома адкуль узніклую ўпэўненасць, што бачыла на платформе Фёдара Ануфрыевіча, што ён мяне сустракае, — з чаго б яму раптам мяне сустракаць? Не з праверкай еду, не з місіяй, як бывала раней... Званіла яму, што прыеду. Дык не першы ж раз прыязджаю — не было ў яго гэткай звычкі. Машыну, калі прасіла, прысылаў... Мо што непрадбачанае здарылася? Мо Шатэрнік?

— Добры дзень, Шура.

Ён. Фёдар Ануфрыевіч. Адзін. Усё гэткі ж падцягнуты, маладцаваты. Толькі скроні зусім сівыя (мінулы раз чамусьці не заўважыла) ды ў вачах за шкельцамі строгіх акуляраў ледзь прыкметна ўспыхваюць і тут жа гаснуць трывожныя агеньчыкі. Незнаёмыя агеньчыкі... А і цёмна-сіні на тоўстай футравай падкладцы ягоны плашч і яго чорны капялюш усё тыя ж, добра знаёмыя: гэта яго стыль, колькі помню яго не ў форме.

Вітаюся. Падаю руку. Не выказваю здзіўлення. Можа, толькі больш пільна, чым звычайна, углядаюся ў яго твар, у светлыя, злёгку зеленаватыя вочы за акулярамі: відаць, штосьці ўсё ж здарылася.

— Нічога не здарылася, Шурачка. Нічога нечаканага, — адказвае ён на непрамоўленае пытанне. — Я рады, што ты ўсё-ткі захацела пагаварыць з братам. Мо і мне чым дапаможаш.

— Патрэбна дапамога? Чаму ж вы не сказалі?

— Радзінскаму, безумоўна, ніхто не можа забараніць гэтак жа зацята, як зараз, у часе следства, маўчаць і на судзе. Але ж гэта не дапаможа справе. Наадварот.

— Ён і з Лёнай, з сястрой, адмовіўся гаварыць.

— Я ведаю.

— Я не хачу яго бачыць. Я...

— Ведаю. І ўсё ж ты прыехала, і я рады. За цябе. Мінулы раз мне здалося, што ты спалохалася. Як бы табе мякчэй растлумачыць... Спалохалася наперад той платы, якую з цябе возьме жыццё. Я разумею: гаворка ідзе пра тваё прызванне, ведаю — сам калісьці з цяжкасцю адмовіўся — пра зманлівасць кар'еры і твае ахвяры.

— Фёдар Ануфрыевіч, — слаба пратэстую я (прычына таго, што ён сустрэў мяне на вакзале аказалася простая: кабінет следчага — не месца для падобных гаворак). — Справа не ўва мне.

— Пачакай, паслухай, Шура. Я шмат перадумаў за гэтыя дні. І пра сябе. І пра цябе. Сам жа некалі паўтараў табе: расці! Расці, калі бачыш у гэтым сваё прызванне, казаў я. Нават тады, калі ты паехала, калі ты ў рэдкіх тэлефонных размовах пачала скардзіцца на вечныя пераматмленні і адсутнасць па-сяброўску чыстых адносін з калегамі, я верыў, што ты справішся, што гэта проста — новая работа, большы маштаб, аб'ём яе, большая адказнасць, нарэшце. Я верыў, што ты справішся. А потым ты амаль перастала званіць. І ў голасе з'явіліся незнаёмыя сухія ноткі. І Марыі Антонаўне забывала перадаць паклон... Ты не падумай, Шура, што я і Маша на цябе ў крыўдзе. Ты не падумай. Мы любілі — мы любім цябе, гэта так. І не ў асуджэнне табе я кажу. З трывогай кажу. Вырашыў сказаць. Пасля таго як ты — ты, Шура, юрыст, суддзя, жанчына! — не захацела ўбачыць брата, я спытаўся ў сябе: што здарылася?

Мы ідзём па вузкім, няроўна выкладзеным цэмент-

нымі, даўно вышчарбленымі пліткамі тратуары, і зрэдку, калі трапляецца купка школьнікаў, заклапочаная, абчапляная сумкамі гаспадыня, ці абыякавы, зранку хмуры, як гэты асенні ранак, рабочы-будаўнік у ссунутай на патыліцу ржава-рыжай касцы, Фёдар Ануфрыевіч толькі крыху запавольвае хаду, прапускаючы мяне наперад і прапускаючы сустрэчнага, і гэтак жа, як і раней, ціха працягвае:

— Ні я, ні Маша — ніхто з нашых — не заўважалі ў табе чэрствасці або прагі асуджэння. Ты не асуджала, ты — так, як патрабуе таго закон, — судзіла, шукала і знаходзіла справядлівае рашэнне. Мне здавалася, ты любіш людзей.

— Мая прафесія змушае мяне любіць людзей, — кажу і тут жа ўсведамляю, што кажу не тое, а ён ужо ўскідвае галаву і, ледзь зірнуўшы, адводзіць згаслы позірк.

— Змушае, Шура?

— Я не так сказала, — злуюся я на сябе і на яго: навошта гэта маралізатарства, калі душа і без таго прыгнечана? — Не так хацела сказаць, Ануфрыевіч, вось і прагучала недакладна. Не змушае — патрабуе, умову такую агаворвае... Хіба не прафесія, урэшце, вызначае паводзіны, а значыць, і адносіны да людзей, а значыць, і пачуцці? Хіба не прафесія вымагае пэўнай дзейнасці, пэўных слоў ва ўжытку? А?

Ён не адказвае. Глыбей засунуў рукі ў кішэні плашча, нахіліў крыху ўперад галаву, прыспешваючы крокі. Я помню гэту яго звычку ўпарта ўцякаць ад адказу, калі ён не задаволены, не згодны і не хоча выказваць сваю нязгоду, і шукаю больш пераканаўчыя словы.

— Кожны з нас у жыцці выконвае адведзеную яму ролю. Ці не так? Прадвызначэннем гэта яшчэ называюць. Або і прызваннем. Справа не ў назве. Справа ў тым, што адзін выконвае сваю ролю чэсна, напружваючы ўсе свае духоўныя сілы, а другі — абы з рук, абы дзень да вечара... А ўсё астатняе — словы. Словы, Фёдар Ануфрыевіч, цану якіх вы ведаеце гэтак жа добра, як і я. За што ж вы судзіце мяне?

— Я табе не суддзя, Шура. Ты ведаеш. Я хачу зразумець, што здарылася.

— Мой брат забіў чалавека, — не хаваю я горычы. — І гэта не так мала, каб рабіць выгляд, што нічога не здарылася.

— Твой брат няшчасны, хворы чалавек. Хоць гэта наўрад ці змякчыць пакаранне... — няўпэўнена пярэчыць Ануфрыевіч, і я дзіўлюся на гэту яго няўпэўненасць, на гэтыя спачувальныя ноткі ў яго голасе: ён жа зусім не ведаў Яна!

— Вы ж не ведалі яго, вы ж не ведаеце! — здзіўлена, глуха адгукаюся на яго словы, раз і другі раз зглынуўшы горыч.

Стала горача шчокам. Стала прыкра. Што ён думае, што ён перадумаў пра мяне за гэтыя дні? Што зразумеў пра мяне і пра Яна? Што я не любіла, не люблю брата? А за што мне яго любіць! Надараюцца хвіліны, калі я думаю: лепей бы забілі яго, Яна...

— Ты памыляешся, Шура. Я ведаю пра Яна Радзінскага столькі, колькі і ты, відаць, на сённяшні дзень не ведаеш, — работа ў мяне такая. Але я не пра яго, я — пра цябе... Адкуль гэтая чэрствасць у тваёй душы, адкуль гэтая жорсткасць, якая мяне ў табе палохае? Што здарылася, што яшчэ здарылася? Што высушвае тваю душу? Горад? Кар'ера? Няўдалае каханне? Адзіноцтва?

Заўважаю, што мы спыніліся. Што Фёдар Ануфрыевіч сціскае абедзве мае рукі ў сваіх сухіх, напружаных, прыемна цёплых далонях. Што ён з трывогай узіраецца ў мяне, у мой зніякавелы, мабыць, твар. Што мы ўсяго якіх трыццаць крокаў не дайшлі да месца і на ўсю вулічку — адны. Ён штосьці пытае?

— Што табе баліць, я чую. Што?

— Не ведаю, — выціскаю праз балюча сашчэпленыя губы. — Можа, гэта страх.

— Страх?! — злёгку адхінаецца ён, не выпускаючы маіх рук. — Ты баішся за сябе, за сваю кар'еру? Але ж ёсць добры дзесятак магчымасцей...

— Я баюся стаць безабароннай, як там, у мінулым... Я ненавіджу мінулае!

Ён выпускае мае рукі. Моўчкі, з цяжкой (мяне гняце яе непрыемны цяжар) пяшчотай глядзіць на мяне. Потым апускае вочы, нейкі міг разглядвае наскі сваіх чорных на тоўстай падэшве асенніх паўбацінак і, перамагаючы раптоўнае хваляванне, амаль спакойна вяртаецца да ранейшага тону ў гаворцы.

— Нянавісць высмоктвае сэрца. Павер мне, старому следчаму, Шурачка, якому даводзілася калупацца ў самых пустых душах. Не заслужыць чыёйсьці любові —

усяго толькі няўдача, не любіць — няшчасце, і няшчасце аграмаднае. Сёння ўсе мы паміраем ад гэтага няшчасця... Стаць на ногі, стаць дужым, што б там ні было, што б ні здарылася — вось памкненне ледзь не кожнага з нас. А сіла... сіла не ведае адпачынку.

— Чаму вы гаворыце з такім смуткам? Хіба гэта кепска — быць дужай?

Пытаюся, адно каб перапыніць Фёдара Ануфрыевіча, каб перавесці гаворку на што іншае, лягчэйшае, больш агульнае. Як яму растлумачыш усё, пра што думаецца? Думаецца пра рознае. І пра тое, што вось нешта ў жыцці выпадкова супадае або не супадае, сутыкаецца з чымсьці іншым і ўсё псуе... і, калі хрыбетнік ламаеш, каб чагосьці дасягнуць, каб жыццё мела сэнс, аказваецца — усё ў ім залежыць не ад мяне, а ад мінулага, усё ідзе карэннем кудысьці ў далёкую далячынь, да няшчасцяў брата, да бацькоў, да бабак і дзядоў, так далёка, што сэрца абмірае. Можа, таму і радасці як не было.

Вось кінула Фёдару Ануфрыевічу сваё горкае: «А ўсё астатняе — словы. Словы, цану якіх вы ведаеце гэтак жа добра, як і я...», а што гэтым сказала? Кожнаму з нас — выключэнняў тут не бывае! — даводзіцца прайсці і праз гора, і праз пакуту, і, каб іх перанесці, трэба ўвесь час паўтараць сабе якіясьці словы... А то я гэтага не ведаю! Вось і зараз... пытаюся... Быццам не ведаю, што кепска быць якраз слабым, бязвольным, гатовым прыняць любую злыбяду.

А Фёдар Ануфрыевіч маўчыць. Даўно, відаць, маўчыць.

— Я што-небудзь не так сказала? — не вытрымліваю паўзы.

— Чалавек не ўвесь у тым, чым яго лічаць. Пэўна ж. Вось і ў табе я прагледзеў трагедыю, — спакойна, амаль абыякава адгукаецца той, і гэты спакой, гэтая абыякавасць у голасе так не пасуюць да трывогі, да балючай трывогі слоў, што я нават не спрабую схаваць здзіўленне.

— Трагедыю? Ува мне? Пра што вы, Ануфрыевіч?

— Маша заўважыла... Яна неаднойчы казала мне: «Прыгледзься! Якаясьці ўнутраная сіла змушае Шурачку трымацца прама, змушае ніколі і ні перад кім не згінаць спіны, а ў куточках вачэй стаілася пакутнае напружанне, глухі балючы нерв. Быццам яна і сама не

можа зразумець, што гэта за сіла, што гэта за пачуццё, а таму і не знаходзіць ім выйсця, таму і не можа пазбавіцца ад напружання...» Маша казала, а я адмахнуўся. Вось і зараз амаль што адмахнуўся ад твайго прызнання.

— Я не разумею... — суплю я бровы, адчуваючы, як вось-вось захлісне мяне цёплая хваля пяшчоты: яны мяне любілі! яны мяне любяць! — і так стараюся справіцца з абуджаным пачуццём, што ў першы момант не заўважаю ў словах Фёдара Ануфрыевіча трывогі.

— Ты сказала пра свой страх. Ты сказала: «Я ненавіджу мінулае!» А нянавісць высмоктвае сэрца. Табе цяжка, табе балюча ад гэтага. Калі... калі ты не вырвеш яе з сэрца, ты прыйдзеш да прызнання, што ніколі... ніколі нікога не любіла, — запінаючыся, дагаворвае ён і мякка, быццам просячы прабачэння, зазірае мне ў вочы. — З нянавісцю ў сэрцы нельга жыць, Шура.

— А што б я змагла інакш? — я ўжо адолела раптоўную слабасць і гавару рашуча, падкрэсліваючы рашучасць слоў лёгкімі ўзмахамі рукі. — Ні для каго няма падрыхтаванага, гатовага месца. У мяне — не было! Я сама павінна была змагацца за сваё месца ў жыцці, сама павінна была кінуць у полымя гадоў, у полымя барацьбы сваю маладосць — і яна згарэла ў ім, спапялілася. Нікога з блізкіх не шкадавала, не пашкадавала? Але ж я не шкадавала і сябе, каб вырвацца са свайго акружэння, каб вырвацца з нядолі, з гразі. З гразі — я дапускаю, у якой захлынуўся хтосьці іншы. Што б я змагла інакш? Памяняцца з кімсьці сілай і застацца растаптанай? Даць жыццёвым абставінам сябе растаптаць, як яны растапталі Яна і топчуць дзесяткі, сотні людзей, занадта кволых, каб выправіць свой лёс? Што?

— Ты гэта сур'ёзна, Шура? — бездапаможным, нейкім старэчым рухам папраўляе Фёдар Ануфрыевіч акуляры.

— Куды ўжо сур'ёзней! — адмахваюся ад яго руху, ад яго жэсту. — Я не разумею, што можа звязваць такіх розных па духу людзей, як я і Ян... ці гэты... матчын Міколка. Што гэта за повязі, якіх не відаць! А вяжуць жа мёртвым вузлом, не вырвешся, як ні вырывайся. Год, два, тры, дзесяць гадоў мінае — нібыта адмерла ўсё, адвалілася... Аж не! Зноў штосьці зводзіць, зноў заблытвае дні, думкі, сцежкі. І цягне, цягне мяне кудысьці ўніз. Назад і ўніз. І нічым ад сваёй крыўды не адку-

пішся — хіба што ўсёй крывёй, у якой расплаўлены якіясьці крышынкі мінулага.

— Ты нічога не разказвала нам пра сваё маленства.

— Там адна нянавісць.

— Шурачка! У наш час... Няхай і цяжкія гэта былі гады...

— Лёгкіх гадоў не бывае, Фёдар Ануфрыевіч. І раны ў сэрцы пакідаюць не гады, а людзі. На жаль, у мяне гэта былі самыя блізкія мне людзі.

— І ты ніколі не захацела забыць, даравать?

Зноў гэты бездапаможны, поўны прыхаванай роспачы жэст: рука яго слепа цягнецца да акуляраў... Я не адрываю ад яе вачэй, адчуваючы, што штосьці ўва мне абрываецца — абарвалася і пачало расці, шырыцца ў грудзях, сцінаючы дыханне, запавольваючы ўдары сэрца. Я яшчэ штосьці адказваю... вельмі гучна... амаль што крычу яму. «Хацела, хацела забыць! Ды не забываецца! А даравать — не! Не хацела!» Я яшчэ паспяваю падумаць, што трэба напружыць усю волю, каб раптам не захлынуцца гэтымі словамі, гэтым сваім крыкам: надта ж пачарнела ўсё вакол, надта ж захісталася...

Пахіснулася сцяна. Акно плыве кудысьці ўгару і застывае высока скошаным вуглом недзе пад самай бэлькай, над распатланай матчынай галавой. Бачу толькі яркі ромб акна з пахіленым крыжам цёмнай рамы і гэтыя распатланыя залацістыя валасы тырчком вакол галавы. Твар расплываецца ў цёмна-сінюю ультрамарынавую, як сіняк у яе пад вокам, пляміну, і гэтыя два колеры, што адштурхваюць, адмаўляюць адзін аднаго, смяюцца адзін з аднаго, і складаюць сутнасць не толькі гэтага моманту, але і гэтай жанчыны, якую я павінна называць маці. Маці не выбіраюць... О, горкі смак гэтай ісціны я добра ведаю! Змалку ведаю. І праклінаю! Чаму мая маці — вось гэтая п'яная жанчына ў пакамечанай, выцягнутай спераду спадніцы з распатланымі, не часанымі пасля качання ў ложку валасамі і вялізным сіняком пад правым вокам (рэзнулася, няйначай, аб спінку, падымаючыся)? Чаму мяне нарадзіла менавіта яна? Стаіць, хістаецца, вярзе нешта пра мацярынскае сэрца... Быццам яна была камусьці з нас маці!

Сплёўваю ад агіды, спрабую позіркам вярнуць на месца перакошанае маёй злосцю, маёй нянавісцю акно,

адпіхваю яе рукі, бо яна зноў пачынае чапляцца за мяне са сваім п'яным: «Дачушка! Дачушка!», — адпіхваю раз і другі.

— Дай прайсці! — сіплю.

Але яна ўсё чапляецца за мяне, драпаючы пазногцямі, і, калі раптам ушчаміла маю руку ў сваіх, павісае на мне ўсім цяжарам, дыхае ў самы твар перагарам, горкім пахам тытуню і яшчэ чымсьці кіслым. Млосць адпадступае ў мяне да горла, я спрабую вырвацца, адпіхваю яе локцем і другой рукой. Я ўжо амаль вырвалася, як яна ўпілася раптам пазногцямі ў маю руку і залямантавала:

— Сучка! Драная даўганосая сучка ты! Усё шпіёніш за мной! Усё выглядваеш і морду перакошваеш! Як жа... Яна, бачыце, чысценькая, а маці гуляе... А хто вас корміць, а? Хто вас корміць, я пытаю?

Я задыхаюся. Ад перагару. І ад яе слоў. Раблю неапісальнае намаганне і адрываюся ад яе. Страціўшы апору, яна ледзь утрымліваецца на нагах, але робіць колькі крокаў і зноў загароджвае мне дарогу — я не паспяваю зглынуць млосць і праслізгнуць паўз яе. І вось яна ўжо ідзе на мяне. З кулакамі. З крыкам. Крыку я не чую. Бачу толькі яе перакошаны крыкам рот. Калі кулак яе злосна апускаецца на маё плячо, штосьці ўва мне абрываецца. Я ўгінаюся, быццам пад цяжарам гэтага нічым не заслужанага ўдару, і, угнуўшыся, раптам бачу зусім побач, пад нагамі, штосьці цяжкое — сякеру! Рукі самі цягнуцца да яе, да сякеры, не ўсведамляючы свайго руху, свайго намеру...

— Дык гэтак ты з маці! Гэтак ты з маці, сучка! — малоціць яна па маёй галаве, па плячах, па спіне.

Не ведаю, адкуль бярэцца нейкая няўцямная, шалёная сіла — рэзка разгінаюся, з сякерай у руках:

— Пусці-і! Заб'ю!

Гэта не мой голас. Гэта хтосьці ўва мне дзіка, перамагаючы боль і страх закрычаў: «Пусці-і!. Заб'ю!» Сякера — рукі мае, трымаючы сякеру, узлятаюць над галавой. У грудзях, злева, там, дзе павінна біцца сэрца, а зараз штосьці глуха, балюча звініць, нараджаецца новы страх. Ліпкі і халодны, гэты страх народжаны жахлівай думкай: калі яна не адступіцца — рукі апусцяцца, апусцяць сякеру на што трапіць...

Матка цверазее. Я зусім блізка бачу яе вочы, не спалоханыя, а раптоўна працверазелыя. Бы яна раптам

адчула ўва мне, пятнаццацігадовай, нямую, шалёную сілу, бы раптам зразумела, якая бездань паміж намі, паміж ёй, маёй маці і мной... Міг мінае. Другі. Я не ведаю, колькі часу вісіць узнятая мной у паветра сякера. Калі матка адступае, не зводзячы з сякеры, з маіх рук вачэй, сіла мяне пакідае, рукі дранцвеюць, і сякера падае на падлогу. Падае цяжка: зноў пахіснулася сцяна, зноў узлятае кудысьці ўгару, пад самую бэльку акно з нахіленым управа крыжам цёмнай рамы...

— Табе лепей, Шура? Шура!

Свядомасць вяртаецца марудна: спярша ўрываецца аднекуль здалёк трывожны голас Фёдара Ануфрыевіча, потым адчуваю, што вось ён, голас, побач, над самым вухам, а я амаль вішу, абвісла, відаць, на падстаўленай Фёдарам Ануфрыевічам руцэ і спрабую выпрастацца, адчуць зямлю пад нагамі. Зноў гэта мінутная слабасць! І Фёдара Ануфрыевіча, няйначай, напалохала... Праводжу далонню па твары — твар халодны і чужы (мой твар — халодны і чужы!).

— Як? Адступіў боль? Ісці зможаш?

Не адказваю нават кіўком галавы. Толькі падымаю і тут жа апускаю павекі, апёкшыся любоўю, якую выпраменьвае знаёмы зеленаваты позірк.

## XIX

Ян не павярнуў галавы на мае крокі, і, міжволі прыпыніўшыся, я ўзіраюся ў яго ненатуральна прамую, нерухомую постаць, як пераламаную папалам вузкай, зашмальцаванай бліжэй да стала лаўкай. Бясфарбна-шэры (такое ўражанне, што брудны) пінжачок яго — як бы сам па сабе, асобна ад плячэй і рук, — тырчком стаіць вакол тулава. Акуратна зачасаныя назад валасы акрэсліваюць, выразней падкрэсліваюць гэткія ж, як калісьці ў бацькі, залысіны, яшчэ больш падаўжаючы, выцягваючы твар. Калі б не абвостраны зараз і ад гэтага яшчэ больш няправільнай формы нос з ладнай гарбінкай, воку не было б за што зачапіцца на твары, выцягнутым у адну, злёгку закругленую над ілбом і ўздоўж падбародка лінію. Абыякавасць — нават не абыякавасць, а нейкая поўная адчужанасць ад уся і ўсіх, надае яго вобліку незнаёмыя рысы, і гэта трывожыць,

гэта бянтэжыць мяне, змушаючы шукаць у думках словы, што праб'юцца, змогуць прабіцца да Яна, да яго свядомасці.

— Ты вось так і сядзіш цэлымі днямі?

Пытанне гучыць нечакана рэзка, нават злосна, быццам я лаўлю раптам Яна на тым, што ён спрабуе наладзіць перада мной спектакль, разыграць гэткага пакрыўджанага лёсам пакутніка. Пакутнік, ты ж разумееш! Раней трэба было над сваім жыццём задумацца. А цяпер... Цяпер няма чаго спадзявацца на чыесьці слёзы. На мае няхай не спадзяецца!

І даўняя крыўда, і нядаўняя горкая гаворка мая з Фёдарам Ануфрыевічам, і разгубленасць гэтых першых імгненняў быццам адступілі — не адступілі, пераішлі ў неадольнае жаданне разбіць, растаптаць гэту Янаву нерухомасць, адчужанасць — растаптаць, скрышыць, каб яму забалела, каб яму так забалела, што ён месца сабе не знаходзіў. Бач, пакутнік! А хто яго штурхаў? Хто яго прасіў? Сядзіць, як святы Іаан пасля вадохрышча, адно што лыпнуў на мяне вачамі... Не, я ўсё яму выкажу, усё скажу — хай выслухае, хай, нарэшце, працверазее!

— Мо чакаў, што са слязьмі на грудзі да цябе кінуся? Што пашкадую, над жыццём тваім горкім паплакаўшы? Ну, не! — старэйшы ў сям'і, мужчына, — ты ніколі не быў мужчынам, прадаўжальнікам роду. Ніколі! Матчыну хлусню не змог перамагчы. Нас, сясцёр, яшчэ па маладосці адцураўся, каб, крый божа, не ўзваліць на сябе цяжар нашых няшчасцяў. Вучобу кінуў, каб кралю сваю па рэстаранах вадзіць, а потым, як нагледзела яна кагосьці лепшага, здраду яе не мог перажыць. Сліні распусціў, нос у віне штодзень мачыў... А не, і гэтага табе было мала. Угледзеўшы залітымі гарэлкай вачамі пуза Шатэрніка, труну бацькаву ўспомніў і жыццё сваё, бязволле сваё апраўдаць захацелася. Зноў жа не адно за свой кошт — за кошт спакою іншых: маё жыццё, маўляў, пад адхон пакацілася, дык і на іншых няхай камяні пасыплюцца. Пасыплюцца! Гэтага ты дамогся. Гэтага ты і хацеў, няйначай. Толькі і цябе ў героі ніхто не запіша: невялікае геройства — старога мярзотніка, гэткага, як і сам, п'янтоса прыкончыць. Лепш бы на сябе азірнуўся, лепш бы ад цябе сын — два, тры сыны! — нарадзіліся, вартыя дзеда свайго, роду свайго! Ты думаў: ты, жыццё тваё — дакорам людзям, дакорам свету? Ду-

маў: пашкадуюць цябе, сліні табе выціраць прыбягуць? А за што цябе шкадаваць? За слабасць? За маладушша? За нежаданне змагацца за сябе, за сваю душу? Ці мо за тое, што ты кроў чужую праліў, з таінным вінам яе змяшаўшы?

Кажу заведама жорсткія словы, і кажу амаль спакойна. Голасу не павышаю. Адно што на крэсла не апусцілася і стаю за два-тры крокі ад Яна ў позе суддзі. Не суджу яго, не! Няма каго судзіць: не Ян, а цень яго перада мной. Сэрца балюча сцялася, а я не зважаю на сэрца. Увесь боль гэтых дзён, усю горыч сваю на Яна выплёскваю. Падсвядома ж выразна адчуваю, што толькі вось так, вось гэткім націскам рэзкіх, спакойных пагардлівых слоў — кроў жа ў яго гэткая, як і ў мяне! — і можна збудзіць яго, скалануць, каб апамятаўся, каб усвядоміў, што зрабіў, у якую бездань коціцца. Я не ведаю, навошта мне гэтага дамагацца. Не ведаю, ці лепш гэта будзе для Яна. Я рашуча, усёй істотай сваёй не прымаю гэтую яго здранцвеласць, змярцвеласць: чалавек не павінны, не мае права памерці яшчэ пры жыцці, жывым! Чалавек павінны ўсведамляць сябе такім, які ён ёсць, павінны змагацца за сваю душу!

За ўсе гады работы ў судзе не бачыла я гэткіх згаслых, як зараз у Яна, вачэй: не тое што надзеі няма ў іх — нават ценю надзеі, якая адна і прывязвае да жыцця.

— Ты быў упэўнены, што я не прыеду, што я не схачу цябе ўбачыць. Я і не хацела. І не хачу. Мяне прывяла сюды кроў. Не тая, што ты праліў, уявіўшы сябе мсціўцам ці проста напіўшыся да чорцікаў у вачах. Мяне прывяла кроў бацькі, яго жыццё, пералітае ў нас абаіх, у нас траіх, якое мы так па-рознаму разумелі і карысталі. Ты аднойчы — не прыгадаеш, мусібыць! — кінуў мне, дзяўчынцы: «Кожны сам выбірае сабе святых!» Можа, скажаш зараз, каго, якога святога ты сабе выбраў, што нават пакута адступілася ад цябе.

Мне цяжка гаварыць. Здаецца: я даўно ўсё сказала. Кінуцца б зараз да Яна, ударыць, сціснуць у абдымку і потым біць, хвастаць яго па шчоках што ёсць сілы, пакуль на іх не выступіць балючы рдзень, пакуль яму не забаліць мая рука, мая прысутнасць! Галоўнае, што мне нельга змоўкнуць, нельга яго пашкадаваць... І чуе ж, чуе кожнае маё слова!

— Слон таўстаскуры, п'янчуга няшчасны! Годнасці

ніякай, а туды ж! — уявіў, убіў сабе ў башку, што яго ніхто не любіць, што ён нікому не патрэбны, што ён можа абысціся з сабой, як з нікому не патрэбнай рэччу. Ну, канечне, што табе ўсе мы, калі ты ніколі намі, жыццём нашым — не тым, знешнім, якое падобнае на любое іншае, а духоўным, душэўным, у больках і ранах, — не пацікавіўся? На тое, што твае бяздарныя пісьмы з мностввам памылак усіх калібраў яны ведалі на памяць, хаваючы гэта адна ад адной, табе было напляваць. Шатэрніку ён бутэлькай у чэрап усадзіў! А колькі раз да гэтага піў з ім за адным сталом? Піў, а ці спытаўся ў яго хоць аднаго разу, хто пісаў той данос на бацьку?

— Ён пісаў, — амаль не расціскаючы вуснаў, глуха прамовіў Ян, здалося нават, што гэта мне толькі пачулася, але ў твары яго з'явілася напружанне, ледзь прыкметнае, амаль няўлоўнае, але напружанне, якое сведчыла пра тое, што ён сапраўды адгукнуўся, што словы мае скранулі ў ім штосьці, што трэба працягваць у тым жа, што і раней, тоне і выцягнуць з яго прызнанне: як не яму, Яну, то гэта мне потым дапаможа.

— А ты — бачыў? Ты ведаў? — пагардліва адгукаюся на яго словы. — Нябось нікому ніколі не заікнуўся пра гэта. Ці мала што можа здацца сп'яну! Любіць Шатэрніка, мякка кажучы, нам не было за што. Гэта так. Але сцвярджаць, што ягонай злачыннай рукой быў забіты бацька, не маючы доказаў... Чым ты лепшы за яго зараз, пасля свайго ўчынку? Не ў яго, не ў Шатэрніка, ты меціў, а ў мяне. Так і атрымліваецца. Так і ёсць.

— Ён засмяяўся, калі я сказаў, што я — Радзінскі.

— І гэта — усё?! — ледзь не зрываюся я на крык. — І гэта ўся яго віна?! Ды гавары ж, гавары, чорт вазьмі!

— Ён гэтак жа засмяяўся, калі клаў тую паперку ў шуфляду, — адвярнуўшыся ад мяне, ціха, абыякава гаворыць Ян.

— Якую паперку, Ян? Данос на бацьку? Гэта ж магло быць што заўгодна...

Ён пазірае паўз мяне. Быццам не чуе. Быццам не заўважае майго хвалявання. Упершыню мільгае думка: ён і сапраўды хворы, цяжкахворы — і гэта не нейкі там неўроз, а штосьці значна горшае, значна большае. Я адганяю думку, недарэчную зараз, — я не пачула яшчэ ад Яна самага галоўнага.

— Ты бачыў тую паперку? Ян, ты чытаў, што там было напісана?

— Там было напісана, што бацька — вораг народа.

— І ты... ты... ты, Ян, усе гэтыя гады маўчаў! Шатэрнік спаў пасля ўсяго з нашай маткай, а ты маўчаў?!

Не ўсведамляю ўжо, чаго ў маіх словах, у маім недаўменні больш: абурэння або жалю — якраз у гэты момант Ян нязграбна, усім ненатуральна прамым туламам паварочваецца ў мой бок і я бачу, што твар яго яшчэ больш збялеў, калі можна яшчэ больш збялець, белы, без адной крывінкі твар.

— Ён спаў з маткай ужо тады.

— Калі... тады? — палохаюся я, адчуваючы, што падкошваюцца ногі. — Калі бацька быў яшчэ жывы?!

— За што, ты думаеш, мяне выгналі з дому?

Я павольна апускаюся на крэсла па другі бок стала. Усё стала ясна. Усё заблыталася так, што не тое што парваць повязь, якой я далучана да ўсіх падзей мінулага і цяперашняга, а і знайсці яе, тую повязь, сярод шматлікіх іншых, учапіцца хоць бы за канец, каб разблытаць свае думкі, свае бязладныя, горкія думкі нельга. Атрымліваецца: ва ўсім, што адбылося і адбываецца — я, усё перабытае і яшчэ не перабытае — ва мне. І гэта сведчыць аб маёй асобе гэтак жа, як і маё жаданне забыць мінулае — калі не даравацъ, то хоць забыць. Колькі гадоў праляцела, а нянавісць у сэрцы... А мо і не нянавісць гэта, а толькі боль, і я марна наіўна верыла, што можна забыць пра свой боль, пра пякучы, нічым невынішчальны боль перажытай у маленстве несправядлівасці? Несправядлівасці, якая ўявілася некалі ледзь не ўсясветнай, а была выклікана звычайнай, як на сённяшні дзень, жыццёвай драмай.

Не, не! Мерка звычайнай жыццёвай драмы ўсё-ткі малаватая. Штосьці ж значыў і час, тыя першыя пасляваенныя гады. Ды і працяг старой драмы — Янаў учынак, блізкі суд — зусім не нагадвае меладраму. Нават праз слёзы не ўсміхнуцца... Якая там усмешка! Пазіраю на Яна ледзь не з жахам: жыць з г э т ы м?! Ніколі не сказаць усё нават мне?! Пазіраю на прамую схуднелую яго постаць і бачу постаць бацькі, бачу рукі яго, не тыя, жывыя, якімі ён хапаўся за грудзі, калі пачынаў кашляць, а тыя, кімсьці складзеныя на грудзях і нерухомыя, якія з цяжкасцю ўтрымлівалі насоўку. І не разумею, чаму з горыччу думаю аб тым, што мы, усе мы, Радзінскія, зу-

сім не ведалі адзін аднаго. Штосьці адзін у адным бачылі, нават маглі растлумачыць, штосьці прымалі або рашуча не прымалі, а ніяк не ведалі. Вось і я з Янам...

Ян маўчыць. Па-ранейшаму абыякава, адчужана. Колькі чаму моўчкі сядзім мы, раздзеленыя сталом і гэтай адчужанасцю. Трэба б штосьці сказаць, трэба б працягнуць цераз стол руку і спачувальна крануцца Янавага пляча альбо рукі, а я ніяк не магу сябе перасіліць. Спрабую і не магу. Адчужанасць такая глыбокая, што, здаецца, краніся я шэра-бруднага пінжака брата рукой, хоць бы пальцамі — і пальцы натыкнуцца на пустату, і я закрычу ад жаху. Ад болю і жаху... А мо і не патрэбна зараз Яну маё спачуванне? Ну, канечне, не патрэбна! Я ж і гневам сваім яго душы не закранула, і пагардліва-злоснымі словамі хоць бы злоснага водгуку не збудзіла: дзесятак слоў з сябе Ян усяго і выціснуў. Каб не чаплялася. Каб зразумела ўсё да канца. Каб ведала, за што асуджала.

Божа мой, як цяжка судзіць, калі хочаш, калі рвешся апраўдаць! Апраўдаць... Чаму, чаму я не знаходжу ў сабе сілы пераадолець адчужанасць усіх гэтых гадоў? Чаму?

— Ты вось гэтак і сядзіш цэлымі днямі? — нечакана рэзка, нават злосна паўтараю ранейшае пытанне.

Ян не адказвае. Бы ў адказ на гэтыя словы адчыняюцца дзверы і сяржант Сітніца запытальна пазірае ў мой бок. Адгукаюся ж на стук дзвярэй і яго запытальны позірк не я. Ян апярэдзіў мой рух, апярэдзіў маё рашэнне — падняўся і, не азірнуўшыся, ступіў да сяржанта.

— Я прынесла табе цёплы світэр, Ян, — ліхаманкава пачынаю я разгортваць свой пакунак, бы нельга аддаць, перадаць яго вось у гэткім выглядзе, загорнутым у акуратны ліст паштовай паперы.

— Світэр мне ўжо не спатрэбіцца, сястрычка. Жыві!

Ён гаворыць: «Жыві!» замест «Бывай!» і выходзіць паперадзе сяржанта, так і не азірнуўшыся. Так і не азіраецца — ні на мае словы, ні на мой рух: я ўскочыла ў тое ж імгненне, ні на мае крокі. Колькі было тых крокаў — два, тры? Я чапляюся рукамі, нават позіркам за непрыняты Янам тоўсты мой спартыўны світэр, і ён паступова цяжэе ў маіх руках. Міг, другі — і я ўпускаю яго на падлогу, з раптоўнай нерашучасцю пераступаю цераз яго і, пераступіўшы ўжо, свядома раблю крок на-

зад, намацваю яго нагой і з ярасцю тапчу яго, піхаю, быццам гэты світэр і ёсць прычына хворай адчужанасці Яна і майго паражэння, апошняга і самага вялікага паражэння за ўсе гэтыя пакутныя дні неразумення, чаканняя і барацьбы. Слёзы цякуць у мяне па твары. Я выціраю іх абедзвюма рукамі, а яны цякуць і цякуць, хоць далоні застаюцца сухімі і гарачымі.

Калі ў пакой (дзверы так і былі незачыненымі) заходзіць Фёдар Ануфрыевіч, я ўжо загарнула бясформенны, забруджаны ботамі світэр у паперу, узяла сябе ў рукі і гатова ісці, ехаць — ехаць у Мінск, у прапанаваны санаторый, чорт ведае куды яшчэ! — толькі б не быць адной са сваімі думкамі. За ўсе гады работы ў судзе не бачыла я гэткіх згаслых, як у Яна, вачэй. Што яшчэ ён ведае? Пра што ён маўчаў?

## XX

Яна хавалі адвячоркам. Два дні таму... У гэта амаль немагчыма паверыць, але медыцынская экспертыза ўстанавіла, што акту самагубства не было і памёр ён ад таго, што раптоўна спынілася сэрца. Раптоўна. Сярод ночы. З часу нашай сустрэчы, з часу нашай гаворкі мінула дванаццаць гадзін. Усяго дванаццаць! Калі ён гаварыў са мной, ён ужо в е д а ў. Не адчуваў, а пэўна ведаў. «Жыві!» — сказаў. І не азірнуўся. Ні на мяне, ні на сваё, пражытае ўжо, жыццё. Быццам і тады, і яшчэ раней — з той хвіліны, як ударыў Шатэрніка, — выразна бачыў гэту ноч, і камеру, і сябе ў ёй, і сваю смерць. Быццам ступіўшы ў цень смерці, так і застаўся ў яе цяні, за нейкай нябачнай і страшнай мяжой, якую не мог пераступіць. Не мог? Ці не хацеў?

Ах, Ян, Ян! Вось ужо трэція суткі сон бяжыць ад мяне, ад маёй пакуты. Нічога не сказаць мне, нічога! — у адказ на мае горкія бязладныя словы, у адказ на мае папрокі. Чаму? У каго цяпер запытацца, чаму ён гэта зрабіў? Мог жа жыць з гэтай памяццю столькі гадоў! Жыў. Ніколі не пашкадаваў аб былым, не паскардзіўся. Піць, праўда, пачаў. Дык гэта пасля таго, як яго жонка... як яго кінула жонка...

Бездапаможна хапаюся за апошнія словы, за наступную, спалоханую думку. Не! Пры чым тут... Пры чым тут параўнанне з маткай? Піць пачаў, таму што і жон-

ка, як матка?.. Але ж тады выходзіць, што ён помніў усё. Помніў і, як і я, хацеў забыць, шукаючы свой шлях да забыцця. Жыў, помніў — да пэўнай мяжы, да той страшнай мяжы, за якой застаўся. Так выходзіць?

Баліць галава. Расколваецца. Дзе ўжо тут справіцца з балючымі думкамі! А тут яшчэ гэты голас... Вось ужо трэція суткі спрабую разабраць, пачуць у пустой, мёртвай цішыні чыйсьці глухі, невыразны голас, які яшчэ больш трывожна, чым удзень, гучыць уначы, глыбокай ноччу, як зараз, калі пакой асветлены, аголены яркім святлом і вісне ў бязмежжы горада, сярод пустых, скаваных непрабудным сном камяніц. Гучыць, гукае... Хто мяне можа гукаць? Адкуль? Адтуль, дзе Ян, не гукаюць. Ды і не Янаў гэта голас — хутчэй дзявочы, дзіцячы...

Сну няма. Усё вакол спіць, усё памерла да раніцы, а я ўслухваюся ў змрок, да звону ў вушах услухваюся ў ноч і ў сябе. Мы, я і гэта цёмная ноч, адно і супрацьстаім сну і смерці. Я і ноч... Над Янавым жыццём. Над яго магілай. А паміж намі, то спалучаючы, то падзяляючы нас, трымціць тоненькая, дрогкая нітачка дзіцячага голасу. Чый ён? Мой? Аднекуль здалёк, з маленства?

Націскаю пальцам на чорны гузік, выключаючы настольную лямпу, і моцна сплюшчваю павекі, асляпленая чарнатой. Аслепленая на адзін нейкі міг, бо ўжо ў наступны міг бачу хату, прыгорбленую пад цяжкой цэментавай чарапіцай, бачу, як павольна, спатыкаючыся і ўскідваючы поперак неба сваё пыльнае голле, ідуць паўз платы высокія таполі. І следам — не побач, а менавіта следам брыдзе дзяўчынка, і на ўсёй зямлі няма гэтулькі радасці, колькі б ёй хацелася...

Няўжо сапраўды дзецьмі мы пражываем усё, нам адпушчанае, усё, як ёсць — выпіваем нагбом, адным вялікім глытком, а потым усё жыццё тужым па гэтай смазе і паўтараем, паўтараем завучаныя змалку рухі, без мэты і без сэнсу, разбураючы сябе такіх, якімі стварылі нас прырода і наша маленства? Няўжо птушкі радасці адлятаюць на другі канец свету, каб ніколі не вярнуцца назад?

Не, не! Штосьці ж дапамагло, дапамагала мне ў самыя горкія хвіліны, калі здавалася немагчымым жыць далей, штосьці ж ратавала мяне! Можа, гэта была дзіцячая вера ў тое, што жыць яшчэ і жыць, што ад мяне, ад мяне самой залежыць, якім будзе маё жыццё. Памянела

ўпэўненасці, паблякла з гадамі вера, але ж не знікла зусім, не пакінула мяне! Як жа мне ад яе адмаўляцца? А птушкі...

Калі хавалі Яна, неба было чорнае ад птушак — зграя крыклівых, растрывожаных чымсьці варон кружыла так нізка, што, здавалася, твар мой студзілі ўзмахі іх крылаў, падобныя на ўсплёскі аграмадных якіхсьці веек. Чорнае ад груганпя неба і яркія, занадта яркія на цёмнай, амаль чорнай зямлі, — колькі кветак герані, асляпляльна крамяных, з першага позірку дзікіх і міжволі параўнаных мной з патаемнай пянавісцю, — вось усё, што засталося ў памяці. Птушкі. Кветкі. Ды яшчэ Лёніны спалоханыя і ад таго вялізныя, на ўвесь твар, вочы, у якіх пялёхкалася балючае неразуменне. Неразуменне смерці ці нават чагосьці большага, пра што ніхто з нас не здагадваўся. Ні яна, Лёна, ні я. Мо Ян ведаў больш. Пра штосьці ж ён маўчаў!

Не, трэба па парадку. Пра што ён мог маўчаць? Пра лясныя, выбухамі парослыя сцежкі? Пра пажары на паўнеба? Пра брэх аўчарак і холад, халоднае сіпенне гадзюк у балоце, дзе адседжваліся ў блакаду жанкі з дзецьмі? У сорак трэцім, калі ён з бабуляй трапіў за калючы дрот, яму было шэсць гадоў. І ён, адзін, пралезшы пад дротам, дабіраўся да лесу. І не плакаў, адвыкшы плакаць яшчэ малым, раз і назаўсёды. І потым доўга да крыку палохаўся сваіх сноў. І, падросшы, учыніў суд над гісторыяй. Гісторыю судзіў. А бацьку з маці, а Шатэрніка доўга не мог... Не мог чалавека судзіць. Пакуль мог трываць, пакуль мог насіць усё ў сабе, не асудзіў. А я... Я ж скрозь асуджала Яна за слабасць. Гэта — слабасць?

Бездань, якая ўсё-ткі бездань была паміж намі, паміж усімі. Род Радзінскіх, дом Радзінскіх... Быццам выбухнула ўсё знутры, глыбока знутры, адтуль, дзе няма ўжо ні імёнаў, ні твараў, ні ўспамінаў. Ні імёнаў, ні твараў, ні згадак — толькі чарната, толькі няўцямная нейкая страсць, якая не хацела мірыцца з няспешнай хадой дзён, якую ўсе мы скрозь імкнуліся прыкрыць і прыкрывалі — хто чым. Хто чым знаходзіў. Бабуля — любоўю і верай, бацька — служэннем ідэі, матка — граззю... І мы. І мы чапляліся кожны за сваё. Лёна за сям'ю і дзяцей, я — за бацькаву справу, якая стала маёй, Ян... А ён за што? За сябе? За нідзе ні ў кім не прысутную сваю любоў і глыбока прыхаваную вернасць

сям'і? Для нечага ж ён вярнуўся пасля смерці маці ў старую нашу хату!

Так, магчыма, у гэтым разгадка. Разгадка і яго сілы, і яго слабасці. Хворай любоўю не выжыць. Дзецьмі, сям'ёй выжыць можна, справай сваёй — можна, а пакалечанай, хворай любоўю...

Ну, адкуль мне было ведаць пра Янаву любоў? Я і пра сябе не ўсё ведала. Пайшла следам за таполямі, якія ўскідвалі поперак неба сваё пыльнае голле. Бо шлях пагукаў. І зараз, калі магу азірнуцца і азіраюся, узіраюся ў сябе тую, самаўпэўненую і жорсткую ў гэтай самаўпэўненасці, за што мне сябе абвінавачваць? І тая залішняя самаўпэўненасць, і тая жорсткасць ратавалі мяне. Гэтак жа, як Яна ратавала яго незалежнасць. Кожны ішоў сваім шляхам, магчыма, прадвызначаным не толькі лёсам, але і часам. Мне было прадвызначана маё. Не прызнавацца ж сёння немаведама каму ці хоць бы мінуламу, што ўсе мае намаганні былі марнымі, што я магла пражыць іншае жыццё. Не магла я пражыць іншае жыццё. Не магла пайсці іншым шляхам. У мяне была і ёсць справа. Мая справа. Справай якраз і выжываюць. Гэта ведаў Ян. «Жыві!» — сказаў. І не азірнуўся назад.

Ах, як баляць думкі! Быццам увесь боль, выплеснуты ў апошнюю гаворку з Янам, зноў, наноў прарос у душы.

Колькі помню сябе, усё нутро балела, праз боль — болем! — прагнучы сілы, няйнакш, як галодны страўнік, што болем патрабуе свайго. Мне здавалася, што гэтага патрабаваў мой шлях. Ды і сам час. Не я ж адна была пераканана, што, калі нідзе не збочваць з прамога шляху, калі не збочваць і не адступаць, сустракаючыся з перашкодамі, няхай нават самымі неадольнымі, — дойдзеш, куды хочаш дайсці, дамажашся таго, чаго хочаш дамагчыся. Трэба толькі ісці. Трэба толькі нідзе не збочваць і не шкадаваць сябе! Вось я і не шкадавала сябе. Сіла — не ведае адпачынку. Гэта дакладна заўважыў Ануфрыевіч. Толькі і ён, стары мой Ануфрыевіч, і ў думках не дапускае, што нічога іншага мне папросту не заставалася. Або ўніз — да п'янства і распусты, або кудысьці ўгару, далей і ўгару, невядома куды. Туды, куды клікала мара. Быць дужай — што ж яшчэ заставалася? Не жаліцца ж, не расказваць усім тое, якія незразумелыя, цёмныя глыбіні, дзе няма ні імёнаў, ні тва-

раў, ні ўспамінаў, тояцца ўва мне! Ні імёнаў, ні твараў, ні згадак — толькі чарната, толькі няўцямная нейкая страсць, якую я ніяк не магла змірыць з няспешнай хадой будняў, страсць, якую я скрозь імкнулася прыкрыць і прыкрывала рашучымі словамі.

Прабіцца! Рашучае, жорсткае слова. Яно і патрабавала рашучасці. І ў мяне была яна, гэта рашучасць. Была, пакуль Ян... Ах, Ян, Ян! Мо і праўда словы не маюць ранейшай — хоць бы ранейшай! — сілы і не могуць перамагчы жыццё. Не могуць, якімі б прыгожымі, якімі б правільнымі ні былі. І не змогуць. І не адно час вінаваты ў тым, што разуменне гэтага прыйшло так позна. І нават зусім не час вінаваты, бо ён (усе гадзіннікі хлусяць, адмерваючы нам гады!) не мае межаў і ніколі не спяшаецца, ніколі. Ды і мы — часцей не там, дзе знаходзімся, а там, дзе сябе бачым: ні час, ні адлегласць не маюць значэння. Быццам мы так і застаёмся дзесьці ў маленстве, перад сваімі крыўдамі. Мы... Хто мы?

Уздрыгваю і, не адразу намацаўшы выключальнік, запальваю святло. Зіркаю на гадзіннік (ён не ў гэтым, у большым хлусіць!): шостая гадзіна раніцы. Хто б мог пазваніць гэткай ранню? Хіба што Вадзім?

— Лёкса? Я знаю, ты не спіш, — нягучна абзываецца на мой рух тэлефонная трубка. — У мяне заканчваецца дзяжурства. Мне прыехаць?

— Не трэба, Вадзім.

— Не трэба дык не трэба, — уздыхае. — Ты толькі помні, што я блізка, амаль што побач, і варта табе адно...

— Я помню. І сама знайду цябе, калі штосьці пэўнае вырашу. Я сама павінна вырашыць.

— Што вырашыць? Што яшчэ вырашаць?

Хвалюецца. Голас ледзь прыкметна зазвінеў ад напружання. І мне міжволі перадаецца яго хваляванне — на міг нават хочацца адкінуць усё перажытае, адкінуць асцярожнасць і загукаць у трубку, у гэта глухое начное бязмежжа: «Я люблю цябе! Я ўсё-ткі люблю цябе, Вадзім. Прыязджай. Назаўсёды прыязджай — я так доўга чакаю...» Пагукаць! А я маўчу. Каб нічым, ніводнай шчымлівай ноткай не выдаць сябе.

— Што ты хочаш вырашаць? — паўтарае ён, не хаваючы трывогі.

— Што рабіць са сваёй любоўю, — вырываецца ў

мяне і, папікнуўшы сябе, нават нязлосна вылаяўшы ў думках, балюча закусваю губу.

— Са сваёй... любоўю? А з маёй? Ты не павінна нічога вырашаць адна. Ты ўжо аднойчы вырашыла...

Я маўчу.

— Можна я прыеду, Лёкса? Мо і не час гаварыць пра ўсё, а калі — час? І што такое час, як радасць скрозь абарочваецца незразумелай віной?

Я маўчу. Я думаю, што трэба пакласці трубку, і не кладу, па-ранейшаму прыціскаю яе да шчакі, нервова пагладжваючы пальцамі.

— Чаму ты маўчыш? Зноў хочаш схавацца ад мяне за маўчаннем? Мы дарослыя людзі, Лёкса!

— Я люблю цябе, Вадзім, — перамагаю я сваё хваляванне. — Люблю і таму нічога не хачу для сябе. Разумееш? Нічога! Мы позна сустрэліся. Няма ў тым віны, так. Але і трагедыі няма, колькі б і як бы ні давялося пакутаваць. Любоў не павінна нічога разбураць, адпрэчваць. Разумееш?

— А сябе, значыць, любоў можа адпрэчваць? Ты гэта хацела сказаць?

— Я сказала тое, што сказала: любоў не павінна нічога разбураць. Калі гэта любоў. Я толькі зараз... пасля ўсяго, што адбылося, зразумела.

— Але ж ты нічога не ведаеш! — з горыччу адгукаецца Вадзім. — Ты ж ніколі не хацела выслухаць мяне, ніколі не давала мне гаварыць пра сваё жыццё, пра сям'ю. Ты не ведаеш!

У мяне сціскаецца сэрца. Ад болю. Ці ад жалю. Ці ад таго і другога. Мне ніколі так, як зараз, не хацелася, каб Вадзім быў побач, заўсёды — побач! Але ніколі я і не ўсведамляла так ясна, што няма ў мяне такога права, няма і не будзе, колькі б я ні шукала яго ў сваім сэрцы.

— Мы пра ўсё пагаворым, Вадзім. Я абяцаю табе. Я выслухаю ўсё, што ты хочаш мне сказаць. Толькі не зараз, не сёння. Добра?

Боль паціху адпускае. Мо таму, што я ўсё правільна зрабіла, што сказала тое, што павінна была сказаць.

— Калі мне пазваніць?

— Я сама знайду цябе, Вадзім. Абяцаю!

Націскаю на рычажок, не развітваючыся, і яшчэ доўга пакручваю ў руцэ анямелую, гарачую ад маіх пальцаў трубку.

Любоў не павінна нічога разбураць. Вадзім зразумее. Магчыма, ён і разумее. Магчыма, ён заўсёды разумеў. Ён жа ўрач, хірург. «Калі і быў бог, то ён быў урач, а не суддзя», — неаднойчы даводзіў жартам. Што на гэта скажаш?

Законы жыцця і законы грамадства — не зусім адно і тое ж. Не супрацьлегла розныя, але розняцца. Суддзя — урач... Зманліва, канечне. І параўнанні пад рукой: лечым сацыяльныя хваробы, ратуем чалавека... Не. Усё ж, суд — іншае. Не лекі суддзя шукае, а доказы: вінаваты — невінаваты? Усе «за» і «супраць» на шалі кідаюцца — што пераважыць! Дзе тут месца любові? Любы суддзя крышачку над. Над спачуваннем. І над асуджэннем. Хоць, урэшце, і павінен асудзіць, прыняць рашэнне. Скрозь так, колькі суд існуе. І я, колькі ў судзе працую, гэтым кіруюся. Дзе тут памылка? І што такое любіць, як не разумець, як не да канца зразумець чалавека? Засумнявацца ў гэтым — азначала б не адно ў сабе, у сваёй рабоце і сваім жыцці засумнявацца, а і ў асновах грамадства і яго маралі. Не, не! Якія тут могуць быць сумненні? Без суда нельга. Закон ніколі не будзе знішчаны, таму што ў людзей, калі б яны адпрэчылі закон, не засталося б паратунку. Як інакш абудзіць сумленне?

Вось і Яна ўзяць... Ах, Ян! Колькі ні заліваў душу, колькі ні душыў яе гарэлкай, а яна жывая заставалася, а яна сваё спагнала. І віна яго ў тым. Вінаваты — і я б гэткі прысуд вынесла! — што ўчыніў самасуд: цярпеў, колькі мог, сябе загубіў, а потым — не па закону, адно па праву пераджытага, ужо на краі ўласнай гібелі, перад смерцю, — судзіў чалавека, на смерць яго асудзіў. Слабога, мярзотнага душой чалавека, а ўсё ж, чалавека. І апраўдаць Яна нібыта лёгка, і не асудзіць нельга.

Ды чаго там! Што сёння ўсе апраўданні і асуджэнні? Няма Яна. Прыйдзі я да яго раней — яшчэ годам раней! — вырві я, выгавары я боль яго, і да забойства не дайшло б. Магчыма, не дайшло б. Тое, што брат ён мне, што не магла я не любіць яго, мне і пашкодзіла... Разумей як хочаш!

Зноў тэлефон?

— Лёкса, тваё акно асвятляе цэлы квартал, непакоячы паставых і закаханых!

— Хутка тралейбусы пойдуць, якія закаханыя, Вадзім?

— А я?!

— Мы ж дамовіліся! — пратэстую.

— Я ўсё раблю, як мы дамовіліся, — з гатоўнасцю адгукаецца той. — І хоць знаходжуся зусім блізка, побач, пад тваімі вокнамі, — не падымаюся наверх, бо ты сказала: «Не трэба». І не падымуся, хоць і рупіць, калі ты паабяцаеш выключыць святло і заснуць. Як?

— Спрабавала заснуць і не магу! — скарджуся і тут жа адразу тузаю, нацягваю нябачны павадок волі. — Ну, ды гэта не страшна. Бяссонніца — яшчэ не смерць.

— Лёк-са! Свет непарушна трывалы і застанецца такім заўсёды. І галоўная каштоўнасць яго — любоў! — не знікла і не знікне. Ты любіла Яна — любі яго ў кожным слабым, няшчасным чалавеку і ты сто, тысячу разоў апраўдаеш яго. Ты ўжо яго апраўдала!

— Госпадзі, адкуль ты ўзяўся на маю галаву, гэткі ўсязнаўца? І гэта ты ведаеш, і тое ты разумееш! Як ты можаш разумець тое, чаго я сама ў сабе не разумею?

— Табе перашкаджае боль, — голас Вадзіма супакоіўся і зрабіўся сумным. — А боль — па маёй частцы, Лёкса. Табе трэба заснуць. Жыццё ўсё паставіць на свае месцы, і не суддзі мы яму, жыццю, — ты ведаеш, пра што я. Мы можам асудзіць ці апраўдаць чалавека, хоць, павер мне, чалавек заўсёды — амаль заўсёды! — заслугоўвае апраўдання. Любы чалавек...

— І я? — вырываецца ў мяне, і я сцінаюся, чамусьці чакаючы смеху, чамусьці ўпэўненая, што Вадзім не можа не засмяяцца ў адказ на гэта няўцямнае прызнанне.

— Ты — больш, чым хто іншы. Бо ты самы лепшы чалавечак на свеце, — нават не ўсміхаецца ён, і ў мяне адлягае ад сэрца: дзесьці вельмі глыбока, пад цяжарам змрочных прадчуванняў і бяссоннай трывогі ўспыхвае якаясьці святлінка, пакуль яшчэ ледзь адчувальная, ледзь улоўная, а — на сэрцы цяплее.

— Абяцай мне, што ты зараз выключыш святло і заснеш!

Я кладу трубку і выключаю святло.

## XXI

Ноч. Зноў навалілася ноч. Зноў вяртаецца адчуванне бяздоннай у абодва бакі чарнаты, з якой мне трэба, абавязкова трэба выбрацца, а я не магу. Змрок чорнымі цяжкімі хвалямі, ліпкімі ад задушлівай гарачыні, калыхаецца ўшчытную да твару — і я не магу адарваць галаву ад падушкі, не магу расплюшчыць вочы і бачу — бачу! — чорнае калыханне, і кароткія, на адзін пераштоўк гадзінніка, таямнічыя бліскі за ім, і гадзіннік... Надта ж дзіўны гадзіннік. Быццам і той самы, што вісіць на сцяне, у прасценку паміж вокнамі, —аграмадны, чорнага дрэва, з круглым гучным маятнікам і асветленым, падсвечаным аднекуль збоку цыферблатам, і ўсё ж іншы. Я не адразу і ўсведамляю, у чым іншы. Услухваюся, да рэзі ў вачах узіраюся ў яго і, нарэшце, разумею: гадзіннік б'е беспярастанку, і яго роўныя меладычныя ўдары расцякаюцца вакол, на шмат кіламетраў вакол чыстым, злёгку кранутым трывогай звонам — так, бы хто дзесьці ўгары, высока ўгары разгойдвае вялікі звон. Звон часу. Вось жа і на цыферблаце замест двайных рымскіх лічбаў — звычайныя чатырохзначныя: 1942... 1945... 1953... 1956... 1960... Мае гады? Дык тады недзе вышэй, завяршаючы круг, павінен значыцца і той год, той далёкі... апошні... Да рэзі ў вачах узіраюся ў цыферблат, у лічбы, але яны расплываюцца, знікаюць у новай хвалі чарнаты, і позірк зноў бездапаможна чапляецца за самыя першыя з іх: 1942... 1945... 1953... Мільгануў год сёлетні — і ўсё зноў патанула ў змроку, хоць яго, гэты змрок, і разганяюць, адганяюць роўныя меладычныя ўдары. І гэта не ад падушкі я не магу адарвацца, а ад гэтага звону, ад гэтага часу, у які перацякае маё жыццё, перацякае незалежна ад мяне, ад маёй волі, бо ніякі іншы час выбраць я не магу, ды і наогул ніякі час я не выбірала — гэта ён, час, мяне выбраў. І ўсё, што я магла і магу, усё, што змагу, — сцвердзіць сваё імя, каб засталося яно, выбітае на простым надмагільным камені, сярод вялікага мноства іншых імён, імён маёй незлічонай радзіны — сваякоў, падобных і не падобных на мяне, з маім і не з маім прозвішчам.

Я так пільна ўзіраюся ў гадзіннік, у лічбы на цыферблаце, што яны пачынаюць рухацца — зварушваюцца і... і ўзлятаюць! І зусім гэта не лічбы, а птушкі. Чароды

птушак. Самых розных. Самых розных форм і колераў, не падобных ні на адну з тых, якія я добра ведаю. Іх так шмат, што яны засланяюць цёмнае неба — здаецца, гэта неба і калыхаецца гарачымі цёмна-светлымі ўсплёскамі. «Гэ-эй! Адкуль вы ўзяліся?» — гукаю я ім, гукаю ў неба, задзіраючы галаву і нават не спрабуючы суцішыць у сэрцы радасць. Нейкую трывожную радасць.

— Гэта птушкі твайго лёсу, усіх чалавечых лёсаў, — спакойна прамаўляе хтосьці ў мяне за спіной. — Птушкі радасці, і птушкі сумоты, і птушкі адчаю.

Паварочваюся, на міг адпускаючы з пагляду птушак: маці. Стаіць, склаўшы, сашчапіўшы на грудзях рукі, і плечы акрыты старой, парудзелай ад часу плюшаўкай, і ў вачах — незнаёмы спакой, спакойнае нейкае здзіўленне. Я пазіраю — і здзіўленне неяк паступова змяняецца трывогаї. Мо таму, што я бокам, спатыкаючыся, адступаю ад яе, усё хутчэй і хутчэй, пакуль не кідаюся бегчы, спалохаўшыся за сябе і за сваіх птушак, якія — усе! — паляцелі, ляцяць за мной.

— Куды ж ты?! — роспачна загукала яна мне ўслед. — Куды ж ты, Лёкса? Тут жа твая зямля, тут твой лёс!

Ніжэй апускаюцца птушкі (я чую, як чапляюцца яны за мяне крыламі), ніжэй апускаецца неба (я чую, як яно пачынае ціснуць на плечы), а голас, поўны роспачы і болю, усё гукае, усё гучыць.

— Куды ж ты, дачушка?

— Я вярнуся, — шапчу. — Я потым вярнуся.

І адступае раптам чарната. І вось ужо я бачу не толькі гарачае калыханне птушак на фоне цёмнага, чорнага неба — бачу першы тоненькі праменьчык сонца, бачу сонца ў прасвеце паміж аблокамі, і там, дзе лёг першы праменьчык, бачу шлях. Свой шлях...

Сон, нечакана вярнуўшыся, успыхнуўшы ў памяці, уяўляецца ледзь што не рэальнасцю: заўважаю, што я спынілася пасярод вірлівага вакзальнага натоўпу люду і ўслухваюся ў голас, які так настойліва ўварваўся ў даволі будзённыя думкі пра расклад цягнікоў, пра білет і свой ад'езд у санаторый. Ён усё яшчэ гучыць, гэты голас, і я не спяшаюся яго адпіхваць, не адгароджваюся нейкімі новымі думкамі і клопатамі. Услухваюся ў яго і ў сябе, знаходзячы ў душы не толькі стары і новы,

нядаўні боль, але і штосьці незнаёмае — незнаёмую лагоднасць, сцішанасць. Бы душа, няхай і не вырваўшыся з мінулага, усё ж узнялася, вырасла — і ёй адкрыліся якіясьці новыя, іншыя далягляды, іншыя шляхі, над якімі гэтак жа, як птушкі сумоты і адчаю, кружаць і птушкі радасці. Калі, на якім пераходзе надарыцца радасць; адсюль не разгледзець, але ж надарыцца!

І не трэба баяцца балючых думак, не трэба адпрэчваць памяць, бо не бывае радасці без сумоты і гора без адчаю, бо ўсё мінае і ўсё застаецца, калі ёсць вера ў будучыню, вера ў тыя некалькі гадоў ці некалькі імгненняў, якія кожны павінен пражыць і пражыве з годнасцю.

Углядаюся ў ажыўленых і змораных чаканнем незнаёмых людзей — шукаю пацвярджэння сваім думкам і знаходжу: зморшчыны, часам падобныя на глыбокія рубцы, падведзеныя ліловым мяшкі пад вачамі — сляды нялёгка пражытага жыцця ні на адным твары не засланяюць іншага, галоўнага — перакананасці, што ніводнае, нават самае безнадзейнае намаганне не было марным, што жыццё, дадзенае не навечна і не задарма, вартае ўсіх намаганняў і страт.

Сцішаная, заспакоеная няроўным гулам галасоў і крокаў, я ўжо кіруюся да выхаду і не адразу разумею, за што, за каго зачапіўся раптам позірк. Лаўка, застаўленая сумкамі і чамаданамі. Рэчмяшок на каленях у сівагаловага дзядка... Чакай, дык гэта ж той дзядок невысокага росту ў шытай вясковым краўцом світцы, магазінным капелюшы і хромавых, добра начышчаных ботах, якому я паказвала дарогу да музея! Вунь і знаёмы капялюш побач з ім, на крайку лаўкі, і боты гэтак жа добра нашмальцаваны, як і мінулы раз. Быццам і не было гэтага тыдня...

Мне руліць падысці, загаварыць да дзеда. Стрымлівае адно тое, што ён збіраецца палуднаваць — відаць, перад дарогай: на разгорнутым шматку газеты — кусман жытняга хлеба і нарэзаныя скрылікі сала. Я яшчэ вагаюся, калі дзядок падымае галаву і раптам, згледзеўшы мяне і прызнаўшы, здзіўлена гукае:

— Яй-бо, знаёмая! Дзіва што я ўсё ніяк да сваіх прысмакаў не дабяруся.

— Добры дзень, дзядуля, — раблю я крок да яго, заспетая ў сваёй нерашучасці. — Другім разам у горадзе ці мо не ад'язджалі дагэтуль?

— Перапрашаю, грамадзяначка, — звяртаецца той да сваёй суседкі, вастраносай (нават акуляры не прыкрываюць тонкага, дзюбастага носа), няўсмешлівай кабеты, што ні на імгненне не выпускае з позірку два вялікія пузатыя чамаданы, раз-пораз намацваючы іх, то адзін, то другі, прыкрытым крысом паліто каленам. — Можа, вы пасунецеся трохі? Знаёмую напаткаў, сваячку лічы.

Тая косіцца на мяне, незадаволена папраўляе акуляры, падбірае паліто і крыху адсоўваецца, даючы месца, і мне нічога не застаецца, як, падзякаваўшы, сесці, хоць, праўду кажучы, у мяне і думкі падобнай не ўзнікала. Сеўшы ж, усміхаюся, нечакана радуючыся гэтай сустрэчы: штосьці ў гэтым дзядку выклікае безумоўны давер, штосьці ў ім — глыбока добрае, вечнае. Гэткае, як у маёй бабулі Кацярыны. І пазірае ён гэтак жа спакойна-ўважліва, як і яна...

— Як не ад'язджаў? Ад'язджаў, — тлумачыць. — Бабу адну на тыдзень не кінеш на гаспадарцы, аняготж? Кволая яна яшчэ, хай перш акрыяе трохі. Вось частуйся, дочка. Свойскае сала, добрае.

Падае скібку хлеба, накрытую тонкім духмяным скрылікам, не слухаючы, бы не чуючы, маіх пярэчанняў і потым маёй падзякі. Няспешна адкусвае ад другой скібкі, перш, па даўняй сялянскай звычцы, адправіўшы ў рот сабраныя ў далонь крышынкі. Есць немітусліва, спакойна, гэтак жа, відаць, як робіць любую патрэбную работу (я міжволі стараюся рабіць, як ён). Пасля гэтак жа няспешна ўціраецца насоўкай, выцягнутай з шырокай кішэні світкі і, акуратна завярнуўшы рэшту ежы і свае няхітрыя прылады ў вузельчыку, ладкуе ўсё ў рэчмяшку.

— Знайшліся мае сыны, як жа! Таму і выклікалі мяне.

— Дзе... знайшліся? — разгубілася я і не адразу адольваю разгубленасць.

— У Польшчы знайшліся. Пад Варшавай галовы склалі. Абодва ў адзін дзень. І Чэсь і Ляксандра.

— Мяне таксама Ляксандрай бабуля звала, — немаведама чаму кажу я ў адказ, а спахопліваюся — трэба б іншае што сказаць! — дзядок згоднаківае галавой і пагладжвае (адным і тым жа рухам непаслухмянай рукі) добра паголеную шчаку: сачу за гэтымі яго рухамі і шукаю нейкія іншыя словы. — Тата ў мяне таксама

героі вайны, партызанскі камандзір. Шэсць узнагарод у яго. Толькі ён нядоўга пасля вайны пажыў...

— Вайна дагэтуль людзей забірае, — уздыхае ён, пакасіўшыся на мяне.

— У вас нікога не засталося? — пытаю. — Зусім-зусім нікога?

Рука яго на міг як прыстала да шчакі, і ў позірку адразу — недавер. Але, праўда, мільгануў і знік недавер, і зноў роўным мяккім святлом свецяцца вочы.

— Свае людзі вакол — вось і родныя. Вось і мяркуй тут сама. Мы з бабай адыдзем хутка: век жа, лічы, пражыты, а радня паўсюль застанецца, анягож? Пакуль людзі будуць народам звацца, застанецца радня. Гэтак я думаю.

Пазіраю на дзеда з павагай: так паверне, што і слова і не ўставіш, адно пагадзіцца і можаш.

— Ты, дочка, гора, бачу, пераэкыла.

Уздрыгваю: адкуль ён бачыць?

— Не трэба хаваць гора ад людскіх вачэй і слоў. Гора перабудзецца, а душа ім ачысціцца павінна, вось пра што помні. Мо і абвальваецца на чалавека гора, каб паменела ў ёй, у душы, злосці і неразумення. Анягож?

Я апускаю долу вочы.

Аб'яўляюць пасадку на дзедаў цягнік, а я ўсё не магу выціснуць з сябе ні слова. Пазіраю на дзядка, на яго немітуслівыя, спакойныя зборы і маўчу. І думаю пра тое, што надоўга, назаўсёды ўвайшоў ён у маё жыццё, а чаму, з якой такой прычыны, невядома. Ці мо і сапраўды па-ягонаму выходзіць: свой чалавек — вось і родны?

Перабіраючы паглядам нумары вагонаў, заўважаю, што на захадзе, недзе над гарадской ускраінай і далячынню за ёй, выдзіраецца з шэрані сонца. Спачатку бачу колькі нясмелых яго праменьчыкаў — наўскос па небасхіле, а праз момант у прагале паміж набрынялымі шэранню аблокамі з'яўляецца бліскучы вогненны шар. Ён здаецца цацачным, да яго можна дайсці, дацягнуцца... Разумаю, што гэта проста малюнак з маленства (цацачны шар!), але раз-пораз азіраюся на яго, прабіраючыся цераз натоўп мітуслівага вакзальнага люду.

# ЗМЕСТ

АПОВЕСЦІ

ЖЫВЫЯ ЖЫВУЦЬ
3

ЧАС, КАЛІ НАС ЛЮБІЛІ
275

**Бондар Т.**

Б 81 Час, калі нас любілі: Аповесці. — Мн.: Маст. літ., 1988 — 430 с. : іл.

ISBN 5-340-00002-8.

Бондарь Т. Время, когда нас любили: Повести.

Работа, кар'ера, сям'я, каханне — што стане галоўнай апорай у жыцці? У чым кошт і найвялікшы сэнс жыцця? Пра гэта думаюць і разважаюць героіні аповесцей Таісы Бондар. Іменна пошук адказу на гэтыя складаныя пытанні ў многім вызначаюць жыццё жанчыны і яе лёс.

Б $\frac{4702120200 - 136}{М\ 302(03)-88}$ 2—88 ББК84 Бел 7

Литературно-художественное издание

**БОНДАРЬ**
**ТАИСИЯ НИКОЛАЕВНА**

ВРЕМЯ, КОГДА НАС ЛЮБИЛИ

Повести

На белорусском языке

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

Літаратурна-мастацкае выданне

**БОНДАР**
**ТАІСА МІКАЛАЕЎНА**

ЧАС, КАЛІ НАС ЛЮБІЛІ

Аповесці

Рэдактар Е. А. Пяршай. Мастак У. І. Сытчанка. Мастацкія рэдактары М. Я. Шкурпіт, А. І. Дрозд. Тэхнічны рэдактар А. Б. Барадзіна. Карэктар Т. В. Трубач.

ІБ №3014

Здадзена ў набор 08.12.87. Падп. да друку 05.08.88. АТ 08711. Фармат 84×108$^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 22,68. Ум. фарб.-адб. 22,89. Ул.-выд. арк. 24,27. Тыраж 12 000 экз. Зак. 2737. Цана 1 р. 90 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600. Мінск, праспект Машэрава, 11.

Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11